С. М. Ходзін

# БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС: ШЛЯХІ І ФОРМЫ САВЕЦКАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ (1921–1939)



БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

С. М. Ходзін

# БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС: ШЛЯХІ І ФОРМЫ САВЕЦКАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ (1921–1939)



МІНСК
БДУ
2014

УДК 94 (476) «1921/1939» : 930
ББК 63.3 (4 Беи) 61-21 г
Х69

*Друкуецца па рашэнні
Рэдакцыйна-выдавецкага савета
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук *У. Н. Сідарцоў*;
доктар гістарычных навук *В. А. Самовіч*

Выкарыстаны фотаматэрыялы
Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў

**Ходзін, С. М.**
Х69 Беларуская вёска ў міжваенны час: шляхі і формы савецкай мадэрнізацыі (1921—1939) / С. М. Ходзін. — Мінск : БДУ, 2014. — 240 с.
ISBN 978-985-518-989-4.

У выданні даследуюцца гістарычныя крыніцы і вызначаюцца асноўныя этапы і кірункі гістарыяграфіі важнейшых змен у беларускай вёсцы ў кантэксце тэорыі мадэрнізацыі. Асаблівая ўвага надаецца фактару сацыяльнай псіхалогіі сялянства, традыцыйным сялянскім інстытутам і паўсядзённасці, якія трансфармаваліся пад уплывам дэмаграфічных працэсаў і палітыкі савецкай улады.

**УДК 94 (476) «1921/1939» : 930
ББК 63.3 (4 Беи) 61-21 г**

**ISBN 978-985-518-989-4**

© Ходзін С. М., 2014
© БДУ, 2014

*Маім продкам, якія прысвяцілі*
*сваё жыццё зямлі,*
*сям'і і працы*

# АД АЎТАРА

За кароткі перыяд аднаўлення гістарычнай памяці беларусы вярнулі сабе шляхетнае саслоўе, многіх славутых дзеячаў еўрапейскага, сусветнага маштабу. І ўсё ж менавіта сялянства застаецца калыскай беларускай традыцыі. У XX ст. на яго долю выпала шмат выпрабаванняў. Вясковец звыкла аднаўляў парушанае вайною. Але мяжа 1920—30-х гг. запатрабавала ад селяніна ўнутранага псіхалагічнага пералому, карэнных змен у сутнасці яго жыцця як самастойнага гаспадара. Апынуўшыся ў сітуацыі выбару, большасць беларускіх сялян прыстасавалася да тых умоў, якія дыктавала савецкая ўлада. Складаныя працэсы, што назіраліся ў беларускай вёсцы ў 1920—30-х гг., патрабуюць далейшага вывучэння. Але ўжо на першы погляд бачна: багацце альтэрнатыў яе развіцця выяўлялася больш яскрава, чым у іншых рэгіёнах СССР. Тут з большым поспехам прайшла Сталыпінская аграрная рэформа, істотныя адрозненні меў інстытут сялянскай абшчыны, развіваліся пераважна тыя кірункі, якія вельмі складана і без належнага выніку адразу маглі быць абагулены: жывёлагадоўля, бульбаводства, льнаводства, садова-агародная гаспадарка. Тое, што беларусы ў гэты час не маглі самастойна фарміраваць сваю палітыку ў спалучэнні з адміністрацыйным прымусам, мела далёка ідучыя адмоўныя вынікі. У лік кулакоў трапілі не толькі серадняки, але і значная частка бяднейшага сялянства, якая трымала для ўгнаення па дзве каровы і нейкую дробную жывёлу. Абагульненне жывёлы прывяло да страты больш за тры часткі яе пагалоўя.

Псіхалагічны, ідэйны раскол аказаўся вельмі глыбокім. Сялянства было азлобленае, уладныя структуры з цяжкасцю разбіраліся з паклёпамі і даносамі. Вёска паступова губляла гаспадара.

Адначасова складана, пад наглядам і прымусам пачала фарміравацца новая сістэма — калгасна-саўгасная. Да гэтага часу навукоўцы і палітыкі па-рознаму ацэньваюць вынікі яе функцыянавання. Але нельга яе адмаўляць як традыцыю, на якой выхоўвалася не адно пакаленне вяскоўцаў. Каб зразумець саміх сябе, каб выправіць памылкі і не зрабіць новых, мы, хто жыве ўжо ў XXI ст., павінны ўважліва ўглядацца ў той час.

# УВОДЗІНЫ

Адно з найбольш сугучных паняццяў у дачыненні да вёскі — «традыцыя». Даследчыкі ўсё часцей звяртаюць увагу на распаўсюджаную «моду» супрацьпастаўляць падзеі да і пасля кастрычніка 1917 г. Адмаўленне вядомага гісторыка-генетычнага метаду, калі вывучаемыя з'явы вызначанага перыяду адрываюцца ад папярэдняга этапу развіцця, прыводзіць чытача да высновы, што ўсе яны ўзніклі ўпершыню [1, с. 22]. Заканамерна паўстае пытанне аб пераемнасці і тых элементах сацыяльнай сістэмы, якія гэтую пераемнасць забяспечваюць [2].

Гістарыяграфія мяжы 1980—90-х гг. — адна з самых паказальных у дачыненні да гісторыі вёскі. Акрэсліваючы яе асаблівасці, неабходна адзначыць дзве: нарастаючае з часам супрацьпастаўленне папярэдняму этапу і значны ўплыў публіцыстыкі. Журналісты, літаратары і гісторыкі, выкарыстоўваючы публіцыстычныя формы і перыядычны друк, спрабавалі апярэдзіць адзін аднаго ў радыкальнай пераацэнцы мінулага. Магчымасць доступу да раней закрытых фондаў, збораў і матэрыялаў дзейнічала на іх, як дух свабоды на прафесара Плейшнэра ў стужцы «Сямнаццаць імгненняў вясны» [3]. Многія і не заўважылі, як перайшлі рысу, за якой навука перастае існаваць.

Публіцыстыка як форма прадастаўлення інфармацыі заўсёды патрабуе ад навуковай супольнасці адназначных адказаў і высноў. У выніку тыражуецца літаратура, якая адпавядае падобным запытам. Магчымасці інтэрнэта садзейнічаюць узмацненню такіх тэндэнцый. У апошнія гады колькасць прац беларускіх даследчыкаў па гісторыі сялянства, у тым ліку міжваеннага (1921—1939 гг.) перыяду, памяншаецца. Манаграфіі М. А. Бяспалай [4], М. П. Касцюка [5], А. М. Сарокіна [6] з'явіліся, бадай, апошнімі значнымі даследаваннямі праблемы. Пэўны час у асяроддзі гісторыкаў прысутнічала перакананне, што ўсе кропкі над «і» ўжо пастаўлены: бальшавікі перарвалі нармальны ход развіцця Расійскай імперыі. Яны забралі ў сялян усе правы, зямлю, навязалі нежыццяздольныя формы арганізацыі гаспадаркі: камуны, калгасы. Такі падыход не дазволіў пераадолець бачанне гісторыі ў чорна-белым адлюстраванні [7]. «Да сяго часу, — пазначаў А. Р. Бухавец на міжнародным круглым стале "Сялянства і ўлада ў гісторыі Расіі XX ст.", — няма адказу на пытанне: чаму, здавалася б, антысялянская ўлада замацавалася ў сялянскай краіне — і пры гэтым карысталася пэўнай падтрымкай сялянства?» [8, с. 163].

Пры наяўнасці вялікай колькасці публікацый, прысвечаных аналізу каманд-на-адміністрацыйнай сістэмы, недастаткова распрацавана праблема механізмаў і альтэрнатыў яе фарміравання, калектыўных гаспадарак як элементе такой сістэмы. Негатыўныя з'явы прымусовай калектывізацыі нярэдка экстрапалююцца на

калектыўныя формы гаспадарання, утвораныя ў выніку такіх працэсаў. Заўважым: сацыяльныя выдаткі многіх рэформ (Пятра I, прамысловай рэвалюцыі ў Англіі ў дачыненні да сялянства і інш.) з'яўляліся істотнымі, але не заўсёды вызначалі негатыўную ацэнку саміх пераўтварэнняў, іх выніку.

Да пачатку XXI ст. акрэслілася разуменне спецыфікі вывучэння твораў гістарыяграфіі. Вызначэнне С. В. Шмітам паняцця «гістарыяграфічная крыніца» не толькі замацавалася ў гістарычнай літаратуры, але і атрымала новае развіццё [9, с. 112]. У прыватнасці, Г. М. Іпалітаў зрабіў спробу класіфікацыі гістарыяграфічных крыніц, акрэсліў суадносіны паняццяў «гістарыяграфічная крыніца», «гістарыяграфічны факт» і «гістарычны факт» [10]. Гістарыяграфія беларускай вёскі міжваеннага часу, якая ахоплівае перыяд у некалькі дзесяцігоддзяў, уключае вялікую разнастайнасць гістарыяграфічных крыніц: абагульняючыя працы, манаграфіі, спецыяльныя дысертацыйныя даследаванні, навуковыя артыкулы, матэрыялы навуковых канферэнцый і іншых навуковых форумаў, агляды літаратуры і рэцэнзіі. Кожны з гэтых відаў мае сваю спецыфіку, адпаведна вывучэнне пэўнай праблемы павінна адбывацца з улікам наяўнасці вызначанай сістэмы гістарыяграфічных крыніц.

За папярэднія дзесяцігоддзі ў абагульняючых працах, падручніках, дысертацыйных працах і артыкулах неаднаразова рабіліся спробы гістарыяграфічнага вывучэння беларускай вёскі міжваеннага часу. Самымі грунтоўнымі з іх у Беларусі неабходна прызнаць шэраг артыкулаў і манаграфію У. М. Міхнюка [11]. Напрацоўкі, зробленыя ім па дадзенай тэматыцы, у далейшым склалі аснову для аналізу развіцця беларускай савецкай гістарычнай навукі ў цэлым [12]. Уладзімір Мікалаевіч зрабіў спробу сістэмнага вывучэння беларускай савецкай гістарыяграфіі сялянства Беларусі. Дзеля дасягнення гэтай мэты ім быў абраны праблемны прынцып вывучэння. На наш погляд, істотным з'яўляецца вызначэнне не толькі кірункаў, але і пэўных этапаў у вывучэнні гісторыі беларускай савецкай вёскі. Аб'ектам даследавання У. М. Міхнюка сталі працы беларускіх гісторыкаў. Між тым ва ўмовах тагачаснага СССР не толькі сацыяльна-эканамічныя, але і гістарыяграфічныя працэсы былі ўзаемазвязанымі.

Больш за 20 гадоў Савецкі Саюз не існуе на карце свету. За гэты час вырасла пакаленне даследчыкаў, якое не памятае такой дзяржавы, не адчула яе ідэалагічнага ўплыву, якое можа фарміраваць свае ўяўленні толькі па водгуках бацькоў і на аснове навуковых і папулярна-публіцыстычных выданняў. Таму актуальным уяўляецца новае асэнсаванне публікацый па гісторыі савецкай, у тым ліку беларускай, вёскі 1920—30-х гг., а таксама вызначэнне асноўных кірункаў даследаванняў у так званай «перабудовачнай» і постсавецкай гістарычнай літаратуры.

У беларускай гістарыяграфіі вылучаюць тры плыні, сфарміраваныя на мяжы XX—XXI стст.: кансерватыўную, радыкальную і «канструктыўную» [13, с. 221, 222; 14]. Прадстаўнікі кожнай з іх прэтэндуюць на сваю «праўду ў гісторыі». Перавагу можна аддаць тым аўтарам, якія добра ведалі гістарычныя крыніцы, мелі шырокі кругагляд і вялікі жыццёвы вопыт. Адначасова хацелася б падкрэсліць: гісторыя не толькі ствараецца, але і пішацца людзьмі. У спадчыну ад савецкай

гістарыяграфіі мы атрымалі імкненне ствараць пэўную аб'ектыўную карціну мінулага. Між тым кожнае пакаленне гісторыкаў піша «сваю гісторыю», шукае ў мінулым адказы на тыя пытанні, што ставіць ім жыццё. Гісторыя не змяняецца і як навука не знікае разам з чарговым крызісам уяўленняў аб ёй. Змяняецца наш погляд на мінулае. Можам мы пакінуць па-за ўвагай тое, які ўніверсітэт скончыў даследчык, хто аказаў уплыў на яго станаўленне, якія канцэпцыі панавалі ў той час, ідэалогія і г. д.? Ці, забываючыся пра Фрэйда, не браць да ўвагі дзяцінства будучага навукоўца, напрыклад вядомага даследчыка сялянства савецкага часу Мікалая Аляксеевіча Іўніцкага, якога ў маленстве літаральна адрывалі ад стрыечнай сястры падчас раскулачвання? Выпадкова ён раней за многіх іншых савецкіх даследчыкаў пісаў пра хібы калектывізацыі?

Гісторыкі належаць да розных нацыянальных школ, маюць уласны вопыт даследаванняў. У апошняй кнізе, напісанай у 1931 г. у Бутырскай турме, сусветна вядомы вучоны М. Д. Кандрацьеў адзначаў: «...гісторыя літаратуры, гісторыя навукі пераканаўча даказваюць, што кожны мастак і кожны даследчык ёсць дзіця пэўнай эпохі, ёсць спадкаемца мінулага літаратуры і навукі і што ў яго творчасці, у яго прыёмах і выніках заўсёды прысутнічае значная доля незалежнага ад індывідуальнасці» [15, с. 55]. Але гістарычнае вывучэнне ўяўляе сабою працэс пазнання, якое мае свае правілы. Тэрміны, якія выкарыстоўваюцца вучонымі, самі па сабе ўжо гістарычныя, маюць уласную гісторыю. Шматдысцыплінарнасць павялічвае магчымасці гісторыка, «узбройвае» яго больш дасканалым інструментарыем. Пошукі шляхоў да аб'ектыўнасці гістарычнага даследавання не маюць нічога агульнага з манапалізацыяй ісціны адным ці групай даследчыкаў [16].

І ўсё ж калі разважлівая Кліо пераўтвараецца ў сварлівую Ксанціпу, то тыя, хто ведае гісторыю выключна па падручніках, толькі раздражняюцца ад яе супярэчнасцей. У такім выпадку, колькі б мы, падобна вучням Сакрата, не апраўдвалі яе, гісторыя не зможа стаць настаўніцай жыцця. Безумоўна, розныя метадалагічныя падыходы застаюцца. Можна згадзіцца з В. М. Шутавай, што «постмадэрн — гэта аб'ектыўная рэальнасць» [17, с. 34]. «Традыцыйным» гісторыкам не патрэбна спяшацца адкідваць напрацоўкі заходнееўрапейскай гістарыяграфіі і сваіх калег-гуманітарыяў, а прыхільнікі новых школ павінны ўлічваць сваю спадчыну і з павагай ставіцца да папярэднікаў. Вядомы расійскі крыніцазнаўца І. Д. Кавальчанка ў апошнім апублікаваным пры жыцці артыкуле падкрэсліваў, што «характарыстыка сутнасці тых ці іншых грамадскіх адносін на аснове той ці іншай тэорыі заўсёды справядлівая толькі ў пэўных гістарычных граніцах...» і адначасова настойваў на неабходнасці «сінтэзу ідэй і метадаў», а не механічным адкідванні адных і замене іх іншымі [18, с. 457]. Падсумоўваючы свой жыццёвы вопыт, Іван Дзмітрыевіч адзначаў: «Пры вывучэнні грамадска-гістарычнага працэсу ва ўсіх яго праявах у цэнтры ўвагі павінен быць *чалавек*» [18, с. 458]. У гісторыі складана «шукаць праўду» менавіта таму, што ў ёй дзейнічалі людзі са сваімі памкненнямі і інтарэсамі.

Шматколернасць гісторыі традыцыйна дэманструецца дэталёвым даследаваннем сацыяльнай структуры насельніцтва ў сукупнасці ўсіх элементаў, у дынамі-

цы яе развіцця як цэлага. Нярэдкай для гістарыяграфіі з’явай стала тоеснасць «вёска-сялянства». Большасць даследаванняў па аграрнай гісторыі акрэслівае ў якасці аб’екта вёску. У традыцыйным разуменні «вёска» — невялікі населены пункт, жыхары якога займаюцца пераважна сельскай гаспадаркай. Вёска — «сельскае паселішча», у другім значэнні — «сельская мясцовасць або жыхары вёскі, сялянства, вясковае насельніцтва» [19, с. 486]. Да другой паловы XX ст. яна з’яўлялася асноўным тыпам паселішча ў Беларусі, які супрацьпастаўляўся мястэчку і гораду. У «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» пазначана, што тэрмін «вёска» паходзіць ад старажытнаславянскага «вЂсь». Такое ж сцвярджэнне знаходзім у «Этымалагічным слоўніку беларускай мовы», складальнікі якога прыводзяць прыклады адпаведнікаў не толькі ў славянскіх, але і іншых індаеўрапейскіх мовах у сэнсе «дом, жыллё» [20, с. 121]. Але ў «Гістарычным слоўніку беларускай мовы» тэрміна «вёска» мы не сустрэнем. Ён вызначаўся ў часы ВКЛ праз «сяло», зрэдку ўжываўся тэрмін «весь» [21, с. 406; 22, с. 154].

«Сяло» ўвогуле распаўсюджаная назва сельскага паселішча ва ўсходніх славян. Дарэчы, «Село» — украінская ілюстраваная газета для вяскоўцаў, якая была заснавана па ініцыятыве М. Грушэўскага ў 1909 г. у Кіеве. Адпаведна, калі мы хочам падкрэсліць род заняткаў, то ўжываем тэрмін «сяляне» («сельская гаспадарка»). Але з часу распаўсюджвання тэрміна «вёска» ў другой палове XIX—XX ст. ён стаў ужывацца ў больш шырокім сэнсе, ахопліваючы не толькі ўсе віды пастаянных паселішчаў, жыхары якіх займаюцца сельскай гаспадаркай, але і ўвесь комплекс сацыяльна-эканамічных, культурна-бытавых, прыродна-геаграфічных асаблівасцей і ўмоў жыцця [23, с. 136]. Паняцце ж «сяло» часцей вызначала вялікую вёску, адміністрацыйны і гаспадарчы цэнтр для навакольных паселішчаў (у Расійскай імперыі — паселішча з царквой) [24, с. 447]. Насельніцтва вёскі, такім чынам, — і сяляне, і сельскагаспадарчыя рабочыя, і іншыя людзі, якія арганізуюць ці забяспечваюць працу ў галіне сельскай гаспадаркі, палявання, пчалярства, рыбалоўства і г. д. Пры ўсім тым, што ў сярэдзіне 1920-х гг. больш за 90 % вяскоўцаў былі занятыя пераважна ў сельскай гаспадарцы, нельга пакідаць паза ўвагай саматужнікаў, настаўнікаў, аграномаў, а таксама тых, хто быў заняты ў фабрычна-заводскай вытворчасці ці на калгасна-саўгасных прадпрыемствах, на транспарце. Сацыяльная стратыфікацыя насельніцтва вёскі на працягу даследуемага перыяду толькі ўскладнялася.

Нават павярхоўны позірк на гістарычнае поле замежжа дазваляе заўважыць яшчэ адну асаблівасць: амаль татальную распрацоўку матэрыялаў у архівасховішчах і публікацыях. Менавіта ў такіх умовах адбываецца пошук замежнымі навукоўцамі новых ракурсаў даследавання ўжо вядомых, даўно апісаных і вывучаных крыніц. Уключэнне ж гісторыкаў краін былога СССР у навамодныя пошукі адбываецца ва ўмовах, калі істотныя комплексы крыніц па гісторыі мадэрнізацыі вёскі яшчэ не ўведзены ў навуковы зварот. Па-за разглядам беларускіх гісторыкаў застаюцца статыстычныя крыніцы па гісторыі беларускай вёскі міжваеннага часу, а таксама шматлікія публікацыі крыніц па гісторыі сялянства 1920—30-х гг. [25—27].

Узбуйненая БССР (1924 і 1926 гг.), якая тэрытарыяльна акрэслівае межы вывучэння, вызначаецца не толькі падабенствам сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця ў міжваенны перыяд, але і сходнасцю папярэдняга гістарычнага развіцця. Перыяд 1921—1939 гг., мабыць, адзін з самых цікавых для вывучэння з пункту гледжання наяўнасці і рэалізацыі самых розных альтэрнатыў. Ён стварае шырокае поле для кампаратыўных аспектаў. Вельмі цікава прасачыць і развіццё тых ці іншых форм калектывізацыі ў 1920-я і 1930-я гг., спецыфіку іх развіцця ў БССР.

Актуальнасць тэмы акрэсліваецца і недастатковай распрацаванасцю шэрагу тэарэтычных і прыкладных праблем мадэрнізацыі другой паловы 1920-х — пачатку 1950-х гг. у СССР, якую называюць то сталінскай, то савецкай. Нярэдкім з'яўляецца меркаванне аб пераўтварэннях мяжы 1920—30-х гг. як «рэвалюцыі зверху». Тэрмін «мадэрнізацыя» савецкімі гісторыкамі не выкарыстоўваўся. Аднак усе даследчыкі амаль адзінадушныя ў сцвярджэнні, што калектывізацыя перадвызначала кардынальныя і даволі імклівыя змены ва ўсіх сферах жыцця сялянства. Па меркаванні класікаў сацыялогіі, паслядоўнасць падзей не з'яўляецца рэвалюцыяй, калі ў ёй не прысутнічае масавы сацыяльны рух [28, с. 568]. Калі ж гаварыць аб спробах рэформ, то толькі ў дачыненні да новай эканамічнай палітыкі. Дарэчы, на працягу 1920—30-х гг. змяняліся змест і сутнасць паняцця «калектывізацыя».

Працягласць і сістэмнасць пераўтварэнняў падкрэсліваюць звычайна праз ужыванне тэрміна «трансфармацыя», якая разумеецца як «узаемазвязаныя рэвалюцыйныя і эвалюцыйныя змены эканамічных, сацыяльных і палітычных структур грамадства...», уключае акрамя інстытуцыянальна рэгулюемых дзеянняў новыя з'явы ў матывацыі і эканамічных паводзінах, калі змяняюцца не толькі нормы (прававыя і іншыя), але і сацыякультурная, а таксама тэхналагічная структура грамадства [29, с. 12, 13]. Калі дзякуючы працы вядомага сацыёлага А. М. Данілава «Пераходнае грамадства: праблемы сістэмнай трансфармацыі» [30] тэрміналогія трансфармацыі ў беларускай навуковай літаратуры ў пэўнай ступені распрацавана, то паняцце «мадэрнізацыя» ў «Беларускай энцыклапедыі» ў 18 тамах вызначана адным сказам: як «змяненне, удасканаленне, якое адпавядае сучасным патрабаванням», прыводзіцца прыклад «абсталяванне» [23]. У апошняе дзесяцігоддзе з'явіліся працы беларускіх гісторыкаў, дзе з выкарыстаннем тэорыі мадэрнізацыі даследуюцца працэсы, што назіраліся ў беларускай вёсцы на працягу другой паловы XIX — пачатку XX ст. [31, 32]. У якой ступені можна разглядаць пераўтварэнні, што адбываліся ў аграрнай сферы Беларусі 1920—30-х гг. у распаўсюджаным ракурсе пераходу ад традыцыйнага да індустрыяльнага грамадства? Ці супрацьстаяць традыцыі пераўтварэнням і ці мае мадэрнізацыя нейкі ўніверсальны для ўсіх краін характар? Ці трэба разглядаць беларускую вёску 1920—30-х гг. як сістэму стабільную, што імкнулася да раўнавагі, і выкарыстоўваць агульныя сістэмна-структурныя тэорыі (напрыклад, функцыяналізм Т. Парсанса [33, с. 42])? Ці, улічваючы глыбіню і дынаміку трансфармацыйных працэсаў, аддаць перавагу Т. Піірайнену, які лічыў неабходным сканцэнтраваць да-

следчыцкі інтарэс на паўсядзённым жыцці звычайных людзей, выяўленні іх пэўных «стратэгій», якія яны выкарыстоўваюць, каб прыстасавацца да новых умоў жыцця [34]? Адказ на пастаўленыя пытанні патрабуе не толькі адпаведных тэарэтычных распрацовак, але і новага прачытання вядомых крыніц, а таксама звароту да новага факталагічнага матэрыялу. Патрэбна пашырыць поле гістарыяграфіі савецкай вёскі ў міжваенны час, не абмяжоўвацца пошукамі толькі беларускіх вучоных. Пры ўсёй спецыфіцы падзей, што назіраліся ў аграрнай сферы Беларусі, у СССР даследуемага перыяду існавалі і вырашаліся падобныя праблемы, прысутнічалі блізкія па сутнасці кірункі і падыходы ў палітыцы ўлад і адносінах вяскоўцаў да пераўтварэнняў.

Вёска значны час была (і застаецца) носьбітам традыцый, багатай і своеасаблівай культуры. Не вывучаючы сялянства, яго гісторыю, нам будзе складана асэнсаваць сябе як народ, як нацыю.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Верт Н.* Террор и беспорядок. Сталинизм как система / пер. с фр. А. А. Пешкова. М. : Рос. полит. энцикл., 2010. С. 22.

2. *Данилов В. П.* Крестьянская революция в России. 1902—1922. Крестьяне и власть : материалы конф. Москва; Тамбов, 1996. С. 4—23.

3. *Протько Т. С.* Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917–1941 гг.). Мінск : Тесей, 2002. 688 с.

4. *Бяспалая М. А.* Беларуская вёска ў першыя гады нэпа (1921—1923). Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. 253 с. ; *Яна ж.* Эканамічнае і сацыякультурнае развіццё беларускай вёскі ў гады нэпа (1921—1927). Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. 325 с.

5. *Касцюк М. П.* Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мінск : Экаперспектыва, 2000.

6. *Сарокін А. М.* Рэха эпохі крайнасцяў: беларуская вёска: ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917–1990-я гады). Мінск : Права і эканоміка, 2005. 298 с. ; *Сорокин А. Н.* Искушение будущим и уроки прошлого. Белорусская деревня: от Декрета до Кодекса о земле (1917—1990-е годы). Минск : Право и экономика, 2008. 426 с. (Сер. «Гуманитарные науки»).

7. *Ходин С. Н.* Вернуться к цветному изображению: еще раз о наркоме Д. Ф. Прищепове // Полит. собеседник. 1991. № 2. С. 12—15.

8. *Марченя П. А., Разин С. Ю.* Международный круглый стол «Крестьянство и власть в истории России XX века». Ч. 1 // Власть. 2011. № 8. С. 161–171.

9. *Шмидт С. О.* О некоторых общих проблемах истории исторической науки // Методологические и теоретические проблемы истории исторической науки. Калинин, 1980. С. 109—117.

10. *Ипполитов Г. М.* К вопросу о синергетическом подходе в исторических и историографических исследованиях // Изв. Самар. науч. центра Рос. акад. наук. 2010. Т. 12. № 2. С. 207—216 ; *Он же.* Классификация источников в проблемно-тематических историографических исследованиях и некоторые методологические подходы к их анализу // Изв. Самар. науч. центра Рос. акад. наук. 2011. Т. 13. № 3—2. С. 501—509 ; *Он же.* Историографический факт и историографический источник как категории исторической науки: непростая диалектика // Изв. Самар. науч. центра Рос. акад. наук. 2013. Т. 15. № 1.

11. *Михнюк В. Н.* Крестьянство Белоруссии на пути к социализму : историогр. очерк. Минск : Изд-во БГУ. 1979. 183 с.

12. *Михнюк В. Н.* Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919—1941 гг.). Минск, 1985 ; *Он же.* Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919—1941 гг.) : автореф. дис. ... д-ра ист. наук : 07.00.02 / АН БССР, Ин-т истории. Минск, 1987. 45 с.

13. *Козляков В. Е.* Современная историография Беларуси: некоторые тенденции в изучении отечественной истории // Рос. и славян. исследования : науч. сб. / редкол. : А. П. Сальков (отв. ред.) [и др.]. Минск : БГУ, 2009. Вып. 4. 232 с.

14. *Сташкевіч М. С.* Сучасныя даследаванні гісторыі Беларусі: стан, дасягненні і перспектывы // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця : матэрыялы рэсп. навук. канф., Гродна, 3—4 мая 2002 г. : у 4 ч. / пад рэд. П. Крэня [і інш.]. Гродна : ГрДУ, 2003. Ч. 1, 2.

15. *Кондратьев Н. Д.* Основные проблемы экономической статики и динамики: предварительный эскиз / авт. ст. о Кондратьеве и его творчестве Ю. Н. Давыдов, Ю. Б. Кочеврин, В. В. Симонов. М. : Наука, 1991. 576 с. (Сер. «Социологическое наследие»).

16. Международная научная конференция на истфаке МГУ «Может ли история быть объективной» / Л. Байбакова [и др.] // Новая и новейшая история. 2012. № 3. С. 3—40.

17. *Шутова О. М.* Историография и постмодерн: вопрос об идентичности во второй половине XX — начале XXI века. Минск : БГУ, 2008. 279 с.

18. *Ковальченко И. Д.* Сущность и особенности общественно-исторического развития (Заметки о необходимости обновленных подходов) // *Он же*. Методы исторического исследования: Отделение историко-филологических наук. 2-е изд., доп. М. : Наука, 2003. Приложение. С. 454—481.

19. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. Мінск : Беларус. Савец. Энцыкл. імя П. Броўкі, 1977. Т. 1. 608 с.

20. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Т. 2 : В — Вяшчэль / рэд. Г. А. Цыхун. Мінск : Беларус. навука, 1980. 344 с.

21. Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Герасімовіч. 20-е выд. Мінск : БелЭн, 2007. Т. 1 : Абаленскі — Кадэнцыя. 688 с.

22. Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Вып. 3. Вариво — вкупе. Акадэмія навук Беларусі. Інстытут мовазнаўства / склад. А. П. Груцо [і інш.]. Мінск : Навука і тэхніка, 1983.

23. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. Мінск : БелЭн, 1997. Т. 4 : Варанецкі — Гальфстрым. 480 с.

24. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 5. Кн. 1. С — У / рэд. тома М. Р. Суднік. Мінск : Выд-ва Беларус. Сав. Энцыкл. імя П. Броўкі, 1982. 663 с.

25. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927—1939. Документы и материалы : в 5 т. / под ред. В. Данилова, Р. Маннинг, Л. Виолы. М. : РОССПЭН, 2002. Т. 4 : 1934—1936. 1056 с.

26. Советская деревня глазами ВЧК–ОГПУ–НКВД. 1918—1939. Документы и материалы : в 4 т. / под ред. А. Береловича, В. Данилова. М. : РОССПЭН, 2000. Т. 4. 864 с.

27. «Тянут с мужика последние жилы...». Налоговая политика в деревне (1928—1937 гг.) : сб. док. и материалов / сост. : Н. Е. Глущенко [и др.] ; редкол. : Н. А. Ивницкий (отв. ред.) [и др.]. М. : Собрание, 2007. 638 с.

28. *Гидденс Э.* Социология. М. : Эдиториал УРСС, 1999. 704 с.

29. *Кодин М. С.* Теоретико-методологические проблемы социально-экономических и социально-политических преобразований в России в конце XX века. 1990—2000 гг. М. : Наука, 2002. 213 с.

30. *Данилов А. Н.* Переходное общество: проблемы системной трансформации. Минск, 1998. 432 с.

31. *Каханоўскі А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства ў другой палове XIX — пачатку XX ст.: метадалогія і методыка аналізу // Рос. и славян. исследования : науч. сб. / редкол. : А. П. Сальков (отв. ред.) [и др.]. Минск : БГУ, 2009. Вып. 4. С. 44—51.

32. *Токць С.* Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX — першая траціна XX ст. Мінск : Тэхналогія, 2007. 308 с.

33. *Парсонс Т.* О социальных системах / под ред. В. Ф. Чесноковой и С. А. Белановского. М. : Академ. проект, 2002. 832 с.

34. *Piirainen T.* Towards a New Social Order in Russia: Transforming Structures in Everyday Life. University of Helsinki, 1997. 342 c.

# Раздзел 1. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ, КРЫНІЦЫ І МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ

## 1.1. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

Гістарыяграфія мадэрнізацыі беларускай вёскі міжваеннага часу (1921—1939 гг.) налічвае амаль стагоддзе. Першыя працы па яе вывучэнні з'яўляліся па меры разгортвання тых працэсаў, якія кардынальна змянялі сацыяльную структуру вясковага насельніцтва. У 1920-я гг. з навукоўцаў найбольшую публікацыйную актыўнасць выяўлялі прадстаўнікі трох аграрных школ: арганізацыйна-вытворчай (А. В. Чаянаў, А. М. Чэлінцаў, М. П. Макараў), сацыяльна-эканамічнай (ліберальнай) (С. М. Пракаповіч, М. М. Літошанка, М. Д. Кандрацьеў), радыкальнай марксісцкай (У. С. Нямчынаў, М. Л. Крыцман, Юрый Ларын (Міхаіл Аляксандравіч Лур'е)) [1—5]. У гэты час з'яўляюцца публікацыі беларускіх навукоўцаў і практыкаў У. М. Ігнатоўскага, І. А. Кіслякова, Д. Ф. Прышчэпава і інш. [6—10].

Адной з важнейшых тэм вывучэння ў 1920—30-я гг. была тэма зараджэння і развіцця калектыўных форм гаспадарання ў БССР. У гэты час назапашваўся пэўны факталагічны матэрыял, вёўся актыўны пошук шляхоў і форм мадэрнізацыі вёскі. З'яўляецца шэраг артыкулаў і брашур, у якіх вывучаўся быт удзельнікаў кааператыўнага будаўніцтва, вызначаліся першыя поспехі і недахопы дзейнасці савецкіх гаспадарак, выяўляліся перспектывы развіцця асобных галін сельскагаспадарчай вытворчасці ў калгасах. Яны былі напісаны не прафесіяналамі-гісторыкамі, а галоўным чынам партыйнымі і гаспадарчымі работнікамі, супрацоўнікамі кааператыўных устаноў, рэдакцый часопісаў і характарызуюцца вузкай крыніцазнаўчай базай, апісальнасцю, адсутнасцю глыбокага гістарычнага аналізу і гістарычных абагульненняў пастаўленых праблем [11—24].

Аднак на дадзеным этапе з'яўляюцца і больш грунтоўныя даследаванні (А. А. Біцэнка, І. А. Канюкова, А. Х. Мітрафанава) [25—27]. У працах гэтых аўтараў, выкананых пераважна на агульнасаюзным матэрыяле, разглядаліся вытворчая дзейнасць калгасаў, арганізацыя працы і размеркавання ў іх, узаемаадносіны калектываў з кааператыўнымі і дзяржаўнымі ўстановамі, з навакольным сялянскім насельніцтвам. З прычыны спецыфікі вырашаемых задач яны толькі часткова закраналі беларускую праблематыку. М. П. Макараў даследаваў толькі аспекты эканамічнай эфектыўнасці калектыўных гаспадарак БССР у параўнанні з іншымі формамі землекарыстання [28].

З канца 1929 г. распрацоўка пытанняў мадэрнізацыі вёскі папярэдніх гадоў фактычна прыпыняецца. Шырокае распаўсюджанне атрымлівае агітацыйна-прапагандысцкая літаратура, у якой адлюстроўваліся поспехі паказальных калектыўных гаспадарак [29, 30], каментаваліся асобныя пастановы партыі і ўрада. Прысвечаная задачам бягучага дня і выклiканая рэалізуемымі бальшавікамі разгромнымі кампаніямі, гэтая літаратура не змяшчала элементаў навуковага аналізу. Этап з пачатку 1930-х гг. да сярэдзіны 1950-х гг. пераважна характарызуецца спробамі абгрунтаваць высновы, выказаныя І. В. Сталіным у артыкуле «Год вялікага пералому» [31, с. 125, 132].

В. І. Пагудзін у сваім шырокім гістарыяграфічным даследаванні прыводзіць меркаванне на гэты конт В. П. Данілава, згодна з якім літаратура 20—30-х гг. XX ст. мае, па сутнасці, не гістарыяграфічнае, а крыніцазнаўчае значэнне. Аўтар уступае ў палеміку з такой пастаноўкай пытання [32]. В. І. Пагудзін даказвае, што ў тыя гады выходзілі папулярныя і прапагандысцкія артыкулы, брашуры, але былі прадстаўлены і навуковыя працы, заснаваныя на вывучэнні паўсядзённай практыкі, вялікага факталагічнага матэрыялу. Нігілістычныя адносіны да літаратуры мінулых гадоў шкодзяць гістарычнай навуцы. Нярэдка ўзнікаюць сітуацыі, калі робяцца адкрыцці ўжо даўно вядомых рэчаў. Разам з тым маюць месца факты і некрытычнага выкарыстання літаратуры мінулага. Гэты недахоп звязаны перш за ўсё са слабым яе крыніцазнаўчым аналізам.

Даследаванне праблем савецкай мадэрнізацыі вёскі ўзнаўляецца з канца 1940-х — пачатку 1950-х гг. Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе не акрэсліла асобнага этапу ў развіцці гістарыяграфіі беларускай вёскі. Ва ўмовах рэалізацыі планаў суцэльнай калектывізацыі заходніх абласцей БССР пераважала літаратура прапагандысцкага, публіцыстычнага кшталту. Пазначаная сітуацыя паўплывала і на стан дысертацыйных работ. У якасці прыкладу можна прывесці кандыдацкую дысертацыю Г. А. Кірыленкі, якая была выканана ў 1953 г. пад кіраўніцтвам І. С. Краўчанкі па кафедры марксізму-ленінізму БДУ. Дысертант справядліва акцэнтаваў увагу на мабілізацыйных магчымасцях калектыўных форм гаспадарання, якія вызначыліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аднак праца па змесце нагадвала агітацыйны матэрыял. Дысертацыя была абаронена, з канчатковага варыянта аўтарэферата знікла назва «Сталінская калектывізацыя» [33]. У гэты перыяд з’яўляюцца агульнасаюзныя работы і абагульняючыя працы па эканоміцы і гісторыі БССР, дзе закранаюцца асобныя аспекты развіцця калектыўных гаспадарак Савецкай Беларусі ў 1921 — першай палове 1929 г. [34, 35]. Некаторыя звесткі аб калгасах рэспублікі 1920-х гг. прыводзіліся ў кандыдацкіх дысертацыях, абароненых у 1953 г. (І. М. Ігнаценкі, С. Г. Скапцова і інш.) [36, 37].

Новы этап у савецкай гістарыяграфіі беларускай вёскі пачынаецца ў другой палове 1950-х гг. Змены ў грамадска-палітычным жыцці СССР сярэдзіны 1950-х гг. істотна паўплывалі на гістарыяграфічныя працэсы. На месца дэкларатыўна-публіцыстычных прац прыходзіць больш уважлівае вывучэнне крыніц, акрэсліваецца крытычны падыход да стэрэатыпаў, якія склаліся ў папярэднія гады [138]. Савецкія гісторыкі атрымалі магчымасць больш хутка дзяліцца сваімі напрацоў-

камі праз правядзенне ўсесаюзных канферэнцый і выданне часопісаў [39]. Найбольш вядомай і ўплывовай з'явілася такая форма, як Сімпозіум па праблемах аграрнай гісторыі Усходняй Еўропы (у 2008 г. адзначалі яго 50-гадовы юбілей, першае пасяджэнне адбылося ў Латвіі). Сярод арганізатараў і сталых удзельнікаў Сімпозіума — знакамітыя гісторыкі-аграрнікі Віктар Пятровіч Данілаў, Ілля Яўгенавіч Зяленін, Марыя Лукінічна Багдэнка. Дарэчы, Ілля Яўгенавіч і Марыя Лукінічна рыхтавалі для абмеркавання на Сімпозіуме ў 1961 г. гістарыяграфічны агляд асноўных праблем калектывізацыі сельскай гаспадаркі [40].

У другой палове 1950-х — 1960-я гг. пачыналі сваю дзейнасць такія беларускія навукоўцы, як В. А. Мілаванаў, М. Я. Стральцоў, В. А. Нядзелька [41]. В. А. Мілаванаў распрацаваў праблемы зараджэння і развіцця калектыўнага земляробства ў 1917—1920 гг. [42, 43], дынаміку калгаснага будаўніцтва ў Беларусі ў аднаўленчы перыяд [21]. Вынікам яго руплівай працы з'явілася ўстанаўленне папавятовых і паакруговых даных аб колькасці калгасаў і суадносінах розных форм калектыўнай гаспадаркі, выяўленне рэгіянальных асаблівасцей у разгортванні калгаснага будаўніцтва ў 1921—1925 гг. Некаторыя палажэнні і звесткі, прыведзеныя В. А. Мілаванавым, патрабавалі дадатковага вывучэння і ўдакладнення [44].

Перапляценне, цесны ўзаемаўплыў — характэрная рыса нацыянальных школ аграрнай гісторыі савецкага перыяду. І. Я. Зяленін — прадстаўнік так званых «шасцідзясятнікаў». 1960-я гг. у гістарыяграфіі — перыяд, калі больш істотнай стала ўвага да вывучэння крыніц (найперш архіўных), фарміраваліся новыя методыкі вывучэння, пераадольваліся ілюстрацыйнасць і схематызм у адлюстраванні праблемы. Ілля Яўгенавіч — вядомы спецыяліст па гісторыі саўгаснага руху [45—47] — паўплываў на лёс беларускага вучонага Аляксандра Мікалаевіча Сарокіна (навуковы рэдактар яго манаграфіі) [48]. Напрацоўкі, створаныя гісторыкамі СССР напрыканцы 1950-х і ў 1960-я гг., таксама ў кожнай з саюзных рэспублік, сталі штуршком да гістарыяграфічных прац па аграрнай праблематыцы. Адной з першых з'явілася чарговая сумесная праца Марыі Лукінічны Багдэнка і Іллі Яфімавіча Зяленіна. Яны прапанавалі падзяліць працэс савецкай мадэрнізацыі вёскі на тры этапы: падрыхтоўку суцэльнай калектывізацыі (1927—1929), суцэльную калектывізацыю (1929—1933), завяршэнне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі [49, с. 34]. У 1960-я гг. узнавіўся навуковы інтарэс да гісторыі эканамічнай палітыкі пераходнага перыяду, які ўключаў і кааперацыю. Штуршком да актывізацыі вывучэння гаспадарчага механізму нэпа паслужылі пачатыя ў краіне эканамічныя рэформы.

Характарыстыка перыяду другой паловы 1950 — 1960-х гг. будзе няпоўнай, калі не пазначыць ролю такой асобы, як В. П. Данілаў (1925—2004). Віктар Пятровіч належаў да тых пакаленняў, якія вынеслі на сабе цяжар барацьбы з фашызмам. З сярэдзіны 1950-х гг. В. П. Данілаў імкліва ўліваецца ў кагорту самых уплывовых гісторыкаў-аграрнікаў СССР. Ужо ў гэты час ён сцвярджаў, што матэрыяльна-тэхнічныя перадумовы для калектывізацыі сельскай гаспадаркі да мяжы 1920—30-х гг. не былі створаны [50]. Падрыхтаванае пад кіраўніцтвам В. П. Данілава двухтомнае выданне па азначанай праблематыцы так і не пабачыла свет. Па

сведчанні блізкіх да яго асоб, В. П. Данілаў мог нават трапіць у турму, але цяжка захварэў [51]. На пачатку 2012 г. намаганнямі Людмілы Валерыянаўны Даніла-вай убачыў свет двухтомнік выбраных твораў Віктара Пятровіча [52]. У першай частцы апублікаваны артыкулы вучонага з пачатку 1960-х гг., у тым ліку напіса-ныя ім главы з 1-га тома так і не выдадзенай «Гісторыі калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў СССР». На жаль, шмат якія тэксты друкаваліся не па рукапісах, а па адрэдагаваных старых публікацыях. Вядома, што толькі ў другой палове 1970-х гг. В. П. Данілаў змог абараніць дысертацыю, вынікі якой у цэлым былі адлюстра-ваны ў дзвюх манаграфіях [53, 54].

Падзеі ў Чэхаславакіі, працэсы рэсталінізацыі, узмацненне ўвагі да ідэалогіі (якая выключала існаванне іншай думкі, акрамя афіцыйнай) акрэслівалі іншы этап гістарыяграфіі і больш асцярожныя ацэнкі мінулага (1970-я — першая па-лова 1980-х гг.). У гэты перыяд істотна пераважаюць дысертацыі, абароненыя па партыйнай тэматыцы, асабліва ў ВНУ. У манаграфічнай літаратуры большая ўвага надаецца ролі партыі, Саветаў, рабочага класа, развіццю саўгасаў [48, 55—61]. Дарэчы, менавіта ў гэты час з'яўляецца знакамітае выданне гісторыка, вядомага партыйнага дзеяча С. П. Трапезнікава [62], якое на працяглы час стала компасам для тых навукоўцаў, якія імкнуліся сваімі даследаваннямі адпавядаць «генераль-най лініі» партыі. Пэўным выключэннем сталі публікацыі М. П. Касцюка, якія закраналі сферу сацыяльнай псіхалогіі і працоўнай дзейнасці сялянства [63—65].

Публікацыі беларускіх даследчыкаў, прысвечаныя дзейнасці савецкай улады і Камуністычнай партыі па ўзмацненні саюза рабочага класа і працоўнага сялян-ства, па ажыццяўленні сацыялістычных пераўтварэнняў у беларускай вёсцы, пы-танням калгаснага будаўніцтва прысутнічалі і ў гістарыяграфіі 1960-х гг. [66—69]. Умовы ўтварэння і развіцця калектыўных гаспадарак, дынаміка калгаснага будаўніцтва, палітыка дзяржаўных і партыйных органаў знайшлі адлюстраванне ў абагульняючых працах па гісторыі Беларусі [70—75].

Разнастайны фактычны матэрыял па гісторыі калектыўнага земляробства ў БССР змяшчаецца ў шэрагу артыкулаў па аграрнай праблематыцы, якія храна-лагічна ахопліваюць перыяд 1920-х гг. [76—77]. З ліку аўтараў гэтых артыкулаў неабходна адзначыць М. Я. Стральцова, які на XIV сесіі міжрэспубліканскага Сімпозіума па аграрнай гісторыі Усходняй Еўропы (1972 г.) паставіў пад сумнен-не катэгарычную выснову беларускіх гісторыкаў аб пераважным развіцці ў рэс-публіцы сельскагаспадарчых арцеляў у параўнанні з іншымі тыпамі калгасаў [78]. Аргументуючы сваю пазіцыю, М. Я. Стральцоў у апублікаваным у 1979 г. арты-куле [79] звярнуў увагу на высокую ступень абагульнення маёмасці ў калектыў-ных гаспадарках рэспублікі, абумоўленую перавагай у іх складзе бяднейшага на-сельніцтва горада і вёскі. Заслугай аўтара з'явіўся параўнальны аналіз сацыяль-нага складу членаў калгасаў БССР і РСФСР, а таксама ўвядзенне ў навуковы зва-рот нявыкарыстаных раней матэрыялаў Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлен-ня (ЦСУ) і даных Белсельсаюза 1927—1929 гг. Аднак М. Я. Стральцоў не прааналі-заваў змены сутнасных характарыстык гэтых форм калектыўных гаспадарак, не прасачыў умоў іх узнікнення і развіцця на працягу 1920-х гг. Быццам падводзячы

вынік таму, што было зроблена гісторыкамі па дадзенай праблеме да 1979 г., У. М. Міхнюк у гістарыяграфічным нарысе падкрэсліў, што «пытанне аб вядучай форме калгаснага будаўніцтва ў Беларусі застаецца дыскусійным і патрабуе больш грунтоўнага даследавання» [80, с. 150].

У пачатку 1980-х гг. выявілася адставанне беларускіх гісторыкаў у распрацоўцы праблем мадэрнізацыі вёскі. Да гэтага часу былі апублікаваны працы В. П. Данілава, які ўсебакова даследаваў пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця савецкай дакалгаснай вёскі, абагульняючыя работы па гісторыі сацыялістычнага пераўтварэння сельскай гаспадаркі СССР у цэлым [39, 53, 54] і яго ходу ў асобных рэспубліках. У прыватнасці, зараджэнне і разгортванне калгаснага руху ва Украіне асветлены ў манаграфіі А. Ф. Чмыга [81]; В. В. Грышаеў даследаваў гісторыю сельскагаспадарчых камун Расіі ў 1917—1929 гг. [82].

Пазначанае адставанне было пераадолена з выхадам у 1981 г. калектыўнай манаграфіі, падрыхтаванай супрацоўнікамі Інстытута гісторыі АН БССР і Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ М. П. Касцюком, У. А. Палуянам, А. М. Сарокіным, М. Я. Стральцовым і А. А. Філімонавым [83]. У манаграфіі на аснове шырокага кола крыніц прааналізаваны працэс калектывізацыі сялянскіх гаспадарак, паказана фарміраванне калгаснага ладу ў 1929—1939 гг. Аўтары даследавалі змены ў сацыяльнай псіхалогіі сялянства (У. А. Палуян) і матэрыяльны стан калгаснікаў у 1930-я гг. (А. М. Сарокін).

Безумоўна, умовы і час падрыхтоўкі абагульняючых выданняў паўплывалі на іх змест. Такая акалічнасць, у прыватнасці, вызначылася ў 2-м томе «Гісторыі рабочага класа Беларускай ССР», выдадзеным у 1985 г. Адпаведны падыход прысутнічае і ў назвах раздзелаў пазначанага выдання. Галоўным імператывам мэты і зместу выдання з'яўлялася імкненне прадэманстраваць вядучую ролю рабочага класа ў сацыялістычным будаўніцтве. І ўсё ж прафесіяналізм аўтараў шматтомніка (У. Вышынскага і інш.) дазволіў асэнсаваць не толькі значны аб'ём факталагічнага матэрыялу, але і акрэсліць праблемы развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці, забеспячэння яе тэхнікай (высокі яе кошт, сацыяльныя супярэчнасці і інш.) [84, с. 213, 214].

Маладаследаванымі заставаліся пытанні вытворчай дзейнасці калгасаў, арганізацыі працы і размеркавання ў іх, адносіны да калектываў з боку мясцовага сялянства ў 20-я гг. XX ст. Калі аспекты падрыхтоўкі матэрыяльна-тэхнічных перадумоў масавай калектывізацыі ў рэспубліцы закраналіся ў манаграфіі М. П. Касцюка [65], то зусім не вызначаліся адказы на пытанні: у якой ступені розныя слаі сялянства Беларусі былі падрыхтаваны да падобнага пераўтварэння, ці выявілі і ў якой ступені свае перавагі калектыўныя гаспадаркі да 1929 г. і ці былі альтэрнатывы калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР у выглядзе сельскагаспадарчай арцелі? Менавіта гэтыя пытанні выклікалі асобную плынь артыкулаў у перыядычным друку [85—88]. Далейшага аналізу патрабавала пытанне аб утварэнні адміністрацыйна-каманднай сістэмы ў СССР, якое шырока абмяркоўвалася на XXII сесіі Усесаюзнага сімпозіума па вывучэнні праблем аграрнай гісторыі, што адбылася 11—14 кастрычніка 1989 г. у Мінску. Зразумела, што пэўныя элементы

такой сістэмы фарміраваліся непасрэдна ў арганізацыйным кіраўніцтве калгасным будаўніцтвам [89] .

У 1970—80-я гг. даследчыкі сталі надаваць больш увагі пытанням сацыяльнай структуры вёскі. Яны разглядаліся В. П. Данілавым, В. М. Сялунскай, В. Б. Жыромскай, Н. Л. Рагалінай [90—93]. Культурнае будаўніцтва на вёсцы вывучалася расійскім гісторыкам У. А. Казловым і беларускай даследчыцай А. В. Маскоўкінай [94, 95]. Узрасла ўвага гісторыкаў да пытанняў дзейнасці грамады, узаемаадносін сялянства і мясцовых органаў улады, культуры і быту, вольнага часу сялян. Пачалі абмяркоўвацца пытанні пашырэння крыніцазнаўчай базы даследаванняў аграрнай гісторыі, далучэння сацыялагічных абследаванняў, лістоў і ўспамінаў сялян, матэрыялаў перыядычнага друку. Павялічылася ўвага да метадалогіі гістарычнага даследавання. Пад уплывам прац І. Д. Кавальчанкі і Л. І. Бародкіна з'яўляюцца даследаванні з прымяненнем колькасных метадаў [96, 97]. У 1980-х гг. расійскімі даследчыкамі Б. М. Міронавым, А. Г. Бухаўцом, Б. Г. Літваком і інш. была абгрунтавана неабходнасць міждысцыплінарнага вывучэння менталітэту расійскага сялянства [98—100]. З'яўляюцца спецыяльныя працы, прысвечаныя праблемам штодзённасці.

На мяжы XX—XXI стст. з'явіліся працы, якія асэнсоўвалі феномен савецкай гістарыяграфіі [101—103]. Аналізуючы асноўныя напрамкі даследаванняў савецкай вёскі між дзвюма сусветнымі войнамі ў параўнальна-гістарычным і рэгіянальным аспектах, можна не толькі пазначыць тэндэнцыі развіцця беларускай і постсавецкай гістарыяграфіі, асноўныя праблемы, але і пераемнасць вывучэння вёскі 1921—1939 гг., ролю вядучых вучоных-аграрнікаў у захаванні лепшых традыцый аграрнай гісторыі савецкага перыяду. За час існавання СССР было падрыхтавана некалькі пакаленняў высокапрафесійных даследчыкаў. Пры ўсім тым, што яны былі вымушаныя дзейнічаць пад уплывам ідэалагічнага ўціску, савецкіх гісторыкаў характарызуе высокі ўзровень акадэмічнай культуры. Што ж датычыцца беларускай савецкай гістарычнай навукі, то школа гісторыкаў-аграрнікаў — адна з самых знакамітых у СССР. Менавіта гэтыя аўтары, атрымаўшы доступ да новых крыніц і магчымасць больш адкрыта фарміраваць свае канцэпцыі, ужо ў постсавецкі час стварылі новыя значныя працы па гісторыі беларускай вёскі (М. П. Касцюк, А. М. Сарокін і інш.) [104—107].

У апошнія дзесяцігоддзі з'явіліся публікацыі, у якіх даецца спроба асэнсаваць этапы і кірункі ў развіцці гістарыяграфіі савецкай вёскі [108—110]. Нягледзячы на пэўныя разыходжанні ў перыядызацыі, аўтары аднадушна акрэсліваюць асобны постсавецкі перыяд гістарыяграфіі. Заўважна, што працы гісторыкаў мяжы XX і XXI стст., першых дзесяцігоддзяў XXI ст. цесна звязаны з тым этапам савецкай гістарыяграфіі, які называюць «перабудовачным» і які стаў складаным выпрабаваннем для гісторыкаў. Гісторыя імкліва ператваралася ў публіцыстыку, гісторыкі спяшаліся расказаць найхутчэй пра новыя ацэнкі падзей, часам не шукаючы нават новых крыніц для доказу. На пачатку новага, постсавецкага перыяду (1992 г.) савецкія гісторыкі Г. А. Бардзюгоў і У. А. Казлоў у прадмове да сваёй кнігі «Гісторыя і кан'юнктура» пісалі: «Мы так імкліва запаўнялі

“белыя плямы” мінулага, што не заўважылі, як у адзін прыгожы момант засталіся не толькі без “белых плям”, але і без мінулага ўвогуле» [111, с. 3, 4]. Гэты пераходны да сучаснага постсавецкі перыяд гістарыяграфіі ўтрымліваў і станоўчыя напрацоўкі. Па-першае, нават адмоўны вопыт — гэта вопыт. Па-другое, гісторыкі навучыліся не адседжвацца за спінамі палітыкаў, а больш плённа працаваць з публіцыстыкай. Публікацыя артыкула В. П. Данілава ў газеце «Праўда» — яскравы прыклад таго, як можна захаваць навуковасць у публіцыстычных формах выкладання матэрыялу [112]. З другой паловы 1980-х да пачатку 1990-х гг. былі выдадзены зборнікі дакументаў, якія акрэслівалі магчымасць удакладнення раней зробленых высноў і ацэнак [113].

У другой палове 1980-х гг. значную ролю ў дзейнасці гісторыкаў пачалі займаць аб’яднанні, круглыя сталы, міждысцыплінарныя канферэнцыі з удзелам гісторыкаў, сацыёлагаў, філосафаў і іншых спецыялістаў. Істотнай праблемай для айчынных даследчыкаў працягваў заставацца абмежаваны доступ да архіўных матэрыялаў і прац замежных аўтараў, што вызначала шанцы для беларускай гістарыяграфіі пераўтварыцца ў правінцыйную навуку.

Простае супрацьпастаўленне канцэпцый, падыходаў, высноў нам нічога новага не дадае, калі мы не прымаем пад увагу асаблівасці біяграфіі, творчасці гісторыка, умоў і мэт стварэння кожнага навуковага твора. У залежнасці ад асобы гэтыя акалічнасці вызначаюцца ў той альбо іншай ступені. Для маладога гісторыка, не звязанага з папярэднім этапам дзейнасці, апублікаванымі высновамі і ацэнкамі характэрна найчасцей акрэсліць новыя падыходы, канцэпцыі, больш «востра» паставіць пытанні. Прафесійны ж вопыт і папярэднія напрацоўкі часам не дазваляюць сталаму аўтару істотна адыходзіць ад заяўленай пазіцыі, падштурхоўваюць да больш узважаных ацэнак падзей.

На мяжы 1980—90-х гг. вызначыліся кірункі, якія атрымалі развіццё ў постсавецкай гістарыяграфіі, найперш тэма рэпрэсій і раскулачвання. Сярод аўтараў, што змястоўна вывучалі такую праблематыку, патрэбна адзначыць Мікалая Аляксеевіча Іўніцкага — аднаго з найбольш аўтарытэтных даследчыкаў па гісторыі савецкай вёскі. Ён прайшоў складаны жыццёвы і прафесійны шлях. Можна меркаваць, што падзеі дзяцінства, калі быў арыштаваны яго бацька, пакінулі псіхалагічную траўму на ўсё жыццё. Хрушчоўская адліга дала магчымасць абараніць кандыдацкую дысертацыю па крыніцазнаўстве, а ў далейшым — апублікаваць шэраг цікавых прац па калектывізацыі. Асноўным вектарам яго прафесійнай накіраванасці склала раскулачванне. Імкненне паказаць гэты працэс рознабакова прывяло да сутыкнення з С. П. Трапезнікавым, які на той час не толькі лічыўся тэарэтыкам па тэме калектывізацыі, але і загадваў аддзелам навукі і вучэбных устаноў ЦК КПСС. Зразумела, што як толькі з’явілася магчымасць для больш вольнага выказвання сваёй пазіцыі, у 1988 г. М. А. Іўніцкі выдае манаграфію «Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў СССР: вопыт, урокі, высновы» (М., 1988), а ў 1994 г. выходзіць у свет яго знакамітая праца «Калектывізацыя і раскулачванне (пачатак 1930-х гг.)», якая ў 1996 г. была перавыдадзена [114]. Нягледзячы на распаўсюджаны ў 1980—90-я гг. публіцыстычны пафас, манаграфія

М. А. Іўніцкага аб раскулачванні была напісана навуковай (магчыма, нават у стылі 1960—70-х гг.) мовай. Аўтар у гэтым выданні імкнуўся пазбегнуць нейкіх навацый, якія запазычваліся на той час маладымі гісторыкамі ў заходніх сацыёлагаў. Пэўнае адступленне ад такога прынцыпу М. А. Іўніцкі дазволіў сабе ў манаграфіі, якая ўбачыла свет у Таронта (Канада). Да манаграфіі з новай назвай «Рэпрэсіўная палітыка савецкай улады на вёсцы (1928—1933)» прадмову напісаў прафесар універсітэта г. Таронта Лін Віола [115]. У кнізе, прысвечанай светлай памяці бацькоў, М. А. Іўніцкі зрабіў вывад аб тым, што «рэпрэсіі і прымус былі і заставаліся важнейшым метадам будаўніцтва сацыялізму на вёсцы» [115, с. 335].

У другой палове 1980-х — 1990-я гг. з'явіліся працы яшчэ аднаго класіка савецкай аграрнай гістарыяграфіі — М. А. Вылцана [116]. Ён нарадзіўся ў Томскай вобласці, аднак яго бацька Аўгуст Пятровіч — ураджэнец Віцебскай губерні, з латышскіх сялян-перасяленцаў — усё жыццё працаваў сельскім настаўнікам. І ў савецкі час Міхаіла Аўгуставіча разам з Віктарам Пятровічам Данілавым адносілі да так званай «ліберальнай» плыні савецкіх гісторыкаў. Невыпадкова, што ў постсавецкі час М. А. Вылцан у большай ступені імкнуўся сказаць і напісаць аб тым, аб чым раней было нельга [117, 118].

Трагічны лёс сялянства праз трагедыю пэўных асоб, не мог не паўплываць на змест і эмацыянальны фон выдаваемых у 1990-я гг. кніг і брашур па гісторыі беларускай вёскі [119, 120]. Заўважны таксама ўплыў тых дакументаў, доступ да якіх у савецкія гады заставаўся для гісторыкаў толькі марай. Вызначылася імкненне максімальна поўна зафіксаваць гэтыя сведчанні дакументаў [121]. Акрамя таго, ва ўмовах выбару далейшых шляхоў развіцця сельскай гаспадаркі характэрнай з'явай заставалася імкненне знайсці ў мінулым абрысы сучаснага для фермерскіх гаспадарак і інш. [121, с. 13].

Гістарыяграфічны «разлом», што вызначыўся ў цэнтральнай прэсе СССР ужо з сярэдзіны 1980-х гг., стаў трагедыяй не толькі для настаўнікаў гісторыі, якія не ведалі, што спытаць на экзаменах. Гісторыка-публіцыстычны бум і далейшыя працэсы, справакаваныя крушэннем СССР, сфарміравалі сітуацыю ідэйнага крызісу ў падрастаючага пакалення. У выніку, як і пасля рэвалюцыйных падзей пачатку XX ст., увага значнай часткі беларускай інтэлігенцыі, актыўнага носьбіта нацыянальных ідэй, звярнулася да далёкага мінулага і выявілася перш за ўсё ў гераізацыі перыяду ВКЛ [122].

Новыя ўмовы дзейнасці і крыніцы даюць вопытнаму гісторыку магчымасць для ўдакладнення высноў і новых ракурсаў вывучэння праблемы. У 2006 г. у апошняй сваёй манаграфіі І. Я. Зяленін перагледзеў прапанаваную раней перыядызацыю на падставе серыі фундаментальных дакументальных публікацый, першая з якіх была ажыццёўлена на мяжы 1990-х — пачатку 2000-х гг. з яго ўдзелам [124]. Ён адзначаў, што аграрная палітыка бальшавіцкай партыі і савецкай дзяржавы істотна змянялася і ўдакладнялася пад уплывам шматлікіх працэсаў, у прыватнасці барацьбы сялянства — актыўнай ці пасіўнай, і выдзяляў наступныя этапы: канец 1930-х — 1933 г.; 1934—1936 гг.; 1937—1939 гг. Аддаючы належнае светлай памяці В. П. Данілава (04.03.1925—16.04.2004), Ю. А. Палякова (18.10.1921—

27.12.2012), Э. М. Шчагіна (02.03.1933—13.08.2013) і іншым вядомым савецкім даследчыкам, можна адзначыць такую характэрную рысу гэтых вучоных, як дакладная прынцыповасць. Адсутнасць ідэалагічнага ўціску для іх перадвызначыла не ўседазволенасць, а магчымасць стварыць больш асэнсаванае бачанне падзей і з'яў мінулага, адкрыла быццам «другое дыханне».

В. П. Данілаў з'яўляецца адной з постацей, якая аб'ядноўвае «гістарыяграфічны разлом» другой паловы 1980-х — 1990-х гг. За цыкл манаграфій і дакументальных публікацый па гісторыі расійскай вёскі ён у 2004 г. быў узнагароджаны Залатым медалём імя С. М. Салаўёва. В. П. Данілаў — класік «сялязнаўства», яго прозвішча можна ставіць побач з прозвішчам А. В. Чаянава. На працягу больш чым паўстагоддзя ён быў на чале савецкай, а пасля і постсавецкай школы гістарыяграфіі вёскі XX ст. В. П. Данілаў сваю ўвагу засяроджваў найперш на аспектах сацыяльна-эканамічнай гісторыі: у апошнія гады пад уздзеяннем новай «рэвалюцыі зверху» прымаў удзел у канферэнцыях і выступаў па пытаннях узаемастасункаў сялян і ўлады. Яго запаветам як вучонага-гісторыка палітыкам і нашчадкам стала праца «Сялянская рэвалюцыя ў Расіі, 1902—1922». У ёй Віктар Пятровіч імкнуўся пазначыць, што Кастрычніцкая рэвалюцыя ў 1917 г. не была чымсьці наносным, звязаным толькі з дзейнасцю партыі бальшавікоў. Неразуменне сутнасці падзей 1917 г. падштурхнула расійскіх палітыкаў першай паловы 1990-х гг. да «суцэльнай фермерызацыі». Але гісторыя не вучыць, яна толькі карае за няведанне яе ўрокаў.

Па меркаванні В. П. Данілава, нельга пакідаць па-за ўвагай калектывісцкія настроі вёскі, якія ў гістарыяграфіі аграрнай справы вывучаны недастаткова. Дарэчы, ён пазначаў «такі магутны фактар, як абшчынны архетып рускай ментальнасці».

Вывучэнне абшчыны, яе становішча за савецкім часам як іншай формы землекарыстання мае сваю асобную, працяглую гісторыю, якая пачынаецца літаральна з першых гадоў мірнага гаспадарчага будаўніцтва [125—128]. В. П. Данілаў, безумоўна, зрабіў істотны ўклад у даследаванне працэсаў развіцця абшчыны пасля кастрычніка 1917 г. Абшчыну ён вызначаў не толькі як форму сумеснага карыстання зямлёй, але і як грамадскі інстытут, які ажыццяўляў пасрэдніцтва паміж дзяржавай і асобным землекарыстальнікам. В. П. Данілаваў лічыў, што пасля рэвалюцыі змянілася прырода абшчыны, якая ператварылася пры савецкім часе ў пэўную пераходную ступень да калектывізацыі. Аднак пры гэтым яна захавала шмат рудыментаў мінулага часу. Яе кансерватыўнасць так ці інакш вызначылася пры рэалізацыі савецкай аграрнай палітыкі [129—131].

Нельга пакінуць па-за разглядам і працы вядомага аграрніка В. В. Кабанава, у якіх даследаваліся праблемы кааперацыі і абшчыны ў паслярэвалюцыйны час, жыццядзейнасці сельскай абшчыны да пачатку нэпа. У яго работах акцэнтуюцца пытанні дэмакратызацыі абшчыны, уплыву савецкага ўкладу вёскі на станаўленне мясцовых саветаў, удзелу абшчыны ва ўраўняльным пераразмеркаванні зямлі і зборы падаткаў, тых знешніх фактараў, якія паўплывалі на ўзаемаадносіны паміж абшчынай і кааперацыяй [133—136].

Па сутнасці, толькі манаграфія В. Я. Асокінай, падрыхтаваная ў савецкі час, была прысвечана гісторыі паслярэвалюцыйнай абшчыны. Вера Якаўлеўна звярнула ўвагу на імкненне савецкай улады да выкарыстання магчымасцей абшчыны для сумеснага абмеркавання гаспадарчых пытанняў, арганізацыі сялянскай узаемадапамогі. Класавае разуменне працэсу, характэрнае для савецкай гістарыяграфіі, перадвызначыла сцвярджэнне аб немагчымасці эвалюцыі абшчыны ў новых умовах. Недастатковым бачыцца вывучэнне механізму яе дзеяння як фактару стабільнасці на вёсцы [137].

У цэлым, нягледзячы на істотныя напрацоўкі савецкай гістарыяграфіі ў вывучэнні абшчыны як фактару гісторыі савецкай вёскі, многія пытанні засталіся неразгледжанымі. Да іх неабходна аднесці спецыфіку ўзаемаадносін сельскай абшчыны і органаў савецкай улады ў розных рэспубліках СССР, традыцыі і наваныі ў сістэме сацыяльнай абароны на вёсцы.

Пазначаныя аспекты акрэслены ў сучаснай расійскай гістарыяграфіі дзякуючы публікацыям тамбоўскага даследчыка С. А. Есікава, якога многія лічаць не толькі вучнем, але паплечнікам і сябрам В. П. Данілава [138]. Па меркаванні Сяргея Альбертавіча, ідэя «чорнага перадзелу» як галоўнага лозунга сялянскай рэвалюцыі склалася ў расійскай вёсцы праз палітыку расійскага самадзяржаўя. Сяляне імкнуліся стаць уласнікамі зямлі праз абшчыну, без афармлення яе ў прыватную ўласнасць [139, 140].

Каштоўнымі для разумення генезісу эканамічных паводзін і вывучэння сацыяльнай псіхалогіі сялянства з'яўляюцца публікацыі беларускіх вучоных: Л. П. Ліпінскага, В. І. Мялешкі, В. П. Панюціча, У. А. Сосны [141]. Асаблівае значэнне набывае цыкл работ У. Ф. Голубева [142, 143], якому ўдалося даказаць, што грамада ў Беларусі дзейнічала і пасля аграрнай рэформы сярэдзіны XVI ст. Яна змяняла свае функцыі, прыстасоўвалася да новых эканамічных і палітычных умоў [143, с. 289, 290]. Артыкулы Г. І. Маскевіч пазначаюць неабходнасць удакладнення тэрмінаў «абшчына», «сельская грамада», «сялянская грамада» [144, 145].

Вывучэнне гістарычнай свядомасці сялянства, як і іншых сацыяльных груп, з'яўляецца адным са значных аб'ектаў даследаванняў постсавецкіх гісторыкаў. Вялікую цікавасць набываюць даследаванні сацыяльнай памяці расійскага сялянства Ірыны Яўгенаўны Казновай. Яна разглядае сялянскую памяць як узаемадзеянне прасторы і часу і важнейшы фактар фарміравання нацыянальнай самасвядомасці [146—149]. На наш погляд, істотныя зрухі тут магчымы не толькі дзякуючы новым эмпірычным пошукам, новым дакументам, але і на аснове міждысцыплінарнага вывучэння, праз асэнсаванне напрацаванага сацыёлагамі, філосафамі, эканамістамі, філолагамі (выдатным прыкладам сталі працы Наталлі Мікіцічны Казловай) [150, 151]. «Спецыфіка якасных метадаў складаецца з таго, — пісала Н. М. Казлова, — што даследчык мае справу з ідэаграфічным: з індывідуальнай жыццёвай гісторыяй, індывідуальным паведамленнем аб сабе, індывідуальным тэкстам» [152, с. 25].

Цэлы пласт новых падыходаў створаны даследчыкамі ў галіне эканамічных паводзін [153, 154]. Абаронены дысертацыі па ўзаемасувязі індывідуальнага і ка-

лектыўнага, інстытуцыянальных і этнасацыяльных дэтэрмінантаў эканамічных паводзін. Праблема псіхалагічных асноў эканамічных паводзін інтэрпрэтавалася М. Д. Кандрацьевым, Д. М. Кейнсам, іншымі вядомымі вучонымі. У 1994 г. грунтоўную манаграфію па пытаннях сацыяльна-псіхалагічных высноў тэарэтычнай псіхалогіі ў галіне эканамічных паводзін выдаў А. Л. Слабадскі [155]. Але больш абагулена, вызначаючы цікавыя прыклады з расійскай гісторыі, напісаў па гэтай праблематыцы Ю. Я. Альсевіч [156].

Сістэмны падыход, што практыкуе сялянaзнаўства, вымушае большую ўвагу надаваць сацыяльнай псіхалогіі. У апошнія дзесяцігоддзі з'явіўся шэраг фундаментальных прац заходнееўрапейскіх вучоных; сярод іх — публікацыі, ажыццёўленыя пры падтрымцы Інстытута распаўсюджвання інфармацыі па сацыяльных і эканамічных навуках (ІРІСЭН). На наш погляд, істотную ўвагу неабходна звярнуць на кнігу Гельмута Шока «Зайздрасць: тэорыя сацыяльных паводзін». Публікацыя яе ў серыі ІРІСЭН «Сацыялогія» выканана не на аснове першага (што выйшла на нямецкай мове ў 1966 г.), а на падставе другога выдання на англійскай мове (1969 г.). Кніга Гельмута Шока выклікае павагу ўсебаковым, сістэмным падыходам да характарыстыкі з'явы, якую мы разглядаем як звычайную рысу побыту. Аўтар спыняецца не толькі на псіхалагічных характарыстыках чалавека (які зайздросціць), але і выяве зайздрасці ў мове і літаратуры, вывучэнні зайздрасці ў сацыяльных навуках, філасофіі. Гельмут Шок, зразумела, перабольшвае ролю прадмета свайго вывучэння, але разам з тым вельмі дасціпна, на аснове навуковых падыходаў разглядае яе як фактар, які палітыкам, гісторыкам, эканамістам нельга пакідаць па-за ўвагай. Яго назіранні і вывады патрабуюць далейшага асэнсавання на падставе вывучэння крыніц па сацыяльнай псіхалогіі беларускага сялянства 1920—30-х гг. [157]. Той жа сістэмны падыход у вывучэнні сялянства Беларусі міжваеннага часу вымагае неабходнасць прыняць напрацоўкі беларускай этналогіі. Сярод апошніх — энцыклапедычныя даведнікі, шматтомныя выданні, шматлікія артыкулы і манаграфіі. Асобна ў манаграфіях даследаваліся аспекты, акрэсленыя ў 5-м томе шматтомніка «Беларусы» і ў працы Т. У. Валодзінай, прысвечаных вывучэнню рэчавых крыніц [158, 159].

Значная колькасць публікацый, што ўбачылі свет у апошнія гады, прысвечаны пераўтварэнням, якія адбыліся ў тых ці іншых постсавецкіх рэспубліках, рэгіёнах Расійскай Федэрацыі [160—163]. Асабліва заўважнымі з'явіліся манаграфіі Л. М. Мазур і Д. У. Якаўлева. Яны імкнуліся прасачыць рэгіянальныя асаблівасці праз скразное даследаванне змен, якія адбываліся ў першай чвэрці XX ст. [164]. Падобны кантэкст прысутнічае і ў манаграфіі Н. Л. Рагалінай [165]. Такія даследаванні дазваляюць акрэсліць рэакцыю сялянства на змены ў палітыцы савецкай улады на вёсцы, акрэсліць спецыфічныя асаблівасці аграрнага развіцця, грамадска-палітычнай сітуацыі. Асэнсаванне напрацаванага вопыту часам праводзіцца на аснове аналізу савецкай нацыянальнай палітыкі праз эвалюцыю росту нацыянальнай самасвядомасці розных слаёў насельніцтва: інтэлігенцыі, рабочых, сялянства, моладзі і г. д. Уякасці прыкладу можна прывесці манаграфію казахскай даследчыцы Ж. У. Кыдыралінай «Нацыя і гісторыя» [123]. Сярод вы-

ніковых прыкладаў постсавецкай хвалі аграрнай гісторыі ў Беларусі неабходна адзначыць публікацыі М. А. Бяспалай [166, 167]. Пераход Марыі Аркадзьеўны на ніву вывучэння беларускай вёскі адбываўся ва ўмовах татальнага расчаравання грамадства ў спробах рэфарміравання сістэмы, якая прывяла да знікнення з палітычнай карты свету найбуйнейшай дзяржавы. Калі ў сярэдзіне 1980-х — пачатку 1990-х гг. адбывалася пэўная ідэалізацыя нэпа [168—170], то ў другой палове 1990-х гг. новая эканамічная палітыка вывучалася праз прызму незадаволенасці тымі сацыяльнымі стратамі, што прыйшлося несці ў выніку рэалізуемых змен. Прадметам вывучэння М. А. Бяспалай сталі падатковая і зямельная палітыка, культурныя змены на вёсцы. Разглядаючы лозунгі і дзеянні бальшавіцкіх улад з пазіцыі сялянства, Марыя Аркадзьеўна заканамерна пазначыла незадаволенасць вяскоўцаў дэклараванымі, але недастаткова эфектыўнымі мерапрыемствамі. На наш погляд, у сялянства (і не толькі беларускага) прысутнічалі завышаныя чаканні, карані якіх можна шукаць з часоў абвяшчэння Дэкрэта аб зямлі, а магчыма, і крыху раней. М. А. Бяспалая прымусіла аўтараў, звыклых вызначаць новую эканамічную палітыку ў якасці асобнай і пераважна паспяховай, шукаць новыя аргументы [171].

Недастаткова даследаваным у Беларусі аспектам аграрнай гісторыі XX ст. з'яўляецца дэмаграфічная сітуацыя ў беларускай вёсцы. Насельніцтва вёскі, вельмі неаднароднае па сваім сацыяльным складзе, займалася не толькі сельскагаспадарчай працай. Сацыяльныя асаблівасці захаваліся падчас і пасля суцэльнай калектывізацыі. Акрамя сітуацыі, звязанай з дуалізмам калгаснік — індывідуальны гаспадар, фарміраваліся і спецыфічныя сацыяльныя групы. Цікавым у гэтым кірунку ўяўляецца вывучэнне «рабочай арыстакратыі» ў сельскай гаспадарцы. Сельскія механізатары з'яўляліся, па вызначэнні Ш. Фіцпатрык, «блакітнымі каўнерчыкамі» вёскі, некаторыя даследчыкі вызначаюць іх праз тэрмін «рабочая арыстакратыя». Гэты тэрмін быў уведзены ў сярэдзіне XIX ст. Ф. Энгельсам у дачыненні да часткі рабочага класа, якая мела прывілеяванае эканамічнае становішча. Тэрмін ужывалі і У. І. Ленін, і І. В. Сталін, але наяўнасць «рабочай арыстакратыі» ў СССР адмаўлялася. Між тым даследчыкі вёскі адзначаюць, што такія катэгорыі, як трактарысты, камбайнеры, працаўнікі МТС, мелі сацыяльныя і эканамічныя перавагі над астатняй часткай сельскагаспадарчага насельніцтва [172]. Гэтыя сацыяльныя групы ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі засталіся па-за ўвагай. Безумоўна, паўплывала стварэнне МТС першапачаткова ў раённых цэнтрах, своеасаблівая карпаратыўнасць, якая быццам адрывала гэтую частку працаўнікоў вёскі часам нават геаграфічна.

Акрэсліваючы тэндэнцыю да ўзважлівага навуковага падыходу, неабходна пазначыць, што яна ахапіла не ўсе аспекты развіцця міжваеннай вёскі. Тут вельмі важна не схіліцца да «моды», не ісці ўслед за вывадамі, якія паслужліва прапануе публіцыстыка. Старонкі чалавечай трагедыі заўсёды балючыя, эмацыянальныя. Па гэтай (і іншых) прычыне тэма голаду даўно выйшла за межы навуковай дыскусіі і атрымала грамадска-палітычнае гучанне, асабліва ва Украіне і Расіі [173]. У такой сітуацыі наўрад ці можна спадзявацца ў бліжэйшы час на перавагу наву-

ковых падыходаў. Аднак станоўчым бачыцца выданне належным чынам падрыхтаваных навуковых зборнікаў [174]. Заўважна, што гэта патрабуе далейшага вывучэння з'явы голаду ў БССР у 1930-я гг.

На фоне карэннага перагляду гісторыі ўсё ж прысутнічае імкненне паказаць яе пераемнасць і праз гістарыяграфічныя школы. Адным з прыкладаў з'яўляецца выданне калектыўнай манаграфіі «Савецкая спадчына. Адлюстраванне мінулага ў сацыяльна-эканамічных практыках сучаснай Расіі» [175]. Гэта вельмі істотна, паколькі не толькі палітыкі, але і гісторыкі часам забывалі пра тое, што ў гісторыі нічога імгненна не змяняецца. Ёсць глыбінныя працэсы (у свядомасці, псіхалогіі, эканамічных паводзінах), якія захоўваюць пераемнасць паводзін чалавека, нягледзячы на «рэвалюцыйныя» змены.

Асобную групу гістарыяграфічных крыніц складаюць абагульняючыя працы па гісторыі Беларусі. Кожная з іх адлюстроўвала пэўны этап развіцця гістарычнай навукі ў краіне. Да напісання тых ці іншых раздзелаў шматтомнікаў прыцягваліся аўтары, якія мелі істотныя напрацоўкі па вызначанай праблеме. Не стала выключэннем і выданне «Гісторыя Беларусі» (у 6 т.), якое было падрыхтавана пад рэдакцыяй М. П. Касцюка. Том пяты (рэдактарам з'яўляўся М. П. Касцюк) уключыў грунтоўны агляд гісторыі беларускай вёскі ў міжваенны час [176].

Раздзел абагульняючай працы «Стан і шляхі развіцця сельскай гаспадаркі. Роля кааперацыі», падрыхтаваны А. М. Сарокіным, утрымлівае характарыстыку важнейшых працэсаў на вёсцы ў 1920-я гг. А. М. Сарокін зрабіў вывад аб тым, што землезабяспечанасць сялянства не пераўзыходзіла дарэвалюцыйную нават па стане на 1928 г. [177, с. 148]. Стан землеўпарадкавання быў яшчэ горшым, пры гэтым амаль поўнасцю было спынена выдзяленне хутарскіх і дробна-пасялковых гаспадарак [177, с. 149]. Па меркаванні А. М. Сарокіна, практыка, якая спалучалася з абрэзкамі сялянскіх гаспадарак, «абмяжоўвала магчымасці павышэння эфектыўнасці дробнай індывідуальнай гаспадаркі», вяла да росту сацыяльнай напружанасці ў вёсцы, ва ўсім грамадстве. Як лічыць Анатоль Мікалаевіч, падатковая сістэма рэзка звужала магчымасці развіцця заможных гаспадарак, асноўных таваравытворцаў на вёсцы. А. М. Сарокін адзін з самых вядомых гісторыкаў-аграрнікаў Беларусі, прадстаўнік дынамічнай хвалі беларускай гістарыяграфіі 1960-х гг. [178, 179]. Вопыт працы па сінтэзным падыходзе Анатоль Мікалаевіч выкарыстаў у далейшым вывучэнні беларускай вёскі XX ст. [180, 181].

У раздзеле «Адміністрацыйна-камандны шлях развіцця калектывізацыі», падрыхтаваным М. П. Касцюком, звяртаецца ўвага на наяўнасць альтэрнатыўных падыходаў, прапанаваных М. І. Бухарыным, А. І. Рыкавым, вучонымі аграрнікамі М. Д. Кандрацьевым і А. В. Чаянавым. М. П. Касцюк лічыў, што калектывізацыя разгортвалася на аснове адміністрацыйна-камандных метадаў. Ён звяртае ўвагу на тое, што масавая калектывізацыя ў канцы 1929-х — першыя месяцы 1930 г. праходзіла без асноўнага дакумента калгаснага будаўніцтва — прыкладнага статута сельскагаспадарчай арцелі [176, с. 279]. Спецыфіка абагульняючай працы не дазваляла акцэнтаваць дыскусійныя пытанні, дэталізаваць тыя ці іншыя аспекты, але менавіта яна вызначыла падыходы, якімі кіраваліся беларускія гісторыкі і якія не

маглі быць пакінуты па-за ўвагай замежнымі даследчыкамі. М. П. Касцюк, як і А. М. Сарокін, — адзін з вядомых беларускіх спецыялістаў па тэматыцы падрыхтаванага ім раздзела абагульняючай працы [182, 183].

Нельга пакінуць па-за ўвагай і тыя працы, што ахоплівалі вывучаемы перыяд, аднак непасрэдна не былі прысвечаны праблематыцы беларускай вёскі. Яны ствараюць магчымасць (як і працы абагульняючыя) сістэмна падысці да даследуемых аспектаў. У прыватнасці, праца Р. П. Платонава дазваляе прыняць пад увагу ўплыў сацыяльна-палітычных умоў на развіццё тых працэсаў, якія мелі месца ў беларускай вёсцы ў 1921—1939 гг. [184]. Асаблівае значэнне мае прыведзеная ім характарыстыка дзяржаўных дзеячаў Беларусі гэтага часу. Расціслаў Пятровіч быў выдатным знаўцам крыніц, прынятых для вывучэння даследуемых ім працэсаў. Для ўяўлення ўмоў, у якіх адбывалася развіццё беларускай вёскі ў міжваенны час, істотнае значэнне маюць працы С. А. Елізарава, В. А. Круталевіча, У. Ф. Ладысева, М. М. Мязгі, І. Ф. Раманоўскага, М. В. Гудава і інш. [185—189].

Ужо ў савецкі час істотную ролю для вывучэння пазначанай праблемы набылі зборнікі канферэнцый, прысвечаных асобным датам і дзеячам нашай гісторыі. У постсавецкі перыяд колькасць такога кшталту выданняў істотна павялічылася. У сферы вывучэння этнічнага і сацыяльнага складу насельніцтва заўважным з'явілася выданне «Гомельшчына шматнацыянальная (1920—30-я гг.)», якое ажыццяўлялася ў некалькі выпускаў з 1999 г. [190, 191]. Да другой паловы 1990-х гг. беларуская гістарыяграфія выразна спазнялася ў вывучэнні аспектаў развіцця нацыянальных меншасцей. Напрыканцы XX ст. здзейснілася не толькі абарона шэрагу кандыдацкіх, доктарскіх дысертацый, але і выданне артыкулаў, манаграфій, тэматычных зборнікаў [92]. У прадмове да выдання аўтары адзначылі, што «ў навуковых адносінах у сённяшні час у Беларусі ажыццяўляецца комплексны падыход да вывучэння мінулага і сучаснага нацыянальных меншасцей» [190, с. 4].

У расійскай, украінскай гістарыяграфіі даследаванне нацыянальнах меншасцей адбывалася часам па-за кантэкстам той палітыкі, якая ўздзейнічала на ўсіх жыхароў тагачаснага СССР. Стваралася ўяўленне аб выключнасці сітуацыі ў дачыненні да той ці іншай нацыянальнай меншасці [193]. Важнай характарыстыкай выдання «Гомельшчына шматнацыянальная» з'явілася шырокае выкарыстанне не ўведзеных раней у навуковы зварот матэрыялаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, наяўнасць шматлікіх інфармацыйна насычаных дадаткаў.

На мяжы XX—XXI стст. толькі ў Расіі фарміруецца некалькі цэнтраў вывучэння гісторыі сялянства. Захаваў і выконвае важнейшую ролю для абмену думкамі вучоных розных краін Сімпозіум па аграрнай гісторыі Усходняй Еўропы (адбылося 33 яго сесіі, пачынаючы з 1958 г.) [194]. У 1990-я гг. актыўна пачаў дзейнічаць тэарэтычны семінар «Сучасныя канцэпцыі аграрнага развіцця» (В. П. Данілаў, І. Я. Зяленін, В. У. Бабашкін і інш.), склаліся яшчэ некалькі цэнтраў вывучэння сялянства: Цэнтр гуманітарных даследаванняў у Інстытуце філасофіі РАН (І. Я. Казнова, С. А. Нікольскі), Інтэрцэнтр (Т. Шанін, Т. І. Заслаўская).

Працэсы савецкай мадэрнізацыі вёскі, у тым ліку беларускай міжваеннага перыяду, не засталіся па-за разглядам англамоўнай гістарыяграфіі. Безумоўна, прад-

стаўнікам іншай традыцыі і культуры было складана асэнсаваць і глыбока даследаваць тыя працэсы, што разгортваліся на вёсцы ў супярэчлівыя 1920—30-я гг. Разам з тым, як і замежныя падарожнікі ў той ці іншы час, яны складалі новы, свежы позірк на гэтыя аспекты, прапаноўвалі новыя канцэпцыі і падыходы. Апошнія настолькі захапілі частку айчынных гісторыкаў, што адцягнулі ўвагу даследчыкаў ад самастойнай працы ў архівах і фарміравання свайго ўласнага погляду на праблему. Да нядаўняга часу гістарыяграфія савецкай, у тым ліку беларускай савецкай вёскі 1920—30-х гг., заставалася ў цені саветалагічнага характару англамоўных прац, карані якіх зыходзяць з далёкіх 1920—30-х гг. Першыя замежныя публікацыі навуковага характару з'явіліся ў 1960-я гг., калі пэўныя палітычныя падзеі ў СССР далі спадзяванне на прыпыненне халоднай вайны. Сярод іх выдзялялася манаграфія Машэ (Міхаіла Львовіча) Левіна «Расійскія сяляне і Савецкая ўлада», якая ўпершыню была апублікавана на французскай мове ў Парыжы, а постсавецкаму чытачу стала вядомай дзякуючы публікацыі ў часопісе «Айчынная гісторыя» [195].

Радыкальныя змены ў саветалогіі, крытыка прыхільнікаў «таталітарнай канцэпцыі», кароткачасовая хрушчоўская адліга заставілі пераасэнсаваць працы заходнееўрапейскіх аўтараў савецкімі гісторыкамі. Спробу аналізу тагачаснай немарксісцкай гістарычнай думкі ў Вялікабрытаніі прадпрыняў А. М. Нейман [196]. Грунтоўнае вывучэнне саветалагічных цэнтраў у ЗША і асноўных канцэпцый саветалогіі (з выкарыстаннем традыцыйнай для тагачаснай савецкай гістарыяграфіі тэрміналогіі) праведзена Б. І. Марушкіным [197]. «Пахаладанне» грамадска-палітычнай сітуацыі ў СССР паўздзейнічала на ступень навуковай крытыкі савецкімі аўтарамі заходнееўрапейскіх і паўночнаамерыканскіх публікацый.

«Перабудова» ў СССР пазначыла не толькі новы этап у развіцці Савецкай краіны, але і падштурхнула гісторыкаў да больш плённай навуковай і публіцыстычнай дзейнасці. Амаль аднachасова з Уолтэрам Лакерам, вядомым гісторыкам-публіцыстам, які разгледзеў заходнюю гістарыяграфію Кастрычніцкай рэвалюцыі [198], выдаў сваю кнігу Стывен Коэн. Яго «пераасэнсаванне савецкага вопыту» дало пачатак шматгадовай дыскусіі ў заходнееўрапейскай і амерыканскай гістарыяграфіі, якая доўжыцца, па сутнасці, да сённяшняга дня.

Савецкая гістарыяграфія з сярэдзіны 1980-х да сярэдзіны 1990-х гг. прайшла шлях ад поўнага яднання з такога кшталту падыходамі да іх непрыняцця і даволі негатыўных ацэнак «дасягненняў» заходнееўрапейскіх, англамоўных выданняў [199, 200]. На мяжы XX—XXI стст. з'яўляецца шмат артыкулаў А. А. Някрасава і В. І. Менькоўскага, якія завяршыліся абаронай адпаведна кандыдацкай (2001) і доктарскай (2002) дысертацый. У выніку сучасная беларуская гістарыяграфія прадстаўлена не толькі артыкуламі, але і шэрагам манаграфій прафесара БДУ В. І. Менькоўскага (а таксама з яго ўдзелам) [201]. Аб'ектам вывучэння В. І. Менькоўскага з'явіліся працы англа-амерыканскіх гісторыкаў і палітолагаў. Вызначэнне «англа-амерыканская» супольнасць уключае не толькі ўласна Вялікабрытанію, ЗША, але і Аўстралію, Канаду. Па-іншаму аб'ект вывучэння можна было б акрэсліць як «англа-амерыканская саветалогія», паколькі тэрмін

«саветалогія» атрымаў шырокае распаўсюджанне ў англа-амерыканскай гістарыяграфіі яшчэ ў 1960-я гг. Беларусь, яе гісторыя і культура не былі для саветолагаў чымсьці абасобленым, цікавым для вывучэння, а адзначалася толькі ў кантэксце падзей у СССР. У пераважнай частцы прац 1960—80-х гг. замест назвы дзяржавы «СССР» ужывалася «Савецкая Расія». Выключэннем з'яўляліся толькі працы беларускіх эмігрантаў, якія нярэдка пісаліся на беларускай мове.

Аўтары англамоўных публікацый 1960—80-х гг. канцэнтравалі ўвагу на сталінізме, на асобе І. В. Сталіна. У савецкай літаратуры тэрмін «сталінізм» фарміруецца шмат пазней. Г. А. Бардзюгоў і В. А. Казлоў сведчаць, што ён загучаў толькі ў 1987 г. і выклікаў адмоўныя эмоцыі; палітыкі і грамадазнаўцы лічылі яго «не нашым» [111]. Але ўжо на мяжы 1980—90-х гг. савецкая гістарыяграфія налічвала такую колькасць публікацый, што Г. А. Бардзюгоў і В. А. Казлоў назвалі трэці раздзел сваёй кнігі («История и конъюнктура») «Сталініяда» [111, с. 137—236]. Публікацыі па 1920—30-х гг. у так званы «перабудовачны» перыяд адбываліся не без уплыву замежнай саветалогіі. Таму даследаванні В. І. Менькоўскага і іншых аўтараў маюць выключнае значэнне не толькі для знаёмства з пунктам гледжання англа-амерыканскіх даследчыкаў, але і для разумення тых працэсаў, якія адбываліся ў постсавецкай гістарыяграфіі, і ўвогуле для вывучэння гістарычнай свядомасці сучаснага грамадства.

Вывучаючы таталітарную парадыгму англа-амерыканскай саветалогіі, В. І. Менькоўскі адзначае, што для яе разумення неабходна даследаваць не толькі мір ідэй і слоў, але і вызначыць узаемасувязь гісторыі і палітыкі [201, с. 33]. Урад ЗША з другой паловы 1940-х гг. падштурхоўваў да вывучэння гісторыі Савецкага Саюза, рускай мовы. Істотны ўплыў для развіцця саветалагічных даследаванняў мела і наяўнасць эмігрантаў з СССР і Усходняй Еўропы. Сумесная праца В. І. Менькоўскага, К. Уль і М. А. Шабасавай, якая выйшла з друку ў 2013 г., факусіруе ўвагу на 1930-х гг. Аўтары больш падрабязна спыняюцца не толькі на «класічнай» таталітарнай мадэлі і яе мадыфікацыях, але і заходнім рэвізіянізме.

Для разумення сучасных тэндэнцый гістарыяграфіі істотнае значэнне мае характарыстыка сацыяльнай гісторыі. Прыхільнікі класічнай таталітарнай мадэлі не разглядалі грамадства як актыўны элемент гісторыі СССР. Змяніўшыя пакаленне сацыёлагаў англамоўныя гісторыкі 1970-х гг. звярнуліся да архіваў, але накіраванасць іх даследаванняў засталася такой жа. Пачала фарміравацца незадаволенасць напрацаваным матэрыялам і пошук новых ракурсаў вывучэння. Працэсы, што адбываліся ў СССР у сярэдзіне 1980-х гг., актывізавалі такія даследаванні і дыскусіі. Рэвізіяністы, аснову якіх склала новая генерацыя гісторыкаў (С. Коэн, М. Левін, Ш. Фіцпатрык і інш.), не прымаючы таталітарную мадэль і адмаўляючы пераемнасць паміж ленінскім і сталінскім перыядамі савецкай гісторыі, вызначалі наяўнасць розных альтэрнатыў у развіцці СССР 1920—30-х гг. «Новая кагорта» сацыяльных гісторыкаў у манаграфіі В. І. Менькоўскага, К. Уль і М. А. Шабасавай даследуецца даволі падрабязна. Аднак гісторыя сялянства, замежная гістарыяграфія савецкай вёскі 1920—30-х гг. не выдзяляецца з агульнага кантэксту вывучэння [202].

У гэтым кірунку большую цікавасць уяўляе выступленне В. І. Менькоўскага на сімпозіуме ў Волагдзе ў 2008 г. [203, с. 95—97]. Аналізуючы апошнія працы Ш. Фіцпатрык, ён справядліва сцвярджае, што без прац гэтай даследчыцы немагчыма ўявіць сусветную гістарыяграфію савецкай гісторыі. Шэйла Фіцпатрык — амерыканскі гісторык з аўстралійскімі каранямі: ступень бакалаўра атрымала ў Мельбурне, доктарскую дысертацыю абараняла ў Оксфардзе. Выключная частка яе прац прысвечана перыяду 1920—30-х гг.: ад пытанняў адукацыі і сацыяльнай мабільнасці да вывучэння гісторыі сялянства, паўсядзённасці ў СССР (дарэчы, яна часцей ужывае не «савецкія сяляне», а «сталінскія», не «СССР», а «Савецкая Расія»). Шэйла Фіцпатрык — гісторык сталінізму, пачынала як гісторык культуры. Яе кнігі аб Наркамасветы і А. В. Луначарскім сталі класікай інстытуцыяльнай гісторыі савецкай культуры. Адна з апошніх манаграфій — «Зрывайце маскі! Ідэнтычнасць і самазванства ў Расіі XX ст.» — па меркаванні шэрагу даследчыкаў, адна з самых цікавых прац па гісторыі сталінізму. У цэнтры — праблема ідэнтычнасці, дзеля чаго прыцягваецца шырокі пласт спецыфічных апавядальных крыніц: ад біяграфій і аўтабіяграфій да просьбаў і паклёпаў. Імкненне зарэтушаваць у біяграфіях і аўтабіяграфіях небяспечнае фарміравала фенатып савецкага чалавека. І наадварот, фарміравалася катэгорыя людзей, якія імкнуліся адкрыць не сваё «я» ў звычайным сэнсе слова, а зручнае для сябе «я». У гэтым Ш. Фіцпатрык бачыць папулярнасць персанажа А. Бендэра, якога суправаджаюць часам яшчэ больш экзальтаваныя асобы [204, с. 166].

Адной з класічных прац па сацыяльнай гісторыі сялянства лічыцца праца Шэйлы Фіцпатрык «Сталінскія сяляне. Сацыяльная гісторыя Савецкай Расіі ў 30-я гады: вёска». У гэтым выданні яна ахапіла шырокае кола пытанняў: характарыстыку розных сацыяльных груп і канфліктаў, уладных структур на вёсцы, адносін сялян да ўлады, аспекты сацыяльнай псіхалогіі. Пастаноўка шэрагу праблем і іх раскрыццё былі новымі на мяжы XX і XXI стст. (да прыкладу — новая сацыяльная структура вёскі) [205, с. 159—162]. Аднак многія падзеі рэчаіснасці для Ш. Фіцпатрык як прадстаўніцы іншай культуры не былі зразумелымі. Са значным недаверам яна адносіцца да многіх станоўчых з'яў у СССР, да прыкладу стаханаўскага руху, змен у статусе жанчыны. СССР для Ш. Фіцпатрык — Савецкая Расія, што ўскладніла для яе вызначэнне прычын і вынікаў асобных падзей і з'яў у розных рэгіёнах СССР. Заняткі гандлем як несялянская справа на тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага пакідаюцца ёю без каментарыяў. Пры гэтым даследчыца слушна пазначае, што «класавая» прыналежнасць сялян вызначалася не толькі рэальным эканамічным становішчам, але і гістарычнай памяццю [205, с. 43]. Шматколернасць гісторыі ў бачанні Ш. Фіцпатрык памяншаецца спрошчанай характарыстыкай калектыўных гаспадарак у 1920-я гг. як выключна нежыццяздольных.

Істотную дынаміку сацыяльная гісторыя набыла з 1990-х гг. Напрацоўкі першай паловы 1990-х гг., магчымасці кампаратыўнага вывучэння дазволілі правесці за чатыры гады тры агульнаеўрапейскія канферэнцыі (1996, 1998, 2000). Іх асаблівасцю з'явілася адсутнасць пленарных пасяджэнняў і шматстайнасць кірункаў

і даследаванняў. Аднак заўважна, што на секцыі, прысвечанай вясковай гісторыі, і колькасць выступоўцаў, і навізна вывадаў саступалі іншым складаючым канферэнцый па сацыяльнай гісторыі. Гэта дазваляе зрабіць вывад аб тым, што ў сярэдзіне — другой палове 1990-х гг. цікавасць да аграрнай праблематыкі знізілася не толькі ў Беларусі.

Між тым Расію, Украіну ў 1990-я гг. захліснула хваля новых даследаванняў па гісторыі вёскі. Яны ажыццяўляліся на аснове выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі. Гэта дазволіла надаць новы подых эканамічнай гісторыі, прыўнесці новыя аргументы [206—208]. З 1998 г. па ініцыятыве групы гісторыкаў Расійскай акадэміі навук і МДУ выходзіць у свет штогоднік «Сацыяльная гісторыя» (пад рэд. К. М. Андэрсана і Л. І. Бародкіна) [209]. Побач са словам «крызіс» на старонках навуковых і гісторыка-публіцыстычных выданняў папулярнасць набылі словазлучэнні «лінгвістычны паварот», «постмадэрнісцкі выклік». Увага да ўмоў з'яўлення крыніцы, іх уплыву на змест гістарычнага нарратыву — з'ява сучаснай гістарыяграфіі. Гэта перадвызначае цікавасць да сінтэзу такіх спецыяльных гістарычных дысцыплін, як археаграфія, архівазнаўства, крыніцазнаўства, гістарыяграфія; да разумення таго, што ніякая (палітычная, эканамічная, сацыяльная) гісторыя не можа быць вызначана па-за кантэкстам культурнай і інтэлектуальнай сферы.

Больш за дваццаць пяць гадоў вывучае савецкую гісторыю М. Верт. Можна вызначыць два этапы яго дзейнасці. Першы — гэта стварэнне фундаментальнай абагульняючай працы, якая для цэлага пакалення расійскіх навукоўцаў стала настольнай кнігай ва ўмовах крызісу айчыннай гістарыяграфіі. Штуршком да наступнага этапу з'явілася сумесная праца з расійскімі даследчыкамі пад кіраўніцтвам В. П. Данілава па падрыхтоўцы двух значных і па аб'ёме, і па ўплыве на далейшае развіццё даследаванняў па аграрнай гісторыі савецкага грамадства 1921—1939 гг. [209]. Доступ да гэтых дакументаў, па сведчанні самога М. Верта, дапамог удакладніць шэраг гіпотэз, акрэсленых у кнізе «Паўсядзённае жыццё савецкіх сялян ад рэвалюцыі да калектывізацыі», у прыватнасці аб істотнай аўтаномнасці вёскі, сялянства ад рэжыму. У новай кнізе «Тэрор і беспарадак. Сталінізм як сістэма» (2010) М. Верт акцэнтуе ўвагу на вывучэнні гістарычных крыніц, на разуменні тых умоў (сацыяльных, псіхалагічных, эканамічных, палітычных), у якіх яны фарміраваліся. Выданне прадстаўляе некалькі артыкулаў. Аўтар імкнецца пераадолець састарэлы (з яго пункту гледжання) водападзел паміж «таталітарнай» і рэвізіяніcцкай школамі, пазначае, што аснову дзяржаўнага прымусу, акрамя ідэалогіі, складала добра ўсвядомленае разуменне хісткасці сістэмы ва ўмовах наяўнасці дрэнна кіруемых грамадскіх груп і складанасцей кадравай палітыкі, комплекс турботы, перадвызначаны рэальнымі цяжкасцямі ва ўстаноўленым кантролі над гэтым «грамадствам зыбучых пяскоў» [210, с. 9].

Выключнай з'явай мяжы XX і XXI стст. з'явілася публікацыя крыніц, якую некаторыя даследчыкі пазначылі як «архіўная рэвалюцыя». У «заходняй» саветалогіі доступ да новай інфармацыі прывёў да рэвізіянізму папярэдніх поглядаў: усё часцей прысутнічае акцэнт не толькі на рэпрэсіях, асобах і сталінскіх пераўтварэннях, пададзеных у традыцыйных схемах. Заходнееўрапейскія гісторыкі

звяртаюць увагу на паўсядзённасць, на плынь жыцця ў тагачасным СССР, заўважаючы, што савецкія людзі ў 1920—30-я гг. хадзілі ў кіно, кахалі, нараджалі дзяцей і былі шчаслівымі. Да прыкладу, калектывізацыя ў СССР вызначалася раней выключна змрочнымі фарбамі. У даследаванні Джона Кіпа звяртаецца ўвага на публікацыі з іншым кантэкстам і асэнсаваннем падзей. Мэры Баклі ў сваёй манаграфіі піша аб жанчынах-стаханаўках, аб тым, што калектывізацыя на вёсцы падштурхнула жанчын да больш актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці. Яна нават бачыць пэўны «гендарны выклік сталінізму» ў гэтым працэсе і пазначае, што не віна гэтых жанчын у тым, што не здолелі «пазбавіць вёску ад усіх несправядлівасцей і памылак» [211, с. 90].

Радыкальныя змены, якія адбываліся ў савецкай вёсцы, спробы рэфармавання «зверху» ва ўмовах адміністрацыйна-загаднай сістэмы выклікаюць усё большую цікавасць у краінах Усходу (Кітаі, Індыі і інш.). Частка гэтых даследаванняў стала асновай для шэрагу дысертацый. У прыватнасці, кітайскі даследчык Хон Вун Хо прысвяціў сваю працу вызначэнню прычын і фактараў ліквідацыі механізмаў нэпа ў расійскай вёсцы 1922—1929 гг. [212, 213]. Па яго меркаванні, нэп выяўляў сістэму супярэчнасцей, якая склалася ў 1920-я гг. у СССР: сацыяльнай структуры сялянства, спадзяванняў розных груп сялянства, паміж горадам і вёскай. Прымаючы шматстайнасць форм гаспадарання, сялянства чакала з'яўлення моцнага лідара, здольнага прыгожа пераканаць і даць указанні на тое, што неабходна зрабіць. У такіх умовах узнікае ідэалізацыя новых форм гаспадарання бядняцкімі слаямі вёскі. Серадняцка-заможная частка сялянства не змагла выступіць адзіным фронтам супраць адміністрацыйна-рэпрэсіўнага апарату.

Увагу да гісторыі савецкай вёскі перыяду 1920—30-х гг. праяўляюць і японскія даследчыкі. Складанасці з перакладам перадвызначылі тое, што іх распрацоўкі і публікацыі малавядомыя еўрапейскім гісторыкам, таму важнае значэнне мела ініцыяваная цэнтрам міжнароднага даследавання японскай эканомікі (CIRJE) пры эканамічным факультэце ўніверсітэта Токіа канферэнцыя, на якой выступілі расійскія вучоныя (І. Я. Казнова, Г. Я. Карнілаў, В. В. Кандрашын) і японскія навукоўцы (Хірасі Акуда, Нарыякі Мацуі, Каіці Нобэ). Цікавасць для супастаўлення пунктаў гледжання на праблему мела рэцэнзія Сіньіці Кадзікаву на працу Віктара Віктаравіча Кандрашына, прысвечаную тэме голаду 1932—1933 гг. [214]. Нягледзячы на невялікае кола праблем для абмеркавання і абмежаваную колькасць удзельнікаў, канферэнцыя, безумоўна, садзейнічала павелічэнню цікавасці да пазначанай праблематыкі [115, 216].

Публікацыі новых крыніц, пашырэнне магчымасцей працы для замежных даследчыкаў у архівах падштурхнулі найбольш прафесійную іх частку да «спецыялізацыі» ці «рэгіяналізацыі». Да прыкладу, Мікаля Верт у большай ступені акцэнтуе ўвагу на падзеях ва ўкраінскай вёсцы. У 1990-я гг. выяўляецца цікавасць замежных даследчыкаў і да гісторыі беларускага сялянства. Найбольш плённым вынікам з'явілася праца па вывучэнні вёскі Савецкай Беларусі ў міжваенны час Дзіяны Зіберт, якая некалькі гадоў даследавала матэрыялы ў беларускіх архівах, мела дыскусіі з беларускімі вучонымі. Ужо ў 1990 г. у Кёльнскім універсітэце яна

выканала працу, прысвечаную аналізу эканомікі сельскай гаспадаркі ў польскай і савецкай частках беларускага Палесся (1921—1939) [217]. Кампаратыўнае вывучэнне паглыблялася на аснове гісторыка-генетычнага метаду. Даследаванне Д. Зіберт уключала гісторыю Палесся, сялянскай эканомікі да 1914 г. (прыродная тэрыторыя Палесся, сацыяльныя, нацыянальныя і царкоўныя ўзаемаадносіны, структура сельскай гаспадаркі, матэрыяльнае становішча сялян, працэсы меліярацыі і інш.). Яе даследчыцкая дзейнасць у Беларусі акрэслілася першай паловай 1990-х гг., таму Д. Зіберт адчула не толькі павелічэнне цікавасці да праблематыкі альтэрнатыўнасці гістарычнага развіцця, але і тое «гістарыяграфічнае раздарожжа», што фарміравалася ў постсавецкіх гісторыкаў у дачыненні да мінулага сваёй краіны.

У 1997 г. Д. Зіберт абараніла дысертацыю ў Кёльнскім універсітэце. Яе дысертацыйнае даследаванне ахоплівае перыяд з 1921 па 1941 г. і прысвечана «стратэгіі» паўсядзённага сялянскага жыцця ў Беларускай ССР, разбурэнню патрыярхальнай эканомікі сям'і. Праца складаецца з шасці раздзелаў, якія ахопліваюць аспекты ад палітычнай гісторыі БССР (1917—1939) з улікам аграрнай палітыкі да дэмаграфічнай сітуацыі ў БССР і штодзённага жыцця сялян, арганізацыі працы і размеркавання яе вынікаў [218]. Праз год у выдавецтве Франца Штайнера ў Штутгарце ў серыі «Крыніцы і даследаванні па гісторыі Усходняй Еўропы» Дзіяна Зіберт выдала кнігу «Стратэгіі паўсядзённага жыцця ў Беларускай ССР (1921—1941)» (т. 52) [219]. У анатацыі да выдання С. Я. Новікаў пазначае, што сярод 52 манаграфічных прац, якія былі падрыхтаваны за апошнія трыццаць гадоў у рамках дзейнасці Аб'яднання ўсходнееўрапейскіх гісторыкаў Нямеччыны, толькі кніга Зіберт прысвечана гісторыі Беларусі [219].

На сучасным этапе механізм уплыву гістарыяграфіі на сацыяльную свядомасць грамадства становіцца ўсё больш складаным, аднак ён захоўваецца, больш таго — дзякуючы новым інфармацыйным тэхналогіям і публіцыстычным формам, — узрастае. Важнейшы элемент сацыяльнай свядомасці — гістарычная памяць народа, якая забяспечвае захаванне яго традыцый і з'яўляецца адным з фактараў стабільнасці грамадства. Вывучэнне яе магчыма не толькі на аснове манаграфій і артыкулаў, але і па тых адносінах да мінулага, якія склаліся ў грамадстве. Гістарычная памяць выяўляецца ў побыце, звычках і факусіруе свядомасць аб мінулым праз сучаснасць і чакаемую будучыню. Адна са спецыфічных масавых крыніц інфармацыі сёння — інтэрнэт, уважлівае вывучэнне якога дазваляе ўбачыць калі не заканамернасці, то тэндэнцыі фарміравання грамадскай свядомасці. Звесткі, з якімі мы звяртаемся да іншых, часта змяняюцца ў залежнасці ад магчымай іх рэакцыі. Інтэрнэт праз абязлічванне інфармацыі (да прыкладу, у каментарыях) стварае асяроддзе, у якім аўтар разлічвае на больш свабодны выклад сваіх думак наконт тых ці іншых з'яў. Такога роду «дыскусіі» па «вясковай» праблематыцы ў інтэрнэце дазваляюць гаварыць аб дэфармацыі ў масавым светапоглядзе ўяўленняў аб важнейшых працэсах развіцця нашага грамадства. Негатыўнае значэнне дадаецца словамі «калгаснікі», «вёска», што праяўляецца перш за ўсё ў асяроддзі моладзі. Прычыны такой з'явы — крытычнасць гістарыяграфіі

мяжы XX—XXI стст., пераасэнсаванне аграрнай гісторыі. Уплыў гістарыяграфіі на грамадскія працэсы выяўляецца ў тым, што, разглядаючы і ацэньваючы мінулае праз прызму цяперашняга, а цяперашняе — як вынік папярэдняга развіцця, гістарычная свядомасць успрымае будучыню як праекцыю сучасных працэсаў і тэндэнцый.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Чаянов А.* Местные комбинаты по первичной переработке сельскохозяйственных продуктов // Сельское хозяйство на путях восстановления. М., 1925.

2. *Чаянов А. В.* Основные идеи и формы организации сельско-хозяйственной кооперации. 2-е изд. М. : Изд-во Книгосоюза, 1927. 383 с.

3. *Чаянов А. В.* Крестьянское хозяйство : избр. тр. / редкол. сер. : Л. И. Абалкин (пред.) [и др.]. М. : Экономика, 1989. 492 с. (Экон. наследие).

4. *Кондратьев Н. Д.* Рынок хлебов и его регулирование во время войны и революции / отв. ред. акад. Л. И. Абалкин. М. : Наука, 1994. 487 с.

5. *Кондратьев Н. Д.* Основные проблемы экономической статики и динамики: предварительный эскиз / авт. статей о Кондратьеве и его творчестве : Ю. Н. Давыдов, Ю. Б. Кочеврин, В. В. Симонов. М. : Наука, 1991. 576 с.

6. *Игнатовский В., Смолич А.* Белоруссия: территория, население, экономика. Важнейшие моменты истории. Экономический очерк Советской Белоруссии и ее округов. Минск : Изд-во СНК БССР, 1925. 94 с.

7. *Heltman S.* Nacjonalizacija ziemi na Bialej Rusi. M. : Госиздат, 1921. 62 с.

8. *Прышчэпаў Зьм.* Аб Зямельным кодэксе БССР // Звязда. 1924. № 164.

9. *Прищепов Д.* Мероприятия по восстановлению сельского хозяйства Белоруссии // Вперед. 1924. № 2. С. 52—58.

10. *Бонч-Осмоловский Р.* Земельная площадь в БССР и ее распределение // Сов. стр-во. 1926. № 11.

11. *Агеяў Л.* Жывёлагадоўля і пэрспэктывы яе развіцьця ў калгасах БССР // Сел. і ляс. гасп-ка. 1928. № 3—4. С. 22—34.

12. *Агеяў Л.* Прамысловыя і тэхнічныя прадпрыемствы калектыўных гаспадарак БССР // Сав. буд-ва. 1928. № 10. С. 53—60.

13. *Ерохин М. М.* Что дала коммуна беднякам. М., 1925. 16 с.

14. *Кавалеўскі Н. Ц.* Пытаньні каляктывізацыі вёскі (Бешанковіцкі раён Віцебскай акругі) //Бальшавік Беларусі. 1928. № 11. С. 94—96.

15. *Каз А.* Еврейские колхозы в Белоруссии // На аграрном фронте. 1928. № 5. С. 115—122.

16. *Клімко М.* Будаўніцтва і праца комуны «Чырвоны Сьцяг» (Кароткая манаграфія) // Сел. і ляс. гасп-ка. 1928. № 3—4.

17. *Кудзінаў С.* Жыцьцё і праца комуны «Зьвязда». Менск, 1929. 52 с.

18. *Кудзінаў С.* Адзін з лепшых (калгас «Камбайн» Слуцкага раёну). Менск, 1931. 48 с.

19. *Левченок Ф.* Первые итоги (Из материалов по обследованию колхозов) // Бальшавік Беларусі. 1928. № 10. С. 81—84.

20. *Лук'янчык А.* Увага калгаснаму будаўніцтву (Да вынікаў 2 зьезду калгасаў Менскае акругі) // Бальшавік Беларусі. 1928. № 8. С. 55—59.

21. *Мядзьведзкі П. Я.* Пра становішча калгасаў // Бальшавік Беларусі. 1929. № 2—3. С. 34—45.

22. *Паскрэбка Ул.* Трактар будзіць раньне. Менск, 1929. 68 с.

23. *Самохин Ф.* Колхозы Оршанщины // Сов. стр-во. 1926. № 10. С. 277—286; *Симхович А., Чиж М.* Сельскохозяйственные коллективы БССР (колхозы, коммуны, артели и товарищества по общественной обработке земли) // Сов. стр-во. 1927. № 6. С. 49—55.

24. *Цейтлин М. С.* Строительство колхозов // Сов. стр-во. 1928. № 12. С. 89—90.

25. *Биценко А. А.* К вопросам теории и истории коллективизации сельского хозяйства в СССР. М. : Изд-во Книгосоюза, 1929. 165 с.

26. *Конюков И. Я.* Коллективное земледелие: из итогов аграрной революции. 3-е изд. М. : Новая деревня, 1927. 238 с.

27. *Митрофанов А. Х.* Колхозное движение (его прошлое, современные задачи и значение). М. ; Л., 1929. 143 с.

28. *Макараў М. П.* Спроба вывучэньня эфектыўнасьці форм землекарыстаньня ў БССР. Менск, 1929. 112 с.

29. *Маргелаў* С. Супраць беларускай кандрацьеўшчыны // Бальшавік Беларусі. 1929. № 10—12.

30. *Бондар Г.* Кулацкая палітыка прышчэпаўшчыны // Шляхі калектывізацыі. 1930. № 15—16; *Ганин А.* Подрывная работа кондратьевцев в БССР // На аграрном фронте. 1930. № 10.

31. *Сталин И. В.* Крестьянский вопрос : (Статьи и речи). [Текст]. 2-е изд. М. ; Л. : Госиздат. 72 с.

32. *Погудин В. И.* Путь советского крестьянства к социализму: историографический очерк. М., 1975.

33. *Кириленко Г. А.* Сталинская политика коллективизации сельского хозяйтсва и ее значение в деле укрепления оборонительной мощи СССР : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 1953. 58 с.

34. *Конюков И. А.* Очерки о первых этапах развития колеективного земледелия (1917—1925). М., 1949.

35. *Краев М.* Победа колхозного строя в БССР. М., 1954 ; Социалистическое народное хозяйство Белорусской ССР. Минск, 1949 ; История БССР. Минск, 1953.

36. *Игнатенко, И. М.* Борьба за восстановление сельского хозяйства Гомельской губернии (1921—1925) : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 1953.

37. *Скопцов С. Г.* Крестьянские комитеты общественной взаимопомощи БССР в восстановительный период (1921—1925) : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 1953.

38. *Стральцоў М. Е.* Некаторыя пытанні падатковай палітыкі беларускай вёскі ў 1921—1925 гг. // Весці акад. навук Беларусі. Сер. грамад. навук. 1963. № 1.

39. Очерки истории коллективизации сельского хозяйства в союзных республиках. М., 1963.

40. Основные проблемы истории коллективизации сельского хозяйства в современной советской исторической литературе [Текст]: Материал для обсуждения на Сессии по истории советского крестьянства и колхозного строительства в СССР / М. Л. Богденко, И. Е. Зеленин ; Ин-т истории Акад. наук СССР. Науч. совет по проблеме «История соц. и ком. строительства в СССР». М. : [б. и.], 1961.

41. *Неделько В. А.* К вопросу об особенностях социально-экономической структуры белорусской доколхозной деревни // Тез. докл. и сообщ. XIV сессии межреспубликанского симпозиума по аграрной истории Вост. Европы. Минск — Гродно, 25—29 сент. 1972 г.). М., 1972. Вып. 11.

42. *Милованов В. А.* Зарождение и развитие коллективного земледелеия в Белоруссии в первые годы советской власти // Из истории борьбы белорусского народа за Советскую власть и победу социализма : сб. ст. Минск : Изд-во АН БССР, 1957.

43. *Мілаванаў, В. А.* Першыя крокі калгаснага руху ў Беларусі (кастрыч. 1917—1920 гг.). Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1958. 135 с.

44. *Милованов В. А.* Динамика колхозного движения в Белоруссии в восстановительный период (1921—1925) // Из истории социалистического строительства Советской Белоруссии : сб. ст. Минск : Изд-во АН БССР, 1959.

45. *Богденко М. Л., Зеленин И. Е.* Совхозы СССР: Краткий исторический очерк (19І7—1975). М. : Политиздат, 1976. 279 с.

46. *Зеленин И. Е.* Зерновые совхозы СССР (1933—І941 гг.). М. : Наука, 1966. 247 с.

47. *Зеленин И. Е.* Совхозы СССР в годы довоенных пятилеток. 1928—1941. М. : Наука, 1982. 239 с.

48. *Сорокин А. Н.* Совхозы Белорусской ССР: 1917—1941 гг. ; науч. ред. И. Е. Зеленин. Акад. наук БССР, Ин-т истории. Минск : Наука и техника, 1979. 246 с.

49. *Богденко М. Л., Зеленин И. Е.* Основные проблемы истории коллективизации сельского хозяйства в современной литературе. М., 1961.

50. *Данилов В. П.* Создание материально-технических предпосылок коллективизации сельского хозяйства. М., 1957.

51. *Александр Журавель.* Памяти Виктора Петровича Данилова (воспоминания несостоявшегося ученика) // Крестьяноведение. Теория. История. Современность. Вып. 5. М., 2006.

52. *Данилов В. П.* История крестьянства в России в XX веке : избр. тр. : в 2 ч. М. : РОССПЭН, 2011. Ч. 1. 863 с. ; М. : РОССПЭН, 2011. Ч. 2. 831 с.

53. *Данилов В. П.* Советская доколхозная деревня: население, землепользование, хозяйство. М. : Наука, 1977. 318 с.

54. *Данилов В. П.* Советская доколхозная деревня: социальная структура, социальные отношения. М. : Наука, 1979. 359 с.

55. *Головко А. А.* Деятельность Советов Белоруссии по осуществлению экономической политики в деревне в 1927—1936 гг. Минск : Изд-во БГУ, 1968. 125 с.

56. *Герман К. К.* Ведущая роль рабочего класса в создании колхозного строя в Белоруссии (1926—1935 гг.). Минск : Изд-во БГУ, 1968. 244 с.

57. *Власенко Н. В.* Борьба Компартии Белоруссии за построение экономического фундамента социализма. 1926—1932. Минск : Беларусь, 1970. 232 с.

58. *Герасименко Г. Г.* Деятельность Компартии Белоруссии по вовлечению трудящихся масс в управление государством. 1925—1937. Минск : Изд-во БГУ, 1973. 230 с.

59. *Лагун С. Р.* Укрепление Советов Белоруссии и повышение их роли в строительстве социализма. Минск : Наука и техника, 1970. 304 с.

60. *Приходько А. А.* Государственно-правовое руководство коллективизацией сельского хозяйства Белоруссии (1929—1936 гг.). Минск : Изд-во БГУ, 1970. 100 с.

61. *Погудин В. И.* Советская историография о некоторых проблемах социально-экономических отношений в доколхозной деревне СССР // История СССР. 1973. № 3.

62. *Трапезников С. П.* Ленинизм и аграрно-крестьянский вопрос. М., 1967. Т. 1 ; 1974. Т. 2.

63. *Костюк М. П.* Идейно-политическое воспитание крестьянства: из опыта работы Компартии Белоруссии в период строительства социализма (1926—1937 гг.). Минск : Беларусь, 1979. 254 с.

64. *Костюк М. П.* [и др.]. Формирование коллективистских идей в белорусской деревне (1918—1929) // Вопр. истории. 1983. № 11.

65. *Костюк М. П.*Трудовой вклад крестьянства в победу и упрочение социализма: на материалах БССР. Минск : Наука и техника, 1986. 238 с.

66. *Шкляр М. Е.* Борьба Компартии Белоруссии за укрепление союза рабочего класса и трудящегося крестьянства в восстановительный период (1921—1925). Минск, 1960.

67. *Мартовицкий В. И.* Лозунг партии «Лицом к деревне!» и его осуществление в БССР в 1924—1925 гг. Минск : Изд-во М-ва высш., сред., спец. и проф. образ. БССР, 1961. 136 с.

68. *Маргунский С. П.* Государственное строительство БССР в годы восстановления народного хозяйства (1921—1925). Минск : Акад. наук БССР, 1966. 286 с.

69. *Фих Б. М.* Социалистическое переустройство деревни // Коммунист Белоруссии. 1968. № 5.

70. История Белорусской ССР : в 2 т. Минск : Изд-во АН БССР, 1961. Т. 2. 700 с.

71. Гісторыя Беларускай ССР. Мінск : Навука і тэхніка, 1973. Т. 3. 696 с.

72. История государства и права Белорусской ССР : в 2 т. Минск : Наука и техника, 1970. Т. 2. 608 с.

73. Развитие экономики Белоруссии в 1921—1927 гг. Минск : Наука и техника, 1973. 335 с.

74. Развитие экономики Белоруссии в 1928—1941 гг. Минск : Наука и техника, 1975. 317 с.

75. Экономика Советской Белоруссии (1917—1967) / *Мартинкевич Ф. С.* [и др.]. Минск : Наука и техника, 1967. 571 с. ; *Стрельцов М. Е.* Некоторые вопросы землеустройства земель крестьянского пользования в БССР в 1921—1929 гг. // Вопр. истории : тез. докл. XII конф. молодых ученых Белорусской ССР. Минск, 1969.

76. *Стрельцов М. Е.* Социальные группы в крестьянстве Белоруссии к концу восстановительного периода : докл. конф. секций Научного совета по проблеме Истории БССР. Минск, 1969. 572 с.

77. *Стрельцов М. Е.* О формах колхозного строительства в БССР в 1921—1928 гг. // Тез. докл. и сообщ. XIV сессии межреспубликанского симпозиума по аграрной истории Вост. Европы. Минск — Гродно, 25—29 сент. 1972 г. М., 1972. Вып. 2.

78. *Стрельцов М. Е.* О формах колхозного строительства в БССР в 1921—1928 гг. // Из истории социалистического строительства (на материалах Белорусской ССР). Минск, 1979.

79. *Михнюк В. Н.* Крестьянство Белоруссии на пути к социализму : историогр. очерк. Минск : Изд-во БГУ, 1979. 183 с.

80. *Чмыга А. Ф.* Колхозное движение на Украине (1917—1929 гг.) : очерки истории. М., 1974.

81. *Гришаев В. В.* Сельскохозяйственные коммуны Советской России. 1917—1929. М., 1976.

82. Победа колхозного строя в Белорусской ССР / *Костюк М. П.* [и др.]. Минск, 1981. 448 с.

83. История рабочего класса Белорусской ССР : в 4 т. Т. 2 : Рабочий класс БССР в годы Великой Октябрьской социалистической революции и построения социализма (1917—1937) / Ин-т истории АН БССР; редкол. тома : М. П. Костюк (отв. ред) [и др.]. Минск : Наука и техника, 1985. 488 с.

84. *Данилов В. П.* Коллективизация: как это было // Страницы истории КПСС: Факты. Проблемы. Уроки. М., 1988.

85. *Кузнецов Н.* Коллективизация: трудные пути // Сов. Белоруссия. 1988. 25 дек.

86. *Вышинский В.* Судьба одной «безобидной» концепции // Сел. газета. 1989. 18 окт. ; *Іофэ Э.* «Адзіны выхад — кааперацыя» // Крыніца. 1989. № 10.

87. *Костюк М. П.* Коллективизация: как это было (БССР) // Полит. собеседник. 1989. № 4.

88. *Ходин С. Н.* Колхозное строительство в Белорусской ССР в 1921 — первой половине 1929 г. : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 1990. 20 с.

89. Изменения социальной структуры советского общества: 1921 — середина 30-х годов / отв. ред. В. М. Селунская. М : Мысль, 1979. 343 с.

90. *Селунская В. М.* Социальная структура советского общества: история и современность. М. : Политиздат, 1987. 288 с.

91. *Рогалина Н. Л.* Коллективизация: уроки исторического опыта. М., 1989.

92. *Жиромская В. Б.* Социальная и демографическая структуры населения: вопросы комплексного изучения // Ист. демография: проблемы, суждения, задачи. М. : Наука, 1989. 286 с.

93. *Козлов В. А.*Культурная революция и крестьянство. 1921—1927. (По материалам Европейской части РСФСР). М. : Наука, 1983. 212 с.

94. *Московкина Е. В.* Культурное строительство в белорусской деревне 1917—41 гг.: из опыта работы КПБ. Минск : Изд-во БГУ, 1983. 149 с.

95. Количественные методы в исследованиях по истории советского рабочего класса и крестьянства : сб. науч. тр. / отв. ред. Т. П. Славко. Свердловск : УрО АН СССР, 1991. 176 с.

96. *Бородкин Л. И.* И. Д. Ковальченко и отечественная школа квантитативной истории : материалы науч. чтений памяти акад. И. Д. Ковальченко. М., 1997.

97. *Буховец О. Г.* «Приговорное» движение крестьян в 1905—1907 гг. (методы изучения по материалам Самарской и Воронежской губерний) : автореф. дис. ... канд. ист. наук / Моск. гос. ун-т им. М. В. Ломоносова. М. : МГУ им. М. В. Ломоносова, 1984. 23 с.

98. *Миронов Б. Н.* Историк и социология. Л. : Наука, 1984. 174 с.

99. *Кабытов П. С., Козлов В. А., Литвак Б. Г.* Русское крестьянство: этапы духовного освобождения. М. : Мысль, 1988. 237 с.

100. *Ліндנэр Р.* Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX—XX стст. СПб. : Неўскі прасцяг, 2003. 540 с.

101. Советская историография / под ред. Ю. Н. Афанасьева. М. : Рос. гос. гуманит. ун-т, 1996. 592 с.

102. *Смалянчук А.* Феномен беларускай савецкай гістарыяграфіі // Гіст. альманах. 2004. Т. 10.

103. *Касцюк М. П.* Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мінск : Экаперспектыва, 2000. 307 с.

104. *Сарокін А. М.* На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска. Ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917—1990-я гг.). Мінск, 1999. 298 с.

105. *Сарокін А. М.* Рэха эпохі крайнасцяў: беларуская веска ад Дэкрэта ла Кодэкса аб зямлі (1917—1990-я гг.) / Прыватная ўстанова адукацыі «БІП — Інстытут правазнаўства». Мінск : Права і эканоміка, 2005. 298 с.

106. *Сорокин А. Н.* Искушение будущим и уроки прошлого. Белорусская деревня: от Декрета до Кодекса о земле (1917 — 1990-е годы). Минск : Право и экономика, 2008. 442 с.

107. Россия в XX веке. Судьбы исторической науки / под общ. ред. чл.-кор. РАН А. Н. Сахарова. М., 1996.

108. Современная российская историография : в 2 ч. / В. И. Меньковский [и др.] ; под ред. В. И. Меньковского. Минск, 2009.

109. *Кананерова Е. Н.* К вопросу об основных этапах и направлениях развития советской аграрной историографии // Вестн. Астраханского техн. ун-та. 2009. № 1. С. 127—129.

110. *Бордюгов Г. А., Козлов В. А.* История и конъюнктура: субъективные заметки об истории советского общества. М., 1992. 352 с.

111. *Данилов В. П.* Как это было // Правда. 1988. 26 сент.

112. Документы свидетельствуют. Из истории коллективизации. 1927—1932 : сб. док. / под ред. В. П. Данилова, Н. А. Ивницкого. М., 1989.

113. *Ивницкий Н. А.* Коллективизация сельского хозяйства в СССР: опыт, уроки, выводы. М., 1988.

114. *Ивницкий Н. А.* Коллективизация и раскулачивание (начало 30-х годов). М. : ИНТЕРПРАКС, 1994. 269 с. (Программа «Обновление гуманитарного образования в России»).

115. *Ивницкий Н. А.* Репрессивная политика советской власти в деревне (1928—1933 гг.). М., 2000.

116. *Вылцан М. А.* Коллективизация сельского хозяйства в СССР: пути, формы, достижения / В. П. Данилов [и др.]. М. : Колос, 1982. 415 с.

117. *Вылцан М. А.* Менталитет и аграрное развитие России (19—20 вв.) // Институт рос. истории РАН. М., 1996. С. 334—347.

118. *Вылцан М. А.* Индивидуализм и коллективизм крестьян // Менталитет и аграрное развитие России (19—20 вв.). М., 1996.

119. *Лыч Г. М.* Трагедыя беларускага сялянства. Мінск : МІК, 2003. 269 с.

120. *Чапля Я.* Кулацкі эшалон / прадм. Георгія Штыхава. Мінск : Конфидо, 2008. 150 с.

121. *Процька Т.* Вынішчэньне сялянства. Веска Усходняй Беларусі пад цяжарам бальшавіцкіх рэпрэсіяў 30-х гадоў / рэд. Г. П. Патаповіч (адк. рэд.). Мінск : БГАКЦ, 1998. 136 с.

122. *Ходин С. Н.* «Я из деревни»: к вопросу о самосознании белорусов // Беларус. думка. 2014. № 1. С. 83—88.

123. *Кыдыралина Ж. У.* Нация и история. Астана : Елорда, 2009. 304 с.

124. *Зеленин И. Е.* Сталинская «революция сверху» после «великого перелома». 1930—1939. Политика, осуществление, результаты. М., 2006. 315 с.

125. *Огановский Н.* Община и земельное товарищество // О земле : сб. ст. о прошлом и будущем земельно-хозяйственного строительства. М., 1921. Вып. 1.

126. *Першин П. Н.* Участковое землепользование в России. Хутора и отруба. Их распространение за десятилетие 1907—1916 гг. и судьба во время революции (1917—1920 гг.). М., 1922.

127. *Дубровский С. М.* Очерки русской революции. М., 1923. Вып. 1.

128. *Козлов Н. И.* Крестьянский двор и земельное общество. Л., 1926.

129. *Данилов В. П.* Община у народов СССР в послеоктябрьский период: К вопросу о типологии общины на территории советских республик // Народы Азии и Африки. 1973. № 3.

130. *Данилов В. П.* К вопросу о характере и значении крестьянской поземельной общины в России // Проблемы соц.-эконом. истории России. М., 1974.

131. *Данилова Л. В., Данилов В. П.* Проблемы теории и истории общины // Община в Африке: проблемы типологии. М., 1978.

132. *Кабанов В. В.* Октябрьская революция и крестьянская община // Ист. записки. М., 1984. Т. 11.

133. *Кабанов В. В.* Октябрьская революция и кооперация. 1917–1919. М., 1973.

134. *Кабанов В. В.* Крестьянское хозяйство в условиях «военного коммунизма». М., 1988.

135. *Кабанов В. В.* Кооперация, революция, социализм. М., 1996.

136. *Кабанов В. В.* Крестьянская община и кооперация России XX века. М., 1997.

137. *Осокина В. Я.* Социалистическое строительство в деревне и община, 1920—1933. М. : Мысль, 1978. 176 с.

138. *Окуда Х., Кондрашин В. В.* Сергей Альбертович Есиков — выдающийся исследователь русской деревни // Ист., философ., полит. и юр. науки, культурология и искусствоведение. Вопр. теории и практики. Тамбов : Грамота, 2012.

139. *Есиков С. А., Канищев В. В.* Естественные критерии определения зажиточности крестьянства на мезо- и микросоциальном уровнях (Тамбовская губерния, 1860—1920-е гг.) // Зажиточное крестьянство России в исторической ретроспективе (землевладение, землепользование, производство, менталитет). XXVII сессия Симпозиума по аграрной истории Восточной Европы: тез. докл. и сообщ. (г. Вологда, 12—16 сент. 2000 г.). М., 2000.

140. *Есиков С. А.* Российская деревня в годы нэпа: к вопросу об альтернативах сталинской коллективизации (по материалам Центрального Черноземья). М. : РОССПЭН, 2010. 246 с.

141. *Панютич В. П.* Наемный труд в сельском хозяйстве Беларуси. 1861—1914 гг. / под ред. П. Т. Петрикова. Минск : Навука і тэхніка, 1996. 142 с.

142. *Голубеў В. Ф.* Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі: XVI—XVIII стст. / пад рэд. В. І. Мялешкі. Мінск : Навука і тэхніка, 1992. 176 с.

143. *Голубеў В. Ф.* Сельская абшчына ў Беларусі XVI—XVIII стст. Мінск : Беларус. навука, 2008. 407 с.

144. *Маскевіч Г. І.* Сацыяльная арганізацыя сельскай грамады Беларусі ў 60–90-я гг. XIX ст. // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3. Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Эканоміка. Права. № 3. 2007.

145. *Маскевіч Г. І.* Да пытання аб вызначэнні тэрмінаў сельская «грамада» і «абшчына» ў Беларусі ў другой палове XIX ст. // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в. : материалы междунар. науч.-практ. конф. / редкол. : Т. А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. Минск : БГУ, 2011.

146. *Кознова И. Е.* XX век в социальной памяти российского крестьянства. М. : Изд-во ИФ РАН, 2000. 207 с.

147. *Кознова И. Е.* Российская модернизация XX века и крестьянская память // Государственная власть и крестьянство в XX – начале XXI века : сб. ст. Ч. I. Коломна : Коломенский гос. пед. ин-т, 2007.

148. *Кознова И. Е.* Память о прошлом и национальное самосознание // Проблемы рос. самосознания. М. : ИФ РАН, 2007.

149. *Кознова И. Е.* Социальная память русского крестьянства в XX веке // Между канунами. Ист. исследования в России за последние 25 лет / под ред. Г. А. Бордюгова. М. : АПРО-XXI, 2013.

150. *Козлова Н. Н.* Социология повседневности: переоценка ценностей // Обществ. науки и современность. 1992. № 3.

151. *Козлова Н. Н., Сандомирская И. И.* «Я так хочу назвать кино». «Наивное письмо»: опыт лингвосоциологического чтения. М. : Гнозис ; Рус. феноменологическое общ-во, 1996. 256 с.

152. *Козлова Н. Н.* Опыт социологического чтения «человеческих документов», или размышления о значимости методологической рефлекции [Электронный ресурс]. URL: http://ecsocman.hse.ru/data/872/890/1216/003.KOZLOVA.pdf/ (дата обращения: 16.10.2013).

153. *Фальцман В. К.* Теория экономического поведения. М. : Дело, 1993.

154. *Адамидов Д. Ю.* Проблема взаимосвязи индивидуального и коллективного в экономическом поведении : дис. канд. эконом. наук / Гос. акад. упр. им. Оржоникидзе. М., 1997.

155. *Слободской А. Л.* Экономическое поведение: социально-психологическое обоснование теоретической психологии. СПб., 1994.

156. *Ольсевич Ю. А.* Психологические основы экономического поведения. М., 2009. 413 с.

157. *Шёк Г.* Зависть: теория социального поведения / пер. с англ. В. Кошкина ; под ред Ю. Кузнецова. М. : ИРИСЭН, 2008. 544 с. (Сер. «Социология»).

158. Беларусы. Т. 5 : Сям'я / В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, Т. І. Кухаронак [і інш.] ; рэдкал. : В. К. Бандарчык [і інш.] ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Мінск : Беларус. навука, 2001. 375 с.

159. *Валодзіна Т. У.* Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў. Мінск : Тэхналогія, 1999. 167 с.

160. *Грехова Н. Н., Ефимов О. В.* Советы и крестьянство в 1917—1928 гг. (на материалах Нижегородской губернии). Арзамас, 2011.

161. *Давыдов Д. В.* Крестьянство ТАССР в условиях нэпа: историко-демографическая характеристика. Казань, 2010.

162. *Надькин Т. Д.* Сталинская аграрная революция и крестьянство (на материалах Мордовии). Саранск, 2006.

163. *Есиков С. А.* Российская деревня в годы нэпа: к вопросу об альтернативах сталинской коллективизации (по материалам Центрального Черноземья). М. : РОССПЭН, 2010. 246 с.

164. *Мазур Л. Н.* Российская деревня в условиях урбанизации: региональное измерение (вторая половина XIX–XX в.). Екатеринбург : Изд-во Урал. ун-та, 2012. 472 с.

165. *Рогалина Н. Л.* Власть и аграрные реформы в России XX века. М. : Энцикл. рос. деревень, 2010. 256 с.

166. *Бяспалая М. А.* Беларуская вёска ў першыя гады нэпа (1921—1923 гг.). Мінск : БУК, 1999. 253 с.

167. *Бяспалая М. А.* Эканамічнае і сацыякультурнае развіццё беларускай вёскі ў гады нэпа (1921—1927): М-ва культ. Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культ. і мастацтваў. Мінск : БДУКіМ, 2009. 324 с.

168. *Микула Е. И.* Влияние новой экономической политики на кооперативно-колхозное строительство в белорусской деревне (1921 — начало 30-х годов) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02. АН Беларуси. Ин-т истории. Минск, 1991. 29 с.

169. *Мікула Я. І.* Новая эканамічная палітыка і калгаснае будаўніцтва ў Беларусі ў 1921—29 гг. // Весці АН Беларускай ССР. Сер. грамад. навук. 1990. № 6.

170. *Микула Е.* Что было в деревне при нэпе // Человек и экономика. 1990. № 8.

171. Эканамічнае і сацыякультурнае развіццё беларускай вёскі ў гады нэпа (1921—1927). Мінск : Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. 325 с.

172. *Безнин М. А., Димони Т. М.* Рабочая аристократия в сельском хозяйстве России 1930—1980-х гг. (новый подход к социальной истории российской деревни). Вологда, 2012.

173. *Кондрашин В. В.* Голод 1932—1933 годов: трагедия российской деревни. М. : РОССПЭН, 2008. 520 с.

174. Голод в СССР. 1929—1934 : в 3 т. Т. 1 : 1929 — июль 1932. Кн. 2. С. 142—143. М. : МФД, 2011. 560 с. (Россия. XX век. Документы).

175. Советское наследство. Отражение прошлого в социально-экономических практиках современной России : монография /под ред. Л. И. Бородкина [и др.]. Мюнхен ; Берлин, 2010.

176. Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т. 5 : Беларусь у 1917—1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.] ; рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Экаперспектыва, 2006. 613 с.

177. Гісторыя сялянства Беларусі : у 3 т. Т. 2 : Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 да сакавіка 1917 г. / З. Е. Абезгаўз [і інш.] ; рэдкал. : В. Панюціч (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2002. 522 с.

178. *Сорокин А. Н.* Эксперимент. Человек и земля. Минск, 1994.

179. *Сарокін А. М.* На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска. Ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917—1990-я гады). Мінск, 1999.

180. *Сарокін А. М.* Рэха эпохі крайнасцяў: беларуская вёска: ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917—1990-я гады). Мінск : Права і эканоміка, 2005.

181. *Сорокин А. Н.* Искушение будущим и уроки прошлого. Белорусская деревня: от Декрета до Кодекса о земле (1917—1990-е гг.). Минск : Право и экономика, 2008. (Сер. «Гуманитарные науки»).

182. *Касцюк М. П.* Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мінск, 2000.

183. *Костюк М. П.* Большевистская система власти в Беларуси. М., 2002.

184. *Платонаў Р. П.* Беларусь у міжваенны перыяд: старонкі палітычнай гісторыі ў святле архіўных крыніц. Мінск : БелНДІДАС, 2001. 282 с.

185. *Елизаров С. А.* Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.). Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2009. 222 с.

186. *Круталевич В. А.* Административно-территориальное устройство БССР. Минск : Наука и техника, 1966. 133 с.

187. *Круталевіч В. А., Юхо І. А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917—1945 гг.). Мінск : Беларус. навука, 1998. 238 с.

188. *Ладысеў У. Ф., Брыгадзін П. І.* Паміж Усходам і Захадам. Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917—1939 гг.). Мінск : БДУ, 2003. 307 с.

189. *Романовский И. Ф., Гудов М. В.* Антисоветское подполье в Беларуси в 1919—1925 гг. Витебск : ВГАВМ, 2000. 86 с.

190. *Пичуков В. П., Старовойтов М. И.* Гомельщина многонациональная (20—30-е гг. XX в.). Вып. I. Гомел. гос. ун-т им. Ф. Скорины, 1999. 235 с.

191. Гомельшчына: старонкі мінулага. Нарысы. II вып. / пад рэд. Р. Р. Лазько [і інш.]. ГДУ імя Ф. Скарыны, 1996. 185 с.

192. *Тугай У. В.* Латышскі этнас у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Беларусі; Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця : матэрыялы рэспуб. навук. канф. : у 4 ч. / пад рэд. І. П. Крэня [і інш.]. Гродна : ГрДУ, 2003. Ч. 3. 275 с.

193. *Ченцов В. В.* Трагические судьбы. Политические репрессии против немецкого населения Украины в 1920—1930-е гг. М. : Готика, 1998. 208 с.

194. Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. 1958 г. Таллин : Ред.-изд. совет Акад. наук Эст. ССР, 1959.

195. Современные концепции аграрного развития. Теоретический семинар. Обзор подготовлен В. Бабашкиным // Отеч. ист. 1994. № 4—5. С. 46—78.

196. *Нейман А. М.* Некоторые тенденции развития современной немарксистской исторической мысли в Англии и теоретико-познавательные воззрения Э. Х. Карра // Ист. наука и проблемы современности. М., 1969.

197. *Марушкин Б. И.* История и политика. Американская буржуазная историография советского общества. М., 1969.

198. The Fate of the revolution: Interpretation of Soviet history, by Walter Laqueur. The Macmillan Company New York,1967. P. VIII, 216.

199. *Лукин А. В.* Англоязычная советология и общественные науки в России // США: экономика, политика, идеология. 1995. № 9.

200. *Павлова И. В.* Современные западные историки о сталинской России 30-х годов (критика «ревизионистского» подхода) // Отеч. ист. 1998. № 5.

201. *Меньковский В. И.* История и историография: Советский Союз 1930-х гг. в трудах англо-американских историков и политологов. Минск : БГУ, 2007. 359 с.

202. *Меньковский В. И., Уль К., Шабасова М. А.* Советский союз 1930-х годов в англоязычной историографии. Сыктывкар, 2013. 222 с.

203. Актуальные проблемы аграрной истории Восточной Европы: историография; методы исследования и методология; опыт и перспективы. XXXI сессия Симпозиума по аграрной истории Восточной Европы : тез. докл. и сообщ. Вологда, 23—26 сент. 2008 г. М., 2008.

204. *Фицпатрик Ш.* Срывайте маски! Идентичность и самозванство в России XX в. М. : РОССПЭН, 2011. 373 с.

205. *Фицпатрик Ш.* Сталинские крестьяне. Социальная история Советской России в 1930-е годы: деревня / пер. с англ. М. : РОССПЭН, 2011. 422 с.

206. *Бородкин Л. И., Свищёв М. А.* Социальная мобильность крестьянства в период нэпа // Вестн. сельскохоз. наук. 1992. № 2, 6.

207. Власть и общество России. XX век : сб. науч. тр. / под ред. В. П. Попова [и др.]. М. : Тамбов, 1999. 354 с.

208. *Свищёв М. А.* Мелкое производство в 20-е годы // НЭП: приобретения и потери. М. : Наука, 1994. С. 175—186.

209. Социальная история. Ежегодник. 1998/1999. М. : РОССПЭН, 1999. 454 с.

210. *Верт Н.* Террор и беспорядок. Сталинизм как система / пер. с фр. А. А. Пешкова. М. : РОССПЭН ; Фонд Первого Президента Б. Н. Ельцина, 2010. 447 с. (История сталинизма).

211. *Кип Дж., Литвин А.* Эпоха Иосифа Сталина в России. Современная историография. М. : РОССПЭН, 2009. 328 с.

212. *Хон Вун Хо*. Репрессивная политика и реакция населения в советской деревне (1927—1929 гг.). М., 2004 ; *Он же*. Моск. гос. ун-т им. М. В. Ломоносова, ист. фак. М. : МАКС-пресс, 2004. 202 с.

213. *Хон Вун Хо*. Ликвидация рыночных механизмов нэпа в российской деревне (1917—1927) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07. 00. 02. Моск. гос. ун-т им. М. В. Ломоносова. М., 2003. 29 с.

214. The New History of the Russian Peasantry in the 20th Century (volume 1). Tokyo, 2002. Edited by Hiroshi Okuda The University of Tokyo, January 2003.

215. *Окуда Хироси*. XX век и сельская Россия // Родина. 2005. № 10.

216. XX век и сельская Россия. Российские и японские исследователи в проекте «История российского крестьянства в XX веке». Reseach Report Series. Токио : CIRJE-R-2, 2005. 392 с.

217. Die Ländliche Wirtshaft im Polnischen und Sowjetischen Teil des Weissrussischen Polesien (1921—1939) : Ein Vergleich. Vorgelegt von Diana Siebert/ Gutacheter: Prof. Dr. Andreas Kappeler. Köln, im September 1993.

218. http://www. diana-siebert. de 2. (дата обращения: 12.04.2013).

219. Bäuerliche Alltagsstrategien in der Belarussischen SSR Die Zerstörung patriarchalischer Familienwirtschaft. (1921—1941). Stuttgart, 1998. 416 с.

## 1.2. КРЫНІЦЫ

Найважнейшае значэнне для вывучэння беларускай вёскі міжваеннага часу маюць афіцыйна-дакументальныя матэрыялы, якія ў даследуемы перыяд даволі складана размежаваць на заканадаўчыя, актавыя і справаводныя крыніцы. Для разумення іх сутнасці і зместу неабходна прыняць да ўвагі тагачасны міжнародна-прававы статус беларускай савецкай дзяржавы [1, с. 46—55]. 31 ліпеня 1920 г. адбылося абвяшчэнне незалежнасці ССРБ, але на III з'ездзе КП(б)Б (22—25 снежня 1920 г.) падкрэслівалася, што Беларусь як Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка адначасова з'яўляецца састаўной часткай РСФСР. Унесеныя Другім Усебеларускім з'ездам Саветаў (снежань 1920 г.) папраўкі да Канстытуцыі ССРБ 1919 г. зафіксавалі яе аўтаномны статус у складзе РСФСР [2, с. 197, 198; 3, с. 233—239; 4].

На пачатку 1920-х гг. функцыянавалі аб'яднаныя наркаматы вайсковых спраў, замежнага гандлю, грашовых спраў, працы, шляхоў зносін, пошты і тэлеграфа. Кіраўніцтва імі і кантроль за іх дзейнасцю ажыццяўлялі Усерасійскі з'езд Саветаў і УЦВК, у якія СНК ССРБ пасылаў сваіх прадстаўнікоў (апошнія зацвярджаліся з'ездам Саветаў ССРБ) [5, с. 14]. У сваю чаргу, ва ўрад ССРБ з правам рашаючага голасу ўваходзіў прадстаўнік Наркамата фінансаў РСФСР. Аналізуючы сацыяльна-эканамічныя працэсы ў БССР, трэба мець на ўвазе, што тэрыторыя Усходняй Беларусі да 1924 г. не ўваходзіла ў склад новаабвешчанай БССР, усе мясцовыя падаткі і зборы ў ССРБ (уключаючы мэтавыя) устанаўліваліся, збіраліся па ўзгадненні з Наркаматам фінансаў РСФСР і вызначаліся ў адпаведнасці з Канстытуцыяй РСФСР. Кіраўніцтва ўсімі фінансавымі ўстановамі НКФ на тэрыторыі ССРБ ажыццяўлялася ўпаўнаважаным НКФ РСФСР пры СНК ССРБ, які адначасова з'яўляўся наркамам фінансаў Беларусі. Нягледзячы на фактычнае існаванне савецкіх рэспублік і дэкларацыі аб іх незалежнасці, дзяржаўныя структуры РСФСР, у тым ліку Наркамзем, на працягу 1921—1922 гг. патрабавалі выканання сваіх дырэктыў, настойваючы на тым, што яны, уключаючы Украінскую Рэспубліку, уваходзяць у склад РСФСР [6].

З 1921 г. усе заканадаўчыя акты РСФСР, указы Прэзідыума, яго ЦВК і СНК, пастановы неаб'яднаных наркаматаў набывалі сілу толькі тады, калі зацвярджаліся цэнтральнымі дзяржаўнымі органамі ССРБ. Зыходзячы з вядомай практыкі, калі вышэйшым органам дзяржаўнай улады РСФСР належала роля своеасаблівых агульна-федэратыўных органаў, у другой палове 1922 г. дзеянне вышэйшых заканадаўчых актаў РСФСР было распаўсюджана і на Савецкую Беларусь [7, с. 80, 81]. Таму ідэя стварэння раўнапраўнага Саюза рэспублік атрымала станоўчы водгук у Савецкай Беларусі. Гэта быў крок наперад не толькі ў тэарэтычнай пастаноўцы пытання (ад «аўтанамізацыі» да ідэі Саюза), але і ў практычным кірунку, паколькі БССР станавілася на адзіны ўзровень з РСФСР. Дэлегацыя ад Савецкай Беларусі прыклала шмат намаганняў, каб напоўніць дагавор рэальным зместам. У прыватнасці, ЦВК БССР прапанаваў захаваць за саюзнымі рэспублікамі права ўводзіць рэспубліканскія падаткі, адзначыў неаднароднасць аб'яднання і пераўтварэння ў саюзна-рэспубліканскія Наркаматы асветы, аховы здароўя, са-

цыяльнага забеспячэння, рэкамендаваў замацаваць раўнапраўны статус нацыянальнай мовы кожнай з рэспублік СССР. Пэўнае значэнне ў гэтым кірунку мела і ўстанаўленне раўнапраўя дзвюх палат ЦВК СССР (Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей), якое мела на мэце перашкодзіць рашэнням, што супярэчылі інтарэсам кожнай з рэспублік.

Пашырэнне рэальных правоў Беларускай ССР можна прасачыць на прыкладзе такога спецыфічнага інстытута, як Паўнамоцнае прадстаўніцтва ССРБ у Маскве. У першыя гады дзейнасць прадстаўніцтва зводзілася да выяўлення па тэрыторыі РСФСР беларускіх спецыялістаў ва ўсіх галінах дзейнасці, якія апынуліся там у выніку Першай сусветнай вайны, рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. З часам прадстаўніцтва імкнулася адстойваць інтарэсы Беларусі. У Расійскім дзяржаўным архіве эканомікі захоўваецца цікавы дакумент. На бланку «Пастаяннае прадстаўніцтва Беларускае Социялістычнае Савецкае Рэспублікі» ад 13 студзеня 1925 г. наступны тэкст: «Пацвярджаючы атрыманне з Дзяржплана праекта НКЗема РСФСР — "Інструкцыі...", паведамляем, што згодна нашаму меркаванню гэтае пытанне рэгулюецца заканадаўствам Саюзных Рэспублік» [8, л. 16].

Паступова мацнеў новы фактар, які можна было б назваць фактарам дзяржаўнасці. Інтарэсы рэспублікі як асобнага арганізма часта не супадалі з інтарэсамі цэнтра і прымушалі рэспубліканскія ўлады кіравацца інтарэсамі БССР і адстойваць яе правы (апошнія станавіліся адначасова і ўласнымі інтарэсамі рэспубліканскай партыйна-гаспадарчай эліты, якая складвалася ў гэты перыяд). Фактар дзяржаўнасці (інтарэсаў Беларусі і яе інстытутаў) далёка не заўсёды быў звязаны з фактарам нацыянальным (для таго, каб служыць Беларусі, не абавязкова трэба быць беларусам і падзяляць нацыянальныя каштоўнасці). Але гэтыя фактары маглі выступаць і ў цеснай узаемасувязі, што знайшло сваё выяўленне ў дзейнасці многіх прадстаўнікоў Савецкай Беларусі, у прыватнасці Д. Ф. Прышчэпава, і Наркамата земляробства БССР, які з'яўляўся ў 1920-я гг. важнейшай установай у рэспубліцы. Нават тады, калі пазначаныя фактары не выступалі ў спалучэнні, любая дзейнасць, накіраваная на абарону паўнамоцтваў рэспублікі, аб'ектыўна садзейнічала ўмацаванню Беларусі як дзяржавы.

Вывучэнне заканадаўчых дакументаў паказвае, што фармальна-юрыдычны аналіз неабходна дапаўняць гісторыка-генетычным вывучэннем. Дакументы права ў БССР фарміраваліся пад уплывам шэрагу тэндэнцый, у тым ліку пашырэння эканамічнай самастойнасці саюзных рэспублік, якая паступова ўступала ў супярэчнасць з аўтарытарнымі памкненнямі партыйнага цэнтра. Пасля заключэння Саюзнага дагавора прымаюцца некаторыя ўласныя прававыя дакументы. У сакавіку 1923 г. на падставе адпаведных расійскіх дакументаў ЦВК БССР прыняў Зямельны кодэкс БССР, уведзены ў дзеянне з 15 красавіка 1923 г. Разам з аб'яўленнем зямлі дзяржаўнай уласнасцю і прадастаўленнем сялянам права карыстання ёю пры ўмове вядзення гаспадаркі ўласнай працай у Кодэксе замацоўваліся бестэрміновае карыстанне зямлёй і права сялян выбіраць любую форму землекарыстання. У выключных выпадках закон дазваляў наёмную дапаможную працу пры ўмове захавання сялянскай гаспадаркай свайго працоўнага характа-

ру. У Кодэксе рэгуляваліся пытанні землеўладкавання і парадку разгляду зямельных спрэчак. Пад уплывам пазначаных працэсаў змяніўся Зямельны кодэкс БССР, які ў новай рэдакцыі, у адрозненне ад Кодэкса РСФСР, не дапускаў ураўняльных перадзелаў зямлі. Зямля замацоўвалася ў пастаяннае працоўнае карыстанне за сельскагаспадарчымі аб'яднаннямі, а пасля выдачы адпаведных дакументаў — за асобнымі землекарыстальнікамі. Камісарыят земляробства БССР меў права ўсталявання гранічнай нормы сялянскага землекарыстання [9—14].

Актавы матэрыял вывучаемага перыяду нешматлікі. Аналіз статутаў сельгасарцелі дазваляе, да прыкладу, прасачыць, якім чынам адбывалася адасабленне ўласніка і вытворцы сельскагаспадарчай прадукцыі ад сродкаў вытворчасці. У другой палове 1920-х гг. пашырылася заключэнне дагавораў аб кантрактацыі як формы нарыхтоўкі сыравіны для прамысловасці. Кантрактацыйны дагавор павінен быў гарантаваць нарыхтоўшчыкам паступленне пэўнага аб'ёму сельскагаспадарчай прадукцыі ў пэўныя тэрміны. Кантрактацыйныя арганізацыі абавязваліся выплаціць за здадзеную прадукцыю зараней вызначаную цану незалежна ад рынparam хістанняў. Ва ўмовах хлебанарыхтоўчага крызісу кантрактацыя выявілася як форма экспрапрыяцыі ў сялян хлеба па кошце, які даўно не адпавядаў рынкаваму. Таму тэхнічны бок правільнасці складання дагавора аб кантрактацыі, дакладнасць фармуляра і захаванне парытэту бакоў на паперы не павінны засланяць сутнасці.

У савецкі час павялічваецца колькасць дакументаў справаводства. Імкненне дзяржавы да поўнага кантролю над сваімі грамадзянамі акрэсліла з'яўленне і новых відаў, і большай колькасці розных матэрыялаў. Ператварэнне партыі бальшавікоў напачатку ў партыю кіруючую, а пасля і ў адзіную прадвызначыла яе перараджэнне ў бюракратычную дзяржаўную структуру. У даследаваннях савецкіх гісторыкаў вызначылася практыка разглядаць дакументы КПСС як асобную групу крыніц. На наш погляд, гэта не мае падстаў, паколькі яны не змяшчаюць такіх характарыстык, што адрознівалі б іх ад дакументаў справаводства (за выключэннем асобных відаў: праграмы, лістоўкі, пракламацыі). Азначанае датычыцца матэрыялаў прафсаюзных, камсамольскіх і іншых грамадскіх і грамадска-палітычных арганізацый савецкага часу.

Для вывучэння дакументаў справаводства вялікае значэнне маюць класіфікацыі ў залежнасці ад іх функцый. Паводле гэтага крытэрыю можна вызначыць комплексы арганізацыйна-распарадчай, планавай, уліковa-кантрольнай і справаздачнай дакументацыі [15]. На пачатку 1920-х гг. з пераходам да мірнага жыцця ва ўстановах колькасць папер рознага кшталту рэзка ўзрасла. Чым больш малапісьменным, непрафесійным быў чыноўнік, тым больш ён патрабаваў справаздач. Бюракратызм захліснуў нават такую дэмакратычную ўстанову 1920-х гг., як кааперацыя.

Да 1924 г. функцыі ЦВК і СНК у іх практычнай дзейнасці не заўсёды былі дакладна размежаванымі. Апарат Прэзідыума ЦВК і СНК быў аб'яднаным (Кіраўніцтва справамі ЦВК і Саўнаркама), справаводства вялося агульнае. Вынікам размежавання спраў у сакавіку 1924 г. стала тое, што старое справаводства і

архіў ЦВК і СНК было вырашана пакінуць пры Цэнтральным Выканаўчым Камітэце. Сярод створаных камісій для вывучэння пазначанай праблемы найбольшае значэнне маюць камісія па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі і камісія па землеўпарадкаванні працоўных яўрэяў пры Прэзідыуме ЦВК, што пачалі працу ў ліпені 1924 г. (дзейнасць апошняй была спынена ў ліпені 1938 г., калі яе функцыі і справы былі перададзены аддзелу НКУС). Пры даволі частых рэарганізацыях гісторыя Белкамзема ў складзе ЦВК — адна з самых працяглых.

Адным з распаўсюджаных відаў дакументаў, без якіх не праходзіла ніводнае пасяджэнне СНК, з'яўляюцца пратаколы. Першапачаткова на аснове ўсіх прынятых пытанняў канцылярыя СНК фарміравала «павестку для пасяджэння Савета Народных Камісараў» на пэўную дату з вызначэннем дакладчыкаў. Па завяршэнні пасяджэння складаўся праект пратакола, у левай яго калонцы змяшчаліся імя выступоўцы і пытанні, што разглядаліся на пасяджэнні, у правай — «пастанавілі» — вынік разгляду. Пасля таго як у дакумент уносіліся ўсе змены і дапаўненні, складаўся выніковы пратакол. Па форме ён быў блізкі да праекта, але меў разгалінаваную ўводную частку, якая ўключала загаловак з нумарам пратакола, найменне органа, ход пасяджэння якога адлюстроўваў дадзены дакумент, дату і месца правядзення пасяджэння, пералік асоб, якія прысутнічалі. Дакументы гэтыя замацоўваліся подпісамі, але яны былі не заўсёды разборлівыя і адпавядаючыя пазначаным прозвішчам.

Яшчэ ў меншай ступені падпісваліся пастановы, магчыма, каб падкрэсліць калегіяльны характар рашэння. Дакумент часта суправаджаўся грыфам абмежавання («сакрэтна», «зусім сакрэтна»). Справаводства з другой паловы 1920-х гг. і да сярэдзіны 1930-х гг. вялося пераважна на беларускай мове. Дакумент уключаў пералік арганізацый, якім накіроўвалася пастанова для выканання. Можна сустрэць на першапачатковым этапе дзейнасці СНК такія нарматыўныя акты, як дэкрэты. Аднак у разглядаемы перыяд яны амаль адсутнічаюць. Ніжэйстаячым органам накіроўваліся цыркуляры з вызначэннем найбольш актуальных пытанняў, што падпісваліся сакратаром ці кіраўніком спраў СНК.

Ва ўсіх вышэйшых, цэнтральных і мясцовых органах дзяржаўнай улады, у партыйных структурах акрамя агульнага справаводства вялося і сакрэтнае, што ахоплівала шырокае кола пытанняў. Менавіта так, у фондзе Цэнтральнага камітэта Кампартыі Беларусі сфарміраваўся вопіс, які змяшчае матэрыялы Асобага сектара ЦК КП(б)Б (да 1934 г. — сакрэтны аддзел). Большасць яго дакументаў мае грыф «сакрэтна» ці «зусім сакрэтна». Гэта звесткі з розных крыніц аб настроях насельніцтва, аб рэальным становішчы спраў.

Ужо ў 1920-я гг. узнікаюць такія віды справаводных крыніц, як матэрыялы планавання народнай гаспадаркі. Яны ствараюцца і дзейнічаюць як у межах СССР, так і ў кожнай з саюзных рэспублік: планы нарыхтовак, тэхніка-эканамічныя планы разгортвання вытворчасці ў асобных галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі, гадавыя планы на 1923/24 і 1924/25 гаспадарчыя гады і, урэшце, першыя пяцігадовыя планы, якія распрацоўваліся не толькі ў агульнасаюзных маштабах, але і ў дачыненні да пэўных галін развіцця гаспадаркі асобных рэс-

публік СССР, тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак і інш. У першых пяцігадовых планах яшчэ не вызначалася сістэма асноўных планавых паказчыкаў, што дыктаваліся з цэнтра (як у наступных). Яны і па форме, і па змесце нагадваюць навуковыя даклады, і вывучаць іх патрэбна ў спалучэнні з распрацоўкамі эканамістаў 1920-х гг. Улікова-кантрольная дакументацыя мае на мэце рэгістрацыю мерапрыемстваў у працэсе кіраўнічай і грамадскай дзейнасці, іх кантроль. Уліковыя дакументы ўключаюць анкеты, аркушы, журналы і кнігі ўліку, рэестры, кадастры, табелі, тарыфы, рахункі, балансы.

Справаздачная дакументацыя абагульняе звесткі названых вышэй дакументаў. Гэта не толькі агляд, але і аналіз дзейнасці пэўных устаноў за вызначаны час, адначасова і інтэрпрэтацыя вынікаў, якая мае магчымасць акрэсліць перспектывы развіцця. Менавіта ўменне скласці справаздачу яшчэ з даўніх часоў характарызавала працу чыноўніка. У савецкі час шырока практыкаваліся справаздачы перад пачаткам пасяджэнняў, з'ездаў (з'езды Саветаў, пасяджэнні Савета Народных Камісараў, партыйныя з'езды). Шырокую распаўсюджанасць атрымалі справаздачы аб працы, агляды, працоўныя рапарты, зводкі, даклады. Нягледзячы на тое што змяняўся час, асобныя з гэтых дакументаў можна параўноўваць з дакументамі дасавецкага перыяду і знаходзіць падабенствы (разыходжанні ў справаздачы і дадатку, завышэнні паказчыкаў, лепшыя паказчыкі ў тых кіраўнікоў, што працавалі пэўны час, і крытычныя аспекты ў тых, хто нядаўна заняў пасаду, і г. д.).

Пры даследаванні вывучаемага перыяду нельга пакідаць па-за ўвагай і спецыяльныя сістэмы справаводнай дакументацыі. Да прыкладу, паведамленні мясцовых упраўленняў АДПУ (НКУС), якія звычайна суправаджалі чарговыя гаспадарчыя кампаніі. Побач з дакладамі аб палітычных настроях вёскі яны ўтрымлівалі інфармацыю аб падрыхтоўцы да пасяўной, стане насеннага фонду і рамонце трактароў, ходзе севу і стане жывога цягла, аб харчовых цяжкасцях і ўборцы ўраджаю, укараненні севазваротаў і г. д. Названы від дакументаў адрознівае лакальны змест, фіксацыю негатыўных бакоў і фактaлагічнасць, заўважную вузкасць абагульненняў і імкненне звязаць недахопы ў справах з наяўнасцю варожых элементаў. Аднак такія асаблівасці не зніжаюць каштоўнасці такога роду гістарычных крыніц. Менавіта ў пазначаных крыніцах утрымліваецца інфармацыя аб паводзінах сялянства СССР і Савецкай Беларусі ў дачыненні да працэсаў мадэрнізацыі вёскі.

Да спецыяльных сістэм справаводнай дакументацыі належаць матэрыялы палітычнага следства 1930-х гг. Склад следчых спраў разнастайны. Як правіла, следчыя справы змяшчаюць розныя матэрыялы па ажыццяўленні следчых дзеянняў (ордары, позвы), сведкавыя паказанні, пратаколы допытаў абвінавачаных, пратаколы вочных ставак, акты ператрусаў, абвінаваўчыя заключэнні. У следчых справах можна выявіць дакументы асабістага паходжання (асабістыя лісты, дзённікі, фатаграфіі), аднятыя ў абвінавачаных.

Справаводная дакументацыя як гістарычная крыніца не вычэрпвае ўсёй разнастайнасці з'яў рэчаіснасці. Дакументы справаводства ў найменшай ступені апавядаюць аб самім працэсе дзейнасці. Яны часцей указваюць на яе вынік ці неаб-

ходнасць (маюць імператыўны характар), але не пазначаюць матывы дзейнасці. Таму вывучэнне звестак дакументаў справаводства неабходна дапаўняць данымі з іншых відаў крыніц.

Пры вывучэнні этнасацыяльных працэсаў неабходна спалучаць як макра-, так і мікрагістарычныя падыходы, выкарыстоўваць увесь комплекс крыніц. Важнейшай крыніцай для вывучэння этнасацыяльнай дынамікі беларускага грамадства ў міжваенны перыяд застаюцца даныя статыстыкі. Статыстычныя крыніцы змяшчаюць масавыя, пераважна колькасныя даныя. Правільнае іх выкарыстанне дазваляе выявіць характэрныя заканамернасці развіцця. Выяўленне азначаных заканамернасцей адбываецца шляхам параўнання колькасных даных, для чаго неабходна супастаўнасць (аднароднасць) статыстычных даных. Статыстычныя звесткі маюць не толькі колькасныя, але і якасныя характарыстыкі. Змены тэрыторыі ці іншых параметраў вывучаемага аб'екта ці яго недакладнае вызначэнне не даюць магчымасці супастаўляць статыстычныя даныя ў поўным аб'ёме (для прыкладу, тэрытарыяльна-адміністрацыйныя змены БССР на працягу 1920-х гг. не даюць магчымасці параўнаць многія звесткі).

Наяўнасць праграмы статыстычнага абследавання не заўсёды дазваляе абавязкова прымяняць да яго метады матэматычнай статыстыкі. На ўзроўні праграмы пад уздзеяннем шэрагу фактараў могуць быць закладзены такія скажэнні, якія не будуць з'яўляцца хібамі разлікаў. Гісторык, маючы справу пераважна з публікацыямі (матэрыяламі распрацоўкі), павінен атрымаць уяўленне аб абедзвюх стадыях. Каб меркаваць аб ступені дакладнасці статыстычных крыніц, неабходна вызначыць іх паходжанне: ці запазычаны з анкеты, што запаўнялася асобай, зацікаўленай у выніках, ці яны атрыманы ад статыстыка, што абавязаны дакладна запісваць вывучаемыя звесткі; даныя збіраліся падрыхтаванымі спецыялістамі ці выпадковымі асобамі, сярод якіх маглі быць і тыя, хто не меў элементарных ведаў аб правілах статыстычнага ўліку; і ўрэшце, звесткі павінны быць аднароднымі (параўноўвацца аднародныя з'явы, працэсы, аб'екты па пэўных, дакладна акрэсленых параметрах). Асноўныя прынцыпы выкарыстання статыстычных звестак датычацца, такім чынам, трох бакоў: іх паўнаты, дакладнасці і аднароднасці.

Роля статыстыкі для вывучэння аграрнай гісторыі неаднаразова разглядалася яшчэ ў 1960—70-х гг. на ўсесаюзных канферэнцыях і адлюстроўвалася ў іх выніковых публікацыях. У прыватнасці, на мяжы 1960—70-х гг. І. А. Чэмярыскі звярнуў увагу савецкіх даследчыкаў на разыходжанні ў ацэнках пасеваў, ураджайнасці і валавых збораў паміж ЦСУ і Дзяржпланам СССР за 1921—1923 гг. [16]. На пачатку 1980-х гг. Ю. П. Бокараў акрэсліў як цікавейшую крыніцу матэрыялы бюджэтных абследаванняў сялянскіх гаспадарак [17].Пэўным этапам у вывучэнні гісторыі вёскі з выкарыстаннем статыстычных крыніц і колькасных метадаў сталі штогоднікі «Эканамічная гісторыя» і «Сацыяльная гісторыя».

Пачатак статыстычнага вывучэння сельскай гаспадаркі ў савецкі час можна звязваць з перапісам 1920 г. Перапіс ахапіў большасць сельскагаспадарчых рэгіёнаў краіны. Праграма ж вывучэння была абмежаванай, надзейнасць паказчыкаў, сабраных ва ўмовах ваеннага часу, — невысокай, а сам матэрыял у паслява-

енны час хутка састарэў. Большае значэнне мела апытанне насельніцтва аб формах землекарыстання, праведзенае ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі ў апошнія месяцы 1920 г. Анкеты запаўняліся не кожным селянінам асабіста, а адказнымі работнікамі сельскіх Саветаў. Аднак недахопы адзначанага апытання сталі перашкодай для публікацыі яго вынікаў у савецкі час. Галоўнае яны не адпавядалі канцэпцыі аб росце цікавасці вяскоўцаў да калектыўных гаспадарак і ідэалагічнай схеме аб «прышчэпаўшчыне» [18, л. 3—79].

У гісторыі савецкай сельскагаспадарчай статыстыкі акрэсліваюцца два асноўных перыяды: першы — 1920-я гг., другі — з пачаткам суцэльнай калектывізацыі вёскі. На працягу першага перыяду вывучэнне спраў у сельскай гаспадарцы праводзілася ЦСУ. У цэнтры ўвагі статыстыкі 1920-х гг. знаходзілася індывідуальная гаспадарка. Склаліся наступныя формы абследаванняў: дынамічныя ці «гнездавыя» перапісы, вясеннія (асеннія) апытанні і бюджэтныя абследаванні. З пачаткам масавай калектывізацыі статыстычнае вывучэнне базіруецца на гадавых справаздачах калгасаў і саўгасаў.

У студзені 1930 г. ЦСУ БССР ліквідавана, а яго функцыі перададзены сектару народнагаспадарчага ўліку Дзяржплана БССР. Зліццё планавых і статыстычных органаў прывяло да значнага звужэння дзейнасці апошніх і скарачэння работ. З'явіліся ідэі аб адміранні статыстыкі ва ўмовах сацыялізму і замене яе бухгалтарскім улікам. Была ліквідавана большасць статыстычных установ, а іх функцыі перададзены бухгалтэрыям, што нанесла безумоўныя страты развіццю статыстычнай справы. На зыходзе 1931 г. кіраўніцтва СССР паспешліва ідзе на стварэнне Цэнтральнага ўпраўлення народнагаспадарчага ўліку (ЦУНГУ СССР). Яно па-ранейшаму ўваходзіла ў склад Дзяржплана, але з пэўнай аўтаноміяй. Кіраўнік ЦУНГУ М. Асінскі аб'явіў вайну скажэнням інфармацыі. Адпаведныя змены адбыліся і ў рэспубліцы. У 1932 г. на аснове сектара народнагаспадарчага ўліку Дзяржплана БССР было створана Упраўленне народнагаспадарчага ўліку БССР. Паляпшэнню справы павінна было садзейнічаць рашэнне аб крымінальнай адказнасці за прадстаўленне недакладных звестак аб выкананні планаў. Працэс паляпшэння спраў у галіне статыстыкі быў перарваны рэпрэсіямі сярэдзіны 1930-х гг.

Звяртаючыся да статыстычных матэрыялаў 1920—30-х гг. у дачыненні да звестак аб стане і дынаміцы сельскагаспадарчай вытворчасці, сустракаешся з істотнымі разыходжаннямі ў лічбах. Шмат даных былі атрыманы шляхам абследавання невялікай колькасці гаспадарак. Таму асаблівай увагі патрабуе вызначэнне рэпрэзентатыўнасці матэрыялаў. Неабходна ўважліва вывучаць верагоднасць статыстычных крыніц міжваеннага часу.

Цікавай крыніцай па гісторыі вёскі з'яўляюцца выбарачныя перапісы, што праводзіліся ЦСУ з 1922 па 1929 г. Найбольш распаўсюджанымі былі два віды выбарачных абследаванняў: дынамічныя (ці гнездавыя) перапісы і асенне-вясеннія апытанні. Асноўная мэта вясенніх апытанняў — атрыманне статыстычных звестак аб важнейшых паказчыках гаспадаркі на момант заканчэння вясенняга севу, найперш аб стане ўсяго земляробства і жывёлагадоўлі. Гэтыя даныя былі неабходнымі для вызначэння памераў сельскагаспадарчай вытворчасці ў бягучым годзе,

і ў першую чаргу валавога збору збожжавых. Перапіс улічваў як насельніцтва, так і пэўныя гаспадарчыя аспекты: жывёлу, інвентар, асабліва падрабязна — пасевы розных культур. Акрамя вытворчых картачка-фармуляр вясенняга апытання ўключала звесткі аб сацыяльных адносінах па найме-здачы інвентару і жывёлы і найме-продажы рабочай сілы. Абследаванні праводзіліся сіламі валасных статыстыкаў з прыцягненнем работнікаў валвыканкамаў, настаўнікаў, добраахвотных карэспандэнтаў і іншых асоб. Выкарыстоўваліся спісы гаспадарак, атрыманыя ў выніку розных перапісаў (дэмаграфічнага 1926 г., падатковых, сельсавецкага ўліку). Але вясенняе апытанне праводзілася часцей адначасова з падатковым улікам у даволі сціслыя тэрміны. Да таго ж пытанне аб пасевах задавалася самім сялянам, а яны, маючы ва ўвазе, што ад гэтага залежыць памер падатку, заніжалі велічыню засеяных плошчаў, колькасць жывёлы, ураджайнасць.

Дынамічныя перапісы праводзіліся штогод з 1921 па 1929 г. (выключаючы 1928 г.) пераважна ў тыповых для пэўнай прыродна-гаспадарчай зоны групах паселішчаў («гнёздах»). Сістэматычнае назіранне за адной групай гаспадарак праводзілася па шырокай праграме (рабочая сіла, пасяўная плошча, пагалоўе жывёлы, наяўнасць машын і абсталявання, а таксама арэнда зямлі, жывёлы, інвентару, наём рабочай сілы). У развіцці дынамічных перапісаў вызначаюць два перыяды. Першы — 1920—1926 гг., калі ўся ўвага была сканцэнтравана на вывучэнні «сацыяльна-арганічнай эвалюцыі», і другі — 1927—1929 гг., калі асноўным стала вывучэнне сацыяльна-вытворчых адносін у вёсцы. Пераход да нэпа на вёсцы прадвызначыў неабходнасць змен, якія акрэсліліся ў развіцці дынамічных перапісаў да 1927 г. Быў зменены сам прынцып закладкі «гнёздаў» шляхам іх звязкі з вытворчым напрамкам пэўнай мясцовасці. Тыповасць раёна вызначалася ў залежнасці ад таго, якая з галін сельскай гаспадаркі давала найбольшы прыбытак. Асаблівая ўвага ў праграме дынамічнага абследавання 1927 г. звярталася на вызначэнне сацыяльнага складу насельніцтва, якое абслугоўвалася крэдытнай кааперацыяй, і на сацыяльна-класавыя аспекты ўвогуле [19].

Пэўным мінусам можна лічыць нераспрацаванасць і неабгрунтаванасць асобных крытэрыяў для вызначэння сацыяльна-класавай структуры насельніцтва з улікам спецыфікі сельскагаспадарчай вытворчасці, нізкую рэпрэзентатыўнасць іх даных. Абследаваннем, блізкім да суцэльнага, з'яўляўся падатковы ўлік, які праводзіўся штогод фінансавымі ўстановамі краіны. З 1923 г. пачалося выданне зборніка «Сельская гаспадарка Саюза ССР...» у пэўным годзе па даных падатковых зводак па адзіным сельгаспадатку (1924—1930 гг.) [20—23]. У гэтых зводных выданнях прыводзіліся галоўныя паказчыкі сельскагаспадарчай вытворчасці па тэрыторыях. У спісы занатоўваліся ўсе гаспадаркі, незалежна ад таго, плацілі яны падаткі ці не. Спісы ўключалі звесткі аб агульнай колькасці асоб, што знаходзіліся ў гаспадарцы (звязаныя адзіным бюджэтам), аб плошчы ворыва, сенажацей, аб колькасці буйной рагатай жывёлы, рабочых коней і іншай рабочай жывёлы, напрыклад валоў. Акрамя таго, фіксаваліся і іншыя паказчыкі. Такім чынам, адначасова з улікам гаспадаркі праводзілася рэгістрацыя найбольш істотных гаспадарчых прыкмет, такіх як насельніцтва, зямля, жывёла. Аднак фіскальныя інтарэсы,

безумоўна, уплывалі на дакладнасць даных. Да таго ж змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле Беларускай ССР у сістэме падаткаабкладання не даюць магчымасці параўнаць большасць звестак, прасачыць дынаміку развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці на працягу 1920-х гг.

Статыстыка сельскагаспадарчай вытворчасці ў 1930-я гг. фарміравалася ўжо на аснове гадавых справаздач калгасаў. Пэўнае ўяўленне аб іх дае дынаміка гаспадарчага стану калгасаў за 1932 і 1933 гг. У гэтым выбарачным абследаванні параўноўваліся памеры калгасаў па ліку двароў і працаўнікоў, пасяўной плошчы, кошту валавой прадукцыі, вызначаліся суадносіны галін гаспадаркі па складзе валавой прадукцыі, напрамак паляводства (па ўдзельнай вазе збожжавых і асноўных тэхнічных культур), напрамак жывёлагадоўлі. Распрацоўка змяшчала характарыстыку вытворчага абслугоўвання МТС і забяспечанасці калгасаў цяглавай сілай, аплаты працы (налічэнне працадзён), валавога збору збожжавых і тэхнічных культур, у тым ліку забяспечанасці пасяўных плошчаў, вымярэння памераў пасеву ад 1932 да 1933 г., пасяўной плошчы і ўрадлівасці збожжавых, а таксама тэхнічных культур. Даследавалася дынаміка жывёлагадоўлі, перш за ўсё забяспечанасць абагуленай жывёлай, а таксама забяспечанасць калгаснікаў жывёлай індывідуальнай. Меліся даныя аб прыбытковасці калгасаў і размеркаванні калгаснай прадукцыі (памерах валавой прадукцыі і яе размеркаванні, памерах грашовых паступленняў), аб размеркаванні прыбытку паміж членамі калгаса (памерах і складзе размеркаванага паміж членамі калгаса прыбытку, у тым ліку збожжавых і бульбы). Асобна характарызаваліся забеспячэнне калектыўнымі сродкамі (памеры і склад) і дынаміка капітальных укладанняў. Важна заўважыць, што першапачатковыя звесткі фарміраваліся не пэўнай незалежнай групай экспертаў (ЦСУ і інш.), а непасрэдна кіраўніцтвам калгаса. Фарміраванне звестак адбывалася ва ўмовах, калі пры абмежаваных сродках улады патрабавалі максімальна магчымых вынікаў. Гэта патрабуе супастаўлення даных такога роду справаздач з іншымі крыніцамі, якія характарызавалі калектыўную гаспадарку непасрэдна ці ўскосна. Пры гэтым агульнасаюзныя абагульненні даных дазваляюць правесці кампаратыўнае вывучэнне па даволі шырокім коле паказчыкаў.

Шырока вядома легенда аб будаўніках Вавілонской вежы, якія раптам пачалі размаўляць на розных мовах і не завяршылі пачатае. У дачыненні да дэмаграфічных крыніц 1920—30-х гг. задача супастаўлення даных — адна з самых складаных. Толькі на працягу 1920-х гг. тройчы змяняліся межы і адміністрацыйна-тэрытарыяльная пабудова БССР.

Асноўныя працэсы можна прасачыць пры супастаўленні некалькіх перапісаў. Але дзеля таго, каб аналіз быў канкрэтным, неабходна вызначыць ступень адпаведнасці вынікаў перапісаў, параўнальнасць іх пытанняў. Недастаткова параўнаць наяўнасць пытанняў ва ўсіх перапісах. Часам адказы нават на аднолькава сфармуляваныя пытанні несупаставімыя з прычыны адпаведнасці інструкцыям, згодна з якімі збіраўся матэрыял. Параўнанне звестак перапісу без супастаўлення праграмы і інструкцый не з'яўляецца з навуковага пункту гледжання бездакорным і можа прывесці да супярэчлівых высноў.

У 1920 г. Беларусь была вызвалена ад польскіх войскаў, але да моманту перапісу (28.08.1920) перамовы з Польшчай не завяршыліся і пагранічная лінія не была вызначана. Сярод насельніцтва хадзілі чуткі аб магчымасці перадачы Беларусі пад пратэктарат Польшчы, і шмат хто з беларусаў палічыў за лепшае назвацца рускім. Многія раёны не былі ахоплены перапісам — панаваў бандытызм. Гэта вымушае крытычна ставіцца да матэрыялаў перапісу 1920 г. з пункту гледжання паўнаты і дакладнасці. Больш насычаныя канкрэтнымі фактамі па гісторыі Беларусі матэрыялы перапісу 1923 г. Акрамя даных выключна эканамічнага зместу ў іх ёсць звесткі аб узроставай дынаміцы, нацыянальным складзе. Зніжае каштоўнасць азначаных матэрыялаў тое, што перапіс датычыўся толькі гарадоў і мястэчак Беларусі, а таксама праведзенае ў 1924 г. размежаванне ўзбуйненай тэрыторыі БССР на акругі і раёны. Менавіта апошняе прывяло да несупастаўнасці большасці звестак з паказчыкамі наступных перапісаў. У гэтым сэнсе больш карыснымі бачацца апублікаваныя ў 1925 г. «Вынікі адміністрацыйнага сьпісу паселішчаў і гаспадарак БССР на 1 студзеня 1925 г.». Такая распрацоўка якраз і была выклікана істотнымі цяжкасцямі, якія ўзніклі з-за немагчымасці карыстацца ранейшымі статыстычнымі матэрыяламі. Адсюль — спроба высветліць дэмаграфічныя, эканамічныя і іншыя народнагаспадарчыя паказчыкі не толькі па 10 акругах БССР, але і па кожным сельсавеце.

Каштоўнасць «Вынікаў...» павялічваецца праведзеным у 1926 г. Усесаюзным перапісам, які займае асаблівае месца сярод Усесаюзных перапісаў 1920—30-х гг. Падрыхтоўка і правядзенне перапісу адбываліся ва ўмовах шырокай галоснасці, і яго вынікі былі апублікаваны ў такім аб'ёме, які не пераўзыдзены да нашага часу [24—28]. Пераўлік насельніцтва (на 1,5 млн — да 1,5 % насельніцтва), па ацэнках дэмографаў, гісторыкаў, не выходзіў за межы звычайнай недакладнасці для выключнай большасці агульных перапісаў, праведзеных у Еўропе. У той жа час, як адзначаюць даследчыкі, няма агульнапрызнанага крытычнага аналізу вынікаў перапісу 1926 г., і яго данымі карысталіся і карыстаюцца без усялякіх папраўак. Напрыклад, у савецкай літаратуры пытанне аб недаўліку перапісам 1926 г. усяго насельніцтва ці асобных узроставых груп не ставілася. Некаторыя даследчыкі толькі згладжвалі крывую ўзроставай смяротнасці, не праводзячы выраўноўвання ўзроставай структуры, якая несла ў сабе наяўныя рысы акумуляцыі, ці бачылі сваю задачу толькі ў ліквідацыі акумуляцыі ва ўзростах, кратных 5 і 10. Менавіта гэта робіць актуальным увядзенне ў навуковы зварот створанай калектывам даследчыкаў БДУ (С. М. Ходзін, Д. М. Бузун, С. У. Вайтовіч) базы даных Усесаюзнага перапісу 1926 г. па БССР.

Што ж тычыцца перапісаў 1937 і 1939 гг., то першы з іх выклікаў недавер ва ўладных структурах, другі — у вучоных у 1990-я гг. Вядома, што вынікі другога па ліку Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1937 г. былі абвешчаны дэфектнымі, ніводная лічба не ўбачыла свету, а яго арганізатары былі падвергнуты рэпрэсіям. І ўжо на гэтай аснове даследчыкі пачалі разглядаць перапіс 1937 г. як найбольш поўны, усебаковы і падрыхтаваны. Было зроблена шмат, каб перапіс 1937 г. прайшоў паспяхова: удакладнены і ўзгоднены з кіраўніцтвам СССР фармуліроўкі пе-

рапіснога аркуша, прадуманы асноўныя этапы правядзення, да якога далучаны ўсе спецыялісты, якія ўдзельнічалі ў арганізацыі перапісу 1926 г. [29]. Публікацыі матэрыялаў перапісу 1937 г. ажыццёўлены на мяжы XX і XXI стст. па абмежаваным пераліку, але даюць магчымасць супаставіць звесткі аб руху насельніцтва, у тым ліку па БССР. Што ж датычыцца перапісу 1937 г., то да нядаўняга часу ўвогуле лічылася, што яго матэрыялы загінулі. У 1991 і 2007 гг. апублікаваны знойдзеныя ў архівах звесткі [30—36].

Супастаўляючы даныя перапісу 1926 г. і перапісаў 1930-х гг. па роднай мове, можна заўважыць павелічэнне колькасці асоб, якія вызначылі беларускую мову ў якасці роднай, і павелічэнне асоб, што назвалі роднай польскую мову. У той жа час колькасць рускіх і яўрэяў па прыкмеце родная мова скарацілася. Такая акалічнасць не адпавядае стэрэатыпам, якія склаліся ў постперабудовачныя гады, аб чарговым этапе русіфікацыі ў Беларусі на пачатку 1930-х гг. Разам з тым звесткі перапісаў 1937 і 1939 гг. і не абвяргаюць пазначанае сцвярджэнне. Трэба мець ва ўвазе, што ў перапісным лісце 1937 г. (а ў далейшым — і 1939 г.) згодна з Інструкцыяй па запаўненні фіксавалася назва той мовы, якую апытваемы сам лічыў роднай. Для дзяцей у якасці роднай звычайна вызначалася мова, на якой размаўляла яго сям'я. Такім чынам, працэсы русіфікацыі, калі яны і мелі месца на працягу першай паловы 1930-х гг., не маглі выявіцца да 1937—1939 гг. Але пазначаны вышэй факт ужо сам па сабе не можа быць пакінуты без увагі. У канчатковых варыянтах перапісных аркушаў у 1926 г. змяшчалася 15 пытанняў, а з падворнымі — 23; у 1937 г. — 14 (падпытанняў не было). Усе пытанні падзяляліся на наступныя групы: пол і ўзрост, народнасць (нацыянальнасць) і родная мова; сямейнае становішча, грамадзянства, заняткі, становішча ў занятках і галіна працы. Праведзенае В. Б. Жыромскай, І. М. Кісялёвым і Ю. А. Паляковым параўнанне перапісных аркушаў паказала аднак, што перапіс 1926 г. больш падобны ў перапісных аркушах на перапіс 1939 г., чым на перапіс 1937 г. [37]. І калі канчатковы варыянт перапіснога аркуша 1937 г. літаральна рэдагаваў І. В. Сталін, то ў 1939 г. кіраўніцтва ўжо не так настойліва ўмешвалася ў праграму перапісу. Магчыма, менавіта па гэтай прычыне ён атрымаўся больш багаты і разнастайны, чым у 1937 г. Для ўліку насельніцтва па нацыянальнасцях у 1926 г. складаўся «Пералік і слоўнік народнасцей» [38], у якім улічваліся як самастойныя нават этнічныя групы малой колькасці. У 1937 і 1939 гг. такія слоўнікі ўлічвалі толькі асноўныя нацыянальнасці.

Цікава было б (асабліва для вывучэння маштабаў рэпрэсій) параўнаць паказчыкі народанасельніцтва БССР у 1926 г. і ў канцы 1930-х гг. Аднак публікацыя вынікаў перапісу 1939 г. была праведзена толькі часткова, і гэта патрабуе пошуку новых крыніц [39—41]. У сярэдзіне 1930-х гг. у НКУС была перададзена справа перасялення, а таксама запісу актаў грамадзянскага стану. Таму важнае значэнне ў справе статыстычнага вывучэння набывае дакументацыя НКУС, у тым ліку службовая перапіска. Да прыкладу, дакладная запіска начальніка актаў грамадзянскага стану НКУС СССР М. М. Аліеўскага наркаму ўнутраных спраў М. І. Яжову ад 26 кастрычніка 1936 г. дазваляе не толькі атрымаць інфармацыю аб падзенні ўплы-

ву сезоннасці на нараджэнні і шлюбы ў СССР, але і акрэсліць пэўныя чаканні кіраўніцтва па росце насельніцтва ва ўмовах сацыялістычнага развіцця, а таксама змяншэння ўплыву рэлігіі на сялянства [42, с. 859—861]. Даследаванні за апошняе дзесяцігоддзе паказваюць, што вывучэнне дэмаграфічных перапісаў не толькі пацвярджае ўжо зробленыя высновы, але і акрэслівае новыя аспекты. Істотныя магчымасці для ўдакладнення даных перапісу ўяўляюць даныя аб натуральным руху насельніцтва Саюза ССР. На працягу 1920-х гг. ЦСУ СССР было выдадзена некалькі зборнікаў, якія ўтрымлівалі такія звесткі [43—47].

На жаль, недастаткова вывучаны патэнцыял мемуарнай літаратуры. Для творчай інтэлігенцыі, якая ўзрасла на глебе «беларусізацыі» да канца 1920-х гг., пісаць дзённікі стала небяспечна. Рэпрэсіі, а пасля вайна прадвызначылі рашэнне многіх аўтараў, што не час зараз пісаць дзённікі. Многія з дайшоўшых да нас дзённікаў навейшага часу (як сведчыць характар запісаў у іх) вяліся аўтарамі для памяці, для таго, каб не забыць нічога істотнага і пасля на падставе запісаў аднавіць падзеі больш шырока; у іх адсутнічае такая характэрная рыса дзённікавых запісаў, як эмацыянальная насычанасць.

Аўтар успамінаў больш асцярожны, асабліва ў дачыненні да тых фактаў, якія ён з цягам часу пазначае як небяспечныя. Вывучаючы ўспаміны, неабходна вылучаць два перыяды ў жыцці мемуарыста: 1) да апісаных падзей, уключаючы апошнія; 2) ад часу падзей да часу стварэння ўспамінаў. Значэнне першага перыяду зразумела, значэнне ж другога істотнае таму, што пражытае мемуарыстам пасля апісаных ім падзей часам міжвольна накладвае на трактоўку мінулага асаблівы адбітак. У дачыненні да ўспамінаў у большай ступені, чым да іншых пісьмовых крыніц, трэба вызначыць пабуджальныя матывы, «сацыяльны заказ».

У навейшы час павялічваецца колькасць такіх відаў мемуарных крыніц, як біяграфічныя анкеты, аўтабіяграфіі, стэнаграфічныя запісы ўспамінаў і інш. Біяграфічныя анкеты (ці анкеты біяграфічнага характару) мелі афіцыйнае прызначэнне і змяшчалі пэўныя рэгламентаваныя звесткі. Гэты від дакументаў набыў асаблівае значэнне, паколькі партыйна-дзяржаўны апарат імкнуўся кантраляваць жыццё грамадзян. Дзесяцігоддзямі спецыяльныя службы распрацоўвалі анкетныя фармуляры, сачылі за дакладнасцю іх інфармацыі. Анкеты абавязкова запаўняліся ў выпадках, звязаных са зменай сацыяльнага становішча чалавека. Рэгламентаванасць зместу біяграфічных анкет прымушае многіх даследчыкаў адносіць іх не да жанру мемуарнай літаратуры, а да матэрыялаў справаводства ўстаноў, у выніку дзейнасці якіх яны фарміраваліся. Аўтабіяграфіі адрозніваюцца ад анкет не толькі тым, што іх змест вызначаецца самім аўтарам, але і большым аб'ёмам. На змест аўтабіяграфіі вялікі ўплыў аказвала іх прызначэнне (уступленне ў камсамол, у партыю, паступленне на працу і г. д.). У той час як істотная частка іншых відаў мемуарнай літаратуры навейшага часу апублікавана [48], біяграфічныя анкеты, аўтабіяграфіі, стэнаграфічныя запісы ўспамінаў захоўваюцца ў архівах і яшчэ толькі чакаюць сваіх даследчыкаў.

Асаблівае месца сярод гістарычных крыніц займаюць творы літаратуры. Яны не столькі дакументальна фіксуюць падзеі, колькі адлюстроўваюць эмоцыі,

адчуванні, роздум аўтараў аб пэўных падзеях і з'явах. Да прыкладу, многія з твораў К. Крапівы былі выкліканы рэакцыяй на характэрныя рысы рэчаіснасці («Дай ды дай» — хабарніцтвам, «Вось тут і пішы» — ідэалагізацыяй у літаратуры, «Хто смяецца апошнім» — паклёпніцтвам і рэпрэсіямі і інш.). Не менш карысныя для вывучэння пазначанай праблемы творы беларускіх літаратараў, якія самі выйшлі з вёскі, аб паўсядзённасці сялянскага жыцця (М. Зарэцкі і інш.) [49, с. 63—73].

Гісторыя паўсядзённасці, вусная гісторыя востра ставяць праблемы крыніц. Акрамя традыцыйных пісьмовых крыніц па гісторыі XX ст. сёння мы маем магчымасць выкарыстоўваць для рэканструкцыі ладу савецкай вёскі і асноўных этапаў яе развіцця аўдыявізуальныя крыніцы, якія ўключаюць прафесійна створаныя дакументальныя і мастацкія кінадакументы. Кінадакументы традыцыйна выдзяляюцца ў асобную групу гістарычных крыніц і падзяляюцца на 2 групы — дакументальныя і мастацкія. Іх надзейнасць, на думку большасці даследчыкаў, адрозніваецца: найбольш сапраўднымі і, адпаведна, больш каштоўнымі (не зусім абгрунтавана) лічацца дакументальныя фільмы, асабліва хроніка. Другая разнавіднасць кінадакументаў, мастацкае кіно, выклікала і па-ранейшаму выклікае цяжкасці з інтэпрэтацыяй, паколькі ў ёй прадстаўлена выдуманая рэальнасць, арганізаваная па законах мастацкага твора. Узнікае парадаксальная сітуацыя: па змоўчанні за мастацкімі кінастужкамі прызнаецца права на «гістарычную праўду», але яны практычна незапатрабаваныя. Фундаментальная праца В. М. Магідава, прысвечаная характарыстыцы інфармацыйнага патэнцыялу кінафотадакументаў, у прыватнасці дакументальнага кіно, фактычна гэта пацвердзіла [50].

Кіно мае сваю «мову», сімвалічнае выяўленне, спецыфічныя тэхналогіі. Усё гэта ўскладняе інтэрпрэтацыю закладзенай у фільмах інфармацыі, патрабуе распрацоўкі асаблівых методык аналізу кінадакументаў з улікам задач гістарычнага даследавання, сумяшчэння розных па характары выяўленчых і слоўных сімвалаў. Даволі працяглы час пераважная маса гісторыкаў арыентавалася на пісьмовыя крыніцы, не прымаючы пад увагу, што звыклыя для іх метады аналізу пісьмовых дакументаў не заўсёды адпавядаюць спецыфіцы аўдыявізуальных матэрыялаў. У даследчай практыцы пераважаюць падыходы, заснаваныя на ўспрыняцці фільма як вызначанага мастацкага феномена, гэтыя методыкі ўзнаўляюцца гісторыкамі, парушаючы прынцып гістарызму і пераўтвараючы гістарычны дыскурс у кіназнаўчы. Фільмы пра вёску 1930-х гг. выконвалі пэўную агітацыйную, прапагандысцкую функцыю, не адлюстроўваючы жыццё вёскі, а мадэлюючы вобразы, неабходныя для вырашэння задач сацыялістычнага будаўніцтва. У тэрміналогіі тых гадоў шырока выкарыстоўвалася паняцце «агітпрапфільм», пад якім выходзіла значная частка кінапрадукцыі тых гадоў, падкрэсліваючы іх ідэалагічную зададзенасць. Значны інфармацыйны патэнцыял фільмаў, які можа быць выкарыстаны для вывучэння гісторыі вёскі, і перш за ўсё праблем паўсядзённасці [51, с. 218—226].

На аснове савецкіх фільмаў сталінскага часу па 1920—30-х гг. Д. А. Панамарова паспрабавала вызначыць, як мадэляваліся сацыяльныя адносіны ў сельскіх супольнасцях 1930-х гг. СССР, спосаб структуравання сацыяльнай рэчаіснасці,

сістэму інстытутаў, скрозь прызму якіх тагачасны кінематограф прапаноўваў гледачу асэнсоўваць жыццё калгаснай вёскі [52]. Зразумела, што свет вёскі ў сталінскім кінематографе меў мала агульнага з сапраўдным жыццём. Разам з тым тагачаснае кіно ўтрымлівае ўскосную інфармацыю і пра пэўныя праблемы: калі героі фільма раптам заўважаюць, што не могуць, да прыкладу, пакінуць свой калгас без дазволу старшыні. У свядомасці сялянства павінна было зацвердзіцца, што новыя магчымасці адкрываюцца як для мужчын, так і жанчын, што сапраўды мела рэвалюцыйны характар. Вобраз ударніцы і стаханаўкі паказаны ў шматлікіх фільмах 1930-х гг. на першым плане.

Беларускія даследчыкі толькі распачынаюць вывучэнне «пісьмаў маленькага чалавека», альбо «пісьмаў ва ўладу». Гэта сялянскія скаргі, паведамленні і іншыя матэрыялы, якія захаваліся ў архівах (РДАЭ, РДАСПІ, НАРБ і інш.). Найбольш шматлікая з груп — перапіска сялян з прэсай. Гэтая група крыніц нясе не толькі інфармацыйныя веды аб жыцці вёскі 1920-х гг., але і эмацыянальную ацэнку часу самімі носьбітамі культуры. У другой палове XIX ст. сяляне нават не спадзяваліся, што хтосьці выслухае іх прапановы. Напярэдадні Сталыпінскай аграрнай рэформы сялянскія звароты сталі ўжо паўсядзённым фактам. Адчуўшы, што да іх меркавання прыслухоўваюцца, у сярэдзіне 1920-х гг. сяляне літаральна засыпалі вярхоўную ўладу пытаннямі, праектамі і скаргамі. Толькі ў «Сялянскую газету», створаную па рашэнні XII з'езда РКП(б), з 1923 па 1933 г. прыйшло каля 5 млн сялянскіх пісьмаў з розных куткоў СССР, у тым ліку з Беларусі. Тэматыка лістоў сялян 1920-х гг. адлюстроўвае важныя надзённыя праблемы і змены ў сялянскім жыцці. Кола пытанняў было наступным: беспрацоўе ў вёсцы, работа кааперацыі, саўгасаў і калгасаў, работа партыйных і камсамольскіх арганізацый, савецкіх органаў, культурна-асветніцкая работа ў вёсцы, суадносіны старога і новага быту, святкаванне савецкіх святаў, палітычная актыўнасць сялян, адносіны да рэлігіі, змены ў жыцці жанчын. Часцей і найбольш востра выяўлялася незадаволенасць у дачыненні да мясцовай улады, паводзінамі камсамольцаў і камуністаў, празмерным ужываннем самагону, пазначаліся зямельныя спрэчкі, негатыўныя адносіны сялян да рабочых, голад у вёсцы, актыўнасць жанчын, праблемы эканамічнага «выжывання» сялянскага двара. Танальнасць сялянскай карэспандэнцыі, такім чынам, розная. Гэта скаргі, паклёпы, роздумы, просьбы, рэкамендацыі, парады.

Своеасаблівасць перыядычнага друку (прэсы) вызначаецца тым, што яна з'яўляецца комплекснай крыніцай, якая аб'ядноўвае і традыцыйныя віды крыніц, і разнастайныя спецыфічныя жанры. Тут друкуюцца заканадаўчыя, справаводныя, статыстычныя дакументы, мемуары, літаратурныя творы. Другая група інфармацыі ствараецца самой перыёдыкай за кошт уласных крыніц і ў сваіх характэрных формах. Апошнія падзяляюць на матэрыялы інфармацыйныя, аналітычныя і мастацка-публіцыстычныя. Інфармацыйныя матэрыялы пры ўсёй разнастайнасці іх жанраў (заметка, справаздача, рэпартаж, інтэрв'ю) аб'ядноўвае імкненне хутка і дакладна перадаць звесткі аб падзеі, факце. Пры вывучэнні перыёдыкі, акрамя фактару часу, важна прымаць да ўвагі, кім ажыццяўляліся дадзеныя выданні і іх рэдакцыйная палітыка.

Публікацыі дакументаў, прысвечаныя мадэрнізацыі савецкай вёскі, уключаючы беларускую, прадпрымаліся ўжо ў 1930-я гг. Аднак найбольшая колькасць дакументальнага матэрыялу апублікавана ў апошнія 50 гадоў, пасля XX з'езда КПСС. За савецкім часам выйшла 36 тамоў «Гісторыі калектывізацыі сельскай гаспадаркі СССР», што ў сукупнасці з іншымі выданнямі па азначанай праблематыцы складае велізарны матэрыял для асэнсавання. Выключную ролю ў вывучэнні працэсу мадэрнізацыі беларускай вёскі маюць перыядычныя выданні 1920—30-х гг. [53]. Да прыкладу, ужо ў 1957 г. выйшаў зборнік дакументаў, які ўтрымліваў важнейшыя рашэнні партыі па калектывізацыі. А ў Беларусі выйшаў з друку том, прысвечаны кааператыўна-калгаснаму будаўніцтву [54]. Пры гэтым неабходна адзначыць, што ў БССР у серыі былі выдадзены тры тамы (два пад рэдакцыяй А. І. Азарава і ў 1985 г. — пад рэдакцыяй М. П. Касцюка) [55—57]. Гэтыя публікацыі дакументаў і матэрыялаў, як і іншыя выданні савецкай эпохі, адлюстроўвалі асаблівасці і магчымасці таго часу. Яны змяшчалі важнейшыя рашэнні партыі, урада, іншыя афіцыйнага характару дакументы. Публікатары ў шэрагу выпадкаў не мелі доступу да архіўных матэрыялаў, што заставаліся пад грыфам «сакрэтна». Тыя нешматлікія дакументы, якія трапілі ў рукі даследчыкам, давалі падставу пісаць аб некаторых адступленнях ад лініі партыі ці вызначаць такія дзеянні, як выяўленне кулацкага сабатажу і варожай барацьбы. У залежнасці ад добрасумленнасці публікатараў такога кшталту крыніцы перамяжоўваліся з дакументамі, якія адлюстроўвалі пераважна станоўчы бок калектыўнага будаўніцтва ў 1920—30-я гг.

На мяжы 1980—90-х гг. пад уплывам «галоснасці» ў СССР выйшлі з друку некалькі тамоў, дзе ўздымаліся аспекты насаджэння калектыўных форм калектывізацыі і голаду ва Украіне і інш. [58]. Увогуле за апошнія дзесяцігоддзі ў Расійскай Федэрацыі, ва Украіне ўбачылі свет дзясяткі публікацый дакументаў па тых ці іншых аспектах жыцця вяскоўцаў у 1920—30-я гг. [59]. У Беларусі, на жаль, такія выданні не ажыццяўляліся. Таму вельмі важным бачыцца аналіз тых зборнікаў, дзе ўтрымліваецца матэрыял аб працэсах савецкай мадэрнізацыі ў беларускай вёсцы.

Хацелася б пазначыць выданні, ажыццёўленыя з удзелам выдатнага сялpackназнаўца В. П. Данілава. Найбуйнейшым з іх з'яўляецца пяцітомнік «Трагедыя савецкай вёскі. Калектывізацыя і раскулачванне. 1927—1939». Пры адборы дакументаў для публікацыі выкарыстоўваліся матэрыялы, якія адлюстроўвалі ролю цэнтральнага кіраўніцтва ў правядзенні калектывізацыі, матэрыялы аб мясцовых працэсах, аб сялянскай рэакцыі, сельскіх традыцыях, эканамічных і экалагічных фактарах. Уключэнне аўтараў, што працавалі па савецкай тэматыцы дзясяткі гадоў, а таксама даследчыкаў з Паўднёвай Карэі, Канады, Вялікабрытаніі, ЗША і іншых краін дазволіла сканцэнтраваць увагу на тых крыніцах, якія не публікаваліся, выбраць такі кантэкст, які цікавіць і замежнага чытача. Зразумела, што ў выніку зборнік утрымлівае пераважна тыя матэрыялы, якія акрэсліваюць негатыўныя бакі калектывізацыі, незадаволенасць сялянства і яго барацьбу (як актыўную, так і пасіўную) супраць улады бальшавікоў. Пяцітомнік падрыхтава-

ны на належным археаграфічным узроўні, змяшчае шматлікія дадаткі (у тым ліку каментарыі па тагачасных установах і ведамствах, тлумачэнні па тэрміналагічным апараце, імянныя каментар і паказальнік, геаграфічны паказальнік, іншыя звесткі, якія істотна паляпшаюць працу даследчыка з дакументамі).

Першы том, які ахоплівае перыяд з мая 1927 г. па лістапад 1929 г., змяшчае матэрыялы, якія акрэсліваюць тыя дыскусіі, што адбываліся ў кіраўніцтве і грамадстве аб хлебанарыхтоўках і далейшым крызісам, кірункам развіцця савецкай вёскі (выступленні І. В. Сталіна, М. І. Бухарына і В. М. Молатава на ліпеньскім (1928 г.) Пленуме ЦК УКП(б), пісьмо М. І. Фрумкіна ў ЦК і ЦКК УКП(б) і інш.). Дакументы такога характару пра бальшавіцкае кіраўніцтва ў Беларусі адсутнічаюць. Разам з тым працэсы, якія назіраліся ў БССР гэтага часу, акрэсліваюцца не толькі ўскосна, але і праз інфармацыю з некаторых дакументаў. Гэта звесткі аб незадаволенасці сялянства хлебанарыхтоўкамі, працэсах калектывізацыі, прыцягненні да адказнасці прыватных гандляроў [60].

Другі том пяцітомнага выдання «Трагедыя савецкай вёскі. Калектывізацыя і раскулачванне» (лістапад 1929 г. — снежань 1930 г.) вызначаны пераходам да прымусовых метадаў «суцэльнай калектывізацыі», які распачаў адну з самых трагічных старонак савецкай, у тым ліку беларускай, вёскі. У склад дакументаў тома ўвайшлі рашэнні пленумаў бальшавіцкай партыі і іншыя «кіраўнічыя» дакументы. Асабліва цікавымі з'яўляюцца інфармацыйныя даведкі і агляды АДПУ. Адсутнасць арыентацыі на публікацыю, распаўсюджванне інфармацыі, наяўнасць паўнамоцных прадстаўнікоў ад АДПУ на месцах акрэслілі не толькі значную дакладнасць, але і паўнату крыніц. Матэрыялы АДПУ паказваюць, якім чынам ствараліся «папяровыя» калгасы і як фарміраваўся той «працэнт калектывізацыі», аб якім з высокіх трыбун гаварылі партыйныя дзеячы. Разам з тым нельга выкарыстоўваць гэтыя матэрыялы без супастаўлення іх інфармацыі са звесткамі Калгасцэнтра і Аддзела друку і інфармацыі СНК СССР [61].

Пасля рэзкага спаду тэмпаў калектывізацыі ўвосень 1930 г. вызначылася яе новая, больш магутная хваля. Яна дапаўнялася спробай рэалізацыі практычна нерэальных лічбаў хлебанарыхтовак праз харчразвёрстку. Дакументы, якія адлюстроўваюць гэтыя трагічныя старонкі гісторыі вёскі, увайшлі ў трэці том пяцітомніка. Асобную групу матэрыялаў тома складаюць матэрыялы аб формах, метадах і тэмпах калектывізацыі, высяленні «кулацкіх элементаў» і масавым голадзе ў шэрагу рэгіёнаў СССР. Аднак да сярэдзіны 1930-х гг. колькасць звестак аб тым паменшылася [62].

Да прыкладу, у чацвёртым томе выдання адсутнічаюць прамыя звесткі аб галадоўках на вёсцы ў 1935—1936 гг. кшталту тых, што мелі месца ў Беларусі ў 1934 г. Цяжка сцвярджаць, ці было гэта вынікам упарадкавання спраў у сельскай гаспадарцы краіны, ці знікненнем такой крыніцы, як данясенні намеснікаў начальнікаў палітаддзелаў МТС свайму кіраўніцтву ў Маскву, што з'яўляліся асноўным каналам падобнай інфармацыі. Аднак шматлікія просьбы да Сталіна і Молатава са скаргамі на бядотнае харчовае становішча, выезды калгаснікаў з напаўгалодных вёсак, факты са спецпаведамленняў мясцовых кіраванняў НКУС у цэнтр

дазваляюць меркаваць: такія з'явы маглі адбывацца і ў гэты час, асабліва пачынаючы з восені неўрадлівага 1936 г. [63].

У пятым томе «Трагедыі савецкай вёскі...» публікуюцца дакументы аб з'явах аднаго з самых трагічных для СССР этапаў, калі асноўным аб'ектам рэпрэсій у 1937—1938 гг. стала сялянства. Супраць яго былі накіраваны і самая масавая «кулацкая аперацыя», і «паказальныя судовыя працэсы». Дакументы вылучаны з раней недасягальных для даследчыка фондаў вышэйшых органаў партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва (ЦК УКП(б), ЦВК, СНК СССР), розных ведамстваў і арганізацый (НКУС, Вярхоўнага Суда, Пракуратуры і інш.). Значная ўвага надавалася становішчу сялян, іх настроям і рэакцыі на тое, што адбывалася [64].

Сапраўды ўнікальным стала выданне «Савецкая вёска вачыма УНК—АДПУ—НКУС. 1918—1939». Тут апублікаваны інфармацыйныя зводкі і агляды, тэматычныя даведкі і аналітычныя даклады, якія спецслужбы рыхтавалі для вузкага кола асоб вышэйшага дзяржаўнага і партыйнага кіраўніцтва. Яны ўтрымліваюць звесткі аб становішчы і настроях насельніцтва, аб палітычных падзеях і рухах у горадзе і на вёсцы, у сістэме кіравання і партыі, аб кааперацыі, царкве і г. д. — звесткі, якія збіраліся пастаянна ў маштабе велізарнай краіны [65]. У зборнік уключаны змястоўныя аналітычныя даклады, абагульняючыя даныя па сялянскім супраціве за 1920—30-я гг. Яго асноўнымі формамі сталі лістоўкі, выступленні «кулацтва» супраць нарыхтоўшчыкаў, мясцовых прадстаўнікоў улады (спробы забойстваў, пабоі, падпалы і г. д.), пратэсты грамады, петыцыі, лісты ў рэдакцыю і вышэйстаячыя інстанцыі. Асноўным штуршком да пратэсту, найчасцей напрыканцы 1920-х, становяцца хлебанарыхтоўкі. Пры гэтым, па меркаванні АДПУ, у Беларусі і ва Украіне пэўную ролю адыгрывалі дыверсійныя групы і «контррэвалюцыйныя» элементы, пацярпелыя ад савецкай улады [66, с. 1020]. Публікацыі дакументаў ажыццяўляліся выдатнымі прафесіяналамі з Інстытута Расійскай гісторыі РАН, архіва ФСБ РФ і іншых архіўных устаноў. Патрэбна мець на ўвазе, што значная частка тэкстаў — гэта машынапіс на папяроснай паперы з мінімальнымі інтэрваламі між радкоў, якія ўжо на час выкарыстання з цяжкасцю чыталіся. Як і іншыя крыніцы, зводкі УНК—АДПУ—НКУС пранізаны ідэалагічнымі стэрэатыпамі свайго часу, тым больш часу рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Сяляне, што ўдзельнічалі ў супраціве бальшавікам, называліся «бандытамі», «кулакамі», «ворагамі рэвалюцыі» [67].

З пачатку XXI ст. з'яўляецца ўсё больш тэматычных публікацый па гісторыі савецкай вёскі. Сярод іх вызначаецца выданне, падрыхтаванае пад рэдакцыяй М. А. Іўніцкага і прысвечанае падатковай палітыцы Савецкай дзяржавы [68]. Падатковая палітыка з'яўлялася ў 1920-я гг. не толькі фіскальным элементам, але і істотным сродкам рэалізацыі палітыкі ўлад на вёсцы. Спецыфіка рэгіёнаў былой Расійскай імперыі, а ў 1920—30-я гг. — асобных рэспублік традыцыйна не ўлічвалася. Таму выданне цікавае і з пункту гледжання даследавання беларускай вёскі. Зборнік уключае дакументы за 1928—1937 гг., калі працэсы савецкай мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі вызначаліся ва ўніфікаваных формах і метадах. У публікацыі змешчаны матэрыялы, якія сведчаць аб зменах у падатковай палітыцы,

рэакцыі мясцовых улад і насельніцтва на яе рэалізацыю, матэрыялы інспекцый і камісій аб выніках абследавання сістэмы падатковых выплат, займаў і льгот.

У апошнія гады з'явілася значная колькасць публікацый, прысвечаных аграрнай праблематыцы, сялянству, савецкай мадэрнізацыі на вёсцы. Шэраг публікацый раскрывае тэматыку сялянскага ўзброенага супраціву [69]. Дакументы змяшчаліся пераважна паводле храналагічнага прынцыпу, ахопліваючы перыяд з 1919 па 1921 г. і акцэнтуючы ўвагу на падзеях у Слуцкім павеце. Гэта даволі разнастайныя па змесце і форме гістарычныя крыніцы — ад допісаў у газету, успамінаў да статутаў, справаздач і г. д. Яны дазваляюць акрэсліць прычыны сялянскіх выступленняў, склад удзельнікаў і кіраўнікоў, лозунгі, формы і метады барацьбы. Разам з тым адсутнасць легенды да дакумента пазбаўляе чытача і нават даследчыка магчымасці суаднесці тыя ці іншыя падзеі з пэўнай з'явай, акрэсліць сувязі паміж публікацыямі. Публікацыя раней не вядомых дакументаў — істотны крок у вывучэнні праблемы, але яна не вычэрпвае ўсіх даследчыцкіх магчымасцей [70]. Каб аналізаваць выяўленыя гістарычныя крыніцы, неабходна веданне кантэксту, валоданне метадамі гістарычнага даследавання. Незадаволенасць сялянства на пачатку 1920-х гг. часта выяўлялася шляхам узброеных выступленняў. Сялянскія паўстанні ў гэты перыяд ахапілі ўсе тэрыторыі былой Расійскай імперыі, дзе ўсталявалася савецкая ўлада. Вывучэнне рэгіянальных асаблівасцей, кампаратыўнае вывучэнне сялянскіх выступленняў дазволіць больш глыбока і ўсебакова даследаваць праблему ўзаемаадносін сялянства з уладай у 1920—30-я гг.

Даследуючы пазначаную праблему, нельга пакідаць па-за ўвагай публікацыі савецкага часу. Безумоўна, дакументы да публікацыі адбіраліся не ўсе, часцей у іх чуваць голас улады, а не сялян. Разам з тым комплекснае вывучэнне крыніц, іх кампаратыўны аналіз, удакладненне разыходжанняў неабходна як у дачыненні да савецкіх публікацый, так і да постсавецкіх, незалежна ад таго, з якімі «незалежнымі» мэтамі ці якімі аўтарамі яны выдаваліся. Вялікую ролю ў пошуку і вызначэнні дакументальных публікацый савецкага часу мае даведнік зборнікаў дакументаў, які выйшаў у свет у савецкіх і расійскіх выдавецтвах у 1917—2000 гг. Даведнік падрыхтаваны І. А. Казаковай і ўтрымлівае вялікую колькасць паказальнікаў, якія ствараюць дадатковыя магчымасці для даследчыкаў [71].

Значны фактычны матэрыял утрымліваецца ў афіцыйных крыніцах: стэнаграфічных справаздачах і рэзалюцыях з'ездаў, канферэнцый, Пленумаў ЦК РКП(б) — УКП(б) і Кампартыі Беларусі [72—76], справаздачах Народнага камісарыята земляробства (НКЗ) рэспублікі, акружных партыйных органаў і выканаўчых камітэтаў, грамадскіх і кааператыўных устаноў [77—84]. Да гэтай жа групы крыніц прымыкаюць насычаныя матэрыялы з'ездаў Саветаў і сесій Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта (ЦВК) Беларускай ССР [85, 86]. Пазначаныя дакументы і матэрыялы дазваляюць не толькі прааналізаваць палітыку партыйных, дзяржаўных і кааператыўных органаў у кірунку мадэрнізацыі вёскі, паказаць умовы ўтварэння і дзейнасці калектыўных гаспадарак, тэхнічнага аснашчэння сельскагаспадарчай працы, але і змяшчаюць непасрэдныя даныя аб адносінах да гэтых працэсаў мясцовага сялянства.

Істотнае значэнне для вывучэння кірункаў і форм савецкай мадэрнізацыі маюць статыстычныя крыніцы (рознага роду даведнікі, зборнікі, штогоднікі і г. д.) [87—88]. Неабходна ўлічваць, што да 1928 г. статыстыка калгаснага будаўніцтва ў рэспубліцы, як і ў цэлым у СССР, з'яўлялася амаль выключна ведамаснай (НКЗ, НКФ, Белсельсаюза і інш.). Праграмы абследаванняў ставілі на мэце атрыманне дастаткова вузкага кола звестак. У асноўным паказвалася колькасць калгасаў, іх зямельная плошча, забяспечанасць жывым і нежывым інвентаром, пабудовамі. Радзей прыводзіліся даныя аб сацыяльным складзе калектываў. У абагульненыя звесткі Белсельсаюза аб колькасці калгасаў не былі ўключаны тыя камуны, арцелі і таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі, якія, праіснаваўшы вядомы перыяд часу, па розных прычынах распаліся ці зліліся ў працэсе ўзбуйнення [87, с. 36]. У зборніках Наркамфіна СССР [89—91], наадварот, змяшчаюцца перабольшаныя даныя аб колькасці калектыўных гаспадарак. Інфармацыйныя магчымасці апошняй з названых крыніц звужаюцца зменамі ў прынцыпах падаткаабкладання і ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні на працягу 1924—1928 гг.

Не разглядаючы архіўныя фонды як пэўную сінергетычную мадэль, не вывучаючы асаблівасці іх фарміравання і структуру, гісторыкі-спажыўцы ідуць у архівы, па трапным выразе прафесара Т. І. Хархордзінай, «з мэтай вырываць (красці) факты» [92]. Не заўсёды прадстаўнікі навамодных кірункаў умеюць прааналізаваць сабраны эмпірычны матэрыял. А гэта спараджае недавер да іх вывадаў. Неабходна ўлічваць тыя ўніфікацыйныя і цэнтралізацыйныя працэсы ў СССР, якія выявіліся з канца 1920-х гг. У сувязі з гэтым істотнае значэнне набываюць дакументы органаў кіравання СССР, якія захоўваюцца пераважна ў цэнтральных архівах у Маскве. Значная колькасць дакументаў па гісторыі беларускай вёскі міжваеннага часу знаходзіцца ў Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Ён быў створаны ў 1992 г. у выніку аб'яднання Цэнтральнага дзяржаўнага архіва РСФСР і Цэнтральнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі, вышэйшых органаў улады і дзяржаўнага кіравання СССР (ЦДАКР СССР). Апошні ўзнік у 1961 г. на аснове ліквідаванага Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва, з яго складу ў наваствораны Цэнтральны дзяржаўны архіў народнай гаспадаркі (ЦДАНГ), зараз Расійскі дзяржаўны архіў эканомікі (РДАЭ), былі выдзелены фонды па эканамічнай гісторыі савецкага часу. ДАРФ захоўвае дакументы вышэйшых органаў дзяржаўнай улады, у прыватнасці Цэнтральнага выканаўчага камітэта СССР (ЦВК СССР).

Велізарны аб'ём дакументаў ускладняе пошук крыніц, якія датычацца гісторыі беларускай вёскі ў міжваенны час. Трэба мець ва ўвазе, што шэраг фондаў і асобных дакументаў могуць закранаць вяскоўцаў ускосна і характарызаваць, да прыкладу, тыя іх групы, якія пераязджалі ў горад, прадстаўлялі вёску на партыйных сходах і інш. Пошук дакументаў фонду больш эфектыўна можа ажыццяўляцца па пазначаных датах спраў. Што ж тычыцца загалоўкаў, то яны не заўсёды адпавядаюць зместу.

Неабходна адзначыць ролю Наркамата земляробства РСФСР як агульнадзяржаўнага і каардынуючага цэнтра ў галіне сельскай гаспадаркі, якая ўзмацнілася

з утварэннем СССР. Асобныя прэтэнзіі НКЗ СССР на ўніверсальнасць сваіх рашэнняў сустрэлі істотнае супрацьдзеянне з боку БССР і Украіны. Становішча змянілася толькі ў 1929 г., калі быў створаны Наркамзем СССР. Наркамзем РСФСР пачынае выконваць функцыі выключна рэспубліканскага органа кіравання сельскай гаспадаркай. Дакументы Наркамзема РСФСР за 1918—1922 гг. захаваліся часткова, стан з іх за 1923—1925 гг. незадавальняючы, шмат якія надрукаваны на папяроснай паперы, утрымліваюць малакантрасны ці затухаючы тэкст. У выніку на мікрафільмах асобныя сказы можна вызначаць толькі па сэнсе.

Улічваючы спецыфіку сацыяльнай структуры Беларусі і калектыўнага гаспадарання ў БССР 1920-х гг., істотную цікавасць мае фонд Р7541 «Камітэт па зямельнаму ўпарадкаванню працоўных яўрэяў (Камзет) пры Прэзідыуме Савета Нацыянальнага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР». Менавіта тут мы знаходзім звесткі пра абставіны і канкрэтныя ўмовы фарміравання адпаведнай структуры, звесткі пра міграцыйныя працэсы ў 1920—30-я гг., іншыя статыстычныя даныя пра яўрэйскую дэмаграфію.

Палітыку цэнтральных дзяржаўных і кааператыўных органаў удалося прасачыць, абапіраючыся на дакументы, што змяшчаюцца ў фондах РДАЭ: Наркамзема РСФСР, Хлебацэнтра (Усесаюзны саюз сельскагаспадарчай кааперацыі па вытворчасці, перапрацоўцы і збыце збожжавых і маслічных культур), Усерасійскага саюза сельскагаспадарчых калектываў (Калгасцэнтра РСФСР).

Найбольшы комплекс крыніц па гісторыі беларускай вёскі міжваеннага часу захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (НАРБ). На аснове даных з фондаў Белсельсаюза і Белкалгассаюза (Усебеларускі саюз сельскагаспадарчых калектываў, у студзені 1930 г. перайменаваны ў Беларускі цэнтральны саюз сельскагаспадарчых калектываў (Белкалгасцэнтр)) можна вызначыць дынаміку і накіраванасць мадэрнізацыйных працэсаў у 1920—30-я гг., сацыяльны склад членаў калектыўных гаспадарак, забяспечанасць калгасаў жывым і нежывым інвентаром, шмат іншых фактаў па гісторыі даследуемага пытання.

Важнейшай крыніцай, якая характарызуе палітыку ўлад на вёсцы ў 1920—30-я гг., з’яўляюцца дакументы Наркамата земляробства БССР, што складаюць у НАРБ асобны фонд (ф. 48). Такая назва зямельнага органа БССР вызначылася толькі ў снежні 1920 г. Для разумення ролі і кірунку дзейнасці Наркамата земляробства БССР неабходна адзначыць адсутнасць агульнасаюзнага зямельнага органа, а таксама тое, што на працягу вывучаемага перыяду выключную большасць насельніцтва Беларусі складалі вяскоўцы. Мясцовыя зямельныя органы фарміраваліся ў адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі зменамі (з 1930 г. — непасрэдна раённыя зямельныя аддзелы). Значная частка дакументаў Віцебскага і Гомельскага губернскіх зямельных аддзелаў да сярэдзіны 1920-х гг. знаходзіцца ў расійскіх архівах (РДАЭ, ДАРФ).

Удакладненню паказчыкаў колькасці калектыўных гаспадарак і сацыяльнага складу ўдзельнікаў калгаснага будаўніцтва ў сярэдзіне 1920-х гг. садзейнічала распрацоўка матэрыялаў абследаванняў калгасаў, праведзеных работнікамі Народнага камісарыята рабоча-сялянскай інспекцыі БССР (ф. 101). Каштоўныя звесткі

аб этнасацыяльных аспектах мадэрнізацыі ў Беларусі атрыманы з фондаў Камісіі па зямельным упарадкаванні працоўных яўрэяў пры ЦВК БССР (Белкамзет) і Камісіі па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі пры ЦВК БССР. Распрацоўка фондаў Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта (ЦВК), Савета Народных Камісараў БССР, Эканамічнага савета (ЭКАСА) пры СНК БССР і іншых дазволіла ахарактарызаваць палітыку рэспубліканскіх органаў дзяржаўнай улады і дзяржаўнага кіравання рэспублікі. Аналізуючы дакументы ЦВК БССР у складзе НАРБ (ф. 6), можна вызначыць дзве буйныя групы: матэрыялы з'ездаў Саветаў, сесій ЦВК БССР і матэрыялы Прэзідыума, Сакратарыята ЦВК БССР. Першыя адлюстроўваюць заканадаўчую дзейнасць ЦВК, у тым ліку па зямельным пытанні, развіцці сельскай гаспадаркі, жыцці вёскі. Гэта пастановы аб свабодным выбары форм землекарыстання, адзіным сельскагаспадарчым падатку, кааператыванні, землеўпарадкаванні і г. д. Другая група дакументаў адлюстроўвае рашэнні па пэўных пытаннях сацыяльна-эканамічнага жыцця, кадравыя прызначэнні (у прыватнасці, зацвярджэнні наркамаў земляробства, старшынь камісій ЦВК і г. д.).

Па-свойму ўнікальны і малаўжываемы беларускімі даследчыкамі комплекс матэрыялаў, які садзейнічаў вызначэнню ступені абагульнення сродкаў вытворчасці, арганізацыі працы і размеркавання ў калектыўных гаспадарках на працягу даследуемага перыяду, уяўляюць асобныя дакументы фонду Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення (ЦСУ) БССР (ф. 30).

Асаблівую ролю для даследавання беларускай вёскі ў 1921—1939 гг. маюць дакументы Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі. Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі (далей — КП(б)Б), за выключэннем кароткага перыяду пачатку 1920-х гг., была адзінай партыяй у Савецкай Беларусі, да таго ж партыяй кіруючай. Ужо да сярэдзіны 1920-х гг. склалася жорсткая сістэма партыйнага кіравання і кантролю. Усе прымаемыя ўрадам БССР і кіраўніцтвам на месцах рашэнні ўзгадняліся з адпаведнымі партыйнымі органамі. Дарэчы, пры Цэнтральным Бюро Кампартыі рэспублікі ў 1921 г. была створана Камісія па збіранні і вывучэнні матэрыялаў па гісторыі КП(б)Б і Кастрычніцкай рэвалюцыі, рэарганізаваная ў 1929 г. у навукова-даследчы Інстытут гісторыі партыі. У гэты ж час у структуры Інстытута быў створаны партыйны архіў. Важным аспектам з'яўляецца тое, што дакументацыя ЦК КП(б)Б захоўвалася да 26 чэрвеня 1941 г. у Магілёве (як і палітаддзелаў МТС, кантрольных камісій). У выніку дакументы за 1920—30-я гг. захаваліся ў архіве (і адпаведна ў фондзе ЦК КП(б)Б) найбольш поўна [93]. У 1990 г. партархіў Інстытута гісторыі партыі і партархіў Мінскага абкама КПБ былі аб'яднаны, і на іх базе быў створаны Цэнтральны партыйны архіў Кампартыі Беларусі. Менавіта яго фонды склалі частку створанага Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (за выключэннем дакументаў мясцовых партыйных арганізацый, перададзеных у Дзяржархіў Мінскай вобласці).

Такім чынам, адным з важнейшых збораў крыніц пра гісторыю беларускай вёскі з'яўляецца фонд 4п Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, які на кастрычнік 1993 г. налічваў больш за 100 000 спраў. У выніку ўдасканалення вопісаў 26 000 спраў за 1918—1941 гг. удакладняліся загалоўкі і крайнія

даты спраў, фондавая і структурная прыналежнасць. Пасля перасістэматызацыі спраў на дакументы агульнага справаводства за 1918—1941 гг. быў складзены вопіс № 1 [94]. Вопіс уключыў разнастайныя віды дакументацыі, найперш афіцыйнай: пастановы, рэзалюцыі ЦК КП(б)Б, пратаколы і стэнаграмы з'ездаў Кампартыі Беларусі, рознага кшталту справаздачы і інфармацыя, што рыхтавалася да з'ездаў, і інш. У складзе фонду 4п захоўваюцца такія віды гістарычных крыніц, як пасведчанні, мандаты, артыкулы, лісты многіх вядомых партыйных і савецкіх кіраўнікоў БССР (І. А. Адамовіча, У. М. Ігнатоўскага, К. В. Гея і інш.). Значная частка дакументаў фонду ЦК КП(б)Б распрацавана беларускімі даследчыкамі, найперш І. М. Ігнаценкам, М. С. Сташкевічам, Р. П. Платонавым. Аднак ступень апублікаванасці гістарычных крыніц, якія змяшчае фонд, невялікая.

Істотны масіў крыніц па гісторыі беларускай савецкай вёскі захоўваецца ў дзяржаўных архівах Віцебскай вобласці (ДАВВ), Гомельскай вобласці (ДАГВ) і Мінскай вобласці (ДАМВ). Фактычны матэрыял абласных архіваў дазволіў канкрэтызаваць многія аспекты мадэрнізацыйных працэсаў на месцах. Найбольш цікавыя звесткі па аналізаваным пытанні змяшчаюцца ў фондах губернскіх (акруговых) зямельных аддзелаў і саюзаў сельгаскааперацыі.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Тихомиров А. В.* Взаимоотношения БССР и РСФСР в 1919—1921 гг.: противоречивое партнерство // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 2003. № 3.

2. Образование БССР : сб. док. М. ; Л., 1949.

3. *Барановский Е.* Некоторые вопросы национальной политики Коммунистической партии Белоруссии в 1920—192 годах // Вопр. истории : тез. докл. XII конф. молодых ученых Белорусской ССР. Минск, 1969.

4. *Барановский Е. И.* Деятельность Коммунистической партии Белоруссии по осуществению ленинской национальной политики в 1921—1925 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук. Минск, 1973.

5. Белорусская социалистическая республика в 1922/23 г.: к 5-му съезду Советов Белоруссии. Минск : Изд. Совнаркома Белоруссии. 424 с.

6. Переписка с ВЦИК об аннулировании постановления СНК УССР от 22 мая об утверждении Всеукраинской комиссии по отсрочкам ветеринарного персонала 18 августа 1922 — 21 сентября 1922 на 5 л. // РДАЭ. Ф. 478. Воп. 1. Спр. 889.

7. СУ БССР. 1922. № 5.

8. Материалы о передаче Наркомзему технических и подсобных сельскохозяйственных предприятий, находящихся на территории трестированных совхозов (протоколы, инструкции, докл. записки, письма) (5 июня 1923 — 17 марта 1925) на 120 л. // РДАЭ. Ф. 478. Воп.1. Спр. 1108.

9. Земельный кодекс БССР, принятый на II сессии Центрального исполнительного комитета БССР с подробным алфавитно-предметным указателем. Издание официальное. Минск : Наркомюст Белоруссии, 1923. 42 с.

10. *Пятровіч А. Я.* Зямельны кодэкс Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі ў запытаннях і адказах. Мінск : Белтрэстдрук, 1923. 48 с.

11. Земельный кодекс Белорусской Социалистической Советской Республики. Минск : Издание Агитпропа Белбюро ЦК РКП, 1924. 59 с.

12. Земельный кодекс БССР с изданными в его развитие до 1 июля 1927 г. узаконениями, правилами, инструкциями и циркулярами, а также разъяснениями и тезисами из определений особой Коллегии высшего контроля по земельным делам / Я. И. Лобановский [и др.]. Минск, 1927. 350 с.

13. Земельный кодекс БССР (введен в действие с 1 апреля 1925 г.). Минск : Изд. Отдела законодательных предложений Наркомюста БССР, 1925. 40 с.

14. Зямельны кодэкс БССР / Наркамзем БССР. Мінск, 1929.

15. *Ходзін С. М.* Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі : дапаможнік. Мінск : БДУ, 2012. 255 с.

16. *Чемерисский И. А.* Сельскохозяйственное производство СССР в 1920—1925 гг. по статистическим источникам // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы. М., 1970.

17. *Бокарев Ю. П.* Бюджетные обследования крестьянских хозяйств как историческнй источник. М., 1981.

18. ДАВВ. Ф. 191. Воп. 1. Спр. 1.

19. Инструкции для разработки материалов гнезд динамического обследования 1927 г. М., 1929.

20. Отчет Народного Комиссариата Земледелия БССР за 1924/25 хозяйственный год (с 1 октября 1924 г. по 1 октября 1925 г.). Минск : Наркомзем Белоруссии, 1926. 183 с.

21. Отчет Народного Комиссариата Земледелия БССР за 1925/26 хозяйственный год (с 1 октября 1925 г. по 1 октября 1926 г.). Минск : Наркомзем Белоруссии, 1927. 240 с.

22. Отчет Народного Комиссариата Земледелия БССР за 1926/27 хозяйственный год (с 1 октября 1926 г. по 1 октября 1927 г.). Минск : Наркомзем Белоруссии, 1928. 252 с.

23. Пастановы 2-й сэсіі Савету Саюзу Калектыўных Гаспадарак Б.С.С.Р. 22—25 лютага 1929 г. Менск, 1929. 20 с.

24. Всесоюзная перепись населения 17 декабря 1926 г. : крат. сводки / Центр. стат. упр. СССР, Отд. переписи. М. : Изд. ЦСУ СССР, 1928 ; Вып. 5 : Возраст и грамотность. Европейская часть РСФСР. Белорусская ССР.

25. Всесоюзная перепись населения 1926 года = Recensement de la population de L'U. R. S. S. / Центр. стат. упр. СССР, Отд. переписи. М. : Изд. ЦСУ Союза ССР, 1928—1929; Т. 10 : Белорусская Советская Социалистическая Республика : Народность. Родной язык. Возраст. Грамотность. 289 с. ; Т. 27 : Белорусская Советская Социалистическая Республика : Занятия. 155. Алф. указ. : С. 154—156 ; Т. 44 : Белорусская Советская Социалистическая Республика : Семейн. сост. Место рождения и продолжительность проживания. Увечные и психические больные. 203 с.

26. Гомель и городские поселения Гомельщины : Предвар. итоги переписи 1925 г. и некоторые дан. текущих учетов и обследований: [Крат. справ. сведения] / БССР, Гомел. окр. стат. бюро. Речица : Тип. Комтреста, 1927.

27. Праферансаў. Стэнаграма даклада кіраўніка ЦСУ БССР тав. Праферансава на пасяджэнні СНК БССР 21 лістап. 1928 г. па пытанні аб выніках дэмаграфічнага перапісу 1926 г. Мінск : Выд. Кіраўн. спраў СНК ; Выд. Эканам. Нарады БССР, 1928.

28. *Воробьев Н. Я.* Всесоюзная перепись населения 1926 года. 2-е изд. М. : Госстатиздат, 1957. 107 с.

29. *Поляков Ю. А., Жиромская В. Б., Киселев И. Н.* Полвека молчания: Всесоюзная перепись населения 1937 г. // Социол. исследования. 1990. № 6—8.

30. Итоги переписи населения 1937 г. // Вестн. статистики. 1990. № 7.

31. Всесоюзная перепись населения 1937 г.: краткие итоги ; сост. : Н. А. Араловец [и др.] ; вступ. ст. В. Б. Жиромский [и др.]. М. : Ин-т истории СССР, 1991. 239 с.

32. Всесоюзная перепись населения 1937 года: общие итоги : сб. док. и материалов. М. : РОССПЭН, 2007. С. 8—19.

33. Всесоюзная перепись населения 1937 года / РАН, Ин-т рос. истории. М. : Наука, 1996. С. 144—148.

34. Бланкі і падручнікі для счётчыка ў сельскіх мясцовасцях : Усесаюз. перапіс насельніцтва 1937 г. / Цэнтр. кіраўн. нар.-гасп. учота Дзяржплана СССР. Мінск, 1937.

35. Інструкцыя па арганізацыі падрыхтоўкі і правядзення Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1937 года / Кіраўн. нар.-гасп. учота Дзяржплана БССР. Мінск, 1937.

36. Аб усесаюзным перапісу насельніцтва 1937 года : Што кожны павінен ведаць аб перапісу. Мінск : Выд. КНГУ БССР, 1936.

37. *Поляков Ю. А., Жиромская В. Б., Киселев И. Н.* Полвека под грифом «секретно»: Всесоюзная перепись населения 1937 года. М. : Наука, 1996. 152 с.

38. Перечень и словарь народностей. М., 1927.

39. Вестник статистики. 1956. № 6.

40. Всесоюзная перепись населения 1939 года: основные итоги : сб. док. М. : Наука, 1992. 256 с.

41. Всесоюзная перепись населения 1939 года: основные итоги. Россия : сб. док. СПб. : Русско-Балтийский информационный центр «БЛИЦ», 1999. 208 с.

42. Докладная записка начальнику Отдела актов гражданского состояния НКВД СССР М. М. Алиевского наркому внутренних дел СССР Н. И. Ежову о резком падении влияния сезонности на рождаемость и браки в СССР. 29 окт. 1926 г. // Трагедия сов. деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927–1939 : в 5 т. Т. 4 : 1934–1936 / под ред. В. Данилова, Р. Маннинг, Л. Виолы : отв. ред. Ю. Мошков. М. : РОССПЭН, 2002. 1056 с.

43. Батрачество и пастушество в СССР. Центральное статистическое управление. Сектор статистики труда. Секция статистики труда в сельском и лесном хозяйстве. М. : Статиздат ЦСУ СССР, 14 тип. «Мосполиграф», 1929. 127 с.

44. Естественное движение населения Союза ССР в 1926 г. Центральное статистическое управление СССР. Сектор социальной статистики. Секция статистики социального состава и движение населения. М., 1929. Т. 1. Вып. 2. 179 с.

45. Естественное движение населения Союза ССР в 1923—1925 гг. Центральное статистическое управление СССР. Сектор социальной статистики. Секция статистики социального состава и движение населения. М., 1928. Т. 1. Вып. 1. 112 с.

46. *Ковалев С. А.* Сельское расселение: географическое исследование / под ред. проф. Ю. Г. Саушкина. М. : Изд-во Моск. ун-та, 1963. 371 с.

47. *Урланис Б. Ц.* Рождаемость и продолжительность жизни в СССР. М. : Госстатиздат, 1963. 136 с.

48. Савецкая Беларусь ва ўспамінах сучаснікаў: анатаваны паказальнік мемуарнай літаратуры. 1917—1972. Мінск, 1993.

49. *Марціновіч А.* Жыцця вірлівыя павароты // Беларус. думка. 2001. № 10.

50. *Магидов В. М.* Кинофотофонодокументы в контексте исторического знания. М., 2005. 440 с.

51. *Мазур Л. Н.* Российская деревня в условиях урбанизации: региональное измерение (вторая половина XIX–XX в.). Екатеринбург : Изд-во Урал. ун-та, 2012. 472 с.

52. *Пономарева Д. А.* «Потемкинская деревня»: крестьянский мир сталинского кинематографа // Отеч. записки. 2004. № 2.

53. Бальшавік Беларусі: тэарэт. і паліт. журн. ЦК КП(б)Б. 1927—1929; Беларуская вёска: Сялянская газета ЦК Камуністычнай партыі (б) Беларусі. 1924—1929; Звезда (Зьвязда): Орган Центрального Комитета Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии. 1921—1929; Известия Гомельского губ. Комитета РКП(б). 1924; Коллективист: Орган Наркомзема РСФСР. 1925—1927; Колхозцентр: Информационный бюллетень. 1928; Кооперацыйнае жыцьцё: Орган Белкаапсаюза, Белсельсаюза, Белсельбанка, Беларускага аддзялення Усекабанка. 1925—1927; Малады Араты: Орган ЦК ЛКСМБ. 1924—1925; На аграрном фронте: Орган аграрной секции Коммунистической академии. 1927—1928; Плуг: Сельскагаспадарчы часопіс Наркамзема БССР. 1927—1928; Полесский коммунар: Орган Гомельского губкома ВКП(б). 1926; Савецкая Беларусь: Орган ЦВК і СНК БССР. 1921—1928; Советское строительство (Савецкае будаўніцтва): Ежемесячный политико-экономический журнал Госплана БССР. 1926—1928; Сельская і лясная гаспадарка: Выд. Белар. нав.-дасл. ін-ты сельск. і лясн. гасп. імя У. І. Леніна, Народнага Камісарыята Земляробства і Саюза сельгаспрацаўнікоў Беларусі. 1927—1928 і інш.

54. Кооперативно-колхозное строительство в Белорусской ССР (1917—1927 гг.) : сб. док. и материалов. Минск : Наука и техника, 1980. 309 с.

55. Проведение сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР (ноябрь 1929—1932 гг.) / под ред. А. И. Азарова. Минск, 1973. 424 с.

56. Подготовка сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР (ноябрь 1927 г. — ноябрь 1929 г.) / под ред. А. И. Азарова. Минск, 1976. 271 с.

57. Завершение коллективизации сельского хозяйства и организационно-хозяйственное укрепление колхозов Белорусской ССР (1933 — июнь 1941 г.) / глав. ред. М. П. Костюк. Минск, 1985. 286 с.

58. Голод 1932—1933 років на Україні: очима істориків, мовою документів / редкол. : Ф. М. Рудич (голова), І. Ф. Курас [и др.]. Київ, 1990. 605 с.; Колективізація і голод на Україні. 1929—1933 / відн. ред. С. В. Кульчицкий. Київ, 1992. 732 с.

59. Политика раскрестьянивания в Сибири. Вып. 1 : Этапы и методы ликвидации крестьянского хозяйства 1930—1940 / отв. ред В. А. Ильиных, О. К. Кавцевич. Новосибирск, 2000. Голод в СССР. 1929—1934 : в 3 т. Т. 1 : 1929 — июль 1932 / отв. сост. В. В. Кондрашин : в 2 кн. Кн. 1. М. : МФД, 2011.

656 с. ; Кн. 2. М. : МФД, 2011. 560 с. ; Голод в СССР. 1929–1934 : в 3 т. Т. 2 : Июль 1932 — июль 1933 / отв. сост. В. В. Кондрашин. М. : МФД, 2012. 912 с. ; Политбюро и крестьянство: высылка, спецпоселение. 1930—1940 : в 2 кн. Кн. 2 / отв. ред. Н. Н. Покровский, В. П. Данилов, С. А. Красильников, Л. Виола. М. : РОССПЭН, 2006. 1120 с.

60. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927—1939 : в 5 т. Т. 1 : Май 1927 — ноябрь 1929 / под ред. В. Данилова, Р. Маннинг, Л. Виолы ; отв. ред. В. П. Данилов. М. : РОССПЭН, 1999. 880 с.

61. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927—1939 : в 5 т. Т. 2 : Ноябрь 1929 — декабрь 1930 / под ред. В. Данилова, Р. Маннинг, Л. Виолы ; отв. ред. Н. Ивницкий. М. : РОССПЭН, 2000. 927 с.

62. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927—1939 : в 5 т. Т. 3 : Конец 1930–1933 / под ред. В. Данилова, Р. Маннинг, Л. Виолы ; отв. ред. И. Зеленин. М. : РОССПЭН, 2001. 1008 с.

63. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927—1939 : в 5 т. Т. 4 : 1934—1936 / под ред. В. Данилова, Р. Маннинг, Л. Виолы ; отв. ред. Ю. Мошков. М. : РОССПЭН, 2002. 1056 с.

64. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927—1939 : в 5 т. Т. 5 : 1937—1939. Кн. 1 : 1937 г. ; отв. ред. В. Данилов, Р. Маннинг. М. : РОССПЭН, 2004. 648 с. ; Кн. 2 : 1938—1939 / под ред. В. Данилова ; отв. ред. В. Данилов. М. : РОССПЭН, 2006. 704 с.

65. Советская деревня глазами ВЧК — ОГПУ — НКВД. 1918—1939. Документы и материалы : в 4 т. Т. 1 : 1918—1922 гг. / под ред. А. Береловича, В. Данилова. М. : РОССПЭН, 2000. 864 с.

66. Советская деревня глазами ВЧК — ОГПУ — НКВД. 1918—1939. Документы и материалы : в 4 т. Т. 2 : 1923–1929 гг. ; отв. ред. А. Берелович, В. Данилов. М. : РОССПЭН, 2000. 1168 с.

67. Советская деревня глазами ВЧК — ОГПУ — НКВД. 1918—1939. Документы и материалы : в 4 т. Т. 3 : 1930—1934 гг. Кн. 1 : 1930—1931 гг. ; отв. ред. А. Берелович, В. Данилов. М. : РОССПЭН, 2003. 864 с. ; Кн. 2 : 1932—1934 гг. М., 2005. 840 с.

68. «Тянут с мужика последние жилы...». Налоговая политика в деревне (1928—1937 гг.) : сб. док. и материалов / редкол. : Н. А. Ивницкий (отв. ред.) [и др.]. М. : Собрание, 2007. 638 с.

69. Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах / уклад. : А. Гесь [і інш.]. Мінск : Энцыклапедыкс, 2001. 274 с.

70. *Стужынская Н. І.* З гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціву ў 1920-я гг. Вільня : Наша будучыня, 2011. 384 с.

71. Открытый архив — 2: справочник сборников документов, вышедших в свет в отечественных издательствах в 1917—2000 гг. / авт.-сост. И. А. Кондакова. М. : РОССПЭН, 2005. 432 с.

72. Коллективизация сельского хозяйства. Важнейшие решения Коммунистической партии и советского правительства. 1927—1935. М., 1957.

73. Четырнадцатая конференция Российской Коммунистической партии (большевиков) : стеногр. отчет. М. ; Л. : Госиздат, 1925. 335 с.

74. Пятнадцатый съезд ВКП(б). Дек. 1927 г. : стеногр. отчет : в 2 т. М. : Политиздат, 1962.

75. Стэнограма і рэзолюцыі верасеньскага Пленуму ЦК КП(б)Б (5—8 верасьня 1929 г.). Менск, 1929. 382 с.

76. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и Пленумов ЦК. 9-е изд., доп. и испр. Т. 4. 1926—1929. М. : Политиздат, 1984.

77. Отчет Народного Комиссариата Земледелия БССР за 1922 г. (с 1 янв. по 1 окт.). Минск, 1923.

78. Отчет Народного Комиссариата Земледелия БССР за 1922/23 хозяйственный год (с 1-го октября 1922 г. по 1-ое октября 1923 г.). Минск : Наркомзем Белоруссии, 1924. 239 с.

79. Отчет Народного Комиссариата Земледелия БССР за 1923/24 хозяйственный год (с 1-го октября 1923 г. по 1-ое октября 1924 г.). Минск : Наркомзем Белоруссии, 1925. 324 с.

80. Отчет Гомельской губернской контрольной комиссии РКП(б) XIII Губернской Партконференции. Гомель, 1925.

81. Отчет Мозырского Окружного Комитета КП(б)Б за время с 1 октября 1924 г. по 1 октября 1925 г. Мозырь, 1925. 169 с.

82. Справаздача аб дзейнасьці Аршанскага Акруговага Выканаўчага Камітэту. Ворша, 1929. 161 с.

83. Белсельсаюз: Справаздача за 1926/27 апэрацыйны год (6-ы год дзейнасці). Менск, 1928. 93 с.

84. Белсельсаюз: Справаздача за 1927/28 апэрацыйны год (7-ы год дзейнасьці). Менск, 1929. 116 с.
85. ЦВК БССР. 2-я сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР VIII скліканьня: Пастановы. Менск, 1928. 46 с.
86. Съезды Советов в документах. 1917—1936. М., 1960. Т. 3. 399 с.
87. Статистический ежегодник. 1923—1924. Минск : ЦСУ БССР, 1925.
88. Белорусская ССР в цифрах: к 10-летию существования БССР. 1919—1929. Минск : ЦСУ БССР. 534 с.
89. Сельское хозяйство Союза ССР в 1924/25 году по данным налоговых сводок по единому сельхозналогу. М. : НКФ СССР, 1925. 763 с.
90. Сельское хозяйство Союза ССР в 1925/26 году по данным налоговых сводок по единому сельхозналогу. М. : НКФ СССР, 1927. 641 с.
91. Сельское хозяйство Союза ССР в 1926/27 году по данным налоговых сводок по единому сельхозналогу. М. : НКФ СССР, 1929. 605 с.
92. *Хорхордина Т. И.* Корни и крона: штрихи к портрету Историко-архивного института (1930—1991) ; Рос. гос. гуманит. ун-т. М. : РГГУ, 1997. 110 с.
93. Фонды бывших архивов Коммунистической партии Белоруссии : кратк. справ. : в. 2 ч. Ч. 1 / сост. : Г. С. Данилова, В. Д. Селеменев ; предисл. : В. Д. Селеменев, М. Ф. Шумейко. Минск : НАРБ, 1997. 104 с.
94. Центральный Комитет Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии, 1918—1941 гг. Ф. 4п. Оп. 1 / НАРБ ; сост. : Ю. И. Анейчик, Ж. А. Лиходиевская, Г. И. Плавская ; редкол. : В. Д. Селеменев (гл. ред.) [и др.]. Минск : НАРБ, 2007. 70 с.

## 1.3. КІРУНКІ ВЫВУЧЭННЯ І МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ

На мяжы XX—XXI стст. змяняліся грамадства, канцэпцыі, падручнікі. З'явіліся навуковыя творы, у якіх прысутнічае кардынальнае непрыняцце бальшавіцкай сістэмы. Аднак ужо новымі даследчыкамі (падчас пад сцягам «дэідэалагізацыі») ужываюцца тыя ж падыходы, што склаліся яшчэ ў «Кароткім курсе ВКП(б)». Некрытычнае ўспрыняцце саветалагічных прац, карані якіх вядуць да часоў халоднай вайны (таталітарная канцэпцыя), парадаксальным чынам зноў перадвызначыла адмаўленне пераемнасці ў вырашэнні важнейшых задач, якія прысутнічалі ў развіцці Расійскай імперыі і якія паўсталі перад бальшавікамі пасля іх прыходу да ўлады. Гэта акрэсліла чорна-белы погляд постсавецкай гістарыяграфіі на шэраг праблем, у тым ліку і аграрнага развіцця.

Гісторыкі «новай хвалі», як і савецкія гісторыкі, успрымаюць часам сялянства толькі як аб'ект уздзеяння. Між тым сялянская большасць краіны — неадменная характарыстыка стагоддзяў развіцця Расійскай імперыі, у складзе якой фарміравалася беларуская нацыя і фарміравалася пераважна на сялянскай аснове. Толькі сацыяльна-эканамічныя характарыстыкі наўрад ці здольныя скласці цэласную карціну сялянства як галоўнага фактару развіцця СССР да сярэдзіны XX ст. Своечасовым стаў комплексны падыход да яго вывучэння і фарміравання (на «памежжы» навук: сацыялогіі, гісторыі, філасофіі і палітычных навук) асобнай навуковай полідысцыплінарнай галіны — сялянaзнаўства [1, 2].

Прыхільнікі сялянaзнаўства як асобнага спецыфічнага кірунку падкрэсліваюць, што сялянскі свет у многім для сучаснага ўрбаністычнага і постмадэрнісц-

кага грамадства незразумелы. Значная колькасць інфармацыі засталася не зафіксаванай крыніцамі, яе нельга вызначыць толькі ў выглядзе тэксту. Гэта, да прыкладу, звычаі, абрады — тое, што гісторыкі звыкла перадавалі этнографам. Вызначаючы ролю паўсядзённасці, В. А. Бердзінскіх падкрэслівае, што ўспрыняцце сялянамі часу (месяц, год, дзень і ноч), святаў і іншых аспектаў жыцця істотна адрознівалася ў XIX — першай палове XX ст. [3]. Тут мы маем магчымасць перайсці да такога феномена ў гістарыяграфіі, як «антрапалагічны паварот». Мы можам разглядаць гэтую з'яву і з пункту гледжання пашырэння таго поля гісторыі, якое яна страціла ў выніку дэцэнтралізацыі гуманітарыстыкі. Урэшце гісторыкам заўсёды наканавана лёсам працаваць у міждысцыплінарнай, дакладней — полідысцыплінарнай, сферы. Паводле меркавання асобных аўтарытэтных гісторыкаў, гісторыя — гэта ўвогуле сістэма гістарычных навук (Ф. Брадэль, І. Кон). Не спадзеючыся вярнуць калег-гуманітарыяў у лона гістарычнай навукі, у Расійскім дзяржаўным гуманітарным універсітэце створана канцэпцыя аб крыніцазнаўстве як аснове полідысцыплінарнага гуманітарнага сінтэзу. Тэрміналогія гэтага сінтэзу па-ранейшаму застаецца недастаткова распрацаванай, што істотна замаруджвае працэсы міждысцыплінарнай інтэграцыі. Значэнне праблемы адчуваецца, калі праз тэрміналогію, тэрміналагічны апарат вызначаюцца розныя, часам супрацьлеглыя тэорыі гістарычнага працэсу, розныя метадалагічныя падыходы.

Тэрміналагічныя спрэчкі абвастрыліся, калі заходнееўрапейскія гісторыкі (а ўслед за імі — гісторыкі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы) захапіліся такімі кірункамі, як гісторыя паўсядзённасці і вусная гісторыя. У заходняй гістарыяграфіі стварыўся фетыш паўсядзённасці, каб з выкарыстаннем шырокіх апісанняў, спосабаў, прапанаваных антраполагамі, вызначыць усе дэталі жыцця і быту чалавека. У беларускай гістарыяграфіі гэтая тэндэнцыя выявілася не адразу. Напрыклад, можна заўважыць, што нацыянальная канцэпцыя гісторыі Беларусі на пачатку 1990-х гг. стваралася з выкарыстаннем старой марксісцкай тэрміналогіі. Але ўжо з сярэдзіны 1990-х гг. гістарыяграфічная сітуацыя ў многіх краінах былога СССР імкліва змяняецца. Дакладнае тлумачэнне такой з'явы пазначае ў сваёй манаграфіі беларуская даследчыца В. М. Шутава: «...пасля развалу "ідэялагічна" змадэляванай гістарыяграфіі мы часта шукаем у прыкладах гістарыяграфіі Захаду штосьці, што змагло б стаць новай "вытлумачальнай мадэллю", дало б нам новае адчуванне "татальнасці", якое было беззваротна згублена» [4].

За апошнія дзесяцігоддзі сяляназнаўства прайшло ў сваім развіцці заўважны эмпірычны і тэарэтычны шлях. Значную ролю мела падтрымка ў асобе аднаго з тэарэтыкаў заходнееўрапейскага сяляназнаўства — прафесара Манчэсцерскага ўніверсітэта Тэадора Шаніна. Яго даследаванні акрэсліліся на фоне неразумення заходнееўрапейскай навуковай і палітычнай элітай спецыфікі развіцця краін Азіі, Афрыкі і Усходу. Па меркаванні Т. Шаніна, гэтая спецыфіка выяўлялася ў тым, што як сялянскія супольнасці яны своеасаблівым чынам інтэграваліся ў еўрапейскі рынак. Менавіта Т. Шаніну ўдалося падтрымаць навуковыя даследаванні ў Расіі ў пазначаным кірунку праз шэраг грантаў. Другім фактарам паспя-

ховасці сяляназнаўства стала дзейнасць выдатнага гісторыка вёскі Віктара Пятровіча Данілава, які змог аб'яднаць калектыў аднадумцаў і ўзняць даследаванні па гісторыі сялянства на новы ўзровень. Нельга пакідаць па-за ўвагай і падтрымку сялянназнаўства той часткай інтэлігенцыі, якая стагоддзямі шукала ў сялянстве тлумачэнне і перспектывы асобнага шляху Расіі. Такі кірунак навукова-публіцыстычных даследаванняў хоць і выяўляе спробу пераўтварэння сялянназнаўства ў нейкую ўніверсальную тэорыю, але ўсё ж не з'яўляецца рэальнай пагрозай для традыцыйных падыходаў. Да прычын такога сцвярджэння (акрамя глабальна-палітычных) можна аднесці і тое, што сучасная вёска з'яўляецца малапрыцягальнай для інтэлектуалаў.

Сярод вынікаў дзейнасці ў галіне сялянназнаўства ў апошнія гады патрэбна адзначыць працу па развіцці метадалагічных даследаванняў, пачатак якім быў пакладзены выдатным расійскім сялянназнаўцам Аляксандрам Васільевічам Чаянавым. Дзесяцігадовае комплекснае ўключанае палявое міждысцыплінарнае (гісторыка-эканоміка-сацыялагічнае) даследаванне вёскі, праведзенае расійскімі навукоўцамі, стала асновай цікавай публікацыі — «Рэфлексіўнае сялянназнаўства. Дзесяцігоддзе даследаванняў сялянскай Расіі» [5]. У гэтым выданні, як ні ў якім іншым па сялянназнаўстве, вызначыліся і слабыя бакі (у той ці іншай ступені характэрныя для гістарыяграфіі XXI ст.): адсутнасць уліку рэгіянальнай спецыфікі ў сукупнасці з экстрапаляцыяй асобных назіранняў на ўсю сукупнасць з'яў. Пэўныя рысы метадалагічнага раздарожжа вызначыліся і падчас праведзенага ў Маскве напрыканцы сакавіка 2013 г. XX штогадовага сімпозіума «Шляхі Расіі: альтэрнатывы грамадскага развіцця». На наш погляд, азначаныя з'явы пацвярджаюць: фундаментальныя тэарэтычныя вывады магчымы не толькі дзякуючы ўважліваму вывучэнню сялянства ў дзень сённяшні, але і ў выніку дасціпнага гістарычнага даследавання яго мінулага. Па-другое, неабходна дэталёвае вывучэнне сацыяльна-гістарычных, этнічных і іншых асаблівасцей развіцця сялянства, якія фарміраваліся ў тым ці іншым рэгіёне на працягу стагоддзяў. Апошняе становіцца асабліва актуальным з улікам новых прац аб эканамічных паводзінах, іх псіхалагічных асновах [6, 7].

За савецкім часам змяніліся крытэрыі прафесіяналізму. Вынікам барацьбы з ідэалагізацыяй стала тое, што нярэдка асноўнай ацэнкай якасці працы гісторыка разглядалася прырашчэнне фактаў, а метадалагічная роспач хавалася за заблытанасцю вывадаў. Невыпадкова, што пераход да выкарыстання новых ракурсаў вывучэння гісторыі адбываўся пад акампанемент крытыкі пазітывісцкай, марксісцкай школ як выключна апісальных (па вызначэнні Д. Калінгвуда — «гісторыі нажніц і клею»). Але і зараз «дыялог дзвюх эпох» часам адбываецца ў форме маналогу. Прадстаўнікі новых гістарычных школ нярэдка даследуюць мінулае праз катэгорыі сучаснага, забываючы, што «людзі ў мінулым» — са своеасаблівым светапоглядам, яны не толькі прадстаўнікі іншай эпохі, але і пэўных сацыяльных груп, людзі са сваёй індывідуальнай псіхалогіяй. Чалавек другой эпохі меў сваю сістэму каштоўнасцей, жыццёвыя інтарэсы, мэты, патрэбы, свае ідэалы, а нярэдка і час, і прастору апісваў па-свойму. Па гэтай жа прычыне прадстаўнікам іншай

культуры цяжка пераадолець стэрэатыпы. У сувязі з пэўнай эйфарыяй наконт «збліжэння пазіцый» неабходна звярнуцца да цікавага назірання, што ўтрымліваецца ў рэцэнзіі П. Кенэза на кнігу П. Пайпса «Расія пры бальшавіцкім рэжыме» (Нью-Ёрк, 1993). Вядомы спецыяліст у галіне саветалогіі адзначае, што сцвярджэнне аб магчымасці даведацца ўрэшце сапраўдную гісторыю толькі пры ўмове, што будзе забяспечаны доступ да ўсіх савецкіх архіваў, стала лозунгам у асяроддзі англамоўных гісторыкаў СССР. Але калі архівы сталі даступнымі, адзначае П. Кенэз, ён штосьці не заўважыў, каб нехта з яго калег заявіў, што пад уздзеяннем новых крыніц ён перагледзеў свой пункт гледжання. Кожны з гісторыкаў шукае і пацвярджае праз новыя матэрыялы свае папярэднія вывады [8, с. 265].

Гісторыкі вымушаны паглыбляцца не толькі ў вывучэнне прычын, што выклікаюць змены ў складаных дынамічных сістэмах, але і фактараў, што прадвызначаюць іх стабільнасць. Тут патрэбна адзначыць працы буйнейшага тэарэтыка сацыялогіі XX ст. Талката Парсанса. Многім з яго крытыкаў здаецца, што Т. Парсанс перабольшвае ролю норм, традыцыі ў захаванні стабільнасці сістэмы. На першы погляд за хваляй матэрыяльных рэчаў, праблем і дзеянняў сацыяльная норма зусім не заўважная. Ці ж можа нейкае чыстае ўяўленне штосьці рэгуляваць і стабілізаваць? Але Т. Парсанс аргументавана паказвае: чалавек дзейнічае, упарадкоўвае рэальнасць у адпаведнасці ўяўленням, якія ён засвоіў і ператварыў у свае перакананні і якія сталі матывацыяй яго дзеянняў [9].

Гістарычная памяць народа забяспечвае захаванне яго традыцый і з'яўляецца адным з фактараў стабільнасці грамадства. Вывучэнне яе магчыма не толькі на аснове манаграфій і артыкулаў па гістарычнай праблематыцы і па тых адносінах да мінулага, якія склаліся ў грамадстве. Гістарычная памяць выяўляецца ў побыце, звычках і факусіруе свядомасць аб мінулым праз сучаснасць і чакаемую будучыню. Адной са спецыфічных масавых крыніц інфармацыі сёння з'яўляецца інтэрнэт, уважлівае вывучэнне якога дазваляе ўбачыць калі не заканамернасці, то пэўныя тэндэнцыі фарміравання грамадскай свядомасці.

Г. Лебон, якога лічаць тэарэтыкам псіхалогіі натоўпу, пісаў, што вялікія перавароты, якія папярэднічаюць зменам цывілізацый, найчасцей тлумачаць прычынамі знешнімі. «Але больш уважлівае вывучэнне гэтых падзей паказвае, што за гэтымі, быццам верагоднымі, прычынамі найчасцей хаваюцца глыбокія змены ў ідэях народаў... Адзіныя істотныя змены, з якіх вынікае аднаўленне цывілізацый, адбываюцца ў ідэях, паняццях і вераваннях» [10].

Услед за М. Веберам, Т. Парсансам, Ю. Хабермасам гісторыкаў усё больш цікавяць дэвіянтныя паводзіны, якія ў шэрагу выпадкаў разглядаюцца як сур'ёзная пагроза стабільнасці сацыяльнай сістэмы [11]. З пазіцый сінергетычнай парадыгмы дэвіянтныя дзеянні з'яўляюцца вынікам біфуркацыі, якая ўзнікае на ўзроўні грамадства, групы ці індывіда. У біфуркацыйны перыяд з'яўляецца вялікая колькасць форм дэвіянтнага дзеяння, прычынай якога можа стаць незадаволенасць індывіда сацыяльнай структурай, пануючай культурай і ўласным дасягнутым статусам. Этнічнасць як адзін з параметраў узаемадзеянняў у грамадстве выяўляецца як магутны каталізатар сацыяльных і палітычных змен.

Этнічнасць праяўляецца перш за ўсё праз традыцыю. Традыцыя як сацыяльная форма выяўлення агульнага закона пераемнасці валодае ўстойлівасцю, дазваляе збіраць культурны вопыт, ажыццяўляць яго перадачу, а дынамічнасць садзейнічае ўзбагачэнню, узаемадзеянню традыцый з іншымі з'явамі грамадскага жыцця. Фарміруючыся на працягу шматлікіх стагоддзяў, традыцыя назапашвае гістарычны вопыт, мудрасць народа, забяспечвае ўзаемасувязь паміж мінулым і сучасным. Традыцыйнае грамадства беларускай вёскі не адчула ў поўнай ступені кардынальнай трансфармацыі, праз якую прайшла Заходняя Еўропа (уключаючы поўнае разбурэнне адносін у грамадзе). Лёс беларускага сялянства — гэта шмат у чым лёс беларускага этнасу. Шэраг рыс беларускага сялянства склаўся гістарычна, на працягу стагоддзяў. Роля традыцыі для беларускага вяскоўца была выключнай. Асабліва гэта выявілася ў адносінах селяніна да зямлі [12, с. 1—17].

Колькі б мы ні гаварылі пра крызіс мэтаапавядання і пра постмадэрн, гісторыя па-ранейшаму выконвае такую функцыю, як вызначэнне ідэнтычнасці соцыуму і асобнага чалавека, што фарміруецца праз дзеянне механізмаў сацыяльнай памяці, праз той механізм трансляцыі гістарычных ведаў, які пранізвае не толькі сферу тэорыі, але і паўсядзённага жыцця.

Сістэмнасць вывучэння гістарычных працэсаў патрабуе прымянення мікра- і макрападыходаў, роўна як тэорыі і практыкі макра- і мікравывучэння этнасацыяльных працэсаў. Пры макрападыходзе аб'ект разглядаецца як адзінае цэлае, а ўнутраныя сувязі, унутранае ўпарадкаванне аб'екта ігнаруюцца. Грамадства разумеецца як сістэма, якую нельга растлумачыць на аснове індывідуальных паводзін і ўзаемадзеянняў; наадварот, індывідуальныя паводзіны і асобныя працэсы тлумачацца на аснове сістэмных заканамернасцей і структурных асаблівасцей. Асноўная тэарэтычная цяжкасць у такім выпадку заключаецца ў немагчымасці раскрыць крыніцы сістэмных заканамернасцей і канкрэтныя механізмы іх уплыву і ўзаемаўплыву. Аднак пазначаная праблема максімальна памяншаецца, калі аб'ект разглядаецца як бы «знутры». Пры мікрападыходзе даследуюцца ўнутраная структура, унутраныя сувязі паміж яго элементамі. Такі падыход дазваляе не толькі вызначыць дынаміку этнасацыяльнага развіцця, але і раскрыць крыніцы выяўленых сістэмных заканамернасцей [13].

З ростам увагі грамадства да фактару дэвіянтных паводзін усё больш распаўсюджваюцца мікрагістарычныя падыходы ў вывучэнні этнасацыяльных працэсаў. Асаблівасці гістарычнага развіцця і фарміравання нашых архіўных фондаў (найперш з канца XVIII ст.) прадвызначылі тое, што мы тут часцей знаходзім матэрыялы, якія характарызуюць дзяржаву, царкву, установы і — меней — асобных людзей, іх настроі, трагедыі і поспехі. Памяць чалавека знікае разам з яе носьбітам, і мы можам згубіць цэлыя пласты светаўспрымання людзей нашага нядаўняга мінулага. Таму ўсё больш папулярнымі сярод даследчыкаў становіцца збор і вывучэнне звестак, якія доўгі час існавалі ў вуснай форме. Ёсць і іншыя прычыны росту колькасці апавяданняў, атрыманых ад сведак падзей — гісторыкі таксама людзі і звычайна больш хутка ўспрымаюць нейкія тыповыя гісторыі, чым абагуленыя матэрыялы і лічбы, што апісваюць макрагістарычныя працэсы. Па-

добныя матэрыялы быццам праецыруюцца на мінулае і з мінулага праз сябе, праз свой вопыт, вопыт сваёй сям'і, сваіх сяброў і блізкіх. У падобнага кшталту гісторыях дзейнічае невялікая колькасць людзей, кіруючыся сваімі матывамі, суадносячыся ў межах пэўнага часу і прасторы. Тыповыя гісторыі ўздзейнічаюць эмацыянальна і павучальна, таму нават схільныя да аналітыкі даследчыкі з мэтай даць зразумелае, жыццёвае тлумачэнне сацыяльных працэсаў часам іх выкладаюць. Менавіта ў такіх апавяданнях працягваюць жыць этнічныя стэрэатыпы, якія па шэрагу прычын цывілізацыйнага (ідэалагічнага) характару зніклі з поля макрагісторыі. Яны фарміруюцца на аснове каштоўнасцей, прынятых у сферы дадзенага этнасу, праз прызму традыцый і культуры, якія склаліся ў працэсе яго жыццядзейнасці. Разам з тым методыка збору і аналізу падобнага матэрыялу недасканалая. Не заўсёды прадстаўнікі навамодных кірункаў умеюць прааналізаваць сабраны эмпірычны матэрыял. Часцей за ўсё даследчыкі прапаноўваюць уласныя падыходы, у выніку іх высновы з'яўляюцца маласуадноснымі. У такім выпадку павінны пазначацца як абставіны фіксацыі, так і яе спосабы (пытанні, методыка, тэхнічныя сродкі), а таксама інфармацыя аб аўтары.

Відавочна, што пры вывучэнні этнасацыяльных працэсаў неабходна спалучаць як мікра-, так і макрагістарычныя падыходы, выкарыстоўваць увесь комплекс крыніц. Важнейшай крыніцай для вывучэння этнасацыяльнай дынамікі беларускага грамадства ў міжваенны перыяд застаецца дэмаграфічная статыстыка. Праведзеныя за апошняе дзесяцігоддзе даследаванні паказваюць, што вывучэнне дэмаграфічных перапісаў не толькі пацвярджае ўжо зробленыя высновы, але і акрэслівае новыя, яшчэ не даследаваныя аспекты. Мікрападыходы ці мікраўзровень, чаму гісторык павінен аддаць перавагу? Ён быццам мастак, які стварае сваё палатно — то адыходзіць на адлегласць: выпісвае фон, то вяртаецца: дадае дэталі. І так шмат разоў, з рознымі суадносінамі часу. Гісторыя падобна габелену, сатканаму са шматлікіх нітак розных адценняў і колераў. Адпаведна адзіным спосабам пазначыць важкасць кожнай складаючай з'яўляецца канструяванне міждысцыплінарных аб'ектаў гістарычнага даследавання, а да іх неабходна аднесці (акрамя пералічаных В. М. Шутавай: «гендарныя стэрэатыпы», «сям'я», «дыскурсіўныя практыкі», «мова») [4, с. 124] і «сялянства», «вёска» — якімі б састарэлымі яны ні здаваліся для новых пакаленняў гісторыкаў.

У якасці метадалагічнай асновы абрана тэорыя мадэрнізацыі. Па-першае, яна дае магчымасць ажыццявіць полідысцыплінарны падыход, якога патрабуе вывучэнне беларускай вёскі, не пакінуць па-за разглядам сумежныя сферы сацыялогіі, этналогіі, эканамічнай навукі. Па-другое, значны час мадэрнізацыя разглядалася як феномен, які не ўключае працэсы станаўлення і развіцця індустрыяльнага грамадства ў СССР у цэлым і ў савецкай частцы Беларусі ў прыватнасці.

Тэорыя «мадэрнізацыі» сапраўды прайшла ўжо такі працяглы шлях, што яе разуменне патрабуе пэўнага агляду, шэраг даследчыкаў асобныя яе кірункі і формы пазначаюць як самастойныя, асобныя тэорыі. Тэорыя мадэрнізацыі атрымоўвае папулярнасць у другой палове XX ст. Яе зараджэнне ва ўмовах халоднай вай-

ны дало падставу У. М. Мяжуеву і іншым расійскім даследчыкам лічыць, што мэты стварэння аналізуемай тэорыі пераважна ідэалагічныя. Не адмаўляючы такіх высноў, пазначым, што яшчэ К. Маркс падзяліў гісторыю грамадства на індустрыяльную і даіндустрыяльную. Працы М. Вебера, Х. Артэгі-і-Гасета, А. Тойнбі, К. Ясперса, Т. Парсанса, Ш. Эйзенштадта акрэслілі імкненне асэнсаваць сістэмнасць і паслядоўнасць грамадскага развіцця. У сучаснай літаратуры пазначаюцца тры фактары, якія садзейнічалі ўзнікненню тэорыі мадэрнізацыі. Першы фактар, сацыяпалітычны, выкліканы да жыцця неабходнасцю больш уважлівага вывучэння краін трэцяга свету. Па класічных канонах тэорыі мадэрнізацыі меркавалася, што посткаланіяльныя краіны на падставе вопыту і напрацовак краін Заходняй Еўропы і ЗША пры дапамозе апошніх хутка рушаць за імі, даганяючы заходнюю цывілізацыю на шляху да росквіту. Аднак неўзабаве выявілася, што гэтага не адбываецца, больш таго, адлегласць у развіцці і разуменні шляхоў і кірункаў гэтага развіцця павялічвалася. Заходнееўрапейскія і амерыканскія даследчыкі ў выніку вымушаны былі звярнуць увагу на сацыяльную структуру краін трэцяга свету, найперш на сялянства, своеасаблівы сялянскі свет. Важным фактарам акрэсліўся інфармацыйна-палітычны, які ўключаў выпрацоўку пэўных рэкамендацый для ЗША і іх саюзнікаў у дачыненні да дзеянняў у краінах Азіі. Трэцім фактарам вызначаюць ідэалагічны, маючы на ўвазе, што тэорыя мадэрнізацыі стваралася ў якасці альтэрнатывы сацыялізму. Б. Старасцін пазначае яшчэ тэарэтычны аспект, які выяўляўся ў неабходнасці стварыць для заходняга грамадазнаўства больш аптымістычную парадыгму гістарычнага развіцця, чым тая, што была створана ў міжваенны час (крызісу і «скону» Еўропы ў працах О. Шпенглера, А. Тойнбі, П. Сарокіна, К. Ясперса і інш.) [14].

Супрацьпастаўленне даіндустрыяльнага (традыцыйнага) і індустрыяльнага (сучаснага) грамадства з'яўляецца асноўным паняццем тэорыі мадэрнізацыі, аднак разуменняў і падыходаў да вызначэння тэрміна «мадэрнізацыя» за дзесяцігоддзі склалася шмат. У сваёй вядомай працы І. В. Пабярэжнікаў акрэслівае шмат варыяцый у разуменні зместу і маштабаў мадэрнізацыі [15, с. 53, 54]. Падводзячы вынік шматлікім вызначэнням, ён характарызуе мадэрнізацыю «як працэс, шляхам якога традыцыйныя аграрныя грамадствы трансфармуюцца ў сучасныя, індустрыяльныя» [15, с. 59]. Характэрнымі рысамі мадэрнізацыі з'яўляюцца: выкарыстанне шырокага кола крыніц энергіі, індустрыялізацыя, пашырэнне прыкладных навуковых даследаванняў. Сістэмную характарыстыку прыкмет мадэрнізацыі вызначыў А. Дэсаі, які бачыць іх не толькі ў інтэлектуальнай сферы (рацыянальная ўстаноўка), але і ў сацыяльна-дэмаграфічнай, экалагічнай і палітычнай. У галіне эканомікі ён пазначае такія характарыстыкі мадэрнізацыі, як замена сілы чалавека ці жывёлы іншымі крыніцамі энергіі (паравая, электрычная, атамная), машыны і складаныя тэхналогіі, растучая спецыялізацыя, індустрыялізацыя.

На працяглым этапе развіцця тэорыі мадэрнізацыі традыцыя разглядалася як пэўны тормаз, выключна кансерватыўная сіла, што супрацьстаяла наваўвядзенням і якую неабходна было пераадолець, ліквідаваць, каб забяспечыць пляцоўку для ўкаранення новага. Такім чынам, захоўваліся рэвалюцыйныя падыхо-

ды не на карысць эвалюцыйным. Станаўленне раўнавагі ў свеце ў 1960—70-я гг., далейшае вывучэнне краін трэцяга свету дазволілі пaглядзець на гэтыя суадносіны інакш. Разам з тым прызнанне своеасаблівасці развіцця мадэрнізацыйных працэсаў, негатыўныя працэсы ў эканоміцы краін, якія звязваліся з заходнім уплывам, выклікалі істотны спад даследаванняў і скарачэнне колькасці прыхільнікаў тэорыі мадэрнізацыі.

На мяжы 1980—90-х гг. у СССР адбываліся не эканамічныя змены, а глыбокі крызіс у гуманітарнай галіне, ідэалогіі, на якой базіраваліся адукацыя і выхаванне. Навукоўцы спешна шукалі новыя падыходы і канцэпцыі. Адной з бліжэйшых да панаваўшага на той час фармацыйнага падыходу з'яўлялася тэорыя мадэрнізацыі. Яна, здавалася б крыху састарэлая і забытая, з другой паловы 1980-х гг. адраджаецца [16, с. 4—52; 17, с. 267, 268]. Прычыны такой з'явы розныя, але асноўнай з іх стаў распад камуністычнага блока і пераход краін былога сацыялістычнага лагера на капіталістычны шлях развіцця. Нават тыя расійскія даследчыкі (да прыкладу, У. М. Мяжуеў) [18], якія пазначалі «разбуральныя» вытокі тэорыі мадэрнізацыі, сваімі працамі паказваюць: адраджэнню тэорыі мадэрнізацыі пасадзейнічалі разважанні расійскай інтэлігенцыі аб далейшых шляхах развіцця Расійскай дзяржавы. Першапачатковым штуршком да новых даследаванняў па мадэрнізацыі з'явіўся заклік яе «бацькоў-заснавальнікаў» — Ш. Эйзенштадта, М. Леві [19, 20, 21, с. 136—145]. Зразумела, зараз з'яўляюцца і новыя даследчыкі ў галіне тэорыі мадэрнізацыі, і новыя назвы: «тэорыі неамадэрнізацыі» (Э. Цірык'ян), «тэорыі постмадэрнізацыі» (Д. Аляксандэр), «тэорыі экалагічнай мадэрнізацыі» (Э. Гіддэнс, У. Бек). Тэорыя экалагічнай мадэрнізацыі, хоць і зарадзілася ў Заходняй Еўропе (А. Мол і інш.), мела сваіх прыхільнікаў у розных частках свету [22, с. 101—122; 23].

Можна нагадаць, што лейтматыў новых пагроз (у тым ліку экалагічных) прысутнічаў у выступленнях Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова ў сярэдзіне 1980-х гг. У адной з апошніх яго прац (2003 г.) заўважна акрэслілася тое новае, што выклікала з нябыту тэорыю мадэрнізацыі — працэсы глабалізацыі [24]. Што ж тычыцца такіх тэрмінаў, як «неамадэрнізм» і «постмадэрнізм», то, як пазначыў П. Штомпка (прафесар Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве), яны звязаны з імкненнем удыхнуць новае жыццё ў старыя мяхі мадэрнізму. «Напрыканцы XX ст. эра "трыумфу сучаснасці" з яе росквітам, аптымізмам, экспансіянізмам, падобна, ужо завяршылася. Лейтматывам сацыяльнай свядомасці становіцца крызіс, а не прагрэс», — сцвярджае ён [25]. У такіх умовах прыцягальнасць Захаду як мадэлі (адпаведна мадэрнізму ў класічным сэнсе) становіцца малапрывабнай. Дарэчы, П. Штомпка акрэслівае глабалізацыю як тое, што выклікала рэанімiраванне і перагляд тэорыі мадэрнізацыі з улікам вопыту посткамуністычнага свету.

На фоне даволі крытычных адносін да савецкага этапу гісторыі і сучаснасці часам адзіным станоўчым вобразам для постсавецкага свету сталі краіны Захаду. Развіццё інфармацыйных сродкаў, магчымасці доступу да інфармацыі значна паскаралі працэс. Пашырылася колькасць грантаў і фондаў для даследчыкаў

у галіне грамадскіх навук. Вынікам стала імклівае абуджэнне тэорыі мадэрнізацыі, найперш з удзелам даследчыкаў з постсавецкіх краін. Лідарства ў гэтым кірунку захапілі расійскія даследчыкі. Па-першае, у навуковых і вучэбных цэнтрах Расіі традыцыйна на высокім узроўні заставаліся тэарэтычныя даследаванні. Па-другое, тэорыя мадэрнізацыі вярталася ўжо на новым грунце глабалізацыі. У гэтых умовах менавіта даследчыкі з Расіі, якая імкнулася вярнуць згублены з прычыны распаду СССР статус вялікай дзяржавы, сталі першымі па колькасці і якасці даследаванняў у галіне тэорыі мадэрнізацыі. Большасць прац, напісаных з пазіцыі дадзенай метадалогіі, прысвечаны «даганяючай» мадэрнізацыі Расіі. Адно з першых канцэптуальных даследаванняў у гэтым кірунку (капітальны трохтомнік) падрыхтавана А. А. Ахіезерам. Напісаная лагічнай мовай (цэлы том прысвечаны тэрміналогіі) кніга, па сутнасці, апісвае спецыфічныя асаблівасці расійскага вопыту зыходзячы з іх разрыву між традыцыйнасцю расійскага сялянства і заходніцкімі мадэрнізацыйнымі памкненнямі палітычнай, культурнай эліты грамадства. Асноўная  ідэя выдання ў тым, што Расія не прайшла завершаную мадэрнізацыю і да пачатку рэвалюцыі 1917 г. зноў апынулася ў путах традыцыяналізму. Падобныя высновы былі зроблены ў шматлікіх працах расійскіх даследчыкаў як напрыканцы XX ст., так і на пачатку XXI ст. (Герасімаў, 1994; Якавенка, 1995/96; Лейбовіч, 1996; Аляксееў, Няфёдаў, Пабярэжнікаў, 2000 і інш.) [26—44]. У апошнія гады з'явіліся працы па дадзеным кірунку і ў іншых краінах СНД [45, с. 11—15].

Цікавая канцэпцыя мадэрнізацыі Расіі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. створана вядомым даследчыкам у галіне сацыяльнай гісторыі Б. М. Міронавым. На працягу апошніх гадоў убачылі свет тры выданні яго «Сацыяльнай гісторыі Расіі» [46]. У прадмове да 3-га выдання Барыс Мікалаевіч піша, што «ва ўсіх супастаўленнях Расіі і Захаду» вобраз Расіі заніжаны, а вобраз Захаду завышаны, у выніку чаго параўноўваецца ідэалізаваны вобраз Захаду з карыкатурным вобразам Расіі. З Захадам асацыіруюцца лепшыя рысы і самыя вялікія дасягненні еўрапейскай цывілізацыі, але забываюцца антысемітызм і халакост, контррэфармацыя і Варфаламееўскія ночы, жорсткія рэвалюцыі і контррэвалюцыі, фашызм у Германіі і Італіі, рабаўладанне ў XX ст.

Мадэрнізацыйныя працэсы выклікаюць з'яўленне і развіццё перадавых індустрыяльных тэхналогій, а таксама адпаведных сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных механізмаў, якія дазваляюць кіраваць імі, падтрымліваць і выкарыстоўваць дадзеныя тэхналогіі. Працэсы мадэрнізацыі рэдка адбываюцца спакойна і раўнамерна, яны ўплываюць на ўсе сацыяльныя інстытуты, на ўсё грамадства. Тэрмін «мадэрнізацыя», такім чынам, акрэслівае сукупнасць адначасовых змен на розных узроўнях. Мадэрнізацыя суправаджаецца ўзрастаючай дыферэнцыяцыяй розных сфер жыцця (эканамічнай, арганізацыйнай, палітычнай і культурнай). З мадэрнізацыяй вельмі цесна звязаны працэсы індустрыялізацыі, урбанізацыі, бюракратызацыі, якія, аднак, мадэрнізацыі нятоесныя. Можна сцвярджаць, што найбольш сутнаснай і складанай задачай, што засталася бальшавікам у спадчыну ад Расійскай імперыі і якую яны вымушаны былі вырашаць

пасля працяглага перыяду ваенных дзеянняў ва ўмовах перавагі сельскагаспадарчай вытворчасці, вясковага насельніцтва і ў сціслыя тэрміны, з'яўлялася мадэрнізацыя краіны, у тым ліку і вёскі.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Толстов С. И.* Крестьяноведение: предмет, трудности становления, региональный аспект // Актуальные вопросы истории Сибири. Секция «История Сибири XX в.» [Электронный ресурс]. URL: http://new.hist.asu.ru/biblio/borod2/40-199.html/ (дата обращения: 10.09.2013).
2. *Бабашкин В. В.* Россия 1902—1938 годов как аграрное общество: опыт применения концептуальных подходов современного крестьяноведения. Саар: LAMBERT Academic Pablishers, 2001. 419 с.
3. *Бердинских В. А.* Крестьянская цивилизация в России. М. : Аграф, 2001. 432 с.
4. *Шутова О. М.* Историография и постмодерн: вопрос об идентичности во второй половине XX — начале XXI века. Минск : БГУ, 2008. 279 с.
5. Рефлексивное крестьяноведение. Десятилетие исследований сельской России / под ред. Теодора Шанина, Александра Алкумина, Виктора Данилова. М. : МВШСЭН ; РОССПЭН, 2002. 592 с.
6. *Тарантул В. З.* Геном человека. Энциклопедия, написанная четырьмя буквами. М., 2003. 486 с.
7. *Ольсевич Ю. Я.* Психологические основы экономического поведения. М. : ИНФРА, 2009. 413 с.
8. *Kenez P.* The Prosecution of Soviet History. Vol. 2 // The Russian Revien. Vol. 54, № 2. 1995. April. P. 265.
9. *Парсонс Т.* О социальных системах / под ред. В. Ф. Чесноковой и С. А. Белановского. М. : Академический проект, 2002. 832 с.
10. *Лебон Г.* Психология народов и масс // Психология масс. 1988. 352 с.
11. *Румянцева М. Ф.* Теория истории : уч. пособ. М. : Аспект Пресс, 2002. 319 с.
12. *Довнаръ-Запольский М.* Очерки обычнаго семейственнаго права крестьянъ Минской губернии // Этнограф. обозрение. 1897. № 2.
13. *Носевич В. Л.* Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе. Минск : Тэхналогія, 2004. 350 с.
14. *Старостин Б. С.* Проблема модернизации: история и современность // Модернизация и национальная культура. М., 1995.
15. *Побережников И. В.* Переход от традиционного к индустриальному обществу: теоретико-методологические проблемы модернизации. М. : РОССПЭН, 2006. 240 с.
16. *Хабермас Ю.* Модерн: незавершенный проект // Вопр. философии. 1992. № 4.
17. *Инглегарт Р.* Модернизация и постмодернизация // Новая постиндустриальная волна на Западе. Антология / под ред. В. Л. Иноземцева. М. : Academia, 1999.
18. *Межуев В. М.* Ценности современности в контексте модернизации и глобализации // Информационный гуманитарный портал «Знание. Понимание. Умение». 2009. № 1.
19. *Eisenstadt S. N.* Modernization, Diversity, and Growth. Bloomington: University of Indiana, 1953; *Eisenstadt S. N.* BureaucracyandPoliticalDevelopment // LaPolambaraJ. (Ed.). Bureaucracy and Political Development. Princeton: Princeton University Press, 1963.
20. *Эйзенштадт Ш.* Революция и преобразование обществ. Сравнительное изучение цивилизаций. М. : Аспект-Пресс, 1999. 416 с.
21. *Эйзенштадт Ш.* Множественность модернизмов в век глобализации // Глобализация: Контуры XXI века. М., 2002.
22. *Гидденс Э.* Последствия модернити // Новая постиндустриальная волна на Западе. Антология / под ред. В. Л. Иноземцева. М. : Academia, 1999.
23. *Бек У.* Общество риска: на пути к другому модерну. М. : Прогресс-Традиция, 2000. 384 с.
24. *Горбачев М. С.* Грани глобализации: трудные вопросы современной российской модернизации. М. : Альпина Паблишер, 2003. 591 с.
25. *Штомпка П.* Социология социальных изменений. М., 1996. 416 с.
26. *Поляков Л. В.* Путь России в современность: модернизация как деархаизация. РАН ; Ин-т философии ; Центр теоретических проблем российского реформаторства. М., 1998. 202 с.

27. *Федотова В. Г.* Типология модернизаций и способов их изучения // Вопр. философии. 2000. № 4. С. 3—27.

28. *Раков В. М.* Особенности российского традиционализма // Консерватизм: история и современность : материалы междунар. науч. конф. (12—13 мая 1994 г). Пермь : Новая книга, 1995. С. 67—75.

29. *Красильщиков В. А.* Модернизация и Россия на пороге XXI века // Вопр. философии. 1993. № 7. С. 40—56.

30. *Федотова В. Г.* Плюсы и минусы модели «догоняющей модернизации». М., 1995.

31. *Федотова В. Г.* Модернизация «другой» Европы. М., 1997.

32. *Побережников И. В.* Модернизационная перспектива: теоретико-методологические и дисциплинарные подходы // Третьи Уральские ист.-пед. чтения. Екатеринбург : УрПГУ, 1999. С. 16—25.

33. *Побережников И. В.* Модернизация: определение понятия, параметры и критерии. Историческая наука и историческое образование на рубеже XX—XXI столетий // Четвертые Всерос. ист.-пед. чтения. Екатеринбург, 2000. С. 105—121.

34. Опыт российских модернизаций XVIII—XX веков / отв. ред. В. В. Алексеев. М. : Наука, 2001. 246 с.

35. *Алексеев В. В., Побережников И. В.* Школа модернизации: эволюция теоретических основ // Урал. ист. вестн. Екатеринбург, 2000. № 5—6.

36. *Алексеев В. В., Побережников И. В.* Модернизация: факторы, модели развития, последствия изменений. Екатеринбург, 1998.

37. *Алексеев В. В., Побережников И. В.* Модернизация и традиция // Модернизация в социокультурном контекте: традиции и трансформации : сб. науч. ст. Екатеринбург, 1998.

38. *Побережников И. В.* Теория модернизации: от классической к современной версии // Северный регион: наука, образование, культура. Сургут, 2000. № 2.

39. *Бауман З.* Индивидуализированное общество : пер. с англ. / под ред. В. Л. Иноземцева. М. : Логос, 2002. 390 с.

40. *Кравченко И. И.* Модернизация сегодняшней России // Этатистские модели модернизации. М., 2002.

41. *Ачкасов В. А.* Трансформация традиций и политическая модернизация: феномен российского традиционализма // Философия и социально-политические ценности консерватизма в общественном сознании России (от истоков к современности) : сб. ст. / под ред. Ю. Н. Солонина. СПб. : Изд-во СПб., 2004. Вып. 1.

42. *Гавров С. Н.* Модернизация во имя империи. Социокультурные аспекты российской модернизации. М., 2004. 352 с.

43. Европейская модернизация : в 2 кн. Кн. 1 / Д. Травин, О. Маргания. М. : АСТ ; СПб. : Terra Fantastica, 2004. 665 с.

44. *Пантин В. И.* Волны и циклы социального развития: Цивилизационная динамика и процессы модернизации. М. : Наука, 2004. 246 с.

45. *Сейсенова Н. Б.* Типология политической модернизации в сравнительной позиции ценностей и традиции казахстанского общества // Вестн. Казах. нац. пед. ун-та им. Абая. Сер. «Социологические и политические науки». 2011. № 1 (33).

46. *Миронов Б. Н.* Социальная история России периода империи (XVIII — начало XX в.) : в 2 т. 3-е изд., испр., доп. СПб. : «Дмитрий Буланин», 2003. 548 с.

# Раздзел 2. ДЫНАМІКА І ФОРМЫ САВЕЦКАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ

## 2.1. ЗМЕНЫ Ў ПАЛІТЫЦЫ ЎЛАД НА ВЁСЦЫ: ПРЫЧЫНЫ І ЗМЕСТ. ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ АДЗІНААСОБНАЙ СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРКІ

У 1921 г. пачаўся новы этап развіцця савецкіх рэспублік, у тым ліку і Беларускай ССР, адроджанай першапачаткова ў межах 6 паветаў былой Мінскай губерні. Быў дэклараваны пераход ад Грамадзянскай вайны да мірнага будаўніцтва, ад «ваеннага камунізму» да новай эканамічнай палітыкі. Гэты пераход адбываўся ў цяжкіх эканамічных умовах. Вайна знясіліла народную гаспадарку Беларусі. Пасяўныя плошчы скараціліся больш чым на 30 %, а колькасць жывёлы — напалову [1].

Нягледзячы на Рыжскую дамову, на тэрыторыі Беларусі працягваліся ваенныя дзеянні. Гэта адлюстравана нават у назвах дакументаў, якія паказвалі наяўнасць як унутранага, так і замежнага фронту [2, л. 2]. Згодна з данымі савецкай вайсковай разведкі ў м. Баранавічы чакалі прыбыцця 20-й пяхотнай дывізіі (да 1500 чал.), узброенай вінтоўкамі французскай і нямецкай вытворчасці. У Нясвіжы, па звестках АДПУ, знаходзіўся камітэт беларускай арміі «Абарона Радзімы і свабоды». У Баранавічах размяшчаўся атрад балахоўцаў [2, л. 5].

Найбольшая колькасць узброеных антысавецкіх фарміраванняў на тэрыторыі БССР дыслакавалася ў Ігуменскім павеце, далей у парадку памяншэння ішлі Слуцкі, Мазырскі, Мінскі. Характэрнай рысай гэтых фарміраванняў станавілася палітычная афарбоўка. Яны дзейнічалі пад сцягамі «Аграрнага саюза абароны Радзімы і свабоды» і іншых арганізацый, але з часам іх напады набывалі грабежніцкі характар. Кіраўнікі гэтых фарміраванняў усё часцей зыходзілі за мяжу разам з нарабаваным, а «барацьбіты» пераходзілі да грабяжоў, расстрэлаў мясцовага насельніцтва. Мясцовыя савецкія ўлады хадайнічалі аб высылцы сем'яў удзельнікаў супраціву з Беларусі. У адваротным выпадку яны сцвярджалі аб немагчымасці весці эфектыўную барацьбу побач з польскай мяжой, адкуль ішлі ўзбраенне і так званыя «добраахвотнікі» [2, л. 60 — 67 аб.]. Толькі ў ліпені 1921 г. было выслана 5482 чал., у жніўні — 8000 чал. — шмат больш, чым прасілі [3, л. 6]. Крыху ў лепшым становішчы знаходзілася Віцебская губерня, найперш з прычыны аддаленасці ад фронту. Тут была наладжана эфектыўная работа мясцовага савецкага апарату, якая забяспечыла найвышэйшыя паказчыкі выканання бюджэту [4]. Добрае забеспячэнне Віцебска прыцягвала творчую інтэлігенцыю.

Цяжкае эканамічнае становішча беларускага сялянства пагаршалася аграрнай перанаселенасцю вёскі, малазямеллем. Да рэвалюцыі ў такіх губернях, як Гомельская і Віцебская, значная частка насельніцтва была занята адыходнымі промысламі, саматужніцтвам, што забяспечвала занятасць і папаўняла бюджэты сялянскіх сем'яў. У выніку вайны і разрухі саматужныя промыслы прыйшлі ў заняпад. На глебе беспрацоўя спынілася адыходніцтва. Разам з эканамічнымі паўсталі сур'ёзныя цяжкасці палітычнага характару.

Для разумення глыбіні сацыяльна-псіхалагічнага пералому, што адбываўся на рубяжы 1921—1922 гг., важна ўяўляць, што «ваенны камунізм» разам з выкліканымі ваенным становішчам мерапрыемствамі вызначаў пэўныя дзеянні па ажыццяўленні непасрэднай калектывізацыі вёскі. У адпаведнасці з Палажэннем аб сацыялістычным упарадкаванні зямлі і мерах пераходу да сацыялістычнага земляробства (1919 г.) «усе наогул землі, да часу ўступлення ў сілу гэтага становішча яшчэ не размеркаваныя ў адзінаасобнае карыстанне», перадаваліся для арганізацыі савецкіх гаспадарак.

Палітыка «насаджэння камун і саўгасаў» шырока праводзілася не толькі ў Беларусі, але і ва Украіне, у Прыбалтыцы, Туркестане [6, с. 37—42]. У Віцебскай і Магілёўскай губернях, у адрозненне ад іншых рэгіёнаў Еўрапейскай часткі РСФСР, у большай ступені назіралася імкненне да камун, чым да саўгасаў [6, л. 9]. Захопленыя ідэяй непасрэднага пераходу да камунізму, многія партыйныя кіраўнікі і работнікі зямельных аддзелаў лічылі, што «калі неадкладна не будзе пачата стварэнне адзінай камуністычнай сельскай гаспадаркі, то ўся прамысловасць прыпыніцца і працоўным пагражае галодная смерць» [7, с. 43, 47].

На барацьбу з падзеламі маёнткаў арыентавала і II канферэнцыя Кампартыі Літвы і Беларусі ў лютым 1919 г. Большасць з іх аддавалася пад саўгасы і калектыўныя гаспадаркі [8, с. 71—73, 96, 145, 148, 149]. У Наркамземе Літоўска-Беларускай ССР быў створаны пададдзел абагульнення сельскай гаспадаркі. Арганізоўваліся таксама камітэты садзейнічання арганізацыі сацыялістычнай сельскагаспадарчай вытворчасці [9, л. 1, 2]. Памылковасць такой палітыкі ўжо тады ўсведамлялася асобнымі работнікамі камісарыята земляробства ЛітБел. «Ставячы сабе на словах шырокія задачы насаджэння сацыялізму, — гаворыцца ў адным з дакументаў, — мы адмаўляем у задавальненні надзённых патрэб беднага насельніцтва» [9, л. 10].

Ва ўмовах цяжкага становішча сялянства, адсутнасці сталай моцнай улады пашырылася кола тых, хто шляхам узброенай барацьбы хацеў дасягнуць сваіх палітычных мэт, а таксама звычайных бандытаў. З інфармацыйнай зводкі сакрэтнага аддзела Усерасійскай надзвычайнай камісіі (УНК) вынікала, што 1—15 жніўня 1920 г. у Віцебскай губерні ў вялікай колькасці выдаваліся лістоўкі і адозвы. Сярод паўстанцаў з'явіліся польскія афіцэры. Колькасць «бандытаў» савецкія ўлады вызначалі да 3 тыс. чал. [10, с. 298]. Увосень 1920 г. колькасць узброеных фарміраванняў рознага кшталту павялічылася. Па звестках УНК, у Мазырскім раёне з'явіліся 2 эскадроны кавалерыі паўстанцаў, якія фарміравалі партызанскія атрады з ліку заможнага насельніцтва [10, с. 347]. У дакладзе сакрэтнага аддзела УНК аб

паўстанцкім руху 11 снежня 1920 г. паведамлялася, што «губерні Віцебская, Смаленская, Мінская і Гомельская ўяўляюць сабою ва ўсіх адносінах зручную глебу развіцця бандытызму, які ўжо там даўно квітнее». Сярод прычын пазначаліся частая змена ўлады, агітацыя Булак-Балаховіча, прыродныя ўмовы (густыя лясы). Заўважаліся выпадкі, калі нават камуністы ўліваліся ва ўзброеныя атрады. У Полацкім павеце «бандай» кіраваў старшыня валаснай ячэйкі [10, с. 369].

У канцы снежня 1920 г. на VIII Усерасійскім з'ездзе Саветаў, падагульняючы трохгадовы досвед адносін з сялянствам, У. І. Ленін падкрэсліваў: «Трэба абапірацца на аднаасобнага селяніна, ён такі і ў бліжэйшы час іншым не будзе, і марыць аб пераходзе да сацыялізму і калектывізацыі не прыходзіцца. Ад агульных разваг трэба перайсці да таго, каб зрабіць першы практычны крок абавязкова гэтай вясной і ні ў якім разе не пазней, і толькі такая пастаноўка пытання будзе дзелавая» [11, с. 181]. Вясной 1921 г. «першым практычным крокам» новай (у параўнанні з «ваенным камунізмам») эканамічнай палітыкі стала замена харчразвёрсткі харчовым падаткам.

Аднак гэта не перадвызначала істотных змен. Дасягненне непасрэднага пераходу да калектывізацыі сельскай гаспадаркі звязвалася з шырокай прапагандай пераваг буйной вытворчасці. Адпаведную рэзалюцыю, напрыклад, прыняў і Першы Гомельскі губернскі з'езд Саветаў [7, с. 69]. Складанае ваенна-палітычнае становішча ў Беларусі захоўвалася. Адсутнасць належнага харчовага забеспячэння і транспарту садзейнічала росту колькасці разбояў. Аб пасевах ніхто нават не думаў. У канцы сакавіка 1921 г. у Гомельскай губерні дзейнічала некалькі партызанскіх атрадаў, якія ўсё ў большай ступені пазначалі палітычныя лозунгі [10, с. 393]. УНК на пачатку красавіка 1921 г. паведамляла: «Бандыцкі рух з кожным днём узмацняецца». Узрасталі антысеміцкія настроі, яны былі характэрныя не толькі для ўзброеных антысавецкіх фарміраванняў, але і для частак Чырвонай арміі, расквартыраваных у Беларусі. Сяляне, часам імкнучыся схаваць сваіх, сведчылі, што значная частка «бандытаў» размаўляе на польскай мове [10, с. 398]. Яўрэйскае насельніцтва настолькі запалоханае, што гатова было эміграваць у любую частку Расіі [10, с. 403].

1921 год выдаўся для савецкай улады надзвычай цяжкім. Катастрафічна не хапала хлеба, пад пагрозай зрыву былі яго закупкі за мяжой, змяншаліся спадзяванні на атрыманне харчовай пазыкі ў Заходняй Еўропе і Амерыцы [12, л. 2—33]. Павялічваўся аб'ём лістоў ад сялян аб змякчэнні харчовага падатку. «Пры развёрстцы хлеба ўсё аддаў, — пісаў адзін з сялян, — астатняе не ў сілах. Сам і брат з часу рэвалюцыі знаходзіліся ў Чырвонай арміі на работах. На ўтрыманні 2 жанчыны, сям'я з 9 душ, і напрацаваць хлеба на такую сям'ю не магу» [13, л. 125, 216; 14, л. 197 аб.].

У новаабвешчанай Савецкай Беларускай Рэспубліцы на працягу 1921 г. таксама доўжылася рэалізацыя мерапрыемстваў, характэрных для «ваеннага камунізму». Згодна з прынятым ЦВК БССР 28 студзеня 1921 г. Палажэннем аб сацыялістычным землеўпарадкаванні ў Беларусі і аб мерах пераходу да сацыялістычнага земляробства калектыўныя формы землекарыстання прызнаваліся найлеп-

шымі «для канчатковага знішчэння ўсялякай эксплуатацыі чалавека чалавекам, для арганізацыі сельскай гаспадаркі на асновах сацыялізму» [15, л. 45].

X канферэнцыя (V з'езд КП(б) Беларусі), якая адбылася 15—30 кастрычніка 1921 г., пазначыла не толькі разуменне Беларусі як часткі Расіі [16, л. 173, 198 і інш.]. Значная колькасць удзельнікаў акрэслена выступіла супраць свабоды выбару форм землекарыстання, выяўляючы своеасаблівае разуменне новай палітыкі. Наркам земляробства А. Славінскі заяўляў: «Вы называеце гэта новай эканамічнай палітыкай, гэта анархія, і анархію трэба супыніць». Ён заклікаў абапірацца на камуны і сельскагаспадарчыя арцелі [16, л. 192, 219, 220].

Па сцвярджэнні мясцовых савецкіх улад і вайсковай разведкі, «бандыты» экіпіраваліся ў польскую форму, і харчаванне таксама перадавалася ім з Польшчы. У раёне Нясвіжа дыслакавалася каля 1 тыс. беларускіх партызан. У першай палове сакавіка ў Клецку адбыўся іх з'езд пад старшынствам Юзэфа Балаховіча. Чакаўся прыезд з Лодзі інтэрніраваных балахоўцаў для фарміравання беларускіх вайсковых частак [10, с. 402]. У БССР дзейнічалі дзясяткі ўзброеных груп — польскія фарміраванні, балахоўцы і агенты Б. Савінкава. Па сведчанні АДПУ, у раёне Мінска колькасць «бандытаў» дасягала 4 тыс. чал. [10, с. 426]. Ва ўмовах незавершанасці нацыявытворчых працэсаў сацыяльна-эканамічныя прычыны ваеннага супраціву паглыбляліся ідэйнымі і канфесійнымі, спела разуменне сваёй дзяржаўнасці [17, 18].

Сялянства чакала, да дэкларацый і слоў адносілася з традыцыйным недаверам. Вяскоўцы не спяшаліся павялічваць пашу, у шэрагу выпадкаў выкарыстоўвалі парослыя хмызняком плошчы для выпасу жывёлы. Улады ж расцэньвалі гэта як сродак ухілення ад натурпадатку. Новая інструкцыя стварала больш жорсткія ўмовы падаткаабкладання. Схаваная ад падаткаабкладання зямля належала перадачы ў Зямельны фонд [19, л. 2, 3]. Згодна з тлумачэннем Наркамата фінансаў абкладанню належалі: буйная рагатая жывёла, дробная жывёла (авечкі, козы, свінні). Падаткам меркавалася абкласці і сабак, што (мяркуючы па нататцы алоўкам на дакуменце) выклікала неразуменне нават у работніка Наркамзема [20]. Гэта ўрэшце не змяншала базу для бандытызму як у БССР, так і суседняй Чарнігаўскай губерні [12, с. 470]. Сітуацыя пачала паляпшацца толькі з восені 1921 г. У Гомельскай губерні, якая да 1924 г. уваходзіла ў склад РСФСР, па меркаванні савецкіх улад, насельніцтва паступова схілялася ў іх бок. Але яны шчыра сведчылі, што сялянства губерні падтрымала б любую ўладу, «альбо былі толькі мір, хлеб, соль, газа» [12, с. 277].

Калі ў Гомельскай губерні збор харчпадатку адбываўся добрымі тэмпамі (тут прынялі 3 тыс. рабочых і 500 дзяцей з галадаючага Паволжа), то ў БССР (тэрыторыя былой Мінскай губерні) гэтыя працэсы затрымліваліся ўзброенай барацьбой. Б. Савінкаў імкнуўся аб'яднаць свае разрозненыя ўзброеныя фарміраванні [12, с. 493]. Сярод каталікоў распаўсюджваліся чуткі аб тым, што пасля выканання харчпадатку будзе забраны ўвесь хлеб [12, с. 499]. Складанае становішча на тэрыторыі былой Мінскай губерні выкарыстоўвалася Гомельскім губернскім зямельным аддзелам для адмовы ў рээвакуацыі жывёлы [21]. Аднак паступова сіту-

ацыя наладжвалася і ў цэнтральнай частцы Беларусі. Да канца кастрычніка 1921 г. харчовы падатак быў амаль выкананы — настрой сялянства, стомленага ад узброенай барацьбы, стаў схіляцца ў бок савецкай улады [10, с. 515, 691]. Для таго каб выканаць харчпадатак, насельніцтва вёскі прадавала інвентар, таму большая частка падатку была выплачана грашыма. Менавіта гэта, па сцвярджэнні АДПУ, стала прычынай узмацнення поспехаў «кулацтва» пры перавыбарах у Саветы [22, с. 140, 151, 153].

У мэтах барацьбы з бандытызмам на пачатку 1922 г. была ўведзена пашпартная сістэма як для гарадскога, так і сельскага насельніцтва са складаннем пасямейных спісаў [23, л. 15]. Вынікам праведзеных мерапрыемстваў стала тое, што колькасць мясцовых партызан істотна зменшылася. Не трэба перабольшваць ролю і ўплыў бальшавікоў у беларускай глыбінцы на самым пачатку 1920-х гг. Пацвярджэннем можа стаць стэнаграма XI канферэнцыі (VII з'езда) КПБ, якая адбылася ў Мінску ў сакавіку 1922 г. Характарызуючы кадравы склад па Слуцкім павеце, адзін з выступоўцаў зазначыў, што: «Ва ўсім земаддзеле там ёсць два камуністы, а кіруе тым аддзелам левы эсэр, хто яго ведае, левы ён ці правы, але ва ўсякім выпадку эсэр, і яго любяць сяляне» [16, л. 66].

Традыцыя суадносіць усе важнейшыя змены ў эканамічным жыцці з рашэннямі партыі пачала складвацца толькі ў другой палове 1920-х гг. і замацавалася пад уплывам «Кароткага курса ВКП(б)». Справаздача аб дзейнасці Наркамзема РСФСР за 1917—1922 гг. і даклад аб асноўных выніках аграрнай палітыкі, у якім утрымліваецца характарыстыка зямельнай палітыкі за гэты час, выдзяляе чатыры асноўных этапы. У аснову іх былі пакладзены рашэнні з'ездаў Саветаў, а не партыйных структур. Па меркаванні аўтараў дакумента, самастойным рубяжом з'яўляецца час ад VIII да IX Усерасійскага з'езда Саветаў (снежань 1920 г. — снежань 1921 г.): «ад перамогі на франтах да самадзейнасці сялянскіх мас». Мэтай гэтага этапу з'явілася стымуляванне сялян да пашырэння свайго ворыва. А вось аб рашэннях IX Усерасійскага з'езда Саветаў у снежні 1921 г. сцвярджаецца, што гэта пачатак палітыкі, накіраванай на «ўзняцце самадзейнасці сялянскага насельніцтва на глебе гаспадарчага разліку *і асабістай іх зацікаўленасці* ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі» (курсіў аўтара. — *Х. С.*) [24]. Менавіта на гэтым з'ездзе кіраўнік бальшавіцкай партыі У. І. Ленін пазначае, што саюз сялянства і рабочага класа павінен быць пабудаваны «на іншых пачатках». «Асновай, сутнасцю эканамічнай сувязі, — падкрэслівае ён, — павінен стаць гандаль». — «Для камуністаў, — працягвае ён, — гэта непрыемнае адкрыццё. Вельмі можа стацца, што гэтае адкрыццё — надзвычай непрыемнае...» [25, с. 13, 14]. Кіраўнік бальшавікоў сцвярджаў, што неабходна вучыцца, неабходны новы культурны ўзровень, гэта патрабуе «новай культуры», і некалькі разоў паўтарыў: «...навучыцца працаваць іншымі тэмпамі, лічачы работу дзесяцігоддзямі, а не месяцамі, «тут праца цэлых дзесяцігоддзяў» [25, с. 23, 24]. У. І. Ленін лічыў: «Харчпадатак у агульным і цэлым даў сялянам ва ўсёй масе паляпшэнне. Гэта не патрабуе доказаў...» [25, с. 17]. У супярэчнасць яму М. Асінскі (пад гэтым псеўданімам працаваў вядомы савецкі дзеяч, чалавек з грунтоўнай адукацыяй і выдатнымі

здольнасцямі Валерыян Валерыянавіч Абаленскі) сцвярджаў аб катастрафічнай сітуацыі ў сельскай гаспадарцы. І каб выправіць яе, неабходны былі, па яго меркаванні, найперш за ўсё сродкі. Можна заўважыць, што асобнае месца М. Асінскі адводзіў абшчыне, маючы на ўвазе магчымасць яе трансфармацыі ў кааперацыйную перспектыву. Прызнаючы кансерватыўныя рысы абшчыны, ён лічыў станоўчым фактам захаванне ў зямельным заканадаўстве перадзелаў, лімітаваных дзевяцігадовым тэрмінам. Выступленне М. Асінскага падштурхнула многіх дэлегатаў да дыскусіі і новых прапаноў. Так, адзін з выступоўцаў сцвярджаў, што харчпадатак, які збіраецца таксама надзвычайнымі метадамі, павінен быць зменены; па яго меркаванні, ён павінен быў улічваць і якасць зямлі [26, с. 19]. М. Асінскі падкрэсліваў, што неабходна прапагандаваць сялянскую кааперацыю. Але менавіта прапаноўваць, а не насаджаць — і ў гэтым бачылася характэрная рыса новай эканамічнай палітыкі [27, с. 3].

Варта адрозніваць гаспадарчую палітыку і гаспадарчую сістэму, якая складваецца пад яе ўплывам. Адпавядаючая пэўнаму палітычнаму курсу гаспадарчая сістэма складаецца паступова і толькі з часам выцясняе старую сістэму. Сельгаспадатак з'яўляўся сапраўды толькі «першым практычным крокам» у кірунку да сістэмы новай эканамічнай палітыкі, якая сфарміравалася на вёсцы да 1925 г. і ўключала ўвядзенне свабоды мясцовага тавараабароту, дапушчэнне працоўнай арэнды зямлі і найму рабочай сілы, а таксама дэкрэт аб свабодным выбары форм землекарыстання [28, с. 245—247; 29, с. 267—279].

Пачынаючы з 1922 г. кіраўніцтва бальшавіцкай партыі паступова арыентавала мясцовыя арганізацыі на неабходнасць развіцця рыначных адносін [30, с. 588]. Такі погляд на новую эканамічную палітыку прадугледжваў адмову ад непасрэднай калектывізацыі як «слупавой дарогі да сацыялізму». «Цалкам не трэба бянтэжыцца тым, што справа пачынаецца не з вытворчасці, а з абарачэння, — адзначаў у 1926 г. М. І. Бухарын. — Логіка рэчаў абавязкова прывядзе да таго, што ўслед за каапераваннем у галіне абарачэння непазбежна будзе ісці рознымі шляхамі і кааперыраванне вытворчае» [31, с. 142—144]. Падобную пазіцыю ў 1924 г. можна прасачыць і ў І. В. Сталіна [32, с.17, 68].

Дарэчы, адзіны натуральны падатак на прадукты сельскай гаспадаркі на пачатку 1920-х гг. змяняўся па цэлым спектры паказчыкаў, з'яўляючыся прадметам абмеркавання і дыскусій. Праект дэкрэта СНК РСФСР па гэтым пытанні быў жорстка раскрытыкаваны ў Наркамземе. «Чатырохгадовая практыка харчпадаткавых кампаній ужо дастаткова ярка паказала нам усю шкоду дзеянняў такога кшталту базіравання сумы падатку выключна на патрэбах дзяржавы, зусім не прымаючы пад увагу матэрыяльныя рэсурсы сялянскай гаспадаркі, на аднаўленне якой мы павінны кінуць свае сілы», — адзначалася ў дакуменце [33]. НКЗ прапанаваў наступную фармулёўку: «Аб'ектам абкладання з'яўляецца чыстая прадукцыя сялянскай гаспадаркі (валавая прадукцыя за вылікам насення і корму жывёле), налічаная ў ржаных (ці залатых) адзінках і аднесеная да адзінкі выгоднай зямлі» [33, л. 7]. Па меркаванні ўлад, адносіны да адзінага сельгаспадатку залежалі ад тлумачэння яго мэты і задач. Аднак яны вымушаны былі прызнаць, што

на пачатак восені 1923 г. у шэрагу губерняў вяскоўцы не толькі не мелі грошай, але і неабходнай колькасці і якасці насення. Па гэтай прычыне вясной 1924 г. чакаўся недасеў збожжа [22, с. 196]. Важнейшымі мерапрыемствамі нэпа сталі замена натуральнага падатку грашовым і рэалізацыя фінансавай рэформы.

Між тым тэмпы аднаўлення не адпавядалі чаканням. З даклада Наркамата земляробства БССР 1924 г. сведчыла, што экстэнсіўнае развіццё сельскай гаспадаркі стварала велізарны працэнт незапатрабаваных на вёсцы рабочых рук, якія ў той жа час не маглі тэрмінова знайсці працу і ў горадзе. «Не будзем думаць, — адзначалася ў дакладзе, — што прырэзка сялянскай зямлі вырашыла аграрнае пытанне ў Беларусі, яна толькі стварыла ўмовы для яго вырашэння». Далейшае развіццё бачылася ў меліярацыі, землеўпарадкаванні, крэдытаванні, развіцці розных форм кааперацыі (найперш вытворчай) [34]. У БССР сяляне скардзіліся на непасільнасць гербавага і іншых збораў. Адраджэнню вёскі не спрыяла затрымка па выдзяленні сялянам лясоў мясцовага прызначэння. У Віцебскай губерні, да прыкладу, быў зарэгістраваны напад сялян на лясную ахову [22, с. 190]. У шэрагу выпадкаў перашкаджала няўзгодненасць дзеянняў органаў улады БССР і РСФСР. З прычыны таго, што ў суседніх тэрыторыях РСФСР падчас нарыхтоўчага перыяду былі зняты ліміты, цэны там склаліся занадта высокія. Спецыяльныя атрады толькі дарма ганяліся за бясконцымі караванамі абозаў, якія накіроўваліся прыватнымі гандлярамі ў Раслаўль, Смаленск і Сураж [35, л. 442, 443].

Што тычылася саўгасаў, то яны не толькі не мелі значнай ролі на працягу 1920-х гг. па аб'ёмах зямельнай плошчы, але і не выявілі сябе як высокапрадукцыйныя гаспадаркі. На XIII партыйнай канферэнцыі ЦК КП(б)Б, што адбылася 12—14 мая 1924 г., пазначалася: «Мы ведаем, што саўгасы зусім слаба працуюць, але гэта яшчэ не бяда. А галоўная бяда ў тым, што адміністрацыя саўгасаў не можа падысці да селяніна так, каб ён адносіўся добра да саўгаса. Адносіны грубыя. Селянін аніякім чынам не бачыць, што саўгасы дапамагаюць яму. Акрамя таго, саўгасы здаюць у арэнду зямлю, а не апрацоўваюць яе сваімі сіламі. Гэта сапраўднае бяльмо на воку ў селяніна» [36, л. 150].

На пачатку 1920-х гг. савецкае кіраўніцтва імкнулася максімальна аператыўна выкарыстаць дасягненні навукі для іх практычнага прымянення ў сельскай гаспадарцы. Так, праслухаўшы даклад прафесара Пранішнікава «Аб некаторых заданнях для восеньскай пасяўной кампаніі 1921 г.», камісія Дзяржплана пазначыла: «З прычыны выключнай важнасці даклада тэрмінова паведамляем у НКЗ аб пажаданасці пасеву на корм па ржышчы сумесі аўса з вікаю; прасіць НКЗ, Наркамхарч і Цэнтрасаюз тэрмінова высветліць наяўнасць колькасці насення аўса (у асаблівасці) і вікі» [37, л. 43, 44]. Прымяненне навуковых дасягненняў — адна з істотных прыкмет мадэрнізацыі. Найбольш вядомымі прадстаўнікамі эканамічных школ 1920-х гг. з'яўляліся А. В. Чаянаў, М. Д. Кандрацьеў, М. П. Макараў, А. М. Чэлінцаў, якія ставілі на мэце паляпшэнне сялянскай працоўнай гаспадаркі на аснове інтэнсіфікацыі за кошт перадавой тэхналогіі, кааперавання збыту і перапрацоўкі сельгаспрадукцыі.

М. Д. Кандрацьеў адзначаў эканамічную бесперспектыўнасць як буйных капіталістычных, так і дробных сялянскіх гаспадарак. Перспектывы развіцця сельскай гаспадаркі ён бачыў у кааперыраванні. Менавіта кааперацыя здольная, на яго погляд, пераадолець недахопы як капіталістычнага (акцэнт на дабавачным кошце як мэце вытворчасці), так і дробнага (адсутнасць умоў да павышэння вытворчасці працы і ўкаранення дасягненняў тэхнічнага прагрэсу) спосабаў гаспадарання. На пачатку 1920-х гг. Кандрацьеў — начальнік упраўлення сельскагаспадарчай эканоміі і планавых работ Наркамзема РСФСР, прадстаўнік Наркамзема ў сельгассекцыі Дзяржплана, вядомы ўжо як аўтар кнігі «Рынак збожжа і яго рэгуляванне падчас вайны і рэвалюцыі». Яна была выдадзена ў 1922 г. (2000 экз.), але ў сувязі з арыштам аўтара ў 1930 г. і вызначэннем «варожага» зместу яго выданняў да 1980-х гг. у публічных зборах засталося толькі два тамы [38]. Цэнтральнай праблемай манаграфіі М. Д. Кандрацьева з'явілася даследаванне сістэмы забеспячэння ва ўмовах немагчымасці функцыянавання рынку падчас вайны і рэвалюцыйных пераўтварэнняў грамадства. М. Д. Кандрацьеў яшчэ на пачатку 1920-х гг., аналізуючы ўмовы 1914—1916 гг., прадказаў праблему, якая склалася праз 5—6 гадоў. Ён падкрэсліваў, што ўзвышэнне спажывання хлеба сялянамі і памяншэнне вытворчасці высокатаварных «уладальніцкіх» (памешчыцкіх) гаспадарак здольна выклікаць крызіс хлебнага рынку. Заўважым, што надалей так і адбылося. Высокатаварныя памешчыцкія гаспадаркі ў Беларусі не былі заменены іншымі формамі буйной сельскагаспадарчай вытворчасці, ва ўмовах драблення сялянскіх гаспадарак узрастаў узровень іх спажывання. Ужо з 1926 г. БССР увозіць значную колькасць збожжа. З пачатку 1927/28 гаспадарчага года ў СССР у цэлым выявілі крызісныя рысы, звязаныя з рэзкім зніжэннем збожжавай прадукцыі на рынак. Паўтарыліся тыя ж прычыны, што сфарміравалі папярэдні хлебны крызіс 1916 г., але ў мірных умовах, калі істотна ўзрастала даходная частка бюджэту сялянства ў параўнанні з расходнай і памяншалася ўздзеянне тых аспектаў, якія стымулявалі сялянства выкідваць хлеб на рынак (у Беларусі — нізкі кошт збожжа на рынку пры высокім сабекошце ўласнай вытворчасці, развіццё мяса-малочнай жывёлагадоўлі, выдаткаванне збожжа на корм жывёле).

В. П. Данілаў бачыў прычыну несуразмернасці і дыспрапорцый далейшага развіцця СССР у памылцы ЦСУ пры падліку ўраджаю 1927 г. Аднак яшчэ на пачатку 1920-х гг. М. Д. Кандрацьеў сцвярджаў, што вырашальнае значэнне для цэнаўтварэння маюць сапраўдныя, а не магчымыя прапановы і спажывецкі попыт, разыходжанне паміж якімі выходзіць на першы план і становіцца вырашальным фактарам узвышэння цэн. Сялянства не складала высокакультурную масу, не мела належнага даверу ўладам, не было схільным да высокай самаахвярнасці. Да такой высновы М. Д. Кандрацьеў прыйшоў з прычыны асэнсавання адмоўнага вопыту, што набыў падчас працы ў складзе Часовага ўрада. Яму, відаць, не давала спакою думка, чаму тэорыя не заўсёды спрацоўвала на практыцы. Разважанні, зробленыя ўжо ў Бутырскай турме (рукапіс апошняй кнігі вучонага створаны пераважна ў 1931 г.), вывелі яго на неабходнасць больш глыбокага вывучэння грамадства і разумення прычын марудных змен у яго развіцці. Эканоміка,

па меркаванні М. Д. Кандрацьева, па-за сувяззю з грамадствам і чалавекам — голая тэорыя. Прырода выстаўляе быццам бы максімальныя і мінімальныя абмежаванні культуры, уплыву грамадскіх умоў на чалавека і, адпаведна, для амплітуды ходу самога грамадскага жыцця [39, с. 32].

Яшчэ адным цікавым выданнем 1990-х гг. з'явілася публікацыя выбраных прац выдатнага расійскага сялязнаўца Аляксандра Васільевіча Чаянава (выдадзеная ў серыі «Эканамічная спадчына»). Сярод артыкулаў і аб'ёмам, і зместам вызначаецца кніга «Арганізацыя сялянскай гаспадаркі» (1925). З 1919 г. А. В. Чаянаў працаваў у Наркамаце земляробства РСФСР. У лютым 1921 г. ён быў зацверджаны членам калегіі Наркамзема і ажыццяўляў яго прадстаўніцтва ў Дзяржплане, у красавіку таго ж года — намеснікам старшыні Эканамічнай нарады пры планавай камісіі Наркамзема. Менавіта ён 23 лістапада на аб'яднаным пасяджэнні прэзідыума сельскагаспадарчай секцыі Дзяржплана і прадстаўнікоў Наркамзема прачытаў даклад «Генеральны план Наркамзема на 1921—1922 гг.». А. В. Чаянаў сцвярджаў, што сялянская сям'я, якая не валодае дастатковым запасам зямлі і сродкаў вытворчасці для поўнага выкарыстання сваёй працы ў сельскагаспадарчым прадпрыемстве, размяшчае лішак сваёй працы ў іншы від гаспадарчай дзейнасці [40, с. 278]. У Беларусі спроба пераадолець аграрную перанаселенасць выяўлялася і ў пашырэнні больш працаёмкіх культур — бульбаводства, ільнаводства, развіцці жывёлагадоўлі і падсобных промыслаў.

Прафесар А. В. Чаянаў, услед за А. М. Чэлінцавым даследуючы суадносіны паміж цэнамі на мяса і корм жывёле, прыйшоў да высновы, на першы погляд парадаксальнай, — гэтыя цэны зваротна прапарцыянальныя: чым даражэй корм, тым танней мяса. Бо жывёла з дагістарычных часоў магла прымаць характар запаснога капіталу. У гады неўраджаяў і іншых катаклізмаў сяляне запускалі ў свае статкі вялікую колькасць маладняка, каб у складаны для сябе час выкарыстаць такога кшталту запасны фонд [40, с. 358]. На Беларусі ў другой палове 1920-х гг. на гэтыя працэсы паўплывалі чуткі аб магчымай вайне, абясцэньванне грошай і ўзрастанне кошту збожжа і бульбы. Згодна са звесткамі «Перспектыўнага плана развіцця сельскай і лясной гаспадаркі...» працаёмкія культуры — лён, канапля, бульба — значна больш распаўсюджаныя ў бядняцкіх гаспадарках, кармавыя і збожжавыя — у заможных. Кароў на гаспадарку мелася зноў жа больш у беднякоў, але вывад складальнікаў плана аб больш эфектыўным развіцці жывёлагадоўлі ў бядняцкіх гаспадарках бачыцца памылковым. Жывёла, як паказала ранейшае вывучэнне, разглядалася пераважна як «крыніца» ўгнаенняў [41, с. 52—58]. Павышэнне цэн на збожжа ў 1927—1928 гг. выклікала пэўную паніку на мясцовым рынку. У 1928 г. пагалоўе свіней знізілася ў параўнанні з 1927 г. амаль на 20 % і склала 93 % ад узроўню 1925 г. Закупачныя цэны на свініну кааперацыяй і дзяржавай вызначыліся як занадта нізкія, прыватнік перахапіў ініцыятыву ў нарыхтоўцы свініны і, па сутнасці, дыктаваў рыначныя цэны [42, л. 10]. Менавіта бяднейшае сялянства і частка сераднякоў у выніку шмат страцілі падчас «хлебнага крызісу». Такім чынам, фарміравалася значная сацыяльная база для незадаволенасці і далейшай агітацыі з боку заможных гаспадароў вёскі.

В. П. Данілаў сцвярджаў, што 1926—1927 гг. былі лепшымі па ўмовах жыцця ў краіне, па наладжванні рынкавага механізма, які забяспечваў функцыянаванне шматукладнай эканомікі. Нэп, паводле яго перакананняў, пачынаўся з прызнання права селяніна распараджацца вырабленым ім прадуктам, у першую чаргу хлебам, а таксама з прызнання выключнай ролі кааперацыі ў расійскіх умовах, і лёс гэтых складаючых нэпа быў вырашаны ў 1928—1929 гг. У цэлым новая эканамічная палітыка сапраўды працавала, забяспечваючы асноўныя інтарэсы дзяржавы ў самым буйным сектары савецкай эканомікі — сельскай гаспадарцы. Адным з вынікаў яе ажыццяўлення сталі прыкметныя зрухі як у гаспадарчым стане вёскі, так і ў сацыяльным складзе яе жыхароў. Нэпаўская вёска асераднячвалася, больш шырокія яе пласты атрымлівалі рэальны доступ да ўдзелу ў сельскагаспадарчай кааперацыі. У сярэдзіне 1920-х гг. адбывалася паглыбленне спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі ў кірунку мяса-малочнай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. Істотныя поспехі былі ў развіцці птушкагадоўлі [42]. Развіццё рыначных адносін праз механізмы цэн стымулявала дадзеную тэндэнцыю. Павялічвалася ўдзельная вага гэтай прадукцыі ў таварнай частцы (гл. дадатак, табл. 1). Па разліках эканамістаў на аснове бюджэтных абследаванняў вытворчасць збожжа была прыбытковай толькі для буйных (ад 8,1 да 16 дзесяцін) высокатаварных гаспадарак. Што ж тычылася асноўнай масы (ад 2 да 8 дзесяцін), то для іх сабекошт пуда ў рублях у 1924/25 гаспадарчым годзе быў ніжэй рыначнай цаны толькі па такіх культурах, як лён і бульба. У наступным годзе рыначныя цэны на жыта і авёс узраслі (гл. дадатак, табл. 2). Пры гэтым узровень механізацыі вырошчвання і збору бульбы і тэхнічных культур заставаўся самым нізкім. Вельмі марудна адраджалася свінагадоўля [43, л. 41]. Адной з важнейшых праблем, вынікам ваеннага ліхалецця, з’яўляліся хваробы жывёлы. Па сцвярджэнні Д. Ф. Прышчэпава, Віцебскім бактэрыялагічным інстытутам была наладжана вытворчасць сывараткі з разлікам на 40 000 галоў [41, с. 52—58]. Гэтая праца, безумоўна, патрабавала шмат часу, асабліва ў тых умовах.

Савецкая статыстыка прыводзіла даволі істотныя лічбы росту жывёлы. Аднак зыходныя даныя падаваліся ў параўнанні з 1916 годам — годам ваенным і для жывёлагадоўлі неспрыяльным. Што ж тычыцца дынамікі 1920-х гг., то калі ў 1923 г. налічвалася 911 743 каровы, то ў 1926 г. — 1 126 273 [44, с. 187]. Не зусім добрая сітуацыя складвалася з кармамі і якасцю жывёлы [45, с. 22, 23]. Тыповая серадняцкая гаспадарка была напалову натуральна-спажывецкай. Лібералізацыя толькі выявіла нябачныя хібы планавання. На V з’ездзе Саветаў СССР, які адбыўся ў маі 1927 г., адзначалася, што пры агульным росце асобных галін сельскай гаспадаркі тэмпы росту збожжавай вытворчасці істотна замарудзіліся [46, с. 162]. З’езд звярнуў увагу на паляпшэнне перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі і неабходнасць зняць адміністрацыйныя перашкоды на шляху дробнага сялянскага гандлю. Аднак адразу ж як эканамічныя метады пазначылі збой, акрэсліліся прымусовыя займы, інфляцыя, завышаныя цэны на збожжа і г. д. Узнікала патрэба ў канцэнтрацыі зямлі і капіталу, рухомасці насельніцтва. Але ў рэальнасці назіраліся працэсы драблення і натуралізацыі гаспадарак.

Па меркаванні аўтараў шматтомнай «Гісторыі Беларусі», «партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва Саюза ССР праігнаравала альтэрнатыўныя падыходы, прапанаваныя вядомымі дзеячамі М. Бухарыным, А. Рыкавым, М. Томскім, вучонымі-аграрнікамі М. Кандрацьевым, А. Чаянавым і іх прыхільнікамі, якія прапаноўвалі вырашыць аграрную праблему не такім прамалінейным і жорсткім шляхам, а больш памяркоўным, з выгадай для сялянства і дзяржавы» [47, с. 276]. І ўсё ж меркаванні навукоўцаў не з'яўляюцца такімі ўжо адназначнымі. Аналізуючы перспектывы «бухарынскай альтэрнатывы», С. А. Есікаў пазначае, што яна не мела шанцаў на поспех [48, с. 98], улічваючы ўскладненне міжнароднай сітуацыі, неабходнасць паскораных тэмпаў індустрыялізацыі, лепшай эфектыўнасці гаспадарання на зямлі, большай таварнасці збожжа. Тэмпы, аб якіх пісаў М. І. Бухарын, не задавальнялі найперш маладое пакаленне, энтузіязм якога краіна мела магчымасць выкарыстаць. Сярод моладзі ўсё больш распаўсюджвалася псіхалогія, якую можна назваць «рэвалюцыйным рамантызмам»: вера ў будучую сусветную рэвалюцыю ў спалучэнні з глыбокім перакананнем ва ўсемагутнасці каманднa-адміністрацыйных метадаў кіравання.

Новая эканамічная палітыка ў маштабах СССР не здолела прывесці да чаканых вынікаў росту, найперш у сферы сельскагаспадарчай вытворчасці. Вёска асераднячвалася [49, с. 113; 51, с. 185], аднак селянін забяспечваў пераважна толькі сябе. Пры гэтым нэп далёка не з'яўляўся «сялянскім раем». М. А. Бяспалая, К. Б. Літвак сцвярджаюць, што ўяўленне аб усеагульным прызнанні вёскай палітыкі нэпа, якое існуе ў літаратуры, істотна перабольшана. Актыў вёскі імкнуўся да радыкальных перамен, дрэнна разумеючы іх сутнасць на фоне апалітычнасці значнай часткі сялянства і глухога гоману наконт парушэння палітыкай нэпа векавых ураўняльных традыцый. Адным з важнейшых вынікаў нэпа была ўнутраная пераарыентацыя селяніна: з аднаго боку, ён у масе сваёй гатовы да прынцыповых змен склаўшыхся парадкаў, з другога боку, з'яўляючыся прыродным канфармістам, вызначаў гэтыя змены ў межах меўшыхся палітычных структур, гэта значыць савецкай улады. У працягу паслядоўнай рэалізацыі прынцыпаў нэпа ў палітыцы не былі да канца 1920-х гг. зацікаўлены дастаткова шырокія пласты вясковага насельніцтва, што стала важнай перадумовай адмовы ў дзяржаўным кіраўніцтве ад гэтых прынцыпаў.

Тэндэнцыі дэмакратызацыі міжнацыянальных адносін, якія выявіліся на пачатку саюзнага будаўніцтва, паступова саступалі імкненням да пашырэння функцый і ролі цэнтральных савецкіх і партыйных структур. У выніку не ўлічваліся спецыфіка гістарычнага развіцця, асаблівасці сацыяльна-эканамічнага жыцця Беларусі. У сярэдзіне 1920-х гг. кіраўніцтва БССР (старшыня ЦВК — Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў і старшыня СНК Іосіф Аляксандравіч Адамовіч) сапраўды імкнулася вызначыць раўнапраўны статус Беларусі ў саюзным супольніцтве. У часопісе «На аграрным фронце» за 1926 г. № 10 маецца кароткая тлумачальная запіска Урада Беларускай ССР да праекта «Агульныя пачаткі землекарыстання і землеўладкавання Саюза ССР». Дакумент сведчыць аб тым, што беларускі ўрад застаўся незадаволеным распрацаваным у Маскве праектам, «паколькі праект, дэ-

талізуючы ўсе пытанні землекарыстання і землеўпарадкавання, па сутнасці, з'яўляецца Усесаюзным зямельным кодэксам і пакідае на вырашэнне асобных саюзных рэспублік у галіне рэгулявання зямельных адносін толькі выкананне зямельнага заканадаўства Саюза, між тым як у адпаведнасці з арт. 1 Канстытуцыі СССР веданню Саюза ССР у асобе яго вышэйшых органаў належыць "устанаўленне агульных пачаткаў землеўпарадкавання і землекарыстання"». Урад БССР прапанаваў свой праект, згодна з якім «уся зямля, якая ўваходзіць у склад тэрыторыі Саюза ССР, складае ў межах кожнай Саюзнай Рэспублікі дзяржаўную ўласнасць гэтай рэспублікі». Ад імя Урада Беларускай ССР дакумент падпісалі намеснік Старшыні СНК БССР М. Карклін і Кіраўнік справамі СНК БССР М. Мароз [51, с. 77—80]. Аб неабходнасці ўліку спецыфікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі пры вызначэнні падаткаабкладання гаварыў на VIII Усебеларускім з'ездзе Саветаў наркам земляробства БССР Д. Ф. Прышчэпаў.

Рост калектыўных гаспадарак да 1924 г. і яго адсутнасць у 1924—1927 гг. дазволілі пераважнай колькасці беларускіх савецкіх даследчыкаў суадносіць гэта з дзейнасцю Д. Ф. Прышчэпава (гл. дадатак, табл. 6). У постсавецкі ж перыяд гэта дало падставу бачыць у савецкім наркаме абаронцу будучага фермерства. Праведзенае вывучэнне дазваляе не пагадзіцца з такім сцвярджэннем. У кастрычніку 1924 г. на 2-м з'ездзе ўпаўнаважаных сельскагаспадарчай, крэдытнай і саматужна-прамысловай кааперацыі Беларусі сапраўды адзначаліся факты захаплення шэрагу работнікаў зямельных упраўленняў хутарызацыяй і разгортваннем калектыўных гаспадарак на хутары. Прысутным на нарадзе Д. Ф. Прышчэпавым (у той час яшчэ намеснікам наркама земляробства БССР [52]) было дадзена абяцанне звярнуць больш увагі на развіццё калектываў [53, л. 51].

З пачатку 1925 г. разгортваецца барацьба з «хутараманіяй», якая выявілася ў працы Віцебскага акруговага зямельнага кіравання. Гэтае пытанне спецыяльна разглядалася на сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР 6-га склікання. Яна канстатавала пералом сярод насельніцтва да пасялковай формы землекарыстання і даручыла Віцебскаму акрвыканкаму «правесці шырокую тлумачальную кампанію для замацавання гэтага кірунку». Сесія таксама адзначыла, што «да гэтага часу з боку нізавога савецкага апарату не надаецца дастатковай увагі калгасам», і вызначыла мерапрыемствы па ўмацаванні іх гаспадарча-фінансавага становішча [54, с. 3, 13]. Была прынята адмысловая пастанова Наркамата земляробства БССР, згодна з якой толькі ў асаблівых выпадках, калі «тапаграфічныя ўмовы або размяшчэнне ўгоддзяў» абумоўлівалі найбольшую рацыянальнасць хутарскога або адрубнога землекарыстання або калі насельніцтва ўпарта аддавала перавагу апошнім формам, дапушчалася ўтварэнне хутароў і адрубаў [55, с. 71]. Некаторыя работнікі зямельных органаў лічылі гэта парушэннем рашэння III з'езда Саветаў (май 1925 г.) «не ставіць адміністрацыйных перашкод вылучэнню на адрубы і хутары» [56, с. 85]. Адказваючы сваім апанентам, Д. Ф. Прышчэпаў падкрэсліваў, што, прызнаючы за селянінам права выбару, «дзяржава не можа цалкам адмовіцца ад права заахвочваць тую ці іншую форму землекарыстання» [57, с. 119].

У Перспектыўным плане развіцця сельскай і лясной гаспадаркі БССР на 1925/26—1929/30 гг. адзначалася, што менавіта пасялковая форма землекарыстання з агульным шматпольным севазваротам і без яго «адпавядае асноўнай мэце НКЗ — абагульненню сельскай гаспадаркі шляхам кааперавання (у асаблівасці вытворчага) земляробчага насельніцтва» [58, с. 136]. Калектыўныя гаспадаркі, па меркаванні аўтараў дакумента, з'яўляліся адным з многіх, да таго ж не самых масавых, напрамкаў вытворчага кааперавання. Гэта палажэнне аргументавалася нязначнай колькасцю калгасаў, утварэннем іх амаль выключна на землях дзяржаўнага зямельнага фонду і яго адсутнасцю для развіцця калектыўных гаспадарак у далейшым. Такім чынам, прыхільнасць кіраўніцтва Наркамзема БССР, і ў прыватнасці Д. Ф. Прышчэпава, да хутарской формы землекарыстання, стрымліванне калгаснага будаўніцтва можна разглядаць як тэзіс, пазбаўлены аргументаў. Гаворка можа ісці толькі пра розныя трактоўкі прынцыпаў класічнага нэпа і аб прычынах адыходу ад яго ў канцы 20-х гг. XX ст.

Улічваючы бюракратычныя структуры, якія хутка сфарміраваліся ў кааператыўных органах і органах зямельнага кіравання, можна сцвярджаць, што погляд на калгасы як нешта другаснае ўсё ж мог адбіцца адмоўна на стаўленні да калектыўных гаспадарак. У шэрагу выпадкаў узнікаў разрыў паміж словам і справай, звядзенне прынятых рашэнняў да ўзроўню дэкларатыўных. Тэхнічны савет Гомельскага губернскага зямельнага кіравання ў снежні 1924 г. ахарактарызаваў ільготы, якія прадстаўляюцца калгасам, як «папяровыя стымулы» [59, л. 45].

Мелася шмат пастаноў кіруючых кааператыўных структур, аднак акруговыя саюзы сельскагаспадарчай кааперацыі часам не маглі арганізаваць неабходнага абслугоўвання калектыўных гаспадарак, разглядаючы іх як «дадатковы цяжар» [60, л. 4]. Многія савецкія і зямельныя органы на месцах, не маючы ў сваім складзе работнікаў, дастаткова кампетэнтных у пытаннях калгаснага будаўніцтва, неабгрунтавана ліквідоўвалі калектыўныя гаспадаркі, затрымлівалі для іх выдзяленне зямлі, не адпускалі лесаматэрыялы для рамонту і г. д. [61, л. 25, 26]. Камісія Рабоча-сялянскай інспекцыі (РСІ), якая абследавала ў 1926 г. калектыўныя аб'яднанні, канстатавала, што «калгасы пакінутыя на волю лёсу. І калі яны існуюць у такіх умовах, то яны цалкам даказалі сваю жыццёвасць, а роўна і тое, што з іх выйдуць магутныя арганізацыі, калі ім будзе нададзена ўвага не ў рэзалюцыях і пастановах, а на справе» [62, л. 225]. Калектыўныя гаспадаркі абкладаліся такім жа сельгаспадаткам і на такіх жа ўмовах, што і адзінаасобнікі, але мелі зніжэнне па сельгаспадатку ў памеры 25 % для камун і арцеляў і 10 % для таварыстваў па грамадскай апрацоўцы зямлі. Гэта вымушала кантралюючыя органы ўвесь час сачыць за адпаведнасцю назваў і статутаў рэальнаму становішчу спраў [63, с. XVII].

Ідэйныя матывы пры арганізацыі калектываў з'яўляліся часцей выключэннем, чым правілам [60, л. 2]. Аднак уяўляецца цалкам натуральным, што ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі ўступленне ў камуну, арцель або таварыства па грамадскай апрацоўцы зямлі праследавала рэальныя мэты і пэўныя матэрыяльныя выгоды. Забяспечанасць зямлёю ў калгасах была вышэй, чым у сялян-аднаасобнікаў, што ва ўмовах аграрнай перанаселенасці і малазямелля выяўлялася істот-

ным фактарам (гл. дадатак, табл. 14). Частка членаў калектываў, якія мелі зямлю да ўступлення ў калгас, працягвала карыстацца аднаасобна сваімі надзельнымі землямі, іншая ўтварыла калектыўныя аб'яднанні з атрыманнем прырэзкі з запаснога фонду [64, л. 129]. Таму ў арганізацыі калгасаў перш за ўсё былі зацікаўлены беззямельныя і малазямельныя пласты вясковага насельніцтва.

У 1925—1926 гг. многія з сялян спадзяваліся атрымаць зямлю ў аднаасобнае карыстанне з запаснога фонду. Гэты фонд быў створаны згодна з рашэннем IV сесіі ЦВК БССР 1-га склікання ў студзені 1925 г. Ён складаўся з участкаў, пералічаных з ляснога фонду ў зямельны і дзяржмаёмасці; часткі непрыдатных зямель, якія не выкарыстоўваліся належным чынам; ад абрэзак зямлі ў гаспадарках, якія перавышлі ўстаноўленыя максімальныя нормы землезабеспячэння [65, с. 135]. З названага фонду за 1926—1928 гг. было нададзена 42 тыс. бядняцкіх і дададзена 91 700 бядняцкіх і малазямельных серадняцкіх гаспадарак [66, с. 75]. Паколькі гэта ажыццяўлялася ў ходзе землеўпарадкавання, то магчымасць атрымання прырэзкаў з запаснога фонду была нашмат ніжэйшай у акругах, утвораных на тэрыторыі былых Гомельскай і Віцебскай губерняў, дзе землеўпарадкавальныя работы пачаліся з 1921 г. і значная частка сялянскага землекарыстання была ўпарадкавана. На 1 кастрычніка 1925 г. менавіта тут дзейнічала большасць калектыўных гаспадарак: 76 % камун, 51,2 % арцеляў і 94,6 % таварыстваў па грамадскай апрацоўцы зямлі [67, с. XXXVII]. Пазначаная залежнасць была не абсалютнай. На 1 кастрычніка 1928 г. па Мазырскай акрузе прырэзка да вёсак і асобных гаспадарак была найбольшай, і ў той жа час тут назіралася самая высокая па БССР удзельная вага калектыўных гаспадарак сярод упарадкаваных форм землекарыстання [68, с. 248, 249]. Відавочна, дзейнічалі і іншыя рэгіянальныя фактары.

Ці была праблема крызісу хлебанарыхтовак 1928—1929 гг. у межах больш паслядоўнага ажыццяўлення базавых прынцыпаў новай эканамічнай палітыкі як у вёсцы, так і ў горадзе невырашальная? Ва ўмовах тагачаснай ідэалогіі харчовая бяспека звязвалася з функцыянаваннем усёй эканомікі СССР, і невыпадкова менавіта ў хлебавытворчых раёнах Саюза была першапачаткова звернута ўвага на калектыўнае гаспадаранне. На працягу 1927/28 гаспадарчага года ў дынаміцы калгаснага будаўніцтва ў СССР адбываюцца істотныя змены, якія дазваляюць казаць пра новы этап у развіцці дадзенага працэсу [69, с. 9].

За 1927/28 гаспадарчы год узрасла колькасць калектыўных гаспадарак і ў БССР (з 440 да 994). Колькасць аб'яднаных у калгасы сялянскіх гаспадарак павялічылася ўдвая [70, с. 3; 71, с. 56]. Пазначаючы прычыны значных змен, гісторыкі звяртаюць увагу на пачатак агульнага павароту ў сельскагаспадарчай палітыцы бальшавіцкай партыі, акрэсленага рашэннямі XV з'езда ВКП(б). У рэзалюцыі з'езда «Аб рабоце на вёсцы» сцвярджалася, што «адной з асноўных перадумоў развіцця СССР да сацыялізму з'яўляецца ўздым прадукцыйных сіл вёскі і рост дабрабыту шырокіх сялянскіх мас. Сацыялістычны горад можа весці за сабой вёску толькі па гэтым шляху, усяляк пры гэтым спрыяючы паступоваму пераходу ад індывідуальнай, ад уласнай гаспадаркі, якая яшчэ значны час будзе базай усёй сельскай гаспадаркі, сельскагаспадарчай вытворчасці, да яго калек-

тыўных формаў» [72, с. 295]. Канкрэтныя формы і тэрміны калектывізацыі з'ездам не вызначаліся. Пры гэтым тэрмін «калектывізацыя» заставаўся тоесным «кааперацыі».

Рост колькасці калектыўных гаспадарак адбываўся ў тым ліку за кошт памяншэння выпадкаў іх распаду і ліквідацыі [70, с. 3]. 26 сакавіка 1928 г. СНК Беларускай ССР пастанавіў спыніць практыку выдзялення зямлі на адрубы і хутары «там, дзе яна садзейнічае росту кулацкіх элементаў». Эканамічнай нарадзе было даручана ўзмацніць агранамічнае абслугоўванне калгасаў з боку сельгаскааперацыі і зямельных органаў [73, л. 28, 29]. На прадухіленне распаду калектыўных гаспадарак была накіравана Пастанова Прэзідыума ЦВК БССР ад 28 лютага 1928 г., у якой акруговым і раённым выканаўчым камітэтам прадпісвалася ні ў якім разе не дапускаць індывідуальнага падзелу дзяржаўных зямельных фондаў і захоўваць іх у мэтах калектыўнага землябробства [74, с. 5]. На стымуляванне калгаснага будаўніцтва былі накіраваны і змены ў падатковай палітыцы дзяржавы. 29 красавіка 1928 г. было прынята новае Палажэнне аб сельгаспадатку, у адпаведнасці з якім да падаткаабкладання цалкам прыцягваліся дробная жывёла і даходы ад саматужна-рамесных і іншых неземляробчых заробкаў. Каровы абкладаліся падаткам пасля першага цялення замест існуючага ў 1927/28 гаспадарчым годзе абкладання кароў, старэйшых за 3 гады [74, с. 5]. Ва ўмовах Беларусі гэта аказалася пераважна па бюджэце малапасеўнай часткі сярэдняга сялянства.

У выніку рэалізацыі такой палітыкі трэба было б чакаць павелічэння долі серадняцкіх гаспадарак у калгасах з мая 1928 г. і некаторага зніжэння яе з 1 кастрычніка гэтага ж года. Дадзенае меркаванне пацвярджаюць звесткі, прыведзеная ў справаздачы Белсельсаюза за 1927/28 гаспадарчы год [70, с. 3]. У чэрвені 1929 г. у калектыўных гаспадарках БССР сярэдняе сялянства складала 30,9 % [75, с. 37]. Паводле ж даных В. А. Нядзелькі, у 1927 г. сераднякі сярод усяго сялянскага насельніцтва Савецкай Беларусі складалі 64,7 %. Такім чынам, на працягу 1927—1929 гг. працэнт серадняцкіх гаспадарак у калгасах быў нашмат ніжэйшы, чым у агульнай колькасці сялянства рэспублікі [76, с. 152]. Пераважная большасць калгасаў была створана менавіта ў выніку аб'яднання дробных гаспадарак. На працягу 1927/28 гаспадарчага года колькасць калгасаў у БССР павялічылася больш чым удвая, сялянскіх сем'яў, якія ўваходзілі ў іх, — на 78 %, а зямельная плошча, якая апрацоўвалася калектыўна, — на 58 % [77, с. 345, 86; 78, с. 10].

Той факт, што з 1 кастрычніка 1928 г. не адбылося больш істотнага зніжэння ўдзельнай вагі сярэдняга сялянства ў складзе членаў калгасаў, на наш погляд, тлумачыцца перш за ўсё дзвюма прычынамі. Па-першае, у 1928/29 фінансавым годзе пераважная ўвага была нададзена вызваленню ад сельгаспадатку маламоцных гаспадарак. Падобная практыка падвяргалася крытыцы ўжо ў лютым 1929 г. на аб'яднаным Пленуме ЦК і ЦКК ВКП(б). У яго рэзалюцыі адзначалася, што «такое павелічэнне падатку пры вызваленні ад яго 35 % гаспадарак і раскладзе ўсяго цяжару падатку на астатнія 65 % гаспадарак празмерна закранае інтарэсы некаторых слаёў сераднякоў» [72, с. 439, 440]. Між тым адмовы ад дадзенага падыходу да вырашэння праблемы падаткаабкладання ў далейшым не адбылося.

Адзіным выйсцем для часткі сялянства стала арганізацыя ў калектыўныя гаспадаркі, падатковыя льготы для якіх былі значна павялічаны. Згодна з узгаданым вышэй Палажэннем з 1 кастрычніка 1928 г. ад сельгаспадатку цалкам вызваляліся калгасы з прыбыткам да 30 руб. на едака (раней з прыбыткам да 20 руб. на едака). Для калектыўных гаспадарак, якія падлягалі сельгаспадатку, зніжэнні значна павялічваліся: для таварыстваў — 20 % замест 10 %, камун — 60 %, арцеляў — 40 % замест 25 %. Для камун і арцеляў з прыбыткам вышэй сярэдняга на едака па раёне падатак вылічаўся па сярэднім даходзе са зніжэннем: для камун — 30 % і для арцеляў — 25 % (замест ранейшай у 25 % — аднолькавай для камун і арцеляў) [79, с. VI].

Акрамя імкнення пазбегнуць непасільнага падаткаабкладання, у якасці найбольш істотнага фактару, што садзейнічаў калектывізацыі, выступала жаданне сялян пазбавіцца ад цераспалосіцы. Колькасць уступіўшых у калгасы за 1927/28 гаспадарчы год у шэрагу акруг прама прапарцыянальная адсотку сялянскіх гаспадарак, якія мелі да аб'яднання цераспалоснае землекарыстанне. Выключэннем была Віцебская акруга: тут больш істотным матывам з'явілася імкненне да арганізацыі ў калгасы маладых сялянскіх гаспадарак, якія не мелі дастатковай колькасці інвентара. У некаторай ступені гэты ж фактар паўплываў на развіццё калгасаў у Аршанскай акрузе [80, с. 88].

Жаданне сялянства пазбавіцца ад цераспалосіцы шляхам арганізацыі калектыўных гаспадарак становіцца больш зразумелым, калі звярнуць увагу на павольныя тэмпы правядзення землеўпарадкавання ў БССР. Да восені 1929 г. у рэспубліцы было землеўпарадкавана 3540 тыс. га, што склала толькі 42,6 % ад усёй плошчы зямель сялянскага землекарыстання [81, с. 248]. Пры гэтым землеўпарадкаванне на хутары ў 1928 — першай палове 1929 г. не мела вызначальнага ўплыву на развіццё калгаснага руху ў Беларусі. Частка хутарскіх гаспадарак, па меры неабходнасці, аб'ядноўвалася ў калектыўныя гаспадаркі. Так, у Віцебскай акрузе, дзе працэнт хутароў быў найвышэйшым, значную долю аб'яднаных у калектывы складалі хутарскія гаспадаркі, якія ўзніклі пераважна пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У 1928 г. у БССР прадугледжваліся даволі рэальныя тэмпы росту колькасці калектыўных аб'яднанняў. Згодна з Пастановай СНК Беларусі планавалася ахапіць калгасамі да канца першай пяцігодкі не менш за 6 % сялянскіх гаспадарак. Пераважная ўвага звярталася на арганізацыю буйных (для таго часу) калгасаў (ад 120 да 450 га) [82, л. 54]. Такое павелічэнне, нягледзячы на тое што грунтавалася на дырэктыўных указаннях, забяспечвалася матэрыяльнай базай. Значна больш небяспечным было стыхійнае захапленне стварэннем калектыўных гаспадарак на месцах, імкненне хутчэй адрапартаваць аб выкананні і перавыкананні. У 1929 г., падводзячы вынікі вясновай пасяўной кампаніі ў БССР, камісія РСІ паказвала, што развіццё калгаснага будаўніцтва ў гэты перыяд ішло стыхійна, без дастатковага кіраўніцтва з боку зямельных і кааператыўных органаў, якія не былі падрыхтаваныя да такога павелічэння колькасці калектыўных аб'яднанняў і не мелі нават неабходнай колькасці статутаў [83, л. 271]. Характэрнай з'явай

для 1920-х гг. сталі так званыя «лжэкалектывы», якія ўзнікалі найчасцей для таго, каб атрымаць зямлю з дзяржаўнага фонду. Неабходна падкрэсліць, што па меры вычарпання фонду дзяржаўных зямельных маёмасцей база для іх стварэння ў значнай ступені паменшылася. Паводле справаздачы Белсельсаюза за 1927/28 г. выпадкаў арганізацыі ў рэспубліцы аб'яднанняў выключна на надзельных землях не назіралася [70, с. 13].

На IX (юбілейнай) сесіі ЦВК БССР 8-га склікання падкрэслівалася, што «генеральнай лініяй на другое дзесяцігоддзе» з'яўляецца «ўстаноўка на калектывізацыю» [84, с. 30]. У сваім дакладзе наркам земляробства БССР Д. Ф. Прышчэпаў адзначаў у якасці асноўнай задачы «далейшае паглыбленне аграрнай рэвалюцыі непасрэдна ў самой сельскагаспадарчай вытворчасці» і замену «рэшткаў буржуазнай сельскай гаспадаркі новым, калектыўным сацыялістычным земляробствам» [84, с. 258]. XII з'езд КП(б)Б, які адбыўся 5—16 лютага 1929 г., пазначыўшы неабходнасць узбуйнення калгасаў, паставіў задачу давесці памеры іх пасяўных плошчаў да канца пяцігодкі да 12 % ад усёй пасяўной плошчы рэспублікі [85, с. 105]. Ужо на гэты час паскарэнне калгаснага будаўніцтва адбывалася ў даволі складаных умовах. Харчовыя цяжкасці вясной 1929 г. мелі многія раёны Беларусі, найперш Полацкая, Мазырская і Віцебская акругі. У прыватнасці, у в. Рудня Пальмінскага сельскага Савета Гарадокскага раёна Віцебскай акругі галадала больш за 70 % беднякоў. Меліся выпадкі дзіцячай смяротнасці з прычыны недастатковага харчавання [21, с. 879, 880].

«Трактары, уборачныя машыны павінны быць найбольш шырока распаўсюджаны ў калгасах, — пазначаў А. В. Чаянаў. — ...Яны будуць выгадныя нават у тым выпадку, калі іх бухгалтарская рэнтабельнасць будзе нікчэмная ці нават адмоўная» [86, с. 348]. Забеспячэнне калектыўных гаспадарак складанай сельскагаспадарчай тэхнікай павялічвалася дастаткова павольна. У 1926/27 г. у сярэднім на 2 калгасы мелася 1 сенакасілка, 1 сеялка, 1 конныя граблі, 1—2 культыватары і г. д. На кожныя 100 калгасаў прыходзілася 6 трактароў [87, с. 24]. З 1927/28 г., каб некалькі палепшыць стан з забеспячэннем калектыўных гаспадарак складанай сельскагаспадарчай тэхнікай, быў рэзка абмежаваны продаж прыватным асобам (апошнія змаглі набыць у гэтым годзе толькі 6 % складаных машын). Калгасам, за некаторым выключэннем, уся тэхніка прадавалася ў крэдыт [88, л. 65]. У 1927/28 гаспадарчым годзе забяспечанасць калгасаў трактарнай тэхнікай паменшылася. Між тым яшчэ на XIV канферэнцыі РКП(б) А. І. Рыкаў падкрэсліваў: «Калектыўная арганізацыя некалькіх сялянскіх гаспадарак, якія апрацоўваюць зямлю драўлянай сахой, — гэта зусім не сацыялістычнае будаўніцтва» [89, с. 89]. У 1927 г. на 1 трактар, які быў у калектыўнай гаспадарцы БССР, прыходзілася 800 га; у 1928 г. — 900; у 1929 г. — ужо 2000 га [90, л. 151]. Такія абставіны павінны былі стымуляваць лінію на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы калгасаў, а не на фарсіраванне іх колькаснага росту.

Асобныя вытворчыя кааператывы Беларусі, найперш камуны , акрэслілі шэраг пераваг у племяннoй жывёлагадоўлі, але далёка не ўсе з іх з'яўляліся прыкладам паспяховага развіцця мяса-малочнай гаспадаркі. Да прыкладу, у Лельчыцкім

раёне, які на 1 гаспадарку меў у 1931 г. да 40 % удзельнай вагі лугоў і выпасаў (па БССР — 14), буйной рагатай жывёлы на гаспадарку 5,8 галоў (па БССР — 2,3), малако на продаж не вывозілася з прычыны яго колькасці і якасці, а таксама адсутнасці належных дарог. План мясанарыхтовак за 1930 г. быў выкананы толькі на 55 % [91, л. 196].

Нават бяднейшае сялянства Лельчыцкага раёна разважала: «Калектывізацыя — справа добрая, але ж не ў нашым раёне. Вось у другіх раёнах, дзе зямля лепшая і больш, пусьціць туды трактары і машыны, тады калгас атрымае больш, як індывідуальнік. У нашым раёне зямлі мала і дрэнная, і трактары не пусьціш, бо завязне ў пяньках і балоце і калгас нічога не даб'ецца» [92, л. 198].

Названыя факты садзейнічалі фарміраванню негатыўнага стаўлення аднаасобнага сялянства (перш за ўсё сярэдняга) да калектыўнага гаспадарання. Так, у калгасах Гомельскай акругі, якія ўтварыліся на працягу 1927/28 гаспадарчага года, серадпякі складалі толькі 15 % [93, с. 29]. У калектыўных гаспадарках Віцебскай акругі да 1 кастрычніка 1929 г. удзельная вага сярэдняга сялянства толькі крыху перавышала 25 % [94, л. 22]. Ва Украіне ўжо ў кастрычніку 1928 г. сярод членаў калгасаў беднякі складалі 48,5 %, серадпякі — 49,5 % і заможныя — 2 % [95, с. 251].

1929/30 гаспадарчы год стаў пераломным. Было зменена кіраўніцтва Наркамата земляробства БССР на чале з Д. Ф. Прышчэпавым. З сярэдзіны 1929 г. даюцца ўстаноўкі на ператварэнне цэлых сельсаветаў у раёны суцэльнай калектывізацыі. Гігантаманія адбілася і на памерах калектыўных гаспадарак. Ствараліся велізарныя (да 4 тыс. га) калгасы, кіраванне якімі арганізаваць было немагчыма, таксама як і весці інтэнсіўную гаспадарку. Часта такія аб'яднанні не мелі трактароў, малацілак і іншай сельскагаспадарчай тэхнікі [96, с. 159]. Адсутнасць жадання сярэдняга сялянства Беларусі да аб'яднання ў калектыўныя гаспадаркі спрабавалі кампенсаваць адміністрацыйнымі мерамі. Ігнараваліся рашэнні, прынятыя папярэднімі партыйнымі з'ездамі. У прыватнасці, Пленум ЦК КП(б)Б, які адбыўся ў верасні 1929 г., пазначыў больш высокія паказчыкі колькаснага росту калгасаў у рэспубліцы, чым гэта прадугледжвалася дзяржаўным планам, адобраным XII з'ездам Кампартыі Беларусі. Ён не толькі не асудзіў штучнае фарсіраванне колькасці калектыўных гаспадарак і імкненне да стварэння раёнаў суцэльнай калектывізацыі, якое выявілася ў шэрагу акруг БССР, але і замацаваў гэта ў якасці новага партыйнага рашэння [85, с. 159, 161]. У снежні 1929 г. ставілася задача да восені 1933 г. дасягнуць 80 % калектывізацыі ў Беларусі (БССР) [97, с. 65]. У лютым 1930 г. Бюро ЦК Кампартыі Беларусі вырашыла калектывізаваць да веснавой сяўбы гэтага ж года 76—80 % сялянскіх гаспадарак. У гэты час ЦК КП(б)Б накіраваў у ЦК ВКП(б) дакладную запіску з прапановай прызнаць БССР рэспублікай суцэльнай калектывізацыі [98, с. 277].

Новы этап націску на сялянства супаў з прызначэннем у студзені 1930 г. першым сакратаром Кампартыі (бальшавікоў) Беларусі К. В. Гея. Родам з Латвіі, ён зрабіў сабе кар'еру ў Пскоўскай партарганізацыі і ў сярэдзіне 1920-х гг. належаў да бліжэйшага атачэння І. В. Сталіна. Прыезд яго ў Беларусь у студзені 1930 г. перадвызначаў карэнныя змены ў партыйнай палітыцы, якая і да гэтага часу імкну-

лася быць наперадзе пажаданняў цэнтральнага партыйнага кіраўніцтва. Канстанцін Гей з самага пачатку сваёй дзейнасці (студзень 1930 г.) акрэсліў калектывізацыю як стварэнне вытворчых кааператываў у істотных аб'ёмах, не прымаючы пад увагу асаблівасці Беларусі. 15 студзеня 1930 г. адбылося пасяджэнне бюро ЦК КП(б)Б. Акрамя іншых праблем (падрыхтоўка кадраў, барацьба са знішчэннем жывёлы і інш.) былі разгледжаны пытанні аб высяленні кулакоў з раёнаў калектывізацыі. Адмяняючы папярэдняе рашэнне Бюро ЦК, забаранялася прымаць кулакоў у члены ўсіх відаў кааперацыі. Прапаноўвалася «вычысціць усіх прынятых кулакоў з усіх відаў кааперацыі, а паі, унесеныя імі, канфіскаваць» [99, л. 395]. Дадзенае рашэнне само па сабе было б паўсядзённай з'явай, калі б не факт таго, што толькі 23 студзеня 1930 г. быў прыняты праект пастановы Палітбюро ЦК ВКП(б) аб ліквідацыі кулацтва як класа, падрыхтаваны падкамісіяй І. Д. Кабакова. Мэтай ставілася знішчэнне кулацтва. Дазвалялася прымяненне рэпрэсій у пазасудовым парадку да шэрагу «кулацкіх» арганізацый і кіраўнікоў. У раёнах суцэльнай калектывізацыі і памежнай паласе рэкамендавалася высылка з канфіскацыяй маёмасці. Усе мерапрыемствы меркавалася завяршыць да 1 красавіка таго ж года. Ужо ў гэтым праекце можна, на наш погляд, заўважыць яшчэ адну мэту праводзімых рэпрэсій: уся канфіскаваная маёмасць перадавалася на льготна-крэдытных умовах у недзялімыя фонды адпаведных калгасаў [97, с. 118].

1 лютага 1930 г. былі прыняты Пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Савета Народных Камісараў СССР, згодна з якімі ў раёнах суцэльнай калектывізацыі адмянялася дзеянне закона аб дазволе арэнды зямлі і аб прымяненні наёмнай працы ў адзінаасобных гаспадарках. Канфіскаваная маёмасць кулацкіх гаспадарак павінна была перадавацца ў непадзельныя фонды калгасаў. Кулацкім гаспадаркам забаранялася без дазволу раённага выканаўчага камітэта перасяленне і распродаж імі сваёй маёмасці [100, л. 27, 28]. Да канца мая 1930 г. у Беларускай ССР было раскулачана 15 629 гаспадарак, а іх маёмасць перададзена ў непадзельныя фонды калгасаў.

Бюро ЦК КП(б)Б на сваім пасяджэнні 31 сакавіка 1930 г. пазначыла: «Кулацкая зямля і маёмасьць, а таксама дзяржаўная маёмасьць і зямельныя фонды, якія перададзены калгасам, у выпадках выхаду часткі калгасьнікаў з калгасаў застаюцца ў калгасе. Калгасы прымаюць усе меры да гаспадарчага скарыстаньня гэтае маёмасьці і абавязковага засеву ўсёй зямлі калгасаў. Пры распадзе калгасу кулацкая маёмасьць і зямля, дзяржаўная маёмасьць і зямельныя фонды, што перададзены калгасам — перадаюцца бліжэйшым калгасам ці саўгасам». На гэтым пасяджэнні было асуджана выступленне А. Р. Чарвякова на сходзе рабочых фабрыкі «Кастрычнік», дзе ён гаворачы аб добраахвотнасці ўступлення ў калгасы, параўнаў яе са службай у Чырвонай арміі [99, л. 289, 290].

М. А. Іўніцкі пазначаў, што «...праводзячы раскулачванне заможнай часткі вёскі, савецкае кіраўніцтва галоўным чынам праследавала мэту — стымуляваць суцэльную калектывізацыю. Але акрамя галоўнай мэты савецкае кіраўніцтва мела і іншыя: па-першае, гаспадарчае засваенне аддаленых маланаселеных ці неабжытых раёнаў краіны; па-другое, атрыманне таннай, калі не дармовай працоў-

най сілы для лесараспрацовак, гарнаруднай прамысловасці, сельскагаспадарчага засваення цалінных зямель, раскарчоўкі тайгі. Ставілася і яшчэ адна мэта — працоўнае перавыхаванне былых кулакоў у працэсе грамадска карыснай працы» [101, с. 208]. В. П. Данілаў меркаваў, што «раскулачванне» было выклікана ў большай ступені эканамічнымі прычынамі. У прыватнасці, ён пісаў: «...задачай "раскулачвання" было фарміраванне арміі прымусовай працы, г. зн. арміі таннай рабочай сілы, неабходнай для прамысловых пабудоў, лесанарыхтоўчых работ, засваення неабжытых раёнаў і г. д.» [102, с. 169—175]. На карысць гэтых аргументаў сведчыць той факт, што тэмпы калектывізацыі на пачатку 1930 г. істотна павышаюцца. Па стане на 1 лютага 1930 г. працэнт калектывізацыі ў Беларусі ўзняўся да 38,2 % [97, с. 13]. Менавіта ў памежных і збожжавых раёнах СССР (у прыватнасці ў БССР) у г эты час адбывалася найбольшая колькасць арыштаў.

Здавалася б, зусім неспадзявана 10 сакавіка 1930 г. з'явілася Пастанова ЦК ВКП(б) «Аб барацьбе са скажэннямі партыйнай лініі ў калгасным руху», былі апублікаваны сталінскія артыкулы «Адказы таварышам калгаснікам», «Галавакружэнне ад поспехаў» [97, с. 303—305; 103, л. 333]. 2 красавіка 1930 г. партыйным арганізацыям быў накіраваны закрыты ліст ЦК ВКП(б) «Аб задачах калгаснага руху ў сувязі з барацьбой са скажэннямі партыйнай лініі». У лісце адзначалася, што «...практыка грубага адміністравання ў справе калектывізацыі, якая суправаджаецца перанясеннем на серадднякоў метадаў барацьбы з кулаком, падрывае давер шырокіх мас сялянства да палітыкі партыі і Савецкай улады» [97, с. 365—370]. Прычынамі сталі факты ўзброенага супраціву ва Украіне, Паўночным Каўказе і Казахстане. Аб сітуацыі ў Савецкай Беларусі ў дадзеным дакуменце звестак не прыводзілася. Патрэбна пазначыць, што некаторыя акруговыя партыйныя арганізацыі Беларусі пры выкананні дырэктыў настойвалі на неабходнасці ўважліва адносіцца да кожнага выпадку раскулачвання, пазбягаць сітуацыі, калі ў кулакі запісвалі тых, хто не жадаў ісці ў калгасы.

Згодна са звесткамі Пасеўбюро Наркамзема СССР аб ходзе калектывізацыі ў СССР на 1 жніўня 1930 г. на працягу з 20 студзеня па 1 жніўня ў 2 разы зменшылася не толькі колькасць калектываў, але больш чым у 5 разоў — колькасць сялянскіх гаспадарак у іх складзе. Працэнт калектывізацыі знізіўся з 27,2 да 10,0 [97, с. 574]. Дакладная запіска ў ЦК ВКП(б) ад 25 сакавіка 1930 г. сведчыць аб тым, што Белкалгасцэнтр не валодаў дакладнымі лічбамі і ў яго звестках маецца шэраг супярэчнасцей [104, л. 92—95]. Па Аршанскім раёне працэнт калектывізацыі зменшыўся за два тыдні больш чым напалову (з 85 % да 40 %). Такая сітуацыя складвалася шмат па якіх рэгіёнах Беларусі, дзе мясцовае кіраўніцтва паспешліва ажыццяўляла справу калектывізацыі. Тры чвэрці сялян выйшлі з калектываў нават без падачы заявы. Многія з іх меркавалі, што ўдзел у калгаснай працы не дазволіць ім адыходзіць на сезонную працу ці займацца нейкімі промысламі [105, л. 4]. У далейшым, нягледзячы на рознага кшталту заклікі і абяцанні, так і адбылося.

І ўсё ж дзякуючы такому імкліваму націску калектывізацыя ў БССР пакрысе і менавіта ў вышэйшых формах рухалася наперад. На 1 кастрычніка 1929 г. было калектывізавана ворыва 94 458 га (3,9 % агульнай плошчы), а на 15 мая 1930 г.

мелася калектывізаванага ворава 673 655 га, ці 15 % усёй плошчы і 11 % гаспадарак. Істотна вырасла колькасць серадняковў у калектывах, у тым ліку сярод кіраўніцтва. Аднак эканамічныя стымулы не працавалі. Да прыкладу, камплектаванне свінаводчых калгасаў праходзіла надзвычай дрэнна таму, што паміж нарыхтоўчымі цэнамі і цэнамі вольнага рынку меўся вялікі разрыў. Пры цане за парася 14—15 руб. на вольным рынку яно каштавала 60—80 руб. Нярэдкімі былі выпадкі, калі нават закантрактаваўшыя гаспадаркі адмаўляліся здаваць жывёлу [106, л. 134]. Для заахвочвання рэалізоўвалася дырэктыва аб адлічэнні 5 % з валавога ўраджаю і прыбыткаў ад абагульненых калгаснікамі кароў для размеркавання паміж імі адпаведна кошту абагульненай маёмасці. Аднак у многіх раёнах не толькі калгаснікі, але нават адказныя работнікі нічога аб такім дакуменце не ведалі [106, л. 139]. У маі 1930 г. ЦК КП(б)Б адзначаў парушэнне «добраахвотнасці калектывізацыі шляхам дэкрэтавання калгаснага руху, фарсіравання заданняў і націску зверху, што месцамі даходзіла да голага адміністравання», падмену рэальнай працы «гульнёй у калектывізацыю» [107, с. 86].

Сярод пасіўных форм пратэсту сялянства значную частку складалі лісты ў розныя інстанцыі. Істотная частка іх заставалася ў архівах рэдакцый. Але з прычыны тых ці іншых кампаній па ліквідацыі «перагібаў» шэраг лістоў дасягаў старонак рэспубліканскіх ці саюзных выданняў. У сакавіку — красавіку 1930 г. у «Крестьянской газете» з'явіліся публікацыі аб «шкодніцтве» ў калгаснай справе. Карэспандэнты з розных раёнаў БССР пісалі, што калектывізацыя ажыццяўлялася гвалтам, без знаёмства са статутам аб'яднаннямі. Часам выкарыстоўвалася сістэма двух спісаў: у адзін запісвалі тых, хто за калгас і савецкую ўладу, у другі — тых, хто супраць калгаса і савецкай улады. У выніку з калгасаў выйшлі тры чвэрці калгаснікаў [108, л. 13, 14].

Віна за недахопы ўскладалася цалкам на мясцовае савецкае і партыйнае кіраўніцтва. Яно павінна было адказваць за высокія паказчыкі калектывізацыі і тыя «перагібы», што з імі спалучаліся, таксама як і за рэзкае скарачэнне калгасаў. Згодна з цыркулярам ад імя новага першага сакратара ЦК КП(б)Б К. Гея (які ў далейшым быў прызначаны сакратаром Маскоўскага абкама бальшавіцкай партыі), накіраваным у сакрэтным парадку ўсім райкамам на кастрычнік — снежань 1930 г., планавыя лічбы па калектывізацыі вызначаліся ў 20 %. У дакуменце К. Гей спасылаўся на рашэнне Бюро ЦК КП(б)Б ад 26 верасня 1930 г. і неабходнасць «рашучай барацьбы за захоўванне ленінскіх прынцыпаў у справе калектывізацыі (добраахвотнасць, змаганне з адміністраваннем і г. д.)» [109, л. 107]. Згодна са зводкай аб ходзе калектывізацыі (гл. дадатак, табл. 3) ад 14 лютага 1931 г. працэнт калектывізацыі ўзрастаў з 11,6 % у верасні 1930 г. да 14,3 % у снежні (не дасягнуўшы лічбаў, якія пазначыў К. Гей). На працягу зімы 1930/31 г. колькасць калектывізаваных гаспадарак павялічылася неістотна (да 16,7 % у лютым 1931 г.).

Рэзалюцыя Пленума ЦК КП(б)Б па дакладзе М. Галадзеда аб ходзе калектывізацыі і падрыхтоўцы да вясновай пасяўной кампаніі (27—30 сакавіка 1931 г.) тактычна вызначала словазлучэнне «максімальна магчымыя», каб пазбегнуць абвінавачванняў з цэнтра ў адсутнасці настойлівасці, а таксама і «перагібаў». Больш

таго, «перагібы» на месцах ацэньваліся як «злачынства», цэнтральнае партыйнае кіраўніцтва настойвала на дасягненні «сапраўднай добраахвотнасці». Цікавым і спецыфічным для Беларусі элементам з'яўлялася канстатацыя таго факту, што нявызначанасць тэрміна «кулак» дала падставу для рэзкіх абмежавальных дзеянняў у дачыненні да саматужнікаў з вучнямі і дробнааптовых гандляроў. У выніку істотна знізілася забеспячэнне вёскі ўсім неабходным, што стала дадатковым фактарам незадаволенасці сялянства [110, л. 141, 142].

Важнейшым сродкам стабілізацыі становішча кіраўніцтва ЦК КП(б)Б вызначала хутчэйшую працу па ўкараненні новага статута сельскагаспадарчай арцелі. Не разумеючы ўнутраных механізмаў, якія перадвызначалі абагульненне не толькі рабочай, але і мяса-малочнай жывёлы, меркавалася выправіць тэндэнцыю адміністрацыйным шляхам. Прымаючы пад увагу фактар сацыяльнай псіхалогіі, Пленум Кампартыі Беларусі ў сакавіку 1931 г. рэкамендаваў шырэй прыцягваць сераднякоў да кіруючай работы ў калгасах [111, л. 141—146].

У верасні 1931 г. ЦК КП(б)Б «да Дню ўроджаю і Колектывізацыі» рапартаваў, што «пастаўленая партыяй задача колектывізаваць да 1 студзеня 1931 г. 45 % бедняцка-серядняцкіх гаспадарак перавыканана. Па БССР калектывізавана 47 % сялянскіх гаспадарак, шэраг раёнаў ужо перайшоў да суцэльнай колектывізацыі і канчатковай ліквідацыі кулацтва як класа» [112, л. 73—75]. На 1 кастрычніка 1931 г. працэнт калектывізацыі па БССР склаў ужо 48,5 % (УССР — 67,1 %; Казахстан — 63,0 %), на 10 лютага 1932 г. павялічыўся да 49,4 % [113, с. 282]. Па звестках жа АДПУ, лічбы крыху адрозніваліся: на 1 кастрычніка 1931 г. — 49,3 %, на 1 студзеня 1932 г. — 50,4 % [114, с. 320].

Распад калгасаў доўжыўся і ў 1932 г. За чэрвень 1932 г. толькі па 9 раёнах цалкам распалася 56 калгасаў. Бюро ЦК КП(б)Б 26 мая 1932 г. прапанавала Белкалгасцэнтру зняць з балансу 1700 гаспадарак. ЦК, у які ўжо раз перакладаючы з сябе віну, абвінавачваў райкамы і іншыя арганізацыі ў тым, што яны сістэматычна падманвалі ЦК і іншыя рэспубліканскія органы, хаваючы рэальнае становішча спраў (утойванне фактаў адсеву з калгасаў на мяжы 1931—1932 гг.). За нізкія тэмпы падрыхтоўкі да севу А. Р. Чарвяковым былі накладзены спагнанні на некаторых мясцовых партыйных і савецкіх кіраўнікоў [114, с. 422; 116, л. 72].

Падобнага кшталту сітуацыя склалася ў Гарадоцкім РВК. 25 студзеня ім 1932 г. быў прадстаўлены ў НКЗ даклад, дзе засведчаны 82 % калектывізацыі, а 10 лютага ў сваёй пастанове і рапарце гарсавету РВК паведаміў аб 100 %. Між тым гэтыя лічбы не адпавядалі рэчаіснасці. Для прымусу да ўступлення ў калгас выкарыстоўваліся ўсе магчымыя спосабы: пагрозы, вобыскі і інш. Зразумела, што пасля выяўлення падобных парушэнняў калгасы распадаліся [115, л. 85, 86; л. 1479—1481]. У Чашніцкім раёне ўзровень калектывізацыі зменшыўся на 31,3 %. Прычынамі станавілася безгаспадарчасць, злоўжыванні ўладай, п'янства. Адбываўся значны падзеж жывёлы ў выніку адсутнасці належнага нагляду [113, с. 422]. У Парычскім раёне Бабруйскай акругі масава арыштоўвалі тых, хто не захацеў ісці ў калгас. Так званыя «рабочыя брыгады» ў Рагачоўскім раёне арыштавалі 18 беднякоў, у тым ліку 4 цяжарных жанчын [97, с. 301].

Пазначаліся таксама іншыя прычыны распаду калгасаў: харчовыя цяжкасці і недахопы размеркавання ўраджаю, а ў I квартале 1932 г. — уплыў хадакоў з Украіны за прадуктамі харчавання; наяўнасць гаспадарчых цяжкасцей у суседніх, раней заснаваных калгасах, што стварала няўпэўненасць у часткі калгаснікаў у перавазе калгаснай сістэмы сельскай гаспадаркі перад адзінаасобным, нават прымусовае ўручэнне калгаснікам рублёвых латарэйных білетаў. Распад калектываў нярэдка адбываўся шляхам стыхійных выступленняў; ініцыятарамі часцей з'яўляліся жанчыны, якія збіраліся і разам разбіралі калгасную маёмасць [116].

У гэты ж перыяд выявілася перавага над стратэгічнай мэтай савецкай мадэрнізацыі (стварэнне буйных машынізаваных гаспадарак) задачы тактычнай (забеспячэнне хлебам горада, які павінен быў у сціслыя тэрміны стварыць базу і такую тэхніку). У БССР хлебанарыхтоўкі разгортваліся хуткімі тэмпамі, пры гэтым рэспубліку па-ранейшаму не адносілі да хлебавытворчых рэгіёнаў. У ліпені 1930 г. для рэспублікі было ўстаноўлена заданне ў 12 млн пудоў [97, с. 548], аднак ужо ў верасні 1930 г. (па меркаванні ўлад, з прычыны добрага ўраджаю) план быў павялічаны на 1 млн пудоў. Гэта павелічэнне было не вельмі істотным у параўнанні з Украінай, план для якой быў павялічаны з 440 да 490 млн пудоў [97, с. 633]. Выкананне плана адбывалася нездавальняюча. Згодна са звесткамі ДПУ за I квартал нарыхтоўчага сезона 1930 г. БССР істотна адставала па тэмпах хлебанарыхтовак (16,4 %) [97, с. 668]. 30—31 кастрычніка 1931 г. на Пленуме ЦК ВКП(б) быў зацверджаны канчатковы гадавы план нарыхтовак усіх збожжавых культур па Беларусі ў памеры 10,5 млн пудоў [113, с. 206]. Усходнія раёны СССР у 1931 г. пацярпелі ад засухі, шэраг раёнаў самастойна не змаглі забяспечыць сябе збожжам [113, с. 261]. Насенны фонд на 1932 г. у БССР вызначаўся ў памеры 1200 тыс. пудоў. Меркавалася канчатковым тэрмінам засыпкі насення пазначыць 1 красавіка. Калгасы таксама выплачвалі натураплату МТС, якая звычайна павялічвалася, калі віды на ўраджай складваліся больш спрыяльныя [113, с. 786]. На пачатку 1930-х гг. у СССР атрымоўвалі пераважную частку збожжа па нарыхтоўках менавіта ад калгасаў: у 1931/32 г. — 14,7 млн т (супраць 6,66 т ад індывідуальных гаспадарак), у 1932/33 г. — 12,24 (супраць 2,64 млн т) [113, с. 857]. Такім чынам, калгасная форма выяўлялася як пэўны механізм рэквізіцыі збожжа.

Кантрактацыя, якая першапачаткова з 1922 г. выяўлялася як форма рынкавага пагаднення паміж таваравытворцам і нарыхтоўшчыкамі, вызначала заказ на пэўную колькасць сельскагаспадарчай прадукцыі пры ўмове адпаведнай якасці і продажу яе на дамоўных умовах у вызначаныя тэрміны. Аднак ужо з першых гадоў, калі сфарміраваліся так званыя «нажніцы цэн» на сельскагаспадарчую і прамысловую прадукцыю, складваліся элементы адміністрацыйнага, прававога і іншага прымусу. Узрастаючы недавер сялянства, паглыблены хлебанарыхтоўчымі цяжкасцямі, выклікаў крызіс дадзенай формы нарыхтовак. Таму, калі ў 1928/29 гаспадарчым годзе кантрактацыя была ўведзена як асноўная форма закупак, яна не змагла стварыць спрыяльныя ўмовы для вырашэння задач забеспячэння краіны сельскагаспадарчай прадукцыяй, найперш хлебам. На завяршаючым этапе фарміравання адміністрацыйна-загаднай сістэмы на вёсцы кантрактацыя стала не-

патрэбнай і напярэдадні пасеву 1933 г. была заменена абавязковымі дзяржаўнымі нарыхтоўкамі. Кантрактацыйныя дамовы між тым захоўваліся па шэрагу дзяржаўных закупак, найперш тэхнічных культур [117, с. 217, 218].

Сістэма абавязковых дзяржаўных нарыхтовак прадугледжвала планава-кантрольную аснову вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Вызначаліся планы пасеву, якія даводзіліся да кожнай гаспадаркі. Абавязковыя пастаўкі ў хуткім часе распаўсюдзіліся і на звышпланавыя пасевы. Невыкананне дзяржаўных нарыхтовак пагражала калгасам штрафамі, а кіраўнікам гаспадарак — судовай адказнасцю. На лаву падсудных траплялі і адзінаасобнікі, якія не выканалі абавязкі па пастаўках. Пасля выканання дзяржаўнага плана ўсе лішкі хлеба павінны былі заставацца ў поўным распараджэнні калгасаў, дазваляўся свабодны гандаль хлебам [118, с. 444]. Дзяржаўныя пастаўкі не з'яўляліся адзінай формай павіннасцей сялян. Яны аплачвалі працу МТС, плацілі «гарнцавы збор» (плату за памол), займаліся рамонтам дарог і г. д. [119].

Калі індывідуальная сельская гаспадарка выявіла тэндэнцыю да павелічэння спажывання, то праз калгасную сістэму выпампоўвалася часам нават тая частка хлеба, што была неабходнай для селяніна. Тое, што калектыўныя гаспадаркі ствараліся пераважна для вырашэння практычнай задачы па хлебанарыхтоўках, пацвярджае наступны факт. У Лельчыцкім раёне да часу размеркавання хлебанарыхтовак 1929/30 гаспадарчага года было калектывізавана 4 % гаспадарак (пераважна бядняцкіх) і на гэтыя 4 % калгаснікаў ускладзена 23 % усіх хлебанарыхтовак [120, л. 198]. Згодна з даведкай сакрэтна-палітычнага аддзела АДПУ аб ходзе калектывізацыі і масавых выступленнях сялянства ў 1931 г. — студзені — сакавіку 1932 г. харчовыя цяжкасці мелі месца і ў Беларусі. У Дрысенскім памежным раёне не мелі хлеба 23 калгасы. 40 сем'яў галадавалі ў асобных калгасах Мінскага прыгараднага раёна, па некалькі сем'яў — у Петрыкаўскім і Чырвонаслабадскім раёнах [118, с. 320]. У 1932 г. партыйныя і дзяржаўныя структуры БССР неаднаразова заслухоўвалі пытанні харчовага становішча ў рэспубліцы і перыядычна прасілі дапамогі. Адно з такіх рашэнняў — рэзалюцыя Бюро ЦК КП(б)Б «Аб цяжкасцях з хлебам і канцэнтраванымі кармамі па БССР» ад 25 сакавіка 1932 г. У ёй утрымлівалася просьба да цэнтральных органаў у Маскве дадаткова выдзеліць рэспубліцы 10 тыс. т збожжа [98, с. 294]. Аднак гэта не спыніла хвалі голаду.

Разумеючы, што пераважную частку Чырвонай арміі складае сялянства, палітычнае ўпраўленне Беларускай вайсковай акругі надавала вялікую ўвагу растлумачальнай працы ў войсках. Адначасова аналізаваліся настроі, выяўленыя ў лістах і размовах чырвонаармейцаў. Заўважна, што сярод адукаванай часткі апошніх прысутнічала думка не толькі аб тым, што «кулак сваёй працай маёмасць набыў», але і тое, што менавіта заможнае сялянства з'яўляецца асноўным пастаўшчыком таварнага хлеба [121, л. 88, 89 аб.]. Улады імкнуліся, каб не пацярпелі сем'і, дзеці якіх служаць у Чырвонай арміі [113, с. 142]. Аднак скаргі да чырвонаармейцаў ад родных усё ж дасылаліся. «Ты пішаш, каб у нас была камуна, але ты не разумееш аб тым, што ты служыш, — адзначалася ў адным з пісьмаў. — Наша партыя няправільна падыходзіць да пытання калектывізацыі, гэта значыць перавярнуць

усю сельскую гаспадарку ў якіх-небудзь 2—3 гады, гэта значыць, што мы павінны пакутаваць гадоў 15—20. Калі скажаш што-небудзь супраць камуны, то цябе лічаць кулаком ці падкулаком» [122, л. 74].

Сапраўды, ужо з самага пачатку 1930-х гг. акрэсліваўся галоўны вораг калектывізацыі і галоўная прычына зрыву планаў па калектывізацыі — кулак. 6 студзеня 1930 г. на пасяджэнні ЦК КП(б)Б быў прыняты «закрыты ліст аб колектывізацыі» [123, л. 2]. Нявызначанасць такой групы давала магчымасць акрэсліць у якасці прыкмет «кулака» самыя розныя падыходы. У студзені 1930 г. камісіяй з удзелам наркама земляробства СССР Я. А. Якаўлева быў вызначаны падзел «кулацкіх» элементаў на 3 катэгорыі. Да першай адносіўся кулацкі актыў, які належала змясціць у канцлагеры, да другой — тыя, каго належала выселіць у аддаленыя мясцовасці Саюза ССР, трэцюю катэгорыю дазвалялася пакінуць на месцах жыхарства з адводам ім зямель па-за калгаснымі палямі. Аніякіх крытэрыяў падзелу на групы ў пазначаным праекце не прапаноўвалася [97, с. 123].

Раскулачванне (аб гэтым шмат інфармацыі ў нашай літаратуры) адбывалася ў жорсткіх формах. Не шкадавалі нават дзяцей. Так, у Хоцінскім сельсавеце Ульскага раёна член ВКП(б), які кіраваў раскулачваннем, вынес на вуліцу і кінуў у сані хворае шкарлятынай 4-гадовае дзіця, а іншы ўдзельнік раскулачвання ўзяў сабе стары паўшубак, якім былі прыкрытыя хворыя дзеці [97, с. 301]. Асобнай старонкай жорсткага супрацьстаяння мяжы 1920—30-х гг. з'явілася высылка кулакоў. Паводле пратакола АДПУ 31 студзеня 1930 г. меркавалася выслаць з БССР у Сібір 12 тыс. вяскоўцаў. Пасля завяршэння пакарання асуджаныя не маглі вяртацца па месцы жыхарства [97, с. 155]. Згодна з загадам АДПУ ад 2 лютага 1930 г., дзе БССР прысутнічала «ў першую чаргу», меркавалася выселіць 6—7 тыс. сем'яў (такім чынам, не меней 15—20 тыс. чалавек) [97, с. 165]. Рэспубліканскім органам 5 лютага 1930 г. прапаноўвалася прыстасоўваць усе свае дзеянні ў галіне высялення кулакоў да канкрэтных планаў АДПУ. Дакумент быў падпісаны І. Сталіным. Аб самастойнасці і Канстытуцыі БССР 1927 г. прыходзілася забыць. Дакладна быў вызначаны ўдзел войскаў Беларускай ваеннай акругі ў раскулачванні [97, с. 257]. У аперацыях па раскулачванні ўдзельнічалі войскі і АДПУ. У БССР у маі 1930 г. было перамешчана 259 атрадаў, працягласць іх камандзіровак пазначалася ад некалькіх дзён да месяца [97, с. 405]. На закрытым пасяджэнні сакратарыята ЦК КП(б)Б на пачатку красавіка 1930 г. было прынята рашэнне аб «забяспячэньні зброяй комуністых працуючых на вёсцы». Рэкамендавалася арганізаваць закупку адпаведнай колькасці рэвальвераў для «ад'язджаючых для працы ў вёску студэнтаў, скончыўшых у гэтым годзе Камвуз» [124, л. 105].

У выніку непадрыхтаванасці некаторых раёнаў (Сібір і Казахстан) для прыняцця высылаемых кулакоў колькасць вызначаных да высялення і тэрміны аперацыі на пачатку мая 1930 г. былі зменены. На Урал і Паўночны край меркавалася выселіць 8 тыс. сем'яў. З БССР дадаткова да пазначаных 8 тыс. «у мэтах ачышчэння памежных раёнаў ад кантрабандзісцкіх і бандзісцкіх элементаў высяляліся яшчэ 3579 адзіночак асобага прызначэння» [97, с. 301, 412, 413]. Для перамяшчэння перасяляемых кулацкіх сем'яў былі створаны ў пунктах выгрузкі прыёмныя пунк-

ты, на якія была ўскладзена ўся адказнасць за прыём эшалонаў. Па іх даных, было выселена ў Паўночны край з БССР 4763 сям'і (22 810 чал.) і ва Уральскую вобласць — 4468 сем'яў (21 273 чал.), на Далёкі Усход — 183 сям'і (1787 чал., уключаючы адзіночак «асобага прызначэння»). На пачатак мая 1930 г. 1792 адзіночкі «асобага прызначэння» з БССР знаходзіліся ў эшалонах [98, с. 420—425].

Перапоўненыя вагоны, недастатковае харчаванне, нязвыкла суровы клімат выклікалі шматлікія захворванні і смяротнасць, асабліва сярод дзяцей. Улады апасаліся, што вынікам можа стаць пагаршэнне эпідэміялагічнага стану ў Паўночным краі і на Урале. Было дазволена высланых кулацкіх дзяцей да 14-гадовага ўзросту (са згоды бацькоў) выдаваць родзічам для накіравання па месцы ранейшага жыхарства [97, с. 425]. У выніку многія беларускія дзеці так і не ўбачылі сваіх бацькоў. Часам уз'яднанню сем'яў садзейнічала няўзгодненасць рэпрэсіўных органаў. У дырэктыве АДПУ ад 4 ліпеня 1930 г. пазначалася, што «ва ўсіх эшалонах высяляемых кулакоў выяўлена значная колькасць непрацаздольных сем'яў, гаспадары якіх засталіся на месцах з прычыны арышту. Прапаноўвалася іх пад канвоем накіраваць на Далёкі Усход услед выселеным сем'ям» [97, с. 523].

Больш за 8 тыс. сем'яў — гэта толькі кулакі так званай «2-й катэгорыі». Што тычыцца кулакоў «3-й катэгорыі», то ў адносінах да іх прымаліся не такія радыкальныя дзеянні. Да прыкладу, Бюро Гомельскага акруговага камітэта КП(б) на пачатку красавіка 1930 г. «згодна з дырэктывамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б» рэкамендавала па пытанні аб рассяленні і высяленні кулакоў «адкласьці часова на час севу расьсяленьне кулакоў 3-й катэгорыі, адводзячы ім на бліжэйшы час зямлю ў гэтай жа вёсцы. У тых выпадках, дзе раскулачваньне кулацкіх гаспадарак 3-й катэгорыі праведзена з парушэньнем дырэктыў ЦК па гэтаму пытаньню, гаспадаркам павінны быць зьвернуты самыя неабходныя сродкі вытворчасьці (адзін конь, плуг, барана, цялега і інш. дробны інвентар), а таксама і насеньне» [125, л. 530]. Падобнага роду рашэнні былі прынятыя на той час і ў шэрагу іншых акруг БССР. Разам з тым за кошт зямель кулацкіх гаспадарак рэкамендавалася ўзбуйняць савецкія гаспадаркі [126, л. 263; 127, л. 661, 662].

Фармальна раскулачаныя мелі права на перагляд сваёй справы акруговымі камісіямі краю, куды яны былі высланыя. Працэнт такога перагляду быў невысокім. У прыватнасці, па Паўночным краі перагляд быў здзейснены толькі ў дачыненні да 8,3 % ад колькасці высланых [97, с. 436]. Аднак факт такога дзеяння пазначае імкненне ўлад пазбегнуць выпадковых сітуацый, якія ўзнікалі пры раскулачванні, і стварыць бачнасць аб'ектыўнасці пры разглядзе спраў. Пераважная частка перасяленцаў працавала на лесараспрацоўках [113, с. 440—445], а таксама рыбапромыслах, каменнавугальных шахтах і іншых цяжкіх работах. Пры гэтым належнага харчавання і медыцынскай дапамогі перасяленцы не атрымалі, што прыводзіла да выступленняў, уцёкаў, форм скрытага супраціву [97, с. 446, 447].

Па звестках АДПУ, на 13 чэрвеня 1930 г. кулакоў 2-й катэгорыі па БССР было раскулачана 13 492 гаспадаркі, у тым ліку з пазначанай колькасці выслана 9701 сям'я (72 %) [97, с. 486]. Па стане на 12 чэрвеня 1931 г. 1983 сям'і (8857 чал.) знаходзіліся ў эшалонах па напрамку ва Уральскую вобласць, акрамя таго, 1859 сем'яў

(8219 чал.) было вывезена, заставалася для высялення 1100 сем'яў (5000 чал.) [113, с. 143]. Статыстыка крыху адрозніваецца для выселеных: па адных даных на пачатак лістапада 1930 г. з БССР выселена 9231 сям'я (44 083 чал.). Згодна з іншымі звесткамі з памежнай зоны БССР дадаткова выселена 3309 чал. [97, с. 706].

Вызначыўшы, што калектывізацыя атрымала поспех на пераважнай частцы СССР, ЦК ВКП(б) і СНК СССР 8 мая 1933 г. прынялі сакрэтную дырэктыву — Інструкцыю «Аб супыненні масавых высяленняў сялян, упарадкаванні вытворчасці арыштаў і разгрузцы месцаў заключэння», у якой прадпісвалася неадкладна спыніць любыя масавыя высяленні сялян, праводзіць іх у выключным выпадку (для чаго былі ўстаноўлены максімальныя аб'ёмы: для Беларусі не болей за 500 гаспадарак) [113, с. 748]. Аднак ужо ў лютым 1933 г. АДПУ прапаноўвала выселіць дадаткова тых, хто сабатаваў хлебанарыхтоўкі, адмаўляўся атрымоўваць пашпарты, а таксама «нядобранадзейны» элемент з памежнай тэрыторыі. Зімой 1934 — вясной 1935 г. прымаецца рашэнне аб высяленні ў працоўныя пасёлкі «кулацкага і антысавецкага элемента» з памежнай тэрыторыі. З прыгранічных раёнаў БССР і УССР прапаноўвалася выселіць 2 тыс. сем'яў [129]. Згодна з данымі М. А. Іўніцкага на 1 снежня 1936 г. па СССР агульная колькасць спецперасяленцаў склала больш за 1 млн чалавек [101, с. 319].

Перыяд з лета 1933 г. часам акрэсліваецца як «неанэп» [129, с. 278]. Пры гэтым працэнт калектывізацыі ўзрастаў, хоць і не самымі хуткімі тэмпамі. Згодна з даведкай Дзяржплана СССР на 1 ліпеня 1933 г. па БССР ён склаў 50,3; на 1 ліпеня 1934 г. — 55,3, а на 1 ліпеня 1935 г. планавалася дасягнуць 64 % [129]. Калгаснікі атрымалі магчымасці (якія істотна былі пашыраны згодна з новым Статутам сельскагаспадарчай арцелі) для развіцця сваёй падсобнай гаспадаркі. Яна сапраўды магла стаць істотнай крыніцай папаўнення бюджэтаў калгаснікаў, а для дзяржавы — важнай крыніцай дадатковых паступленняў мяса, малака і гароднiны. Аднак ва ўмовах рэквізіцый збожжа і голаду на вёсцы адзначалася тэндэнцыя, калі падсобная гаспадарка заставалася крыніцай забеспячэння хлебам (па БССР — 16 кг на душу). Істотнай асаблівасцю 1933 г. стала тое, што так званыя «спажываючыя» вобласці пачалі пераўтварацца ў хлебавытворчыя. Калі прыняць нарыхтоўкі 1929 г. за 100 %, то збожжавытворчыя вобласці здалі ў 1933 г. 151 %, а спажывецкія вобласці, як, напрыклад, Заходняя вобласць, Беларусь, Ленінградская вобласць, Маскоўская вобласць, Паўночны край, Іванаўская вобласць, здалі 205 %. На 1934 г. былі пазначаны такія ж лічбы. З 9,5 млн пудоў па БССР 6,0 млн пудоў павінны былі здаць калгасы [129, с. 66].

Ва ўмовах недароду другога хлеба — бульбы — насельніцтва Беларусі апынулася ва ўмовах яшчэ большага голаду, чым у 1931—1932 гг. Асабліва складаная сітуацыя ўтварылася ва ўсходняй частцы Беларусі. Па зоне абслугоўвання Клімавіцкай МТС чвэрць калгасаў мелі менш за 1 кг харчавання на кожнага калгасніка (а яшчэ ж іх сем'і!). У многіх калгасах не засталося бульбы нават на насенне. Нягледзячы на атрыманне харчовай пазыкі (на калгасную сям'ю не болей 40 кг), сітуацыя напачатку красавіка — пачатку мая 1933 г. рэзка абвастрылася. «У шмат якіх калгасах ужываюць у ежу крапіву, траву, лісце ліпы і лазы, — адзначалася ў

данясенні палітаддзела Клімавіцкай МТС. — У калгасе імя Кагановіча калгаснікі з'елі карову, што загінула ад сібірскай язвы. У калгасе "Чырвоны край" ад недаядання многія калгаснікі хварэюць на тыф... У калгасах імя Крыніцкага, імя Калініна, імя Кагановіча, "Парыжская камуна" ёсць шмат апухлых. Галадаюць нават лепшыя ўдарнікі». З 4200 сем'яў, якія знаходзіліся ў калгасах Клімавіцкай МТС, больш паловы мелі патрэбу ў харчовай дапамозе. Па сітуацыі на 25 чэрвеня аніякай дапамогі аказана не было. Прыкладна такое ж становішча склалася і ў зоне дзеяння Плешчаніцкай МТС. «Харчовае становішча калгаснікаў зоны дзейнасці МТС вельмі цяжкае, — адзначаецца ў дакуменце. — Па шэрагу калгасаў сілкуюцца выключна травой. Контррэвалюцыйны элемент выкарыстоўвае харчовыя цяжкасці, актывізуючы сваю дзейнасць» [129, с. 279]. Зімой 1933/34 г. сяляне пачалі масавы забой жывёлы. Яго ажыццяўлялі як калгаснікі, так і рабочыя саўгасаў, а таксама адзінаасобнікі. «У асобных раёнах БССР, напрыклад, з-за забою статак скараціўся на 20—30 %, — адзначалася ў даведцы Пракуратуры СССР. — У Касцюковіцкім раёне (адным з буйнейшых жывёлагадоўчых раёнаў БССР) за час з 1 ліпеня 1933 г. па 1 студзеня 1934 г. прырэзана 8400 галоў буйной рагатай жывёлы. Пагалоўе ў раёне зменшылася за гэты час з 34 898 галоў да 26 457 галоў. З 8400 прырэзаных у раёне галоў жывёлы на адзінаасобны сектар прыпадае 4337 галоў, прычым 4153 галавы адносяцца да маладняка» [129, с. 66].

У 1933 г. голад зноў ахапіў паўднёвую частку Беларускай ССР. Галадала насельніцтва дзевяці сельскіх Саветаў. Да сярэдзіны чэрвеня 1933 г. у Ельскім і Нараўлянскім раёнах ад голаду памерлі 130 чалавек, а колькасць апухлых дасягала 230 чалавек. Голадам была закранута і цэнтральная частка БССР — некаторыя калгасы Мінскага раёна, значная частка Пухавіцкага і некаторых іншых раёнаў [98, с. 283, 284, 295]. Харчовыя цяжкасці сталі прычынай шматлікіх выступленняў у гарадах Беларусі [128, л. 157—161]. Сітуацыя пачала крыху паляпшацца з восені 1934 г., што дазволіла 23 снежня 1934 г. спісаць с калгасаў запазычанасці па пазыках, выдадзеных да 1933 г., на агульную суму 435 639 тыс. руб. [118, с. 517—519]. Праз некалькі дзён (26 снежня 1934 г.) была прынята Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб свабодным продажы хлеба "на гарадскіх і сельскіх базарах і на чыгуначных станцыях"» [129]. Можна адзначыць, што Пастанова СНК «Аб адмене картачнай сістэмы па печанаму хлебу, муцэ і крупах і сістэмы атаварвання хлебам тэхнічных культур» ад 7 снежня 1934 г. устанаўлівала 8 цэнавых паясоў на хлеб, БССР адносілася да 3-й групы разам з цэнтральнымі і заходнімі абласцямі РСФСР, Крымам, Днепрапятроўскай і Адэскай абласцямі, Чэлябінскай вобласцю, ЗСФСР, большай часткай Обска-Іртышскай вобласці.

Станаўленне калгасна-саўгаснай формы на вёсцы перадвызначыла тое, што пошукі ворагаў пераносіліся ў гарадское асяроддзе і партыйна-савецкі актыў. Асаблівага размаху «ворагашукальніцтва» дасягнула ў 1936—1937 гг. Яскрава гэта характарызуе тэлеграма Я. А. Якаўлева (першы наркам земляробства СССР) І. В. Сталіну аб становішчы ў Беларусі. «Устаноўлены наступныя факты, — тэлеграфуе ён, — вялікія чэргі за хлебам меліся амаль ва ўсіх гарадах і раённых цэнтрах. У якасці наркамгандлю на першай з нарад удзельнічаў Гурэвіч. Яго спроба

замазаць становішча, а таксама паводзіны кіраўніцтва, якое не паведаміла ў ЦК аб становішчы з хлебам, выклікаюць падазронасць. Начны перадопыт арыштаваных устанавіў, што Гурэвіч з'яўляўся членам контррэвалюцыйнай арганізацыі і хлебныя чэргі арганізоўваў па яе даручэнні. Учора Гурэвіч быў па нашай прапанове арыштаваны». Папярэдняе кіраўніцтва Беларусі ў тэлеграме называлася не інакш як «галадзедаўскай фашысцкай бандай». Да яе дзеянняў Я. А. Якаўлеў аднасіў распрацаваную Інструкцыю па лесавыкарыстанні, згодна з якой сялянам, па сутнасці, было забаронена пасвіць жывёлу ў лясах. Спецыяльнай правакацыяй называлася тое, што калгаснікі шмат якіх раёнаў пазбаўлены прысядзібных участкаў, насаджэнне Галадзедам саўгасаў і інш. [130, с. 528—534].

Да пачатку 1939 г. калгасы ў БССР аб'ядноўвалі звыш 90 % сялянскіх двароў [98, с. 284].

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Маргунский С. П.* Государственное строительство БССР в годы восстановления народного хозяйства (1921—1925). Минск : Акад. наук БССР, 1966. 286 с.

2. Журнал военных действий штаба войск Минского района за август – декабрь 1921 г. 1 августа 1921 – 31 декабря 1921 г., на 100 л. // РДАЭ. Ф. 1235. Воп. 96. Спр. 81.

3. Выписки из протоколов заседания Президиума Всероссийского Центрального Исполнительного комитета и переписка с представительствами Башкирской и Бурято-Монгольской республиками при Наркомате и губисполкомами Белорусской ССР о выделении территории с бурятским населением, о борьбе с бандитизмом в Белорусской ССР и по другим вопросам. 13 июля 1921 — 13 декабря 1921 г., на 101 л. // РДАЭ. Ф. 1235. Воп. 36. Спр. 202.

4. Без назвы. 298 л. // РДАЭ. Ф. 130. Воп. 23. Спр. 61.

5. *Кабанов В. В.* Аграрная революция в России // Вопр. истории. 1989. № 11.

6. Обзоры центральной и местной печати о проведении социализации, национализации и муниципализации в деревне, о налоговой системе, лесных заготовках и запасах на местах. Октябрь 1918 – апрель 1919 г. // ДАРФ. Ф. 393. Воп. 4. Спр. 43.

7. Кооперативно-колхозное строительство в Белорусской ССР (1917—1927). Минск : Навука і тэхніка, 1980. 309 с.

8. Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 г. — июль 1920 г.) : сб. докл. и материалов. Минск : АН БССР, 1961. 460 с.

9. Циркуляр Комзема Временного рабоче-крестьянского правительства Белоруссии о реорганизации земотделов уездревкомов и уездисполкомов, Положение о губернских рабочих комитетах содействия организации Социалистического сельхозпроизводства, отчет земотдела Минского губвоенревкома о работе за декабрь 1918 г. // НАРБ. Ф. 677. Воп. 1. Спр. 7.

10. Советская деревня глазами ВЧК – ОГПУ – НКВД. 1918–1939. Док. и материалы : в 4 т. / под ред. А. Береловича, В. Данилова. М. : РОССПЭН, 2000. Т. 1 : 1918–1922. 864 с.

11. *Ленин В. И.* Речь при обсуждении законопроекта СНК «О мерах укрепления и развития крестьянского сельского хозяйства на фракции РКП(б) VIII съезда Советов 24 декабря // Полн. собр. соч. Т. 42.

12. Протоколы № 1—10 заседаний Комиссии ЦК РКП по вопросам закупки хлеба за границей и резолюция (автограф) В. И. Ленина на телефонограмме заместителя Наркомпрода о принятии срочных мер для увеличения поставок из-за границы. 23 августа 1921 г. — 28 января 1922 г., на 33 л. // РДАЭ. Ф. 130. Воп. 5. Спр. 643.

13. Телеграммы об уменьшении норм продовольственного налога и продовольственном положении. 4 января 1921 г. — 17 декабря 1921 г., на 132 л. // РДАЭ. Ф. 130. Воп. 5. Спр. 779.

14. Заявления разных лиц с жалобами на неправильные действия отдельных представителей власти с ходатайствами об оказании помощи и переписка по рассмотрению этих заявлений. 3 января 1920 — 25 марта 1920 г., на 478 л. // РДАЭ. Ф. 130. Воп. 4. Спр. 240.

15. Очерки по истории государства и права Белорусской ССР. Вып. I / отв. ред. : Б. Е. Бабицкий, В. А. Дорогин. Минск : Изд-во Белгосуниверситета им. В. И. Ленина, 1958.

16. Стенограмма XI конференции (VI съезда) КП(б)Б Белоруссии. (1-й экземпляр неполный). 15 марта 1922 г. — 19 марта 1922 г., на 343 л. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 688.

17. *Стужынская Н. І.* З гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціву ў 1920-я гг. Вільня : Наша будучыня, 2011. 384 с.

18. *Стужынская Н. І.* Беларусь мяцежная: з гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціву: 1920-я гады. Мінск : Выдавец А. М. Вараксін, 2012. 362 с.

19. Постановления и инструкции СТО за 1922 г. на 3 л. Инструкция по проведению в жизнь Постановления Совета Труда и Обороны от 19 окт. 1921 г. «О мерах по борьбе с сокрытием пашни» // РДАЭ. Ф. 478. Наркамзем РСФСР. Воп 1. Спр. 541.

20. Переписка с Наркомфином по проекту постановления «Об обложении налогами крупного рогатого скота и других животных». 23 авг. — 26 сент. 1922 г., на 10 л. // РДАЭ. Ф. 478. Воп. 1. Спр. 964.

21. Переписка с ВЦИК о реваэкуации скота из Гомельской губернии в Белоруссию, о переводе средств губземуправлениям на закупку скота, об утверждении т. Миртова представителем особой коллегии высщего контроля по земельным спорам и по другим вопросам. 12—16 авг. 1922 г., на 32 л. // РДАЭ. Ф. 478. Воп. 1. Спр. 890.

22. Советская деревня глазами ВЧК – ОГПУ – НКВД. 1918–1939. Док. и материалы : в 4 т. / под ред. А. Береловича, В. Данилова. М. : РОССПЭН, 2000. Т. 2. 864 с.

23. Отчет о деятельности НКВД Б.С.С.Р. за январь — октябрь 1922 г. Протоколы заседаний Президиумов уездных исполкомов и совещаний председателей волостных исполкомов (копии) / Уезды Борисовский, Бобруйский, Игуменский, Мозырский, Минский, Слуцкий. Начало: январь 1922 г. — окончание: декабрь 1922 г. на 162 л. // РДАЭ. Ф. 393. Воп. 35. Спр. 598.

24. Отчет о деятельности Наркомзема за 1917—1922 гг. и доклад «Основные сравнительные данные, характеризующие результаты земельной политики за годы революции» (без автора). 1922, на 218 л. // РДАЭ. Ф. 478 Наркамзем РСФСР. Воп. 1. Спр. 851.

25. IX Всероссийский съезд Советов. Стенографический отчет РСФСР. № 1. М., 21 дек. 1921. 26 с.

26. IX Всероссийский съезд Советов. Стенографический отчет. № 3. М., 25 дек. 1921 г. 71 с.

27. IX Всероссийский съезд Советов. Стенографический отчет. № 4. М., 26 дек. 1921 г. 47 с.

28. Декреты Советской власти. М., 1989. Т. 13.

29. Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. М., 1967. Т. 1 : 1917—1928 гг.

30. Очередные задачи партии в связи с восстановлением хозяйства. Постановление XI Всероссийской конференции РКП (б) // КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. 1898—1970 ; изд. 8-е, доп. М., 1970. Т. 2 : 1917—1924. С. 301—307.

31. *Бухарин Н. И.* О новой экономической политике и наших задачах // Избр. произведения. М. : Политиздат, 1988.

32. *Сталин И. В.* Крестьянский вопрос (статьи и речи). М. ; Л. : Гос. изд-во, 1925. 2-е изд. 72 с.

33. Проект Декрета СНК с объяснительной запиской и переписка с ВЦИК о едином натуральном налоге на продукты сельского хозяйства. Материалы по разработке проекта Декрета ВЦИК и СНК об едином натуральном налоге на продукты сельского хозяйства на 1922—1923 гг. (проекты, доклады, объяснительные записки, выписки из протоколов). 9 февр. 1922 г. — 26 сент. 1922 г., на 75 л. // РДАЭ. Ф. 478. Воп. 1. Спр. 714.

34. Доклады и обзоры о состоянии сельского хозяйства. Январь 1923 г. — сентябрь 1924 г. // НАРБ Ф. 48. Воп. 1. Спр. 1650.

35. Циркуляры ЦК КП(б)Б, протоколы и выписки из протоколов заседаний пленумов, бюро и секретариатов окружкомов КП(б)Б, доклад ЦК КП(б)Б от октября 1924 г. «Об итогах обследования работы Калининской окружной организации КП(б)Б», отзывы ЦК КП(б)Б на политписьма секретарей райкомов КП(б)Б. 20 мая 1924 г. — 4 декабря 1925 г., на 557 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1950.

36. Стенограмма X конференции (V съезд) КП(б)Б Белоруссии. 15 октября 1921 г. – 30 октября 1921 г., на 334 л. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 417.

37. Протокол и журнал заседаний сельскохозяйственной секции, плодово-огородной комиссии и комиссии механизации сельского хозяйства и энергетики сельскохозяйственной секции Госплана. 13 марта 1921 г. — 29 октября 1921 г., на 36 л. // РДАЭ. Ф. 130. Воп. 5. Спр. 496.

38. *Кондратьев Н. Д.* Рынок хлебов и его регулирование во время войны и революции / отв. ред. акад. Л. И. Абалкин. М : Наука, 1994. 487 с.

39. *Кондратьев Н. Д.* Основные проблемы экономической статики и динамики: предварительный эскиз «Социологическое наследие». М : Наука. 1991. 576 с.

40. *Чаянов А. В.* Крестьянское хозяйство. Избр. тр. / редкол. сер. : Л. И. Абалкин (пред.) [и др.]. М. : Экономика, 1989. 492 с. (Экон. наследие).

41. *Прищепов Д.* Мероприятия по восстановлению сельского хозяйства Белоруссии // Вперед. 1924. № 2.

42. Постановление, распоряжение и протоколы заседаний СНК БССР и ЭКОСО, докладная записка президиума Минского окрисполкома о проведении контрактации семенных культур в округе в 1927—1928 гг. и переписка с Наркомторгом БССР и Белсельсоюзом о снабжении Белоруссии сельскохозяйственными машинами, об организации птицеводческих хозяйств в колхозах и совхозах республики и др. // НАРБ. Ф. 18. Воп. 3. Спр. 21.

43. Доклады и обзоры о состоянии сельского хозяйства. Январь 1923 г. — сентябрь 1924 г. // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 1650.

44. Статыстычны даведнік і каляндар з запісной кніжкай для стат.-карэспандэнта на 1927 год. Мінск, 1927. 428 с.

45. *Агеяў Л.* Жывёлагадоўля і перспектывы яе развіцьця ў калгасах БССР // Сельская і лясная гаспадарка. 1928. № 3—4. С. 22—34.

46. Съезды Советов в документах. 1917—1936. Т. III. М., 1960. 399 с.

47. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / А. Вабішчэвіч [і інш.] ; рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Экаперспектыва, 2006. Т. 5 : Беларусь у 1917—1925 гг. 613 с.

48. *Есиков С. А.* Российская деревня в годы нэпа: к вопросу об альтернативах сталинской коллективизации (по материалам Центрального Черноземья). М. : РОССПЭН : Фонд «Президентский центр им. Б. Н. Ельцина», 2010. 246 с. (Ист. сталинизма).

49. *Бородкин Л. И.* Моделирование альтернативной социальной динамики крестьянства после «Великого перелома»: Еще раз о «законе дифференциации» // Крестьянство и власть в истории России XX века : сб. науч. ст. участников Междунар. круглого стола (Журнал «Власть», Институт социологии РАН, Москва, 12 ноября 2010 г.) / под ред. П. П. Марченя, С. Ю. Разина. М. : ООО «АПР», 2011. 472 с. (Науч. проект «Народ и власть: История России и ее фальсификации». Вып. 2). С. 113.

50. *Свищёв М. А.* Мелкое производство в 20-е гг. // НЭП: приобретения и потери : сб. ст. М., 1994. С.185.

51. Краткая объяснительная записка к проекту «Общие начала землепользования и землеустройства Союза Правительства Белорусской ССР» // На аграрном фронте. 1926. № 10. С. 77—80.

52. Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства Белорусской Социалистической Советской Республики (далее — СУ БССР). 1925. № 22.

53. Приказы, циркуляры, инструкции Наркомзема РСФСР и Наркомзема БССР, переписка с уездземотделами и уездными управлениями народными имениями по организационным вопросам // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 84.

54. Стенографический отчет IV сессии Центрального Исполнительного Комитета Б.С.С.Р. VI созыва. Минск, 1925; СУ БССР. 1925. № 8.

55. *Бонч-Осмоловский Р.* Земельная площадь в БССР и ее распределение // Сов. стр-во. 1926. № II.

56. Съезды Советов в документах. 1917—1936. М., 1960. Т. 3. 399 с.

57. ЦИК БССР. 2-я сессия ЦИК БССР VII созыва. Витебск, 1925. 292 с.

58. Перспективный план развития сельского и лесного хозяйства БССР на 1925/26 — 1929/30 гг. Минск : Наркомзем БССР, 1927. 945 с.

59. Земельное управление исполнительного комитета Гомельского губернского Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов (губземуправление) // ДАГВ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 315.

60. Доклады и акты обследования колхозов и госземимущества Бобруйского, Мозырского, Полоцкого и Слуцкого округов // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 2885.

61. План Наркомзема БССР по заготовке и реализации сельскохозяйственных машин, орудий, семян и удобрений на 1927—1928 гг., доклады Белсельсоюза о состоянии и очередных задачах колхозного строительства, кооперировании польского и латышского населения БССР, сведения об оборотах сельскохозяйственной кооперации БССР за 1927—1928 гг., балансы Белсельсоюза и окрсельсоюзов на 1 октября 1927 г. и 1 января 1928 г. // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 753.

62. Акты инспекторов РКИ БССР об обследовании колхозов БССР по состоянию на 1 сентября 1926 г. // НАРБ. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 2598.

63. Сельское хозяйство Союза ССР в 1924/25 году по данным налоговых сводок по единому сельхозналогу. М. : НКФ СССР, 1925. 763 с.

64. НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 2687.

65. Отчет Народного Комиссариата Земледелия БССР за 1924/25 хозяйственный год (с 1-го октября 1924 г. по 1-е октября 1925 г.). Минск : Наркомзем Белоруссии, 1926. 183 с.

66. Победа колхозного строя в Белорусской ССР / М. П. Костюк [и др.]. Минск : Наука и техника, 1981. 448 с.

67. Кооперация БССР. Минск : ЦСК БССР, 1927. 229 с.

68. *Стрельцов М. Е.* Некоторые вопросы землеустройства земель крестьянского пользования в БССР в 1921—1929 гг. // Вопр. ист. : тез. докл. XII конф. молодых ученых Белорус. ССР. Минск, 1969.

69. Колхозы СССР : статист. справочник. М., 1929.

70. Белсельсаюз: Справаздача за 1927—1928 апэрацыйны год (7-мы год дзейнасьці). Менск, 1929. 116 с.

71. Асноўныя вынікі работы Ураду БССР. Да перавыбару Саветаў 1928/29 г. Мінск : Выд-ва УВК і СНК СССР, 1928. 150 с.

72. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и Пленумов ЦК. 1898—1986. 9-е изд., доп. и испр. М. : Политиздат, 1984. Т. 4.

73. Протоколы и выписки из протоколов распорядительных заседаний Президиума ЦИК и Совнаркома БССР, сведения Наркомзема БССР о развитии совхозов и колхозов в БССР, инструкция отдела землеустройства, мелиорации, сельского строительства и госземимуществ о земельно-хозяйственном строительстве госземимуществ // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 4003.

74. Сельское хозяйство Союза ССР в 1926/27 году по данным налоговых сводок по единому сельхозналогу. М. : НКФ СССР, 1929. 605 с.

75. Гісторыя Беларускай ССР. Мінск : Навука і тэхніка, 1973. Т. 3. 696 с.

76. *Неделько В. А.* К вопросу об особенностях социально-экономической структуры белорусской доколхозной деревни : тез. докл. и сообщ. XIV сессии межреспубликанского симпозиума по аграрной истории Восточной Европы (Минск — Гродно, 25—29 сент. 1972 г.). М., 1972. Вып. 2.

77. Советское строительство. 1928. № 12.

78. Стэнаграфічная справаздача XII з'езду КП(б)Б. Мінск, 1929.

79. Сельское хозяйство Союза ССР в 1928/29 году по данным налоговых сводок по единому сельхозналогу. М. : НКФ СССР, 1929.

80. *Цейтлин М. С.* Строительство колхозов // Сов. стр-во. 1928. № 12.

81. *Стрельцов М. Е.* Некоторые вопросы землеустройства земель крестьянского пользования в БССР в 1921—1929 гг. // Вопр. ист. : тез. докл. XII конф. молодых ученых Белорус. ССР. Минск, 1969.

82. Постановления ЦИК и Совнаркома БССР о мероприятиях по развитию колхозного строительства, выделению участков земли для колхозов, их землеустройству, доклад Наркомзема БССР о положении совхозов и колхозов, списки колхозов по округам // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 4002.

83. Планы кредитования сельского хозяйства БССР на 1929—1930 гг., переписка с Белорусской конторой сельхозбанка и окрколхозсоюзами об открытии и распределении кредитов // НАРБ. Ф. 338. Воп. 1. Спр. 10.

84. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР. IV (юбілейная) сэсія VIII скліканьня: стэнагр. справаздача. Менск, 1929.

85. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и Пленумов ЦК. Минск : Беларусь, 1984. Т. 2 : 1928—1932.

86. *Чаянов А. В.* Основные идеи и формы организации сельскохозяйственной кооперации. 2-е изд. М. : Изд-во Книгосоюза, 1927. 383 с.

87. Белсельсаюз : справаздача за 1926/27 апэрацыйны год (6-ты год дзейнасці). Менск, 1928. 93 с.

88. Тезисы докладов Белсельсоюза о состоянии и основных направлениях организационно-инструкторской работы системы сельскохозяйственной кооперации, состоянии и очередных задачах коллективных хозяйств БССР, краткий обзор работы системы сельскохозяйственной кооперации БССР за 1926—1927 гг. // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 881.

89. Четырнадцатая конференция Российской Коммунистической партии (большевиков) : стеногр. отчет. М. ; Л. : Госиздат, 1925. 335 с.

90. Протоколы № 35—45 заседаний Бюро ЦК КП(б), документы к ним. 27 сентября — 23 ноября 1929 г., на 372 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4328.

91. К протоколу № 25 заседания секретариата ЦК КП(б)Б от 2 марта 1931 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5118. Л. 198.

92. Протоколы заседаний секретариата ЦК КП(б)Б, документы к ним. 14 февраля — 25 марта 1931 г., на 364 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5118.

93. Справаздача Гомельскага акруговага Выканаўчага камітэту Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Гомель, 1928.

94. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов (окрколхозсоюз) // ДАВВ. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 1.

95. *Чмыга А. Ф.* Колхозное движение на Украине (1917—1929 гг.) : очерки истории. М. : Изд-во Моск. ун-та, 1974. 320 с.

96. Стэнограма і рэзалюцыі верасеньскага Пленуму ЦК КП(б)Б // Звязда. 1929. 4 ліп.

97. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927—1939. Док. и материалы : в 5 т. / под ред. В. Данилова [и др.]. М. : РОССПЭН, 2000. Т. 2 : Ноябрь 1929 г. — декабрь 1930 г. 927 с.

98. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / М. Біч [і інш.] ; рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Экаперспектыва, 2005. Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII — пачатак XX ст.).

99. Протоколы № 1—5 заседаний Бюро ЦК КП(б), документы к ним. № 35—45. 27 сентября — 23 ноября 1929 г., на 372 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4328.

100. Протоколы и постановления СНК и Совета Министров СССР (подлинники). 1923—1950 гг. // ДАРФ. Р-5446. Воп. 1. Спр. 53.

101. *Ивницкий Н. А.* Коллективизация и раскулачивание (начало 30-х годов). М., 1994.

102. *Данилов В. П.* Сталинизм и советское общество // Вопр. ист. 2004. № 2.

103. Циркуляры КП(б)Б, выписки из протоколов заседаний бюро окружкомов КП(б)Б, докладная записка Госстраха БССР в ЦК КП(б)Б от ноября 1928 г. о ходе сбора страховых платежей с сельского населения, выводы ЦСПСБ по итогам обследования работы Витебского райкома профсоюза рабочих-металлистов. 30 марта 1928 г. — 30 апреля 1930 г. на 535 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4288.

104. В ЦК КП(б)Бел. Совершенно секретно // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 21. Спр. 208.

105. Обзор крестьянских писем о политическом настроении, присланных в редакцию «Крестьянской газеты». 7—20 апреля 1930 г. // ДАРФ. Ф. 5446. Воп. 55. Спр. 1975.

106. Протоколы № 11—14 заседаний Бюро ЦК КП(б)Б, документы к ним, 18 августа — 6 сентября 1930 г. на 299 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4763.

107. Справаздача ЦК КП(б)Б да XII з'езду КП(б)Б (студзень 1929 — май 1930). Менск, 1930. 163 с.

108. Письмо в редакцию «Крестьянской газеты» из Орши // ДАРФ. Ф. 5446. Воп. 55. Спр. 1974.

109. Усім райкомам КП(б)Б. Сакрэтна // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 3. Спр. 4764. Л. 105, 107.

110. В ЦК КП(б)Бел. Совершенно секретно // НАРБ. Ф. 4. Воп. 20. Спр. 72.

111. Рэзалюцыя Пленуму ЦК КП(б)Б па дакладу тав. Галадзеда аб ходзе калектывізацыі і падрыхтоўцы да вясновай засеўнай кампаніі. 27—30 сакавіка 1931 г. // НАРБ. Ф. 4. Воп. 20. Спр. 72.

112. Протоколы заседаний секретариата ЦК КП(б)Б, документы к ним. 21 сентября — 1 октября 1931 г., на 321 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5.

113. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927—1939. Док. и материалы : в 5 т. / под ред. В. Данилова [и др.]. М. : РОССПЭН, 2001. Т. 3 : Конец 1930–1933. 1008 с.

114. Протокол № 9 заседания Бюро ЦК КП(б)Б от 26 мая 1932 г., на 243 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5624.

115. Краткая информация о недостатках, выявленных в Городокском районе. Спецсводка о выходе из колхозов и распаде части их. Х. с. — пометка карандашом — ЦК КП(б)Б тов. Гикало. За период с 1/1 по 15/IV 1932 года // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4443.

116. Материал о развале колхозов и выходе из них за первый квартал 1932 года // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 6302.

117. Экономическая энциклопедия. Политическая экономия (в 4 т.) / А. М. Румянцев (гл. ред.). М. : Сов. Энцикл., 1975. Т. 2. 564 с.

118. Коллективизация сельского хозяйства // Важнейшие постановления Коммунистической партии и Советского правительства 1927—1935 / отв. ред. П. Н. Шарова. М., 1957. 575 с.

119. СЗ СССР. 1933. № 2. Ст. 9.
120. Протоколы заседаний секретариата ЦК КП(б)Б, документы к ним. 14 февраля — 25 марта 1931 г., на 364 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5118.
121. Приказ Политического управления Белорусского Военного округа // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4700.
122. Обзор Политического управления Белорусского военного округа № 2. О работе и настроениях вокруг решения партии о ликвидации кулака как класса // НАРБ. Ф. 4. Воп. 1. Спр. 4700.
123. Протоколы № 35—40 заседания Бюро ЦК КП(б)Б и материалы к ним // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5110.
124. Пратакол № 31 зачынянага паседжаньня сакратарыяту ЦК КП(б)Б АД 2/IV-30 Г // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4331. Л. 530.
125. Бюро Гомельскага акруговага камітэта КП(б) па пытаньню аб расьсяленьні і высяленьні кулакоў 3-й катэгорыі // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4446.
126. Пастанова Бюро Менскага Акруговага Камітэту КП(б)Б аб кулаках 3-й катэгорыі // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4448. Л. 661, 662.
127. Пратакол № 78 Унечарговага пасяджэньня Бюро Аршанскага Акругкома КП(б)Б ад 6-га красавіка 1930 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4452.
128. Докладная записка т. Гикало о волнениях в гор. Борисове в связи с уменьшением норм выдачи хлеба и снятием части населения со снабжения // Голод в СССР. 1929—1934 : в 3 т. М. : МФД, 2011. Т. 1 : 1929 — июль 1932. Кн. 2. 560 с. (Россия. XX век. Документы).
129. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927—1939 : в 5 т. / под ред. В. Данилова, Р. Маннинг, Л. Виолы ; отв. ред. Ю. Мошков. М. : РОССПЭН, 2002. Т. 4 : 1934—1936. 1056 с.
130. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927—1939 : в 5 т. / отв. ред. В. Данилова, Р. Маннинг. М. : РОССПЭН, 2004. Т. 5 : 1937—1939. Кн. 1 : 1937 г. 648 с. ; Кн. 2 : 1938–1939. 704 с. М. : РОССПЭН, 2006.

## 2.2. ІНСТЫТУТЫ КІРАВАННЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКАЙ

Выключная роля дзяржавы ў развіцці мадэрнізацыйных працэсаў у СССР (як і ў Расійскай імперыі) актуалізуе даследаванне структуры і механізмаў яе ўздзеяння на формы і кірункі савецкай мадэрнізацыі, выяўленне зместу гэтых працэсаў на аснове макра- і мікравывучэння [1—6]. Расійскія даследчыкі прыклалі шмат намаганняў дзеля даследавання гісторыі дзяржаўных устаноў 20—30-х гг. XX ст., беларускія ж толькі пачынаюць такое вывучэнне [7].

У вызначэнні не толькі тактычных, але і стратэгічных задач і мэт развіцця сельскай гаспадаркі выключную ролю меў такі дзяржаўны орган, як Наркамат земляробства. Першапачаткова быў вельмі адчувальным уплыў (а ў шэрагу выпадкаў і рэальнага ўмяшальніцтва ў справы БССР) Наркамзема РСФСР. У 1929 г. быў створаны Наркамзем СССР, і Наркамзем РСФСР становіцца выключна рэспубліканскім органам кіравання сельскай гаспадаркай [8].

Напачатку Наркамзем РСФСР задумваўся як Галоўны зямельны савет — кантралюючы законадарадчы орган па справах земляробства пры Усерасійскім Цэнтральным Выканаўчым Камітэце. Такая прапанова ў далейшым не атрымала развіцця. І ўсё ж НКЗ сфарміраваўся як вельмі ўплывовы і разгалінаваны орган улады [9, л. 10; 10, л. 3; 11, л. 135; 12, л. 2]. Значэнне Наркамзема РСФСР як

агульнадзяржаўнага рэгулюючага і каардынуючага цэнтра ў галіне сельскай гаспадаркі ўзмацнілася з утварэннем СССР. Гэта знайшло адлюстраванне ў Палажэнні аб Наркамземе РСФСР, зацверджаным Дэкрэтам УЦВК ад 26 лістапада 1923 г., дзе ўстанаўлівалася, што на НКЗ РСФСР ускладаецца выпрацоўка і правядзенне неабходных мерапрыемстваў агульнаэканамічнага характару, удзел у распрацоўцы пытанняў агульнадзяржаўнай эканамічнай палітыкі ў галіне сельскай і лясной гаспадаркі. У адпаведнасці з мясцовымі ўмовамі ствараліся камітэты ў губернях і паветах. Кіравалі імі загадчыкі, што прызначаліся выканаўчымі камітэтамі Саветаў. Пры іх мелася Калегія (ад 4 да 6 чалавек). Мясцовыя зямельныя органы складаліся з аддзелаў, загадчыкі якіх зацвярджаліся Калегіяй Губземаддзела. Аддзелы дзяліліся (акрамя валасных) на пададдзелы [12]. Адпаведная структура была сфарміравана ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, якія да 1924 г. уваходзілі ў склад РСФСР.

Наркамат земляробства БССР, створаны ў снежні 1920 г., падпарадкоўваўся ЦВК БССР, яго Прэзідыуму, Саўнаркаму БССР і Эканамнарадзе БССР, ажыццяўляючы іх пастановы, дырэктывы і заданні. Маючы шырокія функцыі, НКЗ вырашаў пытанні аднаўлення і развіцця жывёлагадоўлі, арганізацыі конных заводаў, ветэрынарнай службы, барацьбы са шкоднікамі сельскай і лясной гаспадаркі, вёў улік і ажыццяўляў эксплуатацыю дзяржаўных зямельных маёмасцей, забяспечваў выкарыстанне зямельнага і лясного фонду, арганізацыю воднай гаспадаркі. Адной з важнейшых задач стала праца па землеўпарадкаванні на землях працоўнага карыстання. НКЗ таксама каардынаваў работу па рассяленні і перасяленні за межы рэспублікі.

Спробы дэцэнтралізацыі кіравання Наркамата на працягу 1920-х гг. адбываліся няўзгоднена, структура яго змянялася па некалькі разоў за непрацяглы час, работнікі не паспявалі асэнсаваць свае новыя функцыі [13, л. 241, 242; 14]. У 1930 г. аддзелы рэарганізуюцца ў сектары (іх было створана 7, пасля — 10). Мясцовыя зямельныя органы фарміраваліся ў адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі зменамі (з 1930 г. дзейнічалі непасрэдна раённыя зямельныя аддзелы). У 1937 г. у НКЗ ствараюцца інспекцыя пажарнай аховы і Упраўленне воднай гаспадаркі. Такім чынам, на Наркамат ускладаліся планаванне і кантроль за ўсімі водагаспадарчымі мерапрыемствамі па рэспубліцы. Кіраванне воднай гаспадаркай не з'яўлялася чымсьці новым для Наркамата земляробства БССР. Яшчэ 21 лістапада 1924 г. згодна з Пастановай «Аб упраўленні рыбнай гаспадаркай» усе рыбныя ўгоддзі рэспубліканскага значэння адносіліся да ведання НКЗ [15, с. 122]. У лістападзе 1938 г. у складзе Наркамзема БССР пачынаюць працу Бюро па сцяграванні хутароў і Дзяржветінспекцыя [15, с. 126].

Сістэму кіравання сельскагаспадарчымі арганізацыямі нельга ўявіць без характарыстыкі такой рэспубліканскай кааператыўнай арганізацыі, як Беларускі цэнтральны саюз сельскагаспадарчых і крэдытных кааператываў (Белсельсаюз). Пэўны час (з лютага 1922 г. па жнівень 1925 г.) у складзе саюза дзейнічала прамысловая секцыя, і ён функцыянаваў пад назвай «Беларускі цэнтральны саюз сельскагаспадарчых і прамысловых таварыстваў (Белсельпрамсаюз)». Дзейнасці

саюза (гэтаксама як і Наркамзема) перашкаджалі шматлікія рэарганізацыі. Вясной 1923 г. было прынята рашэнне аб зліцці сельскагаспадарчай і прамысловай кааперацыі са спажывецкай (адменена ў ліпені 1923 г.), якое прынесла вялікія страты. Разам з няўвагай да фінансавага боку справы, перабольшваннем кіраўніцтвам саюза арганізацыйна-мітынговых метадаў працы гэта прывяло ў 1924 г. да такіх вынікаў, што ад краху яго змагла выратаваць толькі дзяржава.

I з'езд упаўнаважаных сельскагаспадарчай кааперацыі ўзбуйненай БССР (11 сакавіка 1924 г.) захаваў Беларускі цэнтральны саюз сельскагаспадарчых і крэдытных кааператываў (Белсельсаюз) як адзіную рэспубліканскую кааперацыйную ўстанову. Кустарна-прамысловая секцыя была вылучана ў асобную арганізацыю (жнівень 1925 г.). Згодна з новым Статутам (май 1925 г.) Белсельсаюз вырашаў наступныя задачы: абарона працоўных інтарэсаў членаў саюза, забеспячэнне іх насеннем, сельскагаспадарчымі прыладамі і сыравінай, арганізацыя мерапрыемстваў па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі, распрацоўка агракультурных мерапрыемстваў.

Аднак кааперацыйныя ўстановы не пазбавіліся дзяржаўнага кантролю і цалкам залежалі ад крэдытаў з боку дзяржавы. Невысокім заставаўся і аўтарытэт кіраўнікоў Белсельсаюза. У асяроддзі яго непамерна раздутага апарату меліся выпадкі крадзяжу і растрат, выяўлялася некампетэнтнасць у пытаннях развіцця кааперацыі. У кастрычніку 1929 г. Белсельсаюз ліквідуецца, функцыі яго перадаюцца рэспубліканскім галіновым саюзам сельскагаспадарчай кааперацыі (ліквідаваны ў 1932 г.). У выніку такой рэарганізацыі кааперацыйныя ўстановы страцілі рэшткі сваёй эканамічнай самастойнасці.

Значную ролю ў рэальных працэсах калектывізацыі вёскі набываюць структуры, узнікненне якіх было выклікана новымі формамі мадэрнізацыі вёскі. Разгледзім гэты працэс больш падрабязна, паколькі ў 1920-я гг. закладваліся супярэчнасці і падыходы, што яскрава выявіліся ў наступнае дзесяцігоддзе.

Большасць калгасаў ва ўсходніх паветах Беларусі, якія ўваходзілі да ўзбуйнення БССР у склад РСФСР, да студзеня 1921 г. былі аб'яднаны ва Усерасійскім саюзе сельскагаспадарчых калектываў. У губернскіх зямельных аддзелах існавалі аддзяленні абагульнення сельскай гаспадаркі [16, л. 1]. Назіраўся паралелізм у рабоце. У канцы снежня 1921 г. IX Усерасійскі з'езд Саветаў прыняў рашэнне аб перадачы камун і арцеляў у сістэму сельскагаспадарчай кааперацыі. Аднак утвораныя саюзы сельскагаспадарчай кааперацыі не змаглі ахапіць усе калгасы ні колькасна, ні якасна [17, с. 33]. Што тычыцца органаў дзяржаўнага кіравання калектыўнымі гаспадаркамі, то гэтыя задачы з лютага 1921 г. выконвала Галоўнае ўпраўленне савецкімі і калектыўнымі гаспадаркамі (Галоўсаўкалгас), утворанае ў складзе Наркамата земляробства РСФСР. Пытаннямі калгаснага будаўніцтва ў Галоўсаўкалгасе займаўся аддзел калектыўных гаспадарак. Дадзеная ўстанова праіснавала толькі да снежня 1921 г., калі яе функцыі былі перададзены Цэнтральнаму ўпраўленню земляробства і савецкіх гаспадарак (1921—1923) [18, с. 246]. Аналагічныя органы кіравання на месцах дзейнічалі яшчэ больш кароткі час. Такая арганізацыйная блытаніна адмоўна адбівалася на якасці арганізацыйна-гаспадар-

чага абслугоўвання калгасаў. Падобнага кшталту сітуацыя назіралася і ў 6 паветах няўзбуйненай БССР. Непрацяглае існаванне пададдзелаў абагульнення сельскай гаспадаркі ў выніку польскай акупацыі функцыянавалі перавызначыла тое, што станаўленне органаў кіравання калектыўнымі гаспадаркамі супала тут са стварэннем іншых дзяржаўных структур [19, л. 12; 20, л. 10—12].

У кастрычніку 1921 г. у складзе адміністрацыйна-гаспадарчага ўпраўлення ўтвараецца аддзел сельскагаспадарчай кааперацыі і калектыўных гаспадарак [21, л. 56]. З прычыны сваёй малалікасці аддзел у пачатку сваёй дзейнасці не мог абследаваць усе калектыўныя гаспадаркі. Інструктар Б. Малеўскі 15 снежня паведамляў: «У сувязі з моцнымі маразамі, адсутнасцю пэўнага крэдыту і дрэннымі сродкамі перамяшчэння многа прыйшлося выходзіць пешшу і не атрымалася цалкам выканаць ускладзеныя на мяне заданні, аб чым паведамляю ў аддзел» [29, л. 3]. НКЗ рэспублікі і павятовыя зямельныя кіраванні мелі вялікія паўнамоцтвы па рэгуляванні сацыяльнага складу калгасаў, у галіне іх арганізацыі і роспуску. Да 1925 г. у статутах пераважнай большасці сельгасарцеляў няўзбуйненай БССР змяшчаўся § 6, які ставіў арцелі пад поўны кантроль пазначаных органаў [22, л. 544]. Яны кантралявалі сацыяльны склад і рабілі «чысткі» калектываў, на свой погляд змянялі іх кіраўнікоў [23, л. 73; 24, л. 40, 45].

Утварэнне Белсельпрамсаюза, а потым і Белсельсаюза не перадвызначыла істотнага паляпшэння арганізацыйна-гаспадарчага абслугоўвання калгасаў [25, л. 12]. На хвалі незадаволенасці кіраўніцтвам калектыўнымі гаспадаркамі з боку кааперацыйных устаноў у 1925 г. быў утвораны Усесаюзны савет сельскагаспадарчых калектываў (калгасаў) — УСК — як дарадчы орган пры Сельгассаюзе. Аналагічныя структуры ствараліся і ў рэспубліканскіх саюзах сельскагаспадарчай кааперацыі [26, л. 33, 34]. Ужо ў 1926 г. з'явіліся прапановы аб утварэнні ў Беларусі самастойнага саюза калгасаў. Яго неабходнасць абгрунтоўвалася немагчымасцю для Белсельсаюза ахапіць усю разнастайнасць форм кааперацыі, што праяўлялася ў недастатковым агранамічным і гаспадарчым абслугоўванні калектываў. Разумеючы, што калгасы не змогуць утрымліваць вялікі абслугоўваючы персанал, аўтары праекта прапаноўвалі апрабаваць яго ў якасці эксперымента ў адной з акруг [27, с. 14, 15].

6—10 красавіка 1927 г. адбылася V пашыраная сесія Усесаюзнага савета калгасаў. У яе рашэнні паведамлялася, што агульнае кіраўніцтва арганізацыяй калгасаў у СССР будзе і надалей ажыццяўляцца Усесаюзным Саветам калектыўных гаспадарак, а ў саюзных рэспубліках — калгаснымі цэнтрамі, якія афармляліся ва ўстаноўленым парадку. Калгасцэнтры ствараліся ў РСФСР, УССР, БССР і Узбекскай ССР. У сваёй дзейнасці яны павінны былі абапірацца на саюзы сельскагаспадарчай кааперацыі, секцыі, бюро і іншыя аб'яднанні калгасаў [28, л. 22].

Рашэнне аб утварэнні цэнтральнай секцыі калгасаў пры Белсельсаюзе (з 1928 г. Калгасцэнтр) было прынята ў ліпені 1927 г. камісіяй Эканамічнай нарады пры СНК БССР, а першыя пасяджэнні яе праўлення адбыліся ўжо ў кастрычніку гэтага ж года [29, 30, л. 236—247]. На працягу 1927/28 гаспадарчага года сістэма арганізацыйнага кіраўніцтва калгасамі будавалася наступным чынам: агуль-

нае прадстаўніцтва інтарэсаў калектыўных гаспадарак Беларусі ажыццяўлялася Калгасцэнтрам і акруговымі калгаснымі секцыямі пры сельсаюзах; на месцах дзейнічала 20 самастойных аб'яднанняў калгасаў, якія арганізоўваліся для паляпшэння агратэхнічнага абслугоўвання і стварэння сумесных прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі [31, л. 13, 14; 32, л. 8, 9]. Секцыя калгасаў пры Белсельсаюзе не змагла наладзіць нават абследаванне калектыўных аб'яднанняў, абмежаваўшы сваю дзейнасць пісьмовымі ўказаннямі акруговым секцыям калгасаў. Не было арганізавана агранамічнае абслугоўванне калектыўных гаспадарак, заставалася нізкай аплата працы кваліфікаваных аграномаў [33, с. 14]. Інструктаванне калгасаў мела эпізадычны характар, да таго ж інструктары, якія абследавалі іх, «мелі справу звычайна толькі са старшынёй, а члены калектыву нічога не ведалі аб тых заўвагах, якія рабіў той, хто інструктаваў». Становішча ўскладнялася наяўнасцю саперніцтва ў працы паміж аграперсаналам зямельных органаў і Белсельсаюза [33, с. 84].

Сур'ёзныя рознагалоссі ўзніклі паміж Наркамземам БССР і Праўленнем Белсельсаюза ўлетку 1928 г. пры абмеркаванні Палажэння аб раённым аграноме. Праўленне Белсельсаюза настойвала на тым, каб заснаваны інстытут раённай аграноміі засяродзіў ўвагу на спецыяльных вытворчых відах сельгаскааперацыі. Меркавалася, што калгасы на той момант у больш ці менш дастатковай ступені былі забяспечаны абслугоўваючым персаналам. Наркамзем пярэчыў такой пастаноўцы пытання [34, л. 190]. Гэта паскорыла арганізацыйнае размежаванне. 25 жніўня 1928 г. у ЦК КП(б)Б фракцыяй Праўлення Белсельсаюза была накіравана тэлеграма, у якой запытваўся дазвол на стварэнне «Беларускага калгаснага саюза з тым разлікам, што II Усебеларускі з'езд калгасаў канчаткова вырашыць дадзенае пытанне» [34, л. 201]. На гэтым з'ездзе ў кастрычніку 1928 г. разгарнулася дыскусія па пытанні арганізацыйнага кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам. Некаторыя дэлегаты паставілі пад сумненне неабходнасць залішняй (на іх думку) цэнтралізацыі і прапанавалі засяродзіць арганізацыйна-гаспадарчае абслугоўванне калектыўных гаспадарак на раённым узроўні, каб звязаць работу саматужных аб'яднанняў, раённых аб'яднанняў і раённых крэдытных таварыстваў [35, с. 29, 30]. Аднак большасць удзельнікаў з'езда падтрымалі прапанову аб арганізацыі цэнтральнага і акруговых саюзаў калгасаў [35, с. 21].

14 лістапада 1928 г. было зацверджана Палажэнне аб структуры апарату Усебеларускага саюза сельскагаспадарчых калектываў, машынных і меліярацыйных таварыстваў (Белкалгассаюза). У адпаведнасці з ім утвараліся сакратарыят і 4 аддзелы [36, л. 95]. Савет і Праўленне саюза выбіраліся Усебеларускім з'ездам сельскагаспадарчых калектываў, які з'яўляўся вышэйшым органам Белкалгассаюза [36, л. 109]. На месцах арганізацыйнае афармленне новай структуры кіравання моцна зацягнулася [37, с. 357]. Згодна з пастановай СНК Беларускай ССР забеспячэнне цэнтральнага апарату Белкалгассаюза ажыццяўлялася з Дзяржбюджэту цалкам, а акруговых саюзаў — 50 %. Астатнія 50 % фінансаваліся з мясцовага бюджэту і шляхам адлічэнняў устаноў сістэмы сельгаскааперацыі [38, л. 11; 26, л. 59]. Стан калгасаў, безумоўна, патрабаваў дапамогі з боку дзяржавы. Аднак органы

кіравання калектыўнымі гаспадаркамі не залежалі ад вынікаў гаспадарчай дзейнасці кіруючых імі аб'яднанняў, што ва ўмовах цэнтралізаванага размеркавання крэдытаў, сельскагаспадарчай тэхнікі і іншых сродкаў мела негатыўныя наступствы. На 2-м Усебеларускім з'ездзе калгасаў прадстаўнікі з месцаў адзначалі, што збыт калектывамі некаторай часткі прадукцыі праз прыватны гандаль быў звязаны перш за ўсё з дэфіцытам на шэраг тавараў і паслуг [35, с. 28]. Па меры абмежавання гэтых сувязей і ростам аб'ёмаў кантрактацыі, якая набывала абавязковы характар, калгасы апынуліся ў поўнай залежнасці ад вышэйстаячых органаў.

Кіраўніцтва акруговых саюзаў ужо з самага пачатку сваёй дзейнасці выявіла імкненне да ўмяшання ва ўнутраныя справы калектыўных гаспадарак [39, л. 10]. У метадах кіравання калгасамі істотных змен не адбылося, бо саюзы былі ўтвораны на аснове штатных работнікаў секцый акрсельсаюзаў сельгаскааперацыі. У іх абавязкі па-ранейшаму ўваходзіла складанне шматлікай справаздачнасці, формы якой штогод змяняліся. Як зазначалася ў друку, інструктары і збор матэрыялаў для справаздач часцяком перадаручалі раённым аграномам, чым, уласна, і абмяжоўваліся іх камандзіроўкі ў калектыўныя гаспадаркі [40, л. 438].

На пачатку 1929 г. Белкалгассаюзам прымаецца рашэнне аб стварэнні ў акруговых саюзах калектыўных гаспадарак штату раз'язных інструктараў-аграномаў [41, л. 42]. Прадстаўнікі з месцаў на 2-й сесіі Савета рэспубліканскага саюза звярталі ўвагу на тое, што дзейнасць гэтых інструктараў набыла гастралёрскі характар. Яны заклікалі не ствараць новых начальнікаў над калгасамі, а наблізіць аграномаў да калектываў, паставіць аплату іх працы ў залежнасць ад гаспадарчай дзейнасці калгасаў. Дэлегаты сесіі настаялі на папраўцы да рэзалюцыі, куды ўнеслі пункт, накіраваны супраць адміністравання ў кіраўніцтве калектыўнымі гаспадаркамі, якое выяўлялася ў абавязковым зацвярджэнні акрсекцыямі прыёму і выключэння членаў агульнымі сходамі калгасаў [42, л. 53, 56].

Але факты ўмяшання ва ўнутраныя справы калектыўных аб'яднанняў мелі масавы характар. На прыкладзе Мінскай акругі можна бачыць, што праўленні акруговых секцый і саюзаў калектыўных гаспадарак разглядалі на сваіх пасяджэннях не пытанні паляпшэння арганізацыйна-гаспадарчага абслугоўвання калгасаў, а стан іх унутранага распарадку. У выніку кіраўнічыя органы змагаліся адміністрацыйнымі мерамі не з прычынай адмоўных з'яў у жыцці калектыву, а з іх наступствамі. Так, рэкамендавалася «знішчыць наём працоўнай сілы і парабчанак у бліжэйшы час і папоўніць склад арцелі да 20 сем'яў, а таксама ўсе лішкі прадукцыі рэалізоўваць выключна праз каапераціыю» [43, л. 8, 12]. Было прапанавана паставіць пытанне перад пракуратурай аб прыцягненні членаў арцелі «Колас» і шэрагу іншых калектываў да адказнасці за зрыў падрыхтоўкі да пасяўной кампаніі і невыкананне дырэктыў аб зборы попелу [43, л. 58, 59]. У некаторых выпадках указанні мелі характар непасрэднага ўмяшальніцтва ў гаспадарчыя пытанні. Савету камуны «Чырвонае знамя» прапаноўвалася «адмяніць сваё рашэнне аб уводзенні двухразовага даення кароў і не пазней 15 кастрычніка 1928 г. устанавіць трохразовае даенне кароў» [43, л. 9]. Прыклады адміністравання аналагічнага характару ў дачыненні да калгасаў можна вызначыць і ў дзейнасці іншых

акруговых калгассекцый і саюзаў [44, л. 1, 5, 6; 45, л. 114, 115; 46, л. 1; 47, л. 13]. На 2-м Усебеларускім з'ездзе калгасаў падкрэслівалася неабходнасць дэцэнтралізацыі ў справе кіравання калектыўнымі гаспадаркамі, але гэтыя галасы ўжо не былі пачутыя [48, л. 239—242].

Арганізацыя калектыўных гаспадарак бядняцкімі слаямі вёскі акрэсліла тое, што ў складзе непадзельных капіталаў калгасаў у 1929 г. 87,6 % складала дзяржмаёмасць, перададзеная калектыўным гаспадаркам. Адлічэнні калектываў складалі ад 10 да 12,5 %, заўважнай стала тэндэнцыя максімальна змяншаць адлічэнні ў непадзельны капітал. Такая акалічнасць давала значную падставу чыноўнікам ад кааперацыі для адміністравання і камандных метадаў арганізацыі работы [49, л. 148]. Ва ўмовах хранічнага недахопу кадраў ужо ў гэты перыяд назіралася практыка, калі асобных кіраўнікоў, што не спраўляліся са сваімі абавязкамі, назначалі старшынямі калгасаў [50, л. 141].

У 1928 г. адбываецца размежаванне калектыўнага гаспадарання і кааперацыі, што мела аднолькава адмоўныя наступствы для гэтых форм мадэрнізацыі вёскі, перадвызначыла паступовы адрыў кіраўнічых структур ад патрэб калектыўных гаспадарак, падмену імі функцый дзяржаўных органаў. Ужо ў канцы 1920-х гг. калгасамі быў канчаткова страчаны адзін з асноўных прынцыпаў кааперацыйнага будаўніцтва — самакіраванне. Індывідуальная сялянская гаспадарка з'яўлялася не самым зручным аб'ектам для камандавання і адміністравання, хоць і адчувала такое ўздзеянне. Калгасы ж як абагуленыя прадпрыемствы, наадварот, апынуліся пад моцным ціскам. У такіх умовах курс на суцэльную калектывізацыю прадугледжваў пачатак афармлення адміністрацыйна-каманднага кіравання ў цэласную сістэму, а яго фарсіраванае ажыццяўленне паскорыла і паглыбіла працэс.

На мяжы 1920—30-х гг. быў задзейнічаны той жа механізм мадэрнізацыі, што і ў 1917—1920-х гг.: механізм класавай барацьбы. Партыйны апарат, які (як калісьці на франтах вайны) быў падрыхтаваны выконваць задачы без аглядкі на страты ў максімальных формах і тэрмінах. Частка партыйцаў разглядала калектывізацыю ўвогуле як чарговы этап новай сялянскай рэвалюцыі і заяўляла сялянам: «...прыйшоў час вас рэзаць, і калі вы не ўступіце ў калгас, то вас усіх перарэжам...» [51, л. 4]. Пры гэтым у дачыненні да сябе новыя выканаўцы патрабавалі норм элементарнай партыйнай дэмакратыі. Калектывізацыя стварыла шырокі пласт незадаволенасці партыйнай наменклатуры, што ў далейшым перадвызначыла рознага кшталту «чысткі» як формы барацьбы супраць такой незадаволенасці. Вядомы некалькі выступленняў супраць спроб цэнтральных улад манеўраваць без узгаднення з шэраговымі партыйнымі арганізацыямі. Адным з самых вядомых фактаў супрацьдзеяння імпульсу, закладзенаму ў артыкуле І. В. Сталіна і Пастанове ЦК УКП(б) ад 10 сакавіка 1930 г., стаў зварот Шклоўскага райкама бальшавіцкай партыі. Такіх абурэнняў было шмат, аднак не ўсе партыйныя арганізацыі адважыліся на адкрытую форму незадаволенасці. Яна выяўлялася ў фактах утойвання пазначаных вышэй дакументаў цэнтральнага кіраўніцтва. Падобныя настроі былі характэрныя не толькі для партыйцаў, а ўвогуле для батрацка-бядняцкіх груп. Між тым імклівае развіццё краіны патрабавала хуткай рэакцыі партыйна-савецкага

кіраўніцтва. Пазначаная не толькі ў манаграфіях, але і ў падручніках адміністрацыйна-загадная сістэма мела свае ўяўныя механізмы, супярэчнасці... і перавагі. «Камандаванне», «дэкрэтаванне», якое ў нашай гістарычнай літаратуры найчасцей ужываецца толькі ў негатыўным сэнсе, з'яўляецца характарыстыкай не столькі савецкага грамадства, колькі ўласна любога інстытута ўлады. Яно застаецца важнейшым атрыбутам дзяржаўнасці побач з прымусам рознага роду, які можа быць не толькі з боку калектыву ці іншай асобы, але і праз матывацыю, уласную зацікаўленасць. Ён можа выступаць у форме аўтарытэту, здольнасці перакануць і г. д. Камандаванне, калі яно адбываецца на аснове законаў, зацверджаных норм і правіл, забяспечвае неабходнасць грамадства ў рэгуляванні, захаванні функцыянальнай узаемасувязі паміж рознымі ўзроўнямі ўлады.

Нельга сцвярджаць, што партыйна-савецкае кіраўніцтва БССР увогуле не заўважала праблем мадэрнізацыі, у прыватнасці невялікую колькасць тэхнікі для сельскай гаспадаркі. На 1 кастрычніка 1929 г. колькасць трактароў у рэспубліцы складала ўсяго 198 адзінак (у чым абвінавачвалася «прышчэпаўскае» кіраўніцтва). Нават невялікі план пастаўкі ў 196 трактароў вясенняга севу быў не выкананы (фактычна атрымана толькі 23). Па самых аптымістычных ацэнках да пачатку пасяўных работ БССР магла б атрымаць толькі 53 адзінкі трактарнай тэхнікі [48, л. 239—242]. У сувязі з тым у 1929 г. кіраўніцтва рэспублікі спрабавала звярнуць увагу на асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. Адзначалася, што асноўным напрамкам сельскай гаспадаркі рэспублікі стала жывёлагадоўля, што ўскладняла справу калектывізацыі [48, л. 241].

Арганізацыя калектыўных гаспадарак пераважна батрацка-бядняцкімі слаямі павялічвала спажывецкія настроі ў калектывах. Узнікала неабходнасць у ідэйна вытрыманых кіраўніках, якія добра ведалі сельскую гаспадарку [48, л. 242]. Рабочыя ў Беларусі — прадстаўнікі мяшчанска-саматужных слаёў — не былі звязаны з вёскай. Падбор кіруючых кадраў выклікаў асаблівыя цяжкасці. Саўгасы знаходзіліся ў такім стане, што за пэўным выключэннем не маглі мець паказальнага значэння [48, л. 241].

Спроба новага ціску на сялян у 1931 г. прадвызначыла чарговы адток з калгасаў і з вёскі ўвогуле ў 1932 г. Прычыны заставаліся тыя ж: хлебанарыхтоўкі, адміністраванне, адсутнасць належнай індывідуальнай працы. Нягледзячы на тое што кампанія па раскулачванні вясной 1932 г. набліжалася да завяршэння, кіраўніцтва Калгасцэнтра сцвярджала аб наяўнасці «класавага ворага», «кулацтва, якое хавалася ў калгасах» як прычыне зыходу сялянства з калектываў і распаду часткі з іх. Тыя 150 новых гараджан, якія былі накіраваны на вёску, належнага вопыту не мелі, аднак іншых кадраў не было. Месцы звольненых супрацоўнікаў раённых аддзелаў доўгі час заставаліся вакантнымі. Людзі, не звязаныя з зямлёй, аб ёй дбаць не жадалі [52, л. 23, 24].

Сучасная гістарыяграфія перапоўнена сведчаннямі аб прымусе сялянства да калектывізацыі, але недастаткова вядомыя хвалі рэпрэсіўных мер за «перагібы» ў ходзе калектывізацыі. На працягу вясны — лета пад суд «за скрыўленне клясавай лініі» былі аддадзены многія старшыні калгасаў, прадстаўнікі нізавога звяна

кааперацыі і партыйных органаў [53]. Рэзкія хістанні ў палітыцы калектывізацыі абумовілі сярод шэраговых партыйцаў і кіраўніцтва сельскіх саветаў сітуацыю апатыі і расчаравання. Да прыкладу, у Лельчыцкім раёне лявацкія перагібы на мяжы 1929—1930 гг. выклікалі паўстанне. Пасля роспуску кіраўніцтва раённай партарганізацыі, па сцвярджэнні Калгассаюза, партыйныя і савецкія працаўнікі вясной і летам 1930 г. не толькі не працягвалі працу па калектывізацыі, але баяліся нават абмяркоўваць яе — «гаварылі шопатам» [54, л. 198].

Прычыны пазначаных з'яў мелі карані не толькі ў матываванасці асобных людзей ці арганізацый. Сапраўдныя вытокі многіх з'яў тагачаснай рэчаіснасці хаваліся ў сацыяльнай псіхалогіі кіруючых груп. Вастрыню праблемы можна назіраць ужо на падставе аналізу складу членаў праўленняў калектыўных гаспадарак БССР. Па стане на люты — сакавік 1925 г. асобы з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй сярод іх складалі менш за 7 %, прыкладна столькі ж — неадукаваныя, астатнія мелі толькі хатнюю ці ніжэйшую адукацыю. Прычым узровень пісьменнасці быў забяспечаны за кошт параўнальна высокага прадстаўніцтва ў праўленнях калектываў такой сацыяльнай катэгорыі, як служачыя. Тут яны складалі больш за 14 %, у той час як у агульным ліку членаў калгаса — 4,8 % (гл. дадатак, табл. 4). Нізкі адукацыйны ўзровень, некампетэнтнасць кіраўніцтва калектыўных аб'яднанняў у пытаннях вядзення буйной гаспадаркі перадвызначылі тое, што амаль усе праблемы ў калгасах вырашаліся на агульных сходах іх членаў. У 1927/28 гаспадарчым годзе колькасць сходаў яшчэ больш павялічылася. У некаторых калектыўных гаспадарках за 1926/27 год не адбылося ніводнага пасяджэння праўлення. Слаба выяўлялі сябе і рэвізійныя камісіі [31, с. 15; 55, с. 35].

Такое становішча выклікалася адрывам праўленняў калгасаў ад яго членаў, у выніку чаго апошнія не давяралі не толькі ім, але і рэвізійным камісіям. Падобнага роду дэмакратызм нярэдка прыводзіў да адмаўлення ўвогуле правіл унутранага распарадку і да адказу членаў калектыву выконваць тую ці іншую працу [56, л. 64]. Праўленне пераабіралася штогод на справаздачным сходзе, яго старшыня не вызваляўся ад фізічнай працы, калі ён пры гэтым не выконваў функцый рахункавода, бухгалтара і г. д. Галоўны недахоп кіраўніка калектыва часцей пазначаўся адсутнасцю настойлівасці і патрабавальнасці [57, л. 34, 42, 50, 57]. У выніку недзеяздольнасці праўленняў назіралася і іншая крайнасць — выпадкі «дыктатарства» ў калгасах, выдзялення асоб, у руках якіх канцэнтраваліся ўсе сувязі калектываў са знешнім асяроддзем, што таксама прыводзіла да іх распаду [58, с. 74].

З сярэдзіны 1920-х гг. усё больш узрастае разуменне таго факта, што «для арганізацыі буйной гаспадаркі, устанаўлення яе сістэмы, прывядзення ў адпаведнасць усіх яе галін патрабуецца не толькі навык, але і тэарэтычная падрыхтоўка» [59, с. 54]. Аднак акцэнт рабіўся пераважна на падрыхтоўку спецыялістаў для агранамічнага абслугоўвання калгасаў. З 1928 г. у адпаведнасці з Пастановай СНК СССР ад 17 лютага разгортваецца праца па шырокім азнаямленні сялянскай моладзі з метадамі вядзення буйной гаспадаркі, па павышэнні кваліфікацыі працаўнікоў усіх галін калгаснай вытворчасці [60, л. 4]. Са снежня таго ж года вывучэнне пытанняў калгаснага руху пачалося ў 4-гадовых школах, сямігодках,

прафшколах і тэхнікумах. Значнае распаўсюджанне атрымала практыка правядзення курсаў па падрыхтоўцы спецыялістаў для калгасаў. У 1928—1929 гг. былі арганізаваны 2-месячныя курсы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы аграномаў-інструктараў, кіраўнікоў саматужных аб'яднанняў і буйных калектыўных гаспадарак. Слухачам былі прапанаваны лекцыі па гісторыі калгаснага руху, арганізацыі буйной сельскагаспадарчай вытворчасці і г. д. [61, л. 30]. Такія курсы арганізоўваліся пераважна пры навучальных установах: Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі, сельскагаспадарчых тэхнікумах. У 1928/29 гаспадарчым годзе акцэнт быў зроблены на павышэнні кваліфікацыі кіраўнікоў калгасаў, з якіх ужо ў першым паўгоддзі прайшло навучанне 606 чалавек у параўнанні з 88 у папярэднім годзе [31, с. 16].

Тым не менш разрыў паміж тэмпамі падрыхтоўкі спецыялістаў калгаснай вытворчасці і ростам колькасці калектыўных гаспадарак павялічваўся [31]. Невысокім быў і ўзровень кваліфікацыі такіх спецыялістаў. Курсы выконвалі ролю лікбезу па пытаннях арганізацыі буйной сельскагаспадарчай вытворчасці. Шмат часу страчвалася на агульнапалітычныя пытанні, недастатковая ўвага надавалася практычным пытанням. Не ўлічваўся розны ўзровень падрыхтоўкі курсантаў, нізкім было наведванне заняткаў [61, л. 97, 98, 121; 62, л. 23]. З сярэдзіны 1929 г. прадпрымаюцца пэўныя намаганні, каб выправіць становішча. Праводзіцца кантрактацыя спецыялістаў для калгасаў [63, л. 1—36]. У 1929/30 навучальным годзе адкрываюцца тэхнікум калектыўнага землекарыстання ў в. Капічы Касцюковіцкага раёна, факультэт буйнога земляробства ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі і г. д. [64, л. 64, 95, 96; 65, л. 300]. Аднак прынятыя меры маглі палепшыць сітуацыю з падрыхтоўкай кваліфікаваных кіраўнікоў калгасаў толькі праз некалькі гадоў, між тым нястрымнае фарсіраванне колькасці калектыўных гаспадарак назіраецца ўжо з другой паловы 1929 г.

Напярэдадні вясенняй пасяўной кампаніі 1931 г. было вырашана «мабілізаваць усіх студэнтаў старэйшых курсаў, вытворчую практыку якіх прыстасаваць да сезона веснавой сяўбы і далей — да ўборачнай кампаніі. Мабілізаваных студэнтаў планавалася перадаць пад загад Наркамзема і Калгасцэнтра, накіраваўшы студэнтаў з 1-га сакавіка і да пачатку севу ва ўсе раёны БССР. Меркавалася арганізаваць не пазней чым у канцы лютага датэрміновы выпуск усіх студэнтаў сельскагаспадарчых вузаў і тэхнікумаў, якія павінны былі скончыць навучанне ўлетку гэтага года» [66, л. 3—3 об.].

Для выпраўлення становішча ў вёску накіроўваюцца рабочыя-дваццаціпяцітысячнікі з мэтай аказання дапамогі ў ажыццяўленні калектывізацыі. 612 з іх былі накіраваны ў Беларускую ССР, у тым ліку 99 прадстаўнікоў завода «Чырвонае Сормава» з Ніжняга Ноўгарада. Каля паловы дваццаціпяцітысячнікаў накіраваны ў вёскі БССР у якасці старшынь і намеснікаў старшынь сельскагаспадарчых арцеляў. Рабочыя, магчыма, і «былі аддадзеныя ідэі калектывізацыі, настойліва праводзілі ў жыццё пастановы партыі і ўрада», аднак не заўсёды з'яўляліся дастаткова кампетэнтнымі ў пытаннях сельскай гаспадаркі. Практыка накіравання ў сельскую мясцовасць прадстаўнікоў горада з мэтай узмацнення работы па ства-

рэнні калгасаў і іх арганізацыйна-гаспадарчым развіцці атрымала ў 1930-я гг. значнае распаўсюджанне. Яна, па сутнасці, стала сістэмай у рабоце партыйных і савецкіх структур. Праведзены ў чэрвені 1930 г. агляд становішча і ўмоў працы рабочых-дваццаціпяцітысячнікаў з Беларусі выявіў, аднак, шэраг праблем. Пры патрэбе ў 140 чалавек з 26 вытворчых прадпрыемстваў Віцебска было накіравана 123. Па нацыянальным складзе 53 з'яўляліся беларусамі, яўрэяў мелася 36, рускіх — 11, латышоў — 7, палякаў — 8 і іншых — 8. Жанчыны прысутнічалі сярод гэтай групы, але складалі зусім невялікую частку — 10 %. Віцебская камісія канстатавала дрэнную арганізацыю працы з рабочымі-дваццаціпяцітысячнікамі з боку раённых партыйных і калгасных арганізацый, адсутнасць кансультацый па сельскагаспадарчых пытаннях. Для вылучэнцаў павінны былі ствараецца спрыяльныя ўмовы працы: ім прадастаўлялася кватэра, кампенсавалася розніца ў заработнай плаце, забяспечвалася норма прадуктаў. Віцебскі Акруговы Камітэт КП(б)Б адзначаў, што ўмовы для дваццаціпяцітысячнікаў не заўсёды вытрымліваліся і яны вымушаны былі «абіваць парогі» ўстаноў. Для сельскай гаспадаркі ў выніку заставалася няшмат часу. Сяляне не вельмі добра адносіліся да гэтых вылучэнцаў [67, л. 51—56]. Так, калі пачаўся масавы выхад сялян з калгасаў, кіраўніцтва Лагойскага раёна пісала, што ўвесь актыў кінуты на растлумачальную работу, і прызнавала — станоўчых вынікаў не дасягнута [68, л. 321—325].

У маі 1932 г. наркам земляробства СССР Я. А. Якаўлеў папярэджваў, што план па калгасах у БССР істотна перабольшаны. Мясцовае кіраўніцтва, якое не паспявала за дырэктывамі зверху, увесь час імкнулася схаваць недахопы, не дапусціць скаргаў [69, л. 68, 74—76]. Кіраўніцтва калгасаў часам не мела не толькі дзелавога, але і маральнага аўтарытэту сярод калгаснікаў. У шматлікіх дакументах выкарыстоўваўся нават тэрмін «разлажэнне кіраўнікоў». Прыводзілася вялікая колькасць прыкладаў «разбазарвання імі калгаснай прадукцыі, гулянак, п'янак і г. д.». Так, «старшыня калгаса імя Варашылава Шклоўскага раёна Алданаў, старшыня рэвізійнай камісіі Карнейчыкаў і рахункавод Міхалюта сумесна з кулакамі Рубанавым, Міхейчыкавым наладзілі п'янку, выкарыстаўшы на гэтую справу каля 80 пудоў калгаснага хлеба. Падчас п'янкі распявалі рэлігійныя песні і антысавецкія прыпеўкі. Старшыня калгаса "Бедната" Высоцкі Талкачэўскага сельсавета займаецца сістэматычным п'янствам. Склады са збожжам не ахоўваюцца, вартаўнікі на пасты не выходзяць» [70, с. 50].

Сітуацыя ў сельскай гаспадарцы, заснаваная на жаданні вышэйшай улады ўзяць пад свой кантроль як мага больш відаў дзейнасці, прыводзіла да пашырэння паказчыкаў у галіне сельскай гаспадаркі і распаўсюджання гэтай практыкі на кожную вобласць, край, затым раён і калгас. У планах сталі пазначацца тэрміны не толькі пад'ёму пароў і зябліва, пасеву, але і вывазу гною, плошчы і тэрміны «звышранняга» севу, не толькі агульныя, але і прыватныя агратэхнічныя прыёмы ў маштабе ўсёй велізарнай краіны з яе прыроднымі і гаспадарчымі адрозненнямі. Каб забяспечыць выкананне ўсёй гэтай безлічы распараджэнняў і ўказанняў, неабходна было прадугледзець сістэму пакарання. У выніку ўзрастала колькасць пастаноў вышэйшай улады з пералікам санкцый, якія накладаліся ў судовым і ад-

міністрацыйным парадку на сельскіх працаўнікоў усіх рангаў, пачынаючы з прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі, старшынь калгасаў, дырэктараў МТС і саўгасаў і заканчваючы радавымі калгаснікамі. Шмат у чым сканструяваная зверху калгасная структура, якая зыходзіла найперш не з інтарэсаў саміх калгасаў, а хутчэйшага дасягнення мэты індустрыяльнай магутнасці дзяржавы, не мела дастатковых імпульсаў для развіцця. Складовыя элементы фарміруемай сістэмы знаходзіліся ў слабым узаемадзеянні, з цяжкасцю злучаліся ў адзіны адладжаны арганізм. Каб падтрымліваць яго жыццядзейнасць, узнікала і захоўвалася патрэба штодзень узмацняць «кіраўніцтва партыі», пры тым, што кадравая складаючая не адпавядала ўмовам рэалізацыі тых задач, якія перад імі ставіліся (а нярэдка і самім гэтым задачам). Ажыццяўляўся пастаянны нагляд і ціск на сельскіх працаўнікоў з боку ўсяго разгалінаванага апарату ўлады. У такіх умовах роля асобы і нават зямельных органаў БССР у 1930-я гг. зменшылася. Для параўнання і разумення тэндэнцый і альтэрнатыў карысна спыніцца на кіраўніцтве Наркамзема БССР 1920-х гг. (найперш Д. Ф. Прышчэпаве) праз мікрагістарычны кантэкст.

Дзмітрый Філімонавіч Прышчэпаў нарадзіўся 9 (21) лістапада 1896 г. у вёсцы Калодніца Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Крупскі раён Мінскай вобласці). Непасрэдны ўдзел з маленства ў сельскагаспадарчых працэсах, назіранне за жыццём вяскоўцаў сфарміравалі ў Д. Ф. Прышчэпава ўласны досвед. Ён атрымаў нядрэнную для тых часоў адукацыю. Вучыўся ў царкоўнапрыходскай школе, скончыў земскую школу ў Чарэі (цяпер Чашніцкі раён Віцебскай вобласці), экстэрнам здаў экзамен на званне народнага настаўніка.

У 1915 г. тэрыторыя Беларусі стала зонай ваенных дзеянняў, а Віцебшчына — прыфрантавой тэрыторыяй. Вайна паўплывала на лёс Дзмітрыя Філімонавіча. Напрыканцы 1915 г. ён быў мабілізаваны ў царскую армію. У 1916 г. прайшоў паскораны курс Віленскага ваеннага вучылішча і, атрымаўшы чын прапаршчыка, быў адпраўлены ў запасны полк, а праз некаторы час на Заходні фронт камандзірам роты 698-га Шыргародскага палка. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі салдаты абралі яго камандзірам палка і старшынёю палкавога ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. Урэшце, калі разумець, што салдаты — учарашнія маладыя сяляне, улічыць харызму і адукацыю Д. Ф. Прышчэпава, то гэта акалічнасць не здзіўляе. Можна меркаваць, што разам з імі Д. Ф. Прышчэпаў прайшоў складаны шлях выбару паміж супрацьстаячымі бакамі, з пачатку 1918 г. Дзмітрый Філімонавіч — у Чырвонай арміі, камандаваў 2-м Смаленскім палком, які ахоўваў дэмаркацыйную лінію.

Узброенае супрацьстаянне адбывалася і па-за лініяй фронту. Сацыяльныя супярэчнасці пры наяўнасці не толькі зброі, але і былых салдат-сялян, у тым ліку дэзерціраў, стваралі спрыяльныя ўмовы для ўзнікнення ўзброеных фарміраванняў, што кіраваліся рознымі мэтамі — палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі, а найчасцей — уласнымі, эгаістычнымі. Аднак адна акалічнасць выяўлялася даволі выразна: яны не прыўносілі спакою ў жыццё вяскоўцаў, якія стаміліся ад вайны і імкнуліся адраджаць сваю гаспадарку. Крыніцы перыяду 1918—1921 гг. утрымліваюць супярэчлівую інфармацыю аб часе і яго людзях, у тым ліку Д. Ф. Прышчэпаве, што дало падставу гісторыкам сцвярджаць аб удзеле Дзмітрыя Філімонаві-

ча ў паўстанні сялян супраць харчовай развёрсткі. З вясны 1921 г. паступова фарміруюцца мірныя ўмовы для працы вяскоўцаў і самога Д. Ф. Прышчэпава. У 1922—1923 гг. ён працуе старшынёй Аршанскага павятовага выканкама, на пачатку 1924 г. пераводзіцца на пасаду намесніка старшыні Віцебскага губвыканкама, з'яўляецца членам Часовага Беларускага бюро ЦК РКП(б). 27 лютага 1924 г. на пасяджэнні СНК БССР Дзмітрый Філімонавіч Прышчэпаў быў зацверджаны членам калегіі Наркамзема БССР як загадчык Віцебскага губернскага зямельнага аддзела [71, л. 3].

У сакавіку 1924 г. Д. Ф. Прышчэпава выклікалі ў Мінск і прапанавалі пасаду намесніка народнага камісара земляробства [72, л. 14]. Менавіта падчас працы ў кіраўніцтве Наркамата земляробства выявіліся яго арганізатарскія здольнасці, уменне працаваць з людзьмі, бачыць і разумець іх запатрабаванні і памкненні. На гэты час старшынёй Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларусі з'яўляўся А. Р. Чарвякоў, а старшынёй Савета Народных Камісараў — І. А. Адамовіч. Напярэдадні (у сакавіку 1924 г.) Дзмітрый Філімонавіч разам з І. А. Адамовічам падпісаў акт пра далучэнне Віцебскай губерні да БССР. Афіцыйнае прызначэнне Д. Ф. Прышчэпава наркамам земляробства БССР адбываецца ў снежні 1924, адначасова ён узначаліў сельскагаспадарчую секцыю Інбелкульта.

Да Д. Ф. Прышчэпава Наркамат земляробства ўзначальвалі Аляксандр Антонавіч Андрэеў — член Часовага Урада Беларусі па справах земляробства (04.01.1919—1919), Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі (1919—19.09.1920), Адам Сямёнавіч Славінскі (19.09.1920—19.03.1924), Стэфан Лявонавіч Гельтман (19.03.1924—12.12.1924). З пералічаных толькі Усевалад Макаравіч сваім паходжаннем з вёскі. Аднак адзначым, што ўсе яны (за выключэннем А. А. Андрэева, аб кім ведаем няшмат) былі яркімі асобамі, мелі грунтоўную адукацыю: У. М. Ігнатоўскі закончыў Юр'еўскі ўніверсітэт, С. Л. Гельтман — Кракаўскі.

Наркам земляробства У. М. Ігнатоўскі ў 1920 г. выступаў на пасяджэнні Рабоча-Сялянскай Інспекцыі аб стане калектыўнай гаспадаркі ў Мінскай губерні [73]. У 1921 г. У. М. Ігнатоўскі прызначаецца наркамам асветы, яго пасаду займае А. С. Славінскі — палымяны рэвалюцыянер, які паходзіў з сям'і спадчыннага рабочага (сапраўднае прозвішча Качароўскі) і абмежаваўся чатырохкласным рамесным вучылішчам. На лёс А. С. Славінскага выпаў перыяд адраджэння разбуранай працяглай вайной сельскай гаспадаркі. Адраджэнне вёскі рухалася складана, сялянства захоўвала істотны недавер да палітыкі ўлады. Вайсковы вопыт А. С. Славінскага быў запатрабаваны ў барацьбе з узброенымі фарміраваннямі. Пры падтрымцы А. С. Славінскага 7 лістапада 1922 г. быў адкрыты Беларускі дзяржаўны інстытут сельскай і лясной гаспадаркі (таксама дзейнічаў Горацкі інстытут), які ў маі 1925 г. выпусціў першых аграномаў і лесаводаў. Перакананні А. С. Славінскага сталі адной з прычын таго, што палітыка «ваеннага камунізму» затрымалася ў Беларусі.

Наркам земляробства А. С. Славінскі адзначаў у сваім дакладзе на X канферэнцыі КП(б)Б (1921): «Ход рэвалюцыі не змяніў увогуле псіхікі сялянства. Рэвалюцыя пралетарская, рабочая была праведзена пад дыктатурай пралетарыяту.

На сялян гэта мела зваротны ўплыў, менавіта кожны з іх імкнуўся з маленькага ўласніка пераўтварыцца ў буйнога гаспадара... памешчыцкі клас аддаваў батраку жывы і мёртвы інвентар, каб ён захаваў яго, спадзеючыся вярнуцца дадому калі-небудзь. Псіхалагічна настрой батрака быў такі, што атрымаўшы каня ці карову, ён тым самым пераўтвараўся ў дробнага ўласніка... Гэтае пераўтварэнне зараз яшчэ больш паглыбілася...» [73, л. 175—177, 184]. Далей Славінскі супярэчыў сам сабе, сцвярджаючы, што беднякі і батракі імкнуцца ў камуны. Пазначыўшы гэта, Д. С. Чарнушэвіч заўважыў: «...батракі нават у пасёлкі не хочуць ісці, яны ўсё жадаюць хутар» [73, л. 198, 199]. Яго падтрымаў Аксючыц: «Мы маем уяўна насельніцтва, якое не ідзе ні ў калектывы, ні ў арцелі і г. д., нават калі і ствараюцца калектывы, то, на вялікі жаль, публіка ідзе туды далёка непажаданая — публіка хітрая, якая імкнецца нас падмануць» [73, л. 200]. Адам Славінскі меркаваў, што «селяніну неабходна даць адпор, бо ён адчувае толькі сілу, а кірунак яго жадання толькі адзін — узбагачэнне» [73, л. 219, 220]. Час патрабаваў новых падыходаў. «Па стане здароўя» Адам Сямёнавіч папрасіўся на іншую працу. Апошняе пасяджэнне Наркамзема пад сваім кіраўніцтвам ён правёў 19 сакавіка 1924 г. у прысутнасці прызначанага новага наркама С. Л. Гельтмана [74, с. 62].

Аб Стэфане Лявонавічу Гельтмане мы ведаем дзякуючы працы М. І. Іосько [75]. Ён акрэслівае дзейнасць С. Л. Гельтмана як дзеяча польскага сацыялістычнага руху. Стэфан Лявонавіч з'яўляўся адным з арганізатараў польскага сацыялістычнага аб'яднання (ПСА), старшынёй праўлення яго мінскай групы ў 1917—1918 гг., з 1919 па 1927 г. (з невялікім перапынкам) членам Польбюро ЦК РКП(б), з 1927 г. узначальваў польскі сектар Інстытута беларускай культуры. Разам з тым С. Л. Гельтман да сярэдзіны 1920-х гг. ужо меў вопыт кіравання сельскай гаспадаркай. У 1919 г. ён працаваў намеснікам наркама земляробства і лясной гаспадаркі Літоўска-Беларускай ССР, загадчыкам аддзела земляробства Мінскага губрэўкама, з'яўляўся аўтарам шэрагу публікацый па аграрным пытанні ў Беларусі («Нацыяналізацыі зямлі на Беларусі» і інш.), летам 1920 г. узначальваў зямельны аддзел Польрэўкама ў Беластоку [76, 77, 78, с. 504, 505; 79, л. 5, 12]. Урэшце менавіта дзейнасць С. Л. Гельтмана як наркама земляробства (1924—1925) папярэднічала працы на гэтай пасадзе Д. Ф. Прышчэпава. Можна заўважыць, Стэфан Лявонавіч толькі невялікі час працаваў без Дзмітрыя Філімонавіча (некаторыя дакументы за подпісам Д. Ф. Прышчэпава датаваны чэрвенем 1924 г.). Гэта дазваляе вылучыць гіпотэзу аб усвядомленасці такога кроку кіраўніцтва БССР. Прычыны можна бачыць як у рэалізацыі нацыянальнай палітыкі, імкненні аб'яднаць прадстаўнікоў розных рэгіёнаў Беларусі, так і ў асабістай пазіцыі С. Л. Гельтмана і Д. Ф. Прышчэпава. Не без уплыву Наркамзема ЛітБел (дзе С. Л. Гельтман працаваў намеснікам наркама) рэалізоўвалася ў 1919—1920 гг. на неакупаванай польскімі войскамі тэрыторыі палітыка насаджэння на вёсцы камун і саўгасаў.

Д. Ф. Прышчэпаў, наадварот, імкнуўся забяспечыць усе магчымасці для выбару сялянствам форм землекарыстання. У кастрычніку 1924 г. Д. Ф. Прышчэпаў (яшчэ намеснік наркама), адстойваючы неабходнасць паглыблення новай эканамічнай палітыкі на вёсцы, на з'ездзе ўпаўнаважаных сельскагаспадарчых

калектываў падкрэсліваў: «Вы бачылі развіццё нэпа ў горадзе, і што ж, хіба ад гэтага пацярпела наша палітыка, пацярпелі рабочыя? Вядома, не. І цяпер нам трэба даць магчымасць развівацца нэпу на вёсцы» [95, л. 152]. Аналізуючы дакументацыю Наркамзема, актыўнасць выступленняў і публікацый, можна сцвярджаць: у 1924 /25 гаспадарчым годзе рэалізоўвалася пазіцыя Д. Ф. Прышчэпава. 27 лістапада 1924 г. на пасяджэнні СНК БССР ён афіцыйна прызначаецца наркамам земляробства БССР [80, л. 31].Статус наркама земляробства БССР Д. Ф. Прышчэпава быў пацверджаны Прэзідыумам ЦВК 12 снежня 1924 г., а таксама на 1-й сесіі ЦВК 7-га склікання 9 мая 1925 г. [81, с. 2]. 28 лістапада, змяніўшы У. М. Ігнатоўскага, ён становіцца членам калегіі па землеўпарадкаванні працоўных яўрэяў пры Прэзідыуме ЦВК БССР [82, л. 13]. С. Л. Гельтман на тым жа пасяджэнні СНК 27 лістапада 1924 г прызначаецца намеснікам Старшыні СНК БССР, Старшынёй Эканамнарады БССР і Старшынёй Дзяржплана БССР [83, л. 31, 41]. 30 верасня 1925 С. Л. Гельтман займае яшчэ і пасаду рэктара Камуністычнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна, захоўваючы пасаду намесніка Старшыні СНК і Старшыні Эканамнарады БССР [84, л. 4, 8; 85]. Можна заўважыць, што Стэфан Лявонавіч засяродзіўся пераважна на працы рэктара і загадчыка кафедры эканомікі і палітыкі Камуністычнага ўніверсітэта ў Беларусі ў Мінску. Для разумення далейшага ходу падзей пазначым, што С. Л. Гельтман уваходзіў у склад таварыства гісторыкаў-марксістаў БССР, а ў 1930-я гг. працаваў у Наркаматах земляробства і зернесаўгасаў СССР.

Шырока вядомы заклік Д. Ф. Прышчэпава пераўтварыць Беларусь у другую Данію. Але ў большай ступені ён вылучаны супраць тых, хто гаварыў аб адсталасці аграрнага кірунку развіцця, маючы на ўвазе, што Вялікабрытанія гэтак жа залежыць ад Даніі, як Данія ад каралеўства. Дзмітрый Філімонавіч — дзяржаўная асоба, ён не мог не бачыць, што Беларусь у першую чаргу можа разлічваць на ўласныя сілы і рэсурсы. Бясспрэчны факт: індустрыялізацыя ў класічным сэнсе пачалася ў БССР толькі пасля Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Мадэрнізацыя эканомікі, па меркаванні наркама земляробства Д. Ф. Прышчэпава, павінна была пачынацца з вёскі. У якасці шляхоў такой мадэрнізацыі ён разумеў не толькі выкарыстанне трактарнай тэхнікі. Ва ўмовах спецыялізацыі сельскай гаспадаркі ў кірунку мяса-малочнай гаспадаркі, бульбаводства, тэхнічных культур гэта не вырашала праблемы. Поспех Д. Ф. Прышчэпаў бачыў у прымяненні новых дасягненняў навукі, перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, меліярацыі. Ён спадзяваўся на істотныя людскія рэсурсы вёскі і працавітасць беларускага сялянства, ствараючы для лепшых гаспадарнікаў лепшыя ўмовы. Разам з тым Д. Ф. Прышчэпаў заўважаў, што сялянства ўсё ж недастаткова рэагуе на новыя выклікі. Ён змагаўся за пашырэнне паўнамоцтваў БССР у справе вызначэння самастойнай крэдытнай, падатковай палітыкі для ўліку спецыфікі Беларусі. Але адначасова як селянін і разам з сялянамі ўпэўніваўся, што ва ўмовах тагачаснага СССР палепшаныя спосабы гаспадарання можна больш эфектыўна ўжываць у калектыўных гаспадарках. Калі адсутнічалі і тэхніка, і стымулы для павелічэння мяса-малочнага статка, Д. Ф. Прышчэпаў бачыў перспектыву ў інтэграцыі ка-

лектыўных гаспадарак з вакольнымі індывідуальнымі сялянскімі гаспадаркамі ў галіне насенняводства, племяннной жывёлагадоўлі, перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. У 1928 г. Д. Ф. Прышчэпаў у сваім артыкуле «Задачы рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў сёлетнюю пасеўкампанію» пісаў: «...і для кожнага рабочага і селяніна павінен зьяўляцца аксіомай той просты факт, што дробная індывідуальная сялянская гаспадарка як такая ня можа зьяўляцца сталай базай для развіцьця нашае сацыялістычнае індустрыі і ня будзе сталай падставай наогул для нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Ужо цяпер патрабуецца карэнная рэарганізацыя індывідуальнай сельскай гаспадаркі на новай тэхнічнай базе і ў новых формах. Такімі формамі зьяўляюцца калектывізацыя бядняцка-серадняцкіх індывідуальных гаспадарак і ўцягненьне іх у розныя віды кааперацыі, асабліва вытворчай. Сама індывідуальная сельская гаспадарка зьяўляецца ў сучасны момант прычынай, якая тармозіць палепшаньне ўсяе сельскай гаспадаркі» [86, с. 54]. Абвінавачванне кіраўніцтва Наркамзема БССР, і ў прыватнасці Д. Ф. Прышчэпава, у насаджэнні хутароў, у стрымліванні калгаснага будаўніцтва пазбаўлена пераканаўчых аргументаў (як, дарэчы, і адваротнае).

Да заслуг Д. Ф. Прышчэпава неабходна аднесці і ўдзел у распрацоўцы зямельных кодэксаў БССР 1924 і 1925 гг. У адрозненне ад РСФСР у цэнтральнай і заходняй частцы Беларусі абшчына ў яе класічнай форме з ураўняльнымі перадзеламі адсутнічала. У новым Зямельным кодэксе БССР 1924 г. сярод спосабаў землекарыстання абшчынны адсутнічаў увогуле. Наркамат земляробства мог устанаўліваць максімальныя і мінімальныя нормы для працоўных гаспадарак з улікам наяўнасці працоўнай сілы. У любы час кожны мог выйсці з грамады. У параўнанні з Зямельным кодэксам РСФСР беларускі кодэкс дазваляў арэнду толькі з выкарыстаннем працоўнай сілы гаспадаркі, але павялічваў тэрмін арэнды пры прымяненні шматпольных севазваротаў і палепшаных спосабаў апрацоўкі глебы. Узбуйненні БССР 1924 і 1926 гг. пазначылі неабходнасць вяртання традыцый землекарыстання, якія, па меркаванні Д. Ф. Прышчэпава, вызначыліся раней. У 1927 г. у газеце «Звязда» ён пісаў: «Калі мы ў нас правядзем абшчынны парадак землекарыстаньня, мы адразу прыдушым гаспадарчую ініцыятыву сялянства, пры якой цяпер досыць шпарка праходзіць перабудова сельскай гаспадаркі... Прыклад некаторых губерняў РСФСР нам сведчыць аб тым, што яны доўгі час прасядзелі на абшчыне і, акрамя перадзелаў зямлі, нічому новаму не навучыліся... Дробнабуржуазную вёску і належны настрой сялянства мы ліквідуем не абшчынным перадзелам зямель, а моцным развіццём сельскай гаспадаркі, яе пагалоўным вытворчым каапераваннем і індустрыялізацыяй» [87].

Крызісныя з’явы ў сельскагаспадарчай вытворчасці другой паловы 1920-х гг., перш за ўсё ў галіне нарыхтоўкі збожжа, далі падставу аграрнікам-марксістам, якія групаваліся вакол Л. М. Крыцмана, паставіць пытанне аб здольнасці «буржуазнай» прафесуры даць адказ на актуальныя пытанні сучаснасці. У 1928 г. пачаліся аргвывады — А. В. Чаянаў пакінуў пасаду дырэктара заснаванага ім Інстытута сельскагаспадарчай эканоміі, а сам інстытут быў пераўтвораны ў НДІ буйной сацыялістычнай гаспадаркі, дзе пэўны час А. В. Чаянаў працягваў працаваць. Ён

імкнуўся і гэтую практыку паставіць на навуковую аснову. Але падрыхтаваная А. В. Чаянавым манаграфія «Арганізацыя буйной гаспадаркі эпохі сацыяльнай рэканструкцыі земляробства» так і не ўбачыла свет. Пазначаныя працэсы закранулі і беларускіх савецкіх дзеячаў, у прыватнасці Д. Ф. Прышчэпава. XII з'езд КП(б)Б, які адбыўся 5—16 лютага 1929 г., паставіў задачу ўзбуйнення калгасаў, давесці памеры іх пасяўных плошчаў да канца пяцігодкі да 12 % ад усёй пасяўной плошчы рэспублікі [88, с. 105]. На з'ездзе прагучалі чарговыя абвінавачванні Д. Ф. Прышчэпава ў правым ухіле. Рашэннем Прэзідыума ЦВК БССР 6 сакавіка 1929 г. Дзмітрый Філімонавіч вызваляецца ад абавязкаў наркама земляробства БССР [89, л. 135]. Пасаду наркама земляробства праз месяц (6 красавіка 1929 г.) займае П. М. Рачыцкі [90, с. 58] .

Новы наркам земляробства Піліп Мікалаевіч Рачыцкі (1929—1933) у дакладзе на 2-й сесіі ЦВК БССР 9-га склікання па праблемах калектывізацыі тлумачыў слабое вытворчае каапераванне ў рэспубліцы няправільнай палітыкай папярэдняга кіраўніцтва Наркамата земляробства на чале з Д. Ф. Прышчэпавым, якое не садзейнічала калгаснаму будаўніцтву, а замаруджвала яго, аддаючы перавагу хутарам, дробным пасёлкам і нормам землекарыстання [91, с. 230] Па сведчанні Сымона Кандыбовіча, такая пазіцыя была выклікана хутчэй імкненнем захаваць апарат Наркамзема ад рэпрэсій, чым імкненнем зрабіць кар'еру [92, с. 112]. З мая 1929 г. Д. Ф. Прышчэпаў займае пасаду намесніка старшыні Дзяржаўнай планавай камісіі, з'яўляецца членам Эканамнарады БССР, з мая да верасня 1929 г. — намеснік старшыні Дзяржаўнай планавай камісіі БССР. 14 верасня 1929 г. Дзмітрый Філімонавіч вызваляецца ад абавязкаў намесніка старшыні Дзяржаўнай планавай камісіі і члена Эканамнарады БССР [93, п. 141], а літаральна праз месяц накіроўваецца на пасаду загадчыка Палескай даследчай станцыі. У верасні 1929 г. Дзмітрый Філімонавіч быў вызвалены з партыі. Згодна з ацэнкай бюро ЦК КП(б)Б ён праводзіў варожую справе сацыялізму палітыку («прышчэпаўшчына»), якая выяўлялася ў патуранні кулацтву, прымусовай хутарызацыі і падпарадкаванні сельскагаспадарчай каапераціі і сельгаскрэдыту інтарэсам заможнага сялянства.

Зняцце з пасады Д. Ф. Прышчэпава дазволіла пазначыць яго вінаватым ва ўсіх недахопах, звязаных з калгасным будаўніцтвам. Увосень 1929 г. аддзел ЦК КП(б)Б па рабоце ў вёсцы падрыхтаваў даклад аб кіраўніцтве партыйных арганізацый калгасным будаўніцтвам БССР [94, л. 140—157]. У ім прысутнічалі прыклады дбайных адносін з боку кіраўніцтва партыі да гэтага пытання і імкненне паказаць, што на працягу апошніх гадоў акрэслілася тэндэнцыя росту калектыўных гаспадарак і іх гаспадарчага ўмацавання. Наяўнасць у калектыўных гаспадарках заможных сялян пазначалася як недахоп, які неабходна тэрмінова выправіць.

З кастрычніка 1929 г. Д. Ф. Прышчэпаў загадваў у Скрыгалаве (цяпер у Мазырскім раёне Гомельскай вобласці) Палескай даследчай станцыяй [95, л. 170]. 19 ліпеня 1930 г. яго арыштавалі па справе «Саюза вызвалення Беларусі». Д. Ф. Прышчэпаў быў асуджаны калегіяй АДПУ 18 сакавіка 1931 г. за «дапамогу кіраўніцтву "СВБ" у правядзенні контррэвалюцыйных мерапрыемстваў» на

10 гадоў. Адбываў пакаранне на будаўніцтве Беламорска-Балтыйскага канала, потым этапаваны ў Паўночна-Усходні канцлагер НКУС Далёкаўсходняга краю. 5 красавіка 1937 г. быў арыштаваны органамі НКУС СССР С. Л. Гельтман. Д. Ф. Прышчэпаў, наадварот, 27 чэрвеня 1937 г. вызвалены. Ці ёсць сувязь паміж гэтымі падзеямі — даследчыкі яшчэ толькі спрабуюць вызначыць. Калі С. Л. Гельтман знаходзіўся пад следствам, 13 жніўня 1937 г. Д. Ф. Прышчэпаў зноў арыштаваны ў Магадане. Неўзабаве С. Л. Гельтман быў асуджаны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР і расстраляны ў Маскве 20 верасня 1937 г. Д. Ф. Прышчэпаў у студзені 1939 г. этапіраваны ў Мінск і 20 лістапада 1939 г. Ваенным Трыбуналам Беларускай ваеннай акругі прыгавораны да выключнай меры пакарання. Згодна з дакументамі ён памёр у турэмнай бальніцы 31 студзеня 1940 г., па заключэнні ўрачоў, ад паралiча сэрца (хварэў на сухоты). Па першым прыгаворы Д. Ф. Прышчэпаў рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 14 чэрвеня 1988 г., па другім — у 1956 г. Так сталася, што 1937 год стаў трагічным для наркамаў земляробства БССР 1920—30 гг. Акрамя Прышчэпава былі прыгавораны да смяротнага пакарання Піліп Мікалаевіч Рачыцкі, Казімір Францавіч Бенек, Мікалай Федасеевіч Нізоўцаў, Васіль Фёдаравіч Шышкоў (расстраляны ў 1938 г.).

Аўтары, якія імкнуліся абвінаваціць Д. Ф. Прышчэпава, пісалі аб ім як аб «беларускім Сталыпіне», ці «чырвоным Сталыпіне». Дзмітрый Філімонавіч сапраўды разглядаў захаванне абшчынных адносін на вёсцы як перажытак часу, садзейнічаў землеўпарадкаванню. Ён не ідэалізаваў хутарскую форму, як і калектыўнае гаспадаранне. Д. Ф. Прышчэпавым, перакананым у векавой устойлівасці індывідуальнай гаспадаркі (як і многімі іншымі тэарэтыкамі і практыкамі), былі зроблены пэўныя памылкі. Аднак Дзмітрый Філімонавіч быў здольны іх заўважаць і па-сялянску грунтоўна, няспешна выпраўляць. Усёй сваёй дзейнасцю Д. Ф. Прышчэпаў вызначаў імкненне ісці наперад у развіцці сваёй дзяржаўнасці, нацыянальнай годнасці, не ўпадаючы ў крайнасці, але ўсё ж дамагаючыся неабходнага выніку. Яго публікацыі і выступленні, а таксама пэўныя справы паказваюць імкненне ахапіць усе бакі развіцця вёскі, садзейнічаць яе мадэрнізацыі з улікам беларускай спецыфікі [86, 87, 96—105].

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Носова Н. П.* Становление и развитие системы государственного управления сельским хозяйством Советской России (1917—1929 гг.) : автореф. дис. ... д-ра ист. наук : 07.00.02. М., 1992. 44 с.

2. *Ковалева Э. В.* Формирование и деятельность органов управления народным хозяйством Советского государства в условиях нэпа (1921—1929 гг.) : дис. д-ра ист. наук : 07.00.02. М., 2006.

3. *Орлов И. Б.* Нэп: государственное управление и социально-экономические проблемы, 1921—1928 : дис. д-ра ист. наук : 07.00.02. М., 2000. 365 с.

4. *Чернышова А. В.* Механизм государственного управления деревней в 1920-е гг. : дис. д-ра ист. наук : 07.00.02. М., 2005. 452 с.

5. *Носова Н. П.* Становление и развитие системы государственного управления сельским хозяйством Советской России, 1917—1929 гг. : дис. д-ра ист. наук : 07.00.02. М., 1992. 589 с.

6. *Макаров В. Б.* Советское государственное управление в первое десятилетие: эволюция системы. Н. Новгород : ВВАГС, 2002. 272 с.

7. Гісторыя і сучасная арганізацыя дзяржаўных устаноў Беларусі : дапаможнік / С. Л. Лугаўцова [і інш.] ; пад агульн. рэд. С. М. Ходзіна. Мінск : БДУ, 2013. 275 с.

8. Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства Белорусской Социалистической Советской Республики.1923. № 91. Ст. 903.

9. Описание административного деления Наркомзема с кратким изложением сущности и объема работ всех отделов отделений // РДАЭ. Ф. 478. Воп. 1. Спр. 91.

10. Народный комиссариат земледелия РСФСР // РДАЭ. Ф. 478. Воп. 1. Спр. 93.

11. Материалы I съезда земотделов и коммун Северной области (основные положения, резолюции, правила, объяснительная записка к ним), октябрь 1918 г. // РДАЭ. Ф. 478. Воп 1. Спр. 23.

12. Положение о Народном Комиссариате Земледелия // РДАЭ. Ф. 130. Воп. 5. Спр. 610. М., 1921.

13. СЗ БССР. 1928. № 25.

14. Социалистическое строительство. 1930. № 7.

15. Органы государственного управления Белорусской ССР (1919—1967). М., 1968.

16. Народный комиссариат земледелия РСФСР // РДАЭ. Ф. 478. Воп. 22. Спр. 79.

17. Бюллетень 1-го Всесоюзного совещания с.-х. коллективов (коммун, артелей и товариществ по общественной обработке земли). М., 1925. № 1. № 4.

18. *Ивницкий Н. А.* От бюро коммун до Колхозцентра // Октябрь и сов. крестьянство.

19. Положение и инструкции ВЦИК о выборах волостных и сельских советов, копия Декрета Совнаркома РСФСР «О натуральном налоге на хлеб, картофель и масленичные семена», статистические сведения о состоянии и деятельности коллективных хозяйств, их описание и списки // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 618.

20. Устав, списки членов, инвентаря коммун «Путь к свету» и артели «Козловщина» Минского уезда // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 112.

21. Доклады инструктора отдела об обследовании коллективных хозяйств Мозырского уезда с приложением актов // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 626.

22. Постановления и декреты Совнаркома, ВСНХ и Наркомзема РСФСР, ЦИК и Совнаркома БССР об учреждении горземотделов в уездных городах, охоте, землепользовании и по другим вопросам, резолюции 3-й сессии ЦИК БССР 3-го созыва по докладам о деятельности БГУ и Наркомпрода БССР; протоколы и выписки из протоколов заседаний Президиума ЦК КП(б)Б, ЦИК, Совнаркома, ЭКОСО, коллегии Наркомзема БССР, совещаний представителей коллективных хозяйств и сельхозкооперации БССР, уездных управляющих нархозами и их заместителей, Минских 3-й губернской и 4-й уездной профсоюзных конференций рабземлеса, описания хозяйств, находящихся в ведении Наркомзема БССР, бюллетени сельскохозяйственных цен РСФСР и БССР // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 315.

23. Земельное управление исполнительного комитета Минского уездного Совета // ДАМВ. Ф. 199. Воп. 1. Спр. 238.

24. Земельное управление исполнительного комитета Червенского уездного Совета // ДАМВ. Ф. 200. Воп. 1. Спр. 307.

25. Протоколы заседаний I, II и III Всебелорусских съездов уполномоченных сельскохозяйственных товариществ и промысловой кооперации, сельскохозяйственных кооперативных совещаний при Центробелсоюзе, материалы к протоколам // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 51.

26. План проведения в жизнь решений Пленума ЦК КП(б)Б от октября 1926 г. по выполнению мероприятий пятилетнего плана развития сельского хозяйства БССР, постановление ЦИК и Совнаркома БССР о распределении территорий Борисовского, Калининского, Речицкого и Слуцкого округов между другими округами БССР и о порядке передачи колхозам промышленных предприятий, протоколы заседаний ЦИК, Совнаркома, ЭКОСО и Госплана БССР, Комиссии по землеустройству трудящихся евреев при ЦИК БССР и Комиссии по выработке проекта структуры аппарата Наркомзема БССР, положения об участковых агрономах в районах и о секциях колхозов, докладные записки начальника Управления землеустройства и мелиорации о мероприятиях по развитию колхозов БССР, о структуре аппарата Управления и сведения о госземимуществах БССР // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 2890.

27. К вопросу об организации союза колхозов // Коопэрацыйнае жыцьцё. 1926. № 9 (27).

28. Всероссийский союз сельскохозяйственной кооперации по снабжению крестьянского хозяйства средствами производства (Сельскосоюз) // РДАЭ. Ф. 4106. Воп. 14. Спр. 39.

29. Протоколы постановлений, положений и выписки из протоколов заседаний ЦИК, ЭКОСО, НК РКИ и Наркомзема БССР и Комиссии по рассмотрению предложений НК РКИ по материалам обследования колхозов республики // НАРБ. Ф. 18. Воп. 2. Спр. 116.

30. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов (окрколхозсоюз) // ДАВВ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 9.

31. Белсельсаюз : справаздача за 1927—1928 апэрацыйны год (7-мы год дзейнасьці). Менск, 1929. 116 с.

32. Устав и проекты уставов кустового производственного объединения колхозов, производственного объединения сельскохозяйственных коллективов для совместного ведения полеводства, кооперативной фабрики сельскохозяйственного производства и уставы других сельскохозяйственных объединений // РДАЭ. Ф. 7446. Воп. 15. Спр. 17.

33. *Левченок Ф.* Первые итоги (Из материалов по обследованию колхозов) // Бальшавік Беларусі. 1928. № 10.

34. Переписка с ЭКОСО, Наркомземом, Наркомторгом БССР, Белсельбанком и другими о вовлечении женщин-крестьянок в работу управленческих органов сельскохозяйственной кооперации БССР, мерах по развитию и усилению коллективизации и производственному кооперированию мелких крестьянских хозяйств, развитию птицеводства в БССР и другим вопросам // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 709.

35. 2-гі Усебеларускі зьезд калгасаў (кастрычнік 1928 г.). Менск, 1928. 72 с.

36. Устав Белколхозсоюза, протоколы заседаний правления Белколхозсоюза, Комиссии по коллективизации при Белсельсоюзе, доклады, тезисы докладов о состоянии колхозов, развитии животноводства и молочного хозяйства в них, мерах по повышению урожайности и другим вопросам колхозного строительства // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 854.

37. Стэнаграфічная справаздача XII зьезду КП(б) (5—14 лютага 1929 году). Мінск, 1929.

38. Проект постановления СНК БССР от 1928 г. о перспективах развития и организационного обслуживания колхозов, схема организационной структуры системы сельскохозяйственной кооперации БССР, сведения Белсельсоюза о завозе сельскохозяйственных машин по БССР к весенней посевной кампании 1928—1929 гг., заготовке семян и удобрений на 15 февраля 1929 г. // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 825.

39. Докладные записки, информации об итогах обследования состояния сельскохозяйственных артелей им. Червякова Мозырского округа и «Векер» Полоцкого округа, выделении мелиоративных фондов для землеустроительства трудящихся евреев БССР // НАРБ. Ф. 11. Воп. 1. Спр. 157.

40. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов (окрколхозсоюз) // ДАВВ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 35.

41. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов (окрколхозсоюз) // ДАВВ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 18.

42. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов (окрколхозсоюз) // ДАВВ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 19.

43. Протоколы заседаний правления Минской окружной секции колхозов и Минского окрколхозсоюза // НАРБ. Ф. 338. Воп. 2. Спр. 1а.

44. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов (окрколхозсоюз) // ДАВВ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 11.

45. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов (окрколхозсоюз) // ДАВВ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 14.

46. Земельный отдел исполнительного комитета Витебского окружного Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов // ДАВВ. Ф. 71. Воп. 1. Спр. 653.

47. Гомельский окружной союз сельскохозяйственных коллективов, машинных, поселковых и мелиоративных товариществ (Гомколхозсоюз) // ДАГВ. Ф. 138. Воп. 1. Спр. 13.

48. Циркуляры ЦК КП(б)Б, докладные записки ЦК КП(б)Б в ЦК ВКП(б) о необходимости признания БССР республикой сплошной коллективизации, разрешение на дополнительное выселение из Белоруссии бывших помещиков и крупных землевладельцев и др. Описи секретных документов, возвращаемых из ЦК КП(б)Б в ЦК ВКП(б) [структурные подразделения] ГПУ БССР и другие после их использования. 30 января 1929 г. – 26 мая 1930 г., на 276 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4702.

49. Протоколы заседаний Бюро ЦК КП(б) Белоруссии и материалы к ним, № 35—45. 27 сент. — 23 нояб., на 372 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4328
50. Доклады о состоянии еврейских колхозов Витебского округа и резолюции Бюро Витебского окружкома КП(б)Б по докладам // НАРБ. Ф. 338. Воп. 1. Спр. 1.
51. Обзор крестьянских писем о политическом настроении, присланных в редакцию «Крестьянской газеты». 7—20 апреля 1930 г. // ДАРФ. Ф. 5446. Воп. 55. Спр. 1975.
52. Докладные записки уполномоченных ЦК, секретарей райкомов КП(б)Б и спецсводки ГПУ БССР об итогах проверки фактов распада и выхода из колхозов, чистки колхозов от классово чуждых элементов, ходе весеннего сева по районам БССР. 4 марта — 17 сент. 1932 г., на 151 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 6302.
53. Пратакол № 2 пасяджэння Бюро Менскага Акруговага камітэту КП(б)Б ад 7/VI—30 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 6. Спр. 243.
54. Протоколы заседаний секретариата ЦК КП(б)Б, документы к ним. 14 февр. — 25 марта 1931 г., на 364 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5118.
55. Белсельсаюз: справаздача за 1926/27 апэрацыйны год (6-ты год дзейнасці). Менск, 1928. 93 с.
56. Материалы финансирования колхозного строительства в БССР (постановления, инструкции, положения, контрольные цифры, планы, сметы, ведомости) // НАРБ. Ф. 338. Воп. 1. Спр. 1а.
57. Акты обследования состояния еврейских сельскохозяйственных артелей Бобруйского, Борисовского и Полоцкого округов // НАРБ. Ф. 11. Воп. 2. Спр. 8.
58. *Биценко А. А.* Колхозы СССР // Кооперация СССР за 10 лет. М., 1928.
59. *Симхович А., Чиж М.* Сельскохозяйственные коллективы БССР (колхозы, коммуны, артели и товарищества по общественной обработке земли) // Сов. стр-во. 1927. № 6.
60. Постановление, распоряжение и протоколы заседаний СНК БССР и ЭКОСО, докладная записка Президиума Минского окрисполкома о проведении контрактации семенных культур в округе в 1927—1928 гг. и переписка с Наркомторгом БССР и Белсельсоюзом о снабжении Белоруссии сельскохозяйственными машинами, об организации птицеводческих хозяйств в колхозах и совхозах республики и др. // НАРБ. Ф. 18. Воп. 3. Спр. 21.
61. Материалы об организации курсов по подготовке специалистов сельского хозяйства (положения, протоколы, учебные планы, сметы, переписка) // НАРБ. Ф. 338. Воп. 1. Спр. 2.
62. Белорусский центральный союз сельскохозяйственных коллективов // НАРБ. Ф. 338. Воп. 2. Спр. 14.
63. Постановления СНК и правления Белколхозцентра, инструкция Белколхозцентра от 26 декабря 1930 г. о порядке проведения отчетно-перевыборной кампании в колхозах, переписка с райколхозсоюзами по этому вопросу // НАРБ. Ф. 338. Воп. 2. Спр. 6.
64. Протоколы заседаний коллегии Наркомпроса БССР // НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 1843.
65. Переписка с Наркомпросом, Наркомфином БССР и окрисполкомами об организации научно-исследовательского болотного института и химико-технологического факультета БГУ, геофизической службы БССР, об отпуске средств на проведение курсов, строительство и ремонт школ, предоставлении помещений культурно-просветительным учреждениям и улучшении материального положения студентов // НАРБ. Ф. 7. Воп. 1. Спр. 772.
66. Пастанова ЦК КП(б)Б аб разгортваньні агітацыі і масавай работы па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Зацверджана Бюро ЦК КП(б)Б, пратакол № 35 ад 11 лютага 1931 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 3. Спр. 41. Т. 2.
67. Вывады праведзенага агляду становішча і ўмоў працы рабочых 25-тысячнікаў, пасланых у вёску на калгасную работу. Пастанова бюро, пратакол № 5 ад 27/ 6-30 г. «Аб далейшай рабоце з “25-тысячнікамі”» // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4821. Л. 51—56.
68. Спецсводка № 2 об отливе и развале отдельных колхозов в Логойском районе Б.С.С.Р. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5621. Л. 321—325.
69. Пратакол пасяджэння Бюро ЦК КП(б)Б ад 26 мая 1932 г. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5624.
70. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. Документы и материалы. М. : РОССПЭН. 204. Т. 5 : 1937—1939. Кн. 1 : 1937. С. 528—534.
71. Протоколы № 4, 5, 6 заседания СНК БССР от 27 февраля, 1 и 24 марта 1924 г. и приложения к ним // НАРБ. Ф. 7. Воп. 1. Спр. 16.
72. Постановления, положения и инструкции ЦИК и СНК БССР, протоколы и выписки из протоколов заседаний СНК БССР // НАРБ. Ф. 265. Воп. 1. Спр. 1396.

73. Стенограмма X конференции (V съезд КП(б)Б Белоруссии. 15 октября 1921 г. – 30 октября 1921 г.) на 334 л. // НАРБ. Ф. 4. Воп. 1. Спр. 417.

74. *Досин М. И., Селиванов П. А.* А. С. Славинский: страницы биографии. Минск : Беларусь, 1989. 80 с.

75. *Иосько М. И.* К. Маркс, Ф. Энгельс и революционная Белоруссия. 2-е изд. Минск, 1985.

76. *Heltman S.* Chlopskie paractwo czy gospodarka spoleczna. Sprawa rolna podczas rewolucij. Minsk, 1920.

77. *Heltman S.* Nacjonalizacija ziemi na Bialej Rusi. M., Госиздат, 1921. 62 с.

78. *Heltman S.* Robotnik polski w rewolucji pazdziernikowej na Bialorusi. Minsk, 1927.

79. Выписки из протоколов заседаний Военревкома БССР, докладная записка об организации хозяйственного строительства в Литве и Белоруссии, переписка с ЦК КП(б)Б Литвы и Белоруссии о подборе кадров // НАРБ. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 10.

80. Протоколы № 48 и 49 заседаний СНК БССР от 20 и 27 ноября 1924 г., приложения к ним // НАРБ. Ф. 7. Воп. 1. Спр. 54.

81. Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства Белорусской Социалистической Советской Республики. 1925. № 22.

82. Выписки из протоколов заседаний Президиума ЦИК БССР, протоколы распорядительных заседаний СНК БССР // НАРБ. Ф. 11. Воп. 1. Спр. 1.

83. Протоколы № 48 и 49 заседаний СНК БССР от 20 и 27 ноября 1924 г., приложения к ним // НАРБ. Ф. 7. Воп. 1. Спр. 54.

84. Протокол № 7 заседания СНК БССР от 17 июня 1925 г. и приложение к нему // НАРБ. Ф. 7. Воп. 1. Спр. 154.

85. Советская Белоруссия. 1925. 20 октября. № 223/1522.

86. *Прышчэпаў Зьм.* Задачы рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў сёлетнюю пасеўкампанію // Савецкае будаўніцтва. 1928. № 3—4.

87. *Прышчэпаў Зьм.* Зямельная палітыка на далучанай тэрыторыі і нашы задачы // Звязда. 1927. № 170—171.

88. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и Пленумов ЦК. Минск : Беларусь, 1984. Т. 2 : 1928—1932.

89. Планы снабжения сельскохозяйственной кооперации машинами, инвентарем, семенами, удобрениями на 1926—1927 гг., сведения Белсельсоюза о выполнении плана снабжения на 1 мая 1926 г. // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 692.

90. Сборник законов БССР. 1929. Адд. 3. П. 58.

91. *Бусько В. Н.* Экономическая наука Беларуси в 30-е годы XX в. Минск, 2005. 298 с.

92. *Кандыбовіч С.* Разгром нацыянальнага руху ў Беларусі. Мінск : БГА, 2000.

93. Сборник законов БССР. 1929. Адд. 2.20. П. 141.

94. Даклад аб кіраўніцтве партыйных арганізацый калгасным будаўніцтвам БССР. Т. 3 // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4328. Л. 140—157.

95. Приказы Наркомзема БССР // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 3709.

96. Сельское хозяйство Белорусской ССР и мероприятия по его восстановлению / И. Кисляков [и др.] ; под ред. Д. Прищепова. Минск : НКЗБ, 1925. 77 с.

97. *Прышчэпаў Зм.* Аб Зямельным кодэксе БССР // Звязда. 1924. № 164.

98. *Прищепов Д.* Крестьянка в сельском хозяйстве. Минск. 1925. 20 с.

99. *Прышчэпаў Зм.* Сельская гаспадарка і сялянка. Мінск : Белдзяржвыд., 1927. 83 с.

100. *Прышчэпаў Зм.* Аб НДІ // Сел. і ляс. гасп-ка. Мінск, 1927. Кн. 1.

101. Беларускі навукова-даследчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі імя У. І. Леніна (Мінск). Першы год працы, 1927 / Беларус. навук.-даслед. ін-т сел. і ляс. гасп-кі імя У. І. Леніна пры СНК БССР ; склад. : Зм. Прышчэпаў [і інш.]. Мінск, 1927.

102. *Прищепов Д.* Мероприятия по восстановлению сельского хозяйства Белоруссии // Вперед. 1924. № 2.

103. *Прышчэпаў Зьм.* За калектывізацыю, за ўздым ураджайнасці // Сел. і ляс. гасп-ка. Мінск, 1928. № 5—6.

104. *Прышчэпаў Зьм.* Аб НДІ // Сел. і ляс. гасп-ка. Мінск, 1927. Кн. 1.

105. *Прышчэпаў Зьм.* Дыферэнцыяцыя беларускай вёскі // Большевик Белоруссии. 1927. № 11.

## 2.3. КААПЕРАЦЫЯ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ: ФОРМЫ І ДЫНАМІКА

Тэрмін «кааперацыя» (ад лац. *cooperatio* — супрацоўніцтва) мае некалькі значэнняў. Гэта форма арганізацыі працы, пры якой пэўная колькасць людзей сумесна ўдзельнічае ў адных ці розных, але звязаных паміж сабой працэсах вытворчасці. Пад кааперацыяй разумеюць і сукупнасць арганізацыйна аформленых самадзейных добраахвотных аб'яднанняў, якія маюць на мэце сумесную гаспадарчую дзейнасць ці яе абслугоўванне. Яе сродкі складаюцца з паявых і членскіх узносаў, прыбытку ад гаспадарчай дзейнасці [1—3, 4, с. 212—248]. Марксісты разглядалі кааперацыю як пераходны этап да поўнай камуністычнай вытворчасці, народнікі ў Расіі (пазней эсэры) — як магчымасць накіраваць развіццё вёскі па некапіталістычным шляху. Бальшавікі да пачатку 1920-х гг. не ўяўлялі будучыні краіны без планавай вытворчасці і планавага размеркавання прадуктаў на аснове аб'яднання насельніцтва ў спажывецкія вытворчыя камуны. Практыка жыцця і тэарэтычныя распрацоўкі прыхільнікаў шматстайнасці форм кааперацыі (А. Чаянаў, М. Макараў і інш.) садзейнічалі перагляду У. Леніным сваіх поглядаў на яе.

Кааперацыя ў Расійскай імперыі мела свае карані ў тоўшчы народнага жыцця. Але шмат хто з прадстаўнікоў інтэлігенцыі імкнуўся надаць ёй ідэйна-палітычны характар і (як у абшчыне) убачыць у кааперацыі альтэрнатыву капіталізму. Такога кшталту ідэйнасць (што і пазначае карэйскі даследчык Кім Чан Чжын) з'яўлялася не характэрнай для заходнееўрапейскай кааперацыі як больш прагматычнай і камерцыялізаванай [5, с. 249—257]. Для многіх сацыялістаў таго часу не падлягала сумненню, што зямля не можа знаходзіцца ў прыватнай уласнасці (у праграмах і дзейнасці беларускіх партый такое ўяўленне прысутнічае таксама). «Раздрабненне буйной памешчыцкай гаспадаркі і перадача яе ў рукі многіх дробных гаспадароў абяцае перш за ўсё знішчыць буйную сельскагаспадарчую вытворчасць і пераўтварыць яе ў дробную», — адзначае Міхаіл Туган-Бараноўскі. Канстатуючы, што ў сельскай галіне перавагі буйной гаспадаркі менш значныя, чым у прамысловасці, ён прыводзіў лічбы, згодна з якімі перавага памешчыцкай гаспадаркі па ўраджайнасці параўнальна з сялянскай на працягу часу не толькі не памяншалася, а, наадварот, павялічвалася: за сорак гадоў сялянскія ўраджаі ўзраслі на 48 %, а памешчыцкія — на 64 %. На пачатку XX ст. роля памешчыцкіх гаспадарак у вытворчасці хлеба скарацілася (да 20 %.) [8]. Аднак шэраг даследчыкаў звяртае ўвагу на тое, што значны прырост таварнай часткі вытворчасці сялянскіх гаспадарак быў дасягнуты за кошт прымусовага фактару, паколькі сяляне прадавалі хлеб не дзеля атрымання прыбытку, а дзеля выплаты падаткаў і вяртання пазыкі.

Знішчэнне буйной сельскагаспадарчай вытворчасці стварала ў выніку пагрозу зніжэння вытворчасці сельскай гаспадаркі. «Да гэтага часу горад карміўся не сялянскім, а памешчыцкім хлебам, нягледзячы на тое, што памешчыцкія пасевы складалі толькі адну дзясятую ўсёй плошчы, якая заворваецца ў Расіі, — пісаў М. Туган-Бараноўскі. — Зямельная рэформа ні ў якім выпадку не можа і не па-

вінна абмежавацца толькі гэтым (падзелам зямлі. — *Х. С.*). Падзел зямлі паміж працоўнымі землеўласнікамі для таго, каб не прывесці Расію да эканамічнай катастрофы, непазбежна патрабуе істотнага дапаўнення ў выглядзе сістэматычна праводзімых мерапрыемстваў, якія даюць магчымасць новым зямельным уладальнікам весці на былой памешчыцкай зямлі не менш вытворчую гаспадарку, чым вялі памешчыкі. На першым плане сярод гэтых мерапрыемстваў павінны стаяць меры па развіцці сялянскай кааперацыі» [7, с. 332, 333].

Кніга М. Туган-Бараноўскага была запатрабавана У. І. Леніным на пачатку 1920-х гг., калі кіраўніцтва бальшавікоў шукала выйсце з тупіка «ваеннага камунізму», адмаўляючыся ад ідэі непасрэднай калектывізацыі. Неабходна было знайсці такія формы арганізацыі сельскай гаспадаркі, якія стымулявалі б ініцыятыву сялян, але адначасова накіроўвалі б развіццё ў кірунку буйной гаспадаркі пры захаванні ідэй калектывізму. Новыя ўмовы акрэслілі новае прачытанне ідэй кааператараў [9, с. 173—196]. У прыватнасці, У. І. Ленін пісаў, што «не кааперацыю трэба прыстасоўваць да нэпа, а нэп да кааперацыі» [10, с. 195]. IX Усерасійскім з'ездам Саветаў (у Пастанове ад 28 снежня 1921 г. «Аб сельскагаспадарчай кааперацыі») падкрэслівалася, што «савецкая ўлада пры ажыццяўленні новай эканамічнай палітыкі рэалізуе стварэнне і развіццё кааперацыі як адзін з асноўных момантаў сваёй сельскагаспадарчай палітыкі». Камуны і арцелі акрэсліваліся як істотная, але не галоўная і адзіная форма кааперацыі [11, с. 288].

Сярод бальшавіцкіх кіраўнікоў праблема кааперацыі найбольш грунтоўна разгледжана ў працах М. І. Бухарына. Гістарычныя асаблівасці і спецыфіка развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці ў Беларусі прадвызначылі тэарэтычныя распрацоўкі Р. А. Бонч-Асмалоўскага, Г. І. Гарэцкага, І. А. Кіслякова і інш. (Беларусь — «Чырвоная Данія», пераважнае развіццё кааператываў з невысокай ступенню абагульнення маёмасці). Практычнае ажыццяўленне яны знайшлі ў дзейнасці Народнага камісарыята земляробства БССР, які ў 1925—1928 гг. узначальваў Д. Ф. Прышчэпаў. Погляды Д. Ф. Прышчэпава на кааперацыю характарызуе яго выступленне на 2-й сесіі ЦВК Беларусі. Неабходнасць пашырэння справы кааперацыі ён акцэнтаваў імкненнем да больш высокай культуры гаспадарання і павышэння таварнасці, якая заставалася ніжэйшай, чым у дарэвалюцыйны час. Развіццё кааперацыі ў Беларусі, па яго меркаванні, павінна было пачынацца з прасцейшых форм, найперш з крэдытнай сферы. Але яны мелі нязначныя ўласныя капіталы і разлічвалі на падтрымку дзяржавы, накіроўваючы капітал на аперацыі па скупцы і збыце, а не ў сферу вытворчасці. Вельмі слаба прыцягваліся зберажэнні сялянства, на аснове якіх і павінна была трымацца крэдытная справа. Кааперацыя ў 1922—1924 гг., па сведчанні Д. Ф. Прышчэпава, хутка ўзрастала (за 1922/23 гаспадарчы год — на 14 %, за 6 месяцаў 1924 г. — на 22 %). Аднак выявіліся і хваробы росту, з'яўленне вельмі дробных таварыстваў (7—8 пайшчыкаў), у кіраўніцтва кааперацыі траплялі непадрыхтаваныя асобы. Кіруючыя органы, па меркаванні Д. Ф. Прышчэпава, забылі, што кааперацыя павінна будавацца знізу, і пачалі ствараць яе зверху, правакуючы фінансавы крызіс на высокіх узроўнях кіравання [12].

Згодна з пастановай 2-й сесіі ЦВК Беларусі меркавалася перадаць таварыствам на месцах усе кааператыўныя прадпрыемствы, перанесці акцэнты «на арганізацыю і развіццё першасных кааператываў на аснове шырокай самадзейнасці сялянскіх мас»; у мэтах умацавання крэдытнай кааперацыі «прыкласці намаганні да максімальнага прыцягнення ў яе сялянскіх зберажэнняў» [13]. Белсельбанк ужо ў 1924 г. налічваў 110 сельскагаспадарчых таварыстваў са спецыяльнымі крэдытнымі функцыямі. Крэдытная кааперацыя аб'ядноўвала таваравытворцаў ці ўвогуле частку насельніцтва для задавальнення патрэб у дробным крэдыце (вытворчым ці спажывецкім). З усіх кааперацыйных арганізацый на вёсцы таварыствы крэдытнай кааперацыі былі найбольш масавыя і пашыраныя. Абмежаванне ўдзелу заможнага сялянства ў кааперацыі перадвызначыла тое, што ўласныя сродкі крэдытных кааператываў на 1 кастрычніка 1926 г. склалі толькі 15,7 %, на 1 кастрычніка 1927 г. — 21 %. Са зменай эканамічнай палітыкі Савецкай дзяржавы ў канцы 1920-х гг. лёс крэдытнай кааперацыі ўвогуле быў прадвызначаны. Да 1931 г. усе крэдытныя кааператывы спынілі існаванне. Іх паявыя набыткі спісваліся на запазычанасць, а ўсе камісійныя аперацыі былі перададзены Дзяржбанку.

Другой масавай формай кааперацыі стала спажывецкая як форма добраахвотнага аб'яднання насельніцтва для закупкі і продажу тавараў на аснове паявога ўдзелу яе членаў. У жніўні 1921 г. кааперацыя была выведзена з-пад падпарадкавання Народнага камісарыята харчавання. Спажывецкая кааперацыя атрымала магчымасць ствараць добраахвотныя саюзы спажыўцоў з мэтай абмену на прадукты тавараў, якія атрымлівалі па месцы працы рабочыя ў якасці натуральнай прэміі. Са складу спажывецкай кааперацыі ў 1921 г. былі вылучаны сельскагаспадарчая, крэдытная і прамысловая. У канцы 1922 г. кааперацыя перайшла ад прадуктаабмену да гандлю, да грашовых разлікаў з сялянствам. У 1923 г. была зроблена спроба зноў злучыць спажывецкую кааперацыю з сельскагаспадарчай («палітыка інтэграла»), аднак яна скончылася беспаспяхова. З узбуйненнем БССР у 1924 г. ЦБС рэарганізаваны ў Беларускі саюз спажывецкіх кааператыўных аб'яднанняў (Белкаапсаюз). Паступова замацоўваўся прынцып добраахвотнасці, хутка расла колькасць пайшчыкаў (у 1924 г. — 111 тыс, у 1928 г. — 508,5 тыс). У 1924 г. спажывецкая кааперацыя аб'ядноўвала 16,8 % сялянскіх гаспадарак БССР, у 1927 г. — 40,7 % [17]. Дзяржава вызначала для спажывецкай кааперацыі шэраг ільгот, але адначасова выпрацоўвала розныя формы кантролю над ёй. Вясной 1930 г. былі створаны раённыя спажывецкія таварыствы (райпо), праз якія ішло забеспячэнне таварамі штодзённага попыту калгасаў і дробных вытворцаў. Гэтым быў зроблены чарговы крок да поўнага скасавання рыначных адносін. Спажывецкая кааперацыя захавала рысы кааператыўных структур 1920-х гг., аднак паступова ператварылася ў дадатак каманднa-адміністрацыйнага механізма.

Найбольшыя спадзяванні на вёсцы ўскладаліся на сельскагаспадарчую кааперацыю. Яе арганізацыі ствараліся з мэтай сумеснай вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ці ажыццяўлення іншых эканамічных патрэб (перапрацоўка і збыт прадукцыі, забеспячэнне сродкамі вытворчасці і інш.). Паглыбленне ў 1924—1927 гг. спецыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ва ўмовах нэпа вызна-

чыла хуткі рост спецыяльных відаў сельскагаспадарчай кааперацыі: малочна-жывёлагадоўчых, садова-агародных, птушкагадоўчых і інш. У 1920-я гг. дзейнічаў прынцып матэрыяльнай зацікаўленасці (свабоднае размеркаванне прыбытку, выплата дывідэндаў на ўнесены пай), выплата грашовых прэмій за перамогу на сельскагаспадарчых конкурсах. На 1 студзеня 1926 г. кааперацыя ахоплівала 20,9 % сялянскіх гаспадарак Беларусі, а на 1 кастрычніка 1927 г. — 35,9 %. У спецыфічных відах кааперацыі актыўна ўдзельнічала сярэдняе і заможнае сялянства. Афіцыйныя ўлады разглядалі кааперацыю найперш як дапамогу беднаце, таму з 1924 г. для заможнага сялянства з'явіліся абмежаванні. Аднак у машынных таварыствах (па сумесным выкарыстанні сельскагаспадарчых машын) заможныя сяляне ў 1926 г. складалі 11 % (удвая больш, чым іх удзельная вага ў масе вясковага насельніцтва). Першыя машынныя таварыствы арганізаваны на Беларусі ў 1923 г., у 1926—1927 гг. іх было 188. З-за падтрымкі кааперацыяй беднаты, вялікіх ільгот і крэдытавання кааператываў уласныя нязначныя сродкі арганізацый кааперацыі не давалі магчымасці гаспадарыць без умяшання дзяржавы. Кааператыўнай дзейнасці перашкаджала дубліраванне функцый рознымі яе відамі, велізарны адміністрацыйны апарат, марнатраўства, крадзяжы і інш. З канца 1920-х гг. дзяржава ўсё часцей умешвалася ў справы кааперацыі, калектыўныя гаспадаркі губляюць рысы кааператыўнай структуры. Рэарганізацыя кааператыўнай сістэмы мела на мэце паглыбленне спецыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці рэспублікі, але рэальным вынікам стала ўзмацненне цэнтралізацыі і адзяржаўлення кааператыўных структур, страта імі эканамічнай самастойнасці.

На працягу 1920-х гг. кааперацыя і калектывізацыя разглядаліся амаль як тоесныя па сваім змесце тэрміны. Але менавіта вытворчыя формы кааперацыі вызначыліся ў далейшым як асноўныя пры савецкай мадэрнізацыі вёскі. Каб зразумець прычыны, па якіх гэта адбылося, паспрабуем разгледзець развіццё гэтых форм напярэдадні суцэльнай калектывізацыі.

Найбольшы спад і агульнае скарачэнне колькасці калектыўных гаспадарак (калгасаў) прыйшліся на той жа 1922 г., калі сфармаваліся асноўныя прынцыпы новай эканамічнай палітыкі і ў адпаведнасці з ёю было прыведзена аграрнае заканадаўства. У верасні 1920 г. у Савецкай Беларусі налічвалася 615 калгасаў, у кастрычніку 1921 г. — 735, а ў верасні 1922 г. — 391 калгас [15, с. 38]. На пачатку 1920-х гг. пераважаў погляд, што «паколькі партыя займаецца цяпер аднаўленнем прыватнай сялянскай гаспадаркі, гандлем і да т. п., то паўстае пытанне: дзеля чаго калгасы?!» [16, с. 11]. Перыяд захаплення ідэяй калектыўнага земляробства змяняецца актыўным непрыманнем гэтай ідэі. Уяўленне пра калгасы як аб «аджыўшай форме» склалася перш за ўсё ў рэгіёнах, дзе калектыўныя гаспадаркі некаторы час развіваліся ў рамках палітыкі «ваеннага камунізму». На дадзены факт паказвалі як самі прадстаўнікі калектыўных гаспадарак, так і даследчыкі калгаснага руху 20-х гг. XX ст. А. Х. Мітрафанаў і А. А. Біцэнка [17, с. 37; 18, с. 33; 19, с. 73; 20, с. 58—60]. Падобнае стаўленне да калгасаў паўплывала на дынаміку калгаснага будаўніцтва. За першыя 6 месяцаў 1923 г. колькасць калгасаў у РСФСР зменшылася з 9765 да 8357 [22, л. 172]. Адпаведна скарачалася і колькасць калек-

тыўных гаспадарак у той частцы Беларусі, якая да ўзбуйнення БССР (у 1924 і 1926 гг.) уваходзіла ў склад РСФСР і дзе калгасны рух разгарнуўся яшчэ ў гады Грамадзянскай вайны.

Разам з тым у 6 паветах няўзбуйненай БССР (Бабруйскім, Барысаўскім, Ігуменскім, Мінскім, Мазырскім, Слуцкім) колькасць калектыўных гаспадарак павялічвалася (гл. дадатак, табл. 5). У. М. Міхнюк адзначае, што «аргументаванага тлумачэння гэтай з'явы мы не знаходзім у гістарычнай літаратуры» [23, с. 147]. Гэта дало падставу савецкім даследчыкам сцвярджаць аб прыцягальнасці для сялянства калектыўнага гаспадарання. Усебаковае даследаванне прычын рэзкага скарачэння колькасці калгасаў у адных паветах і ўстойлівага росту ў іншых немагчыма без аналізу матываў арганізацыі, сацыяльнага складу і вынікаў вытворчай дзейнасці калектыўных гаспадарак да і пасля пераходу да нэпа.

Прычыны непазбежнага крызісу пры пераходзе да новай эканамічнай палітыкі былі закладзены ўжо ў саміх умовах росту колькасці калектыўных гаспадарак у 1918—1920 гг. Нельга не пагадзіцца з даследчыкам калгаснага будаўніцтва 1920-х гг. К. Кіндзеевым, што «значныя льготы з боку дзяржавы стваралі цягу да ўтварэння калгасаў спецыяльна для атрымання гэтых ільгот і абудзілі імкненне з боку часткі калгасаў да атрымання ўсё новых і новых ільгот і выгод» [24, с. 8]. У канцы 1920 — першай палове 1921 г. уцекачы з былой Мінскай губерні накіраваліся назад, спадзеючыся атрымаць зямлю ў родных месцах. Паляпшэнне становішча з харчаваннем спрыяла паступоваму вяртанню ў горад працоўных, служачых, саматужнікаў, гандляроў. Акрамя таго, з калгасаў пачалі выходзіць сяляне, якія далучыліся да калгаснага руху па «кан'юнктурных» меркаваннях, спадзеючыся палепшыць сваё становішча працай у аднаасобных гаспадарках.

Нізкі ўзровень сельскагаспадарчай тэхнікі, арганізацыі працы, ураўняльнага размеркавання не дазволілі калектыўным гаспадаркам у 1918—1920 гг. выявіць якія-небудзь перавагі ў сферы вытворчай дзейнасці. Разлічваючы на дапамогу дзяржавы, значная іх частка не выяўляла ўласнай ініцыятывы і не змагла прыстасавацца да ўмоў таварна-грашовых адносін [25, с. 97]. Даволі рэзкую ацэнку вынікаў вытворчай дзейнасці калектыўных гаспадарак 1918—1920 гг. даў У. І. Ленін, адзначыўшы, што «калгасы яшчэ настолькі не наладжаны, у такім сумным стане, што яны апраўдваюць назву багадзельняў» [26, с. 180].

Асноўная прычына адрозненняў у дынаміцы калгаснага будаўніцтва ва ўсходніх паветах Савецкай Беларусі і ў цэнтральных паветах (акругах) БССР заключалася не столькі ў палітыцы мясцовых зямельных органаў, колькі ў часе пачатку разгортвання калгаснага руху ў рэгіёнах. У адноўленай БССР калгаснае будаўніцтва ў 1921—1922 гг. толькі пачало разгортвацца. На нарадзе ўпаўнаважаных калгасаў і сельгаскааперацыі Беларусі (красавік 1922 г.) адзначалася, што «пасля польскай акупацыі асабліва цяжка было праводзіць работу па калектывізацыі, таму што насельніцтва, будучы напужаным, баялася ісці ў калектывы» [27, л. 81]. Толькі 6 студзеня 1922 г. Цэнтральнае Бюро КП(б)Б пасля ўважлівага вывучэння спраў на месцах прыняло рашэнне зняць ваеннае становішча ў рэспубліцы [28, с. 239]. Стварэнне ўмоў для развіцця калгасаў у цэнтральнай частцы

Беларусі супала з пачаткам дзеяння дэкрэта аб свабодным выбары форм землекарыстання. Гэта дазваляла ўсім, хто імкнуўся да аднаасобнага вядзення гаспадаркі і меў для гэтага неабходны інвентар, ажыццявіць сваю мэту.

У снежні 1920 г. — студзені 1921 г. пачынаецца перадача былых непрацоўных гаспадарак беззямельнаму і малазямельнаму насельніцтву [29, с. 254—258]. У выніку надзялення зямлёй беднякоў і малазямельных серадзякоў сялянскае землекарыстанне ў БССР да канца 1922 г. павялічылася на 469 442 дзесяціны і дасягнула 2630,1 дзесяціны. Забяспечанасць зямлёй сялянскай гаспадаркі ў рэспубліцы вырасла з 9,5 да 11,2 дзесяціны [30, л. 51]. Павольны рост колькасці калгасаў у шасці паветах няўзбуйненай БССР [31, с. 49] прадвызначыў арганізацыю калектыўных гаспадарак тымі групамі насельніцтва, якія не змаглі весці індывідуальную гаспадарку і вымушаныя былі звярнуцца за дапамогай дзяржавы альбо тых, хто сапраўды жадаў служыць рэалізацыі ідэі калектыўнага земляробства. Прафесар А. Смоліч прыводзіў яшчэ адзін аргумент на карысць калектывізацыі на тэрыторыі паміж Мінскам і Слуцкам — адносна добрую якасць глебы і даволі высокую аграрную перанаселенасць [32, с. 21]. Гэта не выключала распаду некаторай часткі калгасаў — галоўным чынам слабых, створаных для вырашэння кароткачасовых задач. Пры такой частковай ліквідацыі найбольш няўстойлівых калгасаў калектыўнае земляробства ў цэлым толькі аздараўлялася. Новых калгасаў звычайна ўзнікала больш, чым распадалася старых, таму колькасць калектываў у няўзбуйненай БССР паступова ўзрастала.

Склад членаў калектыўных гаспадарак рэгіёна адрозніваўся ад сацыяльнага складу калгасаў усходніх беларускіх паветаў у 1918—1920 гг. у бок перавагі бяднейшых слаёў горада і вёскі. Па стане на чэрвень 1923 г. тут была вышэй удзельная вага батрацтва і фабрычна-заводскіх рабочых (34,8 %), беззямельных і малазямельных сялян (35,6) і служачых (9,6 %) [28]. Істотную частку членаў калгасаў складала прышлае неземляробчае насельніцтва. Сярод улічаных членаў калектыўных гаспадарак няўзбуйненай БССР у сакавіку 1924 г. 60 % з'яўляліся ў мінулым мясцовымі сялянамі, 22 — рабочымі, 18 % — бежанцамі і эмігрантамі [30].

Для дынамікі калгаснага будаўніцтва ў 1924—1927 гг. характэрна нераўнамернасць, скачкападобнасць яе развіцця. Колькасць калектыўных гаспадарак у гэты перыяд памяншалася да пачатку кожнага наступнага года і зноў павялічвалася да кастрычніка — снежня гэтага ж года. Дадзеная акалічнасць шмат у чым тлумачыцца тым, што з 1 кастрычніка пачынаўся новы фінансавы год, у той час як калгасы карысталіся пэўнымі падатковымі льготамі (зніжэнне па сельгаспадатку ў памеры 25 % для камун і арцеляў і 10 % для таварыстваў па грамадскай апрацоўцы зямлі). Гэты ж фактар абумовіў неадпаведнасці ў адлюстраванні колькасці калектыўных гаспадарак у зводках фінорганаў. Такая важная крыніца, як зборнікі «Сельская гаспадарка Саюза ССР па даных падатковых зводак Наркамфіна» за 1924/25—1927/28 гаспадарчыя гады, утрымлівае некалькі перабольшаныя звесткі пра колькасць калгасаў.

Сацыяльны склад калектыўных гаспадарак у 1924—1927 гг. уяўляе сабой не менш складаную задачу, чым аналіз дынамікі стварэнне калгасаў. У гістарычных

крыніцах сацыяльныя групы ў калгасах вызначаюцца па-рознаму, прасачыць змяненне іх удзельнай вагі даволі праблематычна. Напрыклад, у дачыненні да сялянства выкарыстоўваюцца наступныя паняцці: «беднякі» — «серадзнякі» — «заможныя»; «малазямельныя» — «беззямельныя»; «сяляне з зямлёй» — «беззямельныя» [33, л. 78; 34, л. 154; 35, л. 32]. Наяўныя звесткі дазваляюць пазначыць, што на пачатку 1925 г. найбольш значнай групай насельніцтва калгасаў з'яўляліся «малазямельныя» (47,2 %), якіх варта аднесці да бяднейшых сялян. Беднае, сярэдняе і заможнае сялянства (або сяляне «з зямлёй») пераважала ў калектыўных гаспадарках Віцебскай, Магілёўскай, Калінінскай і Бабруйскай акруг. У калгасах жа Мінскай, Мазырскай, Аршанскай і Полацкай акруг самай буйной сацыяльнай групай былі парабкі (ад 47 да 61 %). Удзельная вага апошніх у складзе насельніцтва калгасаў БССР заставалася высокай на працягу 1924—1927 гг. (гл. дадатак, табл. 7).

У цэлым сацыяльны склад калектыўных гаспадарак БССР дадзенага перыяду адрозніваўся стабільнасцю. Некаторыя змены адбываліся ў суадносінах малазабяспечаных груп. У 1925/26 гаспадарчым годзе працягваўся працэс выхаду з калгасаў сялян з зямлёй, папаўненне калектываў адбывалася пераважна за кошт беззямельных (гл. дадатак, табл. 7). У сярэдзіне 1920-х гг. калгасы па-ранейшаму ствараліся тымі, хто апынуўся ў найбольш цяжкіх жыццёвых абставінах. Да канца 1927 г. сярэдняе сялянства ў асноўнай сваёй масе (за выключэннем часткі малазямельных) не ўключылася ў працэс калгаснага будаўніцтва. Гэта тлумачыцца тым пэўным эканамічным уздымам, які адчувала ў сярэдзіне 20-х гг. XX ст. сельская гаспадарка Беларусі; пашырэннем магчымасці прымянення найму рабочай сілы, арэнды зямлі, атрымання прырэзкаў зямельнага запаснога фонду.

Зацвярджэнне ў практыцы дзейнасці кааператыўных і зямельных органаў перакanання, што калектыўныя гаспадаркі — не «слупавая дарога да сацыялізму», фарміравала погляд на іх як на арганізацыі выключна бяднейшага сялянства. Калектывізацыя асобных гаспадарчых працэсаў і ўсёй гаспадаркі разглядалася як «самая рэальная дапамога беднаце» [36, с. 138]. Падобная палітыка органаў савецкай улады і органаў зямельнага кіравання Беларусі ў пытаннях рэгулявання сацыяльнага складу калектыўных гаспадарак часткова тлумачылася цяжкасцямі ліквідацыі калгасаў, якія не выконвалі статуты. Калі абвясціць калгас ліквідаваным можна было на працягу даволі кароткага тэрміну, то значна больш складаную задачу ўяўляла высяленне яго членаў. Камісія РСІ звяртала ўвагу на тое, што ў выніку недахопу свабодных зямель «справа аб высяленні "цягнецца" па інстанцыях цэлымі гадамі, а "калектыўшчыкі" жывуць сабе сялібамі па некалькі гадоў». Таму прымаліся захады, каб не дапусціць у калгасы элемента, «заражанага ў моцнай ступені ўласніцкімі тэндэнцыямі, жаданнем асабіста нажыцца ў арцелі, а потым раскласці яе з мэтай падзелу арцельнай зямлі на хутары» [37, л. 4, 5]. Асцярожнае стаўленне да серадзнякоў і серадняцкіх гаспадарак у 1924—1927 гг. назіралася і ў іншых рэспубліках СССР, у прыватнасці ў РСФСР [39, л. 76].

Аналізуючы змены ў сацыяльным складзе членаў калектыўных гаспадарак у 1924—1927 гг. (гл. дадатак, табл. 7), нельга не звярнуць увагу на ўзрастанне ўдзель-

най вагі катэгорыі насельніцтва, пазначанай у крыніцах як «іншыя»: з 3,9 % у лютым — красавіку 1925 г. да 11 % у верасні 1926 г. Звесткі камісіі РСІ дазваляюць удакладніць, што ў рэчаіснасці да рабочых, паводле даных суцэльнага абследавання 1925 г., аднесена і значная частка рамеснікаў (4,3 %). Гэтая з'ява тлумачыцца ўзрастаннем ролі яўрэйскага насельніцтва ў складзе членаў калгасаў (гл. дадатак, табл. 8, 9). У калгасным будаўніцтве ў БССР прымалі ўдзел прадстаўнікі амаль усіх нацыянальнасцей, якія пражывалі ў рэспубліцы. Арцель «Чырвоны двор» Магілёўскага раёна складалася з 10 сямействаў латышоў і 2 сем'яў рускіх [39, л. 38]. У 1-й сельгасарцелі Гарбоўскага (Віцебская акруга) разам з беларусамі працавалі і мясцовыя эстонцы [40, с. 60]. У Высачанскім раёне гэтай жа акругі ў 1925 г. утварылася камуна «Інтэрнацыянал», арганізатарамі якой з'явіліся латышы, рускія, беларусы, яўрэі, палякі [40]. Рускія, палякі, латышы, літоўцы пераважна асобных аб'яднанняў не арганізоўвалі, а былі ўключаны ва ўсе калектыўныя гаспадаркі. Невысокая ўдзельная вага прадстаўнікоў гэтых нацыянальнасцей у калгасах тлумачыцца тым, што апошнія складалі невялікую долю сельскага насельніцтва Савецкай Беларусі (каля 9 %) [41, л. 31].

Доля асоб яўрэйскай нацыянальнасці ў складзе сельскага насельніцтва БССР неістотная, 83,6 % яўрэяў у 1920-я гг. у Беларусі пражывала ў гарадах. Аднак колькасць яўрэйскіх калгасаў у рэспубліцы ў сярэдзіне 20-х гг. XX ст. была даволі значнай [41, л. 31]. Іх арганізацыя пачалася яшчэ ў 1918—1920 гг. ва ўмовах гаспадарчай разрухі ўцекачамі ад голаду ў вёску — дробнымі гандлярамі, рамеснікамі, рабочымі на свабодных ад акупацыі землях. Аднаўленне прамысловасці і саматужных промыслаў не прадвызначыла распаду ўсіх яўрэйскіх калгасаў, але іх арганізацыя ў 1921—1924 гг. амаль спынілася. Развіццё эканомікі рэспублікі ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі прывяло да значнай маёмаснай дыферэнцыяцыі, да разарэння асобных рамеснікаў і саматужнікаў. Да сярэдзіны 1920-х гг. утварылася адмысловая катэгорыя яўрэйскага насельніцтва («асобы без пэўных заняткаў»), якая жыла выключна за кошт грашовых пераводаў з ЗША [42, л. 3]. «Ажыццяўляючы на справе прынцып раўнапраўя ўсіх нацыянальнасцей», Прэзідыум ЦВК Беларускай ССР у ліпені 1924 г. прыняў пастанову і стварыў Асобую камісію па землеўпарадкаванні працоўных яўрэяў [43, л. 1]. Ужо ў жніўні гэтага года НКЗ БССР прапаноўваў высветліць наяўнасць свабодных зямельных фондаў. У другой палове 1924 г. пачынаецца арганізацыя яўрэйскіх меліярацыйных таварыстваў і калектыўных гаспадарак. Новыя землекарыстанні ўзнікалі на месцы ліквідаваных арцеляў і камун, прыпісных саўгасаў, а таксама на землях запаснога і ляснога фондаў [44, л. 35].

У той жа час колькасць усіх калектыўных гаспадарак па БССР з 1 кастрычніка 1924 г. па 1 кастрычніка 1926 г. павялічылася нязначна: з 392 да 414 (па іншых даных — 433). Лагічна выказаць меркаванне, што гэты рост забяспечваўся пераважна за кошт арганізацыі яўрэйскіх арцеляў. Названы працэс адбываўся і на працягу 1925/26 гаспадарчага года, калі колькасць беларускіх калгасаў скарацілася з 287 да 235, а яўрэйскіх — павялічылася са 127 да 145 [45, л. 31]. У рэзалюцыі X з'езда Кампартыі Беларусі «Вынікі гаспадарчага будаўніцтва і далейшыя

задачы КП(б)Б» адзначалася, што на 1 студзеня 1927 г. з 369 калгасаў 145 былі арганізаваны асобамі яўрэйскай нацыянальнасці. Акрамя таго, па Гомельскай і Рэчыцкай акругах, якія ўвайшлі ў склад БССР у снежні 1926 г., налічвалася да красавіка 1927 г. 41 калектыўная гаспадарка, у тым ліку 19 яўрэйскіх арцеляў (гл. дадатак, табл. 8, 9). [46, с. 379].

Калі ўлічыць, што беларускае насельніцтва ў 1920-я гг. у большасці было сельскім, яўрэйскае ж, наадварот, пераважна пражывала ў гарадах, то змяншэнне ўдзельнай вагі беларусаў у складзе членаў калектыўных гаспадарак перадвызначала і скарачэнне долі асоб, якія займаліся раней сельскай гаспадаркай. З ліку землеўпарадкаванага яўрэйскага насельніцтва на працягу 1924/25 гаспадарчага года земляробаў у мінулым было 40,5 %, рабочых — 2,6 %, саматужнікаў — 23,5 %, рамеснікаў — 5,4 %, іншых працоўных — 13,7 %, гандляроў і іншых — 14,3 % [47, л. 35]. Зніжэнне ўдзельнай вагі сялян у складзе членаў калектыўных гаспадарак, у тым ліку і малазямельных, можна растлумачыць тым, што ў 1925—1926 гг. многія з іх спадзяваліся атрымаць зямлю ў аднаасобнае карыстанне з запаснога фонду. Гэты фонд быў створаны згодна з рашэннем IV сесіі ЦВК БССР 1-га склікання ў студзені 1925 г. Ён складаўся з участкаў, пералічаных з ляснога фонду ў зямельны і дзяржмаёмасці; часткі непрыдатных зямель, якія не выкарыстоўваліся належным чынам; ад абрэзкі зямлі ў гаспадарках, якія перавышалі максімальныя нормы землезабеспячэння [48, с. 135].

Тэндэнцыі, акрэсленыя ў калгасным руху ў БССР у пачатку 1920-х гг., у другой палове 1924 — першай палове 1927 г., атрымалі далейшае развіццё. У Барысаўскай, Бабруйскай, Мінскай, Мазырскай і Слуцкай акругах па-ранейшаму рост калектыўных гаспадарак забяспечваўся за кошт інтэнсіўнай арганізацыі ў 1924—1926 гг. яўрэйскіх арцеляў (амаль увесь прырост у Слуцкай і Мінскай акругах). Падобным быў і сацыяльны склад калектыўных гаспадарак Мінскай акругі, арганізаваных у 1924—1926 гг. У пачатку 1927 г. беларусы тут складалі крыху больш за палову ўсіх удзельнікаў калектыўнага земляробства [49, л. 20]. Такім чынам, у акругах, утвораных на аснове тэрыторыі былой няўзбуйненай БССР, развіццё калгаснага будаўніцтва ў сярэдзіне 1920-х гг. забяспечвалася пераважна за кошт неземляробчага насельніцтва. Мясцовае ж сялянства, у тым ліку і беднае, імкнулася атрымаць зямлю ў аднаасобнае карыстанне.

Удзельная вага «іншых у ліку насельніцтва калектыўных гаспадарак» узрастала і ва ўсходніх акругах. Аднак арганізацыя яўрэйскіх калектываў праходзіла тут не так актыўна, як у няўзбуйненай БССР (у межах да 1924 г.). Прыведзеныя вышэй паказчыкі ўсё ж не варта і абсалютызаваць, бо яны фарміраваліся на падставе звестак саміх калектыўных гаспадарак. Па заканчэнні года многія былыя рабочыя, саматужнікі і асобы, аднесеныя раней да катэгорыі «іншых», запісваліся ў графу «сяляне» [50, л. 510]. Больш высокая ўдзельная вага сялянства ва ўсходніх акругах Беларусі вызначалася частковай захаванасцю абшчыннага землеўладання. На думку В. П. Данілава, яго рэшткі не былі ліквідаваныя Зямельным кодэксам БССР, зацверджаным 5 лістапада 1924 г. [51, с. 98]. Па меры таго як абмяжоўвалася практыка землеўпарадкавання на хутары, з канца 1926 г. пачынаецца рост

колькасці калгасаў у названых акругах. Сярод прычын, якія выклікалі распад калгасаў, Наркамземам БССР адзначаліся наступныя: 1) адсутнасць сродкаў; 2) неаднолькавая працаздольнасць членаў калектыўных гаспадарак; 3) неразуменне выгады калектыўнай працы; 4) слабае кіраўніцтва калектывамі з боку акрсельсаюзаў [52, л. 12]. Такім чынам, вытворчую дзейнасць калгасаў і сацыяльную псіхалогію сялянства таксама варта ўлічваць як фактары, якія аказвалі істотны ўплыў на дынаміку калгаснага будаўніцтва.

Перыяд з 1921 па 1927 г. можна вылучыць як асаблівы этап мадэрнізацыі вёскі ў БССР, для якога характэрны: 1) працэс кааперавання як паступовы пераход ад простых відаў кааперацыі да больш складаных, уключаючы вышэйшыя яе формы — камуны, арцелі і таварыствы па грамадскай апрацоўцы зямлі; 2) распаўсюджаны погляд на калгасы як арганізацыі самых бедных слаёў горада і вёскі аж да спроб рэгулявання іх сацыяльнага складу; 3) чаргаванне ўздымаў і спадаў у дынаміцы калгаснага руху, пэўны «застой» у колькасным росце калгасаў; 4) арганізацыя калектыўных гаспадарак амаль выключна на землях дзяржаўнага зямельнага фонду.

На працягу 1927/28 гаспадарчага года ў дынаміцы арганізацыі калгасаў у СССР адбываюцца змены, якія дазваляюць акрэсліць новы этап. Усё больш калгасаў рэспублікі з вясны 1928 г. арганізоўвалася на землях працоўнага карыстання. Калі разглядаць дынаміку стварэння калектыўных гаспадарак у іншых саюзных рэспубліках, то можна заўважыць узрастанне іх колькасці з вясны — лета 1928 г. [53, с. 250]. У БССР гэты працэс адбываўся не так імкліва.

У канцы 1920-х гг. адрозненні ў дынаміцы калгаснага руху паміж цэнтральнымі і ўсходнімі раёнамі Беларусі паступова згладжваюцца (гл. дадатак, табл. 10). Аднак па-ранейшаму ў акругах, якія ўтварыліся на аснове тэрыторыі няўзбуйненай БССР, рост колькасці калектыўных гаспадарак адбываецца за кошт утварэння яўрэйскіх калгасаў. У Мінскай акрузе на 1 чэрвеня 1928 г. налічвалася 49 яўрэйскіх (у студзені 1927 г. — 14) і 4 польскія сельгасарцелі, што складала 42 % ад агульнай колькасці калгасаў [54, с. 56]. Да 1 кастрычніка 1928 г. у акрузе мелася ўжо 59 калектыўных гаспадарак, арганізаваных асобамі яўрэйскай нацыянальнасці [55, с. 13, 14]. Гэтым тлумачыцца тое, што з 77 калгасаў, якія ўзніклі з 1 кастрычніка 1927 г. па 1 чэрвеня 1928 г., толькі 27 аб'яднанняў было створана на працоўнай сялянскай зямлі. У 1928 г. ужо не існавала свабодных маёнткаў, спынілася ліквідацыя саўгасаў. Названыя калектывы стварaліся на дробных участках, «агародных гаспадарках». Па Мінскай акрузе працэнт дробных калгасаў быў найвышэйшым [54, с. 56; 56, с. 84].

У 1927/28 гаспадарчым годзе павялічыўся рост яўрэйскіх арцеляў і ў іншых акругах [57, с. 20]. У Віцебскай акрузе колькасны склад яўрэйскіх калгасаў толькі за два месяцы вырас на 45 %, пераважна за кошт былых гандляроў. Прычынай такога хуткага росту яўрэйскіх арцеляў з'явілася пагаршэнне становішча мястэчак. Пра гэта сведчыць заключэнне камісіі, якая абследавала стан яўрэйскіх калектыўных гаспадарак Віцебскай акругі [58, л. 19, 36]. Да 1 кастрычніка 1928 г. было арганізавана 243 нацыянальных калгасы, у тым ліку 227 яўрэйскіх,

12 польскіх, 2 латышскіх, цыганскі і кітайскі калектывы [59, с. 3]. Апошнія 2 калгасы былі створаны ў Віцебскай акрузе. Кітайская камуна «Маркавічы» была арганізавана ў Мікалаеўскім сельсавеце ў цэнтры былога маёнтка членам КП(б)Б Чжан Ван Фу. Спачатку ў калектыў аб'ядналіся 7 кітайскіх сем'яў, усяго 30 чалавек. Зямлі мелася ў калгасе толькі 17 га (2 га ворыва, 5 га лугі, 8 га саду і 2 га лесу), таму пры наяўнасці ў складзе членаў добрых садаводаў і агароднікаў на агульным сходзе было вырашана абраць адпаведны вытворчы кірунак. Пачаўшы ў цяжкіх умовах, у выніку велізарных намаганняў кітайская арцель ужо ў першыя гады паказала прыклад сапраўднага гаспадарання. Аднак рэарганізацыі ў перыяд масавай калектывізацыі прывялі яе да развалу [60, л. 21]. Не ўсе нацыянальныя калгасы паспяхова развівалі сваю вытворчасць. Вялікі наплыў у калектыўныя аб'яднанні насельніцтва мястэчак прыводзіў да арганізацыі калгасаў асобамі, не знаёмымі з вядзеннем сельскай гаспадаркі, што садзейнічала адмоўным адносінам мясцовага сялянства да калгасаў наогул [58, л. 20].

Што ж сабою ўяўлялі камуны, арцелі і таварыствы па грамадскай апрацоўцы зямлі як вышэйшая форма вытворчай кааперацыі ў Беларусі? У беларускай гістарычнай літаратуры пэўны час найбольш распаўсюджанай з'яўлялася думка, што асноўнай формай калгаснага будаўніцтва ў БССР у 1921—1929 гг. была сельгасарцель, і гэта складала адметную рысу калгаснага руху ў Беларусі ў параўнанні з РСФСР і іншымі рэспублікамі. Аднак аргументацыя ў абарону дадзенага тэзісу не заўсёды дастаткова пераканаўчая.

Прымаючы пад увагу аргументы такіх беларускіх вучоных, як Г. Г. Герасіменка [61, с. 155], В. А. Мілаванаў [15, с. 50], М. Я. Стральцоў [62, с. 49, 50, 58], усё ж пазначым, што разам з уключэннем у статут камун пунктаў, якія сведчылі аб іх развіцці ў напрамку паглыблення арцельных прынцыпаў гаспадарання, назіраліся факты і зваротнага руху: ад сельгасарцелі (а ў шэрагу выпадкаў — і ад таварыстваў) да камун. Перадумовай такой з'явы ў развіцці калгасаў у БССР з'явілася арганізацыя калектыўных гаспадарак рабочымі і паўпралетарскімі слаямі насельніцтва вёскі на аснове дзяржаўных сродкаў вытворчасці. На 1 чэрвеня 1928 г. каля 91,3 % камун, 95 % сельгасарцеляў і 71,9 % таварыстваў (ТСЗ) былі створаны на землях дзяржаўнага зямельнага фонду. Беспасеўныя і з пасевам да 0,09 дзесяціны складалі сярод іх членаў адпаведна 97,2, 91,8 і 39,6 % [63, с. 57, 69].

Асабліва высокая ступень абагулення назіралася ў сельскагаспадарчых арцелях, якія былі створаны ў цэнтрах былых маёнткаў, дзе члены калгасаў выкарыстоўвалі агульныя вытворчыя памяшканні, падсобныя прадпрыемствы, прылады працы. У 6 паветах няўзбуйненай БССР аж да 1925 г. сельскагаспадарчыя арцелі арганізоўваліся на падставе зацверджанага Наркамземам рэспублікі статута, згодна з § 10 якога «той, хто ўступае, павінен ліквідаваць усю сваю адзінаасобную гаспадарку, запасы насення і пабудовы, тэхнічныя прадпрыемствы і майстэрні» і перадаць іх у распараджэнне калектыву [64, л. 442, 460]. Такім чынам, у 1921—1925 гг. па 6 паветах няўзбуйненай БССР поўнае абагуленне сродкаў вытворчасці прадугледжвалася непасрэдна статутам сельгасарцелі.

З пачатку 1925 г. пачынае дзейнічаць агульны для РСФСР і БССР статут працоўнай земляробчай арцелі [65, с. 5—9; 66, л. 81].У адпаведнасці з ім членам сельгасарцелі мог быць любы грамадзянін краіны, старэйшы за 18 гадоў, які карыстаўся правам выбіраць у Саветы, унёс устаноўлены пай і выплаціў беззваротны ўступны ўзнос. Дадзеным статутам канкрэтны ўзровень абагулення не агаворваўся. Аднак з мэты сельгасарцелі, замацаванай у § 1 Статута, зыходзіла, што перадачы ў калектыўнае карыстанне падлягаюць усе сродкі вытворчасці, неабходныя для «сумеснай вытворчасці ў агульнай земляробчай гаспадарцы сельскагаспадарчых прадуктаў». К. Кіндзееў у 1927 г. паказваў на наяўнасць мноства пераходных момантаў ад ТСЗ да арцелі і ад арцелі да камуны [24, с. 18]. Дарэчы, і М. Я. Шкляр адзначаў, што сельскагаспадарчая арцель Беларусі ў 1920-я гг. знаходзілася на розных ступенях развіцця [67, с. 294]. Існаванне пераходных да сельгасарцелі форм можна выявіць на падставе вывучэння звестак бюджэтнага апісання і балансаў сялянскіх гаспадарак. Пазначаная крыніца, нягледзячы на недакладнасці ў фармуліроўцы тыпу калектыўных аб'яднанняў, дае магчымасць прасачыць ступень абагулення ў кожнай з іх.

Ва ўмовах наяўнасці мноства пераходных форм размежаванне тыпаў калектыўных гаспадарак толькі на падставе прынятых статутаў не адлюстроўвала сапраўднае становішча спраў, бо статутныя патрабаванні часам не выконваліся [68, л. 85; 69, л. 1]. Імкненне выявіць неадпаведнасць садзейнічала правядзенню абследаванняў калектыўных гаспадарак з вызначэннем дзвюх груп аб'яднанняў: з поўным абагуленнем сродкаў вытворчасці і з частковым (гл. дадатак, табл. 12).

Да канца 1927 г. камуны, сельгасарцелі і таварыствы адрозніваліся па ўдзельнай вазе аб'яднанняў з частковым абагуленнем сродкаў вытворчасці. Наяўнасць вялікай колькасці арцеляў з поўным абагуленнем і рух камун у кірунку ўвядзення вызначаных момантаў матэрыяльнай зацікаўленасці выклікалі ў другой палове 1920-х гг. дыскусію аб крытэрыях размежавання форм калектыўных гаспадарак. Прыхільнікі аднаго пункту гледжання вылучалі чатыры ступені калектывізацыі і адносілі арцель да «трэцяй ступені», для якой характэрна «абагуленне ўсіх сродкаў вытворчасці» — такое ж, як і ў камунах. Для камун яны лічылі найбольш істотнай прыкметай «абагуленне спажывання». У той жа час некаторыя даследчыкі і практыкі калгаснага будаўніцтва выступілі супраць «увядзення адвольна не асноўнай вытворчай прыкметы, а другараднай» [20, с. 88, 89]. Перамога, у рэшце рэшт, такога меркавання ўстанаўлівала межы максімальнага і мінімальнага ўзроўню абагулення, характэрныя для кожнай з форм калектыўных гаспадарак. Да камун былі аднесены гаспадаркі са ступенню абагулення сродкаў вытворчасці ад 95,1 да 100 %, пасеваў — ад 90,1 да 100 %, да арцеляў — адпаведна ад 60,1 да 95 % і ад 90,1 да 100 %, да ТСЗ — ад 0,1 да 60,1 % і ад 0,1 да 90 % [63, с. 24]. У 1928 г. ЦСУ БССР упершыню правяло абследаванне калгасаў рэспублікі з улікам адпаведнасці прынятага імі статута ступені абагулення сродкаў вытворчасці. Абапіраючыся на яго даныя, М. Я. Стральцоў паставіў пад сумненне сцвярджэнне шэрагу беларускіх гісторыкаў аб пераважным развіцці ў БССР сельскагаспадарчых арцеляў у параўнанні з іншымі тыпамі калгасаў [25, с. 108—110].

Разглядаючы аргументы, прыведзеныя М. Я. Стральцовым, нельга не звярнуць увагу на тое, што яны выцякаюць з вызначэння форм калектыўных гаспадарак, дадзенага вядомым даследчыкам калгаснага руху А. Ф. Чмыга, якая пазначыла асноўным крытэрыем узровень абагулення сродкаў вытворчасці. «У камуне, — падкрэслівае А. Ф. Чмыга, — абагульняліся УСЕ сродкі вытворчасці: зямля, рабочая жывёла, інвентар. У члена арцелі захоўвалася асабістая падсобная гаспадарка. У ТСЗ абагульнялася зямля, што апрацоўвалася калектыўна. Узровень абагулення сродкаў вытворчасці быў нязначным» [70, с. 268].

Да вызначэння прыкмет форм калектыўных гаспадарак трэба падыходзіць канкрэтна-гістарычна. Камуны, арцелі і таварыствы ў кожнай з рэспублік СССР прайшлі ў сваім развіцці шмат этапаў, на фарміраванне іх характэрных рысаў аказаў уплыў не толькі сацыяльны склад, але таксама і ўмовы арганізацыі і агульны напрамак развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці. Там, дзе для арганізацыі арцелі найбольшую ролю мела таварна-збожжавая гаспадарка, першараднае значэнне мела абагуленне сельгасінвентару, працоўнай жывёлы, гаспадарчых пабудоў. Аднак у раёнах спажываючай паласы, якой з'яўлялася Беларусь, галоўную ролю мела адчужэнне пераважна прадуктаў мяса-малочнай жывёлагадоўлі і найбольш істотным было пытанне аб абагуленні жывёлы.

У 1928 г. камісія па калектывізацыі сельскай гаспадаркі БССР на аснове аналізу вынікаў абследавання калгасаў ЦСУ пастанавіла, што «таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі павінны абагуліць землекарыстанне, буйныя сельскагаспадарчыя машыны і працу сваіх членаў у паляводстве. Сельскагаспадарчыя арцелі павінны зрабіць сумесным землекарыстанне, інвентар і — пры існуючым жывёлагадоўчым кірунку — жывёлу і працу сваіх членаў, а камуны — землекарыстанне, пабудовы, усю жывёлу і інвентар» [71, л. 19]. Нескладана заўважыць некаторую неадпаведнасць з класіфікацыяй, дадзенай А. Ф. Чмыга.

У большасці яўрэйскіх арцеляў агульнае калектыўнае земляробства дапаўнялася не вытворчасцю пэўных сельскагаспадарчых культур на сваім асобным участку, а заняткамі рамяством, гандлем і г. д. У шэрагу выпадкаў цяжка нават было ўстанавіць, якая з гэтых вытворчасцей мела дапаможны характар. Улічваючы дадзены факт, а таксама прымаючы пад увагу агульную спецыялізацыю сельскагаспадарчай вытворчасці рэспублікі, у красавіку 1928 г. (нягледзячы на пярэчанні Праўлення Белсельсаюза) камісія пры Наркамземе БССР дапоўніла § 13 Тыпавога статута словамі «і ліквідаваць сваю гаспадарку і маёмасць у іншых месцах» [72, л. 197—200]. Дадатак не знайшоў адлюстравання ў зацверджаным Эканамічнай Нарадай Статуце сельскагаспадарчай арцелі 1928 г. [73], аднак выкарыстоўваўся ў практыцы кіравання калектыўнымі гаспадаркамі. Грунтуючыся менавіта на дадзеным дадатку, Мінская акруговая секцыя калектыўных гаспадарак у лістападзе 1928 г. прапанавала Савету арцелі «Прафінтэрн» Койданаўскага раёна пад пагрозай ліквідацыі «аб'яднаць усю маёмасць на працягу двух тыдняў» [74, л. 9].

Зямельнымі і кааператыўнымі органамі рэспублікі поўнае абагуленне сродкаў вытворчасці ў некаторых арцелях разглядалася не як выключэнне, а як пра-

віла. У чым жа выяўлялася адрозненне сельгасарцеляў як формы калектыўнага гаспадарання ад камуны? У якасці адказу прывядзём рашэнне Бабруйскага акрсельсаюза, прынятае ў 1928 г. па сельгасарцелі «Надзея» Парычскага раёна. «У адносінах перарастання арцелі ў вышэйшую форму, — паведамляецца ў дадзеным дакуменце, — неабходна адзначыць рашэнне аб арганізацыі агульнай сталовай. Гэтыя абставіны пры добрай пастаноўцы справы грамадскага харчавання могуць стацца пераходным пунктам для рэарганізацыі арцелі ў камуну» [75, л. 39]. Камуны абавязкова адзначалі наяўнасць шэрагу аб'ектаў сацыяльнага прызначэння — дзіцячы сад ці яслі, бібліятэка, пральня і г. д. [76, л. 10]. Менавіта ў сферы арганізацыі агульнага быту бачыў прычыну скарачэння ўдзельнай вагі камун сярод іншых форм калектыўных гаспадарак Е. І. Ільын [77, с. 10].

Статут сельскагаспадарчай камуны, які быў выдадзены ў 1928 г., прадугледжваў не толькі «поўнае абагуленне зямлі, працы, інвентару і іншых сродкаў вытворчасці», але і «арганізацыю культурна-бытавых мерапрыемстваў (яслі, агульная сталовая і інш.)». Неабходнасць стварэння здаровага псіхалагічнага клімату ў калектыве прадвызначыла замацаванне ў статуце дастаткова працяглага выпрабавальнага тэрміну [78, с. 1, 3]. Вытворчасць камуны будавалася на падставе гаспадарчага разліку. Кожны камунар атрымліваў аванс, а астатнюю частку — па выніках года згодна з колькасцю і якасцю выдаткаванай працы. За стараннасць і рацыяналізацыю выплачваліся прэміі. Высокі ўзровень абагулення ў многіх сельгасарцелях Беларусі як вынік спецыфікі іх сацыяльнага складу, умоў арганізацыі і дзейнасці не дае падставы адносіць іх да камун. Статут сельскагаспадарчай арцелі 1928 г. не прадугледжваў канкрэтнай ступені абагулення сродкаў вытворчасці. У пункце 2 адзначалася, што «арцель мае на мэце арганізоўваць і весці на агульным зямельным участку арцелі сумесную працу і сродкамі сваіх членаў удасканаленую сельскую гаспадарку». У нататцы да пункта 4 удакладнялася, што «паявыя ўнёскі ўстанаўліваюцца ў памерах, неабходных для вядзення сумеснай гаспадаркі», у сувязі з чым яны ўносіліся як грашыма, так і маёмасцю [73, с. 1—5]. Згодна са статутам узровень абагулення залежаў ад вытворчай спецыялізацыі арцелі і асабістай ініцыятывы яе членаў. Да канца 1920-х гг. усё больш праяўляе сябе практыка адміністрацыйнага ціску на калектыўныя гаспадаркі з боку кіраўнічых структур с мэтай павысіць гэты ўзровень, аднак дадзеная з'ява ўяўляе сабой прадмет асобнага разгляду.

Калі крытэрый размежавання паміж арцеллю і камунай знаходзіўся па-за сферай вытворчасці, то асноўнае адрозненне сельгасарцелі ад таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі вызначалася толькі ступенню абагулення. Гэты паказчык не з'яўляўся аднолькавым на розных этапах развіцця калектыўнай гаспадаркі. Калгасы, якія існавалі доўгі час, нязменна адрозніваліся па ступені абагулення сродкаў вытворчасці ў бок яе павелічэння. Згодна са звесткамі, прыведзенымі В. П. Данілавым, у старых ТСЗ і зноў створаных сельгасарцелях узровень абагулення быў прыкладна аднолькавым, а па інвентары ў ТСЗ — значна вышэй [79, с. 283]. ЦСУ СССР, устанаўліваючы межы ступені абагулення сродкаў вытворчасці, не ўлічвала дадзенага факта. У выніку значная колькасць калгасаў, якія былі

арганізаваны ў 1928 г., была аднесена да ТСЗ і нават да машынных таварыстваў [63, с. 55]. Гэтыя абставіны дазваляюць паставіць пад сумненне правамернасць прыведзеных М. Я. Стральцовым суадносін камун, арцеляў і ТСЗ.

Узровень абагулення ў калектыўных гаспадарках розных рэгіёнаў Савецкага Саюза не быў аднолькавым. У ТСЗ БССР ён складаў 45,8 %, Украінскай ССР — 33,6 %, РСФСР — 30,3 % [80, с. 47]. Меліся адрозненні і ў дынаміцы суадносін колькасці форм калгаснага будаўніцтва. Магчымасць спалучэння выгод буйной і дробнай гаспадаркі, значная ступень свабоды ў распараджэнні прадуктамі працы абумовілі тое, што ТСЗ у другой палове 20-х гг. XX ст. сталі пераважаючай формай калектыўных гаспадарак земляробчых раёнаў РСФСР і ва Украіне [81, с. 40, 46; 82, с. 238]. Зусім іншае становішча можна назіраць, калі прасачыць дынаміку суадносін колькасці калектыўных гаспадарак у БССР (гл. дадатак, табл. 15).

Зніжэнне ўдзельнай вагі камун можна аргументаваць спасылкамі на псіхалогію сялянства. З гэтай жа прычыны цяжка растлумачыць змяншэнне долі ТСЗ. У сярэдзіне 1920-х гг. даследчыкі і практыкі калгаснага руху прапаноўвалі Наркамзему Беларусі вывучаць дадзеную з'яву [83, с. 8]. У 1929 г. на падставе абагульнення вынікаў суцэльнага абследавання калгасаў ЦСУ была зроблена выснова, што асноўная прычына адрозненняў у суадносінах форм калгаснага будаўніцтва паміж БССР і іншымі рэгіёнамі Саюза заключалася ў спецыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці рэспублікі, у сувязі з чым «абагуленне аднаго паляводства» не давала гаспадарчага эфекту [63, с. 9]. Гэта ж сцвярджэнне прывёў у 1930 г. Е. І. Ільін, яно паўтаралася і іншымі даследчыкамі, у прыватнасці Г. Г. Герасіменка [61, с. 155; 77, с. 10]. Не змяншаючы значнасці дадзенай высновы, неабходна заўважыць, што такая аргументацыя не з'яўляецца вычарпальнай. Зыходзячы з гэтага, напрыклад, складана растлумачыць змяншэнне ўдзельнай вагі ТСЗ у БССР з 26 % — у 1920 г. да 18 % — у 1922 г., калі яшчэ толькі адбывалася ўзнаўленне сельскагаспадарчай вытворчасці [77, с. 10].

Неабходна ўлічваць і дзеянне іншых істотных фактараў, у прыватнасці аграрнай перанаселенасці і малазямелля, якія існавалі ў беларускай вёсцы ў 1920-я гг. Напрыклад, у Аршанскай акрузе на 100 дзесяцін зямлі сельскагаспадарчага прызначэння прыходзілася 89 чалавек (у сярэднім па БССР — 69,5) [67, с. 269]. Адзіным выйсцем з жабрацтва для многіх сялян была арганізацыя сумеснага засеву з захаваннем свайго нязначнага надзелу ў якасці дапаможнай гаспадаркі. Акрамя таго, у ТСЗ яшчэ ў большай ступені былі зацікаўлены тыя, хто ўвогуле не меў зямлі раней: былыя парабкі, працоўныя, рамеснікі. Яны складалі 75 % складу калгасаў Аршанскай акругі і з прычыны адсутнасці вытворчасці (перш за ўсё вольнай зямлі) вымушаны былі весці агульную земляробчую гаспадарку на падставе сельгасінвентару памешчыцкіх маёнткаў [84, с. 118]. Па меры выкарыстання дзяржаўнага зямельнага фонду тэмпы росту такіх аб'яднанняў зніжаліся. У 1926 г. у Аршанскай акрузе мелася больш паловы ўсіх таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі БССР [85, л. 77]. У 1928 г., калі толькі 18,6 % усіх калгасаў акругі было ўтворана на землях дзяржаўнага фонду, удзельная вага ТСЗ у іх ліку знізілася




Дэлегаты Першага Усебеларускага з'езда селькораў.
Мінск. 1925 г., люты (БДАКФФД, 1-011507)




Сяляне аднаго з сельсаветаў Беларусі купляюць аблігацыі
дзяржаўнай пазыкі. 1926 г. (БДАКФФД, 0-052929)



Настаўніца В. М. Сямёнава праводзіць урок беларускай мовы ў 3-м класе Шамоўшчынскай школы Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці. 1939 г. (БДАКФФД, 0-018549)



Школьнікі калгаса «Наперад» па дарозе ў школу. Мазырскі раён. 1939 г. (БДАКФФД, 0-018716)



Настаўніца Губінскай школы С. А. Аксяльрод праводзіць заняткі па вывучэнні выбарчага закона ў калгасе «Чырвоны Сцяг». Беларусь. 1938 г. (БДАКФФД, 0-019273)



Група рабочых на курсах па падрыхтоўцы да працы на вёсцы ў час заняткаў. Гомель. 1930–1932 гг. (БДАКФФД, 0-024949)



Калгаснік-беларус.
1934 г.
(БДАКФФД, 0-023516)



Конюх калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Прапойскага раёна, ардэнаносец, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР М. Я. Батоўкін. 1937 г.
(БДАКФФД, 0-025066)



Пасеў збожжавых у калгасе. 1930 г. (БДАКФФД, 0-023518)

больш чым напалову [86, с. 50]. На змену сітуацыі паўплывала абмежаванне практыкі раздзялення калектыўных гаспадарак на хутары.

Разам з ліквідацыяй ТСЗ яшчэ адным фактарам, які вызначаў зніжэнне іх долі сярод іншых форм калгасаў, з'явіўся пераход ТСЗ на статут сельгасарцеляў і камун. Перадумовы для гэтага былі закладзены ўжо ў самой арганізацыі ТСЗ. На 1 чэрвеня 1928 г. 8,4 % іх утварылася выключна на надзельных землях, яшчэ столькі ж — са значнай прырэзкай з дзяржаўнага фонду, 1,7 % — на арэндаванай зямлі, а астатнія — выключна на землях дзяржаўнай зямельнай маёмасці (ДЗМ) [63, с. 57]. Гэтыя таварыствы былі арганізаваны пераважна беспасеўнымі і малапасеўнымі групамі сялянства (71,5 %), да таго ж 40,3 % уступіўшых не мелі працоўнай жывёлы, а 54,9 % — і ворнага інвентару [86, с. 69]. Такім чынам, яны ці карысталіся інвентаром былых памешчыцкіх маёнткаў, ці набывалі яго праз калектыўны крэдыт. Аднатыповасць матэрыяльнай базы садзейнічала пераходу ТСЗ на статут арцелі і нават камуны. За 1927/28 гаспадарчы год толькі па 5 акругах БССР 3 таварыствы перараслі ў камуны і 11 — у арцелі [59, с. 4].

З цягам часу сцвярджэнне аб немэтазгоднасці арганізацыі калектываў з нізкім узроўнем абагулення ва ўмовах мяса-малочнай жывёлагадоўлі стала звычайнай практыкай. Такі тэзіс, у прыватнасці, прыводзіцца ў «Дакладзе аб кіраўніцтве партыйных арганізацый калгасным будаўніцтвам БССР», падрыхтаваным аддзелам ЦК КП(б)Б па рабоце ў вёсцы з мэтай перакласці віну за недахопы на Д. Ф. Прышчэпава і Наркамат земляробства, якім ён кіраваў [77, л. 140, 142]. Між тым таварная частка малака ў многіх са створаных калектываў была вельмі нізкай ці ўвогуле адсутнічала.

Празаічна, але ва ўмовах малаўрадлівых глеб Беларусі, адсутнасці дастатковай колькасці мінеральных угнаенняў для вядзення агульнай земляробчай гаспадаркі істотнае значэнне набывала не толькі абагуленне зямлі, інвентару, але і гною. Неабходнасць вырашэння дадзенага пытання прыводзіла членаў калгаса да патрэбы мець агульную прадукцыйную жывёлу, што ўжо выходзіла за межы Статута ТСЗ. Гэта садзейнічала як арганізацыі калектыўных гаспадарак непасрэдна ў форме арцелі, так і больш хуткаму пераводу на яе статут таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі.

Такім чынам, на працягу даследуемага перыяду дзейнічаў не адзін, а цэлы шэраг фактараў, якія прадвызначылі перавагу ў БССР сельгасарцелі. У сярэдзіне 1920-х гг. на суадносіны колькасці форм калектыўных гаспадарак у Беларусі паўплывала шырокае развіццё ў рэспубліцы нацыянальнага калгаснага будаўніцтва. Нацыянальныя калектыўныя гаспадаркі ўтвараліся ў пераважнай ступені ў форме арцеляў ці таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі. Калі ў першай палове 1925 г. беларусы складалі ад 90 да 100 % членаў камун, то ў арцелях доля прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей з'яўлялася больш высокай (гл. дадатак, табл. 13). Латышы і літоўцы былі прадстаўлены пераважна ў калектыўных гаспадарках Віцебскай і Полацкай акруг, палякі — у калгасах Мінскай і Аршанскай акруг. Удалейшым пад уплывам падзей суцэльнай калектывізацыі на поўдні БССР узніклі і нямецкія калгасы [88].

З 1928 г. узмацніўся прыток у калектывы сярэдняга сялянства, якое арганізоўвалася ў арцелі, ТСЗ, машынныя таварыствы і г. д. [63, с. 67]. Выкарыстанне трактароў, а таксама іншай сельскагаспадарчай тэхнікі пры ўзворванні і ўборцы ўраджаю дазваляла максімальна скараціць долю ручной працы і апрацаваць значна большыя зямельныя плошчы. Спалучэнне выгод асабістага гаспадарання з абагуленнем тых вытворчых працэсаў, дзе пры гэтым можна было атрымаць значны эканамічны эфект, вызначала найбольшыя перспектывы для развіцця ТСЗ. У некаторых дакументах выдзяляецца нават чацвёрты тып калектыўных гаспадарак: «машынныя, трактарныя і іншыя аб'яднанні, якія прымяняюць сумесную апрацоўку зямлі» [89, с. 76, 77]. Але ў Беларусі ва ўмовах лішку рабочых рук у сялянскай сям'і і малазямелля, з аднаго боку, і недахопу складанай сельскагаспадарчай тэхнікі — з другога, гэтыя аб'яднанні, як і ТСЗ, шырокага распаўсюджання не атрымалі. Па меры паглыблення спецыялізацыі паляводства набывала падначалены характар, што не магло не прадвызначыць больш высокую ступень абагулення прадукцыйнай жывёлы ў сельгасарцелях Беларусі, чым у збожжавых раёнах СССР.

Тое, што ў чэрвені 1929 г. сераднякі ў калектыўных гаспадарках (больш 80 % якіх — арцелі) складалі менш адной трэцяй часткі ўсіх членаў, сведчыць, што асноўная маса сялянства не магла быць уцягнута ў працэс калектывізацыі без прымусу. У канцы 1929 — пачатку 1930 г. выявілася імкненне пераводу арцеляў на статут камуны [90, с. 28], выразна акрэсліліся тэндэнцыі да ўніфікацыі, пачаўся пошук адзінай формы калектывізацыі. Паступова ўсведамляючы, што для сялян ужо сам тэрмін «камуна» выяўляе пагрозу, зважаючы на вопыт часоў «ваеннага камунізму», бальшавіцкая партыя, уладныя структуры паступова рабілі акцэнт на сельскагаспадарчай арцелі. Адзіны для СССР Прыкладны статут быў апублікаваны толькі 6 лютага 1930 г., калі суцэльная калектывізацыя разгортвалася ўжо поўным ходам. Зразумела, што ў выніку ён не паўплываў на рэальныя працэсы арганізацыі сельскагаспадарчых арцеляў. У сакавіку 1930 г. быў абнародаваны Прыкладны статут, які ўдакладняў рэальную ступень абагулення і членства ў калектыўных гаспадарках [91, с. 78—80]. І ўсё ж Прыкладны статут 1930 г. не ахопліваў многіх важнейшых бакоў жыцця калектываў, найперш пытанні ўліку і аплаты працы. Стала актуальнай праблема індывідуальнай матывацыі праз захаванне падсобнай гаспадаркі.

Ужо ў канцы 1920-х гг. вызначыўся працэс адзяржаўлення кааператыўна-калгаснай уласнасці ў асноўных сваіх рысах. Права ўласнасці прадугледжвае магчымасць свабоднага распараджэння не толькі сродкамі вытворчасці, але і атрыманай прадукцыяй (перапрацоўка, захоўванне ці непасрэдная рэалізацыя). Між тым з канца 1927 г. прадпрымаюцца значныя намаганні, каб паставіць збыт калгасамі сельскагаспадарчай прадукцыі пад поўны кантроль дзяржаўных і кааператыўных органаў. Закупачныя цэны на прадукты раслінаводства і жывёлагадоўлі (напрыклад, на збожжа, малако і малочныя прадукты) не пакрывалі нават выдаткаў вытворчасці. Калгасы імкнуліся значную частку сваёй прадукцыі рэалізоўваць праз прыватны рынак [92, с. 29; 93, л. 34, 36, 45, 47, 377]. Ва ўмовах неэк-

івалентнага абмену кантрактацыя паступова набывае абавязковы характар. У найбольшай ступені гэтыя абставіны праявіліся падчас чарговага хлебнага крызісу 1928/29 гаспадарчага года, калі галоўны ўпор быў зроблены на вынятак у калектыўных гаспадарак хлеба.

У лістападзе 1928 г. прымаецца пастанова праўлення Калгасцэнтра аб хлебанарыхтоўчай кампаніі, у якой прапаноўвалася «выявіць усе калгасы, якія адмовіліся ад здачы сваіх зерневых лішкаў ці правялі толькі частковую здачу, і праз адпаведныя калгассаюзы прыняць меры да ліквідацыі такіх з'яў» [94, с. 9]. На месцах непарэдная праца па кантрактацыі была даручана спецыяльным інспектарам па збыце і нарыхтоўках, якія літаральна спаганялі з калгасаў лішкі (а пасля — і неабходную частку сельскагаспадарчай прадукцыі). Ва ўмовах поўнай залежнасці калектыўных аб'яднанняў у сферы забеспячэння сродкамі вытворчасці ад дзяржаўных і кааператыўных органаў толькі асобныя калектывы выказвалі сваю нязгоду з рашэннем праўленняў акруговых калгассаюзаў [93, л. 30]. Апошнія, у сваю чаргу, прымянялі не толькі эканамічныя санкцыі. Кіраўніцтва Віцебскага акркалгассаюза ў канцы 1929 г., напрыклад, патрабавала роспуску і крымінальнага пакарання ўсіх праўленняў калгасаў, якія не выканалі дагавораў па кантрактацыі. Прымусовае выняцце ў калгасаў хлеба без уліку яго спажывецкага значэння стала дадатковым стрымліваючым фактарам на шляху станаўлення калектыўных гаспадарак Беларусі як вытворцаў мяса-малочнай прадукцыі, а па меры разгортвання масавай калектывізацыі нанесла сур'ёзную шкоду развіццю жывёлагадоўлі ў цэлым. Такім чынам, толькі ва ўмовах раўнапраўных эканамічных адносін паміж калгасамі і дзяржавай магчыма паспяховае функцыянаванне буйной калектыўнай вытворчасці ў сельскай гаспадарцы. Гэта прадугледжвае таксама неабходнасць вырашэння праблемы стымулявання індывідуальнай працы ў калектыве.

Падобнага кшталту зацікаўленасць прысутнічала ў спецыяльных відах вытворчай кааперацыі: насенняводчых, малочных і іншых таварыстваў. Уцягванне ў іх склад на правах калектыўных членаў камун, арцеляў і ТСЗ садзейнічала б інтэграцыі калгасаў з дробнымі адзінаасобнымі гаспадаркамі праз арганізацыю вытворчасці па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі. Ва ўмовах ліквідацыі «кулацтва» толькі кааператывы мелі магчымасць набываць высокапрадукцыйную жывёлу. Але ўласнага капіталу жывёлагадоўчая кааперацыя не мела з прычыны бядняцка-серадняцкага складу, асноўныя фонды складала дзяржаўная пазыка. Па гэтай прычыне перспектывы ў яе развіцці партыйныя кіраўнікі не бачылі. З 1929 г. праявіла сябе глыбока ўкаранелае як у тэорыі, так і на практыцы перакананне, што толькі калектывізацыя ў вышэйшых вытворчых формах паскорыць і максімальна абагуліць працэс вытворчасці. Незавершанасць жа працэсу паступовага кааперавання ўзмацнялася значным ростам фармальнага абагулення. І тое і другое моцна дэфармавала кааператыўныя прынцыпы гаспадарання.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Конюков И. А.* Сельскохозяйственная кредитная кооперация и ее значение для крестьянского хозяйства. М., 1927. 48 с.

2. *Погудин В. И.* Путь советского крестьянства к социализму : ист. очерк. М., 1975. 276 с.

3. *Файн Л. Е.* Развитие кооперации в СССР в 20-е годы: основные проблемы и итоги их изучения. Иваново, 1988.

4. *Кабанов В. В.* Судьбы кооперации в Советской России: проблемы, историография // Судьбы Рос. крестьянства. М., 1996.

5. *Ким Чан Чжин.* Кооперативное движение в революционные годы (февраль 1917 — апрель 1919 г.): историографический взгляд // Россия в XX веке. Судьбы исторической науки. М., 1996. С. 249— 257.

6. *Ким Чан Чжин.* Государственная власть и кооперативное движение России — СССР (1905—1930). М., 1996.

7. *Туган-Барановский М. И.* Социальные основы кооперации / предисл., коммент. : Л. А. Булочникова, Г. Н. Сорвина, Т. П. Субботина. М. : Экономика, 1989. 496 с. (Экон. наследие).

8. *Ковальченко И. Д.* Соотношение крестьянского и помещичьего хозяйств в земледельческом производстве капиталистической России // Проблемы соц.-эконом. истории России : сб. ст. М. : Наука, 1970.

9. *Фроянов И. Я.* Погружение в бездну (Россия на исходе XX века). СПб. : Изд-во С.-Петербург. ун-та, 1999. 800 с.

10. *Ленин В. И.* Письмо В. А.Тихомирову и поручение секретарю // Полн. собр. соч. Т. 54.

11. Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам (1917—1967). М., 1967. Т. 1 : 1917—1928 гг.

12. Доклад т. Прищепова «Сельскохозяйственная кооперация». II сессия ЦИК БССР // Звезда. № 164 (1771).

13. Постановление сессии (Вторая сессия ЦИК БССР 6-го созыва ( июль 1924 года)) о мерах к укреплению сельскохозяйственной кооперации // Звезда. № 164 (1771).

14. *Ходзін С. М.* Кааперацыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : БелЭн, 1996. Т. 3 : Гімназіі – Кадэнцыя. С. 512–514.

15. *Милованов В. А.* Динамика колхозного движения в Белоруссии в восстановительный период (1921—1925) // Из истории социалистического строительства Советской Белоруссии : сб. ст. Минск : Изд-во Ан БССР, 1959.

16. *Карпинский В.* Партия и колхозы // Коллективист. 1925. № 7.

17. Бюллетень Первого Всесоюзного совещания с.-х. коллективов (коммун, артелей и товариществ по совместной обработке земли). М., 1925. № 1.

18. Сельскохозяйственные коммуны (по материалам обследования Московского высшего кооперативного института в 1923 г.). М., 1924.

19. Полесский коммунар: орган Гомельского губкома ВКП(б). 1926. № 17.

20. *Биценко А. А.* К вопросам теории и истории коллективизации сельского хозяйства в СССР. М., 1929.

21. *Митрофанов А. Х.* Колхозное движение (его прошлое, современные задачи и значение). М. ; Л., 1929. 143 с.

22. Всероссийский союз сельскохозяйственной кооперации по снабжению крестьянского хозяйства средствами производства (Сельскосоюз) // РДАЭ. Ф. 4106. Воп. 14. Спр. 4.

23. *Михнюк В. Н.* Крестьянство Белоруссии на пути к социализму: историогр. очерк. Минск : Изд-во БГУ. 183 с

24. *Киндеев К.* Коллективные хозяйства. М. : Новая деревня, 1927. 176 с.

25. Победа колхозного строя в Белорусской ССР / М. П. Костюк [и др.[. Минск : Наука и техника, 1981. 448 с.

26. *Ленин В. И.* Речь при обсуждении законопроекта СНК «О мерах укрепления и развития крестьянского сельского хозяйства» на фракции РКП (б) VIII съезда Советов 24 декабря // Полн. собр. соч. Т. 42.

27. Протокол совещания представителей колхозов и сельскохозяйственной кооперации БССР от 26—28 апреля 1922 г. с приложением выступлений делегатов и резолюций совещания; список, анкеты и удостоверения участников совещания // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 644.

28. *Барановский Е.* Некоторые вопросы национальной политики Коммунистической партии Белоруссии в 1920—1922 гг. // Вопр. ист. : тез.докл. XII конф. молодых ученых БССР. Минск, 1969.

29. Съезды Советов в документах. 1917—1936 гг. Т. 3.

30. Приказы, циркуляры, инструкции Наркомзема РСФСР и Наркомзема БССР, переписка с уездземотделами и уездными управлениями народными имениями по организационным вопросам // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 84.

31. Белорусская Социалистическая Республика в 1922/23 г.: к 5-му съезду Советов Белоруссии. Минск : Изд. Совнаркома Белоруссии. 424 с.

32. *Смоліч А.* Сельскагаспадарчыя раёны Беларускае Сав. Сац. Рэспублікі ў 1927—1928 гадох. Папярэдняя схема і мэтодолёгічныя ўвагі. Мінск, 1930. 138 с.

33. Акты инспекторов РКИ БССР об обследовании колхозов БССР по состоянию на 1 сентября 1926 г. // НАРБ. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 2598.

34. Постановление ЦИК и СНК БССР от 5 октября 1924 г. об освобождении учреждений сельскохозяйственного кредита от подоходно-поимущественного и промыслового налогов и гербового сбора, протоколы заседаний ЭКОСО БССР, Положение о Белсельпромсоюзе, доклады и докладные записки Белсельпромсоюза в ЦИК, СНК, ЭКОСО БССР об истории возникновения и развития кооперации в БССР, сбыте товаров сельскохозяйственной кооперации на заграничном рынке, открытии кредитов для усиления сельскохозяйственной кооперации, связи работы сельскохозяйственной кооперации с учреждениями, балансы Белсельпромсоюза и окрсельсоюзов на 1 сентября — 1 октября 1924 г., 1 января 1925 г. // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 237.

35. Краткие обзоры состояния сельскохозяйственной кооперации БССР за 1925—1926, 1926—1927 гг., сводные отчеты окрсельсоюзов о работе сельскохозяйственных товариществ за 1925—1926 гг. // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 609.

36. Советское строительство. 1927. № 1.

37. Доклады и акты обследования колхозов и госземимуществ Бобруйского, Мозырского, Полоцкого и Слуцкого округов // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 2885.

38. Всероссийский союз сельскохозяйственной кооперации по снабжению крестьянского хозяйства средствами производства (Сельскосоюз)// РДАЭ. Ф. 4106. Воп. 14. Спр. 39.

39. Доклад и акты по обследованию состояния сельскохозяйственных земледельческих коммун и коллективных хозяйств Могилевского округа // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 625.

40. Коллективист. 1925. № 4.

41. Циркуляры Колхозцентра СССР и Белколхозцентра об организации работы по развертыванию соцсоревнования и ударничества в колхозах, переписка с Колхозцентром СССР и окрколхозсоюзами по этому вопросу // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 54.

42. Сведения о работе крахмально-паточного завода в колхозе им. В. И. Ленина Пиревичского с/с Жлобинского района Бобруйского округа и акты обследования состояния колхоза // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 29.

43. Инструкция Всесоюзного совета колхозов от 14 ноября 1929 г. о порядке ведения учета ответственных работников сельскохозяйственных коллективов, положения об учетно-распределительном отделе Всесоюзного совета колхозов, Колхозцентра СССР и окрколхозсоюзов, переписка с СНК БССР и окрколхозсоюзами о переподготовке и распределении кадров колхозно-кооперативной системы, список сотрудников Белколхозцентра на 1 апреля 1930 г. // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 3.

44. Постановление Колхозцентра СССР о реорганизации школ крестьянской молодежи в школы колхозной молодежи, учебные планы факультета крупного сельского хозяйства Белорусской государственной академии сельского хозяйства и отделений факультета народного хозяйства Белгосуниверситета на 1929/30 уч. г.; переписка с ЦК ЛКСМБ, Наркомпросом БССР и окрколхозсоюзами о прикреплении школ к предприятиям, совхозам и колхозам с целью их политехнизации // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 48.

45. Краткие обзоры состояния сельскохозяйственной кооперации БССР за 1925—1926, 1926—1927 гг., сводные отчеты окрсельсоюзов о работе сельскохозяйственных товариществ за 1925—1926 гг. // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 609.

46. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и Пленумов ЦК. Т. 1. Минск : Беларусь, 1984.

47. Документы о землеустройстве трудящихся евреев в БССР (резолюция, план, отчеты, доклады, информации) // НАРБ. Ф. 11. Воп. 1. Спр. 48.

48. Отчет Народного Комиссариата Земледелия БССР за 1924/25 хозяйственный год (с 1-го октября 1924 г. по 1-ое октября 1925 г.). Минск : Наркомзем Белоруссии, 1926. 183 с.

49. План Наркомзема БССР по заготовке и реализации сельскохозяйственных машин, орудий, семян и удобрений на 1927—1928 гг., доклады Белсельсоюза о состоянии и очередных задачах колхозного строительства, кооперировании польского и латышского населения БССР, сведения об оборотах сельскохозяйственной кооперации БССР за 1927–1928 гг., балансы Белсельсоюза и окрсельсоюзов на 1 октября 1927 г. и 1 января 1928 г. // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 753.

50. Акты инспекторов РКИ БССР об обследовании колхозов БССР по состоянию на 1 сентября 1926 г. // НАРБ. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 2598.

51. *Данилов В. П.* Советская доколхозная деревня: население, землепользование, хозяйство. М. : Наука, 1977. 317 с.

52. Доклады и акты обследования колхозов и госземимуществ Бобруйского, Мозырского, Полоцкого и Слуцкого округов // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 2885.

53. *Чмыга А. Ф.* Колхозное движение на Украине (1917—1929 гг.): очерки истории. М. : Изд-во Моск. ун-та, 1974. 320 с.

54. *Лук'янчык А.* Увага калгаснаму будаўніцтву // Бальшавік Беларусі. 1928. № 8.

55. Справаздача Менскага акруговага кіраўніцтва «Озет» за 1928—1929 гг. Менск, 1928.

56. *Цейтлин М. С.* Строительство колхозов // Сов. стр-во. 1928. № 12. С. 89—90.

57. Справаздача аб дзейнасці Бабруйскага Акруговага Выканаўчага Камітэта за 1926/27—1928/29 гг.

58. Доклады о состоянии еврейских колхозов Витебского округа и резолюции Бюро Витебского окружкома КП(б)Б по докладам // НАРБ. Ф. 338. Воп. 1. Спр. 1.

59. Белсельсаюз: справаздача за 1927/28 апэрацыйны год (7-мы год дзейнасьці). Менск, 1929. 116 с.

60. Циркуляры Белгосстраха о порядке выплаты страхового вознаграждения за застрахованное имущество колхозников, протоколы заседаний и отчет комиссии при Управлении пожарной охраны НКВД БССР об итогах проведения двухнедельника противопожарной охраны в сельской местности // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 11.

61. *Герасименко Г. Г.* Деятельность Компартии Белоруссии по вовлечению трудящихся масс в управление государством. 1925—1937. Минск : Изд-во БГУ, 1973. 230 с.

62. *Стрельцов М. Е.* О формах колхозного строительства в БССР в 1921—1928 гг. // Тез. докл. и сообщ. XIV сессии межреспуб. симпоз. по аграр. ист. Восточ. Европы (Минск — Гродно, 25—29 сент. 1972 г.). М., 1972. Вып. 2.

63. Калгасы БССР (Папярэднія вынікі абследаванняў калгасаў у 1928 і 1929 гадах). Мінск : ЦСУ БССР, 1929. 78 с.

64. Материалы к протоколам № 1—24 заседаний коллегии Наркомзема БССР за январь — июнь 1922 г. (Постановление ЦИК БССР о трудовом землепользовании, Инструкция о порядке пользования торфяными залежами БССР для промышленных целей, устав сельхозартели, протоколы заседаний агроколлегии и положение о ней, резолюции и тезисы агросовещания БССР от 20—25 октября 1921 г., положение о реорганизации отдела снабжения в Центроземскладе, список членов коллегий уездземотделов и др.) // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 318.

65. Устав Трудовой Земледельческой Артели. М., 1925.

66. Устав трудовой земледельческой артели «Культура» в дер. Людвиновка Озаричского района Мозырского округа, протокол организационного собрания от 9 марта 1924 г. и список членов артели, заявления местечкового еврейского населения в Белкомзет об отводе им земельных участков для организации артелей, коммун // НАРБ. Ф. 11. Воп. 1. Спр. 7.

67. *Шкляр М. Е.* Борьба Компартии Белоруссии за укрепление союза рабочего класса и трудящегося крестьянства в восстановительный период (1921—1925 гг.). Минск : Госиздат БССР, 1960. 348 с.

68. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов (окрколхозсоюз) // ДАВВ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 9.

69. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов (окрколхозсоюз) // ДАВВ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 14.

70. *Чмыга А. Ф.* Формы коллективных хозяйств в СССР // Тез. докл. и сообщ. девятой (таллинской) сессии симпоз. по аграр. ист. Восточ. Европы. Таллин, 1966, С. 268.

71. Устав Белколхозсоюза, протоколы заседаний правления Белколхозсоюза, комиссии по коллективизации при Белсельсоюзе, доклады, тезисы докладов о состоянии колхозов, развитии животноводства и молочного хозяйства в них, мерах по повышению урожайности и другим вопросам колхозного строительства // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 854.

72. Протоколы и выписки из протоколов заседаний СНК, ЭКОСО, финансово-бюджетной и сельскохозяйственной секций Госплана БССР, планы работы СНК и Госплана БССР на 1927/28 г., отчет об оказании помощи крестьянской бедноте по БССР за 1926/27 г., справки НК РКИ БССР по обследованию системы сельскохозяйственного кредита, состояния молочной кооперативной сети и колхозов БССР, сведения Центральной секции колхозов БССР о колхозном движении среди нацменьшинств БССР на 1 октября 1927 г., переписка с ЭКОСО, НК РКИ, Наркомфином БССР и другими о кредитовании сельскохозяйственной кооперации, проведении конкурса на лучшее сельскохозяйственное кредитное товарищество и другим вопросам // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 727.

73. Статут сельскагаспадарчай арцелі. Менск, 1928.

74. Протоколы заседаний правления Минской окружной секции колхозов и Минского окрколхозсоюза // НАРБ. Ф. 338. Воп. 2. Спр. 1 а.

75. Акты обследования состояния еврейских сельскохозяйственных артелей Бобруйского, Борисовского и Полоцкого округов // НАРБ. Ф. 11. Воп. 2. Спр. 8.

76. Земельный отдел исполнительного комитета Минского окружного совета // ДАМВ. Ф. 196. Воп. 1. Спр. 252.

77. *Ильин Е. И.* Колхозы СССР и их удельный вес в строительстве Советского Союза. М. : Сельхозгиз, 1930.

78. Статут сельскагаспадарчай камуны. Менск, 1928.

79. *Данилов В. П.* Советская доколхозная деревня: социальная структура, социальные отношения. М. : Наука, 1979. 358 с.

80. Колхозы СССР: статистический справочник. М. : ЦСУ СССР, 1929. 80 с.

81. Из истории совхозного и колхозного строительства (к концу восстановительного периода) // Исторический архив. 1960. № 1.

82. *Чмыга А. Ф.* Колхозное движение в первое десятилетия советской власти // Октябрь и советское крестьянство. 1917—1927 гг. М. : Наука, 1977. С. 219—238.

83. Плуг. 1926. № 10.

84. *Гармизе И.* Сельскохоз. кооперация в Белоруссии // Сов. стр-во. 1925. № 5—6.

85. Акты инспекторов РКИ БССР об обследовании колхозов БССР по состоянию на 1 сент. 1926 г. // НАРБ. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 2598.

86. Справаздача Аршанскага Акруговага выканаўчага камітэту. Ворша, 1929. 161 с.

87. Протоколы заседаний Бюро ЦК КП(б) Белоруссии и материалы к ним, № 35—45. 27 сент. — 23 нояб., на 372 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4328.

88. К протоколу № 45 о заседании секретариата ЦК КП(б)Б от 1 октября 1931 г. Д. 196 // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 8. Спр. 5128. Л. 73—75.

89. Правила кредитования сельскохозяйственных коллективов // Шлях коопэрацыі. 1928. № 3. (63).

90. *Приходько А. А.* Государственно-правовое руководство коллективизацией сельского хозяйства Белоруссии (1929—1936 гг.). Минск : Изд-во БГУ, 1970. 100 с.

91. *Ивницкий Н. А.* Коллективизация и раскулачивание (начало 30-х годов). М. : ИНТЕРПРАКС, 1994. 269 с. (Программа «Обновление гуманитарного образования в России»).

92. *Агеяў Л.* Жывёлагадоўля і пэрспэктывы яе развіцьця ў калгасах БССР // Сел. і ляс. гасп-ка. 1928. № 3—4.

93. Гомельский окружной союз сельскохозяйственных коллективов, машинных, поселковых и мелиоративных товариществ (Гомколхозсоюз) // ДАГВ. Ф. 138. Воп. 1. Спр. 17.

94. Колхозцентр : информационный бюллетень. 1928. № 1.

## 2.4. АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Пры самых розных падыходах да вызначэння сутнасці мадэрнізацыі большасць даследчыкаў сыходзяцца на думцы, што яна мае комплексны, працяглы і шматварыянтны характар. Сістэмна-функцыянальны падыход дазваляе вызначыць ролю традыцыі як фактару, які не толькі шмат у чым вызначае накіраванасць і спецыфіку пераўтварэнняў, але і захоўвае свой уплыў у грамадстве перыяду яго трансфармацыі. Для Беларусі з сярэдзіны XVIII ст. характэрным з'яўлялася размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў бліжэй да крыніц сыравіны і таннай працоўнай сілы. Значная колькасць прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі была ўтворана ў Беларусі на пачатку XX ст. Гэты працэс атрымаў працяг і ў савецкі час.

1920—30-я гг. не былі для Беларусі перыядам індустрыялізацыі ў класічным разуменні гэтага тэрміну — як развіццё перш за ўсё цяжкай прамысловасці. У такім кантэксце мадэрнізацыя праходзіла ў другой палове 1940-х — 1950-я гг. І ўсё ж перыяд 1921—1939 гг. дазваляе даследаваць не толькі працэсы мадэрнізацыі, але і змены ў поглядах на адну з яе важнейшых складаючых — індустрыялізацыю. У 1920-я гг. індустрыялізацыя дастаткова часта разглядалася ў больш шырокім кантэксце — як працэс, што закранае ўласна індустрыю і сельскагаспадарчую вытворчасць [1—4, 5, с. 31].

Прамысловая вытворчая дзейнасць у сельскагаспадарчым сектары называлася ў 1920-я гг. «*чацвёртым сектарам*» прамысловасці (пасля дзяржаўнай прамысловасці, прамысловай кааперацыі і прамысловай вытворчасці спажывецкай кааперацыі). Тэрмін «індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі» вызначаўся па-рознаму. На думку большасці савецкіх навукоўцаў таго часу, індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі — непасрэдная арганічная сувязь земляробства з тэхнічнай перапрацоўкай сельскагаспадарчай прадукцыі, ці аб'яднанне на гэтай аснове прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў у адно прадпрыемства. Пры гэтым праводзілася розніца паміж перапрацоўкай прадуктаў сельскай гаспадаркі дзяржаўнай прамысловасцю і перапрацоўкай, якая адбывалася на саміх сельскагаспадарчых прадпрыемствах. На думку другой групы вучоных, сфера перапрацоўкі сельскагаспадарчай сыравіны — гэта адзін з элементаў індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі, бо неабходна ўлічваць яшчэ і тое, што сама сфера вытворчасці сельскагаспадарчай сыравіны (паляводства і жывёлагадоўля) падвяргаецца індустрыялізацыі з-за пераходу на машынную сістэму вытворчасці. Пытанне аб тым, што разумець пад індустрыялізацыяй сельскай гаспадаркі (тэхнічную перапрацоўку сельскагаспадарчай сыравіны ці механізацыю вытворчасці), вырашалася часам па прынцыпе «альбо-альбо». Частка тэарэтыкаў і практыкаў 1920-х гг. увогуле выказвала сумненне ў абгрунтаванасці прымянення «індустрыялізацыі» да сельскай гаспадаркі і зводзіла яе да паскоранага развіцця цяжкай прамысловасці, да індустрыяльных пераўтварэнняў, што адбываліся ў народнай гаспадарцы ў выніку хуткіх тэмпаў яе развіцця.

Пытанне аб перавагах буйной калектыўнай гаспадаркі перад дробнай, адзінаасобнай, у рэшце рэшт вырашалася ў сферы вытворчасці. У сярэдзіне 1920-х гг. выявілася замаруджванне тэмпаў росту вытворчых кааператываў і павелічэнне простых відаў кааперацыі, якія калектывізавалі толькі збыт і перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі. Гэты працэс у другой палове 1920-х гг. сутыкнуўся з нявырашанасцю збожжавай праблемы — той сферы, дзе перавагі буйной гаспадаркі выяўляліся больш хутка і наглядна дзякуючы прымяненню машын.

У 1921—1925 гг., калі адбывалася аднаўленне сельскагаспадарчай вытворчасці рэспублікі, перавага збожжавых культур з'яўлялася характэрнай як для калектыўных аб'яднанняў, так і для адзінаасобных сялянскіх гаспадарак. Больш высокую ўраджайнасць калгасы атрымалі далёка не адразу. Яшчэ ў 1924 г. (а па асобных культурах — і ў 1925 г.) ураджаі ў гаспадарках адзінаасобнікаў былі вышэйшыя (гл. дадатак, табл. 16). У 1925—1926 гг. становішча змяняецца, аднак найчасцей не ў выніку прымянення калектывамі тэхнікі, а за кошт таго, што яны займалі найбольш урадлівыя глебы [6, л. 4; 7, л. 108]. Павышэнню ўраджайнасці ў калгасах садзейнічала і аднаўленне малочнага статка, прымяненне мінеральных угнаенняў (фасфарытаў, суперфасфату, калійнай солі) [8, с. 95; 9, л. 1—24]. Лепшае землезабеспячэнне дазваляла калектыўным гаспадаркам шырока выкарыстоўваць шматпольныя севазвароты. Значныя плошчы засяваліся шматгадовымі травамі. Сялянскія гаспадаркі ў 1927/28 гаспадарчым годзе хутка зрэагавалі на павышэнне рынкавых цэн на хлеб і павялічылі плошчы збожжавых, а ў калгасах працягвалася іх далейшае скарачэнне.

Памер вытворчасці ўздзейнічаў на таварнасць прадукцыі як адзінаасобнага, так і калектыўнага паляводства. Больш буйныя сялянскія адзінаасобныя гаспадаркі выраблялі больш таварнага збожжа, чым сярэднія і дробныя. Такая ж заканамернасць назіралася паміж асобнымі відамі калектыўных аб'яднанняў. У 1929 г. у камунах таварнасць жыта складала 63,1 %, у арцелях — 13,3 % і ў ТСЗ — 0,6 % [10]. Ва ўмовах зніжэння таварнасці збожжавых (з 1925/26 па 1927/28 гаспадарчы год прыкладна ў тры разы) [11, с. 62] і канцэнтрацыі ўвагі кіраўніцтва па дадзенай праблеме фарміравалася ўяўленне аб тым, што цяжкасці з хлебанарыхтоўкамі можна пераадолець на аснове фарсіравання калектывізацыі і павышэння ступені абагульнення ў калектыўных гаспадарках.

Між тым пры параўнальна невысокай урадлівасці (на 1—1,5 ц пераважаючай сялянскую) павелічэнне таварнасці ў калгасах магло адбывацца толькі ў выпадку памяншэння ўнутранага спажывання. Найбольш аптымальным было скарачэнне выдаткаў збожжа на корм коней у выніку замены іх трактарамі. У 1927 г. пасевы аўса ў калгасах складалі больш траціны ўсіх пасеўных плошчаў пад збожжавымі і зернебабовымі культурамі [12, л. 71]. Забеспячэнне тэхнікай дазваляла таксама ўзняць ураджайнасць на аснове палепшаных прыёмаў апрацоўкі глебы. У іншым варыянце павышэнне таварнасці магло адбывацца толькі шляхам змяншэння колькасці зернепрадуктаў, якія ішлі на харчаванне членаў калектыву і на корм жывёле. Недастатковая тэхнічная аснашчанасць перадвызначыла ў далейшым менавіта такі вынік.

Нягледзячы на высокую таварнасць збожжавых у калгасах, даходы ад іх рэалізацыі для калектываў з'яўляліся неістотнымі. Паводле даных ЦСУ, у 1927/28 гаспадарчым годзе ўдзельная вага збожжавых культур у кошце таварнай часткі прадукцыі раслінаводства калектыўных гаспадарак складала 3,3 %, тэхнічных — 0,9 %, бульбы — 5,7 %, садавіны — 80,1 % [13, л. 66]. Гэта тлумачыцца высокай забяспечанасцю калгасаў садовымі насаджэннямі. У 1926/27 гаспадарчым годзе плошчы пад імі ў калектыўных гаспадарках (у разліку на 100 едакоў) у сотні разоў былі вышэй, чым у адзінаасобных. Калі ў сялянскіх гаспадарках у сярэдзіне 1920-х гг. суадносіны саду і раллі складалі 1 : 884, то ў калектыўных 1 : 18 [14, с. 66, 68]. Пры гэтым чыстая таварнасць садавіны ў калгасах БССР дасягнула 93 % [13, л. 65]. У Гомельскай і Рэчыцкай акругах менавіта ад садаводства залежаў дабрабыт членаў калгасаў [15, л. 28—35].

Менш эфектыўна развіваліся ў калгасах пчалярства і агародніцтва — галіны, дзе механізацыя не прымянялася, а неабходнай была руплівая ручная праца. У шэрагу выпадкаў вырошчванне агародных культур стрымлівалася рынкавымі ўмовамі. Так, арцель «Ясная Паляна» Гомельскай акругі з-за адсутнасці рынку збыту вымушана была скарміць жывёле ўвесь вырашчаны ў 1926 г. ураджай капусты ў некалькі тысяч пудоў [15, л. 34]. Прыклад кітайскай камуны «Маркавічы» Віцебскага раёна паказвае, што пры ўменні весці агародную гаспадарку дадзеная галіна прыносіла значныя прыбыткі. Калектыў разлічыўся з пазыкамі, купіў неабходную тэхніку, коней, кароў, свіней [15, л. 34]. Значнае развіццё агародніцтва атрымала таксама ў яўрэйскіх арцелях. У Бабруйскай акрузе ў 1927/28 гаспадарчым годзе ў агульнай масе таварнай часткі калектыўных гаспадарак зернепрадукты складалі 3,9%, бульба — 10,8 %, гародніна — 10,4 %. Найбольшы прыбытак быў атрыманы ад рэалізацыі малочнай прадукцыі (67,8 % усяго даходу) [16, с. 31]. У цэлым у калгасах рэспублікі жывёлагадоўля мела другараднае значэнне. У 1928 г. з 902 сельгасарцеляў і камун 573 гаспадаркі адзначылі ў якасці галоўнай галіны (па кошце валавых паступленняў) паляводства і толькі 163 — жывёлагадоўлю [12, л. 47]. Маючы лепшыя магчымасці для развіцця мяса-малочнай жывёлагадоўлі (вялікія плошчы сенажаці, пасеваў шматгадовых траў і г. д.), калгасы БССР да пачатку масавай калектывізацыі не выявілі значных пераваг у гэтай сферы вытворчай дзейнасці перад адзінаасобнымі гаспадаркамі. Калі апошнія ў значнай масе ў 1925/26 гаспадарчым годзе адчувалі недахоп кармоў, то ў калектыўных гаспадарках, наадварот, меўся іх лішак [17, л. 10, 27, 43, 58, 150, 181, 216, 263, 281, 317, 332, 369, 419].

Павелічэнне малочнага статка, колькасці свіней і птушкі ў калектыўных гаспадарках мела вынікам пашырэнне пасеваў бульбы і караняплодаў, рост спажывання хлебапрадуктаў, што выклікала асаблівы непакой кіраўніцтва Белсельсаюза. Калгасам прадпісвалася адшукаць замену фуражнаму збожжу [18, л. 259, 260]. Тэндэнцыя развіцця вытворчасці калектыўных гаспадарак у кірунку жывёлагадоўлі з канца 1920-х гг. абмяжоўвалася ўзрастаючым выняццем хлеба. Аднак да 1929 г. памеры кантрактацыі збожжавых культур у калгасах былі даволі нязначнымі. Да лютага 1929 г. дагаворы кантрактацыі меліся толькі ў 48 гаспадарак (з

1027), і ў лік яе паступіла 0,13 % ад атрыманых у калгасах БССР зернепрадуктаў [12, л. 45]. Гэта пацвярджае вывад аб адсутнасці ў калгасах менавіта ўнутрыгаспадарчых стымулаў для развіцця жывёлагадоўлі.

Па даных Белсельсаюза, у 1927/28 гаспадарчым годзе ў таварнай частцы атрыманай прадукцыі доля жывёлагадоўлі перавысіла ўдзельную вагу раслінаводства — 61,12 % супраць 21,57 % [19, с. 9]. Аднак гэтыя звесткі нельга прызнаць настолькі сапраўднымі, каб на падставе іх можна было зрабіць вывад аб значных зменах, што адбыліся ў структуры вытворчасці калектыўных аб'яднанняў. Белсельсаюзам улічвалася толькі тая частка прадукцыі, якая рэалізоўвалася праз кааператыўныя органы. Але да сярэдзіны 1928 г. праз сістэму сельгаскааперацыі калгасамі збываліся цалкам толькі малочныя прадукты і тэхнічныя культуры. Гародніна, садавіна і збожжа прадаваліся прыватным асобам [11, с. 88].

У 1920-я гг. калгасы выявілі сябе перш за ўсё як патэнцыяльныя пастаўшчыкі больш таннай прадукцыі. Па разліках эканаміста 1920-х гг. прафесара М. Макарава, калгасы БССР маглі прадаваць сваю прадукцыю ніжэй існаваўшых рынкавых цэн на 30 %, у той час як насельніцтва пасёлкаў і хутаране адчувалі патрэбу ў іх павышэнні на 8—15 % [20, с. 39, 41, 57]. Аднак эфектыўнасць выкарыстання зямлі ў калектыўных гаспадарках была ніжэй, чым у адзінаасобных [20, с. 57]. Разам з галінамі (збожжавая гаспадарка, бульбаводства, лугаводства), дзе мелася магчымасць прымянення трактароў і іншай складанай сельскагаспадарчай тэхнікі, існавалі сферы вытворчасці, дзе выгады сумеснай працы на той час былі не такімі заўважнымі. Большым поспехам карысталіся малочныя арцелі, абагульняўшыя збыт малочнай прадукцыі. Адным з прыкладаў з'яўляецца масласыраварная арцель «Маланка», створаная ў 1926 г. у Дзяржынскім раёне. Сяляне арганізавалі дастаўку малака на бліжэйшую станцыю (Фаніпаль), устанавілі штрафы за няякаснае малако. Такога кшталту кааператывы не садзейнічалі паляпшэнню малочнага статка, мелі пэўныя абмежаванні для росту [21, с. 139]. З другога боку, пэўныя поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі дэманстравалі асобныя саўгасы. Напрыклад, саўгас «Рачкавічы» меў масласырзавод, працаваў над павышэннем прадукцыйнасці жывёлы, прымяняў сучасныя арганізацыйна-тэхнічныя нормы [22].

Наяўнасць як пераваг, так і пэўных недахопаў у сферы функцыянавання буйной сельскагаспадарчай вытворчасці стварала перадумовы для спалучэння каапераваных форм як дробных, так і буйных гаспадарак на вёсцы, інтэгруючых збыт і перапрацоўку сваёй прадукцыі. Пэўны вопыт перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі быў назапашаны спецыяльнымі прамысловымі арцелямі, што дзейнічалі ў вёсцы. Савецкая прамысловая кааперацыя была ў 1920-х і на пачатку 1930-х гг. цесна звязана з земляробствам. У вёсцы знаходзілася большая частка (70 %) рамесных майстэрняў, пры гэтым рамеснікі да стварэння адпаведнай галіны машынабудаўнічай прамысловасці былі галоўным вытворцам сродкаў і прылад працы для сялянства.

Унікальным вопытам з'явілася перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі як сферы прамысловай дзейнасці калгасаў. Яна набывала асаблівае значэнне з прычыны спецыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ў Беларусі ў кірунку

мяса-малочнай жывёлагадоўлі, ільнаводства і бульбаводства. Драбленне сельскагаспадарчай вытворчасці і памяншэнне яго таварнай часткі перадвызначалі стагнацыю аграрнай па сутнасці эканомікі рэспублікі.

Такая тэндэнцыя акрэслілася ў другой палове 1920-х гг. і атрымала адлюстраванне ў Пастанове ЦВК СССР па дакладзе Урада БССР у лютым 1927 г. [23, л. 90]. Вядомай яе перадумовай з'явілася аднаўленне сельскай гаспадаркі і паглыбленне спецыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці рэспублікі. З 1926 г. пачынаецца працэс перадачы калектыўным аб'яднанням у працоўнае карыстанне падсобных прадпрыемстваў і майстэрняў, якія размяшчаліся на іх тэрыторыі. У лютым 1926 г. была прынята Пастанова Эканамічнай Нарады пры СНК БССР аб спецыяльным фондзе для крэдытавання мерапрыемстваў па індустрыялізацыі калгасаў [24, л. 3]. Крэдыты з дадзенага фонду выдаваліся выключна на будаўніцтва, капітальны рамонт, абсталяванне вытворчых прадпрыемстваў і павінны былі выкарыстоўвацца па непасрэдным прызначэнні, у зваротным выпадку ўстановам сістэмы сельскагаспадарчага крэдыту дазвалялася патрабаваць іх датэрміновага пагашэння [25, арт. 175].

У 1925/26 гаспадарчым годзе камуны і сельгасарцелі Беларусі мелі 37 прадпрыемстваў, з іх 31 — вадзяны млын; толькі ў адным калгасе рэспублікі дзейнічаў масласырзавод, у наступным годзе — ужо 38 масласырзаводаў. Тэмпы росту прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі былі даволі імклівымі. Развіццё ж крухмальных заводаў стрымлівалася ў выніку нізкага тэхнічнага абсталявання і адсутнасці попыту на іх прадукцыю [19, с. 10; 26, с. 252; 27, л. 10]. У калгасах меліся плодасушыльні, вінаробчыя і маслабойныя заводы (перапрацоўка насення льну і каноплі ў алей). Аднаўляліся прадпрыемствы па выпуску цэглы, чарапіцы, вапны; разам з ростам колькасці млыноў павялічвалася колькасць лесапілак [28, с. 58, 59]. На 1 кастрычніка 1928 г. толькі ў калгасах Мінскай акругі налічвалася 39 розных прамысловых і дапаможных прадпрыемстваў. Згодна з планам на 1928/29 гаспадарчы год рыхталіся да пабудовы: крухмальны завод з перапрацоўкай да 200 тыс. пудоў бульбы ў год, 5 буйных масларобча-сыраварных заводаў і 2 плодасушылкі. Акрамя прадукцыі сваіх гаспадарак прадпрыемствы калгасаў перапрацоўвалі і сельскагаспадарчую сыравіну навакольнага сялянства [29, с. 41].

Паступова пераадольвалася імкненне калектыўных аб'яднанняў да стварэння найбольш простых тыпаў прадпрыемстваў, якімі былі млыны. Зніжэнне іх удзельнай вагі (з 83 % у 1925/26 гаспадарчым годзе да 39 % у 1927/28 гаспадарчым годзе) абумоўлівалася тым, што млыны былі выключна дробнымі, мелі нагрузку не больш за 30 % ад сваёй магутнасці. Гэта павялічвала сабекошт памолу і часта прыносіла гаспадаркам не прыбытак, а страты [19, с. 10; 26, с. 252; 27, л. 10].

Нягледзячы на колькасны рост прадпрыемстваў калгасаў (з 37 у 1925/26 гаспадарчым годзе да 213 у 1927/28 гаспадарчым годзе), кіраўніцтва Белсельсаюза адзначала недастатковую работу па выкананні плана індустрыялізацыі. Па-ранейшаму праекты і каштарысы на тэхнічныя прадпрыемствы калектыўных гаспадарак складаліся выпадковымі людзьмі па прыватнай дамоўленасці. Назіранне за іх

выкананнем даручалася прыватным асобам, нярэдка недастаткова кампетэнтным у пытаннях індустрыялізацыі. Невыкананне плана пераабсталявання прадпрыемстваў па перапрацоўцы малака з'яўлялася адной з галоўных прычын таго, што сярэдні кошт аднаго завода калгасаў у 1926/27 гаспадарчым годзе складаў 1408 руб. замест 4—6 тыс. для сярэднеабсталяваных заводаў. Нягледзячы на рост удзельнай вагі ў сетцы масласырзаводаў малочнай кааперацыі прадпрыемстваў калектыўных гаспадарак, большасць іх заставалася дробнымі, знаходзілася ў памяшканнях, якія не адпавядалі элементарным тэхнічным і санітарна-гігіенічным нормам вытворчасці [19, с. 10; 30, с. 29, 30].

Узнікала пытанне аб эканамічнай мэтазгоднасці арганізацыі ў калгасах невялікіх дапаможных прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі. Абсталяваныя састарэлай тэхнікай, яны мелі больш высокія выдаткі вытворчасці, чым буйныя спецыялізаваныя прадпрыемствы. Імкненне вырашыць дадзеную супярэчнасць і гарманічна з'яднаць прамысловасць з сельскай гаспадаркай нярэдка прыводзіла да пашырэння дзейнасці прадпрыемстваў за межы аднаго калгаса [31, л. 39]. Ужо на той час меліся прыклады, калі набліжэнне прамысловай вытворчасці да крыніц сыравіны ў сельскай гаспадарцы давала значны эфект. Так, сыраварны завод камуны «Звязда» Пухавіцкага раёна пастаўляў сыр у Германію. Аб высокай якасці сыра і іншых малочных прадуктаў сведчыла і тое, што камуна за іх атрымала на сваёй раённай і Усебеларускай выставе па малочнай справе дыплом І ступені. Нягледзячы на ведамасныя бар'еры, прыбытак сельгаскамуны «Звязда» ад свайго прадпрыемства толькі з 1927 па 1928 г. павялічыўся ў 5 разоў [32, с. 21—24]. На пачатку сваёй дзейнасці адрамантавала і пераабсталявала крухмальны завод камуна імя Карла Лібкнехта Магілёўскай акругі. Прыбытак ад яго склаў у 1920 г. 1500 руб., а ў 1928 г. — ужо больш за 27 тыс. Адходы выкарыстоўваліся на корм жывёле і продаж сялянам. Апошнія адзначалі, што ў выніку такой дабаўкі ў іх гаспадарцы павысіліся надоі малака [33, л. 174, 233; 34, с. 55, 56]. Значнае развіццё атрымала перапрацоўка прадукцыі жывёлагадоўлі ў сельскагаспадарчых арцелях імя Вінчэўскага Віцебскай акругі і «Іскра» Бабруйскай акругі. Выробленыя імі сыры і масла экспанаваліся на раённых і рэспубліканскіх выставах. Умела выкарыстоўваліся і адходы перапрацоўкі. Напрыклад, у арцелі «Іскра» пры заводзе быў арганізаваны адкорм свіней і цялят, што прыносіла калектыву значны прыбытак. Адчуваючы недахоп уласнай сыравіны, сельгасарцелі арганізоўвалі закупку малака ў навакольных сялянскіх гаспадарках. У далейшым меркавалася стварыць вакол прадпрыемстваў спецыяльныя кааператыўныя таварыствы [35, л. 168, 170, 174, 180; 36, л. 17].

Развіццё сферы перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі ў калектыўных гаспадарках у 1920-я гг. вызначала магчымасць з'яднання ў пэўных прапорцыях дробнай вытворчасці з буйной. Чым больш буйным з'яўлялася прадпрыемства, тым больш сучасным быў працэс перапрацоўкі. З іншага ж боку, звязанае з гэтым павелічэнне адлегласці прыводзіла да падаражання канчатковай прадукцыі. Да таго ж пагаршаліся ўмовы выкарыстання адходаў перапрацоўкі, якія валодалі значнай каштоўнасцю ў якасці кармоў ці ўгнаенняў.

Дапаможныя прамысловыя прадпрыемствы ў калектыўных гаспадарках садзейнічалі вырашэнню праблемы рацыянальнага выкарыстання працоўных рэсурсаў. А. В. Чаянаў у 1919 г. у якасці неспрыяльнага адрознення арцельнай гаспадаркі ад капіталістычнай адзначаў перш за ўсё тое, што апошняя (капіталістычная) «змяшчае ў сабе заўсёды такую колькасць працы, якая неабходна ёй у дадзены момант, і ні адным працоўным больш» [37, с. 305]. Сапраўды, пераважная большасць сельскагаспадарчых арцеляў і камун Беларусі шырока выкарыстоўвала ў сярэдзіне 1920-х гг. наёмную працу падчас правядзення ўборачных работ і адчувала сур'ёзныя цяжкасці з забеспячэннем членаў сваіх аб'яднанняў працай у зімні перыяд. Неабходна таксама ўлічваць, што звыш 50 % сялян да ўступлення ў калгасы займаліся саматужнымі промысламі [38, с. 87]. Развіццё падсобнай вытворчасці ў калектыўных гаспадарках дазваляла больш поўна і раўнамерна выкарыстоўваць на працягу года рэсурсы працоўнай сілы для павелічэння масы тавараў, якія карысталіся попытам на рынку.

На працягу трох гадоў (з 1925/26 па 1927/28 гаспадарчы год колькасць млыноў вырасла да 83, крухмальных заводаў — удвая, лесапільных — з 2 да 16, масласырзаводаў — да 84. Акрамя таго, было створана 12 маслабойняў і некалькі прадпрыемстваў па вытворчасці цэглы і чарапіцы. У чэрвені 1928 г., абагульняючы вынікі абследавання калгасаў, ЦСУ БССР пазначала, што праз індустрыялізацыю калектыўных аб'яднанняў наладжвалася іх сувязь з навакольным сялянствам шляхам перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі і абслугоўвання рознага роду майстэрнямі: кузнямі, абутковымі, сталярнымі і г. д. [39, с. 22]. Адбывалася паступовае гаспадарчае зрошчванне калгасаў з сялянскімі гаспадаркамі, якія знаходзіліся побач, у выніку паслядоўнага абагулення апошніх. Так, пры камуне «Чырвоны Сцяг» Віцебскай акругі на аснове масларобна-сыраварнага завода была арганізавана малочная арцель «Жывёлавод». Яна аб'яднала акрамя калгасаў 160 двароў з 350 каровамі. У камуне таксама планавалася стварэнне сушылкі ці вінаробчага завода для сумеснай перапрацоўкі і збыту прадукцыі садоўніцтва [40, с. 26].

Утварэнне сумесных аб'яднанняў такога роду не заўсёды прадугледжвала абагуленне буйной рагатай жывёлы, садоў і іншай маёмасці. Аднак не толькі А. В. Чаянаў, але і такі пераканаы прыхільнік буйной вытворчасці, як К. Каўцкі, падкрэслівалі той вялікі інтэгруючы ўплыў, які аказваюць сумесныя прадпрыемствы на дробныя сялянскія гаспадаркі, калі абагульняюць перапрацоўку сельскагаспадарчай прадукцыі [41, с. 733—752; 42, с. 229, 230]. У рэзалюцыі XV з'езда партыі бальшавікоў «Аб працы ў вёсцы» канстатавалася, што важнейшую ролю ў працэсе вытворчага кааперыравання «адыгрывае ўжо цяпер і яшчэ больш будзе адыгрываць у далейшым сельскагаспадарчая індустрыя (як дзяржаўная, так і кааператыўная), непасрэдна звязаная — і тэхнічна, і эканамічна — з сельскагаспадарчай вытворчасцю, якаяператварае лад гэтага апошняга» [43, с. 300]. Па меркаванні тагачасных спецыялістаў, куставыя аб'яднанні калгасаў маглі выкарыстоўваць і формы садова-агароднай кааперацыі з навакольным сялянствам. Перапрацоўка і збыт прадукцыі, наём спецыяліста-садавода дазволілі б, з іх пункту гледжання, не толькі палепшыць справу садаводства, але і пашырыць кааперыраванне насель-

ніцтва і аграмаджванне працы [44, с. 64, 65]. Дарэчы, развіццё жывёлагадоўлі ў БССР прадугледжвала індустрыю захоўвання і перапрацоўкі мясной прадукцыі. У Оршы планавалася пабудаваць прадпрыемства па вытворчасці бекону, а ў Мінску на аснове навейшага замежнага абсталявання — халадзільныя ўстаноўкі ў разліку на 120 тыс. свіных тушаў у год [36, л. 43, 44].

Адной з тагачасных форм індустрыялізацыі вёскі і адначасова дзейсных метадаў ажыццяўлення палітыкі «суцэльнай калектывізацыі» стала стварэнне машынна-трактарных станцый (МТС). Штуршком да рэалізацыі такой ідэі стаў станоўчы вопыт стварэння на базе трактарнай калоны першай МТС пры саўгасе імя Тараса Шаўчэнкі ў Бярозаўскім раёне Адэскай вобласці (1928 г.). Першая МТС у Беларусі пачала дзейнічаць у 1930 г. Дзясяткі юнакоў і дзяўчат прайшлі падрыхтоўку на курсах механізатараў, што стала падставай для стварэння жаночай трактарнай брыгады. Тэхнічную аснову першапачаткова склалі амерыканскія трактары «Джон-Дзір», а ў далейшым савецкія «Інтэрнацыянал», «Універсал», «Фордзон-Пуцілавец» [45, с. 138; 46, с. 141, 142].

5 чэрвеня 1929 г. выйшла Пастанова Савета Працы і Абароны СССР «Аб арганізацыі машынна-трактарных станцый». Быў створаны Усесаюзны цэнтр машынна-трактарных станцый («Трактарацэнтр»). У 1932 г. у СССР колькасць МТС склала каля 2,5 тыс., а ў 1937 г. — больш за 5,8 тыс. Машынна-трактарныя станцыі ствараліся пераважна ў збожжавых раёнах. Кіраўніцтва БССР імкнулася выкарыстаць гэтыя магчымасці для паляпшэння энергаўзброенасці сельскай гаспадаркі. 11 верасня 1929 г. было накіравана пісьмо сакратару ЦК УКП(б) В. М. Молатаву і Старшыні СНК СССР А. І. Рыкаву. Пры размеркаванні 100 машынна-трактарных станцый па раёнах Саюза для Беларусі не выдзялялася ніводнай станцыі. Выказваючы разуменне канцэнтрацыі трактароў у збожжавытворчых раёнах, у пісьме пазначаліся аргументы на карысць таго, што БССР таксама неабходны тры станцыі. Звярталася ўвага на вострае малазямелле і аграрную перанаселенасць, узрослае імкненне насельніцтва да стварэння калгасаў. Улічваючы актуальнасць калектывізацыі польскага насельніцтва, дадаваўся і гэты аргумент. Па меркаванні аўтараў пісьма, стварэнне трох машынна-трактарных станцый мела велізарнае палітычнае значэнне [47, л. 147].

Паступова выпрацоўваліся формы арганізацыі працы і фінансавання. Асноўнай вытворчай адзінкай стала брыгада. Дырэктар МТС прызначаўся непасрэдна Наркаматам земляробства СССР. Да ліку персаналу МТС адносіліся старшы механік (загадчык гаража), раз'язныя механікі, старшы аграном, аграномы па спецкультурах і насенні, аграномы, прымацаваныя да калгасаў, загадчык нафтабазы, бухгалтары (усяго да 38—42 адзінак). Адносіны МТС з калгасамі рэгуляваліся дамовай, якая распрацоўвалася на аснове Прыкладнай дамовы, зацверджанай СНК СССР. Калгасы аплачвалі паслугі натурай (збожжам, буракамі, бульбай і г. д.), памер аплаты залежаў ад ураджайнасці сельскагаспадарчых культур. Пасрэднікам выступала Цэнтральная Дзяржаўная Камісія (ЦДК) па вызначэнні ўраджайнасці. Але яна пазначала ў якасці асновы біялагічны ўраджай (на корані), а не рэальны, пасля абмалоту, што засыпаўся ў свірны і звычайна ў выніку страт

і сушкі быў на 20—40 % меншы [48]. Савецкая дзяржава праз Прыкладны статут сельгасарцелі (1938 г.) пазначала абавязак калектываў выкарыстоўваць сельскагаспадарчую тэхніку праз МТС і звязвала іх і калгасы ў адзіны сельскагаспадарчы комплекс [49, с. 9—11]. Асаблівую ролю ва ўпарадкаванні дзейнасці МТС, іх арганізацыйным станаўленні набыла Пастанова Савета Працы і Абароны СССР ад 21 верасня 1933 г. (№ 827) «Аб арганізацыі выкарыстання трактарнага парку». Яна, па сутнасці, нагадвала Інструкцыю, што ахоплівала пытанні прыёму і захавання трактароў, арганізацыі працы тэхнікі і спецыялістаў. Дакумент утрымліваў у якасці дадатку падрабязныя тлумачэнні па парадку арганізацыі і правядзення бягучага сярэдняга і капітальнага рамонту, а таксама Палажэнне аб трактарысце МТС, якое засведчыла парадак выдачы і пазбаўлення пасведчання трактарыста, яго абавязкі, парадак нагляду за тэхнікай, аплаты працы, мер заахвочвання і пакарання спецыялістаў. Дадзеная крыніца дазваляе падрабязна ахарактарызаваць сацыяльны статус пераважнай часткі работнікаў МТС [50].

У параўнанні з прамысловасцю ўзровень механізацыі ў аграрным сектары значна адставаў і склаў у 1928 г. усяго 2 %. Работа вялася ў асноўным ручным інвентаром, простымі механізмамі. Толькі 15 % гаспадарак мелі сельскагаспадарчыя машыны: сеялкі, жняяркі, малатарні. У 1933 г. вясновае ворыва ў калгасах краіны было механізавана на 24,2 %, малацьба — на 20,6 %. Адзначаючы тое, што працэс калектывізацыі на пачатку 1930-х гг. значна апярэджваў магчымасці забеспячэння калектыўных гаспадарак новай тэхнікай, падкрэслім тыя намаганні, якія прадпрымаліся савецкім урадам для справы мадэрнізацыі вёскі. Дзякуючы запуску новых вытворчых магутнасцей у Сталінградзе, Харкаве, Чалябінску і Ленінградзе ўжо да канца першай пяцігодкі ўдалося заўважна скараціць, а хутка і цалкам спыніць закупку за мяжой машын і абсталявання для сельскай гаспадаркі.

Характарыстыка дзейнасці МТС будзе няпоўнай, калі не адзначыць кароткі, але значны перыяд дзейнасці палітаддзелаў МТС і саўгасаў. Іх стварэнне адбывалася ў надзвычайным парадку; напачатку яны не былі зацверджаны нават вышэйшымі партыйнымі структурамі. Дзейнасць палітаддзелаў МТС (1933—1934 гг.) не была падмацавана нават такімі спецыфічнымі нарматыўнымі дакументамі, як сумесныя пастановы партыі і ўрада. Надзвычайны характар палітаддзелаў падкрэсліваўся і тым, што ў іх складзе абавязкова прысутнічаў намеснік па АДПУ, прызначэннем начальнікаў палітаддзелаў займаўся непасрэдна ЦК УКП(б) па прадстаўленні першых сакратароў рэспублік і краявых камітэтаў. Такі падыход акрэсліў не толькі непаразуменні з мясцовымі партыйнымі структурамі, але і супярэчнасці паміж кіраўніком палітаддзела і намеснікам па АДПУ. Значная частка складу палітаддзелаў не мела вопыту і практыкі сельскагаспадарчай працы, слаба ўяўляла псіхалогію насельніцтва вёскі. Разам з тым у склад палітаддзелаў былі прызначаны асобы са значным вопытам арганізацыйнай работы. Іх адарванасць ад мясцовых партыйных і савецкіх структур дазволіла быць вышэй кланавай барацьбы ў апараце, садзейнічала выяўленню тых, хто сваімі паводзінамі кампраметаваў бальшавіцкую партыю і савецкую ўладу. Зразумела, што пад «чысткі»,



Стары–пастух у полі. 1931 г. (БДАКФФД, 0-018562)



Сялянкі за мыццём саматканага палатна ў рэчцы. 1931 г. (БДАКФФД, 0-019385)



Механізаваная пасадка бульбы ў Бабруйскім раёне. 1928 г. (БДАКФФД, 0-022868)



Калгасніцы-стаханаўкі Хойніцкага раёна Таццяна
і Ганна Зелянкоўскія ачышчаюць зерне для здачы дзяржаве.
3 жніўня 1938 г. (БДАКФФД, 0-025056)



Здача сена дзяржаве на здатачным пункце калгаснікамі БССР.
1932 г. (БДАКФФД, 0-024951)



Сям'я А. І. Клімовіча, калгасніка сельскагаспадарчай арцелі Мінскага раёна, якая зарабіла 800 працадзён і атрымала шмат прадуктаў і грошай. 1938 г. (БДАКФФД, 0-025064)



Хлусевіч, агароднік калгаса імя Чырвонай Арміі Віцебскага раёна, раскладае насенныя агуркі (гібрыды з дыняй) у цяпліцы. 1934 г. (БДАКФФД, 0-025070)



Члены інтэрнацыянальнага калгаса «Новы свет» Гомельскай акругі:
беларус, паляк і яўрэй.
1928 г. (БДАКФФД, 0-019292)



Апрацоўка бульбянога поля ў калгасе.
1932 г. (БДАКФФД, 0-038794)

арганізаваныя палітаддзеламі, трапілі і многія з тых, хто быў адданы ўладзе, але меў недастатковы вопыт кіраўніцтва, хто пацярпеў з-за інтрыг і паклёпаў. Супярэчліва характарызуецца гісторыкамі і дзейнасць палітаддзелаў МТС у барацьбе за хлеб, якая разгарнулася ў тыя гады і ў шэрагу раёнаў прывяла да голаду і смерці.

У шэрагу выпадкаў менавіта палітаддзелы МТС, добра ведаючы стан спраў на месцах, імкнуліся адстаяць даведзеныя паказчыкі да іх павышэння ў якасці «супярэчлівых» планаў мясцовых савецкіх і партыйных органаў. Прадстаўнікі АДПУ не толькі займаліся дзейнасцю па выяўленні «шкоднікаў» калгаснага ладу, але і своечасова інфармавалі сваё кіраўніцтва аб сітуацыі ў вёсцы. Таму І. Я. Зяленін лічыць, што, нягледзячы на ўсе абставіны, палітаддзелы МТС унеслі пэўны ўклад у арганізацыйнае ўпарадкаванне калгасаў, іх узаемадзеянне з МТС, а таксама падрыхтоўку Статута сельгасарцелі 1939 г., які ў пэўнай ступені палепшыў сітуацыю ў сельскай гаспадарцы [51].

Хуткія тэмпы індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі і спадзяванні ў гэтым кірунку падштурхнулі тагачасных эканамістаў да смелых тэарэтычных пабудоў. Канцэпцыя аграіндустрыяльных камбінатаў (АІК) была прадстаўлена перш за ўсё ў працах Я. Нікуліхіна. На яго думку, на такіх прадпрыемствах можна дасягнуць дакладнай аплаты працы і калькуляцыі сабекошту; АІК павінен ахопліваць увесь эканамічны раён на тэрыторыі дзясяткаў і нават сотняў тысяч гектараў. Прамысловыя прадпрыемствы, якія перапрацоўвалі прадукты земляробства, вызначалі б у гэтым выпадку аб'ём і кірункі сельскагаспадарчай вытворчасці ў асобных яе галінах. Вытворчыя сувязі ў камбінаце абапіраліся б на развітую спецыялізацыю аж да раздзялення вытворчага працэсу на шэраг асобных цыклаў, аддзеленых адзін ад аднаго ў прасторы і часе. Прапаноўвалася нават стварэнне спецыфічнага тыпу канвеера з вытворчым цыклам; пры гэтым лічылася, што ручная праца павінна быць цалкам заменена аўтаматычнай. Арганізаваная такім чынам сістэма павінна была максімальна наблізіцца да сістэмы прамысловай вытворчасці, а сельскагаспадарчыя работы стаць адной з форм прамысловай працы [52].

У 1930 г. прадугледжвалася, што на тэрыторыі СССР будзе створана звыш за 300 саўгасна-калгасных камбінатаў пад кіраўніцтвам прамысловых прадпрыемстваў і саўгасаў. Прамысловыя прадпрыемствы павінны былі вызначаць спецыялізацыю вытворчасці ў калгасах і саўгасах. Стварэнне такіх камбінатаў ажыццяўлялася ў атмасферы, калі патрабавалася ствараць «буйныя збожжавыя фабрыкі» памерам 40—50 тыс. га. Ва ўмовах прымітыўнай матэрыяльна-тэхнічнай базы і адсутнасці кваліфікаваных кадраў такія спробы не маглі завяршыцца поспехам. У дакладной запісцы першаму сакратару ЦК КП(б)Б К. Гею пазначалася, што на студзень 1930 г. «сартыровак "Трыумф" завезена 12 %, дыскавых барон — 15 %, барон зігзагавых — 23 %, пружынных барон — 12 %, сеялак розных — 10 %, касілак — 14 % ад плана і г. д. Тут справы вельмі дрэнныя, і мы на месцы ніяк і нічым не можам дапамагчы» [53, л. 2—6]. На 1 кастрычніка 1929 г. колькасць трактароў у рэспубліцы складала ўсяго 198 адзінак (у чым абвінавачвалася «прышчэпаўскае» кіраўніцтва). Пры гэтым канстатавалася тое, што нават невялікі план пастаўкі ў 196 трактароў вясенняга севу не выкананы (фактычна

было атрымана толькі 23). Нават па самых аптымістычных планах да пачатку пасяўных работ БССР магла б атрымаць толькі 53 адзінкі трактарнай тэхнікі [47, л. 239—242]. Заставалася адно спадзяванне, як прызнавалі самі ўлады, — на сацыялістычнае спаборніцтва [54, л. 207—212].

У перыяд, калі была вылучана канцэпцыя аграіндустрыяльных камбінатаў, у цэлым не было эканамічных, тэхнічных і арганізацыйных перадумоў для яе рэалізацыі. Ад гігантаманіі з часам адмовіліся ў калгасным будаўніцтве, а затым — і ў саўгасным. Разам з тым рэакцыя на памылкі і адмоўныя наступствы дзейнасці разгледжаных вышэй аграіндустрыяльных камбінатаў у далейшым зацвердзіўся погляд, у адпаведнасці з якім адмаўлялася не толькі мэтазгоднасць іх стварэння, але і які-небудзь удзел калгасаў у арганізацыі прамысловых прадпрыемстваў. Яны павінны абмяжоўвацца толькі сельскагаспадарчай вытворчасцю. Перапрацоўку належала ажыццяўляць дзяржаўнай харчовай прамысловасці, у якой вядучую ролю адыгрывалі б прадпрыемствы, адметныя высокім узроўнем канцэнтрацыі вытворчасці. У якасці тэарэтычнага абгрунтавання прыводзіўся тэзіс аб перавагах буйной вытворчасці над дробнай [55, с. 230, 231].

Назапашаны вопыт у дадзенай сферы быў адкінуты, тэндэнцыя інтэграцыі буйной і дробнай сельскагаспадарчай вытворчасці ў вёсцы праз кааператыўныя сувязі не атрымала далейшага развіцця, пошукі шляхоў з'яднання сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці ў рамках адзінага прадпрыемства на працяглы час прыпыніліся. Толькі з пачатку 1980-х гг. пачала фарміравацца структура кіравання, якая аб'ядноўвала ў адзінае цэлае сферу сельскагаспадарчай вытворчасці і перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. На IV Усесаюзным з'ездзе калгаснікаў тэма стварэння перапрацоўчых прадпрыемстваў пры калектыўных гаспадарках гучала неаднаразова як у цэнтральных дакладах, так і ў выступленнях з месцаў [56, с. 43, 44, 67, 68, 81]. На сучасным этапе стварэнне і развіццё вытворчасцей па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі вызначаецца ў якасці важнейшага фактару захавання буйных прадпрыемстваў на вёсцы.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Месснер И.* Как следует индустриализовать сельское хозяйство // Плановое хоз-во. 1926. № 4.
2. *Батюшков В.* Индустриализация сельского хозяйства // Плановое хоз-во. 1926. № 5.
3. *Гордеев Г. С.* К проблеме индустриализации сельского хозяйства // Плановое хоз-во. 1926. № 6.
4. *Егоров К.* Индустриализация сельского хозяйства. М., 1928.
5. *Каратыгин Е. С.* Проблемы индустриализации сельского хозяйства в СССР. М., 1929.
6. Доклады и акты обследования колхозов и госземимуществ Бобруйского, Мозырского, Полоцкого и Слуцкого округов // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 2885.
7. План работы отдела местного обслуживания Белсельсоюза на 1925—1926 гг., отчеты и доклады Белсельсоюза о развитии сети сельскохозяйственной кооперации Борисовского и Минского округов за 1924—1925 гг., сметы расходов отдела местного обслуживания Белсельсоюза и Минского окружного молочно-животноводческого товарищества на 1925—1926 гг. // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 468.
8. Справаздача Калінінскага Акруговага Спаўняючага камітэту Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў 1-му Акруговаму зьезду Саветаў аб становішчы Акругі і аб сваёй працы за тэрмін з жніўня 1924 г. па 1-е красавіка 1925 г. Клімавічы, 1925. 185 с.

9. Карточки обследования урожайности в колхозах и совхозах по округам за 1928 г. // НАРБ. Ф. 30. Воп. 3. Спр. 187.

10. Беларуская вёска: сялянская газета ЦК Камуністычнай партыі (б) Беларусі. 1924—1929. 1925. 7 кастр., 8 снеж.

11. Материалы к докладу Совета Народных Комиссаров БССР Совету Народных Комиссаров СССР. Минск : Изд. Упр. Делами СНК БССР, 1928. 248 с.

12. Статистические сведения об обследовании урожая и распространении агротехники в колхозах и совхозах БССР за 1928 г. // НАРБ. Ф. 30. Воп. 3. Спр. 192.

13. Материалы о строительстве и развитии колхозов и совхозов в БССР (сведения, таблицы, списки и др.) за 1927/28—1929/30 // НАРБ. Ф. 30. Воп. 3. Спр. 292.

14. Падлічана па: Сельское хозяйство Союза ССР в 1926/27 году по данным налоговых сводок по единому сельхозналогу. М. : НКФ СССР, 1929. 605 с.

15. Резолюция совещания зав. орготделами окрсельсоюзов при Белсельсоюзе от 17 ноября 1927 г. об организационно-хозяйственном обслуживании колхозов, докладные записки о состоянии еврейских сельскохозяйственных артелей Оршанского округа, список артелей по округам БССР на 1 января 1927 г. // НАРБ. Ф. 11. Воп. 1. Спр. 76.

16. Справаздача аб дзейнасьці Бабруйскага Акруговага выканаўчага камітэту Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў за 1926/27 і 1927/28 гг. III Бабруйскаму Акруговаму зьезду Саветаў. Бабруйск, 1929. 133 с.

17. Падлічана па: Акты инспекторов РКИ БССР об обследовании колхозов БССР по состоянию на 1 сентября 1926 г. // НАРБ. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 2598.

18. Гомельский окружной союз сельскохозяйственных коллективов, машинных, поселковых и мелиоративных товариществ (Гомколхозсоюз) // ДАГВ. Ф. 138. Воп. 1. Спр. 17.

19. Белсельсаюз: справаздача за 1927/28 апэрацыйны год (7-мы год дзейнасьці). Менск, 1929. 116 с.

20. *Макараў М. П.* Спроба вывучэньня эфектыўнасьці форм землекарыстаньня ў БССР. Менск, 1929. 112 с.

21. *Валахановіч А. І.* З гісторыі Навасадскай масласыраварнай арцелі. Маланка. Памяць. Дзяржынскага раёна. С. 139.

22. *Сярмяжкін А. М.* Саўгас «Рачкавічы» (Стэнаграфічнае апісаньне). Менск : Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі. Сельгассэктар. 1932. 73 с.

23. Протоколы /подлинные/ 3-й сессии ЦИК СССР 3-го созыва. Февраль 1927 г. // ДАРФ. Ф. 3316. Воп. 3. Спр. 266.

24. Постановления СНК СССР о передаче колхозам подсобных и промышленных предприятий и выписки из протоколов заседаний президиума Мозырского окрисполкома // НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр.790.

25. СЗ БССР. 1926. № 51. Ст. 175.

26. Отчет Народного Комиссариата Земледелия БССР за 1926/27 хозяйственный год (с 1-го октября 1926 г. по 1-ое октября 1927 г.). Минск : Наркомзем Белоруссии, 1928. 252 с.

27. Протоколы общих собраний граждан деревень Самохваловичского и Смиловичского районов Минского округа об организации сельскохозяйственных товариществ, ведомость потребности кредитов для сельскохозяйственных коммун и артелей Речицкого округа на 1927 г. и объяснительная записка к ней // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 771.

28. *Агееў Л.* Прамысловыя і тэхнічныя прадпрыемствы калектыўных гаспадарак БССР // Савецкае будаўніцтва. 1928. № 10.

29. Матар'ялы да справаздачы аб дзейнасьці Менскага Акруговага выканаўчага камітэту Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў III Акруговаму зьезду Саветаў за час з I/I-1927 г. па I/I-1929 г. Менск, 1929. 181 с.

30. *Агееў Л.* Жывёлагадоўля і перспектывы яе развіцьця ў калгасах БССР // Сел. і ляс. гасп-ка. 1928. № 3—4.

31. Устав Белколхозсоюза, протоколы заседаний правления Белколхозсоюза, комиссии по коллективизации при Белсельсоюзе, доклады, тезисы докладов о состоянии колхозов, развитии животноводства и молочного хозяйства в них, мерах по повышению урожайности и другим вопросам колхозного строительства // НАРБ. Ф. 334.Воп. 1. Спр. 854.

32. *Кудзінаў С.* Жыцьцё і праца комуны «Зьвязда». Менск, 1929. 52 с.

33. Постановления и положения Совета Труда и Обороны ВЦИК (подлинники и копии) и выписки из протоколов заседаний Президиума ВЦИК об организации центрального и местных комитетов помощи больным и раненым красноармейцам, Доно-Кавказского краевого продовольственного комитета, Комитета по улучшению жизни детей и по другим вопросам // ДАРФ. Ф. 1235. Воп. 95. Спр. 45.

34. *Кудзінаў С.* Комуна імя Карла Лібкнэхта. Мінск, 1929. 63 с.

35. Циркуляры и протоколы заседаний правления Белсельсоюза, контрольные цифры организации колхозов в БССР на 1929—1930 гг., сведения Белсельсоюза о поступлении паевых взносов и движении фонда кооперирования бедноты по сельскохозяйственным кредитным товариществам за 1-ое полугодие 1928—1929 гг. // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 922.

36. Дело о постройке беконной фабрики в г. Орше и мясного холодильника в г. Минске // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 2336.

37. *Чаянов А. В.* Основные идеи и формы организации сельскохозяйственной кооперации. 2-е изд. М. : Изд. Книгосоюза, 1927. 383 с.

38. *Цейтлин М. С.* Строительство колхозов // Советское строительство. 1928. № 12.

39. Калгасы БССР (Папярэднія вынікі абследаванняў калгасаў у 1928 і 1929 гадах). Мінск : ЦСУ БССР, 1929. 78 с.

40. *Левченко Ф.* Растем вширь и вглубь // Коллективист. 1928. № 22 (77).

41. *Чаянов А.* Местные комбинаты по первичной переработке сельскохозяйственных продуктов // Сельское хозяйство на путях восстановления. М., 1925.

42. *Каутский К.* Аграрный вопрос. Изд-во «Пролетарий», 1926.

43. О работе в деревне // Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и Пленумов ЦК. 9-е изд., доп. и испр. М. : Политиздат, 1984. Т. 4 : 1926—1929. С. 120—133.

44. *Ляўчонак Ф.* Пра куставыя аб'яднанні калгасаў // Бальшавік Беларусі. 1929. № 1.

45. *Валахановіч А.* Яны пачыналі першымі // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Дзяржынскага раёна. Мінск : БЕЛТА, 2004. 704 с.

46. *Валахановіч А.* Машынна-трактарныя станцыі // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Дзяржынскага раёна. Мінск : БЕЛТА, 2004. 704 с.

47. Директивные указания ЦК КП(б)Б. Переписка с ЦК ВКП(б), местными партийными органами и ОГПУ. Февраль 1929 — май 1930 г. на 276 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4702.

48. *Томилин В. Н.* МТС (1928—1958 гг.): исторический опыт и уроки [Электронный ресурс]. URL: http://academy-document. narod.ru/friendsarticles/Victor_tomilin.htm (дата обращения: 12.11.2013); *Он же*. Переход к натуроплате работ МТС колхозами в 1930-е гг. // Научное наследие А. Г. Кузьмина и отечественная история : материалы Всерос. науч. конф. «Историческая память народа и духовно-нравственные основы личности», посв. памяти и 80-летию со дня рожд. проф. А. Г. Кузьмина (17—19 сентября 2008 г.). Рязань : Ряз. гос. ун-т им. С. А. Есенина, 2009. С. 283—288.

49. Примерный устав сельскохозяйственной артели. Принят Вторым Всесоюзным съездом колхозников-ударников и утвержденный СНК СССР и ЦК ВКП(б) 17 февраля 1938 г. М., 1950.

50. Коллективизация сельского хозяйства. Важнейшие постановления Коммунистической партии и Советского правительства. 1927—1938. М., 1957.

51. *Зеленин И. Е.* Политотделы МТС — продолжение политики «чрезвычайщины» (1933—1934 гг.) // Отечественная история. 1992. № 6. С. 42—61.

52. *Никулихин Я. П.* Идустриализация сельского хозяйства СССР. М., 1936.

53. Постановления и циркуляры ЦК, Могилевского окружкома и Толочинского райкома КП(б)Б, докладные записки, [информации] о ходе выполнения промфинплана по отдельным отраслям промышленности и кооперации БССР за 10 м-цев 1929/30 г., работе Оршанского железнодорожного узла, необходимости выделения кредита для развития животноводства в Лоевском р-не. 13 января 1930 г. — 3 февраля 1931 г., на 116 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5069.

54. Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б аб задачах асенняй пасеўнай кампаніі і далейшай калектывізацыі // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4763.

55. *Холай X.* Социализм и аграрный вопрос. М., 1986. 445 с.

56. Четвертый Всесоюзный съезд колхозников : стеногр. отчет. М. : Агропромиздат, 1988.

# Раздзел 3. САЦЫЯЛЬНАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ВЁСКІ І ЗМЕНЫ Ў САЦЫЯЛЬНАЙ ПСІХАЛОГІІ СЯЛЯНСТВА Ў 1921—1939 гг.

## 3.1. ДЭМАГРАФІЧНЫЯ І САЦЫЯЛЬНЫЯ ЗМЕНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ

На дэмаграфічную сітуацыю пачатку 1920-х гг. істотны ўплыў зрабілі міграцыі насельніцтва, якія падчас войнаў 1914—1920 гг. з'яўляліся вымушанымі [1, с. 127]. Пакідаючы за межамі даследавання заходнюю частку Беларусі, што апынулася пад уладай Польшчы, мы, аднак, не можам не ўлічыць такі фактар, як бежанства. Цікавыя даныя для разважання прыводзіць Валянціна Сяргееўна Утгоф [2]. Пераважную частку бежанцаў (у суадносінах амаль аднолькава праваслаўных і каталікоў) складалі сяляне. Пры гэтым узровень іх адукаванасці з'яўляўся даволі высокім. Па-за межамі Беларусі яны вымушаны былі займацца дзеля выжывання самымі рознымі справамі, многія з іх станавіліся чорнарабочымі. Палову сям'і бежанцаў складалі дзеці, пры гэтым прыкладна траціна з іх нарадзілася ўжо па-за межамі Беларусі. У 1921 г. беларускія бежанцы вярталіся дамоў сем'ямі. І хоць, нягледзячы на ўсе абставіны, яны імкнуліся вярнуцца на сваю родную зямлю, частка заходнебеларускага сялянства асела ў Цэнтральнай і Усходняй Беларусі [3].

Для разумення дэмаграфічных паказчыкаў істотнымі з'яўляюцца аспекты адміністрацыйнага падзелу БССР у 1921—1939 гг. [4]. Цікавыя звесткі ў гэтым дачыненні ўтрымлівае зборнік, выдадзены НКУС у 1923 г., дзе маюцца даныя аб паветах па рэспубліках, абласцях і губернях СССР, алфавітны спіс паветаў з указаннем, у якую губерню, вобласць, рэспубліку ўваходзіць кожны павет; спісы валасных, губернскіх і павятовых цэнтраў з насельніцтвам па перапісе 1923 г.; скасаваных абласцей і губерняў былой Расійскай імперыі, новаўтвораных рэспублік, абласцей і губерняў і перайменаваных гарадоў. У выданні змешчана карта «Еўрапейская частка СССР» з пазначэннем на ёй меж абласцей, губерняў і паветаў [5].

Пасля вяртання БССР тэрыторый з пераважна беларускім насельніцтвам узнікла неабходнасць выпрацоўкі агульных падыходаў да тыпалагізацыі населеных пунктаў. Спецыяльная камісія на чале з А. Смолічам мела ў якасці ўзору ўкраінскі і расійскі праекты. Згодна з апошнім да гарадоў «адносіліся населеныя

пункты з колькасцю дарослага насельніцтва не меней адной тысячы чалавек пры ўмове, што сельская гаспадарка з'яўлялася асноўным заняткам не болей чым для 25 % насельніцтва» [6]. Камісія вызначыла 3 крытэрыі гарадскіх пасялковых пунктаў: 1) колькасць насельніцтва (не меней за 2 тыс. чал.); 2) характар занятасці працаздольнага насельніцтва («сельская гаспадарка не павінна была з'яўляцца асноўным заняткам болей чым для 25 % жыхароў»); 3) памеры гандлёвага абароту населенага пункта не меней за 100 тыс. руб. у год) [7, с. 85, 86]. 5 лістапада 1924 г. была прынята Пастанова ЦВК і СНК БССР «Аб гарадах, мястэчках (гарадскіх паселішчах), пасёлках і сельскіх паселішчах», згодна з якой тыя населеныя пункты, якія не былі пералічаны ў Пастанове ў якасці гарадскіх, адносіліся да сельскіх.

У 1925 г. акцэнт пераносіцца на колькасць насельніцтва, астатнія характарыстыкі толькі дапаўнялі такое вызначэнне. Гарадамі лічылі пасяленні з колькасцю насельніцтва звыш 5 тыс. чал., мястэчкамі — ад 3 да 5 тыс. чал. У выніку 3 ліпеня 1925 г. быў зацверджаны новы спіс гарадскіх паселішчаў [7, с. 86, 87]. Трэба мець на ўвазе, што ў 1930-я гг. прысутнічала толькі раённае дзяленне. І толькі згодна з Канстытуцыяй БССР 1938 г. уводзілася абласное дзяленне [7, с. 126].

Шчыльнасць сельскагаспадарчага насельніцтва адрознівалася ад сярэдніх лічбаў па БССР. Найбольшай сельскагаспадарчай шчыльнасцю характарызаваліся акругі былой Магілёўскай губерні (72—81). Сярэднія паказчыкі мелі месца ў Віцебскай, Барысаўскай і Бабруйскай акругах (62—65). Што тычыцца найменшай шчыльнасці, то ў дачыненні да Мазырскай і Полацкай акруг прычыны можна бачыць ва ўплыве прыродных фактараў, у Слуцкай і Мінскай – праявы наступстваў Першай сусветнай вайны і вайсковага супраціву 1918—1922 гг. Пры тым, што пераважную колькасць сельскіх населеных месцаў БССР складалі вёскі ад 20 да 50 жыхароў, большасць вяскоўцаў жыла ў населеных пунктах з насельніцтвам ад 200 да 500 жыхароў (гл. дадатак, табл. 11).

Важнейшай характарыстыкай дэмаграфічнага развіцця, свайго роду яго «летапісам», з'яўляецца полаўзроставая структура. Яна адлюстроўвае ўсе канкрэтна гістарычныя падзеі дэмаграфічнага працэсу, якія выпалі на долю жывучых у той момант пакаленняў — уплыў войнаў і эпідэмій, ураджайных і неўраджайных гадоў, міграцыйных і сацыяльных змен.

Поўныя даныя па дэмаграфічнай сітуацыі ў беларускай вёсцы можна атрымаць толькі пры супастаўленні даных перапісаў і бягучага ўліку насельніцтва. Вельмі змястоўны ў гэтым дачыненні перапіс 1926 г. [8—13]. У снежні гэтага года ў склад БССР увайшлі Гомельскі і Рэчыцкі паветы былой Гомельскай губерні. У папярэднія гады звесткі пра іх адлюстроўваліся ў перапісах РСФСР. Тое ж можна пазначыць, характарызуючы звесткі аб натуральным руху насельніцтва БССР за 1924—1926 гг. [14]. На працягу 1924—1926 гг. нараджальнасць паступова ўзрастала, а смяротнасць істотна зніжалася. БССР у сярэдзіне 1920-х гг. мела самы высокі паказчык натуральнага прыросту насельніцтва па еўрапейскай частцы СССР. Пры гэтым колькасць двойняў і тройняў, якія нарадзіліся ў 1926 г., узрасла як у сельскага, так яшчэ больш у гарадскога насельніцтва (да 13,56 на 1000 родаў).

Праз дэмаграфічныя паказчыкі выяўлялася стабілізацыя (з 1922 г.) сацыяльна-эканамічнага становішча ў БССР. Працяглы час на значнай частцы Беларусі размяшчалася вялікая колькасць войскаў (мужчынскага насельніцтва). Самай вялікай узроставай групай у беларускай вёсцы былі дзеці да 4 гадоў. У гарадах, аднак, дэмаграфічная сітуацыя складвалася іншым чынам. Пераважную частку складалі мужчыны і жанчыны ва ўзросце 20—29 гадоў (гл. дадатак, дыягр. 1, 2). Найвышэйшая нараджальнасць па БССР была ў 1926 г. у беларусаў (42,88), пасля ішлі палякі (35,14), яўрэі (28,26). І ў горадзе, і на вёсцы больш нараджалася хлопчыкаў (106 ці 107 на 100 дзяўчынак) [14, с. 16].

Калі б не галодныя гады першай паловы 1930-х гг., то напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны мелася іншая дэмаграфічная сітуацыя. Пры гэтым на працягу другой паловы 1920-х гг. зніжалася колькасць шлюбаў і ўзрастала разводаў. Тлумачэнне бачыцца ў тым, што згодна з данымі перапісу 1926 г. у наступнай па велічыне групе — хто нарадзіўся напярэдадні першай расійскай рэвалюцыі (20—29 гадоў) — колькасць жанчын істотна перавышала колькасць мужчын (355 222 супраць 306 575). Такога кшталту сітуацыя (хоць і не ў такіх прапорцыях) склалася і ў старэйшых рэпрадукцыйных групах: 30—39 гадоў (237 624 жанчыны супраць 216 841 мужчыны) і 40—49 гадоў (454 і 162 873 адпаведна). Пры гэтым у юнацкай групе (15—19 гадоў) узнікае заўважнае перавышэнне колькасці дзяўчат (гл. дадатак, дыягр. 1).

Нараджальнасць у сельскай мясцовасці Беларусі амаль у 1,5 разы перавышала нараджальнасць у буйных гарадах, аднак смяротнасць на вёсцы была крыху вышэйшай (15,0 супраць 13,9). Натуральны прырост насельніцтва вёскі амаль у 2 разы перавышаў гэты паказчык у гарадах з насельніцтвам звыш за 50 000. Трэба мець ва ўвазе, што савецкая Расія стала першай краінай у свеце, якая ўзаконіла перарыванне цяжарнасці па жаданні жанчыны (19 лістапада 1920 г.). Заходнія краіны ажыццявілі поўную легалізацыю абортаў амаль на 40—50 гадоў пазней. Напрыклад, у Вялікабрытаніі ажыццяўленне аборту стала легальным толькі ў 1967 г. Пры гэтым сітуацыя ў Савецкім Саюзе па дадзеным пытанні не заставалася нязменнай. Набліжэнне вайны, паляпшэнне сітуацыі з харчаваннем далі падставу ўладам пазначыць аборты як з'яву вельмі шкодную, што істотна перашкаджае росту насельніцтва. Для шырокага азнаямлення ў маі 1936 г. быў апублікаваны праект закона аб іх забароне, што — як і сам закон ад 27 чэрвеня 1936 г. — выклікаў «шырокую падтрымку працоўных» [15—17]. Зразумела, што на вёсцы, дзе істотную ролю мелі традыцыя і царква, колькасць абортаў была шмат меншай. Магчыма, па гэтай прычыне ў сельскай мясцовасці ў некалькі разоў быў вышэй паказчык жаніхоў да 19 год (амаль 10 %), ды і дзяўчаты ва ўзросце 20—24 гадоў таксама выходзілі замуж раней, хоць сярод іх дадзеная акалічнасць прасочваецца ўжо не так заўважна, як у жаніхоў [14, с. 28—29]. Шлюбаў заключалася менш (9,6 супраць 12,7), але ўдвая менш было разводаў (1,5 супраць 2,9) [14, с. 12]. Большасць разводаў прыпадала ў мужчын на ўзрост ад 25 да 35 гадоў, а ў жанчын — ад 20 да 24 гадоў [14, с. 33]. Згодна са статыстычнымі данымі тыя, хто браў шлюб упершыню, імкнуліся знайсці тых, хто ў шлюбе раней не быў. Па БССР

шмат вышэйшым, чым у іншых рэспубліках тагачаснага СССР, быў працэнт шлюбаў удаўцоў з жанчынамі, якія не былі ў шлюбе раней [14, с. 35]. Заўважна, што беларусы стваралі змешаныя сем'і найчасцей за межамі. На радзіме, асабліва ў сельскай мясцовасці, амаль выключна бралі шлюбы з беларусамі [14, с. 33].

Смяротнасць мужчын традыцыйна перавышала жаночую не толькі па БССР, але і СССР увогуле. Па БССР жаночая смяротнасць сягала 80 % мужчынскай, але па вясковым насельніцтве гэтыя паказчыкі былі больш супастаўнымі [14, с. 20]. Цікава, што дзіцячая смяротнасць (да 1 года) у горадзе была вышэй, чым на вёсцы, пры гэтым хлопчыкі паміралі часцей, чым дзяўчынкі (124 на 100 дзяўчынак — самы высокі паказчык па еўрапейскай частцы СССР). Дзіцячая смяротнасць у параўнанні з перыядам знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі істотна знізілася (102 — у 1926 г. супраць 174 — у 1909 г.) [14, с. 21, 22]. Што тычыцца паказчыка смяротнасці па нацыянальнасцях БССР, то найменшы ён быў ва ўкраінцаў (6,52 на 1000), далей ішлі рускія (7,20), потым — яўрэі (10,03). Самая высокая смяротнасць была ў палякаў (13,01) і беларусаў (15,44), якія жылі пераважна на вёсцы [14, с. 23]. Заўважна, што прырост вясковага насельніцтва істотна перавышаў паказчыкі натуральнага прыросту ў іншых еўрапейскіх краінах (2,7 супраць 1,55 — у Германіі і 1,10 — у Даніі) [18, с. 32]. Пры гэтым сем'і сталі менш шматлікімі (у сярэднім у 1926 г. – 5,3 супраць 6,3 да 1917 г.) [14, с. 34].

Сярод хвароб, што забіралі жыцці жыхароў Беларусі таго часу, пераважалі шкарлятына (ад яе паміраў кожны трэці, найперш дзеці), туберкулёз, запаленне лёгкіх і дызентэрыя. Ракавыя захворванні (якія, магчыма, і менш дыягнаставаліся) былі далёка не на першым месцы. Нізкай (у параўнанні з еўрапейскай часткай, асабліва Масквой і Ленінградам) была колькасць самазабойцаў [14, с. 25]. Дарэчы, у сярэдзіне 1920-х гг. акрэслілася вывучэнне гэтай сацыяльнай з'явы [19]. Па звестках М. Гернета, мінімум самазабойстваў у 1925 і 1926 гг. выпадаў на чацвер ці пятніцу: 24 гады — у мужчын і жанчын — 18—19 гадоў. Максімум выпадкаў пазбаўлення жыцця прыходзіліся на панядзелак. У Беларусі мужчыны, як і ў цэлым па СССР, таксама далі максімум самазабойстваў у сельскай мясцовасці ва ўзросце 20—24 гадоў. На гэты ж узрост прыйшлася найбольшая колькасць самазабойстваў і ў жанчын, у адрозненне ад РСФСР, дзе, як мы бачылі, жанчыны праявілі найбольшую схільнасць да самазабойстваў ва ўзросце 18—19 гадоў. Таксама некалькі больш сталым з'явіўся ўзрост з максімумам самазабойстваў у мужчын у гарадах БССР, а менавіта 25—29 гадоў. Дарэчы, па даных ЦСУ, у БССР у параўнанні з іншымі рэспублікамі высокай была смяротнасць ад хвароб нервовай сістэмы [14, с. 26].

У 1930-я гг., як ужо адзначалася ў першым раздзеле, дзейнасць статыстычных устаноў і абследаванняў не была такой разнабаковай, як у папярэдняе дзесяцігоддзе. Між тым вельмі істотным з'яўляецца пытанне: наколькі голад паўплываў на дэмаграфічную сітуацыю ў савецкай частцы Беларусі? Важным тут з'яўляецца параўнанне даных перапісу 1926 г. са звесткамі перапісаў 1937 і 1939 гг. [20—22]. Згодна з кампаратыўнымі данымі па БССР у 1926 г. насельніцтва складала 4925,8 тыс. чал., а ў 1939 г. — 5110,6 тыс. чал. Такім чынам, прырост склаў 3,8 %.

Лічба не занадта ўнушальная (штогадовы прырост у Расійскай імперыі напярэдадні Першай сусветнай вайны з 1886 па 1914 г. складаў каля 2 %) [18, с. 32]. Можна, аднак, услед за крытыкамі пазначыць, што перапіс 1937 г. з'яўляўся рэальна аднадзённым і ўключаў толькі наяўнае насельніцтва. Па звестках перапісу 1939 г., колькасць насельніцтва БССР склала ўжо 5 568 994 чал. Рост у параўнанні з 1926 г. склаў 13 %. Калі прыняць яго сярэднюю велічыню па двух перапісах (8,4 %), нават гэтыя максімальныя 13 % не адпавядаюць прагнозным 20—25 % за 13 гадоў. Неабходна шукаць пэўныя прычыны замаруджвання росту колькасці насельніцтва, і яны бачацца ў сацыяльна-эканамічных складаючых, найперш у голадзе першай паловы 1930-х гг. Цікавай крыніцай у гэтых адносінах з'яўляюцца «Памесячныя даныя аб нараджальнасці і смяротнасці насельніцтва па гарадскіх і сельскіх мясцовасцях БССР у 1932, 1933 і 1934 гг.». Яны дазваляюць прасачыць паказчыкі нараджальнасці і смяротнасці за 1932—1934 гг. (той перыяд, калі гэтыя звесткі не былі пад кантролем НКУС) [23]. Справа ў тым, што крызісныя з'явы 1932—1933 гг. перадвызначылі не толькі пэўную лібералізацыю эканамічнага жыцця (так званы «нэанэп»), але і ўзмацненне кантрольна-рэпрэсіўных структур. Асаблівую ролю набывае саюзна-рэспубліканскі Народны камісарыят унутраных спраў (НКУС) як цэнтралізаваны орган кіравання дзяржаўнай бяспекай і грамадскім парадкам. Ён уключыў АДПУ, пагранічную і ўнутраную ахову, канвойныя войскі і многія іншыя структуры. Пад кантроль НКУС акрамя іншых быў узяты з 1934 г. і запіс актаў грамадзянскага стану.

Аналізуючы звесткі памесячных даных, можна заўважыць не толькі пагадовыя змены, але і сезонныя. Заўважна, што смяротнасць узрастала ў лютым — красавіку і далей змяншалася ў маі — чэрвені. Рост яе ў ліпені — жніўні кампенсаваўся зніжэннем смяротнасці з кастрычніка па снежань. Улічваючы перавагу сельскага насельніцтва, сезоннасць працы і яе вынікаў, можна бачыць уплыў на вёску прыродна-кліматычных змен і сітуацыі з харчаваннем. Пагадовыя звесткі даюць магчымасць акрэсліць, што найбольш небяспечная дэмаграфічная сітуацыя складвалася менавіта ў 1933 г. Смяротнасць за гэты год узрасла прыкладна на 83 % (амаль удвая) у параўнанні з папярэднім 1932 г. Як вынік — нараджальнасць у наступным 1934 г. знізілася больш чым на 10 % у параўнанні з 1933 г. і на 22 % у параўнанні з 1932 г. пры даволі высокай нараджальнасці (яна была меншай за паказчыкі 1932 г. на 14 %). Для 1933 г. характэрна (упершыню за пасляваенныя гады) зніжэнне колькасці насельніцтва БССР. Пры гэтым такая сітуацыя назіралася найперш у горадзе (нагадаем галодныя бунты ў гарадах, у прыватнасці ў Барысаве) [24]. На вёсцы, дзякуючы высокай нараджальнасці (і наяўнасці рознага кшталту расліннасці), зніжэння колькасці насельніцтва не адбылося. Голад меў тут менш адчувальныя, але больш працяглыя вынікі. Прырост насельніцтва з 1932 па 1934 г. зменшыўся больш чым удвая, дасягаючы ў асобныя месяцы блізкіх да нуля паказчыкаў.

Заўважым, што гэта адбывалася з 1932 г. ва ўмовах станаўлення адзінай пашпартнай сістэмы ў СССР і інстытута абавязковай прапіскі [25]. У сакавіку 1934 г. вызначаецца парадак пашпартызацыі грамадзян, пераязджаючых у мясцовасць

з пашпартнай сістэмай. У выніку была істотна абмежавана мабільнасць вяскоўцаў. Калгаснікі, якія не мелі пашпартоў, павінны былі атрымаць згоду праўлення калгаса для пераезду ў горад на пастаяннае альбо часовае пражыванне.

Насельніцтва вёскі змяншалася таксама за кошт высялення кулакоў і іншага кшталту прымусовай міграцыі. Да прыкладу, 22 кастрычніка 1933 г. была прынята Пастанова Палітбюро ЦК ВКП(б) «Аб перасяленні калгаснікаў на Украіну», згодна з якой меркавалася перасяліць 21 тыс. калгаснікаў, у тым ліку з Беларусі. Для гэтай задачы ў БССР быў спецыяльна накіраваны наркам аховы здароўя Украінскай ССР і была вызначана арганізацыя перасялення [26, с. 810]. Дэмаграфічная катастрофа 1933 г. стала паваротным момантам у гісторыі руху насельніцтва рэгіёна, які паклаў пачатак доўгаму дэмаграфічнаму крызісу. У выніку значна павялічылася міграцыйная рухомасць насельніцтва: усвядоміўшы бесперспектыўнасць сялянскага жыцця, многія пакінулі звыклыя месцы. Менавіта з 1932—1933 гг. бярэ пачатак шырокі непарыўны паток сельскіх мігрантаў перспектыўнай моладзі з вёскі ў горад, у іншыя часткі тагачаснага СССР.

Істотны прырост насельніцтва пачаўся толькі пасля пераадолення наступстваў голаду і акрэсліўся ў другой палове 1930-х гг. Па даных НКУС, у 1936 г. натуральны прырост насельніцтва Беларусі склаў 19,9 % [27, с. 861]. Магчыма, што да часу правядзення перапісу 1937 г. рост насельніцтва Беларусі не паспеў набраць тую дынаміку, якая была засведчана перапісам 1939 г. На дакладнасць іх звестак, безумоўна, паўплывала грамадска-палітычная атмасфера другой паловы 30-х гг. XX ст. Аднак фактар свядомага скажэння даных перапісу 1939 г., на наш погляд, перабольшаны. Для беларускага сялянства стагоддзямі была характэрна схільнасць да міфалагізацыі пачутага, да рознага кшталту чутак і забабонаў.Ва ўмовах недаверу да ўладных структур асабліва вялікую колькасць чутак выклікала пытанне аб рэлігіі перапісу 1937 г. У прыватнасці, супраць перапісу ў Полацкім раёне разгарнулі агітацыю баптысты, распаўсюджваліся чуткі, што «веруючых будуць судзіць, няверуючым — ставіць кляймо». На падставе чутак у Лепельскім раёне 200—250 чалавек адмовіліся даваць звесткі. У Стайкаўскім сельсавеце некаторыя з сялян вырашылі хавацца, бо «хутка прыйдзе Гітлер і будзе знішчаць няверуючых». У шэрагу выпадкаў з-за розных адказаў на пытанне аб рэлігіі ўзнікалі сямейныя канфлікты. У Крупскім, Уздзенскім, Плешчаніцкім раёнах баяліся, што ноч перапісу стане Варфаламееўскай [28, с. 97, 98].

Перапіс 1939 г. праводзіўся пад лозунгам «не прапусціць ніводнага чалавека». Сумны вопыт перапісу 1937 г. падштурхоўваў да больш уважлівай фіксацыі насельніцтва. Упершыню ў практыцы перапіснай справы было ўведзена крымінальнае пакаранне за ўхіленне ад перапісу. І тым не менш, па сцвярджэнні В. Б. Жыромскай, невялікі недаўлік мог прысутнічаць (не больш 0,2 %), асабліва на вёсцы (ад 1,5 да 6 %). Аднак гэты факт усведамляўся і самімі перапісчыкамі, таму ў большай ступені можна гаварыць аб фальсіфікацыі ў бок павелічэння, якая, аднак, склала не болей 0,4—0,9 % [29, с. 471—473].

Для разумення сацыяльнай псіхалогіі вывучаемага перыяду істотнае значэнне мае вызначэнне таго факта, што згодна з перапісам 1926 г. 52,2 % насельніцт-

ва БССР складалі асобы ва ўзросце да 19 гадоў (2 125 692 чал.) (гл. дадатак, дыягр. 1). Такім чынам, больш паловы жыхароў Беларусі фарміраваліся як асобы менавіта ў савецкі час. Малады ўзрост тлумачыць і асаблівасці сацыяльных паводзін насельніцтва БССР, у тым ліку ў пераломныя 1930-я гг. Вядома, што моладзь у большай ступені была схільная да ўспрыняцця новага, здольная на карэнную ломку ладу, які лічыць «старым». Можна было б яшчэ пазначыць фактар граматнасці, але перапіс 1926 г. не дае звестак аб узроўні і якасці адукацыі насельніцтва Беларусі. Даныя перапісаў 1937 і 1939 гг., з'яўляючыся агульнымі, тым не меней паказваюць, што да канца 1930-х гг. непісьменнасць у БССР, як і ў СССР, у цэлым істотна зменшылася. Адбылося выраўноўванне культурнага ўзроўню розных народаў. Разам з тым дадзены працэс не з'яўляўся такім дынамічным, як гэта дэманстравалася ў савецкай гістарыяграфіі, і спарадзіў шмат супярэчнасцей. У 1920—30-я гг. павялічылася колькасць асоб, што мелі сярэднюю і вышэйшую адукацыю, аднак пэўны разрыў у адукацыі паміж яўрэямі, беларусамі і прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей на тэрыторыі Беларусі працягваў захоўвацца.

Ступень прыцягнення вяскоўцаў да працы і характар сацыяльных узаемаадносін у сярэдзіне 1920-х гг. паказвае вылучэнне самадзейнага і несамадзейнага насельніцтва. Паняцце «самадзейнае насельніцтва» прымянялася ў перапісах 1920—30-х гг. і ў міжнароднай статыстыцы працы да 1947 г. (зараз яно заменена на «эканамічна актыўнае насельніцтва»). Да гэтай групы адносяць асоб, занятых вытворчай дзейнасцю, уключаючы тых, якія ў дадзены момант не маюць працы па незалежным ад іх прычынам. Да «самадзейнага насельніцтва» далучаюць таксама сезонных, замежных рабочых, дыпламатаў за мяжой і ваеннаслужачых [30]. Каб разумець сітуацыю, неабходна мець ва ўвазе, што да самадзейнага адносяць не толькі тых, хто мае прыбытковы занятак (гаспадары, наёмныя работнікі), але і тых, хто на бязвыплатнай аснове ўдзельнічае ў сямейным прадпрыемстве (асобна пазначаныя як «дапамагаючыя»). Ад колькасці ўсяго сельскага насельніцтва БССР самадзейнае складала 2 759 635 чал. (66,7 %), а несамадзейнае — 1 375 775 чал. Такім чынам, калі лічыць толькі гарадское насельніцтва, то на двух вяскоўцаў прыходзілася менш аднаго чалавека, якога яны кармілі. Заўважна, што БССР згодна з рэгіянальнай спецыялізацыяй становіцца хлебаспажываючай. Пераважную ролю набываюць мяса-малочная вытворчасць і тэхнічныя культуры. Пры правядзенні перапісу 1926 г. да самадзейнага адносілі і тую частку насельніцтва, што мела свой заробак, але часткова спажывала сродкі сваіх блізкіх. Вывучэнне сацыяльнай структуры ў вёсцы ўскладнялася тым, што перапіс фактычна не ўлічваў заняткі па гаспадарцы і ўдзел у выхаванні дзяцей.

Выключная большасць вяскоўцаў працавала ў сельскай гаспадарцы (99 %). Сярод астатніх груп можна адзначыць будаўнікоў, транспартнікаў. Даволі істотную іх частку складалі саматужнікі, служачыя, гандляры. Неабходна адзначыць, улічваючы ўдзельную вагу групы насельніцтва да 19 гадоў, высокі ўзровень самадзейнага насельніцтва. Ён быў абумоўлены тым, што на вёсцы захоўвалася сталая традыцыя прыцягнення да ўдзелу ў сельскагаспадарчых работах з маленства. М. В. Доўнар-Запольскі, характарызуючы ўдзел дзяцей у працы ў залежнасці ад

узросту і полу, пісаў: «Дзеці з ранніх гадоў выконваюць тыя або іншыя гаспадарчыя абавязкі, і чым меншая сям'я, тым раней сялянскі падлетак знаёміцца з суровай працай. З пяці гадоў дзіця няньчыць сваіх маленькіх братоў і сясцёр, з 7—8 — ён ужо пастух, ідзе за возам і інш., з 12 гадоў для хлопчыка пачынаюцца пешыя практыкаванні ў земляробстве: ён заграбае сена, баранує, з 15 гадоў бярэцца за цэп, касу, а яшчэ гады праз два і за саху, так што да 20 гадоў ён ужо хлебароб, які прайшоў усе акадэмічныя курсы сялянскай гаспадаркі» [31, с. 24].

Па меркаванні часткі вяскоўцаў, мелася толькі тры групы сялян. Такія сведчанні выяўляліся ў адной з лістовак (люты 1927 г.) в. Казіміраўка Рэчыцкага павета БССР, якая шмат цытавалася на розных партыйных і савецкіх форумах. «...Па-мойму, найбольш дакладным, адпавядаючым рэчаіснасці, — пісаў невядомы, — было б дзяленне сялян на такія групы: 1) сялян найбольш працоўных, што выбіваюцца з сіл; 2) сялян сярэдніх, якія не асабліва працуюць, і разумных; 3) на дурных і лайдакоў, што не жадаюць працаваць, а чакаюць падтрымкі ад улады, — беднякоў» [32, л. 430].

Працэсы дыферэнцыяцыі, што адбываліся на вёсцы, сталі прадметам жорсткай ідэалагічнай барацьбы ў 1920-я гг., якая знайшла адлюстраванне не толькі ў літаратуры, але і партыйна-савецкім асяроддзі. Па гэтай прычыне неабходна асабліва ўважліва даследаваць верагоднасць звестак крыніц і літаратуры 1920-х гг. У прыватнасці, Д. Ф. Прышчэпаў імкнуўся даказаць адсутнасць «небяспечнай канцэнтрацыі зямлі ў кулака, як аб гэтым крычаць апазіцыянеры» [33, с. 25]. У 1920-я гг., дзякуючы звесткам Наркамата фінансаў ЦСУ, узнікае дастаткова магчымасцей для ўдакладнення даных. Аналізуючы іх, неабходна згадзіцца з большасцю даследчыкаў (найперш з М. Я. Стральцовым) у тым, што на працягу 1920-х гг. назіраліся працэсы асераднячвання вёскі [34]. Нельга не заўважыць пэўнае зніжэнне землезабеспячэння на адну гаспадарку. Сітуацыя пагаршалася марудным аднаўленнем саматужнай прамысловасці, дзе вяскоўцы маглі б атрымаць дадатковыя заробкі. Гэта пашырала працэсы адыходніцтва, але традыцыйныя цэнтры (Польшча і Рыга) сталі недаступнымі. У выніку актывізаваўся працэс перасялення ў Сібір [19, с. 35]. Паколькі ў бядняцкіх гаспадарках сем'і былі больш шматлікімі, то ўраўняльныя настроі сярод гэтай групы былі больш істотнымі.

Сярод некаторых груп сялянства з 1928 г. заканадаўствам была выдзелена група гаспадарак, абкладаемая ў індывідуальным парадку. У дачыненні да класічнай трыяды «бядняк», «серадняк», «кулак» яна характарызавалася толькі падатковымі крытэрыямі. Палітычныя вызначэнні былі куды шырэйшымі і ахоплівалі сферу не толькі эканамічных, але і сацыяльных узаемаадносін. Такім чынам, кулаком мог быць пазначаны бядняк ці серадняк, які, да прыкладу, выступаў супраць калектывізацыі. Пастулова і гаспадарка, абкладаемая ў індывідуальным парадку на пачатку ў вачах мясцовых улад, а пасля і сялянства, называлася кулацкай. Удзельная вага гэтай катэгорыі сялян на працягу вывучаемага перыяду няўхільна змяншалася. Змяняліся і прыкметы індывідуальнага абкладання. Калі на мяжы 1920—30-х гг. галоўнымі з іх з'яўляліся арэнда зямлі, прымяненне наёмнай працы, наяўнасць складаных сельскагаспадарчых машын, млына, заняткі гандлем, ліхвяр-

ства ці наяўнасць іншых непрацоўных даходаў, то ў далейшым на першы план выходзяць «злоснае невыкананне» пэўных дзяржаўных абавязкаў і «спекуляцыя». Апошняя магла ўключаць самыя розныя дзеянні найбольш актыўнай групы сялянства — ад продажу сваёй прадукцыі да перапродажу прамысловых тавараў. Такая гандлёвая дзейнасць у Беларусі была меней распаўсюджана: у 1920-я гг. — з прычыны наяўнасці разгалінаванай сеткі прыватнага гандлярства, у 1930-я гг. — у большай ступені праз традыцыйнае адчужэнне сельскагаспадарчага насельніцтва ад падобнага роду дзейнасці. Заўважныя розныя адценні такой з'явы: для мясцовага сялянства сам занятак гандлем — справа нядобрая, а для дзяржавы — тое, што прадукцыю здаваў не па дзяржаўных цэнах, а імкнуўся атрымаць прыбытак. Гэта не садзейнічала імкненню насельніцтва да прадпрымальніцкай дзейнасці і толькі пашырыла працэс міграцыі сялянства ў гарады [35].

Кулак вызначаўся рэальным увасабленнем класавага ворага, эксплуатататара ў сялянскім асяроддзі. Выяўленне прысутных яму характарыстык было незавершаным і змянялася ад абставін часу. Станавіліся іншымі і формы барацьбы ўлады з кулакамі: у другой палове 1920-х гг. пераважалі эканамічныя, з 1930-х гг. пачынаецца фізічнае знішчэнне. Масавыя пратэсты сялянства падштурхнулі ўлады не толькі да барацьбы з перагібамі ў калектывізацыі, але і ў дачыненні да падаткаабкладання. ЦВК і СНК СССР у сваёй Пастанове ад 23 ліпеня 1930 г. пазначылі недапушчальнасць індывідуальнага падаткаабкладання серадзнякоў. Пад гэтым лозунгам у саюзных і аўтаномных рэспублік было адабрана права пашыраць у агульнасаюзным Палажэнні аб сельгаспадатку пералік прыкмет залічэння адзінаасобнай гаспадаркі ў шэрагі кулацкіх. Але істотнае змяншэнне ці знікненне такой катэгорыі вызначалася як адсутнасць класавай пільнасці.

Для мадэрнізацыі вёскі патрэбны былі сродкі, і ўзяць іх магчыма было толькі з вёскі. Ва ўмовах адсутнасці неабходнай колькасці машын узнікала патрэба ў вялікай колькасці танных рабочых рук. Грамадская ж свядомасць атрымоўвала феномен ворага, а той, хто не змог сябе выявіць ва ўласных поспехах, меў спосаб паўздзейнічаць на поспех іншых. Распад абшчынных інстытутаў паглыбляў дадзены працэс. Індывідуалізацыя акрэсліла супрацьстаянне ў самых розных формах, і тыя інстытуты грамады, якія заставаліся дзейнічаць, ужо не маглі захаваць стабільнасць сялянскага «міру» [36]. Значная частка сялян займалася падсобнымі промысламі, адыходніцтвам. Акрэсліць прыбыткі дадзенай катэгорыі з'яўлялася справай вельмі складанай, таму індывідуальнае падаткаабкладанне выступала пэўнай абмежавальнай формай для такога роду дзейнасці. У далейшым стымуляванне калектыўных гаспадарак (дазвол падсобнай гаспадаркі, спісанне запазычанасцей) суправаджалася наступам на адзінаасобніка. Улады ўстанавілі адзіначасовы падатак на індывідуальныя гаспадаркі, пры гэтым неземляробчыя і рыначныя даходы ўключаліся ў абкладаемы даход. Мяса павінны былі пастаўляць усе адзінаасобнікі, нават тыя, што не мелі жывёлы і птушкі [37]. Незадаволенасць ліквідавалася традыцыйным спосабам — выяўленнем і пакараннем «перагібаў» на месцах. Пры гэтым ужо выкарыстоўваўся далей папулярны тэрмін «шкоднікі». Прынятае ў лютым 1935 г. на II з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў Прыкладнога ста-

тута сельскагаспадарчай акругі, дало адзінаасобнікам магчымасць пры ўступленні ў калгас спадзявацца на захаванне падсобнай гаспадаркі. У спалучэнні з наступам на індывідуальную гаспадарку гэта садзейнічала росту калектывізацыі ў многіх рэгіёнах, у тым ліку БССР [38, с. 45, 46].

Па сведчанні Л. М. Мазур, паняцце заможнасці мела значэнне толькі ў параўнанні з астатняй масай сялянства, ніжэй якой па ўзроўні жыцця знаходзілася толькі шматмільённая армія ГУЛАГа [39]. «Знікненне кулака» прымушала шукаць яго нават сярод жабракоў. У дакладной запісцы АДПУ начальніка пагранатрада (Петрыкаўскі раён) пазначалася, што кулацтва праводзіла агітацыю, сумяшчаючы яе з папрашайніцтвам. Заможнае сялянства ў такім выпадку выкарыстоўвала розныя стратэгіі выжывання. Здараліся выпадкі, што, уступаючы гаспадаркай у калгас, частка членаў сям'і па-ранейшаму займалася адыходніцтвам і промысламі, захоўваючы істотны ўзровень прыбытку. Гэта, зразумела, выклікала зайздрасць у іншых членаў калектыву, паколькі з'яўлялася, па іх меркаванні, непрымальным. На пачатку 1930-х гг. у перыяд барацьбы з «перагібамі» такія выключэнні разглядаліся як помста правяраючымі камісіямі ЦК КП(б), і падобныя сітуацыі вызначаліся для выпраўлення [40, л. 165—169].

Ускладненне сацыяльнай структуры грамадства, па меркаванні М. А. Безніна і Т. М. Дзімані, выявілася ў фарміраванні пяці буйных сацыяльных груп, характэрных для калгасна-саўгаснай вытворчасці: протабуржуазія (якая мела найбольшыя правы ўласнасці на сельскагаспадарчыя рэсурсы — старшыні калгасаў, дырэктары саўгасаў і МТС), менеджары (упраўленцы і распарадчыкі рэсурсаў) — брыгадзіры, якія кіравалі аддзяленнямі, і інш., інтэлектуалы (уласнікі ведаў — аграномы, заатэхнікі, інжынеры-механікі і інш.), рабочая арыстакратыя (тыя, хто працаваў з тэхнікай — асновай той эканомікі, якая капіталізавалася, — трактарысты, камбайнеры, шафёры і інш.), сельскі пралетарыят (найбольш аддалены ад улады і ўласнасці — «працаўнікі конна-ручной працы») [41, с. 90—102].

У 1930-я гг. сельскія спецыялісты па прычыне сваёй малалікасці найчасцей аказвалі толькі кансультацыйныя паслугі. Старшыні калгасаў з прычыны традыцыйнага сялянскага недаверу да такога роду тэарэтыкаў-кансультантаў не прыслухоўваліся. А ў кіраўніцтве МТС найчасцей не было зацікаўленасці ў паспяховасці агранамічнай справы [42, с. 35]. Аднак з цягам часу роля і адказнасць сельскагаспадарчай інтэлігенцыі павялічвалася. З 1930-х да сярэдзіны 1950-х гг. яны з'яўляліся служачымі і працавалі на ўмовах найму. На пачатку 1930-х гг. гэтая частка вяскоўцаў мела пашпарт і магчымасць свабодна перамяшчацца. Імкненне замацаваць кадры перадвызначыла ва ўмовах адсутнасці іншых эканамічных стымулаў інстытут «размеркавання» (1933 г.). Выпускнікі ВНУ згодна з Пастановай ЦВК і СНК СССР ад 15 верасня 1933 г. павінны былі адпрацаваць у пэўнай гаспадарцы не менш 5 гадоў. Выпускнікі тэхнікумаў не мелі права паступаць у ВНУ, калі не адпрацавалі 3 гады.

Рэальная аплата працы ветэрынараў, заатэхнікаў, аграномаў была вышэйшай, паколькі акрамя грашовай прысутнічала яшчэ і «натуральная» частка аплаты. Найперш гэта тычылася бясплатнага жылля, ацяплення і асвятлення. У другой

паловe ім была павышана заработная плата, на іх была распаўсюджана дзяржаўная сістэма сацыяльнага страхавання [43]. Нягледзячы на пэўную сацыяльную адасобленасць пры ўмове добрых адносін да сваёй справы, чуласці і прафесіяналізму, сельская інтэлігенцыя інтэгравалася ў вясковае асяроддзе. У такіх выпадках яна карысталася павагай і разуменнем сваёй працы. Істотнай з'яўлялася культурная складаючая ў гэтай сацыяльнай групы — яны больш чыталі, актыўна цікавіліся палітычнымі падзеямі. Што ж тычыцца адзення, то з часам яны набліжаліся да паўсядзённага выгляду сельскага жыхара.

Напачатку заработную плату атрымоўвалі толькі рабочыя саўгасаў і некаторых камун. З другой паловы 1930-х гг. пачынаецца пранікненне гарантаванай аплаты працы ў арцелі: яе атрымоўваюць асобныя са старшынь калгасаў (праз «цвёрдыя стаўкі» ў працоўных), калгасныя рахункаводы, прадстаўнікі «рабочай арыстакратыі» (трактарысты, камбайнеры) [44]. Вызначаліся як павышаныя выплаты за перапрацоўку, так і спагнанні за недастатковы ўзровень дысцыпліны і якасці працы. У той час калі ў аплаце трактарыстаў захоўваліся змешаныя формы, з 1 студзеня 1934 г. аплату трактарных брыгадзіраў прапаноўвалася вызначыць адпаведна стаўцы 150 рублёў у месяц. Фіксаваную заработную плату атрымоўвалі ад дзяржавы з пачатку 1930-х гг. і сельскагаспадарчыя інтэлектуалы (аграномы, заатэхнікі і інш.), якія (за пэўным выключэннем) з'яўляліся на той час наёмнымі працаўнікамі дзяржаўных арганізацый [45, с. 104].

Такім чынам, мадэрнізацыя аграрнай сферы вытворчасці перадвызначала ўскладненне сацыяльнай структуры грамадства, якая выявілася ўжо з пачаткам суцэльнай калектывізацыі вёскі.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Бородкин Л. И., Максимов С. В.* Крестьянские миграции в России и в СССР в первой четверти XX века (микроанализ структуры миграционных потоков) // Отеч. история. 1993. № 5. С. 127.

2. *Утгоф В. С.* Белорусские беженцы Первой мировой войны в 1914—1922 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 ; Рос. акад. наук, С.-Петерб. ин-т истории. СПб., 2003. 23 с.

3. *Саматыя В. Р.* Проблема беженцев в Беларуси в годы Первой мировой войны // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 2003. № 2. http://evolutio.info/content/view/631/54/

4. *Круталевич В. А.* Административно-территориальное устройство БССР. Минск : Наука и техника, 1966. 133 с.

5. Административные деления СССР по данным к 15 мая 1923 года / РСФСР. Народный комиссариат внутренних дел. Стат. отд. М. : Изд-во НКВД, 1923. XI. 1. 60 с.

6. Общее положение о городских и сельских поселениях и поселках. Постановление ВЦИК и СНК РСФСР от 15 сентября 1924 г. // СУ РСФСР. 1924. № 73. Ст. 726.

7. *Елизаров С. А.* Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.). Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2009. 222 с.

8. Всесоюзная перепись населения 1926 года. Инструкция по переписи населения Белорусской ССР от 17 декабря 1926 года / СССР, БССР, ЦСУ. Минск : Профтехшкола, [1926?]. 15 [1] с.

9. Предварительные итоги Всесоюзной переписи населения в БССР 17-го декабря 1926 года. Минск : Изд. ЦСУ БССР, 1927 (1-я гостип. «БГИ»).

10. *Праферансаў*. Стэнаграма даклада кіраўніка ЦСУ БССР тав. Праферансава на пасяджэнні СНК БССР 21 лістап. 1928 г. па пытанні аб выніках дэмаграфічнага перапісу 1926 г. Мінск : Выд. Кіраўн. спраў СНК ; Выд. Эканам. Нарады БССР, 1928.

11. Всесоюзная перепись населения 17 декабря 1926 г. : крат. сводки / Центр. стат. упр. СССР, Отд. переписи. М. : ЦСУ СССР, 1927. Вып. 5 : Возраст и грамотность, Европейская часть РСФСР, Белорусская ССР. 1928.

12. Всесоюзная перепись населения 1926 года — Recensement de la population de l' U. R. S. S. / Центр. стат. упр. СССР, Отд. переписи. М. : ЦСУ СССР, 1928. Часть текста параллельно на русском и французском. Т. 10 : Белорусская Советская Социалистическая Республика. Народность, родной язык, возраст, грамотность. 1928. VI. [1] л.

13. Всесоюзная перепись населения 1926 года — Recensement de la population de l' U. R. S. S. / Центр. стат. упр. СССР, Отд. переписи. М. : ЦСУ СССР, 1928. Часть текста параллельно на русском и французском. Т. 44 : Белорусская Советская Социалистическая Республика. Семейное состояние, место рождения и продолжительность проживания, увечные и психические больные. 1929. [6], 203 с.

14. Естественное движение населения Союза ССР в 1926 г. Центр. стат. упр. СССР. Сектор социальной статистики. Секция статистики социального состава и движение населения. Т. 1. Вып. 2. М., 1929. 179 с.

15. *Сольц А.* Аборт и алименты // Труд. 1937. 27 апр. № 97.

16. *Семашко Н.* Какой замечательный закон! (К отмене абортов в СССР) // Медицинский работник. 1937. 16 июля.

17. *Голотик С. И., Минаев В. В.* Население и власть: очерки демографической истории СССР 1930-х годов. М., 2004.

18. *Гернет М.Н.* Самоубийства в 1925 и 1926 гг. [Электронный ресурс] // Самоубийства в СССР в 1925 и 1926 гг. М. : ЦСУ, 1929. 57 с. URL: http://demoscope.ru/weekly/knigi/polka/gold_fund07.html (дата обращения: 14.11.2013).

19. Перспективный план развития сельского и лесного хозяйства БССР на 1925/26—1929/30 г. (Утвержден Правительством). Минск : Наркомзем БССР, 1927. 945 с.

20. *Поляков Ю. А., Жиромская В. Б., Киселев И. Н.* Полвека молчания: Всесоюзная перепись населения 1937 г. // Социол. исследования. 1990. № 6—8; Итоги переписи населения 1937 г. // Вестн. статистики. 1990. № 7.

21. Всесоюзная перепись населения 1937 г. : краткие итоги. М. : Ин-т истории СССР АН СССР, 1991. 239 с. (Сб. док.).

22. Всесоюзная перепись населения 1939 года : основные итоги / Рос. АН, Науч. совет по ист. демографии и ист. географии, Ин-т рос. истории, Упр. статистики населения Госкомстата ; сост.: Ю. А. Поляков [и др.] ; авт. коммент. : Н. А. Араловец [и др.]. М. : Наука, 1992. 256 с.

23. Помесячные данные о рождаемости и смертности населения РСФСР, УССР и БССР за 1932, 1933, 1934 гг. [Электронный ресурс]. URL: http://istmat.info/node/18141/ (дата обращения: 21.10.2013.).

24. Докладная записка т. Гикало о волнениях в гор. Борисове в связи с уменьшением норм выдачи хлеба и снятием части населения со снабжения // Голод в СССР. 1929—1934 : в 3 т. М. : МФД, 2011. Т. 1 : 1929 — июль 1932. Кн. 2. 560 с. (Россия. XX век. Документы).

25. *Попов В. П.* Паспортная система в СССР (1932—1976 гг.) // Социолог. исслед. 1995. № 8. С. 3—14, № 9. С. 3—13.

26. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927—1939 : в 5 т. / под ред. В. Данилова [и др.] ; отв. ред. Н. Ивницкий ; сост. : Н. Ивницкий [и др.]. М. : РОССПЭН, 2000. Т. 2 : Ноябрь 1929 — декабрь 1930. 927 с.

27. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927—1939 : в 5 т. / под ред. В. Данилова [и др.] ; отв. ред. Ю. Мошков ; сост. : В. Данилов, Ю. Мошков [и др.]. М. : РОССПЭН, 2002. Т. 4 : 1934—1936. 1056 с.

28. *Жиромская В. Б., Киселев И. Н., Поляков Ю. А.* Полвека под грифом «секретно». Всесоюзная перепись населения 1937 г. М. : Наука. 1996. 152 с.

29. *Жиромская В. Б.* Всесоюзная перепись населения 1939 г. в историографии: оценка достоверности // Россия в XX в.: судьбы исторической науки. М., 1996. С. 469—477.

30. *Борисов А. Б.* Большой экономический словарь. М. : Книжный мир. 2003. 895 с.

31. *Довнар-Запольский М. В.* Исследования и статьи. Т. 1 : Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность [Электронный ресурс]. Киев, 1909. Электронная коллекция «Россия и Беларусь: этнокультурный диалог». С. 14. URL: http: //books. google. com (дата обращения: 10.09.2013).

32. Доклады, обзоры, справки, информации о состоянии партийно-массовой и культурно-просветительной работы в совхозах и колхозах БССР // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4215.
33. *Прышчэпаў Зьм.* Дыферэнцыяцыя беларускай вёскі // Савецкае будаўніцтва. № 11. С. 13—25.
34. *Стрельцов М. Е.* Социальные группы в крестьянстве Белоруссии к концу восстановительного периода : докл. конф. секций Научного совета по проблеме «Истории БССР». Минск, 1969. 572 с.
35. СЗ СССР. 1928. № 24. Ст. 212; СЗ СССР. 1929. № 34. Ст. 301; СЗ СССР. 1933. № 32. Ст. 188б; СЗ СССР. 1933. № 32. Ст. 1886.
36. СЗ СССР. 1928. № 24. С. 212; СЗ СССР. 1929. № 12. С. 103; СЗ СССР. 1930. № 37. Ст. 399.
37. СЗ СССР. 1934. № 40. Ст. 321, № 48. Ст. 370, № 49. Ст. 380.
38. *Зеленин И. Е.* Коллективизация и единоличник (1933-й — первая половина 1935 г.) // Отеч. история. 1993. № 3. С. 35—55.
39. *Мазур Л. М.* Зажиточное и колхозное крестьянство: парадоксы социально-экономической дифференциации (по материалам Среднего Урала 1950—1960-х гг.) // Зажиточное крестьянство России в исторической ретроспективе : материалы XXVII сессии Симпозиума по аграрной истории Восточной Европы. Вологда : ВГПУ, изд-во «Русь», 2001. 432 с.
40. Доклад комиссии ЦК КП(б)Б, выехавшей в Полоцкий район по проверке правильного исключения колхозников из колхоза // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 3. Спр. 60.
41. *Безнин М. А., Димони Т. М.* Социальные классы в российской колхозно-совхозной деревне 1930—1980-х гг. // Социс. 2011. № 11.
42. *Безнин М. А., Димони Т. М.* Интеллектуалы в сельском хозяйстве России 1930–1980-х гг. // Ярослав. пед. вестн. 2013. № 1. Т. I : Гуманит. науки. С. 29—41.
43. Постановление СТО СССР от 21 сентября 1933 г. № 827 [Электронный ресурс]. URL: www.cawmix.ru/SSSR/15555 (дата обращения: 10.12.2013).
44. *Безнин М. А., Димони Т. М.* Становление «зарплатного» способа эксплуатации труда в российской деревне 1930—1980-х гг. // Проблемы развития территории. 2013. № 4 (66). С. 102—109.
45. Зажиточное крестьянство России в исторической ретроспективе : материалы XXVII сессии Симпозиума по аграрной истории Восточной Европы. Вологда : ВГПУ, изд-во «Русь», 2001. 432 с.

## 3.2. ФОРМЫ ВЯСКОВЫХ ПАСЕЛІШЧАЎ І ЗЕМЛЕКАРЫСТАННЯ. ТРАНСФАРМАЦЫЯ ТРАДЫЦЫЙНЫХ СЯЛЯНСКІХ ІНСТЫТУТАЎ

Напрыканцы другога дзесяцігоддзя XX ст. на тэрыторыі былой Расійскай імперыі адбыліся падзеі, якія пераўтварылі землеўладальнікаў у землекарыстальнікаў. Згодна з энцыклапедычным слоўнікам Бракгаўза і Ефрона «землекарыстанне — карыстанне зямлёю ва ўстаноўленым звычаем ці законам парадку, а землекарыстальнік — юрыдычная ці фізічная асоба, якая атрымала зямлю ў бестэрміновае, доўгатэрміновае ці часовае карыстанне» [1, с. 426—438]. Важнейшае месца ў гэтым працэсе мае Дэкрэт II Усерасійскага з'езда Саветаў аб зямлі, прынятыя 26 кастрычніка (8 лістапада) 1917 г. «Асноўным стрыжнем кастрычніцкага перавароту з'яўляецца зямельны голад сялянства», — пісаў у 1925 г. Антон Міхайлавіч Бальшакоў [2, с. 8].

Агульнавядомы факт, што бальшавікі перахапілі ініцыятыву ў эсэраў і прапанавалі іх праект (складзены на аснове 242 мясцовых сялянскіх наказаў, які быў апублікаваны да прыходу бальшавікоў да ўлады — у газеце «Известия» № 88, 19 жніўня 1917 г.). Важна ўсё ж нагадаць некалькі палажэнняў гэтага дакумента. Па-першае, адмянялася права прыватнай уласнасці на зямлю, зямля абвяшчалася «ўсенародным здабыткам». У большасці пунктаў пазначаюцца толькі два суб'ек-

ты ўласнасці — «абшчына» і «дзяржава». Права карыстання зямлёю атрымоўвалі ўсе грамадзяне, якія жадалі апрацоўваць яе сваімі сіламі, права прыватнай уласнасці адмянялася. Пры гэтым сядзібная зямля захоўвалася ва ўласнасці селяніна. Наёмная праца забаранялася, калі абшчыннік працягла хварэў, то абшчына дапамагала яму апрацоўваць зямлю. Землекарыстанне прапаноўвалася ўраўняльнае, абмяжоўваліся, але ўсё ж захоўваліся перадзелы. На той час мала хто звярнуў увагу на загадкавы пяты пункт дакумента, які ў супярэчнасць іншым дэкларававаў, што землі бяднейшага сялянства і шэраговых казакаў не канфіскуюцца [3, с. 17].

Пакідаючы па-за разглядам зямельную палітыку савецкай улады на працягу 1918—1920 гг., падкрэслім, што бальшавікі напачатку ўсё ж рухаліся ў фарватары сялянскіх патрабаванняў. Пазней У. І. Ленін сцвярджаў, што такім чынам «мы стварылі зямельны лад, найбольш спрыяльны ў сэнсе пераходу да сацыялізму» [4, с. 326]. Між тым гэта было, па сутнасці, вяртанне абшчыны. Дык ці меў рацыю М. А. Бярдзяеў, калі сцвярджаў, што «бальшавікі не накіроўвалі рэвалюцыю, а былі толькі яе паслухмяным сродкам»? [5] Да лета 1918 г., а ў шэрагу выпадкаў і пазней значны ўплыў на палітыку ў дачыненні вёскі мелі левыя эсэры. Вядома, што пасля Уладзіміра Паўлавіча Мілюціна на пачатку снежня 1917 г. народным камісарам земляробства РСФСР быў прызначаны левы эсэр Андрэй Лукіч Калягаеў. На месцах уплыў партыі эсэраў быў яшчэ больш істотным. І. А. Кірылаў сведчыў, што ў гэты перыяд сельская грамада нярэдка праводзіла праз зямельныя аддзелы рашэнні аб тым, што «ўсе хутары і адрубы як на надзельнай, так і купленай зямлі пераходзяць у абшчыны. Пры гэтым заможныя хутаране павінны былі перанесці свае пабудовы за свой кошт» [6, с. 86]. Прыняты 19 лютага 1918 г. па ініцыятыве левых эсэраў «Асноўны закон аб сацыялізацыі зямлі» хоць і ўключыў асобныя прапановы бальшавікоў, па меркаванні І. А. Кірылава, усё ж адлюстраваў ідэалогію партыі сацыял-рэвалюцыянераў. Колькасць зямлі абмяжоўвалася спажывецка-працоўнай нормай, панаваў выключна «ўраўняльны фетышызм», ствараецца Інструкцыя для ўстанаўлення спажывецка-працоўнай нормы землекарыстання на землях сельскагаспадарчага прызначэння [6, с. 95, 96]. Мэта «Асноўнага закона аб сацыялізацыі зямлі» была дасягнута да канца 1918 г. «Сялянства захапіла ўсю зямлю і ўраўняльна яе захапіла, — пісаў І. А. Кірылаў. — Мара цэлага шэрагу пакаленняў ажыццявілася, але вынікі гэтай усерасійскай дзялёжкі сталі значна меншымі, чым чакалі многія» [6, с. 112].

Безумоўна, можна сцвярджаць, што знакаміты «Наказ 242 сялянскіх дэпутатаў» з'яўляўся выразнікам не сялянскіх спадзяванняў, а эсэраўскай партыі. Аднак у дачыненні да ліквідацыі прыватнай уласнасці на зямлю сацыялістычныя партыі выяўлялі характэрнае адзінства. Яшчэ ў 1915 г. знакаміты эканаміст М. І. Туган-Бараноўскі пісаў: «Ідэі права на зямлю неабходна супрацьставіць як бясспрэчна вышэйшую сацыяльную ідэю (роўна як і на ўсе сродкі вытворчасці) зусім не кожнага асобнага грамадзяніна, а ўсяго грамадства ў сукупнасці» [7, с. 331].

Ці дазваляе гэта ўслед за асобнымі публіцыстамі і гісторыкамі сцвярджаць, што «калектывізацыя з'яўлялася толькі зменай землекарыстання»? [8] На наш погляд, не. Але сапраўды патрабуецца больш уважлівы аналіз тых працэсаў, якія

мелі месца ў вёсцы на працягу 1920—30-х гг., вывучэнне не толькі сацыяльна-эканамічных фактараў, але і сацыяльнай псіхалогіі, уплыву традыцыі, ментальнасці [9]. Урэшце менавіта на тэрыторыі Беларусі цягнікі «пераабуваюць» на еўрапейскія рэйкі. Асаблівай увагі патрабуе вывучэнне абшчыны, абшчынных традыцый, якія, безумоўна, нельга зводзіць толькі да землекарыстання. Напачатку спынімся на гісторыі гэтага пытання, дзе пераплятаюцца сацыяльна-эканамічныя, культурна-гістарычныя і рэлігійна-этычныя аспекты. Менавіта абшчына стала тым грамадскім інстытутам, у якім на пэўным этапе гістарычнага развіцця Расійскай імперыі выяўна адлюстраваліся асаблівасці яе гаспадарчага і зямельнага ўладкавання.

Першыя працы па гісторыі паслярэвалюцыйнай абшчыны выйшлі ў свет ужо ў 1920-я гг. У даследаваннях С. М. Дуброўскага, М. П. Аганоўскага, П. М. Першына актуалізоўвалася роля абшчыны ў працэсе зямельнай рэформы, вызначаліся прававыя аспекты функцыянавання і магчымыя шляхі эвалюцыі абшчыннай гаспадаркі [10, с. 79, 91; 11, 12]. Аднак ужо з канца 1920-х гг. на працягу трох дзесяцігоддзяў тэма абшчыны застаецца па-за разглядам. Толькі ў канцы 1950-х гг. абшчына стала прадметам дыскусіі паміж С. П. Трапезнікавым і В. П. Данілавым [13, 14, с. 90—128]. На думку С. П. Трапезнікава, у Расіі цалкам была ажыццёўлена ідэя К. Маркса аб здольнасці абшчыны стаць асновай для арганізацыі сацыялістычнага земляробства. Пераход абшчынных інстытутаў у вышэйшую фазу свайго развіцця быў зроблены ў перыяд калектывізацыі, калі абшчына стала «апорным пунктам сацыялістычнага пераўтварэння сельскай гаспадаркі краіны». Іншы пункт гледжання выказаў В. П. Данілаў, які лічыў, што мірская арганізацыя сялянства не адпавядала задачам сацыялістычнага пераўтварэння сельскай гаспадаркі, а таму ў гады калектывізацыі мела месца не пэўная эвалюцыя абшчыннай гаспадаркі ў калгасы, а карэнная ломка ўсіх адзінаасобных форм землекарыстання. У далейшым цікавасць да праблематыкі абшчыннай гаспадаркі захавалася, хоць і не стала прадметам новых дыскусій [15, с. 102, 134; 16, с. 42—54; 17, с. 341—359; 18, 19, с. 9—60; 20].

У постсавецкі час працы па гісторыі абшчыны перасталі быць выключнай з'явай [22, с. 32—42; 23, с. 366—383; 25, с. 56; 26, 27, с. 49—105; 28, с. 130—132; 29]. Па меркаваннях шэрагу даследчыкаў, асноўнай мэтай абшчыны з'яўлялася калектыўнае выжыванне ў суровых умовах барацьбы за існаванне. У прыватнасці, вядомы расійскі даследчык Леанід Васільевіч Мілоў звярнуў увагу на істотнае адрозненне ва ўмовах сельскагаспадарчай вытворчасці сялян Расійскай дзяржавы і вяскоўцаў у Заходняй Еўропе, якое было выклікана прыродна-кліматычнымі ўмовамі. Гэта надзвычай кароткі для земляробчых супольнасцей рабочы сезон, які доўжыўся з паловы красавіка да паловы верасня (па новым стылі з пачатку мая да пачатку кастрычніка). У той жа час на захадзе Еўропы на палях не працавалі толькі снежань і студзень [30, с. 570].

Абшчына захавала свой істотны ўплыў пасля рэформы 1861 г. Толькі пятая частка ўсёй зямлі стала асабістай уласнасцю сялян, а астатняя належала абшчыне, якая несла адказнасць за выплату подацей, за ўтрыманне сельскіх цэркваў,

школ, дарог і г. д. У 80—90-я гг. XIX ст. расійскія ўлады зрабілі шэраг намаганняў дзеля таго, каб прадухіліць распад патрыярхальных адносін і абшчыны. З 14 снежня 1883 г. выхад стаў магчымым толькі пры згодзе абшчыны [31, с. 85—90]. Роля абшчыны замацоўвалася і ў пытаннях зямельных перадзелаў, якія павінны былі праводзіцца не раней чым 12 (ці больш) гадоў. Паколькі гэтыя правілы пачалі дзейнічаць у мясцовасцях, дзе было ўведзена Палажэнне аб земскіх участковых начальніках, то на ўсходнія беларускія губерні яны распаўсюдзіліся з 1 студзеня 1901 г. [32, с. 762—764].

Валянцін Голубеў ужывае тэрміны «сялянская абшчына», «сельская абшчына», «сельская грамада», «сялянская грамада» як тоесныя. Спасылаючыся на меркаванне Е. Выразумскага, ён вызначае грамаду (у шырокім значэнні) як сход, што прадстаўляе думку альбо волю гэтага аб'яднання, удзел у якім бяруць дарослыя яго члены. Пры гэтым Валянцін Фёдаравіч заўважае, што гэта вельмі ёмкае, але не вычарпальнае вызначэнне сельскай грамады [33, с. 26—40]. Г. І. Маскевіч лічыць, што «сельская грамада — гэта форма грамадскай арганізацыі сялян, адзінка самакіравання, а сялянская абшчына — форма сялянскага землеўладання, якое існавала ў сельскай грамадзе нароўні з падворным» [34, с. 197—200]. Па яе меркаванні, сельская грамада як адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка сялянскага самакіравання ў Беларусі пачала дзейнічаць пасля 1861 г., а абшчына з гэтага часу становіцца выключна прававой адзінкай, якая кантралявала пытанні землеразмеркавання. Як сцвярджае Ганна Іванаўна, сельская грамада вызначаецца ў другой палове XIX ст. асноўнай формай арганізацыі сялянскага жыцця і побыту [35, с. 13—18]. Заўважна, што праблема тэрміналогіі патрабуе далейшага вывучэння.

Па сведчанні Паўла Мікалаевіча Зыранава, у Гродзенскай, Ковенскай і Мінскай губернях абшчыннае землеўладанне ў 1905 г. поўнасцю адсутнічала. Падворнае землекарыстанне, як і абшчыннае, характарызавалася цераспалосіцай, без усякай магчымасці выправіць становішча [37]. Пры гэтым у карыстанні грамады заставаліся землі агульнага карыстання. Беларускі селянін выяўляў да сваёй «грамады» не меншую павагу, чым рускі селянін к «обществу» сваёй вёскі. Адчуўшы пэўныя зямельныя страты, грамада нават у губернях з падворным карыстаннем была вымушана садзейнічаць куплі зямлі. Адначасова ў асобныя гады значная частка зямельных плошчаў прадавалася. Гэты факт не знайшоў свайго тлумачэння ў гістарыяграфіі. Ён уяўляецца істотным сведчаннем ролі і ўплыву грамады ў зямельным пытанні.

Для сялян, якія атрымлівалі асноўны прыбытак ад неземляробчых промыслаў, абшчынная зямля, абцяжараная выкупнымі плацяжамі, станавілася дадатковым клопатам, і яны праяўлялі да яе менш інтарэсу. Наадварот, сяляне, якія атрымлівалі галоўны даход ад сельскай гаспадаркі, сталі больш, чым раней, шанаваць абшчынную форму ўласнасці, што гарантавала ўсім хоць нейкі пражытачны мінімум. Асабліва шмат выпадкаў пераходу ад перадзельнай да бесперадзельнай абшчыны было зафіксавана ў заходніх і паўднёвых губернях Расійскай імперыі, якія межавалі з беларускімі і ўкраінскімі землямі, дзе існавалі падворныя абшчыны без перадзелаў. У выніку паміж беларускімі і ўкраінскімі губернямі, дзе пера-

важала падворная форма, і цэнтральнымі велікарускімі губернямі, дзе панавала перадзельная абшчына, да 1905 г. утварылася зона бесперадзельных абшчын [37, с. 414—418]. Пад уздзеяннем палітыкі ўлад і перадрэвалюцыйных падзей да 1905 г. у параўнанні з 1877 г. колькасць сялянскіх двароў з абшчыннай формай землеўладання ўзрасла на 46,5 %, а абшчыннае землекарыстанне павялічылася на 2,5 % [21, с. 142]. Па сведчанні І. А. Кірылава, да 1915 г. на атрубы і хутары выдзелілася не болей 8—9 % сялянскіх гаспадарак [6, с. 19].

Прызнаючы ў цэлым прагрэсіўнасць Сталыпінскай аграрнай рэформы, савецкія ды і постсавецкія гісторыкі ўсё ж канстатуюць, што істотны поспех яна мела ў заходніх губернях Расійскай імперыі (крыху меншы — у паўночна-заходніх). На гэта паўплывалі латышскія хутары, якія існавалі побач, а таксама прыродна-геаграфічныя ўмовы, спецыялізацыя ў кірунку мяса-малочнай жывёлагадоўлі. Але нават тут значная частка сялянскіх гаспадарак з абшчыны не выдзелілася. Гэта было абумоўлена даволі нізкім узроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця вёскі, асабліва яе геаграфічных і прыродных умоў, аграрнай перанаселенасцю і слабым адтокам насельніцтва ў прамысловую і гандлёвую сферы. Пры гэтым сялянская абшчына не заставалася нязменнай і эвалюцыянавала. Значная частка зямель набывалася грамадой, апрацоўвалася цераспалосна, на тых жа падставах, што і надзельныя землі. Да прыкладу, у 1917 г. па 6 паветах Мінскай губерні (што склалі першапачатковую аснову тэрыторыі БССР) доля зямель, набытых зямельнымі таварыствамі на правах уласнасці, склала 59 % [38, с. 36]. Хутарскія гаспадаркі сапраўды развіваліся больш паспяхова. Аднак гэта спараджала новыя сацыяльныя супярэчнасці, якія былі звязаны ў тым ліку з захопам традыцыйна грамадскіх зямель — выпасаў, лясоў і г. д. Ідэя ўсеагульнага перадзелу з прычыны вайны і агітацыі левых партый толькі ўзмацнялася.

Адна з прычын няўдачы рэформы ў маштабах Расійскай імперыі — феномен завышаных чаканняў. Па меркаванні сучаснага расійскага гісторыка Ігара Якаўлевіча Фраянава, Сталыпінская аграрная рэформа пацярпела крах таму, што ставіла задачу прымусовага разбурэння абшчыны. Яна «не магла падарваць абшчыну, якая працягвала заставацца цэнтральным звяном аграрнай эканомікі, што толькі пацвярджала невыпадковы характар яе ўзнікнення і абумоўленасць дзеяннем аб’ектыўных прычын» [39, с. 176]. Па сведчанні ж К. Кофада (ацэншчыка ў Магілёўскім аддзяленні Дваранскага банка), абшчынны вобраз жыцця не быў ідэалам справядлівасці для беларускіх сялян, ён сведчыў аб тым, што «рэвізіі не выклікалі ніякіх перадзелаў зямлі» [40, с. 134, 140, 141]. За перыяд рэалізацыі рэформы (да пачатку ваенных дзеянняў у 1915 г.) у Магілёўскай губерні выйшлі з абшчыны і замацаваліся надзелы ў асабістай уласнасці 56,8 %, у Віцебскай — 28,9 %. Беларусь па колькасці двароў, якія выйшлі з абшчыны, займала першае месца сярод многіх раёнаў Расіі [41].

Расійскія даследчыкі сцвярджаюць, што ў суседніх Пскоўскай і Смаленскай губернях з часу вайны гэты працэс не толькі не супыніўся, але і набыў зваротны характар. Адной з важнейшых прычын замаруджвання Сталыпінскай аграрнай рэформы акрэсліваюць пачатак Першай сусветнай вайны [24]. Вайна дала абш-

чыне добры шанец падоўжыць сваё існаванне, умацаваць пазіцыі, падарваныя рэформай. Разам з тым крызіс традыцыйнай абшчыннай свядомасці сялян, які вызначыўся пад уздзеяннем мадэрнізацыі, узмацніўся ў гады Першай сусветнай вайны. Структураўтваральныя элементы масавай свядомасці сялян падвяргаліся сур'ёзнай дэфармацыі ў перыяд трансфармацыі «чалавека з зямлёй» у «чалавека са зброяй». Са сродку падпарадкавання вёскі дзяржаве абшчына пераўтварылася ў арганізацыю барацьбы сялян з памешчыцкім землеўладаннем і стала інструмент зямельнага перадзелу.

Рэвалюцыя 1917 г. прывяла да перамогі абшчыннага права і распаўсюдзіла яго на ўсю прастору РСФСР. Асобныя з сучасных гісторыкаў нават пачалі называць рэвалюцыю «абшчыннай» [42, с. 156]. Сялянская рэвалюцыя 1917—1922 гг., па меркаванні В. П. Данілава, была накіравана на рэалізацыю сялянскага ідэалу — свабоднай працы на свабоднай зямлі. У рэвалюцыйных перадзелах бачыцца двуістасць традыцыйнай ментальнасці сялянства, якая перадвызначыла імкненне да ўраўняльнага перадзелу як памешчыцкіх, так і сялянскіх зямель.

Паступовае ўмацаванне ўлады Саветаў на месцах, перавыбары Саветаў стварылі на нейкі час дуалізм улады на вёсцы. В. П. Данілаў сцвярджаў, што ў 1920-я гг. у асноўных земляробчых раёнах РСФСР у абшчынным землекарыстанні знаходзілася каля 98—99 % сялянскіх зямель. Выключэнне складалі БССР, УССР ці заходнія і паўночна-заходнія раёны РСФСР [15, с. 108]. На падставе Пастановы IX з'езда Саветаў РСФСР («Известия ЦИК» ад 30 снежня 1921 г. № 295) з мэтай «прадастаўлення сялянскаму насельніцтву рэспублікі як мага больш ініцыятывы ў справе паляпшэння сялянскай гаспадаркі» быў прыняты (за подпісам А. Р. Чарвякова) Дэкрэт Прэзідыума ЦВК ССР Беларусі «Аб свабодным выбары форм землекарыстання». Дазваляючы «працоўнаму сялянскаму насельніцтву Беларусі свабодны выбар формы землекарыстання», дакумент акрэсліваў кола тых, хто вырашаў дадзенае пытанне. Зямельныя супольнасці ці сельскагаспадарчыя аб'яднанні згодна з пастановай большасці паўнапраўных членаў маглі выбраць любую форму землекарыстання, а менавіта: таварыскую (калектыўную), абшчынную, саматужную, адрубную, змешаную і іншую, якая прыводзіла да магчыма большай інтэнсіўнасці сельскай гаспадаркі. Пераход да той ці іншай формы землекарыстання асобных членаў ці групы членаў дадзенай зямельнай супольнасці ці сельскагаспадарчага аб'яднання дапускаўся выключна ў парадку землеўпарадкавання на аснове прававых палажэнняў, што дзейнічалі ў 1919 г. пры ўмове, што «такі пераход не будзе перашкодай для правядзення асноўнага землеўпарадкавання» [43].

Важнейшым інстытутам, які быў замацаваны ў зямельных кодэксах 1920-х гг., з'яўляўся інстытут «зямельнай грамады». Па меркаванні шэрагу даследчыкаў, зямельная грамада канстытуявала сялянскую абшчыну, якая атрымала права юрыдычнай асобы (гэта значыць магчымасць набываць і прадаваць маёмасць, заключаць дамовы, прадстаўляць свае інтарэсы ў судзе і г. д.) [44, с. 148].

Галоўным органам, які вырашаў усе справы грамады, заставаўся сход. Калі сельсаветы знаходзіліся далёка ад населенага пункта, менавіта сход вызначаўся адзіным легітымным органам сялянскага волевыяўлення.

У заштатных гарадах і пасёлках гарадскога тыпу з насельніцтвам менш 10 000 чалавек выбіраўся не гарадскі, а сельскі Савет. У маі 1923 г. на Гомельскім губпартсходзе па выніках абследавання 6 валасцей прагучала заклапочанасць такой сітуацыяй: «Надзвычай слабыя сельсаветы. Гэты орган фактычна ў вёсцы не існаваў, бо ўсе пытанні вырашае сход, а не сельсавет, які амаль ніколі не збіраецца. Функцыі цяперашняга старшыні сельсавета мала чым адрозніваюцца ад таго, што ў стары час рабіў стараста» [45, л. 163]. Партыйныя ўлады палохаў гэты «сялянскі дэмакратызм», які фарміраваўся стагоддзямі ў якасці ахоўнага механізма ў адносінах сялян з уладаю і які не чапаў нават царскі ўрад. Ва ўмовах савецкай рэчаіснасці такі дэмакратызм уладу не задавальняў — у ім бачылі праяўленне «дробнабуржуазнай стыхіі», небяспечнай для пралетарскай улады ў сялянскай краіне. Узбуйненне сельсаветаў, на думку яго ініцыятараў, паслабіла б гэты «сялянскі дэмакратызм» праз узмацненне ўплыву структуры сельсаветаў шляхам «укамплектавання іх надзейнымі таварышамі». Планавалася пакінуць сельсаветы толькі ў тых населеных пунктах, дзе налічвалася не менш за 600 чалавек, а астатнія сельскія пасяленні павінны былі ці ўвасці ў склад больш буйных сельсаветаў, ці аб'яднацца з іншымі, такімі ж дробнымі, у адзін. У выніку ўнутрыгубернскага раяніравання колькасць валасцей у Гомельскай губерні скарацілася [46, с. 55, 56]. Занятыя правядзеннем масавых кампаній, сельсаветы не надавалі дастатковай увагі задавальненню шэрагу надзённых патрэб сялян у развіцці сельскай гаспадаркі, добраўпарадкавання і інш. Вырашэнне гэтых праблем заставалася ў большасці выпадкаў сферай дзейнасці сельскага сходу.

Вяртанне ў склад БССР некаторых тэрыторый Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў перадвызначыла распаўсюджванне тут беларускага заканадаўства. Да гэтага часу быў распрацаваны Зямельны кодэкс БССР 1924 г., які істотна адрозніваўся ад Зямельнага кодэкса РСФСР 1 снежня 1922 г. найперш у сферы абшчынных адносін. Галоўнае адрозненне было ў адмаўленні абшчыннай формы землекарыстання. Не дапускаліся таму і ўраўняльныя перадзелы. Зямля замацоўвалася ў пастаяннае працоўнае карыстанне за паселішчамі і іншымі гаспадарчымі аб'яднаннямі і з дня выдачы дакументаў — за асобнымі працоўнымі землекарыстальнікамі. Адрозненні склаліся ў межах РСФСР у 1921—1924 гг. і ў дачыненні да форм землеўпарадкавання. У Магілёўскай губерні яно існавала ў форме пасёлкаў па едаках, у Смаленскай губерні — па едаках у форме хутароў, у Віцебскай — у пераважнай ступені па фактычным землекарыстанні таксама ў выглядзе хутароў. Пры гэтым П. Ф. Равінскі пазначае, што ў Магілёўскай губерні, калі зямельная грамада сама рэгулявала дадзенае пытанне, то землеўпарадкаванне адбывалася па фактычным землекарыстанні, якое нарміравалася. Наркамзему было даручана ўстанаўленне максімальнай і мінімальнай нормы сялянскага землекарыстання [47, с. 24—29].

У сярэдзіне 1920-х гг. вакол абмеркавання законапраекта «Аб асноўных пачатках землекарыстання» разгарнулася вялікая дыскусія, якая, у прыватнасці, закранула пытанні абшчыннага землекарыстання, а таксама далейшых шляхоў развіцця сельскай гаспадаркі. Часткова дыскусія акрэслілася і на старонках дру-

ку, у прыватнасці часопіса «На аграрным фронце» (№ 5—6, 7—8, 9, 10 за 1926 г.). У аграрнай секцыі Камуністычнай акадэміі па даручэнні СНК СССР былі абмеркаваны два законапраекты, адзін з якіх быў распрацаваны Камісіяй заканадаўчых прапаноў пры СНК СССР, а другі з'яўляўся праектам СНК РСФСР, падрыхтаваным Наркамземам. Абодва праекты выклікалі крытыку з розных бакоў. Дэлегацыя БССР вызначыла іх як дакументы, што празмерна дэталізуюць тыя нормы зямельнага заканадаўства, што выяўляюць спецыфіку кожнай рэспублікі. Адначасова ва ўмовах пэўных крызісных з'яў у развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці (найперш таварнасці сельскай гаспадаркі, росту сацыяльных супярэчнасцей) пашырыўся ўплыў тых слаёў і асоб, якія прапаноўвалі адкінуць «нэп да чорта» і вярнуцца да калектыўнай гаспадаркі, якую яны бачылі «сацыялістычнай». Таму яны прапаноўвалі, каб закон з'яўляўся выразнікам такой пазіцыі: «Тэорыя эвалюцыі сельскай гаспадаркі зараз бясспрэчна даказала, што сацыялістычныя формы сельскагаспадарчай вытворчасці будуць створаны шляхам зрастання, счаплення, аб'яднання індывідуальных працоўных гаспадарак, шляхам кааперавання іх і, у выніку, удасканалення прылад працы. Стварыць такія формы землекарыстання, якія максімальна б садзейнічалі гэтаму працэсу, і з'яўляецца задачай будучага зямельнага закона» [48, с. 98].

Актывізаваліся і прыхільнікі абшчыны, якія лічылі, што пры дыктатуры пралетарыяту абшчына з'яўляецца амаль што важнейшым элементам будучага сацыялістычнага грамадства, пазбаўленага ранейшых патрыярхальных рысаў. Адным з прадстаўнікоў такога пункту гледжання выступіў М. Суханаў. Ён сцвярджаў: «Абшчына — гэта на тры чвэрці публічна-прававая, савецкая, дзяржаўная драбнейшая адзінка; а на адну чвэрць — гэта добраахвотнае аб'яднанне, падобнае кааперацыі ці іншаму калектыву, утворанаму на добраахвотных пачатках» [48, с. 101].

Згаджаючыся з тым, што законапраект «Асноўныя пачаткі землекарыстання» занадта дэталізаваны, М. Суханаў выяўляў незадавальненне тым фактам, што прафесар М. П. Макараў назваў развіццё вытворчых сіл вёскі важнейшай задачай улады. Па меркаванні М. Суханава, галоўнае — гэта мэта пабудовы сацыялізму, дзеля якой (магчыма, на нейкі час) можна адмовіцца ад эканамічнай мэтазгоднасці на карысць ідэі. Ён лічыў, што «для канчатковага канстытуявання абшчыны ў якасці дзяржаўнай драбнейшай тэрытарыяльнай адзінкі неабходны, па сутнасці, толькі дзве карэктывы да існуючага стану спраў: 1) адмена права гаспадароў дамоў выдзяляцца з абшчыны з зямлёй і 2) прадастаўленне права голасу на сходзе прышлым жыхарам абшчыны. Фактычна гэта ніколькі не парушыла б жыцця сучаснай абшчыны. Але гэта канчаткова зрабіла б яе савецкім органам. Гэта зліла б яе ў адзінае паняцце з сельсаветам» [48, с. 102]. Ён звяртае ўвагу на тое, што «...савецкае заканадаўства (у Зямельным кодэксе) дапусціла выхад з абшчыны з зямлёй, хоць і са згоды сходу. Прапаноўваемы законапраект ідзе далей у кірунку сталыпінскага заканадаўства і дапускае выхад і выдзяленне з абшчыны без яе згоды. І тое і другое штурхае абшчыну да ліквідацыі і ўжо ліквідуе яе ў якасці інстытута публічнага права» [48, с. 102].

Выяўляючы сябе як выдатны публіцыст М. Суханаў прыводзіць даволі трапныя параўнанні: «...гаварыць, што менавіта вызваленне ад абшчыны стварае рух да сацыялізму, не варта. Гэта ўсё роўна што прыпісваць амерыканскай глебе, клімату ці нават грамадскасці той факт, што ў Амерыцы — самае энергічнае, прадпрымальнае і здаровае насельніцтва свету. Не — яно там такое таму, што туды з'ехаліся, шляхам іміграцыі са старых краін, усе найбольш рухомыя, энергічныя і здаровыя элементы, якія шукаюць лепшага, здольныя пераадолець перашкоды і ўладкаваць свой лёс. Неабходна правільна разбірацца ў прычынах і выніках нават таму, хто вельмі добра ведае факты» [50, с. 108]. І Суханаў робіць вывад аб тым, што «...Савецкая дзяржава, дапускаючы разбурэнне абшчыннага апарату, зусім грэбавала ім, замест таго каб абаперціся на яго і выкарыстаць яго ў справе падняцця сялянскага грамадства. Неабходна перамяніць усё гэта» [50, с. 107].

Апаненты Суханава звярталі ўвагу на тое, што К. Маркс не мог прадбачыць эвалюцыю рускай абшчыны за тыя паўстагоддзя, якія прайшлі да часу рэвалюцыі. Спасылаючыся на дыскусію ў газеце «Бедната», дзе ўсе карэспандэнты выступілі супраць абшчыны, яны тлумачылі гэта тым, што абшчына ў трох аспектах адмоўна ўплывае на развіццё сацыяльных адносін на вёсцы: «...па-першае, яна затрымлівае гаспадарчы і культурны рост бядняцкіх і серадняцкіх масаў; па-другое, аб'ядноўваючы дробных таваравытворцаў у старой саслоўнай арганізацыі, яна тармозіць іх аб'яднанне ў адзіна магчымай форме — кааператыўнай; па-трэцяе, дзякуючы ёй капіталістычныя адносіны ідуць не шляхам чыстага капіталістычнага развіцця, а па старых чыста кулацкіх, гандлёва-ліхвярскіх кірунках» [49, с. 118]. У сваіх аргументах апаненты Суханава спасылаліся на сведчанні селькораў, якія пісалі: «Ці знойдзеш лепшую глебу для лёгкай нажывы, чым нашая абшчына. Абшчына — гэта мутная вада, у якой так лёгка ловіцца рыбка на пусцяшную нажыву. Тут і пакосы за чвэрць самагону прапіваюцца ўсім мірам. Тут у якой-небудзь абяздоленай удавы адбіраецца зямля па розных прычынах і прапіваецца ўсім мірам заможнаму мужыку-"дабрадзею". У абшчыне пад рукой і бядняк, які працуе цэлымі днямі за пазычаны пуд мукі» [49, с. 117].

Апаненты абшчыннага шляху сцвярджалі, што хутаране і жыхары землеўпарадкаваных пасёлкаў ахвотней кааперуюцца, ствараючы машынныя і іншыя таварыствы. Не звяртаючы ўвагі на тое, што супярэчыць сам сабе ў меркаваннях аб эвалюцыі абшчыны, М. Кубанін цытуе наступнага селькора беднаты: «Абшчына так і засталася дарэвалюцыйнай абшчынай. У ёй і зараз улада "міру". У ёй і зараз кіруе *кучка міраедаў і "крыкуноў"*. Абшчына, кіруемая гэтаю кучкай, ненавідзіць усё новае. У ёй яшчэ ідуць штогодні перадзелы зямлі і лугоў, прапіўка іх за самагон, здача іх у арэнду з магарычом, адвод сядзібаў за магарыч» [49, с. 123].

Не з'яўляючыся ўдзельнікам пазначанай дыскусіі, Д. Ф. Прышчэпаў і яго прыхільнікі ў Наркамземе і навукова-даследчых установах фактычна былі на баку апанентаў абшчыны. Наркам земляробства БССР у шэрагу сваіх артыкулаў сцвярджаў, што ва ўсходняй частцы Беларусі абшчыны не існавала. У газеце «Звязда» за 1926 г. ён пісаў: «На тэрыторыі Гомельшчыны не існаваў абшчынны парадак землекарыстання, і таму сучасная зямельная палітыка, наскрозь абшчынная,

патрабуе зьмены і правядзення яе на прынцыпах, устаноўленых на Беларусі». Д. Ф. Прышчэпаў выдатна разумеў, што шматдзетныя сем'і (пераважна бядняцкія) будуць незадаволеныя, у тым ліку з прычыны адмаўлення прынцыпу размеркавання зямлі па едаках. У той час, як для Мінскай, Бабруйскай, а таксама Віцебскай акруг былі характэрныя дробныя населеныя пункты, па Магілёўскай і асабліва Гомельскай акругах згодна з перапісамі пераважалі буйныя пасёлкі. Наркам земляробства быў незадаволены дадзеным фактам і лічыў гэта праявай уплыву абшчыннай формы. Д. Ф. Прышчэпаў звяртаў увагу на неабходнасць прэвентыўнай растлумачальнай работы сярод сялянства. Сітуацыя ўскладнялася тым, што сяляне з істотным недаверам адносіліся да ўладнай агітацыі. «Калі цяпер правесьці падзел зямлі па едаках, які фактычна зьяўляецца чорным перадзелам, дык я ўпэўнены ў тым, што праз некалькі год, як толькі зьменіцца лік едакоў, ізноў сяляне пачнуць шукаць няправільнасьці і ізноў будуць дзяліць зямлю па едаках. Такім чынам, мы такой палітыкай ставім вёску на шлях перманентнага “чорнага перадзелу”, пры якім рэарганізацыі сельскае гаспадаркі нельга будзе правесьці. Сяляне будуць умець дзяліць зямлю, а не гаспадарыць», — пісаў Д. Ф. Прышчэпаў [50].

На суседніх з БССР тэрыторыях Расійскай Федэрацыі назіраліся крыху іншыя працэсы. Да прыкладу, у 1928 г. па Пскоўскай акрузе на долю абшчыны прыходзілася 95,4 % працоўнага зямельнага фонду [51, с. 151]. «Калі б абшчына сапраўды была навязаная дзяржавай, — піша Л. В. Аліева, — то наўрад ці яе ўзнаўленне адбылося б у такіх маштабах і паўсюдна. Больш таго, палітыка яе прымусовага разбурэння якраз была распачатая менавіта дзяржавай пры правядзенні аграрнай рэформы Сталыпіна і скончана была сацыялістычнай дзяржавай у 1927—1929 гг., калі былі прынятыя законы, якія забяспечвалі падпарадкаванне абшчыны» [51].

У сярэдзіне 1920-х гг. пачынаецца праца над стварэннем агульнасаюзных «Асноўных пачаткаў землекарыстання і землеўладкавання», якія павінны былі паскорыць пераход да калектыўнай гаспадаркі. Пазіцыя беларускіх савецкіх улад да іх ужо адзначалася вышэй. «Агульныя пачаткі» былі выдадзены напярэдадні пераходу да суцэльнай калектывізацыі (Зямельны закон) Саюза ССР, прыняты Пастановай 4-й сесіі ЦВК 4-га склікання 15 снежня 1928 г. [52].

Ужо падчас пераходу да рыначных адносін вызначыліся істотныя супярэчнасці паміж савецкай уладай і абшчынай, якая ўсё часцей выяўляла незадаволенасць пашырэннем уплыву заможнага сялянства, жанчын і г. д. Уладныя структуры, імкнучыся пераадолець кансерватызм абшчыны ў гэтым кірунку, спрабавалі ажывіць дзейнасць мясцовых саветаў, пашырыць іх матэрыяльнае забеспячэнне. Так, улада пачала працэс стварэння бюджэтаў сельскіх Саветаў, што прадугледжвалася Законам ад 24 жніўня 1927 г. «Аб самаабкладанні сельскага насельніцтва». Згодна з ім збор і расходаванне сродкаў самаабкладання праводзіліся сельскім Саветам. Пашырыліся магчымасці сельсаветаў умешвацца ў справы зямельных таварыстваў [53]. Нягледзячы на тое што Законам забаранялася нямэтавае расходаванне сродкаў, такія факты мелі месца. Бліжэй да суцэльнай калектывізацыі, калі сялянства, асабліва заможнае, адчула ўвесь цяжар падаткаў, пачаліся выступленні супраць

самаабкладання. У шэрагу выпадкаў сяляне былі незадаволеныя тым, што сродкі выдаюцца, а школы ці настаўнікі ў школе адсутнічаюць. Нягледзячы на імкненне ўлад ажыццявіць пэўны сінтэз сельскіх Саветаў і сходаў, заўважна імкненне аддаць перавагу менавіта сельсаветам. Сутыкаючыся з выявамі бюракратызму, сельскія сходы, наадварот, у шэрагу выпадкаў падмянялі сабою саветы. Супрацьстаянне яшчэ больш павялічылася з пачаткам калектывізацыі. Рашэнне аб самаабкладанні павінна было прымацца сельскім сходам. Зразумела, што рэалізацыя такога палажэння ў выніку заставалася цяжка рэалізуемай. Але пачынаючы з 7 студзеня 1928 г. збор самаабкладання ажыццяўляўся органамі дзяржаўнай улады. Ва ўмовах росту прымусовых хлебанарыхтовак гэта яшчэ ў большай ступені аб'ядноўвала вёску, таму што селянін разумеў, што цяжкасці суседа могуць перакінуцца і на яго хату.

15 снежня 1928 г. ЦВК СССР прымае Пастанову «Агульныя пачаткі землекарыстання і землеўпарадкавання». Заўважна, што дакумент усё ж захоўваў кампрамісны характар. У ім выявіліся (хоць і часткова) заўвагі, што выказваліся з боку партыйна-савецкіх кіраўнікоў з саюзных рэспублік (у прыватнасці, РСФСР). Абшчынны парадак захоўваўся для ўсяго СССР, хоць гэты дакумент істотна змяняў і прававы статус абшчыны, і шэраг традыцыйных падыходаў. Удзельнікамі сходу грамады (як і абраныя ў яе выбарныя структуры) маглі быць толькі сяляне, якія мелі выбарчыя правы. У межах новаўвядзенняў пэўнае месца займала і пераўпарадкаванне зямельнай грамады сельскім Саветам [55, с. 299—307]. Пры гэтым усе яе правы і абавязкі перадаваліся сельскім Саветам. Разам з тым можна гаварыць аб плаўным пераходзе. Калгас тэрытарыяльна нярэдка супадаў з абшчынай, з'яўляўся яе пераемнікам, ён (як і абшчына) выконваў сходную функцыю пасрэдніка ў адносінах селяніна з дзяржавай. Як і абшчыну, калгас складана было пакінуць, ён нёс адказнасць (як калісьці абшчына па выкупных плацяжах) па выкананні абавязковых нарыхтовак. Захаванне абшчыны перадвызначыла тое, што сяляне часам уступалі ў калгас «усёй грамадой» [55, с. 365]

Можна заўважыць аднак, што паскарэнне тэмпаў калектывізацыі напрыканцы 1920-х гг. адбывалася нераўнамерна ў розных частках БССР. Аддзел ЦК КП(б)Б па рабоце на вёсцы адзначаў увосень 1929 г., што найбольшая колькасць калектываў была створана ў 1929 г. у тых акругах, дзе захавалася ў большай ступені абшчына: Гомельскай, Мазырскай, Магілёўскай. Пры гэтым менавіта там выяўлялася значная колькасць так званых «ілжэкалгасаў». Найгоршая сітуацыя складвалася ў Цэнтральнай Беларусі (Мінская акруга, Любанская, Асіповіцкая, Бабруйская). Няшмат лепш справа калектывізацыі ажыццяўлялася там, дзе зацвердзілася на працягу першых двух дзесяцігоддзяў ХХ ст. хутарская форма (Полацк, Орша, Віцебск) [56, л. 141—143]. Разам з тым наўрад ці можна згадзіцца з В. Ц. Разанавым, што з'яўленне і распаўсюджанне «кааператыўных форм» — вынік пэўнай абшчыннай трансфармацыі, а тым больш «інстытуцыйнага пераўтварэння» сялянскай абшчыны [57, с. 343].

Сельскія сходы падчас калектывізацыі нярэдка не падтрымлівалі тыя мерапрыемствы, што ажыццяўлялі ўлады. У 1929 г. прымаецца палажэнне аб сельскіх

сходах. З гэтага часу яны маглі адбывацца толькі з ведама сельскіх Саветаў, і на гэтых сходах маглі прысутнічаць толькі тыя, хто захаваў выбарчыя правы. Вызначаецца таксама імкненне павялічыць ролю мясцовых Саветаў. 21 красавіка 1930 г. прымаецца новае палажэнне аб сельскіх Саветах, у якім вызначалася, што «сельскі Савет з'яўляецца вышэйшым органам улады ў межах яго тэрыторыі». З мэтаю забеспячэння большасці ў Саветах прыхільнікаў калектывізацыі былі праведзены перавыбары Саветаў. Разам з тым дадзены працэс акрэсліваўся неабходнасцю пазбавіцца ад той часткі апарату батрацка-бядняцкага паходжання, якая вызначалася празмерным радыкалізмам. Прыкладна такія ж падыходы былі задзейнічаны пры рэалізацыі Палажэння аб раённых з'ездах Саветаў і раённых выканаўчых камітэтах, прынятага ў лютым 1931 г. [58]. Згодна з пратаколам пасяджэння Палітбюро ЦК ВКП(б) у раёнах суцэльнай калектывізацыі, калі было калектывізавана не меней 75 % сялянскіх гаспадарак, зямельныя таварыствы ліквідаваліся [59, с. 669].

Значнае месца ў сацыяльным развіцці вёскі мелі камітэты сялянскай узаемадапамогі. Развіццё рыначных адносін перадвызначыла стварэнне новага палажэння аб камітэтах, і на працягу 1924—1929 гг. яны сапраўды адыгралі пэўную ролю ў дапамозе, а галоўнае — у згуртаванні бяднейшага сялянства. Аднак ужо ў гэты час яны паступова становяцца органамі прымусу не толькі з пункту гледжання членства, але і ў падштурхоўванні сялянства да ўступлення ў кааперацыю. Урэшце лёс камітэтаў паўтарыў лёс сельскіх сходаў. На мяжы 1920—30-х гг., толькі часткова выканаўшы ўскладзеныя на іх абавязкі, яны ліквідуюцца (згодна з Пастановай ЦВК СССР ад 1 лютага 1932 г. пераўтвараюцца ў касы ўзаемадапамогі калгаснікаў) [60, 61].

Можна пазначыць, што паводле абшчыннага, ураўняльнага па сутнасці менталітэту аднолькава непрымальнымі былі і гандляры, і ліхвяры, і заможнікі, на якіх пасля з лёгкасцю можна было павесіць ярлык кулака. Гэта тым больш мела значэнне, што менавіта выхадцы з бядняцка-пралетарскіх слаёў вёскі паступова запаўнялі нішы нізавога савецкага і партыйнага апарату. Лайдацтва і паразітызм, якія, безумоўна, прысутнічалі ў абшчыне, выклікалі найперш моцную незадаволенасць у заможных членаў абшчыны. Фарматам барацьбы з такой з'явай станавіліся агульныя сходы і самасуд (пабоі). Зацятае супрацьстаянне ў абшчыне не знікала пад уздзеяннем улад, былі задзейнічаны і ўнутраныя механізмы грамады.

Абшчына стагоддзямі дыктавала і адносіны да ўлады. Як толькі ўлада адчувалася сялянствам, яна імкнулася да яе прыстасавацца. Пагроза для аднаго члена грамады ўспрымалася як пагроза ўсяму «міру». Такія ўзаемаадносіны выяўляліся не толькі праз імкненне схаваць усе парушэнні (у тым ліку парушэнні закону) і вырашыць іх праз самасуд («між сабой»), але і ў адносінах да кулакоў. Сялянства гатова было гаварыць пра абстрактных «кулакоў-міраедаў», каб паскардзіцца на сваё цяжкае жыццё, але сваіх заможных сялян вызначала як тых, хто выключна працай дасягнуў такой заможнасці. Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы інтэнсіўных спосабаў вядзення сельскагаспадарчай вытворчасці выявілася імкненне даказаць, што дадзеная гаспадарка з'яўляецца менавіта «культурнай, паказальнай».

Імкненне захаваць дастаткова высокі ўзровень гаспадаркі і адначасова не трапіць у катэгорыю кулацтва часам прыводзіла такіх сялян уступаць у вытворчыя кааператывы. Найчасцей гэта былі таварыствы па агульнай апрацоўцы зямлі. Але, здаралася, стваралі і камуны. Такім выпадкам, у прыватнасці, стала і камуна «Кавалі», якая атрымала вядомасць ужо таму, што ў патуранні гэтаму «лжэкалгасу» абвінавачвалася кіраўніцтва БССР, у тым ліку і Д. Ф. Прышчэпаў.

Справа камуны «Кавалі» спатрэбілася тады, калі пачалі шукаць абвінавачванні супраць асобных членаў урада рэспублікі, у прыватнасці Лабаноўскага і Прышчэпава. Матэрыял, які быў надрукаваны 28 мая 1928 г. у газеце «Заря Запада», сведчыў аб тым, што ў Ліёзненскім раёне існуе «лжэкамуна, арганізаваная былым памешчыкам Аляксандрам Каньковым». Артыкул меў цікавую назву: «Памешчыкі прыстасоўваюцца. Трэба абрэзаць ім кіпцюры».

Арганізаваў камуну ў 1918 г. заможны селянін Аляксандр Канькоў на сваёй зямлі. Да рэвалюцыі Канькоў арандаваў яе ў тутэйшага памешчыка і падчас вайны здолеў выкупіць і зямлю, і дом, які, магчыма, цагляны, двухпавярховы, найбольш і рэзаў вочы асобным з мясцовых сялян. Ды і для былых батракоў, што ўвайшлі ў камуну, былі адбудаваны дамы з усімі неабходнымі гаспадарчымі пабудовамі на ўскраінах былога памесця. Пакуль камуна падымалася на ногі, пакуль усе сродкі ішлі на набыццё жывёлы, інвентару, аб камуне маўчалі. Але ўжо ў 1925—1926 гг. ураджайнасць збожжавых у гаспадарцы Канькова перавысіла амаль у 2 разы ўраджайнасць акаляючых сялянскіх гаспадарак. Камуна набыла 11 коней, 16 кароў, сепаратар, сарціроўку і іншую тэхніку.

Па-гаспадарску ставячыся да ўсёй маёмасці, члены камуны пільна сачылі за патравамі палёў статкам нядбайных ці зайздросных мясцовых сялян. У адказ сыпаліся скаргі. Вясною 1926 г. з'явіўся допіс селькораў у газету «Заря Запада», дзе гаварылася аб тым, што былы памешчык, маючы знаёмствы ў Віцебску, па-ранейшаму эксплуатуе сваіх батракоў і мясцовае сялянства. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ЦВК) БССР, які рэагаваў амаль на кожную такую публікацыю, накіроўвае распараджэнне «разабрацца на месцы» Віцебскаму акруговаму зямельнаму аддзелу. І ўжо ў ліпені 1926 г. прымаецца пастанова Ліёзненскага РВК аб рэарганізацыі камуны. У пастанове адзначалася, што гаспадарка «хоць і добра арганізаваная, але адсутнічае належная справаздачнасць, квітнее сямейнасць» і што навакольнае сялянства імкнецца да скасавання дзейнасці калектыву, што хоць старшынёй камуны і з'яўляецца былы батрак, аднак вырашае ўсё Аляксандр Канькоў. Меркавалася вывесці ўсіх Каньковых з камуны і ўвесці ў яе склад усіх жадаючых (напрыклад, тэлеграфных служачых), змяніць назву «Кавалі» на «Дзесяты кастрычнік». Так і было зроблена (безумоўна, без згоды членаў ранейшай камуны). Каньковы ж падалі скаргу.

Між тым, скарыстоўваючы пэўны перыяд безуладдзя, новыя члены калектыву (уведзеныя РВК) паступова «праядалі» маёмасць камуны. Выявілі прэтэнзіі і асобныя з мясцовых сялян. Пракурор рэспублікі ў студзені 1928 г. вымушаны быў накіраваць загад аб захаванні маёмасці маёнтка «Кавалі» да разгляду справы на пасяджэнні Асобай Калегіі Вышэйшага кантролю па спрэчных зямельных

справах. Яно адбылося 9 сакавіка 1928 г., і выявілася наступнае: былы ўласнік разам з сям'ёю і ранейшымі парабкамі працаваў у гаспадарцы. Чакаць прыходу інтэрвентаў ён не мог, бо ўсе пяць яго сыноў служылі ў Чырвонай арміі. Пры гэтым адзін з іх захварэў у арміі і памёр, а другі — Міхась — быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і працягваў службу на час рэарганізацыі камуны. Была прынята да ўвагі і Пастанова Прэзідыума ЦВК БССР ад 26 студзеня 1928 г. «Аб няправільнасці ліквідацыі камуны "Кавалі", аб неабходнасці яе захавання і развіцця». У пастанове ж Асобай Калегіі, падпісанай Лабаноўскім, было вырашана: камуну захаваць, але папоўніць новымі членамі.

У іншы час усё на гэтым і скончылася б, але не мінуў яшчэ крызіс хлебанарыхтовак, з вясны 1928 г. набірала моц новая ідэалагічная кампанія. На вёсцы загаварылі аб неабходнасці «другой рэвалюцыі», а на верхніх эшалонах улады — аб узмацненні ідэалагічнай пільнасці. Менавіта ў адсутнасці апошняй і абвінавацілі Лабаноўскага пасля згаданага артыкула ў газеце «Заря Запада». Праз некаторы час гэткія ж абвінавачванні пасыпаліся і на наркама Д. Ф. Прышчэпава. Што ж да камуны, то тут ужо з законам не лічыліся. Сакратар бюро Віцебскага акруговага камітэта КП(б)Б заявіў: «Палітычна гэтае пытанне страшэнна абвострана. Кажуць, што Савецкая ўлада не ў сілах змагацца з Каньковым». Канькова перамаглі, а пасля і не толькі яго. Зберaглі «чысціню радоў». Але гісторыя нас добра навучыла, што ацэньваць работу селяніна трэба не па класавай прыналежнасці, а па колькасці, якасці і кошце прадукцыі, якую ён прадае.

Адной з прычын рэпрэсій супраць Д. Ф. Прышчэпава (як вядома, ён быў названы «чырвоным Сталыпіным») магла стаць незалежная зямельная палітыка, у тым ліку і ў дачыненні да абшчыны. Аднак ці настолькі супрацьстаялі хутары і абшчына? Германская даследчыца Дзіяна Зіберт сцвярджае, што там, дзе абшчына была больш моцнай, працэс хутарызацыі быў больш паспяховым, чым у тых раёнах, дзе практыкавалася падаткаабкладанне асобных гаспадарак.

У адрозненне ад адрубной гаспадаркі хутар уяўляе такое аднадворнае сельскае паселішча, дзе на адасобленым участку знаходзіцца ўся сядзіба або частка пабудоў і інвентару, неабходных для яе апрацоўкі. У XVI ст. у выніку правядзення валочнай памеры хутарская гаспадарка пачала складвацца ў заходняй частцы тэрыторыі Беларусі. У XIX ст. хутарамі найчасцей называлі фальваркі, што належалі шляхціцам — арандатарам, аднадворцам і чыншавым сялянам. Хутарская форма вядзення сельскай гаспадаркі ў найбольшай ступені стымулявалася развіццём капіталістычных адносін, інтэнсіфікацыяй гаспадаркі. Сялянскія хутары на Беларусі з'явіліся ў другой палове XIX ст. Першапачаткова на хутары і адрубы выходзілі пераважна гаспадары, якія датэрмінова выкуплялі свае надзелы. Пад уплывам перасяленцаў з Прыбалтыкі хутарское рассяленне ў беларускіх губернях пашырылася на мяжы XIX—XX стст. Паводле падлікаў, праведзеных у 1905 г., у Віцебскай губерні налічвалася больш за 5 тыс. хутароў. Хутарская гаспадарка з'яўлялася сімвалам заможнасці, што з'явілася дадатковым стымулам для выхаду на хутары. Такім чынам, хутарская сістэма да рэвалюцыі развівалася галоўным чынам на паўночным захадзе, дзе і прыродныя, і эканамічныя ўмовы (ба-

гацце водаў, разнастайнасць натуральных угоддзяў, дастатковая колькасць зямлі, развіццё рынкавых адносін, імкненне да інтэнсіфікацыі) яшчэ да Сталыпінскай аграрнай рэформы выклікалі самастойную цягу сялян на хутары. У астатніх раёнах насаджалася адрубная сістэма, якая не давала станоўчых вынікаў, у прыватнасці не пазбаўляла ад асноўнага дэфекту — далёказямелля.

Апытанне насельніцтва Віцебскай, Смаленскай і іншых губерняў, праведзенае ў 1921 — пачатку 1922 г., прадэманстравала вялікую папулярнасць хутарской формы. На пытанне, пры якой з форм землекарыстання дасягаецца лепшая апрацоўка глебы, каля 88 % рэспандэнтаў адказалі, што «пры хутарской». Амаль 67 % сцвярджалі, што менавіта пры хутарской форме землекарыстання дасягаецца найбольшая дапамога суседзяў адзін аднаму, і больш за 72 % удакладнілі, што жыццё на хутарах не перашкаджае наведванню дзецьмі школы, а дарослымі — розных сходаў. 78,8 % апытаных выказалі імкненне насельніцтва сваіх сельсаветаў пераважна да хутарской формы. Зямельны кодэкс БССР 1923 г. гарантаваў хутарской і адрубнай формам тыя ж юрыдычныя правы, што і калектывам, дазволіў свабодны пераход да іх шляхам выдзялення з абшчыны асобных гаспадарак, а таксама поўнага размеркавання зямлі ўсёй грамады на хутары і адрубы. На 1 студзеня 1925 г. каля 25 % сялянскіх гаспадарк БССР размяшчаліся на хутарах і адрубах. На IX з’ездзе КП(б)Б, які адбыўся ў снежні 1925 г., адзначалася: «...Да сяго часу сялянства не ведае, якая з форм землекарыстання з’яўляецца самай выгаднай для яго. Мы не можам зараз сказаць, да прыкладу, што пасялковы настрой з’яўляецца зараз настроем большасці сялянства і зараз сялянства кідаецца ад хутарской да пасялковай, ад пасёлкаў да хутароў» [63, л. 65]. Многія партыйныя і савецкія кіраўнікі, якія раней імкнуліся вызначыцца ў справе калектыўнага земляробства, цяпер спяшаліся далажыць вышэйстаячым органам пра поспехі ў развіцці хутарской гаспадаркі. Бяднейшая частка сялянства нават пры моцным жаданні пайсці на хутары не мела сродкаў для пераносу сваёй сядзібы на новае месца і аплаты землеўпарадкавальных работ. Не магла гэтыя выдаткі поўнасцю кампенсаваць і разбураная вайной дзяржава. У гэтых умовах нараджаліся новыя сацыяльныя супярэчнасці, мелі месца факты падпалу гаспадарчых пабудоў, патравы хутарскіх пасеваў.

У 1924—1926 гг. у ходзе ажыццяўлення агульнай для цэнтральнай і ўсходняй частак Беларусі землеўпарадкавальнай палітыкі значная перавага аддавалася пасёлкам. Для гэтага выкарыстоўвалася дадатковае зямельнае забеспячэнне, ільготы пры вызначэнні платы за землеўпарадкаванне і інш. Паводле плана развіцця сельскай гаспадаркі на другую палову 1920-х гг. яны павінны былі скласці адну чвэрць ад усіх форм землекарыстання. Наркамат земляробства БССР вызначыў задачу «як мага менш перасоўваць насельніцтва». У выдадзенай гэтай установай у 1925 г. брашуры «Сельская гаспадарка Беларускай ССР і мерапрыемствы па яе аднаўленні» адзначалася, што «рассяленне на хутары зараз, нават калі яно і было б найбольш дасканалай формай землекарыстання, мера несвоечасовая і для многіх гаспадарак — разбуральная». Кіраўніцтва Наркамзема мусіла манеўраваць паміж эканамічнымі патрэбамі дзяржавы і ідэаламі сацыяльнай роўнасці, дэкларава-

нымі Кампартыяй. З пункту гледжання перспектыў павелічэння сельскагаспадарчай вытворчасці, зніжэння сабекошту прадукцыі і ўліку схільнасцей сялянства найбольшай эфектыўнай формай была хутарская гаспадарка. Калі на пасёлках і адрубах вытворчасць лёну для сялян не прыносіла даходу і з'яўлялася стратнай, хутаране мелі да 40—45 % прыбытку. Спецыяльная камісія, якая даследавала ў 1928 г. стан сялянскай гаспадаркі ў розных рэгіёнах БССР, адзначала, што ва ўмовах пераважна хутарскога землекарыстання сельскагаспадарчая вытворчасць у Віцебскай акрузе развівалася больш інтэнсіўна. Беларускі эканаміст прафесар М. П. Макараў таксама не адмаўляў найбольшай эфектыўнасці хутароў сярод астатніх форм індывідуальнага землекарыстання. Па рацыянальнасці выкарыстання зямельнай плошчы ён ставіў хутары вышэй за іншыя формы арганізацыі гаспадаркі, у тым ліку калгасы.

У 1926 г. з усіх хутарскіх гаспадарак рэспублікі 25,6 % былі створаны да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., астатнія пасля: 23,2 % — на падворна-цераспалосных землях у ходзе землеўпарадкавання, больш за 50 % — на былых памешчыцкіх землях, атрыманых сялянамі пасля 1917 г. У 1926 г. у Аршанскай акрузе ўзнікла больш за 33 % хутароў, у Віцебскай — каля 75 % ад астатніх форм землекарыстання. Распаўсюджанай з'явай стала арганізацыя малазямельным сялянствам на землях дзяржаўнай маёмасці калектыўных гаспадарак з наступным імкненнем расяліць на хутары; высокая ўдзельная вага хутарскіх гаспадарак, найбольш пашыраных у паўночнай і паўночна-ўсходняй частцы БССР. Па выбарачным перапісе 1927 г. хутарскія гаспадаркі складалі каля 20 % усіх наяўных гаспадарак. Каб спыніць распад калгасаў, Прэзідыум ЦВК БССР прыняў у лютым 1928 г. спецыяльную пастанову, якая забараняла размеркаванне калгаснай зямлі. У матэрыялах да даклада Савета народных камісараў БССР канстатавалася: «...у 1928 г. адсутнасць абшчыны і шырокае распаўсюджанне надворна-ўчастковай формы землекарыстання, у тым ліку хутарской і адрубной, як істотнага адрознення БССР ад РСФСР» [64, с. 48, 49]. У 1929 г. хутарская форма наогул была забаронена.

Можна меркаваць, што такія вывады рабіліся на аснове адсутнасці характэрных для абшчыннага землеўладання перадзелаў зямлі. У той жа час роля сялянскай грамады як фактару вырашэння зямельных пытанняў заставалася істотнай. У прыватнасці, у тым жа 1928 г. наркам земляробства БССР Д. Ф. Прышчэпаў прапаноўваў: «...каб самы пераход да калектыўных форм не тармазіўся тымі членамі зямельнага вобчаства, якія жадаюць застацца пры індывідуальным землекарыстанні, неабходна дазволіць любой меншасці зямельнага вобчаства, але ня менш як 5 дваром, без дазволу вобчаства ў любы час пераходзіць да калектыўных форм землекарыстання. Разам з тым неабходна забясьпечыць поўнасцю крэдытамі, асабліва нанова арганізуемые калектыўныя гаспадаркі» [65, с. 55].

Грамада, такім чынам, захавала юрыдычныя правы і з'яўлялася да пачатку суцэльнай калектывізацыі важнейшым інстытутам самакіравання. Аднак і ў абшчыне, і на хутары селянін выяўляў сябе як самастойны гаспадар. І менавіта гэта станавілася асноўнай перашкодай для калектывізацыі. «Вазьміце нашых хутаран — не ўсіх, але большасць і прыглядзіцеся да іх, — пазначаў адзін з выступоў-

цаў на X канферэнцыі КП(б)Б (кастрычнік 1921 г.). — Вы іх не толькі зараз, але і праз пяцьдзесят гадоў, нават тады, калі яны будуць бачыць усю выгаднасць буйной гаспадаркі, яны і тады не пойдуць у арцелі, таму што ў іх маецца свой кавалачак зямлі, а яны жывуць даволі нядрэнна» [66, л. 204, 205].

Апазіцыйнасць, праяўленая абшчынай, абвастрыла яе адносіны з дзяржаўнай уладай і значна паскорыла працэс перадачы яе традыцыйных функцый сельскім Саветам. Шлях эвалюцыйнага пераўтварэння абшчыны ў больш высокую форму сельскага самакіравання станавіўся ў тых умовах немагчымым. Шэраг расійскіх даследчыкаў лічаць, што вопыт сялянскай абшчыны апынуўся незапатрабаваным у поўнай ступені. «Краіна і сёння шукае аптымальную мадэль развіцця, кінуўшыся ад усёпаглынальнага калектывізму да індывідуалізму, які атамізаваў грамадства», — піша М. Есікаў [62]. Нам жа застаецца спадзявацца, што беларускімі даследчыкамі будзе праведзена грунтоўнае вывучэнне абшчыны, накшталт таго, што зроблена В. Ф. Голубевым у дачыненні да перыяду ВКЛ.

Такое вывучэнне неабходна, паколькі застаецца пытанне: «Чаму Сталыпінская аграрная рэформа ў рэшце рэшт была спынена рэвалюцыяй, а савецкая мадэрнізацыя завяршылася фарміраваннем адміністрацыйна-каманднай, мабілізацыйнай, але ўсё ж трывалай сістэмы?» Калі не адказы, то пэўны кірунак вывучэння падказвае сінергетыка [67, с. 118—128; 68, с. 59]. Вучоныя заўважылі, што пры ўсім тым, што прырода разнастайная, у адкрытым асяроддзі могуць рэалізавацца толькі пэўныя структуры. Не толькі ў фізіцы і матэматыцы, але і ў біялогіі вызначылі механізмы звышхуткага развіцця працэсаў. Гэта наш погляд на рэальнасць, бо тое, што здаецца абгрунтаваным на стагоддзі — як калісці першаасноvarious — атам, — вельмі хутка набывае новыя формы і змест. Шлях рэзананснага ўзбуджэння сістэмы — гэта хуткі пераход да складанага, шматкратнае скарачэнне часу і матэрыяльных затрат, ініцыяванне жадаемых і — што не меней істотна — рэалізуемых у дадзеным асяроддзі структур.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона. СПб., 1894. Т. XII : Жилы — Земпах.
2. *Большаков А. М.* Советская деревня (1917—1925 гг.) : экономика и быт. 2-е изд., знач. доп. Л. : Раб. изд-во «Прибой», 1925. 263.
3. Декрет II Всероссийского съезда Советов о земле 26 октября (8 ноября) 1917 г. // Декреты Сов. власти. Т. I. М. : Гос. изд-во полит. лит-ры, 1957. С. 17—20.
4. *Ленин В. И.* Пролетарская революция и ренегат Каутский // Полн. собр. соч. 5-е изд. М. : Политиздат, 1981. Т. 37. С. 235—338.
5. *Бердяев М. А.* Размышления о Русской революции [Электронный ресурс]. URL: http:// philosophy.ru /library/berd/rev. html (дата обращения: 12.08.2013).
6. *Кириллов И. А.* Очерки землеустройства за три года революции (1917—1920 гг.). Пг. Ред. Изд. Ком. Нар. Ком. Земл., 1922. 261 с.
7. *Туган-Барановский М. И.* Социальные основы кооперации / предисл., коммент. : Л. А. Булочникова, Г. Н. Сорвина, Т. П. Субботина. М. : Экономика, 1989. 496 с.
8. *Аксёненко С.* Зачем нужен Сталин. 2010 г. [Электронный ресурс]. URL: http://www.e-reading.me/ book.php?book= 1003658 (дата обращения: 14.07.2013).
9. *Буховец О. Г.* Социальные конфликты и крестьянская ментальность в Российской империи XX века: новые материалы, методы, результаты. М., 1996.

10. *Огановский Н.* Община и земельное товарищество // О земле. Сборник статей о прошлом и будущем земельно-хозяйственного строительства. М.. 1921. Вып. 1. С. 79—91.

11. *Першин П. Н.* Участковое землепользование в России. Хутора и отруба. Их распространение за десятилетие 1907—1916 гг. и судьба во время революции (1917—1920 гг.). М., 1922.

12. *Дубровский С. М.* Очерки русской революции. Вып. 1. М., 1923.

13. *Трапезников С. П.* Исторический опыт КПСС в социалистическом преобразовании сельского хозяйства. М., 1959.

14. *Данилов В. П.* Земельные отношения в советской доколхозной деревне // История СССР. 1958. № 3. С. 90—128.

15. *Данилов В. П.* Об исторических судьбах крестьянской общины в России // Ежегодник по аграрной истории. Вологда : 1976. Вып. 6. С. 102—134.

16. *Данилов В. П.* Община у народов СССР в послеоктябрьский период: к вопросу о типологии общины на территории советских республик // Народы Азии и Африки. 1973. № 3. С. 42—54.

17. *Данилов В. П.* К вопросу о характере и значении крестьянской поземельной общины в России // Проблемы соц.-эконом. истории России. М., 1974. С. 341—359.

18. *Данилов В. П.* Советская доколхозная деревня: население, землепользование, хозяйство. М., 1977.

19. *Данилова Л. В., Данилов В. П.* Проблемы теории и истории общины // Община в Африке: проблемы типологии. М., 1978. С. 9—60.

20. *Осокина В. Я.* Социалистическое строительство в деревне и община. 1920—1933. М. : Мысль, 1978. 176 с.

21. *Кабанов В. В.* Октябрьская революция и крестьянская община // Ист. записки. М., 1984. Т. 111. С. 100—150.

22. *Корелин А. П., Ивацилло К. Ф.* Столыпин. Попытка модернизации сельского хозяйства России // Судьбы российского крестьянства. М., 1996. С. 32—42.

23. *Лурье С. В.* Историческая этнология. М., 1997. С. 366—383.

24. *Тюкавкин В. Г.* Великорусское крестьянство и Столыпинская аграрная реформа. М. : Памятники исторической мысли, 2001. 304 с.

25. *Бухарев В. М., Люкшин Д. И.* Российская смута начала XX века как общинная революция. Историческая наука в меняющемся мире. Казань, 1994. С. 156.

26. *Данилова Л. В., Данилов В. П.* Крестьянская ментальность и община // Менталитет и аграрное развитие России [XIX—XXI вв.]. М., 1996.

27. *Грациози А.* Великая крестьянская война в СССР. Большевики и крестьяне. 1917—1953. М., 2001. С. 49—105.

28. *Алиева Л. В.* Отношение общинного крестьянства Псковской губернии к Столыпинской аграрной реформе // Научно-практический, историко-краеведческий журнал. 2007. № 26. С. 130—132.

29. Крестьяне, посткрестьяне и власть в XX веке: приспособительные стратегии с обеих сторон. Крестьянство и власть в истории России XX века : сб. науч. ст. участников Междунар. круглого стола (Журнал «Власть», Ин-т социологии РАН, Москва, 12 нояб. 2010 г.) / под ред. П. П. Марченя, С. Ю. Разина. М. : АПР, 2011. 472 с. (Науч. проект «Народ и власть: история России и ее фальсификации». Вып. 2).

30. *Милов Л. В.* Великорусский пахарь и особенности российского исторического процесса. М. : РОССПЭН, 1998. 573 с.

31. *Кожевникова Л. М.* Роль крестьянской общины в аграрной истории и судьбе России. Исторические, философские, политические и юридические науки, культурология и искусствоведение. Вопросы теории и практики [Электронный ресурс]. Тамбов : Грамота, 2011. № 7 (13) : в 3 ч. Ч. III. С. 85—90. URL: www.gramota. net/editions/3.html (дата обращения: 15.10.2013).

32. Полное собрание законов Российской империи. Собр. 3. Т. 20. Отд. 1. СПб., 1902. С. 762—764.

33. *Голубеў В.* Сельская грамада ў польскай гістарыяграфіі / Mironowicz Eugeniusz // Białoruskie Zeszyty Historyczne. Беларус. гіст. зб. Białystok : Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 2008. № 30. С. 26—40.

34. *Маскевіч Г. І.* Да пытання аб вызначэнні тэрмінаў «сельская грамада» і «абшчына» ў Беларусі ў другой палове XIX ст. // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX — начале XXI в. : материалы междунар. науч.-практ. конф. / редкол. : Т. А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. Минск : БГУ, 2011.

35. *Маскевіч Г. І.* Сацыяльная арганізацыя сельскай грамады Беларусі ў 60—90-я гг. XIX ст. // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 3. Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Эканоміка. Права. 2007. № 3. С. 13—18.

36. *Зырянов П. Н.* Крестьянская община Европейской России в 1907—1914 гг. М. : Наука, 1992. 256 с.

37. *Сопин В. С.* Эволюция российской крестьянской общины как неформального экономического института // Проблемы совр. экон. 2009. № 4. С. 414—418.

38. Перспективный план развития сельского и лесного хозяйства БССР на 1925/26–1929/30 г. (Утвержден Правительством). Минск : Наркомзем БССР, 1927. 945 с.

39. *Фроянов И. Я.* Россия. Погружение в бездну (Россия на исходе XX века). СПб., 2009. 448 с.

40. *Кофод К. А.* 50 лет в России. 1878—1920 / пер. с дат. К. Кофод ; предисл. К.А.Х. Кофод. М. : Права человека, 1997. С. 134, 140—141.

41. *Липинский Л. П.* Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии. Минск : Изд-во Белорус. гос. ун-та, 1978. 223 с.

42. *Есиков С. А.* Российская деревня в годы нэпа: к вопросу об альтернативах сталинской коллективизации (по материалам Центрального Черноземья). М. : РОССПЭН, 2010. 246 с.

43. Собрание узаконений и распоряжений Рабоче-Крестьянского Правительства Социалистической Советской Республики Белоруссии. 1922. № 2. 1 апр. Ст. 16.

44. *Алиева Л. В.* Реализация Земельного кодекса РСФСР 1922 г. в контексте эволюции крестьянской поземельной общины (на материалах Псковской губернии). Псков, 2006. С. 148—152.

45. Пятилетний план развития лесного хозяйства Гомельского и Речицкого округов на 1926/1927—1930/1931 гг. // НАРБ. Ф. 48. Ф. 1. Спр. 1803.

46. *Елизаров С. А.* Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.). Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2009. 222 с.

47. *Ревинский П.* Новый закон о земле в БССР // Вперед. 1924. № 3. С. 24—29.

48. *Суханов Н.* Община в советском аграрном законодательстве // На аграрном фронте. 1926. № 170—171. С. 97—110.

49. *Кубанин М.* Община при диктатуре пролетариата (ответ Н. Суханову) // На аграрном фронте. 1926. № 170—171. С. 107—125.

50. *Прищепов Д.* Земельная политика на присоединенных территориях // Звезда. 1927. № 170, 171.

51. *Алиева Л. В.* Реализация Земельного кодекса РСФСР 1922 г. в контексте эволюции крестьянской поземельной общины (на материалах Псковской губернии). Псков, 2006. С. 148—152.

52. СЗ 1928 г. № 69. Ст. 642 [Электронный ресурс]. URL: http://pravo.levonevsky.org/baza/soviet/sssr6640.htm/

53. Постановление ЦИК и СНК СССР от 24 августа 1927 г. «О самообложении» // СЗ СССР. 1927. № 51. Ст. 509.

54. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927–1939 : в 5 т. / под ред. В. Данилова [и др.] ; отв. ред. В. П. Данилов ; сост. : В. Данилов, М. Кудюкина. М. : РОССПЭН, 1999. Т. 1 : Май 1927 — ноябрь 1929. С. 299—307.

55. *Юзури Таниучи.* К истории коллективизации сельского хозяйства в СССР. Государство и община // Россия в XX веке. Судьбы исторической науки / под общ. ред. А. Н. Сахарова. М. : Наука, 1996. С. 365.

56. Протоколы заседаний Бюро ЦК КП(б) Белоруссии и материалы к ним. № 35—45. 27 сент. — 23 нояб. на 372 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4328.

57. *Рязанов В. Т.* Экономическое развитие России: реформы и российское хозяйство в XIX—XX вв. СПб. : Наука ; С.-Петерб. издат. фирма, 1999. 796 с.

58. *Головко А. А.* Местные Советы Белоруссии в борьбе за социалистическое переустройство сельского хозяйства (1929—1935). Минск, 1962.

59. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927–1939 : в 5 т. / под ред. В. Данилова [и др.]. М. : РОССПЭН, 2000. Т. 2 : Ноябрь 1929 — декабрь 1930. 927 с.

60. *Скопцов С. Г.* Организация крестьянских комитетов общественной взаимопомощи БССР (1921—1922 гг.) // Ученые зап. БГУ им. В. И. Ленина. Минск, 1955. Вып. 2 ; *Он же*. Крестьянские комитеты взаимопомощи в борьбе за восстановление сельского хозяйства БССР в 1922—1923 гг. // Ученые зап. БГУ им. В. И. Ленина. Минск, 1957. Вып. 36 ; *Он же*. Крестьянские комитеты общественной взаимопомощи БССР в восстановительный период (1921—1925 гг.) : автореф. ... дис. канд. ист. наук. Минск, 1953.

61. *Григорьев Г. А.* Крестьянские общества взаимопомощи БССР: 1921—1930 гг. / под ред. В. А. Полуяна. Мінск : Навука і тэхніка, 1993. 108 с.

62. *Григорьев В. С.* Социальная работа в российской деревне (крестьянская взаимопомощь в первой половине XX в.). Чебоксары, 1998.

63. Стенограмма, протоколы и другие материалы IX съезда КП(б)Б (1-й экз.). Начато: декабрь 1925 г., на 585 с. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1983.

64. Материалы к докладу Совета народных комиссаров БССР Совету народных комиссаров СССР. Минск, 1928. С. 48—49.

65. *Прышчэпаў Зьм.* Задачы рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў сёлетнюю пасеўкампанію // Савецкае будаўніцтва. 1928. № 3—4. С. 55.

66. Стенограмма X конференции (V съезд КП(б)Б). 15—20 октября 1921 г., на 334 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 417.

67. *Бородкин Л. И.* Синергетика в изучении неустойчивых историко-политических процессов: от «равновесия ужаса» к «ужасу неравновесия» // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны : навук. зб. Вып. 3 / рэдкал. : У. Н. Сідарцоў, С. М. Ходзін (адк. рэдактары) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2007. С. 118—128.

68. *Князева Е. Н.*, *Курдюмов С. П.* Жизнь неживого с точки зрения синергетики // Синергетика. Труды семинара : материалы круглого стола «Самоорганизация и синергетика: идеи, подходы и перспективы» / ред. : В. А. Садовничий [и др.]. М., 2000. Т. 3. С. 59.

## 3.3. ПАЎСЯДЗЁННАЕ ЖЫЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ. ЭКАНАМІЧНЫЯ ПАВОДЗІНЫ І САЦЫЯЛЬНАЯ ПСІХАЛОГІЯ СЯЛЯНСТВА

У навуковай літаратуры прысутнічае вялікая колькасць вызначэнняў паўсядзённасці. Звычайна пад гэтым тэрмінам разумеецца пэўная сфера сацыякультурнай рэальнасці, заснаваная на сістэмнай паўтаральнасці сэнсаў чалавечага быцця і якая мае прасторавыя і часавыя межы. Структура паўсядзённасці ўключае ў сябе ўсё жыццёвае асяроддзе чалавека, у прыватнасці ўмовы жыцця (быту, пражывання, рацыёну харчавання і г. д.), працы, адпачынку, а таксама фактары, што ўплываюць на фарміраванне свядомасці і нормы паводзін, сацыяльна-палітычныя схільнасці. Паўсядзённасць засноўваецца на традыцыях, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення.

Паўсядзённасць уключае ў сябе як агульныя рысы гістарычнага развіцця, так і рэгіянальныя, канфесійныя і нацыянальныя асаблівасці. Глыбокімі зменамі з'яўляюцца, згодна Талкоту Парсансу, тыя, што закранаюць сістэму культуры. Эканамічныя і палітычныя перавароты, якія не кранаюць узроўню культуры ў грамадстве, не змяняюць самое грамадства ў яго аснове. Культура — гэта штосьці знешняе для чалавека і адначасова змест яго свядомасці і дзейнасці. Яе неабходны элемент складаюць каштоўнасці. Этналогія і этнаграфія размяжоўваюць народную (традыцыйна-бытавую) культуру — народныя веды, сістэма этычных норм, фальклор, песенна-музычная і выяўленчая творчасць) і культуру прафесійную — навуку, літаратуру, харэаграфію і інш. Пры гэтым, звяртаючыся да культуры народнай, мы павінны ўяўляць калі не залежнасць, то вельмі цесную ўзаемасувязь культуры духоўнай з матэрыяльнай, якая выяўляецца і вывучаецца заўсёды ў пэўнай гістарычнай форме. Традыцыя як сутнасць сялянскага жыцця архаізавала пэўныя формы, садзейнічала марудным зменам ва ўсіх яго сферах, пачынаючы ад

вытворчай. Разам з тым яна забяспечвала ўстойлівасць і пераемнасць. Хуткая дынаміка жыцця, якая акрэслілася напярэдадні і на пачатку XX ст., стварала пэўныя выклікі для стабільнага функцыянавання сістэмы сялянскага жыцця. У такіх умовах як альтэрнатыва гэтым зменам аднаўлялася і адначасова трансфарміравалася роля абшчыны-грамады.

Для сялянства міжваеннага часу заставалася нераздзеленасць гаспадарчага, сацыяльнага і культурна-бытавога жыцця, пэўнае адзінства селяніна і прыроды. Духоўнае жыццё, быт сялянства немагчыма зразумець без вывучэння сутнасці сялянскай гаспадаркі як цэласнага арганізма ва ўсёй сукупнасці яе ўзаемасувязяў (з горадам, уладай і г. д.). Прыродныя цыклы перадвызначалі характар працы, паслядоўнасць сельскагаспадарчай вытворчасці і, такім чынам, усе іншыя бакі вясковага жыцця, уключаючы ўяўленні, вераванні, звычаі, рытуалы [1, с. 276–304]. Фарміравалася пэўная сістэма сялянскага жыцця, пры гэтым змены ў адной з яе элементаў перадвызначалі трансфармацыю іншых. Для замежных аўтараў, даследчыкаў, пераважна з горада, часам даволі незразумелым быў пэўны аптымізм, які прысутнічаў у асяроддзі сялянства нават у самы складаны час. Між тым ён грунтаваўся на тых цыклічных зменах, якія дыктавала сялянству прырода (зіма, вясна, лета, восень) і пацвярджаўся традыцыяй, вопытам продкаў.

Пры наяўнасці агульных тэндэнцый успрымання сялянствам навацый маюцца полаўзроставыя асаблівасці. Сярод сталага насельніцтва і жанчын у большай ступені праяўляўся кансерватызм, а самай схільнай да ўспрымання навацыйных мадэлей паводзін была моладзь. Змены традыцыйных асноў сялянскага жыцця ў 1920-я гг. выяўляліся ў двух кірунках: з аднаго боку, бурылася замкнёнасць сялянскага свету, што выяўлялася ў пранікненні гарадской культуры, новай агратэхнікі, змен становішча жанчыны і г. д., з другога — адыход ад патрыярхальных асноў згубна адбіваўся на маральным абліччы сялянства. Па меркаванні М. М. Есікавай, сяляне былі не самымі лепшымі прадпрымальнікамі, аддаючы перавагу правераным стагоддзямі, традыцыйным формам агракультуры [2]. М. В. Доўнар-Запольскі таксама адзначаў, што «беларус — найперш земляроб, а ў астатніх справах не адрозніваўся прадпрымальніцкімі здольнасцямі» [3, с. 278]. Ва ўсякім разе, тых, хто спекуляваў на цяжкасцях, на хлебе, сяляне не падтрымлівалі. Нават НКУС напрыканцы 1920-х гг. пазначаў, што «свядомыя» сяляне сцвярджаюць, быццам барацьба ўлады са «спекулянтамі» садзейнічае зніжэнню цэн (даклад прадстаўніка АДПУ па Беларускай ваеннай акрузе 10 лютага 1928 г.). АДПУ была выяўлена вялікая «колькасць» хлебафуражнага запасу, асабліва па Аршанскай акрузе [4, с. 687, 688].

Погляд беларускага селяніна на рэчаіснасць нярэдка выяўляўся ў ліставаннях у рэспубліканскую і цэнтральную прэсу. У адным з лістоў з БССР у газету «Праўда» ананімны карэспандэнт пісаў, што калектывізацыя ў тых формах, што праводзіцца, нясе толькі страты. Ён прапаноўваў забараніць спекуляцыю, дадатковыя заробкі і наёмную працу, але захаваць канкурэнцыю індывідуальных сялянскіх гаспадарак. Менавіта так аўтар запісу раіў перамагаць кулака, бо тая палітыка, што ажыццяўлялася, па яго меркаванні, «толькі на руку кулаку» [5, с. 459].

Жыццё вёскі змянялася пад уплывам агульнага росту культуры і эканамічных умоў. Аднак тэмпы гэтых змен здаваліся многім маруднымі, нарастала праблема малазямелля. «Рэвалюцыя ў сэнсе змен асноў і форм сялянскай гаспадаркі амаль яшчэ не дайшла да вёскі», — сцвярджалі даследчыкі вёскі ў сярэдзіне 1920-х гг. Прапаноўваючы як выхад вяртанне да палітыкі калектывізацыі, яны падкрэслівалі, што кааперацыя на вёсцы абапіраецца галоўным чынам на серадняцкія элементы, але мэты і сэнс кааперацыі застаюцца для насельніцтва яшчэ недастаткова выяўленымі [3, с. 9].

У другой палове XX ст. фарміруецца напрамак навуковых пошукаў, у аснову якога пакладзена сацыяльна-псіхалагічнае (ці ментальнае) вымярэнне гістарычнай рэчаіснасці [6]. Паняцце менталітэту вызначаецца як спосаб, метад пазнання рэчаіснасці, уласцівы вызначанай сацыяльнай супольнасці і які адлюстроўвае першасны, звычайны ўзровень успрымання. Этымалагічна паняцце «менталітэт» узыходзіць да англійскага «mentality» — разумовы, але не супадае з ім па змесце [7].

Традыцыйны палітычны ідэал сялянства, заснаваны на ідэях роўнасці і сацыяльнай справядлівасці, утрымлівае сістэмныя характарыстыкі патэрналізму як неабходнага элемента. Такая акалічнасць тлумачыць пераважна сацыяльную накіраванасць рэвалюцыйнасці сялянства, яго «ненакіраванасць» на ўладу [8]. Цэласнай канцэпцыі, якая дазваляе сістэматызаваць нашыя веды аб мінулым сялянскай свядомасці, па-ранейшаму не створана, што зусім не дзіўна: постсавецкая гістарычная антрапалогія як метад навуковага пазнання праходзіць толькі пачатковую стадыю свайго станаўлення. Тэарэтычная і метадалагічная нявызначанасць, нявырашанасць многіх крыніцазнаўчых пытанняў стварае перспектывы для развіцця дадзенага напрамку, узмацняе актуальнасць пастаноўкі пытанняў, садзейнічае фарміраванню ўстойлівага навуковага інтарэсу да праблемы.

У кнізе М. Д. Кандрацьева «Асноўныя праблемы эканамічнай статыстыкі і дынамікі. Папярэдні эскіз», аб якой вышэй мы ўжо згадвалі, падкрэслівалася: «Хоць уплыў агульных умоў жыцця на псіхафізічную арганізацыю чалавека і значны, і глыбокі, але небязмежны. Тое, што немагчыма для чалавека з прычыны натуральных арганічных умоў, зразумела, не можа ўзнікнуць і пад уплывам агульных мэт. І наадварот, тое, што непазбежна ў ходзе жыцця чалавека з прычыны тых жа натуральных арганічных умоў, не можа быць прадухілена і ўмовамі агульнага жыцця. У гэтым прырода ставіць як бы максімальныя і мінімальныя межы для культуры, для ўплыву агульных мэт на чалавека і адпаведна для амплітуды ходу самога грамадскага жыцця». Такім чынам, існуе максімальна магчымая ступень «культурнасці» [9, с. 33].

Ю. Я. Альсевіч звяртае ўвагу на дасягненні псіхагенетыкі, у прыватнасці працы Вячаслава Залманавіча Тарантулы [10]. Прапанаваную ім тэорыю ён акрэслівае прыкладна наступным чынам: як магма, што ўтварае зямное ядро, першааснову псіхікі стварае бесструктурная «жыццёвая сіла». Нервовая энергія закладзена ў кожным чалавеку. Па гэтай магме, разыходзячыся, збліжаючыся і сутыкаючыся, «плаваюць» пліты літасферы — рухомыя фундаменты псіхікі. Яны

ўтвараюць комплексы (ці «модулі») генетычнай памяці ў выглядзе прыроджаных патрэб, інстынктаў, схільнасцей, здольнасцей і інш., набор якіх дакладна акрэслены. Абапіраючыся на гэтыя «пліты», фарміруецца другі, структураваны слой псіхікі — яе «культурна-інстытуцыяльны» слой. Ён складаецца з выхаваных інстынктаў і арганічна засвоеных перадсвядомасцю норм і правіл паводзін. А павярхоўны слой («ландшафт») уяўляе сукупнасць звычаяў, засвоеных людзьмі ў працэсе іх адаптацыі да змяняючыхся ўмоў жыцця. Звыклае мысленне і паводзіны знаходзяцца ў сферы ўзаемадзеяння свядомасці з перадсвядомасцю (апаратыўнай памяццю) і бессвядомым (генетычнай памяццю). Зрухі глыбокіх структураваных «пліт» свядомасці, бы землятрус, з'яўляюцца крыніцаю найбольш рэзкіх зрухаў, выклікаючы разрывы ў традыцыі. Зыходзячы з праведзенага вывучэння, Ю. Я. Альсевіч сцвярджае, што ў розных псіхагеномных тыпаў людзей не можа быць аднолькавага падыходу да жыццёвых каштоўнасцей, да зместу паняццяў «дабрабыт» і інш. [11, с. 3—17]. Кожнае пакаленне можа радыкальна змяніць існуючыя грамадскія адносіны. Але дзейнічаць яно можа толькі абапіраючыся на гістарычную спадчыну [12, с. 459].

Можна пазначыць, што ва ўсходнееўрапейскім гістарычным працэсе на працягу стагоддзяў фарміраваліся своеасаблівыя адносіны да ўласнасці. Ужо ў першыя рускія акты трапілі нормы, згодна з якімі дастатковым лічылася проста вярнуць украдзенае без пакарання, а ў выніку растраты — вярнуць «сугубо» (г. зн. у падвоеным памеры). У далейшым гэта перадвызначала на аснове сялянскага менталітэту своеасаблівае ўяўленне аб зямлі як агульнай каштоўнасці. У лісце, адрасаваным прэм'еру П. А. Сталыпіну, знакаміты пісьменнік Л. М. Талсты пісаў: «Несправядлівасць менавіта ў тым, што як не можа існаваць права аднаго чалавека валодаць іншым (рабства), так і не можа існаваць права аднаго, якога б ні было чалавека, багатага ці беднага, цара ці селяніна, валодаць зямлёю як уласнасцю. Зямля ёсць набытак усіх, і ўсе людзі маюць аднолькавае права карыстацца ёю» [13, с. 243]. «Народнае разуменне працы і яе права на пазямельную ўласнасць, — пісаў вядомы беларускі гісторык М. В. Доўнар-Запольскі, — рэзка адрозніваецца ад разумення ўласнасці, якое зацвердзілася ў культурных слаях» [3, с. 276].

Пад уплывам адрозных форм арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і суіснавання на тэрыторыі Беларусі ў кірунку з усходу на захад усё мацней вызначалася імкненне да індывідуалізацыі, адмаўлення абшчынных форм гаспадарання, ураўняльнага падыходу і г. д. Разам з тым захоўвалася супадзенне ў асноўным падыходзе да зямлі як агульнай каштоўнасці, што павінна належаць усяму грамадству. Можна заўважыць, што пры ўсіх разыходжаннях, да прыкладу, асноўныя дакументы БНР і БССР выяўляюць адзінства ў адмаўленні прыватнай уласнасці на зямлю. Гэты факт ужо адзначаўся вядомым беларускім гісторыкам-аграрнікам А. М. Сарокіным, аднак тлумачыўся пераважна палітычнымі абставінамі [14].

Сацыяльная псіхалогія, эканамічныя паводзіны і іншыя элементы сацыяльна-эканамічных традыцыйных адносін фарміруюцца стагоддзямі і складаюць спецыфіку рэгіянальнага развіцця і нацыянальнага жыцця. Вядома, што дзяцінства і сталенне будучага выдатнага дзеяча Расійскай імперыі П. А. Сталыпіна адбы-

валася найперш у Віленскай і Гродзенскай губернях. У далейшым ён свой вопыт як гродзенскага губернатара экстрапаліраваў на Саратаўскую губерню, дзе захоўвала выключныя пазіцыі абшчына і істотны ўплыў мела партыя эсэраў, і ўрэшце — на ўсю Расійскую імперыю. Той жа падыход можна заўважыць і на прыкладзе працы У. І. Леніна «Развіццё капіталізму ў Расіі», які выкарыстаў для сваіх разважанняў кнігу В. А. Постнікава. Вядома, што ў аснове гэтай кнігі —назіранні аўтара і земская статыстыка па Таўрычаскай, Херсонскай, Екацярынаслаўскай, сітуацыя ў якіх лічылася рэпрэзентатыўнай для абагуленай характарыстыкі становішча спраў у расійскай сельскай гаспадарцы. В. А. Постнікаў канстатаваў імкненне да індывідуалізацыі, да выхаду сялян з абшчыны [15].

Расійскія даследчыкі пазначаюць, што на пачатку XX ст. патрыярхальны сялянскі быт адчуваў моцнае знешняе ўздзеянне, але поўнага і канчатковага разрыву з мінулым не адбылося. У сялянскай свядомасці новае самым мудрагелістым чынам ужывалася са старым. Пранікненне «чужых» «абшчыннаму архетыпу» з'яў выклікала да жыцця рост унутрыабшчыннай канфліктнасці, абвастрала структурныя супярэчнасці грамадскай свядомасці, супярэчнасці паміж патрыярхальнай і мадэрнісцкай традыцыямі, вырашыць якія хутка і безбалюча было проста немагчыма. Запатрабаванасць адпаведных стэрэатыпаў дэтэміравалася неабходнасцю набыцця гарантый для стабільнага існавання, для захавання жыццяздольнасці сялянскай гаспадаркі. І да таго часу, пакуль абшчына выступала гарантам такога роду, карпаратыўная свядомасць сялянства ўпарта працівілася ўсім знешнім выклікам, аб'ектыўна накіраваным на разбурэнне гэтага архетыпу [16—19].

Паказваючы сялянскія ўзаемаадносіны, М. В. Доўнар-Запольскі таксама неаднаразова акрэслівае ролю грамады [3]. Традыцыйныя рысы абшчынных адносін, уключаючы перадзелы зямлі як сведчанне ўраўняльнасці, паступова знікалі, але грамада, па яго меркаванні, у Беларусі захоўвала значныя функцыі, акрэсленыя звычаёвым правам. Калектыўная памяць аб зямлі (якая некалі даступная ўсім) мела вырашальнае значэнне ў фарміраванні звычаёвага права і, наадварот, у шэрагу выпадкаў — у непрыняцці грамадзянскага права ў заходнееўрапейскім яго разуменні, вызначаючы настроі і эканамічныя паводзіны сялянства [20, с. 34—39; 21, с. 155, 225]. У той час як ва ўкраінскай гістарыяграфіі праблема развіцця сялянскай гаспадаркі ва ўмовах дзяржаўнай уласнасці на зямлю знайшла пэўнае адлюстраванне [22, с. 158—175], беларускімі даследчыкамі такога вывучэння не праведзена.

Сваё асобнае становішча ў грамадстве сялянства звязвала з зямлёй. Зямля як «карміцелька» лічылася святой. Гэта акрэсліла паважнае, асцярожнае да яе стаўленне («няможна Зямлю біць, бо Зямля святая»). Узрослыя ўжо ў пасляваенны час юнакі і дзяўчаты неаднаразова атрымлівалі заўвагі ад сваіх старэйшых пакаленняў, што зямлю нельга калоць нажом падчас дзіцячых гульняў. Адначасова існавала забарона чапаць зямлю ў перыяд яе зімовага сну ад Пакроваў і да Радаўніцы («можа быць смерць у сваёй сям'і або неўраджай»). Самай моцнай клятвай у беларусаў лічылася тая, калі чалавек спачатку цалаваў, а затым з'ядаў жменьку

зямлі. Родную зямлю бралі з сабою на чужбіну, пасля смерці яе кідалі ў магілу [23]. Шырока вядомыя словы Якуба Коласа з паэмы «Новая зямля»: «Купіць зямлю, прыдбаць свой кут, каб з панскіх выпутацца пут, і там зажыць сабе нанова: свая зямля — вось што аснова!» — «Зямля — самы каштоўны прадмет для беларуса, — пісаў М. В. Доўнар-Запольскі. — Ва ўсіх яго шматлікіх абрадах, песнях, казках, якія вызначаюцца старажытнасцю поглядаў, адлюстроўваецца глыбокае пачуццё павагі да зямлі. Гэта зразумела, бо зямля шмат стагоддзяў карміла яго і корміць зараз. З уяўленнямі аб зямлі цесна звязана ўяўленне аб родзе...» — «Мы бачылі, — працягвае М. В. Доўнар-Запольскі, — як даражыць беларус сваім родам, і калі не мае сына, ён імкнецца зараней узяць прыёмыша, зяця-прымака, каб гэты працягваў яго род» [3, с. 43, 44]. Зямля звязвалася ў свядомасці селяніна з родам, з вечнасцю, працу на зямлі вясковец лічыў самай значнай.

Па сведчанні М. В. Доўнар-Запольскага, «правы на зямлю асвячаюцца і падтрымліваюцца працай на ёй. Недастаткова мець права на зямлю па нараджэнні — неабходна, каб гэтае права падтрымлівалася працай». Ён прыводзіць шмат сведчанняў аб тым, што грамада пуставаўшую зямлю надавала таму, хто яе апрацоўваў [3, с. 45, 46]. Разуменне такога падыходу мы знаходзім у аграрных праграмах беларускіх партый. У 1920-я гг. размеркаванне зямлі найчасцей ажыццяўлялася па фактычным землекарыстанні. Пэўнае адлюстраванне працоўнага карыстання зямлёй знайшло і ў дзейнасці наркама земляробства Д. Ф. Прышчэпава, у вызначэнні мінімальнай і максімальнай норм землекарыстання, звязаных з наяўнасцю рабочых рук у сям'і. Пры гэтым паняцце даўнасці ў адносінах да зямлі пры існаванні законнага спадчынніка, ды яшчэ прамога, не мае дадатку ў народным праве. «Тут адзін прынцып — прынцып працы», — пазначае М. В. Доўнар-Запольскі.

Зямля заставалася галоўнай каштоўнасцю на працягу 1920-х гг. Як калісьці раней, сяляне, зарабіўшы грошы, у тым ліку за мяжой, імкнуліся вярнуцца, каб прыдбаць зямлю на радзіме. Яны не спыняліся, калі нават зямля не станавілася іх уласнасцю. Добрым прыкладам таму з'яўляецца арганізацыя камуны «Звязда» Навасёлкаўскай воласці Ігуменскага павета [24, л. 2, 5, 7, 77, 78]. Арганізатары камуны — беларусы, якія вярнуліся з Амерыкі, каб увасобіць у жыццё свае ідэалы, — пачалі з таго, што «цягалі плугі замест коней». Усе назапашаныя падчас працы на заводах Форда сродкі яны звярнулі на куплю жывога і нежывога інвентару.

Як жа адбылося так, што ўжо ў 1930-я гг. можна было пачуць: «раз зямля дзяржаўная, значыць нічыя». Шмат хто з даследчыкаў здольны бачыць тут выяўленне рэакцыі на несправядлівасць у дачыненні да селяніна, іншыя пазначаюць тое, што зямля перастала быць уласнасцю вяскоўца. На наш погляд, пачуццё гаспадара сялянствам звязвалася найперш не з прыватнай уласнасцю на зямлю, а з імкненнем пазбавіцца ад умяшання іншых асоб і сіл у свае сялянскія справы. Сяляне вельмі асцярожна падыходзілі да змен форм гаспадарання. Умяшанне дзяржавы, прымус падштурхоўвалі яго да свядомага супраціўлення.

Кіраўніцтва бальшавіцкай партыі ў 1920-я гг. яшчэ разумела, што сяляне — людзі вельмі практычныя, якія найбольш вераць не заклікам, а прыкладам. У

перыяд рэалізацыі Сталыпінскай аграрнай рэформы сялянства не спяшалася выдзяляцца з абшчыны. І наадварот, як толькі сялянства на канкрэтных прыкладах заўважыла рэальныя станоўчыя вынікі гаспадарчай дзейнасці хутаран на пачатку 1920-х гг., рух да гэтай формы землеўпарадкавання акрэсліўся даволі істотны. «Як гаспадар-практык, — пісаў у 1922 г. прафесар Інстытута народнай гаспадаркі Іван Акімавіч Кірылаў, — селянін, натуральна, у першую чаргу звяртае сваю ўвагу на гаспадарчыя формы, ужо рэальна існуючыя... Ён бачыць на хутарах і адрубах павышаныя ўраджаі розных культур, бачыць эканомію ў працы і іншыя з'явы, якія адсутнічаюць у перадзельнай абшчыне» [25, с. 60].

Выключнае значэнне для разумення многіх падзей у свеце сялянскай рэчаіснасці мае вывучэнне сям'і, паўсядзённых адносін паміж бацькамі і дзецьмі, ролі гаспадара. На жаль, у дачыненні да 1920—30-х гг. мы не маем такога ўзроўню даследаванняў, які ўяўляе сабою вывучэнне М. В. Доўнар-Запольскім права і быту сялянства Мінскай губерні. Але, пазначаючы ролю традыцыі і марудныя змены ў гэтым кірунку, можам заўважыць той вектар развіцця, які прысутнічаў на працягу як мінімум двух наступных дзесяцігоддзяў. Акрэсліваючы ролю беларускага гаспадара, М. В. Доўнар-Запольскі заўважае, што пры ўсёй сваёй выключнасці ён «можа і павінен рабіць толькі тое, што адпавядае агульным інтарэсам сям'і». Гаспадар — згодна з сабранымі ім матэрыяламі — павінен быў быць прыкладам, каб навучаць іншых. Лянота, п'янства маглі прывесці да раздзелу гаспадаркі, а ў шэрагу выпадкаў да таго, што справу ў свае рукі браў старэйшы сын [3, с. 11]. «Камуністы для сялян на вёсцы не прыклад, бо не ўмеюць весці сваю гаспадарку», — сведчылі даследчыкі вёскі сярэдзіны 1920-х гг. [5, с. 11].

Магчыма, гэтая ментальная рыса сялянства выяўлялася ў падтрымцы ідэі сваёй, «сялянскай» партыі, якая працягвала жыць і ў савецкі час. Гэтая ідэя сярод сялянства БССР набыла асаблівае гучанне. Пры гэтым ціск на вёску толькі пашыраў рост падобнага роду ідэй і выступленняў. Зразумела, што найбольш актыўным элементам выступала заможнае сялянства, аднак сялянская партыя (саюз) выяўляла міжстратавыя сувязі [4, с. 780—818]. Па меркаванні аўтараў падрыхтаванага даклада Сакрэтнага аддзела АДПУ «Антысавецкі рух у вёсцы» (кастрычнік 1928 г.), сялянства, асабліва заможнае, з першых паслярэвалюцыйных дзён стала адной з сіл, якая выступала супраць бальшавікоў; нэп умацаваў «кулацтва», якое стала выяўляць сябе актыўна. У сувязі з тым уважліва сачылі за настроем моладзі, якая атрымала адукацыю ў ВНУ. Наркам асветы Баліцкі, выступаючы ў лютым 1929 г. на XII з'ездзе КП(б)Б (што ўзяў курс на суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю кулацтва як класа), пазначаў: «...Студэнт Санкт-Пецярбургскай акадэміі Трафімаў, які потым будзе праводзіць нашу аграрную палітыку на вёсцы, піша ў лісце свайму бацьку наступнае: "...палітыка сучаснай улады настолькі грунтоўна накіравана супраць развіцьця асабістых сялянскіх гаспадарак, што пры якім хочаце жаданьні, пры якіх заўгодна цяжкасцях скласьці такую гаспадарку, як гэта можна было раней, не ўдасца ніколі". Ён раіць свайму бацьку ні кроку не рабіць дзеля пашырэньня сваёй гаспадаркі, дзеля павышэньня ўраджайнасці» [24, л. 229, 230].

Заўважна было, такім чынам, імкненне не выявіць карані з'явы, а знайсці вінаватых. Заўважым, што ў 1920-я гг. навукоўцы ўнеслі пэўны ўклад у тое, каб за выявамі бачыць сутнасць. У гэты час істотна цікавіў даследчыкаў менавіта фактар сялянскай псіхалогіі. Аб тым, у прыватнасці, сведчыць зборнік матэрыялаў, выдадзеных у 1923 г. з нагоды 20-годдзя сялянскіх хваляванняў у Расіі [27]. Зборнік выйшаў у серыі «Матэрыялы па гісторыі сялянскага руху», у рэдкалегію якой уваходзілі такія вядомыя вучоныя, як Б. Б. Весялоўскі і У. І. Пічэта. Прыводзімыя ў зборніку факты аб сялянскім руху ў Расіі сведчылі аб тым, што за падзеямі ўлады імкнуліся бачыць не вытокі глыбокіх праблем, звязаных з гаротным становішчам сялянства, а рэвалюцыйную агітацыю студэнцтва. Не змяншаючы ролі гэтага фактару, складальнікі ўсё ж звярталі ўвагу на імкненне сялянства следаваць «праву, магчыма па-свойму зразумеламу, але закону». Менавіта таму сяляне бралі толькі хлеб «на пражыццё» і «скаціне», часам спыняліся перад замкамі па амбрах і ў сітуацыях, калі яны былі заклеены паперай з гербавай пячаткай [27, с. 10]. Пры гэтым можна заўважыць, што ў адрозненне ад Саратаўскай губерні, дзе прапаганда эсэраўскай партыі вялася найбольш інтэнсіўна (і куды ў хуткім часе губернатарам быў прызначаны П. А. Сталыпін), сялянскія хваляванні ў Палтаўскай і Харкаўскай абласцях на пачатку XX ст. вызначаліся меншай ступенню агітацыі [27, с. 3]. АДПУ ў пазначаным дакладзе таксама вызначала актывізацыю народніцкіх арганізацый і эсэраў, якая найчасцей усё ж выяўлялася праз адзінкавыя прыклады барацьбы іх прадстаўнікоў.

Цікавасць АДПУ да інтэлігенцыі была невыпадковай, адраджэнне сельскай гаспадаркі пашырала ўплыў сялянства. Развіццё адукацыі, рост колькасці выхадцаў з вёскі ў ВНУ садзейнічаў росту прасялянскіх, беларускіх настрояў. У данясеннях НКУС адзначалася: «Інтэлігенцыя нацыянальных рэспублік адрозніваецца ад "расійскай" інтэлігенцыі — яна істотна больш актыўная і больш блізкая вёсцы па сваёй сацыяльнай прыродзе і сваім палітычным настроям, так як у большасці сваёй выйшла з вёскі і захавала з ёй цесную сувязь» [4, с. 815].

Пры захаванні традыцыйнага недаверу да дзяржавы, сялянства традыцыйна чакала ад улады не толькі стварэння пэўных умоў, але і канкрэтных выгод. У значнай ступені такі падыход выяўлялі селькоры «Сялянскай газеты». Адзін з іх (у перыяд прыкладна з 1 снежня 1929 г. па 2 студзеня 1930 г.) пісаў: «Штосьці такое робіцца ў нашай Беларусі, усе сумняюцца, і ў гэтым весь народ ходзіць як хворы... Мы будзем гаварыць: гэта штука добрая, але трэба добры закон і жалаванне, каб сяляне маглі пражыць і адзецца, а які-небудзь упраўляючы будзе атрымоўваць 100 руб. і больш, а селянін 15—20 руб., ці і таго меней, тады гэта жыццё невыноснае і можа адбыцца паўстанне народу. Гэта ўжо недалёка. Калі будуць такія парадкі» [28, л. 11].

Для разумення змен у сацыяльнай псіхалогіі сялянства неабходна вывучэнне быту, сацыяльнай інфраструктуры, адукаванасці яго розных слаёў і груп. У айчыннай гістарычнай літаратуры дадзеная праблема комплексна не вывучалася. Найбольш акрэслена тэма сацыякультурнай дынамікі сялянства Беларусі ў 1920-я гг. у працах М. А. Бяспалай [29, с. 21—28]. Станаўленне сістэмы аховы

маці і дзяцінства ў БССР адлюстравана ў публікацыях М. М. Каліноўскай, Д. П. Бяляцкага, Я. І. Шышко, У. А. Навіцкага і інш. [30—33], але гэтае вывучэнне найменш ахапіла вёску. Урэшце, крыніцы па дадзенай праблематыцы дазваляюць сцвярджаць, што ў 1920-я гг. дынаміка змен у сацыяльным статусе жанчыны закранала вёску ў неістотнай ступені. Грамадзянскія шлюбы, дазвол абортаў, дадатковыя адпачынкі па нараджэнні і выхаванні дзяцей станавіліся характэрнай рысай гарадскога, але не сялянскага жыцця. У 1920-я гг. адбывалася дэцэнтралізацыя фінансавання аховы здароўя. Асноўны цяжар пераносіўся на мясцовы бюджэт, страхавыя выплаты, уласныя сродкі насельніцтва (плата за лячэнне), дапамогу грамадскіх арганізацый [34, с. 76]. Гэта ў пэўнай ступені набліжала сітуацыю да стану медыцынскага абслугоўвання ў Заходняй Беларусі, дзе пры адсутнасці дзяржаўнай падтрымкі істотнае значэнне мела ўрачэбнае самакіраванне з элементамі дыспансерызацыі, інстытута сямейных урачоў і г. д. З адкрыццём Медыцынскага факультэта БДУ, а надалей асобных вышэйшых медыцынскіх устаноў сітуацыя з забеспячэннем медыцынскім персаналам у БССР пачала істотна паляпшацца [35]. Аднак гэтыя працэсы закранулі найперш горад. На пачатку 1920-х гг. пераважная частка ўстаноў аховы здароўя БССР утрымлівалася за кошт мясцовых бюджэтаў, якія з прычыны недахопу сродкаў былі не ў стане ўтрымліваць разгалінаваную сетку лячэбна-санітарных устаноў, што прывяло да іх скарачэння. У 1923 г. захаваліся толькі тыя ўстановы, што абслугоўвалі рабочых. Пры гэтым значная частка медыцынскіх работнікаў засталася без працы. Ствараемыя ўстановы аховы здароўя арыентаваліся на гаспадарчыя разліковыя прынцыпы, самафінансаванне і самаакупляльнасць, але значнага росту прыватных лячэбных устаноў не адбылося. Пры гэтым пэўная частка медыцынскіх работнікаў, зарэгістраваных як беспрацоўныя, на самой справе пакідалі працу ў раёнах і ўхіляліся ад накіравання на перыферыю [34, с. 80].

Увогуле, як паказвае ўсплеск нараджальнасці ў Беларусі з 1922 г., вызначальнымі для дэмаграфічных абставін з'яўляюцца сацыяльна-эканамічная сітуацыя і стабільнасць у дзяржаве. Сталае значэнне маюць традыцыі, найперш у галіне родадапамогі. Пры тым, што радзільныя дамы на вёсцы амаль адсутнічалі, большасць родаў адбывалася дома, найчасцей не ў прысутнасці акушэркі ці фельчара, а бабкі-павітухі, дзіцячая смяротнасць на вёсцы была ніжэйшай, чым у горадзе. Больш істотным для селяніна з'яўляўся фактар голаду, які выразна акрэсліўся ў вёсцы ў першай палове 1930-х гг. Пры гэтым нават часовае паляпшэнне ўмоў з харчаваннем перадвызначыла тое, што 1935 год стаў найлепшым з пункту гледжання дзіцячай смяротнасці. Разбурэнне традыцыйных інстытутаў і норм паводзін вёсцы (як і ў горадзе) не кампенсавалася ростам абароны маці і дзіцяці з боку дзяржавы [35—36]. У выніку дзіцячая смяротнасць да года стала рэзка ўзрастаць, дасягнуўшы ў 1940 г. занадта высокіх для цывілізаванай краіны памераў [34].

Акрэсліваючы развіццё адукацыі, неабходна пазначыць спецыфіку сельскай школы. Настаўнік вымушаны быў улічваць асаблівасці сялянскага светапогляду, традыцыйнага ўяўлення сялян аб адукацыі, іх адносіны да школы. У такіх

умовах пераважнае значэнне набывала асоба настаўніка, яго ўменне ўздзейнічаць на бацькоў праз дзяцей і наадварот. Савецкія ўлады разглядалі школу ў якасці аднаго з асноўных інстытутаў свайго ўплыву на вёсцы, вызначаючы выключныя патрабаванні да вясковага настаўніцтва (палітычная лаяльнасць і грамадская актыўнасць).

Моладзь станавілася асноўнай сілай, якую накіроўвалі да злому традыцый. Але ідэал моладзі ў 1920-я гг. паступова звязваўся не з заможнасцю ў вёсцы, а з горадам і тымі перавагамі ў адукацыі і ўмовах жыцця, якія ён увасабляў. Шэраг беларускіх пісьменнікаў, у прыватнасці Кузьма Чорны («Радасць жанчыны», 1925 г.), перадавалі гэтыя чаканні ў вобразнай і эмацыянальнай форме («Цяжкі туман над старой вёскай, ды лёгкімі і новымі былі думкі ў жанчыны») [38]. Што ж тычыцца ўплыву царквы, то, на наш погляд, нельга пераацэньваць уплыў дадзенага фактару. А. М. Бальшакоў пазначаў, што «ў сферы рэлігійных адносін вёска ці індыферэнтная, ці хутчэй актыўная ў кірунку атэізму, абрадавы бок рэлігіі падтрымліваецца ёю з прычыны інерцыі» [5, с. 11]. М. В. Доўнар-Запольскі дакладней ацэньваў гэтую «інерцыю» як павагу да традыцыі з боку селяніна. Пры гэтым ён апісваў прыклады, калі вяскоўцы не давяралі настаўніку, вельмі неахвотна адпускалі дзяцей у школу [3, с. 277]. Развіццё адукацыі стала ўсё ж адным з найбольш эфектыўных кірункаў савецкай палітыкі на вёсцы.

Прымаючы пад увагу пільную апеку НКУС на памежнай тэрыторыі СССР, куды адносілася частка Беларусі, неабходна пазначыць, што памеры сялянскага супраціву тут былі не меншыя, чым у іншай частцы Саюза. Яшчэ М. В. Доўнар-Запольскі развейваў міф аб «рахманым» характары беларуса, які сцерпіць усё. Ён сцвярджаў, што гэты міф стварылі ў 60-я гг. XIX ст. рускія публіцысты, якія «з усіх сіл імкнуліся паказаць беларусаў самым няшчасным, самым прыгнечаным народам, каб паказаць, як цяжка адбілася ў краі панаванне польскіх памешчыкаў і яўрэяў». Беларус адрозніваецца беражлівасцю, амаль скупасцю, прагматычнасцю пры арганізацыі гаспадаркі. «Разам з тым, — працягваў даследчык, — для яго характэрна гасціннасць, часам нават даверлівасць» [3, с. 279].

Актыўнымі носьбітамі індывідуалістычных настрояў з’яўляліся жанчыны. Аб гэтым гаворыць пераважная большасць сведчанняў аб антыкалгасных настроях. Гэты феномен можна бачыць не толькі як вынік нейкай кулацкай агітацыі, але і пэўны псіхалагічны феномен. Па-першае, жанчыны як захавальніцы роду, абаронцы дзяцей (сям’і) у большай ступені схільныя да больш актыўных дзеянняў. Па-другое, заўсёды прысутнічаў прагматычны разлік на тое, што ў дачыненні да жанчын-маці ўлады будуць дзейнічаць больш мякка. Пры гэтым даволі часта ініцыятарам, натхняльнікам выступлення меўся хтосьці з мужчын. Пэўнай «іскрай» да выступлення станавіліся чуткі аб прыходзе палякаў, якія распусцяць калгасы. Таму сяляне, найперш жанчыны, імкнуліся забраць маёмасць ад разграблення [39, л.91].

Многія з даследчыкаў пазначалі, што менавіта жанчыны сталі рэальным фактарам антыкалгаснай агітацыі і барацьбы. Прычыны гэтай з’явы ўладамі не аналізаваліся, найчасцей спасылаліся на адсталасць і нізкую адукацыю. Роля жан-

чыны ў беларускай вёсцы на працягу стагоддзяў была вызначальнай. «Нярэдка, — піша М. В. Доўнар-Запольскі, — можна было сустрэць дзяўчыну, якая выдатна косіць, малоціць, арэ і г. д. <...> Рабіць жа для мужчыны жаночую работу лічыцца “зазорным”». Пры гэтым, па меркаванні Мітрафана Віктаравіча, «становішча жанчыны ў беларускай сям'і далёка не можа быць названа прыгнечаным. Яна з'яўляецца поўнай гаспадыняй у сваёй сферы, памочнікам і дарадцам мужа» [3, с. 13, 14]. Па сведчанні даследчыка, «у беларускай сям'і жорсткія адносіны мужа да жонкі — з'ява вельмі рэдкая, больш таго — выключная». М. В. Доўнар-Запольскі заўважае, што «спасылка на мясцовыя звычаі (магчыма, з часоў ВКЛ)» асабліва часта сустракаецца ў справах, якія тычацца спадчынных правоў жанчыны [3, с. 56].

Заможнае сялянства дзеля адстойвання сваіх інтарэсаў імкнулася выкарыстаць Саветы. Нават тыя, што былі пазбаўлены выбарчых правоў, прыходзілі і агітавалі (1927 г.) [4, с. 533]. Неабходна пазначыць, што камісіі часам няўважліва падыходзілі да пазбаўлення выбарчых правоў. Так, у Халопенічскай мясцовай выбарчай камісіі служачы кааператыва быў пазбаўлены правоў за тое, што ён 5 гадоў назад служыў прыказчыкам у лаўцы прыватніка [4, с. 520]. Часам праз пазбаўленне выбарчых правоў зводзіліся асабістыя рахункі. У Засвічскім сельсавеце Клічаўскага раёна Бабруйскай акругі маламоцны серадняк быў пазбаўлены выбарчых правоў толькі за тое, што крытыкаваў работу старшыні сельсавета. А сакратар Бацэвічскай ячэйкі КП(б)Б таго ж раёна пазбавіў правоў саматужніка, каб звесці рахункі з яго жонкай [4, с. 526, 527].

У барацьбе за свае правы і зямлю сялянства выявіла шэраг падыходаў. Па-першае, сваю еднасць. У Мінскім раёне работнікі сельсавета, даведаўшыся аб арыштах, пачалі выдаваць даведкі заможным сялянам аб «дабранадзейнасці», чым выратавалі частку з іх, дазволіўшы з'ехаць. Па-другое, здольнасць ахвяраваць самым дарагім. Вядома, наколькі сяляне з беражлівасцю адносіліся да сваёй жывёлы. На сходзе ў Жыткавічах адзін селянін заявіў: «Я гараваў некалькі год для таго, каб нажыць коніка, здаў яго ў калгас сытага, а калі праз некалькі дзён убачыў яго схудалага (калі на ім вяртаўся з працы з лесасекі і інш.), мне захацелася ўчапіцца за каня, і няхай бы яна мяне забіла» [39, л. 87]. Разам з тым пры неабходнасці яны ішлі на крайнія меры. Па некаторых раёнах БССР былі адзначаны выпадкі прыводу на скатабойню кароў, якім заставалася да ацёлу 2—3 тыдні [4, с. 87]. Сераднякі лічылі: «Усё роўна пойдзем у калгас, і жывёла прападзе; няхай будуць хоць грошы». Той, хто не мог згадзіцца на забой, прадавалі кароў па самых нізкіх цэнах. Пры гэтым не ўзрастала колькасць масавых выступленняў — іх па Саюзе ў кастрычніку 1929 г. было 63 супраць 56 у верасні, аднак у БССР — толькі адно [4, с. 992]. Па меркаванні АДПУ, ажыўленне контррэвалюцыйнай дзейнасці ў Беларусі было звязана з прыездам агентаў замежных дыверсійных цэнтраў.

Сярод форм барацьбы сялянства напрыканцы 1920-х гг. узрастала колькасць падпалаў: за вясенняе паўгоддзе ў 1927 г. іх было ў рэспубліцы 601, у 1928 — 765, а ў 1929 г.—1037. Аб'ектамі падпалу станавіліся найчасцей дамы арганізатараў

калгасаў і калгасных актывістаў, а таксама гаспадарчыя пабудовы калектываў. Адной з форм супраціву сталі падпалы хлеба. Па БССР паводле дакладной запіскі Сакрэтна-палітычнага аддзела АДПУ ад 15 сакавіка 1931 г. адбылося 358 такіх выпадкаў. БССР адзначалася як адзін з найбольш выяўленых рэгіёнаў з антысавецкімі настроямі. Адпаведна гэтым жа даным адбылося 548 масавых выступленняў [4, с. 792]. Найбольш значную сілу выступленняў складала моладзь [4, с. 795]. Пік такога кшталту барацьбы назіраўся ў сакавіку — красавіку 1930 г. [4, с. 798]. Улады асабліва хвалявала тое, што ўсё гэта адбывалася паблізу дзяржаўнай мяжы. Колькасць тэрарыстычных актаў згодна з данымі АДПУ за 1930 г. склала 533 выпадкі [4, с. 801, 807].

7 жніўня 1932 г. быў прыняты закон аб ахове грамадскай уласнасці супраць крадзяжоў і растраты калгаснага і саўгаснага ўраджаю. Да растраты сацыялістычнай уласнасці адносілася і прымяншэнне калгасамі, саўгасамі даных аб ходзе намалоту, яно разглядалася як схова хлеба. Караліся таксама масавае складанне актаў аб порчы хлеба, перабольшванні страт і г. д. Выключная мера пакарання прымянялася пры сістэматычных крадзяжах калгаснага хлеба, крадзяжах арганізаванымі групамі, у асабліва буйных памерах і тэрарыстычных актах [40, с. 141]. Заўважым, што за крадзяжы сацыялістычнай уласнасці ў горадзе за 1933 г. у цэлым па СССР было прыцягнута да адказнасці прыкладна столькі ж асоб, колькі і ў вёсцы (пры ўяўнай несупастаўнасці насельніцтва). Можна меркаваць, што на пачатку 1930-х гг. гэтая з'ява не набыла істотнага размаху і меры АДПУ з'яўляліся ў значнай ступені прэвентыўнымі. Ступень распаўсюджанасці вышэйшай меры пакарання ў БССР была ў шмат разоў вышэйшая, гэтаксама як і асуджэнне на 10 гадоў, чым у РСФСР і УССР. Так, на 1 студзеня 1934 г. з ліку ўсіх асуджаных (813 чалавек) у БССР было расстраляна 12 %, асуджана на 10 гадоў 72 %, у той час як па УССР гэтыя лічбы складалі 3,7 % і 9%. Прымаючы пад увагу меншыя лічбы ўсіх асуджаных, кіраўніцтва Вярхоўнага Суда СССР лічыла, што гэта выключна больш пунктуальнае прымяненне закона [40, с. 129].

Прысядзібныя надзелы, безумоўна, заспакоілі частку сялянства, задаволілі іх уласніцкія патрэбы. Аднак дуалізм спарадзіў новыя супярэчнасці. Прысядзібныя надзелы калгаснікі імкнуліся максімальна павялічыць, выкарыстоўваючы складанасці з землеўпарадкаваннем. Даволі часта яны трактавалі тыя ці іншыя нормы на сваю карысць. Так, у 3-м пункце Пастановы СНК СССР было пазначана, што пры надзяленні сядзібай калгаснікаў ім адводзіцца не болей чым 0,5 га зямлі. Аднак асобныя землямеры пазначалі перад гэтай лічбай «не менеі...» [41, с. 837]. Паступова спеў дуалізм і ў свядомасці селяніна, выяўляючыся ў яго эканамічных паводзінах. Калгаснікі імкнуліся найбольш часу правесці ў сваёй гаспадарцы, тым болей што за калектыўную ён амаль нічога не атрымліваў.

Пры скарачэнні колькасці коней і кароў на працягу зімы — вясны 1932 г. павялічвалася пагалоўе свіней, рост быў забяспечаны ў пэўнай ступені за кошт калектывізаванай часткі сялянства [41, с. 316]. Значныя спадзяванні ўскладаліся на індывідуальную зацікаўленасць калгаснікаў. Дзеля гэтага быў распрацаваны план надзялення жывёлай бескароўных калгаснікаў. Аднак на 25 снежня 1932 г.

па БССР ён быў выкананы толькі на 31,5 %. Шмат калгаснікаў проста адмаўляліся ад жывёлы, матывуючы рознымі прычынамі, у тым ліку адсутнасцю кармоў [41, с. 825].

Вызначаючы трыяду «бядняк», «серадняк», «кулак», улады разлічвалі найперш на падтрымку першых. На гэта з сярэдзіны 1920-х гг. накіроўваецца шэраг ільгот, сацыяльных гарантый, культурнае абслугоўванне. Практыка, аднак, па-ранейшаму паказвала, што настроі гэтай групы пераменлівыя, патрабавалі ўсё большых магчымасцей без пэўнай аддачы. І калі пазначалася супрацьстаянне, паўпралетарскія слаі вёскі не заўсёды падтрымлівалі ўладныя структуры. У прыватнасці, дакументы АДПУ сведчаць аб тым, што падчас антыкалгасных выступленняў толькі сельскія актывісты з беднякоў захоўвалі нейтралітэт. Астатнія ж актыўна падтрымлівалі арганізатараў такіх падзей. А вось цэлыя вёскі, дзе пераважалі серадняк, увогуле не паддаваліся падобным настроям [39, л. 87].

Вывучэнне паўсядзённага жыцця беларускай вёскі дазваляе зазірнуць у тоўшчу народнага жыцця, пашырае межы прадмета даследавання. У сувязі з гэтым асобны інтарэс уяўляюць 1920-я гг., калі разам са старымі традыцыямі ў паўсядзённым жыцці беларускай вёскі сталі з'яўляцца рысы новага ўкладу, стала змяняцца свядомасць сялян, сістэма адносін, выпрацоўваліся новыя светапоглядныя арыентацыі. Пытанне аб перавагах буйной калектыўнай гаспадаркі перад дробнай, адзінаасобнай, у рэшце рэшт вырашалася ў сферы вытворчасці. І калі тут, як мы ўжо заўважалі, у асобных сферах калектыўныя гаспадаркі не саступалі індывідуальным, адным з важнейшых пытанняў станавілася матывацыя працы селяніна. Праблема стымулявання ўдзелу кожнага члена калгаса ў грамадскай вытворчасці, зацікаўленасці ў яго выніках з'яўлялася ў 1920-я гг. адной з найбольш істотных (калі невызначальных) не толькі для паспяховага гаспадарчага развіцця, але і для захавання жыццяздольнасці калектыўных аб'яднанняў. Вядомы тэарэтык кааператыўнага будаўніцтва А. В. Чаянаў яшчэ ў 1919 г. адзначаў, што «арганізатарам арцельнага земляробства ў першую чаргу прыйдзецца заўсёды вырашаць два асноўных пытанні — як наладзіць у арцелі працоўную дысцыпліну і як павялічыць у псіхалогіі арцельшчыкаў стымулы да павышэння напружання працы. У вырашэнні гэтых асноўных праблем — ключ усёй справы, усё астатняе, па сутнасці, тэхніка» [42, с. 306].

У сярэдзіне 1920-х гг. акрэсліўся крызіс ураўняльнай сістэмы размеркавання, якая прыводзіла да мінімальнай працоўнай аддачы члена калектыву і адначасова — да ўзрастання яго спажывецкіх запытаў, і пачаўся пераход асобных камун Беларусі да аплаты з улікам не толькі выдаткаванай працы, але і ўнесенай маёмасці. Дадзены прынцып размеркавання даходаў уводзіўся пад ціскам членаў, якія ўступілі зноў. Менавіта так развіваліся падзеі ў камуне «Чырвоны Сцяг» Гарадокскага павета Віцебскай губерні. У сакавіку 1924 г. на агульным сходзе камунары вырашылі, што прынцып «ад кожнага — па здольнасцях, кожнаму — па патрэбах» у новых эканамічных умовах з'яўляецца нежыццяздольным. З мая гэтага года для кожнага члена калектыву была вызначана зарплата: адказным за галіны гаспадаркі — 15 руб. у месяц, мужчынам на агульных работах — 12 руб.,

жанчынам — 10 руб., падлеткам — 2 руб. 50 капеек. Акрамя таго, у канцы года з прыбытку дадаткова выплачвалася 10 % за ўнесеную маёмасць [43, с. 44].

У адпаведнасці з данымі абследавання калгасаў БССР на 1 кастрычніка 1924 г. і студзень 1925 г. ураўняльнае размеркаванне існавала ў пераважнай большасці сельскагаспадарчых арцеляў [44]. З сярэдзіны 20-х гг. XX ст. услед за камунамі сельгасарцелі пачынаюць пераходзіць да аплаты ў адпаведнасці з колькасцю і якасцю выдаткаванай працы. У 1925 г. на Усесаюзнай нарадзе сельскагаспадарчых калектываў прадстаўнік арцелі «Адраджэнне» Гомельскай губерні казаў, што ў іх «спачатку вёўся толькі запіс працоўных дзён, але на гэтай глебе адбываліся спрэчкі, з прычыны чаго прыйшлося запісваць дні і пазначаць якасць праведзенай працы» [45, с. 39].

Пошук шляхоў павышэння вытворчасці працы і паляпшэння ўзаемаадносін паміж членамі калгасаў парадзіў вялікую разнастайнасць форм аплаты працы. Асновай сістэм аплаты, якія ўстанаўліваліся, з'яўляўся ўлік колькасці працоўнай сілы, якая затрачвалася на вытворчасць прадукцыі ў калектыўнай гаспадарцы. Размеркаванне даходаў з пераважным улікам працоўных выдаткаў у крыніцах вызначаецца па-рознаму: «па наяўных працаўніках», «па працоўных сілах», а часткай — як адзначалася вышэй — «па паях» [46, л. 6, 20, 22, 28; 47, л. 13; 48, с. 28]. Характэрнай рысай яго з'яўлялася выразная ў залежнасці ад полу і ўзросту градацыя аплаты працы. У асобных выпадках устанаўліваліся аклады для спецыялістаў і членаў праўлення калгасаў. Так, у сельскагаспадарчай арцелі «Бальшавік» працоўны дзень дарослых прыраўніваўся да 1; спецыялістаў — да 1,25; па кіраванні гаспадаркай — да 1,65; падлеткаў да 20 гадоў — 0,75 [49, с. 31].

Частка калектываў практыкавала размеркаванне даходаў па едаках у адпаведнасці з устаноўленым пражытачным мінімумам. У камунах, акрамя натуральных выдач, адбываліся грашовыя выплаты для забеспячэння асабістых патрэб працаўнікоў. Такі парадак размеркавання даходаў пры анкетаванні прадстаўнікі камун ацэньвалі як «размеркаванне "па патрэбах"», што, безумоўна, не адпавядала рэчаіснасці [50, л. 11; 51, л. 6].

У дачыненні да ступені распаўсюджанасці адзначаных вышэй форм у калектыўнай працы «Перамога калгаснага ладу ў Беларускай ССР» М. Я. Стральцоў пазначаў, што «даходы ў калектыўных гаспадарках БССР у 1926/27 гаспадарчым годзе размяркоўваліся наступным чынам: па наяўных работніках — 52,4 %, па сем'ях— 28 %, па паях — 11,3 %, па едаках— 2,2 %, іншыя— 6,1 %» [52, с. 106]. Гэтыя суадносіны значна разыходзяцца з данымі абследаванняў калгасаў ЦСУ ў 1927 г. Прычына паказанага разыходжання заключаецца, на наш погляд, у тым, што М. Я. Стральцовым прыведзены звесткі не аб размеркаванні даходаў, а аб размеркаванні працы ў калгасах, якія ў рэчаіснасці не супадалі [48, с. 28; 53, с. 33].

Акрамя таго, абследаваннем Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення былі ахоплены 383 калектыўныя гаспадаркі (Белсельсаюзам — 275), гэта таксама важкі аргумент на карысць выбару якасці больш дакладнай крыніцы менавіта даных ЦСУ. Іх аналіз дазваляе сцвярджаць, што ў калгасах рэспублікі прынцып аплаты

паводле працы да 1927 г. не атрымаў шырокага распаўсюджання. Толькі крыху больш за 22 % калектыўных гаспадарак практыкавалі размеркаванне даходаў у адпаведнасці з працоўнымі выдаткамі, менш за палову ўлічвалі не толькі выдаткаваную працу, але і ўнесеную маёмасць, астатнія ж выкарыстоўвалі ўраўняльны прынцып («па патрэбах», «па едаках»). Значную долю ўраўняльнасці змяшчала і размеркаванне «па работніках», якое прымянялася пераважна ў сельгасарцелях, бо да ўвагі ў дадзеным выпадку прымаліся не канчатковыя працоўныя выдаткі, а толькі патэнцыяльная здольнасць да працы. Разам з тым у калектыўных гаспадарках БССР вызначыўся больш крытычны падыход да ўраўняльнага прынцыпу размеркавання, чым у іншых рэспубліках Саюза. Улік выдаткаванай працы пры аплаце практыкаваўся тут некалькі шырэй (22,5 % супраць 17,2 %). Размеркаванне ж даходаў «па едаках» і «па патрэбах» прымянялася ў меншай ступені (адпаведна 11,7 % і 6,0 % супраць 53,6 % і 10,5 %) [54, л. 36; 55, с. 87].

На падставе даных ЦСУ можна зрабіць выснову аб некаторых адрозненнях паміж асобнымі формамі калектыўных гаспадарак па аналізуемай прыкмеце. Напрыклад, у ТСЗ пераважала размеркаванне з улікам унесенай маёмасці. У камунах часцей, чым у іншых аб'яднаннях, практыкавалася аплата «па едаках» і «па патрэбах». Аднак у калектывах з больш высокай ступенню абагульнення сродкаў вытворчасці размеркаванне даходаў з улікам выдаткаванай працы прымянялася некалькі шырэй, чым у калгасах з меншай ступенню абагулення (роўна як і грашовая аплата), і суправаджалася імкненнем кампенсаваць непазбежнае паглыбленне сацыяльнай няроўнасці ўлікам стану здароўя, узросту, колькасці едакоў у сям'і. Адрозненні ў сферы размеркавання паміж формамі калектыўных гаспадарак у пэўнай ступені былі абумоўлены асаблівасцямі ў арганізацыі працы. У камунах за кожным членам калектыву звычайна замацоўвалася сталая праца. Гэта дазваляла ацаніць не толькі колькасць працы, але і яе якасць, улічыць кваліфікацыю работніка. У арцелях асобныя гаспадарчыя працэсы выконваліся членамі аб'яднання па чарзе, а зробленыя прадукты дзяліліся ў адпаведнасці з выдаткаванай працай (па адпрацаваных днях, гадзінах і г. д.) [56, с. 88].

Паказаны спосаб арганізацыі працы ў камунах дазваляў вызначыць кола абавязкаў камунараў ужо пры ўступленні ў калектыў з улікам іх здольнасцей і магчымасцей [57, л. 14]. Выкананне вытворчых працэсаў сезоннага характару ў камунах, як і ў арцелях, адбывалася ў адпаведнасці з рашэннямі кіраўніцтва калгаса. У сельгаскамунах, якія з'яўляліся ў большасці выпадкаў шматгаліновымі гаспадаркамі, зацвярджаліся загадчыкі кожнай іх галіны, якія ўваходзілі ў Савет (праўленне). Яны размяркоўвалі працу і правяралі яе выкананне [58, с. 24]. У шэрагу камун быў устаноўлены 8-гадзінны рабочы дзень, які пачынаўся і заканчваўся па званку. Падобная рэгламентацыя з'яўлялася характэрнай не толькі для калектыўных гаспадарак Беларусі, але для сельгаскамун РСФСР [59, с. 38; 60, л. 22, 23]. У калгасах прадугледжваліся меры адміністрацыйнага і эканамічнага ўздзеяння на парушальнікаў працоўнай дысцыпліны: вымовы на агульных сходах; выключэнне пасля трэцяй вымовы; у калектывах з грашовай аплатай практыкаваўся вылік часткі заробку.

Укараненню аплаты па колькасці і якасці выдаткаванай працы ў калектыўных гаспадарках перашкаджала слабая арганізацыя рахункаводства. Паводле справаздачы Белсельсаюза ў 1926/27 гаспадарчым годзе рэальны ўлік працы існаваў толькі ў 4,5 % калгасаў, у пераважнай большасці (75,4 %) калектываў рабіліся толькі асобныя запісы аб выкананай працы, а ў 20,1 % аб'яднанняў рахункаводства адсутнічала ўвогуле [48, с. 27]. Такое становішча было абумоўлена недахопам кваліфікаваных спецыялістаў, нізкім узроўнем пісьменнасці ў калектыўных гаспадарках. Акрамя таго, у шэрагу калгасаў большасць у праўленнях складалі родзічы, усе пытанні вырашаліся па-сямейнаму, і ўліку працы не вялося свядома [61, с. 42].

Ва ўмовах сельскагаспадарчай вытворчасці, калі вынікі выкананай працы не заўсёды можна было назіраць адразу (асабліва ў жывёлагадоўлі), істотныя цяжкасці ўяўляла сабой ацэнка яе якаснага боку. Тым калектывам, дзе адбываўся ўлік працы толькі па адпрацаваных гадзінах, так і не ўдалося дабіцца ўважлівага дагляду за буйной рагатай і дробнай жывёлай. Спробы ж увесці здзельную аплату прыводзілі ў большасці выпадкаў да сур'ёзных рознагалоссяў сярод членаў калгасаў, бо ўстаноўленыя нормы выпрацоўкі маглі быць толькі прыблізнымі. Асаблівую незадаволенасць выклікала ўстанаўленне пры гэтым цвёрдых ставак для асоб, якія займалі адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады [62].

Імкненне пазбегнуць паказаных недахопаў разам з нізкім узроўнем тэхнічнай аснашчанасці калектыўных гаспадарак абумовіла ў арганізацыі працы такія спецыфічныя моманты, як індывідуальны нагляд членаў калгасаў за абагуленай жывёлай, а таксама выкананне сельскагаспадарчых работ па так званым «уроках». У гэтым выпадку кожная сям'я апрацоўвала для сябе свой участак, але засевак, пасеў і ўборка ўраджаю адбываліся адначасова [63, л. 6, 13, 30, 31].

Несправядлівае размеркаванне даходаў нярэдка з'яўлялася не толькі прычынай выхаду з калгасаў асобных членаў, але і перашкаджала ўступленню новых [64, л. 10]. Таму вырашэнне дадзенай праблемы стала прадметам сур'ёзных дыскусій на ўсіх узроўнях кіравання — ад органаў дзяржаўнай улады да нарад кааператыўных арганізацый. У маі 1927 г. на V сесіі Усесаюзнага савета калгасаў было прынята рашэнне аб неабходнасці ўвядзення ў калектыўных гаспадарках норм выпрацоўкі з улікам колькасці і якасці выкананай працы аж да прымянення здзельнай аплаты працы [65, л. 20, 21]. Восенню 1927 — вясной 1928 г. распрацоўваюцца і прымяняюцца адпаведныя папраўкі да Тыпавых статутаў камун, арцеляў і таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі. Так, напрыклад, у статуце сельгаскамуны замацоўвалася, што ёю «могуць быць прыняты ў разлік не толькі колькасць працы, але і яе якасць, і кваліфікацыя» [66, л. 3].

Укараненне ў калгасах аплаты па колькасці і якасці выкананай працы дазваляла ліквідаваць у аплаце работы жанчын і падлеткаў, якія ў шэрагу калектываў фактычна знаходзіліся ў становішчы парабкаў [67, с. 24, 30; 68, с. 59]. Аднак у многіх калектыўных гаспадарках не былі вырашаны іншыя сацыяльныя пытанні. Напрыклад, цяжарныя жанчыны, за малым выключэннем, ад працы не вызваляліся, адсутнічала ахова працы. У Віцебскай акрузе толькі ў камунах «Іскра Доб-

рынская» і «Мір» прадастаўляўся дародавы і пасляродавы адпачынак працягласцю 1—1,5 мес. [69, л. 1]. Нягледзячы на тое што ўдзельная вага членаў калгасаў ва ўзросце звыш 60 гадоў (па стане на 1926 г.) была нязначнай, важную ролю набывалі пытанні сацыяльнага забеспячэння ў старасці. На 2-м Усебеларускім з'ездзе калгасаў (1928 г.) звярталася ўвага, акрамя таго, на неабходнасць выплат непрацаздольным членам калектываў у выпадку страты імі карміцеля [70, л. 80; 67, с. 28]. Усё гэта патрабавала арганізацыі грамадскіх фондаў, якія ствараліся шляхам адлічэнняў кожнай калектыўнай гаспадаркай устаноўленага працэнта са сваіх даходаў. Работу акруговых саюзаў сельгаскааперацыі ў дадзеным кірунку нельга не прызнаць неабходнай і пазітыўнай.

Сацыяльная накіраванасць размеркавання даходаў у калектывах аднак не заўсёды супадала з меркаваннямі сярэдняга сялянства, якое аб'ядноўвалася ў калектыўныя гаспадаркі. У другой палове 1920-х гг. асобныя з сялян былі незадаволены тым, што не ў поўнай ступені ўлічваўся пай, што ўносіўся серадняками. Другая ж частка калгаснікаў лічыла, што ў аснову аплаты павінен быць пакладзены толькі працоўны прынцып. У рэшце рэшт па меры далейшай уніфікацыі форм і статутаў калектыўных гаспадарак у СССР такі падыход перамог. І ўсё ж нельга не адзначыць, што ён наносіў значна большую шкоду, чым рознагалоссі ў калгасах з-за аплаты «па паях», таму што прадугледжваў фактычна адчужэнне вызначанай долі ўласнасці без якога-небудзь узнагароджання. Гэта, у сваю чаргу, нараджала ў сярэдняга сялянства недавер да калектыўных гаспадарак і ўжо першапачаткова звужала сацыяльную базу развіцця буйной вытворчасці ў вёсцы. Пры гэтым ігнараваўся вопыт шэрагу калгасаў, дзе аплата працы з улікам унесенай маёмасці прыносіла значны эфект.

Аналіз працэсу паступовага адчужэння членаў калектыўнай гаспадаркі ад абагульненай уласнасці прадугледжвае разгляд праблемы арганізацыі ў калгасах так званых «непадзельных фондаў». Рашэнне аб іх стварэнні было прынята ў чэрвені 1926 г. на 4-й сесіі Усесаюзнага савета сельскагаспадарчых калектываў і ўвайшло ў Закон «Аб калектыўных гаспадарках» (сакавік 1927 г.) [71, с. 590—597]. Яно дыктавалася імкненнем з боку дзяржаўных органаў захаваць дзяржмаёмасць, якая перадавалася калгасам, ад наступнага падзелу.

Нізкі ўзровень даходаў у калгасах БССР сярэдзіны 20-х гг. XX ст. абумовіў значную цякучасць складу калектыўных аб'яднанняў (у 1926/27 гаспадарчым годзе — 12 % ад усяго насельніцтва). У гэтых умовах фарміраванне «непадзельнага капіталу», які не падлягаў падзелу паміж членамі ні падчас асобных выхадаў, ні нават пры ліквідацыі калгасаў, разглядаўся як заклад стабільнасці калектыву і яго гаспадарчых поспехаў [58, с. 30; 72, с. 50].

Працэс адзяржаўлення кааператыўна-калгаснай уласнасці ў асноўных сваіх рысах акрэсліўся ўжо ў канцы 1920-х гг. Права ўласнасці прадугледжвае магчымасць свабоднага распараджэння не толькі сродкамі вытворчасці, але і атрыманай прадукцыяй (перапрацоўка, захоўванне ці непасрэдная рэалізацыя). Між тым з канца 1927 г. робяцца значныя намаганні, каб паставіць і збыт калгасамі сельскагаспадарчай прадукцыі пад поўны кантроль дзяржаўных і кааператыўных орга-

наў. З гэтай мэтай выпрабоўваліся розныя метады адміністрацыйнага ўздзеяння на калектыўныя гаспадаркі.

Закупачныя цэны на шэраг прадуктаў раслінаводства і жывёлагадоўлі (напрыклад, на зерне, малако і малочныя прадукты) не пакрывалі нават выдаткаў вытворчасці, таму калгасы імкнуліся значную частку сваёй прадукцыі рэалізоўваць праз прыватны рынак [73, с. 29; 74, л. 34, 36, 45, 47, 377]. Ва ўмовах неэквівалентнага абмену кантрактацыя паступова набывае абавязковы характар. У найбольшай ступені гэтыя абставіны праявіліся падчас чарговага хлебнага крызісу 1928/29 гаспадарчага года, калі галоўны ўпор быў зроблены на вынятак у калектыўных гаспадарак хлеба.

У лістападзе 1928 г. прымаецца пастанова праўлення Калгасцэнтра аб хлебанарыхтоўчай кампаніі, у якой прапаноўвалася «выявіць усе калгасы, якія адмовіліся ад здачы сваіх збожжавых лішкаў ці правялі толькі частковую здачу, і праз адпаведныя калгассаюзы прыняць меры да ліквідацыі такіх з'яў» [75, с. 9]. На месцах непасрэдная праца па кантрактацыі была даручана спецыяльным інспектарам па збыце і нарыхтоўках, якія літаральна спаганялі з калгасаў лішкі (а пасля — і неабходную частку сельскагаспадарчай прадукцыі). Ва ўмовах поўнай залежнасці калектыўных аб'яднанняў у сферы забеспячэння сродкамі вытворчасці ад дзяржаўных і кааператыўных органаў толькі асобныя калектывы выказвалі сваю нязгоду з рашэннем праўленняў акруговых калгассаюзаў [76, л. 30]. Апошнія, у сваю чаргу, прымянялі не толькі эканамічныя санкцыі. Кіраўніцтва Віцебскага акркалгассаюза ў канцы 1929 г., напрыклад, патрабавала роспуску і крымінальнага пакарання ўсіх праўленняў калгасаў, якія не выканалі дагавораў па кантрактацыі. Прымусовае выняцце ў калгасаў хлеба без уліку яго спажывецкага значэння для большасці рэгіёнаў рэспублікі надоўга затрымала станаўленне калектыўных гаспадарак як вытворцаў мяса-малочнай прадукцыі, а па меры разгортвання масавай калектывізацыі нанесла сур'ёзную шкоду развіццю жывёлагадоўлі ў цэлым.

Такім чынам, вопыт кааператыўна-калгаснага будаўніцтва ў 1921 — першай палове 1929 г. паказвае, што толькі ва ўмовах раўнапраўных эканамічных адносін паміж калектыўнымі гаспадаркамі і дзяржавай магчыма паспяховае функцыянаванне буйной калектыўнай вытворчасці ў сельскай гаспадарцы. Апошняе, аднак, прадугледжвае яшчэ адну не менш важную ўмову: рашэнне праблемы стымулявання індывідуальнай працы ў калектыве. Можна заўважыць, што асобныя элементы эканамічнага прымусу ў выглядзе адчужэння працаўніка ад створанага ім прадукту склаліся ўжо да пачатку масавай калектывізацыі. Гэта садзейнічала адсутнасці зацікаўленасці члена калектыўнай гаспадаркі ў павелічэнні значнай часткі даходу, якая ствралася непасрэдна яго працай, да назапашанага багацця і было выгадна ў рэшце рэшт толькі адміністрацыйна-каманднай сістэме, якая складвалася ў гэты перыяд.

Праведзены вышэй аналіз вытворчай дзейнасці камун, арцеляў, ТСЗ, арганізацыі працы і размеркавання ў іх з'яўляўся б схематычным і няпоўным без разгляду змен, якія адбываліся ў сацыяльнай псіхалогіі, і перш за ўсё ў эканамічных

паводзінах прадстаўнікоў розных сацыяльных груп, якія аб'ядналіся ў калектыўныя гаспадаркі [42, с. 303]. Вядома, якое вялікае значэнне надаваў дадзенаму факту А. В. Чаянаў. «Праца ў адрозненне ад гульні таму і называецца працай, што яна цяжкая для арганізма яе выконваючага і патрабуе значнага напружання валявых цэнтраў для свайго працягу, — падкрэсліваў ён. — Для таго каб паказанае напружанне волі мела месца, неабходна, каб яно чым-небудзь стымулявалася». Такое стымуляванне, на думку А. В. Чаянава, магло ажыццяўляцца трыма шляхамі: 1) самапрымусам (у адзінаасобнай працоўнай гаспадарцы); 2) знешнім прымусам (з боку прадпрымальніка, калектыву); 3) эканамічнай зацікаўленасцю [42, с. 304—306]. Папярэдні аналіз дазваляе сцвярджаць, што пошукі эфектыўных метадаў маральнага і матэрыяльнага стымулявання якаснай працы ў калгасах не прынеслі пажаданага выніку. Разгледзім, наколькі паспяхова ажыццяўляўся ў іх прымус да працы з боку калектыву. Ён мог быць акрэслены: 1) грамадскай думкай; 2) адміністрацыйным ці ідэйным уздзеяннем кіраўніцтва.

Першы варыянт меў месца толькі ў выпадку высокай самасвядомасці і ідэйнай перакананасці пераважнай большасці членаў калектыўнай гаспадаркі. Да прыкладу, такую характарыстыку неаднойчы атрымлівалі беларусы — палітычныя эмігранты з ЗША [77, л. 26]. Адна з такіх груп, у мінулым рабочых завода Форда, арганізавала камуну ў Ігуменскім павеце. Дзякуючы згуртаванасці калектыў пераадолеў найцяжэйшы перыяд арганізацыйнага станаўлення. Ужо атрымаўшы дыплом I ступені на Усебеларускім конкурсе, камунары пісалі: «Мы ведалі, што шлях да перамогі ідзе праз шэраг цяжкасцей, і цвёрда вырашылі перад гэтымі цяжкасцямі не гнуць спіны». З 1922 па 1926 г. ураджаі збожжавых у дадзенай калектыўнай гаспадарцы павысіліся з 24 да 90 пудоў. За дзясяткі вёрстаў прыходзілі, прыязджалі сяляне глядзець на працу трактара, які з'явіўся ўпершыню ў раёне ў 1924 г. на зямлі камуны [78, с. 25].

Імкненне да ідэалаў аднак прадугледжвае ўсведамленне рэальных шляхоў руху да іх, а апошняе немагчыма без дастатковага ўзроўню культуры, адукацыі. Ступень культурнага і інтэлектуальнага развіцця селяніна перадвызначае і яго эканамічныя паводзіны. Разгляд гэтых аспектаў набывае, такім чынам, вызначальны сэнс.

Аналіз умоў быту, стану адукацыі ў калектыўных гаспадарках паказвае, што найбольш перадавыя калгасы дабіліся ў гэтай сферы значных вынікаў. Напрыклад, у сельгаскамуне «Зорка» Пухавіцкага раёна, што ўзгадвалася вышэй, функцыянавалі агульная сталовая, дзіцячыя яслі, вячэрняя школа для зімовых заняткаў з дарослымі, бібліятэка і драматычны гурток [79, с. 26]. У камуны імя Карла Лібкнехта Быхаўскага раёна меліся свой клуб, бібліятэка, радыё з гучнагаварыцелем. У зімовы перыяд камунары ўдзельнічалі ў шматлікіх гуртках: драматычным, харавым, палітычным і інш. Драмгурток ставіў спектаклі сваімі сіламі як на сцэне камуны, так і ў бліжэйшых вёсках — ад 16 да 20 спектакляў штогод. Сельгаскамуна імя Карла Лібкнехта з'яўлялася адзіным калгасам Беларусі да 1930 г., дзе дзейнічаў водаправод [58, с. 59, 67—69]. Дзіцячыя яслі з арганізаваным харчаваннем меліся і ў камуне «Чырвоны сцяг» Гарадокскага раёна [59, с. 40].

Аднак згаданыя вышэй калектывы з'яўляліся толькі асобнымі выключэннямі, паказальнымі «маякамі». Аб гэтым сведчаць, напрыклад, вынікі абследавання калгасаў камісіяй РСІ ў 1926 г. У пераважнай большасці наведаных калектыўных гаспадарак адсутнічалі лазні, пральні. Недахоп жылой плошчы нараджаў цесна-ту, антысанітарыю. На нарадзе Віцебскага акруговага камітэта КП(б)Б падкрэслівалася, што «бытавыя ўмовы ў калгасах не адрозніваюцца ад бытавых умоваў навакольнага сялянства» [80, л. 15, 31, 32, 60, 285, 318, 338, 440, 551]. Нярэдкімі ў калектыўных гаспадарках з'яўляліся выпадкі п'янства, пры гэтым яны назіраліся як у сельгасарцелях і ТСЗ, так і ў камунах [81, л. 8, 9; 82, л. 41, 42].

У 1926/27 гаспадарчым годзе ў 315 калгасах налічвалася толькі 17 двухгадовых школ і адна сямігодка. Невялікая колькасць дзяцей наведвала таксама школы, якія дзейнічалі ў суседніх вёсках і пасёлках [58, с. 28]. Калі ўлічыць пры гэтым значную змену складу калектыўных гаспадарак, то ўяўляецца зусім заканамерным надзвычайна нізкі ўзровень адукацыі членаў калгасаў. Па стане на 1925 г. колькасць непісьменных у калектыўных аб'яднаннях розных акруг БССР вагалася ў межах ад 40 % — у Мінскай да 57 % — у Віцебскай акругах. Найбольшая колькасць іх была засяроджана ў камунах. Пры параўнальна аднастайным складзе сельгаскамун і арцеляў гэта дазваляе сцвярджаць, што вера ў магчымасць пабудовы камунізму ў межах асобных калектываў захапляла перш за ўсё малаадукаваныя пласты насельніцтва і насіла хутчэй фанатычны, чым усвядомлены, характар. Выключэннем былі камунары Мінскай акругі. Сярод іх працэнт непісьменных быў самым нізкім па калгасах Беларусі, паколькі менавіта ў дадзенай акрузе арганізоўвалася ў сельскагаспадарчыя камуны большасць палітэмігрантаў з ЗША, у мінулым працоўных.

Не адбылося істотных змен ва ўзроўні адукацыі членаў калектыўных гаспадарак і ў наступныя гады. У 1928 г. на 2-м Усебеларускім з'ездзе калгасаў асобнымі выступоўцамі звярталася ўвага на існаванне ў калгасах да 40 % непісьменных [67, с. 23]. Згодна са звесткамі цэнтральнай секцыі калгасаў, датаванымі лістападам гэтага года, агульны працэнт непісьменных членаў у калектыўных гаспадарках ва ўзросце звыш 8 гадоў складаў ад 39,3 — у Мазырскай акрузе да 52,2 — у Віцебскай [83, л. 288]. Такое становішча часта ўскладнялася слабым імкненнем моладзі да адукацыі, нізкім узроўнем культурных запатрабаванняў насельніцтва калектыўных гаспадарак [84, л. 18].

Ва ўмовах нізкага адукацыйнага і культурнага ўзроўню членаў калектыўных гаспадарак узрастала роля кіраўнікоў аб'яднанняў. Шматлікія абследаванні калгасаў у сярэдзіне 1920-х гг. паказалі, што наяўнасць таленавітых арганізатараў, якія карыстаюцца аўтарытэтам на чале калектываў, у большасці выпадкаў служыла залогам паспяховага гаспадарчага развіцця апошніх [85, с. 34]. Цікавы калектыўны партрэт кіраўнікоў камун, арцеляў і ТСЗ. Гэта перш за ўсё маладыя мужчыны, сярэдні ўзрост якіх складаў прыкладна 36 гадоў, у большасці выпадкаў сямейныя, якія адслужылі ўстаноўлены тэрмін у Чырвонай арміі. Узровень іх адукацыі не адпавядаў ступені складанасці тых задач, якія ім прыходзілася вырашаць, тым не менш быў некалькі вышэйшы, чым насельніцтва калгасаў у цэлым.

У той жа час нельга перабольшваць магчымасць прымусу да працы сілай аўтарытэту кіраўнікоў. Тут можна згадзіцца з вядомым даследчыкам Б. Ф. Поршневым, які працаваў на мяжы псіхалогіі і гісторыі, у тым, што «ў выніку ўнушаць людзям можна толькі тое, што ўвогуле адпавядае кірунку іх патрабаванняў і інтарэсаў, іх перакананняў і волі, а значыць, самы аўтарытэт нараджаецца ў калектыве, агульнасцю і псіхічна індуцыраваны імі» [86, с. 166]. Можна звярнуць увагу на выпадкі, калі члены калгаса адстойвалі свайго кіраўніка не ў выніку дзелавых якасцей апошняга, а таму, што ён у найбольшай ступені задавальняў іх патрабаванні [87, л. 28—31; 88, л. 26, 82].

Зразумела, у выпадку «дыктату» (індывідуальнага альбо калектыўнага) прымус да працы дасягаўся ўжо не сілай аўтарытэту, якой-небудзь зацікаўленасцю, а сілай страху. Такая сістэма індуцыравала адсутнасць крытыкі, пакаранне за такую крытыку і ў той жа час не заўсёды перашкаджала паспяховаму развіццю вытворчасці (прыклад камуны імя Карла Лібкнехта Быхаўскага раёна) [89, л. 40]. Аднак калі з боку старшынь калгасаў назіралася імкненне да нажывы, то дадзенае калектыўнае аб'яднанне паступова прыходзіла да стану гаспадарчага развалу, раздзіралася сваркамі і звадкамі паміж яго членамі [90, л. 44; 91, л. 28; 92, л. 8].

Пры вывучэнні сацыяльнага складу праўленняў заўважана вялікае прадстаўніцтва сярэдняга сялянства. Яно асабліва кантрастнае на агульным фоне нізкай удзельнай вагі серадлякоў сярод насельніцтва калгасаў (гл. дадатак, табл. 4). Такое становішча можна растлумачыць толькі асаблівасцямі сацыяльнай псіхалогіі сялянства, якое пераважала ў калектыўных гаспадарках. Яшчэ Г. Успенскі заўважыў, што «вясковы чалавек цэніцца ва ўсіх сваіх грамадскіх і прыватных адносінах» на падставе «сельскагаспадарчых ідэалаў» [93, с. 48]. І ў калектывах (акрамя тых, дзе пераважаў гарадскі ці сялянскі люмпен), такім чынам, павага надавалася тым, хто ўжо змог дасягнуць якіх-небудзь поспехаў у сваёй адзінаасобнай гаспадарцы.

Да пачатку 1920-х гг. характэрныя шматлікія зямельныя спрэчкі паміж калгасамі і навакольным сялянскім насельніцтвам. Гэтыя супярэчнасці шмат у чым былі народжаны неземлеўпарадкаванасцю калектыўных гаспадарак, часцяком іх арганізацыяй на зямлі, якую сяляне ўжо апрацоўвалі і лічылі сваёй. З-за гэтага меліся нават выпадкі падпалаў пабудоў калектываў. Абвастрала адносіны бюракратычная цяганіна, калі на розных узроўнях кіравання прымаліся ўзаемавыключныя рашэнні [94, л. 2; 95, л. 15, 16]. Часам арганізоўваліся калгасы беднейшымі пластамі вёскі, але зямлю яны здавалі ў арэнду на кабальных умовах, самі «не працавалі, а толькі хадзілі па полі і глядзелі, як працавалі сяляне» [96].

Аналіз існуючых крыніц дазваляе сцвярджаць, што характар узаемаадносін паміж мясцовым насельніцтвам і калгасамі ў рэшце рэшт вызначаўся вынікамі вытворчай дзейнасці апошніх (па-за залежнасцю ад іх нацыянальнага складу). Калектывы, якія здолелі ў цяжкіх умовах дабіцца значных поспехаў у сваім гаспадарчым развіцці, нязменна карысталіся аўтарытэтам сярод навакольнага сялянства [97, л. 18; 98, с. 175; 99, л. 45]. Калі ж у калектыўных гаспадарках не маглі арганізаваць вытворчасць пэўным чынам, назіралася зваротнае [85, с. 33]. Самае

вялікае абурэнне выклікалі ў сялян тыя калгасы, члены якіх пражывалі ў мястэчках і займаліся гандлем. Несабраны ўраджай, які заставаўся на палях, мясцовае насельніцтва, дачакаўшыся замаразкаў, скармлівала жывёле [100, л. 4; 101, л. 21]. Разглядаючы скаргі калектываў на варожыя адносіны навакольнага сялянства (патравы, захоп лугоў і г. д.), неабходна ўлічваць, што яны шмат у чым інспіраваліся квітнеючай у шэрагу калгасаў безгаспадарчасцю. У такіх сітуацыях праяўлялася патрыярхальнае ўспрыняцце ўласнасці, якое захавалася ў сялян: яна заўсёды павінна каму-небудзь належаць і выкарыстоўвацца, да яе павінна прыкладацца асабістая праца. Усё, да чаго праца не была прыкладзена, напрыклад безгаспадарны луг, несабраны ўраджай, лічылася «нічыім», карыстанне гэтым нікому не забаранялася.

Пэўныя моманты аналагічных адносін да ўласнасці можна прасачыць і ў калгасах. Падзел унутры калектываў усёй маёмасці на «сваё» (нажытае працай) і «агульнае» (атрыманыя ад дзяржавы пабудовы, крэдыты і г. д.) рабіўся заўважным ужо на пачатковым этапе існавання аб'яднанняў. Прадугледжвалася, што ён будзе зжывацца па меры развіцця калектыўных гаспадарак і росту самасвядомасці яго членаў. Аднак да канца 20-х гг. XX ст. стала відавочным, што такі працэс па меншай меры не вельмі скарацечны, калі магчымы ўвогуле. І на 2-м Усебеларускім з'ездзе калгасаў у 1928 г. выступоўцы звярталі ўвагу на тое, што члены калектываў разлічваюць перш за ўсё на сваю гаспадарку і зусім нядбайна адносяцца да калгаснай маёмасці [67, с. 17, 19; 102, л. 275].

Нявызначанасць арганізацыйных пытанняў і форм, адсутнасць матывацыі падштурхоўвалі да таго, каб, атрымаўшы ў калгасе зямлю, перайсці да індывідуальнага гаспадарання. Дадзеная тэндэнцыя была характэрная не толькі для пачатку 20-х гг. XX ст. У 1927 г. А. Сімховіч і М. Чыж, абследаваўшы прычыны распаду калектыўных аб'яднанняў, пісалі: «Многія выяўлялі моцнае жаданне атрымаць хаця б мінімальную норму зямлі, толькі б жыць самастойна, быць самому сабе гаспадаром». А. Сімховіч і М. Чыж вымушаны былі прызнаць, што «зацікаўленасць членаў калектыву ў выніках гаспадаркі не дасягае ўзроўню зацікаўленасці адзінаасобніка, бо сувязь між выдаткамі працы і яго вынікамі больш моцна адчуваецца ў гаспадарцы адзінаасобнай» [62, с. 52].

Можна звярнуць увагу на наяўнасць асобных груп у калгасах, дзе ўстойлівай прыхільнасці да ўласнасці не назіралася. Такімі з'яўляліся, напрыклад, сектанцкія арцелі [85, с. 34; 103, л. 402]. Больш хутка адмаўляліся ад асабістай гаспадаркі былыя чырвонаармейцы [104, с. 36, 37]. Размеркаваннем дэмабілізаваных чырвонаармейцаў па калектыўных аб'яднаннях займаліся непасрэдна акруговыя секцыі калгасаў [105, л. 367]. У асобных крыніцах адзначаецца, што «псіхалагічна хутчэй засвойвае формы і выгоды калектыўнай працы» яўрэйскае насельніцтва [106, л. 97]. У той жа час у выступленні на 1-й Усесаюзнай нарадзе сельскагаспадарчых калектываў прадстаўнік таварыства распаўсюджання земляробства сярод яўрэяў гаварыў, што «каня лягчэй абагуліць, асабліва калі неабходна на сям'ю больш аднаго і менш двух коней, а карову нельга, таму як толькі яе абагульваюць, яна страчвае малако» [107, с. 72].

Працоўная і прадукцыйная жывёла абагульнялася не толькі ў калгасах БССР, але і ў вытворчых калектывах іншых рэспублік у апошнюю чаргу [108, с. 283, 284]. У некаторых камунах, каб пазбавіцца ад прыхільнасці камунараў да прыведзеных з сабой каня ці каровы, апошніх абменьвалі, «каб усё было камунальнае», «каб яны не мулялі вочы» [109, с. 13]. Разам з тым рэальны ўлік сацыяльна-псіхалагічнага фактару ў шматлікіх калектыўных гаспадарках прыводзіў да таго, што «прадукцыйная жывёла знаходзілася ў асабістым карыстанні ці абагульнялася, але нагляд за ёй захоўваўся індывідуальны» [110, л. 45, 48, 52; 111, л. 6, 13, 49]. Да таго ж на 1 ліпеня 1928 г. 64,5 % уступіўшых у сельгасарцель не мелі ніводнай каровы. У камунах гэты паказчык быў яшчэ вышэйшы [112, с. 10, 69].

У другой палове 1929 г., калі пачынаецца фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі, узроўню абагулення і памераў калгасаў, малочныя арцелі і шэраг іншых кааператыўных форм былі адкінуты як непатрэбныя. Усе пазначаныя псіхалагічныя аспекты не ўлічваліся. Сялянства прымусілі пераскокваць праз шматлікія прамежкавыя стадыі, часам адразу да камун. Вынікам такога прымусу з'явілася знішчэнне толькі да мая 1930 г. больш чвэрці ўсёй буйной рагатай жывёлы. Яе пагалоўе ў БССР было ўзноўлена толькі да 1941 г., у тым ліку кароў — толькі ў пачатку 1960-х гг. [113, с. 416; 114, с. 134; 115, с. 39].

Пад калектывісцкія адносіны ў асяроддзі непісьменных і напаўпісьменных сялян, якія ўкараняліся ідэалагічнымі метадамі, не была падведзена эканамічная аснова. Таму шырокая прапаганда пераваг калектыўнага гаспадарання перад дробным, адзінаасобным нарадзіла такі псіхалагічны феномен, калі частка сялян меркавала, што ўжо самое аб'яднанне ў калгас запяспечыць ім бязбеднае існаванне. Гэта культывавала адносіны сацыяльнага ўтрыманства, узмацняла безгаспадарчасць і шэраг іншых негатыўных момантаў у дзейнасці калектыўных гаспадарак. На гэту сацыяльна-псіхалагічную з'яву, прычым у шырокіх маштабах, звярталася ўвага ўжо ў верасні 1929 г. на Пленуме ЦК КП(б)Б [116, с. 93, 94].

Індывідуальная гаспадарка сама па сабе ўтрымлівала шэраг абмежаванняў. Вёска, якая ў 1920-я гг. асераднячвалася, накіроўвала значную частку прадукцыі не на рынак, а на ўласнае спажыванне. Лозунг «Багацейце!» з прычын не толькі эканамічных, але і сацыяльна-псіхалагічных у сялянства падтрымкі не знайшоў. Неабходнасць развіцця кааперsuccessful форм арганізацыі гаспадаркі ў гэтых умовах акрэслівалася ўсё больш выразна па меры росту гарадскога насельніцтва і індустрыялізацыі. Але дадзены факт быў асэнсаваны не адразу. Ва ўмовах крызісу хлебанарыхтовак дадатковыя аргументы атрымалі тыя, хто выступаў за адміністрацыйныя, выключна прымусовыя метады. Сялянства Беларусі ў выніку страчвала сваіх родных і блізкіх, сваю маёмасць і выразна супрацьстаяла гэтаму прымусу. У рэшце рэшт перамаглі стратэгіі выжывання, якія ў найбольшай ступені былі задзейнічаны ва ўмовах, калі дзяржава зрабіла ў гэтым дачыненні крок насустрач. Сялянства праз прысядзібныя надзелы атрымала не толькі пэўныя гарантыі стабільнасці, але і магчымасць выявіць сябе як гаспадара. Гэта паступова садзейнічала адраджэнню мяса-малочнай гаспадаркі і інтэнсіўных культур, якія на пэўны час перамясціліся ў асабісты сектар сельскай гаспадаркі.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. *Данилова Л. В.* Природное и социальное в крестьянском хозяйстве // Крестьяноведение. Теория. История. Современность. Ежегодник. 1997 / под ред. В. Данилова, Т. Шанина. М., 1997.
2. *Есикова М. М.* Влияние агропропаганды на повышение эффективности сельскохозяйственного производства в годы нэпа // Перспективы науки. 2010. № 12 (14). С. 56—58.
3. *Довнар-Запольский М. В.* Исследования и статьи. Т. 1 : Этнография и социология, обычное право, статистика, белорусская письменность. Киев, 1909. 488 с.
4. Советская деревня глазами ВЧК — ОГПУ — НКВД. 1918—1939. Документы и материалы : в 4 т. / отв. ред. : А. Берелович, В. Данилов ; отв. сост. : Л. Борисова [и др.]. М. : РОССПЭН, 2000. Т. 2 : 1923—1929 гг. 1168 с.
5. *Большаков А. М.* Советская деревня (1917—1925 гг.) : экономика и быт. 2-е изд., знач. доп. Л. : Раб. изд-во «Прибой», 1925.
6. Менталитет и аграрное развитие России (XIX—XX вв.) : материалы междунар. конф. Москва, 14—15 июня 1994 г. М. : РОССПЭН, 1996. 440 с.
7. Современный философский словарь / под ред В. Е. Кемерова. Париж, Лондон, Франкфурт-на-Майне. Хайне, 1999. С. 477.
8. *Кабытов П. С., Козлов В. А., Литвак Б. Г.* Русское крестьянство: этапы духовного освобождения. М., 1988.
9. *Кондратьев Н. Д.* Основные проблемы экономической статики и динамики: предварительный эскиз. М. : Наука, 1991. 567 с. (Серия «Социологическое наследие»).
10. *Тарантул В. З.* Геном человека: энциклопедия, написанная четырьмя буквами. М. : Языки славян. культуры, 2003. 510 с.
11. *Ольсевич Ю. Я.* Психологические основы экономического поведения. М. : ИНФРА, 2009.
12. *Ковальченко И. Д.* Методы исторического исследования. Отделение историко-филологических наук. 2-е изд., доп. М. : Наука, 2003. Приложение. С. 454—481.
13. *Толстой Л. Н.* Письма 1907 г. // Полн. собр. соч. М. : Госиздат, 1957. Т. 61. 423 с.
14. *Сорокин А. Н.*Искушение будущим и уроки прошлого. Белорусская деревня: от Декрета до Кодекса о земле (1917—1990-е годы). Минск : Право и экономика, 2008. 442 с.
15. *Постников В. А.* Южно-русское крестьянство. М., 1891. 391 с.
16. *Сухова О. А.* «Общинная революция» в России: социальная психология и поведение крестьянства в первые десятилетия XX века (по материалам Среднего Поволжья). Пенза, 2007.
17. *Данилов В. П.* Крестьянские миры России. М. : Аспект-Пресс, 1996. 348 с.
18. *Данилова Л. В., Данилов В. П.* Крестьянская ментальность и община // Менталитет и аграрное развитие России: XIX—XX вв. : материалы междунар. конф. (Москва, 14—15 июня 1994 г.). М. : РОССПЭН, 1996. С. 22—39.
19. *Милов Л. В.* Великорусский пахарь и особенности российского исторического процесса. М. : РОССПЭН, 1998. 573 с.
20. *Данилова Л. В.* Природное и социальное в крестьянском хозяйстве // Крестьяноведение. Теория. История. Современность. Ежегодник. 1997. М., 1997. С. 34—39;
21. *Шанин Т. Т.* Революция как момент истины: Россия 1905—1907 — 1917—1922 годы / пер. с англ. Е. М. Ковалева. М. : Весь мир, 1997. 560 с.
22. *Святец Ю. А.* Государственная собственность на землю и крестьянское хозяйство. Исторический опыт НЭПа на Украине // Экономическая история России 19—20 вв.: современный взгляд. М., 2001. С. 158—175. (Государство и экономика).
23. Зямля стаіць пасярод свету... Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1 / уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. Мінск : Маст. літ., 1996. 591 с.
24. Устав, списки инвентаря и членов, доклады и акты об обследовании и другие материалы сельхозкоммуны «Звезда» Новосельской волости Игуменского уезда // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 547.
25. *Кириллов И. А.* Очерки землеустройства за три года революции (1917—1920 гг.). Пг., 1922. 261 с.
26. Стенограмма XII съезда ЦК КП Белоруссии. 5—10 февраля 1929 г., на 637 л. // НАРБ. Ф. 4п. Воп 1. Спр. 4318.
27. Крестьянские движения 1902 года (новые материалы) / Центрархив. М. ; СПб. : Гос. изд-во, 1923. Вып. 3. 129 с. (Материалы по истории крестьянских движений в России).

28. Письмо селькора Е. Г. Ц. в редакцию «Крестьянской газеты» // ДАРФ. Ф. Р5446. Воп. 55. Спр. 1834.

29. *Бяспалая М. А.* Эканамічнае і сацыякультурнае развіццё беларускай вёскі ў гады нэпа (1921—1927). Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. 325 с.

30. *Калиновская М. М.* Становление и развитие социальной инфраструктуры института охраны материнства и детства в БССР в 1920—1930-е гг. // Ученые записки. 2011. Т. 12. С. 21—28.

31. *Беляцкий Д. П.* Охрана материнства и детства в Советской Белоруссии [Текст; Общество по распространению полит. и науч. знаний Белорус. ССР]. Минск, 1957. 34 с.

32. *Шишко Е. И.* История развития охраны материнства и детства. Минск : Изд-во Минск. гос. мед. ин-та, 1974. 20 с.

33. *Навіцкі У.* Жанчына ў савецкім грамадстве: новы погляд на праблему // Штогоднік Ін-та гісторыі Беларусі. Мінск, 1999. С. 93–103.

34. *Кульпанович О. А.* От союзов взаимопомощи к профсоюзу работников здравоохранения (к 105-летию Белорусского профсоюза работников здравоохранения) // Вопр. организации и информатизации здравоохранения. 2011. № 3.

35. Памяць і слава : Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1921—1941 / склад. : С. М. Ходзін, М. Ф. Шумейка, А. А. Яноўскі ; рэдкал. : В. І. Стражаў (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : БДУ, 2006. 383 с.

36. Демографическая модернизация России, 1900–2000 / под ред. А. Г. Вишневского. М. : Новое изд-во, 2006. 608 с.

37. *Злотников Г.* Демографическая наука Беларуси между революцией и войной // Социология. 2011. № 2. С. 91—100.

38. *Кузьма Чорны.* Радасць жанчыны / Беларуская Палічка [Электронны рэсурс]. URL: knihi.com/Kuzma_Corny/Radasc_zancyny.html (дата звароту: 23.09.2013).

39. Начальнику УПО ПП ОГУПУ БВО. Докладная записка // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 21. Спр. 208.

40. История сталинского ГУЛАГа. Конец 1920-х — первая половина 1950-х гг. : собр. док. : в 7 т. / отв. ред. : Н. Верт, С. В. Мироненко. М. : РОССПЭН, 2004. Т. 1 : Массовые репрессии в СССР. 728 с.

41. Трагедия советской деревни. Коллективизация и раскулачивание. 1927—1939 : в 5 т. / под ред. В. Данилова [и др.] ; отв. ред. И. Зеленин. М. : РОССПЭН, 2001. Т. 3 : Конец 1930—1933. 1008 с.

42. *Чаянов А. В.* Основные идеи и формы организации сельскохозяйственной кооперации. 2-е изд. М. : Изд. Книгосоюза, 1927. 383 с.

43. *Клімко М.* Будаўніцтва калгасу // Сел. і ляс. гасп-ка. 1928. № 3—4.

44. Опросные листы обследования состояния коллективных хозяйств БССР на 1 октября 1924 г. и 23 января 1925 г. // НАРБ. Ф. 334. Воп. 2. Спр. 33.

45. Бюллетень 1-го Всесоюзного совещания с/х коллективов (коммун, артелей и т-в по общественной обработке земли). 1925. № 2. С. 39.

46. Доклад и акты по обследованию состояния сельскохозяйственных земледельческих коммун и коллективных хозяйств Могилевского округа // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 625.

47. Сведения об обследовании состояния совхозов и колхозов БССР за 1927 г. // НАРБ. Ф. 30. Воп. 2. Спр. 1787.

48. Белсельсаюз: справаздача за 1926/27 апэрацыйны год (6-ты год дзейнасці). Менск, 1928. 93 с.

49. Коллективист. 1927. № 19—20. С. 31.

50. Доклад и акты по обследованию состояния сельскохозяйственных земледельческих коммун и коллективных хозяйств Могилевского округа // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 625. Л. 11.

51. Коллекция малокомплектных фондов. Коммуна «Авангард» Смолевичского района // ДАМВ. Ф. 1414. Воп. 1. Спр. 12.

52. Победа колхозного строя в Белорусской ССР / М. П. Костюк [и др.]. Минск : Наука и техника, 1981. 448 с.

53. *Туркін С.* Калгаснае будаўніцтва БССР // Плуг. 1928. № 12.

54. Всероссийский союз сельскохозяйственной кооперации // РДАЭ. Ф. 4106. Воп. 14. Спр. 39.

55. *Куликов П.* Итоги и перспективы развития колхозов // На аграрном фронте. 1927. № 11—12.

56. Материалы к докладу Совета Народных Комиссаров Б.С.С.Р. Совету Народных Комиссаров С.С.С.Р. Минск : Изд. Упр. Делами СНК БССР, 1928. 248 с.

57. Коммуна «Авангард» Смолевичского района // ДАМВ. Ф. 981. Вап. 1. Спр. 1.

58. *Кудзінаў С.* Камуна імя Карла Лібкнэхта. Мінск, 1928. С. 24.

59. *Клімко М.* Будаўніцтва і праца камуны «Чырвоны Сьцяг» (Кароткая манаграфія) // Сел. і ляс. гасп-ка. 1928. № 3—4. С. 30—39.

60. Всероссийский союз сельскохозяйственной кооперации // РДАЭ. Ф. 4106. Воп. 14. Спр. 5.

61. *Мядзьведзкі П. Я.* Пра становішча калгасаў // Бальшавік Беларусі. 1929. № 2—3. С. 34—45.

62. *Симхович А.*, *Чиж М.* Сельскохозяйственные коллективы БССР (колхозы, коммуны, артели и товарищества по общественной обработке земли) // Сов. стр-во. 1927. № 6. С. 49—55.

63. Доклад и акты по обследованию состояния сельскохозяйственных земледельческих коммун и коллективных хозяйств Могилевского округа // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 625.

64. Сельскохозяйственная производственная артель «Надежда» Минского уезда // ДАМВ. Ф. 1403. Воп. I. Спр. I.

65. Всероссийский союз сельскохозяйственной кооперации // РДАЭ. Ф. 4106. Воп. 14. Спр. 39.

66. Типовой устав сельскохозяйственной коммуны, Инструкция по образованию группового объединения сельскохозяйственных коллективов // РДАЭ. Ф. 7446. Воп. 15. Спр. I.

67. 2-гі Усебеларускі з'езд калгасаў (кастрычнік 1928 г.). Менск, 1928.

68. *Лук'янчык А.* Увага калгаснаму будаўніцтву (да вынікаў 2-га зьезду калгасаў Менскае акругі) // Бальшавік Беларусі. 1928. № 8. С. 55—59.

69. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов (окрколхозсоюз) // ДАВВ. Ф. 319. Воп.1. Спр. 78.

70. Акты инспекторов РКИ БССР об обследовании колхозов БССР по состоянию на 1 сентября 1926 г. // НАРБ. Ф. 101. Воп. I. Спр. 2598.

71. Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. М., 1967. Т. 1 : 1918—1928.

72. Состояние колхозов Полотчины // Кооперацыйнае жыцьцё. 1926. № 13—14 (31—32). С. 50.

73. *Агеяў Л.* Жывёлагадоўля і перспектывы яе развіцьця ў калгасах БССР // Сел. і ляс. гасп-ка. 1928. № 3—4. С. 22—34.

74. Гомельский окружной союз сельскохозяйственных коллективов, машинных, поселковых и мелиоративных товариществ (Гомколхозсоюз) // ДАГВ. Ф. 138. Воп. 1. Спр. 17.

75. Колхозцентр: Информационный бюллетень. 1928. № 1. С. 9.

76. Планы развития организации колхозов и первичных производственных объединений; сведения о состоянии колхозов Брагинского и Будо-Кошелевского районов. 10 августа 1928 — 6 октября 1929 г., на 375 л. // ДАГВ. Ф. 138. Воп. 1. Спр. 17.

77. Народный Комиссариат Земледелия (Наркомзем) БССР (совр. Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь) // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 625.

78. Не на Форда, а на себя работаем (Коммуна «Звезда» Пуховичского района, БССР) // Коллективист. 1927. № 15—16 (46—47). С. 25.

79. Коллективист. 1927. № 15—16 (46—47). С. 26.

80. Акты инспекторов РКИ БССР об обследовании колхозов БССР по состоянию на 1 сентября 1926 г. // НАРБ. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 2598.

81. Дело о работе сельскохозяйственной производственной коммуны «Звезда» Минского уезда // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 177.

82. Протоколы заседаний правления Минской окружной секции колхозов и Минского окрколхозсоюза // НАРБ. Ф. 338. Воп. 2. Спр. 1а.

83. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов (окрколхозсоюз) // ДАВВ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 35.

84. Витебский окружной союз сельскохозяйственных кустарно-промысловых и кредитных кооперативов (окрсельсоюз) // ДАВВ. Ф. 122. Воп. 1. Спр. 42.

85. Отчет Гомельской губернской контрольной комиссии РКП(б) XIII губернской партконференции. 1924 — ноябрь 1925. Гомель : Полеспечать, 1925. 126 с.

86. *Поршнев Б. Ф.* Социальная психология и история. М., 1979. С. 166.

87. Земельное управление исполнительного комитета Витебского губернского совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов (губземуправление) // ДАВВ. Ф. 14. Воп. 1. Спр. 1014.

88. Полесский союз сельскохозяйственных, кредитных и кустарно-промысловых кооперативов (Полессельсоюз) // ДАГВ. Ф. 69. Воп. 1. Спр. 41.

89. Доклад и акты по обследованию состояния сельскохозяйственных земледельческих коммун и коллективных хозяйств Могилевского округа // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 625.

90. Акты обследования состояния еврейских сельскохозяйственных артелей Бобруйского, Борисовского и Полоцкого округов // НАРБ. Ф. 11. Воп. 2. Спр. 8.
91. Земельное управление исполнительного комитета Витебского губернского совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов (губземуправление) // ДАВВ. Ф. 14. Воп.1. Спр. 1014.
92. Земельный отдел исполнительного комитета Витебского окружного Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов // ДАВВ. Ф. 71. Воп. 1. Спр. 653.
93. *Успенский Г. И.* Крестьянин и крестьянский труд // Собр. соч. : в 9 т. М., 1956. Т. 5. С. 48.
94. Земельное управление исполнительного комитета Гомельского губернского совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов (губземуправление) // ДАГВ. Ф. 13. Воп. 1. Спр. 1712.
95. Земельное управление исполнительного комитета Гомельского губернского совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов (губземуправление) // ДАГВ. Ф. 13. Воп. 1. Спр. 1757.
96. Савецкая Беларусь. 1925. 4 лют., 25 сак., 26 сак.
97. Устав, описание и списки членов сельхозартели «Единение» Паричской волости Бобруйского уезда и переписка с ВЦИК, ЦИК БССР, Бобруйским уездземотделом и др. учреждениями о ее ликвидации // НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 622.
98. Подготовка сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР. С. 175.
99. Акты обследования состояния еврейских сельскохозяйственных артелей Бобруйского, Борисовского и Полоцкого округов // НАРБ. Ф. 11. Воп. 2. Спр. 8.
100. Анкеты посемейного учета трудящихся евреев Витебского округа, желающих заняться земледелием // НАРБ. Ф. 11. Воп. 1. Спр. 125.
101. Акты обследования состояния еврейских сельскохозяйственных артелей Бобруйского, Борисовского и Полоцкого округов // НАРБ. Ф. 11. Воп. 2. Спр. 8.
102. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов «Витокрколсоюз», г. Витебск Витебского округа (с 26.07.1930 — БССР) // ДАВВ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 16.
103. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов (окрколхозсоюз) // ДАВВ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 35.
104. Красная армия готовит колхозников // Коллективист. 1928. № 19 (74).
105. Витебский окружной союз сельскохозяйственных коллективов (окрколхозсоюз) // ДАВВ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 35.
106. План работы отдела местного обслуживания Белсельсоюза на 1925—1926 гг., отчеты и доклады Белсельсоюза о развитии сети сельскохозяйственной кооперации Борисовского и Минского округов за 1924—1925 гг., сметы расходов отдела местного обслуживания Белсельсоюза и Минского окружного молочно-животноводческого товарищества на 1925—1926 гг. // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 468.
107. Бюллетень 1-го Всесоюзного совещания с.-х. коллективов. 1925. № 4. С. 72.
108. *Данилов В. П.* Советская доколхозная деревня: население, землепользование, хозяйство. М. : Наука, 1977. 318 с.
109. *Ерохин М. М.* Что дала коммуна беднякам. М., 1925.
110. Сведения о бюджетном обследовании артелей, коммун, совхозов, товариществ по совместной обработке земли Витебского, Гомельского и Оршанского округов за 1927 г. // НАРБ. Ф. 30. Воп. 2. Спр. 1794.
111. Доклад и акты по обследованию состояния сельскохозяйственных земледельческих коммун и коллективных хозяйств Могилевского округа // НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 625.
112. Калгасы БССР (Папярэднія вынікі абследаванняў калгасаў у 1928 і 1929 гадах). Мінск : ЦСУ БССР, 1929. 78 с.
113. Гісторыя Беларускай ССР. Мінск : Навука і тэхніка, 1973. Т. 3. 696 с.
114. Народное хозяйство Белорусской ССР : стат. сб. М., 1957.
115. Белорусская ССР в цифрах в 1965 году : кратк. стат. сб. Минск, 1966.
116. Стэнограма і рэзолюцыі верасеньскага Пленуму ЦК КП(б)Б (5—8 верасня 1929 г.). Менск, 1929. 382 с.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Роля аграрнага фактару з'яўляецца выключнай для ўмацавання стабільнасці дзяржавы, яе жыццяздольнасці і бяспекі. На працягу XX ст., мяжы XX і XXI стст. аграрная праблематыка выклікала істотную цікавасць навукоўцаў. У апошнія гады ўвага да гісторыі беларускай вёскі істотна знізілася. «Храналагічная» абмежаванасць даследаванняў перадвызначыла тое, што пад увагу не браліся тыя працэсы, якія акрэсліліся ў папярэдні перыяд, падчас знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Па-за ўвагай апынуліся ўплыў традыцый, інстытут грамады, вывучэнне ментальнасці, сацыяльнай псіхалогіі, якія, безумоўна, працяглы час трансфармаваліся.

Працэсы мадэрнізацыі вёскі ў міжваенны час мелі як агульныя заканамернасці ў межах тагачаснага Саюза, так і пэўныя асаблівасці, што вынікалі з сацыяльна-эканамічнага і нацыяльнага развіцця Беларусі. Беларуская вёска ў 1920-я гг. характарызавалася найменшай удзельнай вагой бяднейшага сялянства (у параўнанні з РСФСР і УССР) і ў той жа час надзвычай вострай праблемай малазямелля. Прыродна-геаграфічныя ўмовы ўскладнялі механізаваную апрацоўку глебы, наяўнасць вялікай колькасці хутароў і дробных пасёлкаў стварала прадпасылкі для вызначэння адрозных тэмпаў і форм мадэрнізацыі беларускай вёскі. Кіраўніцтва Наркамата Земляробства БССР пазначала ў якасці асноўнага вектара развіццё жывёлагадоўлі і інтэнсіўных раслінаводчых культур, якія патрабавалі вялікай колькасці працоўных рук і дзе больш эфектыўнай з'яўлялася праца індывідуальнага гаспадара. Гэтыя сферы ў найменшай ступені маглі быць механізаваны, тут абагуленне сродкаў вытворчасці не мела належнага эфекту. Справа жывёлагадоўлі патрабавала не толькі высокапрадукцыйнай жывёлы, істотных капіталаўкладанняў, але і фарміравання адпаведнай вытворчай культуры, стварэння навуковай асновы для мадэрнізацыі гэтай сферы. Пэўны час жывёлагадоўля ў сялянскіх гаспадарках пазначалася пераважна мэтай паляпшэння ўрадлівасці глебы. Для бяднейшых вяскоўцаў жывёла набывала характар «запаснога капіталу», вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі на рынак не давала для іх належнага прыбытку. Беларуская савецкая рэспубліка паступова прыходзіла да стану, калі доля ўвозімага збожжа станавілася ўсё болей значнай. Гэта істотна павялічвала залежнасць ад хлебавытворчых рэгіёнаў тагачаснага СССР і сітуацыі на хлебным рынку.

Важнейшая падзея ў гісторыі беларускай вёскі дадзенага перыяду — пераход ад вайны да міру, ад палітыкі «ваеннага камунізму» да новай эканамічнай палітыкі. Неабходнасць змен акрэслівалася на VIII Усерасійскім з'ездзе Саветаў. Адмова ад калектывізацыі прадугледжвала пошук шляхоў стымулявання працы

індывідуальнай сялянскай гаспадаркі, вяртанне да свабоды выбару форм землекарыстання. IX Усерасійскім з'ездам была вызначана сутнасць новай эканамічнай палітыкі — рыначныя адносіны. Сістэма новай эканамічнай палітыкі, якая фарміравалася з 1922 па 1924 г., уключала адзіны грашовы падатак, дазвол арэнды зямлі і найму рабочай сілы. Аднак рэалізацыя нэпа сутыкнулася з шэрагам праблем. Узнікала патрэба ў канцэнтрацыі зямлі і капіталу, рухомасці насельніцтва. Але ў рэальнасці назіраліся працэсы драблення і натуралізацыі гаспадарак. Сялянства павялічвала сваё спажыванне, змяншалася доля таварнай часткі прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Пасля ліквідацыі памешчыцкага землеўладання, якое да 1917 г. з'яўлялася важнейшым пастаўшчыком таварнага збожжа, ужо на працягу 1920-х гг. паўстала пытанне аб забеспячэнні хлебам узросшага насельніцтва горада. Выйсце магло быць знойдзена на шляху кааперацыі сельскай гаспадаркі як сродку захавання сацыяльнага развіцця ва ўмовах рыначных адносін. Шляхі і метады каапераванння выглядалі дастаткова спрэчнымі. У партыі і сярод моладзі ўсё больш распаўсюджвалася асобая псіхалогія, якую можна назваць «рэвалюцыйным рамантызмам»: вера ў будучую сусветную рэвалюцыю ў спалучэнні з глыбокім перакананнем ва ўсемагутнасці камандна-адміністрацыйных метадаў кіравання.

Адным з вынікаў развіцця працэсаў савецкай мадэрнізацыі ў Беларусі стала фарміраванне дзяржаўнага апарату, які паступова выяўляў свой погляд на шляхі і формы пераўтварэнняў у рэспубліцы. Фактар дзяржаўнасці (інтарэсаў Беларусі і яе інстытутаў) далёка не заўсёды быў звязаны з фактарам нацыянальным, але любая дзейнасць, накіраваная на абарону паўнамоцтваў рэспублікі, аб'ектыўна садзейнічала ўмацаванню Беларусі як дзяржавы. Урэшце адбылася не толькі пэўная адаптацыя партыйных рашэнняў, але і распрацоўка канцэптуальна адрозных падыходаў з улікам спецыфікі сацыяльна-гістарычнага развіцця Беларусі, найперш у сферы зямельнага права. Асноўныя пярэчанні тычыліся адмаўлення абшчыны і ўраўняльных тэндэнцый, замацавання працоўнага прынцыпу карыстання зямлёй у якасці вызначальнага. Невыпадкова першыя рэпрэсіі былі накіраваны не толькі супраць нацыянальнай інтэлігенцыі, але і цесна звязанага з ёю ў 1920-я гг. дзяржаўнага кіраўніцтва БССР.

На працягу 1920-х гг. адбываўся даволі дэмакратычны працэс пошуку шляхоў і форм мадэрнізацыі вёскі. Рост таварнага значэння жывёлагадоўлі і спецыфіка глеб Беларусі прадвызначылі больш высокую ступень абагулення прадукцыйнай жывёлы ў сельгасарцелях Беларусі, чым у збожжавых раёнах СССР. Менавіта дадзеная форма калектыўнага гаспадарання атрымала найбольшае распаўсюджанне ў рэспубліцы на працягу даследуемага перыяду. Яна шмат у чым адпавядала інтарэсам рамеснікаў, саматужнікаў, гандляроў, якія захоўвалі магчымасць атрымання дадатковага даходу. Сельгасарцель прываблівала бяднейшыя і маласямельныя пласты сярэдняга сялянства, якое ва ўмовах рынкавых адносін мела патрэбу ў падтрымцы дзяржавы. Але ж асноўная маса сярэдняга сялянства не была падрыхтавана да такога ўзроўню абагулення, які склаўся ў сельскагаспадарчых арцелях Беларусі. Сельскагаспадарчыя камуны ўяўлялі сабою пошук са-

цыяльнага ідэалу. У іх стварэнні ўБССР прынялі ўдзел дэмабілізаваныя чырвонаармейцы, палітімігранты з ЗША, а таксама шырокія пласты найменш адукаванага беззямельнага сялянства. Канцэпцыя камуны як тыпу сельскагаспадарчага прадпрыемства, што прадугледжваў адзінства вытворчасці, збыту і кіравання на кааператыўных пачатках у межах асобных вёсак, з'явілася ўтопіяй у святле практычнага вопыту. Разам з тым камуны сталі пачынальнікамі стварэння сацыяльнай інфраструктуры на вёсцы (сталовыя, бібліятэкі, дзіцячыя садкі і яслі).

Таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі да 1927 г. шырокае распаўсюджанне атрымалі ў збожжавытворчых раёнах РСФСР і на Украіне. У Беларускай ССР ва ўмовах лішку працоўных рук у сялянскай сям'і і малазямелля, з аднаго боку, а таксама недахопу складанай сельскагаспадарчай тэхнікі — з другога, іх удзельная вага ў складзе ўсіх форм калгасаў была найменшай. Істотна ўплывала на гэты працэс у другой палове 1920-х гг. і спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці БССР па тых галінах раслінаводства (ільнаводства, бульбаводства), дзе пераважала ручная праца і патрабавалася высокая зацікаўленасць селяніна ў яе канчатковых выніках.

У дынаміцы мадэрнізацыі вёскі ў БССР прасочваюцца чатыры этапы. Для першага з іх (1921—1927 гг.) характэрна адсутнасць колькаснага росту калектыўных гаспадарак. Працягваўся распад калектываў, арганізаваных сялянамі, а ў новыя калгасы аб'ядноўвалася пераважна неземляробчае насельніцтва. Калектыўныя гаспадаркі ствараліся ў выключнай большасці выпадкаў на землях дзяржаўнай маёмасці і разглядаліся толькі ў якасці аднаго са шматлікіх напрамкаў мадэрнізацыі вёскі. Другі этап характарызуецца ўстойлівым, паступовым павелічэннем колькасці калгасаў. Ён вызначыўся ўжо ў канцы 1927 г. — пачатку 1928 г., калі, па меры абвастрэння хлебанарыхтоўчых цяжкасцей, істотна павялічваецца ўвага да вытворчага каапеaccording. Рост падаткаабкладання і пашырэнне падатковых ільгот для калгасаў з вясны — лета 1928 г. прадвызначылі зварот да калектыўнага гаспадарання шматсямейнага і шматжывёльнага сярэдняга сялянства, якое не мела дастатковай колькасці зямельнай плошчы для далейшага вядзення адзінаасобнай вытворчасці. Згортванне прыватнага гандлю і пагаршэнне стану мястэчак садзейнічала аднаўленню прытоку ў калгасы яўрэйскага насельніцтва.Трэці этап, са студзеня 1930 г., уключае фарсіраванне калектывізацыі пры дакладна нявызначаных формах. Рост супраціву сялянства абумовіў пошук новых праектаў статута арцелі, перанос акцэнту не на колькасныя, а на якасныя паказчыкі развіцця працэсаў мадэрнізацыі. Ідучы насустрач селяніну як гаспадару, акрэсліваецца характар асабістай гаспадаркі калгасніка. Вынік гэтага этапу — голад 1932—1933 гг. Арганізацыйнае ўпарадкаванне разам з новым этапам ціску на сялян перадвызначылі на працягу 1934—1937 гг. завяршэнне калектывізацыі як адміністрацыйна-прымусовай формы мадэрнізацыі.

На развіццё форм мадэрнізацыі на працягу даследуемага перыяду істотны ўплыў зрабілі новыя структуры арганізацыйнага кіравання вёскай. Дадзеныя абставіны выявіліся як у распрацоўцы статутных норм, так і ў прамым адміністрацыйным умяшальніцтве з мэтай завышэння ступені абагулення сродкаў вы-

творчасці ў асобных калектывах. Такое адміністраванне падмацоўвалася нізкім узроўнем гаспадарчай і агульнаадукацыйнай культуры членаў калгасаў, недахопам кваліфікаваных кіраўнікоў і агранамічнага персаналу, пераважным стварэннем калектываў на грунце дзяржаўнай маёмасці. Зямельныя і кааператыўныя органы, якія выконвалі функцыі кантролю за яго захаваннем і выкарыстаннем, пастаянна ўмешваліся ва ўнутраныя справы камун, арцеляў і ТСЗ. Не маючы значнай індывідуальнай маёмасці, члены такіх калектываў адчувалі сябе ў становішчы найміта.

Па меры арганізацыі калгасаў на надзельных землях адчужэнне сялян ад калектыўнай уласнасці адбывалася шляхам стварэння так званых «непадзельных фондаў» і праз паступовае пазбаўленне калектываў права свабодна распараджацца выробленай прадукцыяй. Гэтае становішча ўскладнялася яшчэ і тым, што ў калгасах не былі выпрацаваны эфектыўныя метады стымулявання індывідуальнай працы. Большасць калектываў у канцы 20-х гг. XX ст. прымянялі ўраўняльнае размеркаванне, якое абумоўлівалася адсутнасцю наладжанага ўліку працы, недахопам адпаведных спецыялістаў і немагчымасцю ў шэрагу выпадкаў суаднесці аплату працы з канчатковымі вынікамі гаспадарчай дзейнасці.

Да пачатку масавай калектывізацыі калгасы выявілі пэўныя перавагі ў вытворчасці збожжа. Выкарыстоўваючы шматпольныя севазвароты, штучныя ўгнаенні, машынную апрацоўку глебы, яны дасягалі больш высокай ураджайнасці, чым адзінаасобныя гаспадаркі. Калектыўныя аб'яднанні паспяхова выконвалі функцыі сацыяльнай абароны бяднейшага насельніцтва ў вёсцы як праз устаноўленне льгот для наймітаў і беднякоў пры ўступленні ў калектыў, так і шляхам аказання ім дапамогі сельскагаспадарчай тэхнікай, насеннем і г. д. Дробныя калектывы, якія не мелі неабходнай тэхнікі, з'яўляліся стратнымі і бесперспектыўнымі. Пераваг буйной вытворчасці ў шэрагу высокатаварных галін сельскай гаспадаркі рэспублікі (ільнаводства, жывёлагадоўля) калгасы на працягу 1920—30-х гг. не прадэманстравалі.

Сярод форм мадэрнізацыі больш адпавядаючых развіццю сацыяльна-эканамічных працэсаў у беларускай вёсцы акрэслілася інтэграцыя буйной і дробнай сельскагаспадарчай вытворчасці на аснове кааператыўных сувязяў. Ужо з сярэдзіны 20-х гг. XX ст. у развіцці грамадскай вытворчасці калгасаў выявілася тэндэнцыя да ўтварэння сумесных з навакольным сялянскім насельніцтвам малочных і іншых таварыстваў, якія арганізоўвалі перапрацоўку і збыт сваёй прадукцыі, а таксама выкарыстанне прадуктаў гэтай перапрацоўкі. Такім чынам, кааперацыя адбывалася не толькі на аснове гарызантальных, але і вертыкальных гаспадарчых сувязяў.

Разгорнутая з другой паловы 1929 г. суцэльная калектывізацыя ажыццяўлялася на падставе ўніфікаваных форм і метадаў. Спецыфіка развіцця сельскай гаспадаркі ў асобных рэгіёнах была праігнаравана. Прымусовая канфіскацыя хлеба ў калгасаў рэспублікі выклікала масавы голад і надоўга затрымала іх станаўленне як вытворцаў мяса-малочнай прадукцыі, нанесла сур'ёзную шкоду развіццю жывёлагадоўлі ў цэлым.

На працягу даследуемага перыяду пад уплывам мадэрнізацыйных працэсаў акрэсліліся аспекты ўскладнення сацыяльнай структуры вясковага насельніцтва, пачатковыя працэсы ўрбанізацыйных з'яў. Аднак істотных зрухаў не адбылося, традыцыйны недавер сялянства да ўладных структур паглыбіўся, акрэслілася разуменне сялянскага палітычнага прадстаўніцтва. Нягледзячы на ўсе захады ўлады, сельскі свет не быў канчаткова расколатым, элементы адносін, сфарміраваных у грамадзе, традыцыйныя інстытуты працягвалі дзейнічаць.

На працягу 1920-х гг. назіраецца перапляценне традыцыйных і мадэрнізаваных структур. Зямля і магчымасць працы на ёй заставаліся для вяскоўца галоўнай каштоўнасцю. У той жа час адбываецца прырашчэнне якасных змен, якія стваралі перадумовы для кардынальнай перабудовы вёскі. У заканадаўстве БССР акрэсліваюцца задачы і функцыі сельскай грамады, якая ва ўмовах Беларусі істотна адрознівалася ад традыцыйнай абшчыны і вызначалася своеасаблівай формай мясцовага самакіравання. Для беларускага селяніна пераважнае значэнне захоўвала не форма ўласнасці на зямлю, а магчымасць свабоднага гаспадарання на ёй. Пры гэтым справядлівым бачылася не ўраўняльнае размеркаванне, а землекарыстанне згодна з працоўным прынцыпам. У 1930-я гг. ва ўмовах цэнтралізацыі і ўніфікацыі адбываецца ліквідацыя форм самакіравання (і кааперацыйнага, і сельскага), узрастае ўплыў дзяржавы, якая вызначаецца адзіным ініцыятарам змен.

За стагоддзе змяніліся і арганізацыйныя формы буйных гаспадарак, і іх тэхнічнае аснашчэнне. Не толькі ў 1920-я гг., але і на мяжы 80—90-х гг. XX ст. складана было прадугледзець, што кармленне і даенне кароў будзе рэгуляваць камп'ютарная тэхніка. Невыпадкова побач з развіццём фермерскіх гаспадарак у Беларусі істотны акцэнт ставіцца на буйнога вытворцу, перш за ўсё ў сферы мяса-малочнай прадукцыі. Аднак па-ранейшаму актуальна гучыць сцвярджэнне Янкі Купалы: «А хто там ідзе, а хто там ідзе ў агромністай такой грамадзе? — Беларусы».

# ДАДАТАК

*Табліца 1*

**Удзельная вага сельскагаспадарчых культур у таварнай частцы**

| Назва | Удзельная вага ў таварнай частцы | | |
|---|---|---|---|
| | 1924–1925 гг. | 1925–1926 гг. | 1926–1927 гг. |
| Зернявыя | 20,0 | 9,5 | 5,0 |
| Бульба і гародніна | 3,6 | 3,2 | 3,7 |
| Валакніста-тэхнічныя | 5,2 | 7,9 | 6,3 |
| Жывёлагадоўля | 42,9 | 50,0 | 53,4 |
| Іншыя | 28,3 | 29,4 | 31,6 |
| Разам | 100 | 100 | 100 |

Савецкае будаўніцтва. 1928. № 6.

*Табліца 2*

**Сабекошт сельскагаспадарчых культур**

| Групы гаспадарак па засеве | Сабекошт пуда ў рублях | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1924–1925 гг. | | | | 1925–1926 гг. | | | |
| | жыта | аўса | ільно-валакна | бульбы | жыта | аўса | ільно-валакна | бульбы |
| Да 2 дзес. | 1,00 | 0,56 | 7,74 | 0,25 | 1,22 | 1,16 | 7,87 | 0,32 |
| Ад 2,1–8,0 дзес. | 0,86 | 0,75 | 4,92 | 0,23 | 1,02 | 0,82 | 7,93 | 0,28 |
| Ад 8,1–16 дзес. | 0,60 | 0,44 | 4,98 | 0,15 | 0,84 | 0,74 | 7,23 | 0,25 |
| Рыначныя мясцовыя цэны | 0,80 | 0,70 | 7,26 | 0,24 | 1,08 | 1,00 | 7,56 | 0,31 |

Савецкае будаўніцтва. 1928. № 6.

*Табліца 3*

**Зводка аб ходзе калектывізацыі па БССР**

| На які час | Колькасць калгасаў | У іх гаспадарак | За перыяд прыбыло гаспадарак | % калектывізацыі | Рабжывёлы (абагулен.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 10/IX-30 г. | 3145 | 90 220 | – | 11,6 | 83 291 |
| 10/X-30г . | 3241 | 93 239 | 3019 | 12,0 | 84 643 |
| 10/XI-30 г. | 3474 | 99 629 | 6390 | 12,8 | 87 255 |
| 10/XII-30 г. | 3864 | II0 265 | 10 625 | 14,2 | 87 954 |
| 10/I-31 г. | 4133 | II5 495 | 5230 | 14,9 | 88 845 |
| 20/I-31 г. | 4239 | II9 644 | 4149 | 15,4 | 89 449 |
| 30/I-31 г. | 4357 | 123 754 | 4110 | 15,9 | 91 649 |
| 10/II-31 г. | 4572 | 129 954 | 6200 | 16,7 | 93 565 |

З а ў в а г а. Зводка аб ходзе калектывізацыі на 10/II складзена па звестках 85 раёнаў па 10/II, а па астатніх даныя ўзяты па папярэдніх дэкадах.

*Сьмірноў*,
Наркамзем бел.- пасеўбюро

14 лютага 1931 г.
Протоколы № 35—40 заседаний Бюро ЦК КП(б) и доклады к ним // НАРБ. Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 5110. НАРБ. Ф. 4п. Воп. 3. Спр. 41. Т. 2. Л. 36.

*Табліца 4*

**Узровень адукацыі, сацыяльны і нацыянальны склад, партыйнасць членаў праўленняў калектыўных гаспадарак па стане на люты – май 1925 г. (адносныя даныя, у %)**

| Акругі БССР | Разам | Узровень адукацыі | | | | | Нацыянальны склад | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | неадукаваныя | атрымаўшыя адукацыю | | | | беларусы | рускія | палякі | яўрэі | іншая нацыянальнасць |
| | | | хатняя | ніжэйшая | сярэдняя | вышэйшая | | | | | |
| Бабруйская | 100 | 4,6 | 78,5 | 9,2 | 7,7 | – | 61,3 | – | – | 37,1 | 1,6 |
| Віцебская | 100 | 9,2 | 35,6 | 47,1 | 8,1 | – | 81,6 | – | 5,7 | 3,4 | 9,3 |
| Калінінская | 100 | – | 50,4 | 40,2 | 7,7 | 1,7 | 74,8 | 0,9 | – | 22,6 | 1,7 |
| Мінская | 100 | 5,9 | 52,9 | 32,4 | 8,8 | – | 85,1 | 3,0 | 3,0 | 7,5 | 1,4 |
| Мазырская | 100 | 8,6 | 62,8 | 20,0 | 8,6 | – | 65,7 | 2,9 | 8,6 | 17,1 | 5,7 |
| Магілёўская | 100 | 2,5 | 86,0 | 10,7 | 0,8 | – | 89,2 | – | – | 9,2 | 1,6 |
| Полацкая | 100 | 10,3 | 60,0 | 21,8 | 8,8 | – | 79,7 | 1,3 | 2,6 | 3,8 | 12,6 |
| Разам па 7 акругах БССР | 100 | 5,2 | 60,1 | 27,9 | 6,5 | 0,3 | 80,3 | 0,9 | 2,2 | 11,9 | 4,7 |

| Акругі БССР | Разам | Членаў КП(б)Б і КСМ | Сацыяльны склад | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | былых рабочых | служачых | батракоў | сялян малазямельных | сераднякоў | іншых |
| Бабруйская | 100 | 12,3 | 12,3 | 29,2 | 12,3 | – | 46,2 | – |
| Віцебская | 100 | 9,2 | 11,5 | 17,2 | 10,3 | – | 59,8 | 1,2 |
| Калінінская | 100 | 6,5 | 18,2 | 11,8 | 3,6 | 65,4 | – | 1,0 |
| Мінская | 100 | 21,5 | 14,9 | 13,4 | 4,5 | 4,5 | 55,2 | 7,5 |
| Мазырская | 100 | 26,5 | 11,4 | 25,7 | 11,4 | – | 48,6 | 2,9 |
| Магілёўская | 100 | 10,7 | 9,6 | 4,4 | 2,6 | 3,5 | 68,4 | 11,5 |
| Полацкая | 100 | 1,3 | – | 9,8 | 4,9 | 4,9 | 78,2 | – |
| Разам па 7 акругах БССР | 100 | 11,9 | 11,3 | 13,7 | 6,1 | 14,7 | 49,5 | 4,7 |

Звесткі па Барысаўскай, Аршанскай і Слуцкай акругах у крыніцы адсутнічаюць.

Табліца складзена на аснове даных акруговых саюзаў сельгаскааперацыі па стане на люты – май 1925 г. (НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 470. Л. 38, 46, 53, 60, 68, 75).

*Табліца 5*

**Усяго па 6 паветах мелася калгасаў**

| На красавік 1921 г. | У студзені – лютым 1922 г. | На жнівень 1922 г. | На сакавік 1923 г. | На кастрычнік 1923 г. | На сакавік 1924 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 33 | 35 | 44 | 52 | 56 | 62 |

Табліца складзена на падставе даных: на красавік 1921 г.: НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 618. Л. 105; на студзень – люты 1922 г.: Советская Белоруссия. – Минск, 1922. – С. 73; на жнівень 1922 г.: НАРБ БССР. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 641. Л. 46–47; на сакавік 1923 г.: Там жа. Спр. 2543. Л. 13; на октябрь 1923 г.: Белорусская Социалистическая Советская Белоруссия в 1922–1923 гг. – Минск, 1924. – С. 49; на сакавік 1924 г.: НАРБ БССР. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 51. Л. 52.

*Табліца 6*

**Дынаміка калгаснага руху ў БССР у другой палове 1924–1927 гг.***

| Год | 1924 | | 1925 | | 1926 | | 1927 | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Месяц | чэрвень | кастрычнік | студзень | кастрычнік | студзень | кастрычнік – снежань | студзень | вясна |
| Колькасць калектыўных аб'яднанняў | 389 | 392 | 385**<br>387 | 414<br>433 | 371<br>404 | 391<br>439 | 369<br>379 | 434 |

Да вясны 1927 г. без уліку калгасаў Гомельскай і Рэчыцкай акруг.

*Інтэрвалы паміж максімальнымі і мінімальнымі паказчыкамі, якія найбольш істотныя ў даных за 1926 г., абумоўлены, на наш погляд, рознай ступенню ўліку т. зв. «дзікіх» калгасаў. Так, на 1 кастрычніка 1926 г. было ўлічана 11, на 1 снежня гэтага ж года – 58 (НАРБ. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 2598. Л. 77). Акрамя таго, у шэрагу выпадкаў указаны толькі калектыўныя гаспадаркі, якія створаны на землях ДЗІ (мінімальны паказчык за студзень 1927 г. – Гл.: Там жа. Л. 80).

**Табліца складзена на падставе даных: чэрвень 1924 г.: НАРБ. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 2598. Л. 80; кастрычнік 1924 г.: Там жа. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 2060. Л. 70; кастрычнік 1925 г.: Там жа. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 480. Л. 27; Справаздача Урада Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі VII Усебеларускаму з'езду Саветаў. – Менск, 1925. – С. 73; кастрычнік 1925 г.: Белсельсаюз: Справаздача за 1926/27 апэрацыйны год. – С. 21; НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 609. Л. 68; Кааперацыя БССР. – С. LXIII.

Студзень 1926 г.: Савецкае будаўніцтва. – 1927. – № 1. – С. 139; кастрычнік 1926 г.: з улікам 11 «дзікіх» калгасаў. – Белсельсаюз: Справаздача за 1926/27 апэрацыйны год. – С. 3; с учетом 58 «диких» колхозов. – НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 881. Л. 69; студзень 1927 г.: КПБ в резолюциях... – Т. 1. – С. 379; НАРБ. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 2598. Л. 77; вясна 1927 г.: Сельское хозяйство СССР в 1925–1928 гг. – С. 18.

*Табліца 7*

**Змены ў сацыяльным складзе калектыўных гаспадарак у 1924–1927 гг.[1]**

| Паказаныя сацыяльныя групы[2] | 1924 г. | 1925 г. | | 1926 г. | | | 1927 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ліпень[3] | люты – май | ліпень – кастрычнік | студзень | на 1.09 | на 1.10 | на 1.10 |
| Заможных | 0,5 | 0,7 | – | – | – | – | – |
| Сераднякоў | 2,3 | 2,4 | – | – | – | – | – |
| Малазямельных | – | – | 22,0 | 21,0 | 19,9 | 20,0 | – |
| Беднякоў | 54,1 | 47,2 | – | – | – | – | 52,5 |
| Беззямельных | – | – | 28,0 | 31,5 | 31,7 | 36,0 | – |
| Батракоў | 28,3* | 31,1 | 32,0 | 30,5 | 29,6 | 28,0 | 30,5 |
| Рабочых | – | 9,9 | 10,0 | 9,5 | 3,2 | 7,3 | 9,5 |
| Рамеснікаў | – | – | – | – | 4,3 | – | – |
| Кустароў | 14,8 | – | – | – | – | | – |
| Служачых | – | 4,8 | 5,0 | 4,5 | – | 3,2 | 4,5 |
| Інтэлігенцыі | – | – | – | – | 0,2 | – | – |
| Іншых | – | 3,9 | 3,0 | 3,0 | 11,1 | 5,5 | 3,0 |
| Разам | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |

[1]Табліца складзена на падставе матэрыялаў: на ліпень 1924 г. – НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 237. Л. 154; на ліпень – кастрычнік 1925 г. – НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 266. Л. 29; Спр. 609. Л. 32; на студзень 1926 г. – Савецкае будаўніцтва. – 1927. – № 1. – С. 139; на 01.09.1926 г. – НАРБ. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 2598. Л. 78; на 01.10.1926 г. – Там жа. Ф. 334. Воп. 1. Л. 32; на 01.10.1927 г. – Там жа.

[2]У дадзенай графе сацыяльныя групы прыводзяцца так, як яны вызначаны ў крыніцы.

[3] Па выніках выбарных даследаванняў.

* У крыніцы – 18,3 %. Аднак у гэтым выпадку падагульняючы вынік не з'яўляецца роўным 100.

*Табліца 8*

**Змены ў нацыянальным складзе калектыўных гаспадарак БССР у 1925–1927 гг.**

| Нацыянальнасць | 1925 г. | 1926 г. | 1927 г. |
|---|---|---|---|
| Беларусаў | 84,0 | 73,0 | 65,1 |
| Яўрэяў | 11,0 | 23,0 | 28,7 |
| Палякаў | 2,0 | 1,5 | 4,0 |
| Рускіх, літоўцаў, латышоў і іншых | 3,0 | 2,5 | 2,2 |

Табліца складзена на падставе даных: НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 4003. Л. 61; Ф. 334. Воп. 1. Спр. 609. Л. 32; Белсельсаюз: Справаздача за 1926/27 апэрацыйны год. – С. 22.

*Табліца 9*

**Нацыянальны і сацыяльны склад калгасаў да 1 кастрычніка 1926 г.**
**НАРБ. Ф. 11. Воп. 2. Спр. 8. Л. 32**

| Беларусаў | Яўрэяў | Рускіх | Палякаў | Іншых | Сялян | Рабочых | Рамеснікаў | Служачых | Іншых |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 47,7 | 49,6 | 2,0 | 0,3 | 0,4 | 57,6 | 3,5 | 3,8 | 1,3 | 33,8 |

*Табліца 10*

**Паакруговая дынаміка калгаснага будаўніцтва ў Беларускай ССР**
**у канцы 1927 г. – першай палове 1929 г.**

| Акруга | На 1 кастрычніка 1927 г. | 1928 г. | | На 1 чэрвеня 1929 г. |
|---|---|---|---|---|
| | | на 1 чэрвеня | на 1 кастрычніка | |
| Бабруйская | 53 | 81 | 108 | 132 |
| Віцебская | 54 | 103 | 117 | 150 |
| Гомельская | 37 | 40 | 96 | 80 |
| Мінская | 50 | 72 | 131 | 134 |
| Магілёўская | 94 | 110 | 218 | 179 |
| Мазырская | 26 | 40 | 57 | 74 |
| Аршанская | 76 | 100 | 178 | 149 |
| Полацкая | 51 | 65 | 90 | 115 |
| Разам | 441* | 611 | 995 | 1013 |

Табліца складзена на падставе даных: Асноўныя вынікі работы Урада БССР да перавыбараў Саветаў 1928–1929 гг. — Менск, 1928. – С. 56; Калгасы БССР (папярэднія вынікі абследаванняў калгасаў у 1928 і 1929 гадах). – С. 48; ДАВВ. Ф. 319. Воп. 1. Спр. 35. Л. 288.

* У крыніцы – 440.

*Табліца 11*

**Колькасць сельскіх населеных пунктаў**

| Насельніцтва | Мінская акруга | Бабруйская акруга | Барысаўская акруга | Віцебская акруга | Гомельская акруга | Калінінская акруга | Магілёўская акруга | Мазырская акруга | Аршанская акруга | Полацкая акруга | Рэчыцкая акруга | Слуцкая акруга |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1–9 | 719 | 481 | 512 | 762 | 294 | 252 | 285 | 524 | 282 | 995 | 205 | 422 |
| 10–99 | 2566 | 1683 | 1861 | 4557 | 568 | 1161 | 1628 | 1327 | 1164 | 3817 | 371 | 1165 |
| 100–499 | 936 | 848 | 899 | 1447 | 443 | 819 | 827 | 480 | 1056 | 753 | 276 | 403 |
| 500 і больш | 105 | 202 | 89 | 15 | 166 | 126 | 229 | 170 | 94 | 5 | 165 | 162 |
| % ад агульнай колькасці сельскіх населеных пунктаў | | | | | | | | | | | | |
| 1–9 | 1,88 | 1,26 | 1,34 | 1,99 | 0,77 | 0,66 | 0,74 | 1,37 | 0,74 | 2,60 | 0,54 | 1,10 |
| 10–99 | 6,70 | 4,39 | 4,86 | 11,89 | 1,48 | 3,03 | 4,25 | 3,46 | 3,04 | 9,96 | 0,97 | 3,04 |
| 100–499 | 2,44 | 2,21 | 2,35 | 3,78 | 1,16 | 2,14 | 2,16 | 1,25 | 2,76 | 1,97 | 0,72 | 1,05 |
| 500 і больш | 0,27 | 0,53 | 0,23 | 0,04 | 0,43 | 0,33 | 0,60 | 0,44 | 0,25 | 0,01 | 0,43 | 0,42 |
| % ад колькасці сельскіх населеных пунктаў у акрузе | | | | | | | | | | | | |
| 1–9 | 16,62 | 14,97 | 15,23 | 11,24 | 19,99 | 10,69 | 9,60 | 20,95 | 10,86 | 17,86 | 20,16 | 19,61 |
| 10–99 | 59,32 | 52,36 | 55,37 | 67,20 | 38,61 | 49,24 | 54,83 | 53,06 | 44,84 | 68,53 | 36,48 | 54,14 |
| 100–499 | 21,64 | 26,38 | 26,75 | 21,34 | 30,12 | 34,73 | 27,85 | 19,19 | 40,68 | 13,52 | 27,14 | 18,73 |
| 500 і больш | 2,43 | 6,29 | 2,65 | 0,22 | 11,28 | 5,34 | 7,71 | 6,80 | 3,62 | 0,09 | 16,22 | 7,53 |

*Табліца 12*

**Суадносіны дзвюх груп калектыўных гаспадарак: з поўным абагуленнем сродкаў вытворчасці і з частковым**

| Формы калектыўных гаспадарак | Ступень абагулення сродкаў вытворчасці | |
|---|---|---|
| | поўнае | частковае |
| Камуны | 39 | 4 |
| Арцелі | 143 | 139 |
| Таварыствы (ТСЗ) | 8 | 50 |

НАРБ. Ф. 30. Воп. 2. Спр. 1787. Л. 13.

*Табліца 13*

**Змены ў суадносінах форм калектыўных гаспадарак**

| Формы калектыўных гаспадарак | Да пачатку года | | Да канца года | |
|---|---|---|---|---|
| | яўрэйскія | беларускія | яўрэйскія | беларускія |
| Камун | — | 49 | — | 45 |
| Арцеляў | 115 | 180 | 133 | 133 |
| Таварыстваў (ТСЗ) | 12 | 58 | 12 | 57 |

НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 609. Л. 31.

*Табліца 14*

**Дынаміка забеспячэння калектыўных і аднаасобных гаспадарак раллёй, буйной рагатай жывёлай і працоўнай жывёлай у 1924/25 – 1927/28 гаспадарчых гадах (у разліку на аднаго едака)**

| Назва паказчыкаў | 1924/25 г. | | 1925/26 г. | | 1926/27 г. | | 1927/28 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | У калек-тыўных гаспадарках | У адзіна-асобных гаспадарках | У калек-тыўных гаспадарках | У адзіна-асобных гаспадарках | У калек-тыўных гаспадарках | У адзіна-асобных гаспадарках | У калек-тыўных гаспадарках | У адзіна-асобных гаспадарках |
| Раллі, у дзес. | 1,17 | 0,70 | 1,31 | 0,72 | 1,26 | 0,73 | 1,38 | 0,75 |
| Буйной рагатай жывёлы (у галовах) | 0,27 | 0,29 | 0,32 | 0,32 | 0,34 | 0,33 | 0,47 | 0,41 |
| Працоўнай жывёлы (у галовах) | 0,17 | 0,17 | 0,18 | 0,19 | 0,17 | 0,20 | 0,20 | 0,21 |

Табліца складзена на падставе даных: Сельская гаспадарка Саюза ССР у 1924/25 годзе. С. XVIII; у 1925/26 годзе. С. XXIII; у 1926/27 годзе. С. IVIII, IIX, IXX; у 1927/28 годзе. С. IVIII.

*Табліца 15*

**Дынаміка суадносін форм калектыўных гаспадарак пасля ўзбуйнення БССР (другая палова 1924 — першая палова 1929 г.)**

| Формы калектыўных гаспадарак | 1924 г. | | 1925 г. | | | 1926 г. | | 1927 г. | | 1928 г. | 1929 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| абсалютныя паказчыкі | | | | | | | | | | | |
| С/г камун | 54 | | 55 | 49 | 50 | 45 | 43 | 45 | 49 | 76 | 84 |
| Сельгасарцеляў | 277 | 280 | 245 | 295 | 254 | 266 | 264 | 262 | 312 | 771 | 1073 |
| Таварыстваў (ТСЗ) | 58 | | 81 | 70 | 129 | 69 | 74 | 72 | 79 | 147 | 180 |
| адносныя паказчыкі | | | | | | | | | | | |
| С/г камун | 13,9 | 13,8 | 14,4 | 11,8 | 11,5 | 11,8 | 11,3 | 11,9 | 11,1 | 7,6 | 6,3 |
| Сельгасарцеляў | 71,2 | 71,4 | 64,3 | 71,3 | 58,7 | 70,0 | 69,3 | 69,1 | 70,9 | 77,6 | 80,2 |
| Таварыстваў (ТСЗ) | 14,9 | 14,8 | 21,3 | 16,9 | 29,8 | 18,2 | 19,4 | 19,0 | 18,0 | 14,8 | 13,5 |

Табліца складзена на падставе даных: на май — чэрвень 1924 г.: НАРБ. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 2310. Л. 133; на 1 кастр. 1924 г.: НАРБ. Ф. 48. Воп. 1. Спр. 2060. Л. 70; на студзень 1925 г.: Справаздача Ураду Б.С.С.Р. УП Усебеларускаму з'езду. – С. 73; на 1 кастр. 1925 г.: Белсельсаюз: Справаздача за 1926/27 апэрацыйны год. – С. 21; Опыт исследования счетоводного анализа. – С. 22; Кооперация БССР. – С. LXIII; на кастр. 1926 г.: НАРБ. Ф. 334. Воп. 1. Спр. 609. Л. 30; на снежань 1926 г.: ДАРФ. Ф. 374. Воп. 9. Спр. 293; на 1 студзеня 1927 г.: НАРБ. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 2598. Л. 80; на 1 кастр. 1927 г.: Белсельсаюз: Справаздача за 1927/28 апэрацыйны год. – С. 1.

*Табліца 16*

**Ураджайнасць асноўных сельскагаспадарчых культур у БССР за 1924–1928 гг.**
**(параўнальныя даныя па калектыўных і аднаасобных гаспадарках у цэнтнерах на 1 га)**

| Віды сельска-гаспадарчых культур | 1924 г. | | 1925 г. | | 1926 г. | | 1927 г. | | 1928 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | калгасы | адна-асобныя гаспадаркі | калгасы | адна-асобныя гаспадаркі | калгасы | адна-асобныя гаспадаркі | калгасы | адна-асобныя гаспадаркі | калгасы | адна-асобныя гаспадаркі |
| Жыта азімае | 6,8 | 7,0 | 7,9 | 7,1 | 6,8 | 5,9 | 8,2 | 6,4 | 7,8 | 7,7 |
| Пшаніца | 7,7 | 7,7 | 8,3 | 7,4 | 6,9 | 7,4 | 6,9 | 7,6 | 9,7 | 8,1 |
| Авёс | 7,1 | 8,3 | 6,5 | 7,8 | 5,8 | 5,9 | 4,8 | 5,6 | 7,9 | 7,4 |
| Ячмень | 6,9 | 7,4 | 7,1 | 7,7 | 7,5 | 6,7 | 6,9 | 6,5 | 7,7 | 7,4 |
| Грэчка | 3,8 | 4,9 | 4,2 | 4,2 | 5,0 | 4,2 | 4,7 | 4,0 | 4,3 | 4,9 |
| Проса | 6,1 | 6,3 | 5,9 | 5,9 | 5,1 | 5,2 | 6,3 | 5,9 | 4,6 | 6,2 |
| Бабовыя | 6,5 | 6,7 | 7,2 | 7,0 | 4,7 | 4,4 | 7,3 | 3,1 | 7,1 | 6,3 |
| Бульба | 88,1 | 82,5 | 87,5 | 84,6 | 91,4 | 96,0 | 81,5 | 80,4 | 94,7 | 96,3 |

Табліца складзена на падставе звестак Белкалгассаюза. Гл.: Беларуская ССР у лічбах. Да 10-годдзя існавання БССР. – С. 159, 188; НАРБ. Ф. 30. Воп. 3. Спр. 292. Л. 68. (даныя за 1928 г.).

**Насельніцтва БССР. 1926 г.**




*Дыяграма 1*

**Гарадскія паселішчы**




*Дыяграма 2*

# ЗМЕСТ

**АД АЎТАРА** .......... 3
**УВОДЗІНЫ** .......... 4

**Раздзел 1. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ, КРЫНІЦЫ І МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ**

1.1. Гістарыяграфія .......... 11
1.2. Крыніцы .......... 39
1.3. Кірункі вывучэння і метадалогія даследавання .......... 64

**Раздзел 2. ДЫНАМІКА І ФОРМЫ САВЕЦКАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ**

2.1. Змены ў палітыцы ўлад на вёсцы: прычыны і змест. Тэндэнцыі развіцця адзінаасобнай сялянскай гаспадаркі .......... 75
2.2. Інстытуты кіравання сельскай гаспадаркай .......... 108
2.3. Кааперацыя і калектывізацыя: формы і дынаміка .......... 130
2.4. Асноўныя кірункі індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі .......... 152

**Раздзел 3. САЦЫЯЛЬНАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ВЁСКІ І ЗМЕНЫ Ў САЦЫЯЛЬНАЙ ПСІХАЛОГІІ СЯЛЯНСТВА Ў 1921—1939 гг.**

3.1. Дэмаграфічныя і сацыяльныя змены ў беларускай вёсцы .......... 165
3.2. Формы вясковых паселішчаў і землекарыстання. Трансфармацыя традыцыйных сялянскіх інстытутаў .......... 177
3.3. Паўсядзённае жыццё беларускай вёскі. Эканамічныя паводзіны і сацыяльная псіхалогія сялянства .......... 196

**ЗАКЛЮЧЭННЕ** .......... 223
**ДАДАТАК** .......... 228

Навуковае выданне

**Ходзін** Сяргей Мікалаевіч

**БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС: ШЛЯХІ І ФОРМЫ САВЕЦКАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ (1921—1939)**

Адказны за выпуск *А. А. Лагвіновіч*

Мастак вокладкі *Т. Ю. Таран*
Тэхнічны рэдактар *Т. К. Рамановіч*
Камп'ютарная вёрстка *Л. М. Копач*
Карэктар *Л. С. Мануленка*

Падпісана да друку 12.03.2014.
Фармат 60×84/16.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 13,95+0,46 укл.
Ул.-выд. арк. 15,7+0,48 укл.
Тыраж 120 экз. Заказы 157, 116.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.
ЛВ № 02330/0494425 ад 08.04.2009.
Пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
ЛП № 02330/0494178 ад 30.04.2009.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.







ISBN 978-985-518-989-4
9 789855 189894

С. М. Ходзін

БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС:
ШЛЯХІ І ФОРМЫ САВЕЦКАЙ МАДЭРНІЗАЦЫІ (1921–1939)